НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

НЯСВІЖ · 1551
МАГІЛЕЎ · 1971
ВІЦЕБСК · 1862
МІНСК · 1963

DEPARTMENT FOR ARCHIVES AND RECORDS MANAGEMENT
OF THE MINISTRY OF JUSTICE OF THE REPUBLIC OF BELARUS

NATIONAL HISTORICAL ARCHIVES OF BELARUS

# Archivaryus

*Collection of scholarly papers and articles*

## Volume 19

Minsk
NHAB
2021

ДЭПАРТАМЕНТ ПА АРХІВАХ І СПРАВАВОДСТВУ
МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

# Архіварыус

*Зборнік навуковых паведамленняў і артыкулаў*

## Выпуск 19

Мінск
НГАБ
2021

УДК [930.22+94(476)«15/19»(082)]
ББК 79.3(Беи)+63.3(4Беи)41
А87

Рэкамендавана да друку Вучоным саветам
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

Р э д а к ц ы й н а я к а л е г і я :
*Г. Я. Галенчанка, В. Ф. Голубеў* (галоўны рэдактар)*,*
*У. М. Дзянісаў, К. Ю. Ерусалімскі, В. І. Кураш, Д. В. Лісейчыкаў,*
*Д. Ч. Матвейчык* (адказны рэдактар)*, А. Рахуба, А. Я. Рыбакоў,*
*А. Л. Самовіч, В. В. Урублеўскі, М. Ф. Шумейка, Д. У. Яцэвіч*

Р э ц э н з е н т ы :
доктар гістарычных навук *А. І. Груша,*
кандыдат гістарычных навук *В. С. Пазднякоў*

У адпаведнасці з загадам старшыні Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 1 лютага 2012 года № 21 зборнік навуковых прац «Архіварыус» уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных навуках

**ISSN 2225-4412**

© Дзяржаўная ўстанова
«Нацыянальны гістарычны
архіў Беларусі», 2021

# Архівазнаўства

*А. М. Латушкін*

## Комплекс арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва Вялікага Княства Літоўскага ў гістарыяграфіі краін постсавецкай прасторы 1991–2020 гг.: тэрміналагічны аспект

У структуры дакументальнай спадчыны Беларусі адно з найважнейшых месцаў займае архіў вялікіх князёў літоўскіх, уласна – дзяржаўны архіў Вялікага Княства Літоўскага. Ён складаўся з дзвюх асноўных частак: 1) т. зв. Метрыка ВКЛ, якая вялася ў гаспадарскай канцылярыі ў форме сшыткаў і кніг, дзе фіксаваліся тэксты выходных і ўваходных дакументаў; 2) комплекс прававых актаў агульнадзяржаўнага значэння ў форме арыгіналаў. Другі з масіваў значна менш вывучаны ў навуцы. На цяперашні час ён не мае ўстойлівага абазначэння. Мэтай гэтага артыкула з'яўляецца аналіз тэрміналагічных падыходаў да аб'екта, якія дэманструе гістарыяграфія на сучасным этапе[1].

***Тэрміналагічныя падыходы гісторыкаў Расійскай Федэрацыі*** ў адносінах да «дзяржаўнага архіва ВКЛ», а разам з тым – Метрыкі ВКЛ і комплексу арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва вялікіх князёў літоўскіх грунтаваліся на поглядах, сфарміраваных у СССР да канца 1980-х гг. Найбольш важкі аўтарытэт у дадзенай праблематыцы мела найбуйнейшы спецыяліст у галіне метрыцыяны, доктар гістарычных навук Ганна Харашкевіч (1931–2017). Варта, аднак, заўважыць, што па працах перыяду, які разглядаецца, падыходы аўтара да комплексу арыгіналаў актаў высветліць дастаткова складана. Што ж датычыцца другога з аб'ектаў – Метрыкі ВКЛ, то падыходы істотна не змяніліся,

[1] У гэтым артыкуле разглядаецца адлюстраванне названага аспекту ў гістарыяграфіі краін Расіі, Украіны і Літвы. Айчынная гістарыяграфія тэмы перыяду 1991–2020 гг. будзе пададзена асобна. Асвятленне іншых аспектаў праблемы гл. у артыкулах аўтара.

але, як падаецца, былі ў гэты час больш глыбока асэнсаваны і падсумаваны даследчыцай. Як вядома, распад СССР і ўзнікненне Беларусі, Літвы і Украіны ў статусе незалежных дзяржаў вывелі праблему гістарычнай спадчыны Вялікага Княства Літоўскага і архіваў гэтай дзяржавы на прынцыпова іншы – больш маштабны – узровень. Гэтая праблема станавілася важнай часткай працэсаў дзяржаўнага будаўніцтва ў названых дзяржавах у галіне гістарычнай навукі, культуры, фарміравання нацыянальнай свядомасці іх грамадзян. Гэта спараджала надзеі на развіццё даследаванняў метрыцыяны і рэалізацыю праектаў па яе публікацыі. Аднак многія чаканні спецыялістаў, у тым ліку самой Г. Харашкевіч, не апраўдаліся, што давала падставы для рэфлексіі над праблемай. Адносна тэрміналагічнага апарату прац расійскай даследчыцы ў гэты час магчыма заўважыць наступнае.

У 1998 г. даследчыца адзначала ў кантэксце перамяшчэнняў і страт дакументальнай спадчыны органаў цэнтральнай улады ВКЛ, што Метрыка ВКЛ заключала ў сабе хоць і значную, але толькі частку «дзяржаўнага архіва княства» нароўні з «граматамі» або «актавымі матэрыяламі Вялікага княства Літоўскага» [42, с. 204]. У 1999 г. Г. Харашкевіч зноў дэкларавала погляд на Метрыку ВКЛ як на дзяржаўны архіў ВКЛ, аднак працягвала падзяляць меркаванне Патрысіі Кэнэдзі Грымстэд аб калекцыйным характары створанага на яе аснове архіўнага фонду № 389 Расійскага дзяржаўнага архіва старажытных актаў (ранейшага Цэнтральнага дзяржаўнага архіва старажытных актаў СССР). У артыкуле, прысвечаным памяці савецкага гісторыка Уладзіміра Пашуты (1918–1983), аналізуючы гістарычную ролю даследчыка ў праекце публікацыі кніг Метрыкі ВКЛ у СССР, яна адназначна называла «Літоўскую метрыку» калекцыяй. Адпаведна, саму назву «Літоўская метрыка» суправаджала словазлучэннем «так званая» [39, с. 295]. Што датычыцца арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння, то акты знешнепалітычнага характару ў адной са сваіх прац даследчыца выразна абазначала як частку «дзяржаўнага архіва Вялікага княства Літоўскага» [41, с. 9].

Разам з тым, магчыма заўважыць, што тэрміналагічная дыскусія вакол Метрыкі ВКЛ мела для Г. Харашкевіч, хутчэй, другаснае значэнне ў параўнанні з іншымі кірункамі яе даследаванняў. У 1997 г. у артыкуле, прысвечаным лёсу праекта выдання кніг Метрыкі ВКЛ, яна прызнавала права на існаванне двух азначэнняў у дачыненні да «Літоўскай метрыкі», г. зн. і «архіў велікакняжацкай канцылярыі», па-сутнасці, ведамасны архіў, і «дзяржаўны архіў Вялікага княства Літоўскага». Пры гэтым яна падкрэслівала прыярытэтнае значэнне факта каштоўнасці Метрыкі ВКЛ як гістарычнай крыніцы ў параўнанні з іншымі яе якасцямі [28, с. 452].

У 2007 г. у артыкуле, змешчаным у зборніку, прысвечаным памяці выдатнага літоўскага даследчыка Метрыкі ВКЛ Эгідзіюса Банёніса, Г. Харашкевіч сцісла рэзюмавала гісторыю шматгадовай тэрміналагічнай дыскусіі. Яна акрэсліла тры асноўныя пункты гледжання, якія сфарміраваліся на той час і былі прадстаўлены ў працах Станіслава Пташыцкага, П. Кэнэдзі Грымстэд і беларускіх гісторыкаў адпаведна: 1) «Літоўская метрыка» – дзяржаўны архіў ВКЛ; 2) «Літоўская метрыка» – калекцыя дакументаў з матэрыяламі «канцылярыі княства» ў сваёй аснове; 3) «Літоўская метрыка» – архіў канцылярыі вялікага князя літоўскага[2]. Даследчыца не называла сваю пазіцыю, а яшчэ раз падкрэслівала высокую крыніцазнаўчую каштоўнасць гэтага ўнікальнага збору, незалежную ад тэрміналагічных інтэрпрэтацый. Яна толькі палічыла мэтазгодным указаць на асноўны маркер зместу Метрыкі ВКЛ – наяўнасць у яе складзе «кніг копій», створаных у канцы XVI ст. [40, с. 28]. Гэта, аднак, з’яўляецца немалаважным, бо сведчыць аб тым, што ў тагачасных уяўленнях даследчыцы комплекс арыгіналаў актаў да Метрыкі ВКЛ усё ж не адносіўся.

У пазнейшы час тэма дзяржаўнага архіва ВКЛ, метрыцыяны ў цэлым, не знайшла такога водгуку сярод расійскіх даследчыкаў, які прадэманстравала Г. Харашкевіч. Комплекс арыгіналаў трапіў у арбіту іх даследаванняў толькі ў другім дзесяцігоддзі XXI ст. Сама Метрыка ВКЛ разглядалася па-рознаму, але пераважна як архіў велікакняжацкай канцылярыі (Сяргей Жэмайціс). Працягнулася традыцыя выкарыстання тэрміна «сапраўдны акт» (рус. – «подлинник») або «сапраўдны прывілей» (рус. – «подлинный привилей») у значэнні арыгінала акта, выдадзенага ад імя манарха, напрыклад, у дачыненні да т. зв. абласных прывілеяў ВКЛ (Міхаіл Кром, С. Жэмайціс) [15; 20].

Не пазней за 2014 г. расійскі гісторык Андрэй Кузьмін выявіў у складзе фондаў Аддзела рукапісаў Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі ў Маскве (далей – РДБ) дакументы ў арыгінале, што паходзяць са складу архіва ВКЛ [21, с. 111–112]. Гэта былі акты прысягі на вернасць (васальную залежнасць), выдадзеныя каралям польскім і вялікім князям літоўскім ад імя іншых, «удзельных» князёў: акт прысягі князя Сямёна Дзмітрыевіча Друцкага аб прызнанні польскага караля Уладзіслава-Ягайлы сваім гаспадаром у выпадку смерці вялікага князя літоўскага Вітаўта (Бірштаны,

[2] У выпадку з беларускім выданнем 2000 г., верагодна, Г. Харашкевіч мела на ўвазе прадмову да выдання кнігі запісаў № 28 Метрыкі ВКЛ [29]. Аднак блізкая фармулёўка – «архіў канцылярыі Вялікага Княства Літоўскага» – выкарыстоўвалася яшчэ П. Кэнэдзі Грымстэд у 1980-я гг. [47]. У 1996 г. аб Метрыцы ВКЛ («Літоўскай Метрыцы») як аб архіве цэнтральнай або дзяржаўнай канцылярыі ВКЛ пісаў літоўскі гісторык Зігмантас Кяўпа [38]. Аб існаванні такога погляду згадвала раней у 1997 г. і сама Г. Харашкевіч (гл. вышэй).

26 студзеня 1401 г.) і акт прысягі князя Дзмітрыя Фёдаравіча Варатынскага на вернасць польскаму каралю і вялікаму князю літоўскаму Казіміру і трыманні на яго карысць замка Казельск (Вільня, 16(17?) сакавіка 1488 г.) [35; 36]. У перыяд 1837–1865/1866 гг. гэтыя акты ўваходзілі ў склад калекцыі расійскага дзяржаўнага дзеяча, калекцыянера старажытных рукапісаў і дакументаў, выдаўца гістарычных крыніц Паўла Муханава (1797–1871) і былі падараваны Маскоўскаму публічнаму і Румянцаўскаму музею ў 1866 г. [9, с. 209; 26; 31, с. 58]. Паведаміўшы навуковай грамадскасці аб знаходцы, А. Кузьмін фактычна зрабіў іх новае адкрыццё: гэтыя акты раней лічыліся страчанымі[3]. Другі ж з іх – да таго ніколі не публікаваўся і быў вядомы ў навуцы толькі паводле апісанняў [9, с. 208, 224–226; 18, с. 78–79; 19, с. 92; 48, s. 392]. Аднак на той час праблема паходжання вышэйназваных дакументаў у навуцы канчаткова яшчэ не была вырашанай. Уласна сувязь актаў з архівам ВКЛ усведамлялася расійскім даследчыкам, хоць і з пэўнымі асаблівасцямі. Ва ўяўленні А. Кузьміна першы з названых актаў раней захоўваўся ў складзе «Літоўскай Метрыкі». Гэтае сцвярджэнне – неадназначнае, але яно важнае з пункту гледжання тэрміналогіі тэмы, якая разглядаецца. Падобны погляд дэманструе тое, што арыгіналы актаў фактычна атаясамляюцца А. Кузьміным з Метрыкай ВКЛ. Больш за тое – уключаюцца ў яе склад [21, с. 112][4]. Гэта больш адпавядае ўяўленням аб аб’екце, уласцівым расійскай гістарычнай навуцы дарэвалюцыйнага перыяду. Адметна таксама тое, што, характарызуючы альбарутэніку ў Аддзеле рукапісаў РДБ, у дачыненні да арыгіналаў дакументаў А. Кузьмін карыстаецца

[3] Артыкул А. Кузьміна 2016 г. з паведамленнем аб актах грунтуецца на матэрыялах даклада на канферэнцыі «Развіццё адзінай культурнай прасторы Беларусі і Расіі – важнейшы кірунак супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы» (Маладзечна–Мінск, 9–10 кастрычніка 2014 г.). Аб існаванні акта прысягі князя Д. Ф. Варатынскага 1488 г. раней паведамлялі Людвік Калянкоўскі, Ян Якубоўскі і інш. 19 кастрычніка 1987 г. з ім працаваў Э. Банёніс з мэтай, сфармуляванай як «апісанне знешніх атрыбутаў». З 2014 г. на падставе інфармацыі ад А. Кузьміна акт пачаў рыхтаваць да друку Сяргей Палехаў [37]. Незалежна ад расійскіх даследчыкаў сучаснае месцазнаходжанне актаў было ўстаноўлена намі ў лютым 2016 г. у працэсе даследавання тэмы гісторыі і складу комплексу арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва ВКЛ. Тады ж былі атрыманы копіі актаў. 9 лістапада 2016 г. аб знаходцы было паведамлена на круглым стале, прысвечаным памяці першага рэктара БДУ Уладзіміра Пічэты [24]. З арыгіналамі дакументаў у РДБ нам удалося папрацаваць у маі 2017 г. Публікацыя ў навуковым друку са сведчаннямі прыналежнасці актаў да складу комплексу арыгіналаў архіва ВКЛ адбылася ў тым жа годзе [25; 26]. Зборнік «Грани русского Средневековья» і артыкул А. Кузьміна раней былі нам, на жаль, невядомы. Пазнаёміцца з тэкстам артыкула ўдалося толькі ў 2020 г.

[4] Аб гісторыі названага акта гл. падрабязней: [26].

як тэрмінам «сапраўдны акт» (рус. – «подлинник», «подлинные акты», «древнейшие подлинные акты…, написанные полууставом преимущественно на старобелорусском языке на пергамене»), так і тэрмінам «арыгінал» (рус. – «ряд оригинальных исторических документов, написанных в белорусских землях ВКЛ»), абодва – у аднолькавым значэнні: «арыгінал» – супрацьвага копіі (рус. – «не подлинные акты XVI – начала XVII в., а чаще всего выписи или копии актов») [21, с. 111, 113, 116].

Істотны ўнёсак у распрацоўку тэмы ў частцы яе актуалізацыі, пастаноўкі і рэалізацыі асобных задач зрабілі расійскія гісторыкі Сяргей Палехаў і Раман Бяспалаў. У межах уласных даследаванняў гісторыі т. зв. навасільскага княжацкага дому – князёў Адоеўскіх, Бялёўскіх, Варатынскіх – уладальнікаў зямель у Верхняокскім басейне (тэрыторыя сучаснай Расійскай Федэрацыі) – імі быў грунтоўна вывучаны і фактычна рэканструяваны комплекс дагавораў («даканчанняў») 1427–1491 гг., якія адлюстроўваюць стасункі паміж ВКЛ і прадстаўнікамі ўказанага роду, т. зв. літоўска-навасільскіх дагавораў [9]. У межах гэтай дзейнасці імі былі апісаны і ўпершыню апублікаваны некаторыя дакументы са складу комплексу арыгіналаў актаў архіва вялікіх князёў літоўскіх, што дайшлі да нас, у прыватнасці, вышэйзгаданая выяўленая А. Кузьміным (і незалежна ад яго – намі) прысяжная грамата князя Д. Ф. Варатынскага [9, с. 224–226]. У працы, прысвечанай названым дакументам, адносна не выдзяляюць асобнага абазначэння для комплексу арыгіналаў актаў архіва ВКЛ. Аднак яны выразна адрозніваюць яго ад Метрыкі ВКЛ («Літоўскай метрыкі»). Для абазначэння месца захоўвання актаў названага комплексу аўтары выкарыстоўваюць тэрміны «архіў вялікіх князёў літоўскіх», «літоўскі велікакняжацкі архіў», «архіў Вялікага Княства Літоўскага» [9, с. 175–176, 196, 199–200, 206, 207, 208]. Пры гэтым, прынамсі, у першага з названых даследчыкаў назіраецца адначасовае выкарыстанне паняццяў «сапраўдны дакумент» і «арыгінал дакумента» (рус. – «подлинный документ», «оригинал документа») у аднолькавым значэнні, а менавіта – «арыгінал» як супрацьвага паняццю «копія», а не як супрацьвага падробцы. Напрыклад, гэта датычыцца дамоў вялікіх князёў літоўскіх і прадстаўнікоў названых родаў, заключаных у XV ст. – актаў у арыгінале ў супрацьвагу копіям іх тэкстаў у складзе кніг Метрыкі ВКЛ (С. Палехаў) [32, с. 8].

***Тэрміналогія даследчыкаў Украіны*** апошніх дзесяцігоддзяў у адносінах да Метрыкі ВКЛ – неаднолькавая, але пад ёй разумеюць пераважна менавіта кнігі з упісанымі ў іх тэкстамі актаў, што выйшлі з дзяржаўнай канцылярыі або паступілі ў яе. Адзін з самых буйных украінскіх спецыялістаў у галіне Метрыкі ВКЛ, член-карэспандэнт НАН Украіны, доктар гістарычных навук Генадзь Борак, атаясамляе Метрыку ВКЛ (укр. – «Литовська метрика») з «архівам Вялікага Княства Літоўскага»

(укр. – «архів Великого князівства Литовського»). Ён разглядае яе разам з «дзяржаўнымі архівамі» іншых дзяржаўных утварэнняў, напрыклад, «дзяржаўным архівам Галіцка-Валынскага княства». Для абазначэння прыкметы арыгінала акта як супрацьвагі «копіі» даследчык карыстаецца тэрмінам «арыгінал» [8, с. 6, 7].

Адметнае месца ў праблематыцы рэканструкцыі архіваў дзяржаўных утварэнняў Усходняй Еўропы перыяду Сярэднявечча і, у прыватнасці, згаданага Галіцка-Валынскага княства займаюць працы ўкраінскага даследчыка Алега Купчынскага. У 2004 г. ім была выдадзена манаграфія пад назвай «Акти та документи Галицько-Волинського князівства XIII – першої половини XIV століть. Дослідження. Тексти» [23]. У 2006 г. ён падрыхтаваў доктарскую дысертацыю на тую ж тэму, пашырыўшы верхнюю храналагічную мяжу на ўсё XIV стагоддзе [22]. У працах зроблена спроба поўнага збору і публікацыі тэкстаў актаў і дакументаў названага дзяржаўнага ўтварэння ва ўсёй разнастайнасці іх відаў і форм. У дачыненні да абазначанай сукупнасці і тэрыторыі Галіцка-Валынскага княства XIII – першай паловы XIV ст. А. Купчынскі ўжывае такія паняцці, як «архіў», «архівы дзяржаўных і царкоўных устаноў», «княжацкі архіў», нават «дакументальны фонд княства», «княжацкі архіўны фонд», «архіўны фонд галіцка-валынскіх зямель» (гл. ніжэй) [23, с. 35, 211, 213, 215, 228]. Аднак выкарыстанне гэтых абазначэнняў носіць эпізадычны характар і патрабуе пэўнага тлумачэння іх зместу і месца ў навуковай структуры даследавання.

Аб'ект вывучэння ў працы разглядаецца як сукупнасць «актаў і дакументаў», якія выйшлі ад імя галіцка-валынскіх князёў або іншых экспанентаў на тэрыторыі Галіцка-Валынскага княства ў абазначаны перыяд, а больш канкрэтна – сам акт або дакумент як феномен культуры ў названым перыядзе і рэгіёне. Мэту, задачы і вынік сваёй працы А. Купчынскі бачыць у тым, каб *«даць чытачу тэксты актаў і дакументаў Галіцка-Валынскага княства і ўсё, што вядома пра іх сёння, і тым самым – паспрыяць працэсу паглыбленага вывучэння эпохі, а ў ёй – дакумента як феномена свайго часу»*, пры гэтым *«як мага паўней раскрыць інфармацыю пра стан захаванасці актавай і дакументальнай спадчыны Галіцка-Валынскага княства»*, *«аднаўленне як мага больш поўнага яе складу»* [23, с. 3, 5, 6]. Тэрміналагічна аб'ект даследавання ў працы абазначаны наступным чынам: «актавая і дакументальная спадчына Галіцка-Валынскага княства», «дакументальная спадчына як асобны від пісьменнасці Галіцка-Валынскага княства», «рэпертуар актавага і дакументальнага складу XIII – першай паловы XIV ст.», «рэпертуар актавых і дакументальных крыніц» (укр. – «актової та документальної спадщини Галицько-Волинського князівства», «документальна спадщина як окремий вид писемності Галицько-Волинського князівства», «репертуар

актовага і дакументальнага складу XIII– першої половини XIV ст.», «репертуар актових і документальних джерел»).

Варта заўважыць, што мэта даследавання, акрэсленая аўтарам, знаходзіцца ў навуковым полі, найперш, гісторыі як навукі, г. зн. – не архівазнаўства, ці дакладней – не толькі архівазнаўства. Яна носіць выразна крыніцазнаўчы, дыпламатычны, археаграфічны і, часткова, гісторыка-дакументазнаўчы характар. Фактычна гэта не «аднаўленне» таго, што існавала раней, а лагічная мадэль, навуковая канструкцыя, бо з пункту гледжання архівазнаўства як самастойнае, адзінае цэлае, такая сукупнасць ніколі не існавала. У такой сітуацыі ўказаныя мэта і аб'ект даследавання – надзвычай складаныя для навуковай распрацоўкі. Яны характарызуюцца адсутнасцю хаця б прыблізных, але навукова абгрунтаваных звестак аб агульнай колькасці элементаў аб'екта, невыразным уяўленнем аб тым, калі ўказаная сукупнасць можа лічыцца вычарпанай, «адноўленай», а пастаўленая задача – выкананай цалкам. Магчыма таму даследчык не карыстаецца ў сваёй працы тэрмінам «рэканструкцыя» ў значэнні «аднаўленне формы, зместу і іншых уласцівасцей аб'екта, у дадзеным выпадку – пэўнай сукупнасці актаў і дакументаў, якая існавала раней як самастойная і цэласная». Тэрмін «рэканструкцыя» фігуруе ў працы толькі ў значэнні «аднаўленне тэксту страчанага акта або дакумента па іншых гістарычных крыніцах, у тым ліку наратыўных». Такі падыход аўтара блізкі да працы Ежы Ахманьскага, прысвечанай вітальдыяне [59]. Адпаведна, аб'ектам увагі не ёсць уласна і выключна архівы, напрыклад, архівы правячых князёў або дзяржаўных утварэнняў, прыватныя архівы феадалаў ці да т. п. Ён з'яўляецца шырэйшым, умоўным, у пэўным сэнсе – штучным.

Аўтар паспрабаваў, наколькі магчыма, дакладна акрэсліць названую сукупнасць, у тым ліку сродкамі тэрміназнаўства. У прыватнасці функцыю тэрмінаў у працы А. Купчынскага выконваюць паняцці «акт» і «дакумент» паасобку і разам, у форме словазлучэння (укр. – «акти та документи»). Асноватворнае значэнне гэтых элементаў для навуковай канструкцыі тэксту даследавання, відавочна, вымусіла аўтара найлепей канкрэтызаваць іх змест, настолькі, што для іх, бадай, адзіных, былі прапанаваны дэфініцыі. Варта прывесці іх цалкам. Так, пад «актам» з апеляцыяй да «дыпламатычнага сэнсу» трактоўкі аўтар разумее *«любы пісьмовы запіс, які ўказвае на прыватную або афіцыйную (дзяржаўную) дзейнасць агульнаграмадскага значэння; як правіла, такі запіс не засведчаны пячаткай, подпісамі ці іншымі спецыяльнымі знакамі, а яго змест сам па сабе не мае юрыдычнага значэння (запіска, паведамленне, дэпеша, ліст і да т. п.)»* [23, с. 5]. Пад «дакументам» разумеецца *«пісьмовы запіс, які створаны па адпаведнай форме, характэрнай для сваёй эпохі і месца выдачы, засведчаны і зацвярджае ці ўстанаўлівае*

*пэўны прававы стан або служыць таксама для выканання тых або іншых дзеянняў або ўпаўнаважанняў»* [23, с. 5]. Пры гэтым аўтар дэкларуе папярэдні характар і ўмоўнасць прапанаваных фармулёвак у сувязі з незавершанасцю дыскусіі па ім у навуцы.

У межах тэрміналогіі даследчыка прыкмета арыгінала акта або дакумента перадаецца праз паняцце «арыгінал», «арыгінальныя акты і дакументы» (укр. – «оригінал», «оригінальних актів і документів»). Супрацьвагай яму выступае «спіс-копія» (укр. – «спис-копія», «список-копія»). Аўтар адрознівае паняцце «арыгінал» ад паняцця «сапраўдны акт» або «аўтэнтык» (укр. – «автентичні акти та документи», «достовірні документи»). Гэтыя апошнія выступаюць супрацьвагай дакументам-падробкам. Такі падыход дазваляе, напрыклад, аддзяляць сапраўдныя, аўтэнтычныя арыгіналы і копіі ад падробленых, неаўтэнтычных арыгіналаў ці копій-фальсіфікатаў (укр. – «автентичні акти та документи, які збереглися в оригіналах і списках з оригіналів», «оригінальні та копійні автентичні акти та документи», «неавтентичні акти та документи і їх списки», «фальсифікати») [22, с. 9, 10; 23, с. 4, 5, 6, 36]. Варта таксама адзначыць, што ад арыгіналаў (і копій ?) актаў і дакументаў даследчык адрознівае «акты і дакументы, рэканструяваныя з наратыўных крыніц» (укр. – «актів і документів, реконструйованих із наративних джерел»).

Асобна абазначаюцца віды «актаў і дакументаў», што А. Купчынскі адносіць да элементаў, на аснове якіх ім і ствараецца («аднаўляецца») названы рэпертуар актаў і дакументаў Галіцка-Валынскага княства XIII – першай паловы XIV ст. У ім адрозніваюцца першасныя і другасныя формы, якія могуць абазначацца таксама як «асобна ўзятыя акты і дакументы» і «рэканструкцыі актаў і дакументаў з летапісаў і іншых помнікаў» адпаведна:

1) першасныя формы:

1.1) арыгіналы;

1.2) спісы-копіі з арыгіналаў;

2) другасныя формы:

2.1) тэксты ў складзе пазнейшых пацвярджальных грамат (укр. – «в складі пізніших підтвердних грамот»);

2.2) запісы ў кнігах адміністрацыйна-судовых устаноў (укр. – «в різних записах в книгах адміністративно-судових установ»);

2.3) разнастайныя паводле зместу і формы даступныя на цяперашні час урыўкі, цытаты актаў і дакументаў з названай сукупнасці ў іншых гістарычных крыніцах, да якіх даследчык адносіць летапісы, летапісцы, палемічныя творы, богаслужэбная літаратура, «дакументы розных дзяржаўных, царкоўных і царкоўна-карпаратыўных інстытуцый, а таксама прыватных асоб, якія згадваюць і цытуюць акты і дакументы Галіцка-Валынскага княства», даследчыцкія працы XV–XIX стст. па

гісторыі дзяржавы, асобных яе інстытуцый, гісторыі царквы, гісторыі асобных населеных пунктаў; публікацыі дакументаў і інш. (укр. – «найрізноманітнішні за змістом і формою нині доступні уривки та цитати джерел»);

2.4) згадкі актаў і дакументаў з названай сукупнасці ў тагачасных або пазнейшых гістарычных крыніцах (укр. – «найрізноманітнішні за змістом і формою нині доступні уривки та цитати джерел, включно до найдрібніших згадок»; «згадки про акти та документи Галицько-Волинського князівства XIII – першої половини XIV ст. у тогочасних і пізніших документальних пам'ятках»);

2.5) канцылярскія запісы і рэгесты актаў і дакументаў (укр. – «канцелярські записи і регести»);

2.6) часовыя, пратакольныя запісы – «дыктаты» або «мінуты» (укр. – «протокольні диктати чи т. зв. мінути») [23, с. 5, 6, 35–36].

У выпадку з дзвюма апошнімі пазіцыямі даследчык апелюе да досведу іншых даследчыкаў падобнай праблематыкі, у прыватнасці, Людмілы Марасінавай і Ежы Ахманьскага [27; 59][5]. Уключэнне ў поле даследавання другасных форм тлумачыцца слабай захаванасцю актавай і дакументальнай спадчыны Галіцка-Валынскага княства XIII – першай паловы XIV ст., з якой да цяперашняга часу дайшлі пераважна толькі рэшткі.

Адносна тэрміналогіі даследчыка варта дадаць таксама наступныя назіранні. Фактам застаецца тое, што як мінімум галіцка-валынскія князі стваралі акты і дакументы і мусілі зберагаць іх не ў адным пакаленні. А. Купчынскі ў сваёй працы карыстаецца тэрмінам «архіў» у дачыненні да абранага перыяду і канстатуе існаванне ў перыяд XIII – першай палове XIV ст. на тэрыторыі Галіцка-Валынскага княства «княжацкага архіва», «архіваў дзяржаўных і царкоўных устаноў». Ён нават дае ацэнку ступені зберажэння прадмета захоўвання – называе страты дакументаў канцылярыямі і архівамі адной з найважнейшых прычын цяперашняй сітуацыі з невялікай колькасцю рукапісных помнікаў таго часу [23, с. 35, 211]. Больш за тое, згадваецца пра «дакументальны фонд княства», «княжацкі архіўны фонд», «архіўны фонд галіцка-валынскіх земель» і нават сцвярджаецца аб тэарэтычнай магчымасці іх узнаўлення [23, с. 213, 215, 228]. Аднак, як адзначалася, нягледзячы на маштабнасць мэты даследавання, аўтар не ставіць асобнай задачы аднаўлення цэласнасці архіваў

[5] У працы Л. Марасінавай, апрача сапраўдных актаў-арыгіналаў (рус. – «подлинник») і копій грамат па гісторыі Пскоўшчыны, вылучаны т. зв. пераказ (рус. – «пересказ») – не зусім дакладнае паўтарэнне тэксту граматы, зробленае на падставе яе арыгінала або копіі, часам з мадэрнізацыяй зместу, з пазбаўленнем ад архаізмаў, характэрнае для канцылярскай практыкі пісараў XVII ст. [27, с. 34, 71]. А. Купчынскі гэты тэрмін не ўжывае.

Галіцка-Валынскага княства як аднаго з магчымых сегментаў усёй дакументальнай спадчыны гэтай сярэднявечнай дзяржавы. Гэта магчыма зразумець з улікам параўнальна ранняга перыяду для самой з'явы архіўнага захоўвання на абазначаных землях, нізкай ступенню распрацаванасці гісторыі архіваў гэтага перыяду і мізэрнай колькасцю арыгіналаў актаў і дакументаў, што дайшлі да нашага часу. Аднак яны ўжываюцца ў дачыненні да гісторыі больш позніх перыядаў і не выступаюць аб'ектам рэканструкцыі. Уключэнне ў прадмет вывучэння хаця б на ўзроўні гіпотэзы такой катэгорыі, як архівы галіцка-валынскіх князёў, адлюстраванне іх у фармулёўках задач даследавання, у базе крыніц стварыла б адзін з трывалых апорных пунктаў усяго даследавання. Цікава, што ў крыніцазнаўча-гістарыяграфічнай частцы прадмовы да працы аўтар усё ж згадвае аб працэсах упарадкавання актаў і дакументаў, што знаходзіліся на захаванні рэлігійных установ на ўкраінскіх землях у другой палове XVIII ст. Ён называе такія выніковыя формы апрацоўкі матэрыялаў, як «сумарыі», «вопісы», «інвентары». Аднак яны не выступаюць як элементы архіўнай структуры, а разглядаюцца, хутчэй, як доказная база маёмасна-прававых спрэчак царквы або гістарычная крыніца – паводле сцвярджэння аўтара, на аснове іх фарміраваліся зборнікі дакументаў і «дыпламатарыі», летапісцы [23, с. 8–9, 10–11]. Тым не менш, пры пераліку і характарыстыцы крыніц, якія могуць даць інфармацыю аб актах і дакументах Галіцка-Валынскага княства, А. Купчынскі не ўказвае падобныя і іншыя ўліковыя дакументы архіваў як асобны від (гл. вышэй). Гэтая акалічнасць яшчэ раз дэманструе спецыфіку гісторыка-крыніцазнаўчага падыходу ў параўнанні з даследаваннямі архівазнаўчымі, прысвечанымі рэканструкцыі ўласна архіваў, дзе ўліковая і даведачная дакументацыя апошніх выступае найважнейшай крыніцай, іх вобразам, асновай т. зв. «ідэальнага вопісу», базай для ўзнаўлення структуры і складу ў лагічнай форме – навуковым грунтам для ўсяго даследавання.

У «Енциклопедії історії України» Андрэй Блануца і Дзмітрый Вашчук указваюць на форму Метрыкі ВКЛ як на комплекс розных матэрыялаў, аб'яднаных у выглядзе сшыткаў або кніг. У іх разуменні Метрыка ВКЛ – гэта «архіў канцылярыі ВКЛ», «асноўная складовая частка велікакняжацкага, а пазней – галоўнага дзяржаўнага архіва ВКЛ» [7]. Апошні з поглядаў дапускае існаванне іншых частак названых архіваў. На жаль, аўтары спецыяльна не патлумачылі, чым яны з'яўляліся. Разам з тым, названымі гісторыкамі на энцыклапедычным узроўні замацаваны падыход, згодна з якім «арыгіналы актаў» уключаюцца ў склад метрыкі. Яны наўпрост адзначаюць, што *«Літоўская метрыка змяшчае шмат разнастайных арыгінальных актаў»* [7, с. 179]. Сярод іх відаў названы «знешнепалітычныя дамовы», «саслоўныя прывілеі», «агульназемскія акты» (значэнне відаў не раскрываецца). У аснове гэтага сцвярджэння

выступае, відавочна, вопіс 1570–1584 гг. са складу кніг запісаў №№ 1 і 2 Метрыкі ВКЛ [7, с. 179][6]. Прыкмету арыгінала акта яны перадавалі праз тэрмін «арыгінальны акт», «арыгінал дакумента» (укр. – «оригінальних актів», «оригінали документів»), прыкмету агульнадзяржаўнага значэння – праз пералік відаў дакументаў комплексу – «знешнепалітычныя дамовы», «саслоўныя прывілеі», «агульназемскія акты».

У 2012 г. Д. Вашчук паўтарыў погляд на «Літоўскую Метрыку або Метрыку ВКЛ» як на «архіў канцылярыі ВКЛ» [10].

***Тэрміналогія тэмы ў гістарычнай навуцы Літоўскай Рэспублікі.*** Важны ўплыў на гістарыяграфію тэмы дзяржаўнага архіва ВКЛ перыяду незалежнай Літоўскай Рэспублікі аказаў знакаміты метрыцыяніст Эгідзіюс Банёніс. Асноўныя палажэнні яго поглядаў сфарміраваліся яшчэ ў познесавецкі час і ўжо былі разгледжаны ў межах аналізу папярэдняга перыяду гістарыяграфіі [50]. Ва ўмовах узнаўлення незалежнасці Літвы яго даследаванні набывалі значэнне больш шырокае, чым выключна навуковае. Аднак калі казаць аб ідэях адносна комплексу арыгіналаў актаў архіва ВКЛ, сфармуляваных у 1990 г. і выкладзеных у дакладзе «Літоўская метрыка і Архіў Вялікага Княства Літоўскага», то, на жаль, немагчыма заўважыць слядоў іх істотнага развіцця, а тым больш, рэалізацыі ідэі рэканструкцыі названага комплексу [5]. Акцэнт аказаўся змешчаны на метрыцыяну, дзе гісторыкі і навуковыя ўстановы Літвы сапраўды сталі лідарамі. У сувязі з гэтым пытанне тэрміналогіі ў адносінах да комплексу арыгіналаў актаў аўтар дадзенага артыкула вымушаны разглядаць як і ў ранейшых сваіх працах – неадрыўна ад гістарыяграфіі Метрыкі ВКЛ.

У адрозненне ад поглядаў на акты ў арыгінале як уласна на архіў ВКЛ, сцвярджэнні Э. Банёніса адносна характэрных рыс Метрыкі ВКЛ былі ў асноўным прыняты ў літоўскай гістарыяграфіі. Пераважна яны адпавядаюць навуковым палажэнням, выкладзеным ва «Уводзінах» да кнігі-копіі № 5 запісаў Метрыкі ВКЛ (1993 г.) [6], хоць часам іх трансляцыя – не зусім уважлівая і паслядоўная. Фіксуюцца і іншыя погляды на статус Метрыкі ВКЛ у кантэксце паняцця «архіў дзяржавы», «дзяржаўны архіў».

З. Кяўпа ў 1996 г. пісаў: *«Літоўская Метрыка» – «архіў цэнтральнай / дзяржаўнай канцылярыі Вялікага Княства Літоўскага»* [38]. Пазней гэты пункт гледжання будзе ўспрыняты ў беларускай гістарыяграфіі.

У 1998 г. аўтары прадмовы да кнігі запісаў № 1 Метрыкі ВКЛ Альгірдас Балюліс і Рамуальдас Фірковічус трактавалі «акты агульнадзяржаўнага значэння» ВКЛ («документы общегосударственного значения»), зафіксаваныя ў вопісе 1570–1584 гг., як «арыгіналы» актаў, што «зна-

[6] Вопіс 1570–1584 гг. гл.: [30; 51].

ходзіліся ў канцылярыі Вялікага Княства Літоўскага», некаторыя з якіх не былі забраны адрасатамі [51, р. 17, 18][7]. Аўтары пры гэтым спасылаліся на частку I даведніка да фондаў Галоўнага архіва старажытных актаў Польшчы (далей – AGAD) пад назвай «Archiwum Główne akt dawnych w Warszawie. Przewodnik po zespołach» рэдакцыі 1958 г., у прыватнасці, на тэкст раздзела «Дакументальны архіў Вялікага Княства Літоўскага» (пол. – «Archiwum dokumentowe Wielkiego Księstwa Litewskiego»). Аўтарам яго тэксту выступала Ірэна Сулкоўска (Сулкоўска-Курасёва). Аднак, як вядома, у пазнейшым выданні тэксту даведніка, зробленым у 1975 г., гэтая крыніца названа «вопісам велікакняжацкага архіва». Тая ж аўтарка лакалізоўвала месцазнаходжанне актаў не ў канцылярыі ВКЛ, а на Ніжнім замку ў Вільні разам з «велікакняжацкай скарбніцай» (земскім скарбам ВКЛ). Паводле меркавання І. Сулкоўскай-Курасёвай, на момант стварэння згаданага вопісу 15 названых у ім «агульнадзяржаўных» актаў захоўваліся ўласна ў «велікакняжацкім архіве». У канцылярыі ж ВКЛ маглі знаходзіцца іншыя акты агульнадзяржаўнага значэння, неахопленыя гэтым вопісам [57, s. 49].

Артурас Дубоніс тэрміну «Літоўская метрыка» даваў наступнае азначэнне: *«Літоўская метрыка – архіў важнейшых дакументаў Вялікага Княства Літоўскага, які складаўся ў асноўным з кніг копій, знятых з выходных і ўваходных дакументаў за час функцыянавання канцылярыі вялікага князя літоўскага з канца XIV – да канца XVIII ст.»* [13, с. 454]. Гісторык называў яе па стане на канец XVIII ст. *«галоўным архівам Вялікага княства Літоўскага»*. Адначасова ім ужываецца назва «велікакняжацкі архіў ВКЛ» як месца захоўвання кніг Метрыкі ВКЛ (у адносінах да прыналежнасці кнігі Метрыкі ВКЛ 1542 г. са складу аддзела рукапісаў Акадэміі навук Літвы) [12, с. 25]. Адносна прыкмет «арыгінал» і «агульнадзяржаўнае значэнне акта» і звязаных з імі паняццяў даследчык ужывае наступныя абазначэнні. У 2003 г. у комплексным артыкуле, прысвечаным Метрыцы ВКЛ, гэтыя прыкметы А. Дубоніс перадае праз тэрміны «арыгіналы дзяржаўных дакументаў», «найважнейшыя дзяржаўныя прывілеі», «важнейшыя дзяржаўныя прывілеі і дакументы» (у кантэксце пытання аб прывілеі Жыгімонта Аўгуста Мікалаю Радзівілу «Чорнаму» ад 3 лістапада 1551 г.) [14, с. 20, 21]. У 2008 г.: «арыгінальныя дакументы», «аўтэнтычныя акты і дакументы» (літ. – «originaliųjų dokumentų», «autentiškų aktų ir dokumentų»). Тэрмін «аўтэнтык» (літ. – «autentiškų aktų ir dokumentų»), відавочна, ужываецца тут у супрацьвагу тэрміну «падробка» або «фальсіфікат», «несапраўдны (неаўтэнтычны) акт» (літ. – «neautentiški», «falsifikatai»). Адваротнае ж «арыгіналу» –

---

[7] Крытычныя заўвагі А. І. Грушы адносна тлумачэння выдаўцамі прычын «знаходжання актаў у канцылярыі» гл.: [11, с. 424].

«копіі існуючых актаў і дакументаў» (літ. – «užuominų apie egzistavusius aktus i dokumentų») [46]. Разам з тым, гэты прыклад ужывання азначанай тэрміналогіі варта разглядаць з улікам таго, што яна змешчана ў рэцэнзіі на працу ўкраінскага даследчыка А. Купчынскага, прысвечаную рэканструкцыі складу «актаў і дакументаў Галіцка-Валынскага княства» XIII–XIV стст. Гэта значыць, яна з'яўляецца фактычна прамым перакладам тэрміналогіі ўкраінскага аўтара (гл. вышэй).

Шэраг даследчыкаў, чые працы ў той або іншай ступені былі прысвечаны Метрыцы ВКЛ, разглядае апошнюю як «дзяржаўны архіў ВКЛ», не згадваючы аб іншых яго частках, апрача т. зв. кніг Метрыкі ВКЛ. Аднак яны, пераважна, датычацца перыяду XVIII ст., другой яго паловы ў гісторыі гэтага аб'екта. Так, Рамунэ Шмігельскіце-Стукене ў межах даследавання гісторыі перамяшчэнняў Метрыкі ВКЛ у 1792–1795 гг. называла апошнюю «дзяржаўным архівам», «Літоўскім архівам». Адначасова яна карыстаецца і абазначэннем «Архіў Літоўскай Метрыкі». Радзівілаўскую частку комплексу арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва ВКЛ яна прадстаўляе толькі як «дакументы з архіва ў Нясвіжы», маючы пры гэтым звесткі з крыніц і, адпаведна, уяўленне аб змесце і форме гэтых дакументаў [43; 56]. Інга Іларэне «архівам ВКЛ» называе менавіта Метрыку ВКЛ. Такі змест яна бачыць у назве сховішча, з якога паходзілі апублікаваныя Мацеем Догелем акты па гісторыі Інфлянтаў (Лівоніі) у 1759 г. у томе V яго працы «Codex diplomaticus…» [45]. Гэтая назва – «Архіў Вялікага Княства Літоўскага» («…Ex Archivo Magni Ducatus Litvaniae») [16, с. 34, 40]. З тэксту артыкула, аднак, вынікае, што даследчыца дапускае магчымасць захоўвання ў тым жа архіве – «архіве ВКЛ» – і арыгіналаў актаў [16, с. 34]. Паняцце «дзяржаўны архіў ВКЛ» даследчыца ўжывае таксама ў сувязі з Метрыкай ВКЛ [17, с. 31]. Для абазначэння прыкмет агульнадзяржаўнага значэння і арыгінала акта яна ўжывае паняцці «публічны акт» і «арыгінал» адпаведна [16].

Іншыя літоўскія даследчыкі бачаць у Метрыцы ВКЛ архіў канцылярыі манарха або дзяржавы ў цэлым, але з рысамі, шырэйшымі за «ведамасны архіў». Паводле Ірэны Валіканіце, Літоўская Метрыка – архіў канцылярыі ВКЛ – цэнтральнай канцылярыі дзяржавы [58].

Адметнае месца ў праблематыцы архіваў перыяду ВКЛ займаюць працы Раймонды Рагаўскене. Напрыклад, для яе прыведзеная вышэй трактоўка Метрыкі ВКЛ як архіва канцылярыі манарха дапускае пашырэнне і да «дзяржаўнага архіва ВКЛ», але пры гэтым не абмяжоўваецца выключна кнігамі ўласна Метрыкі. Так, яна трактуе Метрыку ВКЛ як «архіў канцылярыі Вялікага Княства Літоўскага». Пры гэтым у адносінах да яе выкарыстоўваецца і словазлучэнне «дзяржаўны архіў», «галоўны архіў». Склад Метрыкі ВКЛ характарызуецца як «кнігі-копіі галоўнага архіва Літвы». Адначасова змест паняццяў «дзяржаўны архіў

ВКЛ», «архіў ВКЛ» для Р. Рагаўскене ўключае ўсю сукупнасць дакументаў розных форм і відаў, якія мелі дзяржаўнае значэнне, адносіліся да кампетэнцыі канцлераў і маглі захоўвацца ў земскім скарбе ВКЛ, а гэта – і кнігі Метрыкі ВКЛ, і арыгіналы актаў [33; 34; 54]. «Архівам Літоўскай дзяржавы», «дзяржаўным архівам ВКЛ», «цэнтральным архівам ВКЛ» Р. Рагаўскене называе таксама дакументы, акрэсленыя ў сфальсіфікаваным прывілеі Жыгімонта Аўгуста Мікалаю Радзівілу «Чорнаму» ад 3 лістапада 1551 г. Як вядома, тэкст дакумента апісвае ўласна акты комплексу арыгіналаў архіва ВКЛ – самую раннюю яго частку, якую з другой паловы XVII ст. захоўвалі Радзівілы [49, s. XXII]. Пры гэтым прыкмету агульнадзяржаўнага значэння даследчыца перадае праз словазлучэнні «публічныя дакументы ВКЛ», «дакументы дзяржаўна-прававога характару», але часцей – «дзяржаўныя дакументы», «дакументы дзяржаўнага значэння». Сярод іх відаў ёй пералічваюцца, напрыклад, «прывілеі ўладароў XV–XVI стст.» і «дыпламатычныя дакументы». Пры гэтым такія ж характарыстыкі могуць прымяняцца як да арыгіналаў актаў, так і да дакументаў у кнігах Метрыкі ВКЛ. Назва «дакументы дзяржаўнага значэння» ў Р. Рагаўскене ўжываецца і ў кантэксце лёсу дакументаў маёмасна-прававога характару, якія адносіліся да даменіяльных уладанняў манарха і захоўваліся ў скарбе дзяржавы (пераважна – акты, якія датычыліся ўладанняў Гаштольдаў). Прыкмету арыгінала акта даследчыца перадае праз тэрмін «арыгінал».

Асобнага разгляду вартая манаграфія Р. Рагаўскене «Згубленыя ў гісторыі: прыватныя архівы шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў XVI ст.» [53]. Яна абагульняе вынікі вывучэння гісторыкам архіваў баяраў-шляхты ВКЛ XVI ст. Пытанне дзяржаўнага архіва ВКЛ даследчыца закранала ў кантэксце ўзаемадачыненняў нобіляў ВКЛ і іх прыватных архіваў з грамадствам і дзяржавай [53, p. 169–174]. У сувязі з месцам захоўвання актаў агульнадзяржаўнага значэння яна прымяняе назву «архіў ВКЛ» (літ. – «Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės archyvo», «LDK archyvo») [53, p. 172]. Да яго прымяняецца таксама абазначэнне «Літоўскі дзяржаўны архіў», «дзяржаўны архіў Літвы» (літ. – «Lietuvos valstybės archyvą») [53, p. 174]. Адначасова яна сцвярджае, што само паняцце «архіў» у XVI ст. у ВКЛ не выкарыстоўвалася, і яго ўжыванне да сярэдзіны XVII ст. прызнае ўмоўным [53, p. 22]. Паводле яе меркавання, ва ўяўленнях шляхты і кіраўніцтва ВКЛ законным фізічным сховішчам названага збору дакументаў быў скарб або скарбніца дзяржавы ў Вільні (літ. – «LDK iždе», «LDK iždinę», «iždo Vilniuje»). Гэта фіксуюць крыніцы 1560-х і 1630-х гг. [53, p. 171, 172, 174]. Дакументы агульнадзяржаўнага значэння яна абазначае як «публічныя дакументы Вялікага княства Літоўскага», «дакументы публічнага характару», «публічныя дакументы», «дзяржаўныя дакументы» (літ. – «viešuosius Lietuvos Didžiosios

Kunigaikštystės dokumentus», «viešojo pobūdžio dokumentai», «viešuosius dokumentus», «valstybės dokumentų»). Сярод іх выдзяляюцца: 1) агульнадаступныя дакументы публічнага характару, выдадзеныя ўсёй шляхце ВКЛ або яе групам (літ. – «bendresnio pobūdžio viešieji dokumentai, išduoti visai LDK bajorijai ar jos grupėms»); 2) дакументы, якія траплялі ў прыватныя калекцыі ў працэсе выканання службовых абавязкаў (літ. – «dėl einamų pareigų ar padėties valstybėje į privačius rinkinius patekę dokumentai») [53, p. 169–170]. У дачыненні да «публічных дакументаў», звязаных з міждзяржаўнымі стасункамі, прымяняецца абазначэнне «знешнепалітычны акт» (літ. – «užsienio politinius aktus») [53, p 73]. Адметна, што пры разглядзе ролі роду Радзівілаў у гісторыі архіва ВКЛ яна выкарыстоўвае найменне, якое ўмоўна абазначае службовую асобу, што выконвае функцыю па захаванні дакументаў гэтага збору – «архівісты вялікага княства» (літ. – «Didžiosios Kunigaikštystės archyvarais») [53, p. 174].

Вялікі ўнёсак у распрацоўку праблемы гісторыі архіва ВКЛ зрабіў літоўскі даследчык Дарыус Антанавічус. Менавіта яму належыць актуалізацыя ў навуцы знаходкі рэестра дзяржаўных актаў ВКЛ ад 26 лістапада 1623 г., выяўленага Вальдэмарам Мікульскім у 1997 г. і публікацыя часткі крыніцы, якая ахоплівае кнігі Метрыкі ВКЛ [1; 44]. Як і некаторыя іншыя літоўскія даследчыкі праблем метрыцыяны, ён называе Метрыку ВКЛ (Літоўскую Метрыку) – архівам канцылярыі ВКЛ [2, с. 20]. Вопіс 1570–1584 гг. ён трактуе як вопіс асобных арыгінальных дакументаў, якія захоўваліся разам з кнігамі Метрыкі ВКЛ. Прыкмету арыгінала даследчык перадае праз паняцце «арыгінал» [4, с. 139; 52, p. IX–X]. Само сховішча дакументаў у земскім скарбе ВКЛ у Вільні па стане на канец першай чвэрці XVII ст., дзе, як вядома, знаходзіўся комплекс арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння, называе «архівам скарбу ВКЛ у Вільнюскім ніжнім замку». Даследчык канстатуе факт захоўвання там і «арыгінальных кніг Метрыкі ВКЛ», што значыць, т. зв. старой Метрыкі ВКЛ [4, с. 148]. Такім жа чынам гэтае сховішча ён абазначае і па стане на жнівень 1655 г. – час захопу Вільні войскамі Рускай дзяржавы – «архіў скарбу ВКЛ» (рус. – «архив скарба ВКЛ») [3, с. 34]. Пераказваючы польскага даследчыка В. Мікульскага, ён называе комплекс арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння, ахопленых рэестрам ад 26 лістапада 1623 г. (паводле В. Мікульскага, «Архіў ВКЛ», «дзяржаўныя дакументы Архіва ВКЛ пераважна ў арыгіналах» і да т. п.), наступным чынам: «дакументы ВКЛ дзяржаўнай важнасці / значэння»; «дакументы дзяржаўнай важнасці / значэння»; «рэестр дакументаў дзяржаўнай важнасці / значэння» (літ. – «valstybinės svarbos dokumentai»). Сховішча ў земскім скарбе – «памяшканне земскага скарбу ВКЛ у Віленскім ніжнім замку» [1; 44, p. 158–160].

Вялікае значэнне ў межах абранай тэмы мае распачатая Літоўскай Рэспублікай і яе навуковымі ўстановамі праграма публікацыі найважнейшых міждзяржаўных пагадненняў ВКЛ, дакументаў дыпламатычнага характару за ўвесь перыяд існавання княства. З улікам гістарычнай сувязі гэтага віду актаў з дзяржаўным архівам гэтую серыю непасрэдна магчыма аднесці да гістарыяграфіі праблемы архіва ВКЛ. Разам з тым, праграма не прадугледжвае задачы рэканструкцыі дзяржаўнага архіва ВКЛ, для якога міжнародныя дамовы з'яўляліся адной з найважнейшых частак, найбольш адметным, асноватворным яго элементам. У выданнях серыі абраныя дакументы не разглядаюцца як узаемазвязаныя часткі пэўнага комплексу. Архівазнаўчым аспектам, правененцыі названых актаў, іх архіўнаму лёсу надаецца незаслужана мала ўвагі. Апрача звестак аб сучасных месцах захоўвання арыгіналаў і копій актаў, гісторыі іх ранейшай археаграфічнай апрацоўкі, даследаванні серыі дэманструюць пераважна толькі наяўнасць звестак аб гістарычным значэнні саміх дакументаў, што, без сумнення, таксама надзвычай важна, хаця б з пункту гледжання раскрыцця гісторыка-культурнай каштоўнасці гэтай часткі комплексу арыгіналаў архіва ВКЛ. У якасці прыкладу магчыма прывесці выкананую ў межах названай праграмы грунтоўную з усіх пунктаў гледжання публікацыю літоўскага даследчыка Марыуса Сірутавічуса «Дамовы Вялікага Княства Літоўскага і Маскоўскай дзяржавы 1449–1556 гг.: публікацыя крыніц», якая выйшла ў 2016 г. [55]. Гэта – зборнік пагадненняў аб міры і перамір'і, якія заключаліся паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай у перыяд 1449–1556 гг. У кнізе змешчаны 23 акты, у тым ліку тыя, што фігуруюць у рэестрах архіва ВКЛ. У кнізе фактычна адсутнічае агульны разгляд гісторыі захоўвання пагадненняў, за выключэннем адзінкавых выпадкаў (М. Сірутавічус згадвае аб сувязі Радзівілаў і перамірнага акта 1556 г. з фондаў Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі) [55, p. 46].

Такім чынам, у гістарыяграфіі Расіі, Украіны, Літвы і іншых краін постсавецкай прасторы праблема комплексу арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння не стала аб'ектам спецыяльнага аналізу. Выключэннем стала даследаванне літоўскага даследчыка Э. Банёніса, якое з'явілася на самым рубяжы з папярэднім перыядам і дэманстравала сабой новы час і новыя тэндэнцыі ў вывучэнні аб'екта. Грунтоўных навукова-тэрміналагічных распрацовак у дачыненні да назвы комплексу не выяўлена, а яго абазначэнне ў навуцы не было канчаткова аформлена. Тым не менш, дакументы комплексу часцей пачалі выклікаць увагу даследчыкаў, асэнсоўвацца імі асобна ад іншых масіваў, у прыватнасці – Метрыкі ВКЛ. У параўнанні з савецкім перыядам у гістарыяграфіі тэмы часцей ужываецца яго пазіцыянаванне як часткі «архіва ВКЛ», «дзяржаўнага архіва». Аднак трактоўкі аб'екта як часткі Метрыкі ВКЛ у гэты

перыяд усё яшчэ маюць месца. На цяперашні час па-ранейшаму назіраецца адсутнасць адзінага падыходу да абазначэння ўказанага комплексу. Характэрнай рысай расійскай гістарыяграфіі з'яўляецца працяг традыцыі выкарыстання паняцця «сапраўдны дакумент» (рус. – «подлинник») у значэнні «арыгінал». Ва ўкраінскай і літоўскай гістарыяграфіі ўжываецца пераважна паняцце «арыгінал».

У літоўскай гістарычнай навуцы фіксуецца параўнальна болей распрацовак у праблематыцы гісторыі Метрыкі ВКЛ, гаспадарскай канцылярыі, архівазнаўства названага перыяду. Аднак і тут спецыяльнай адзінай тэрміналогіі ў адносінах да комплексу арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва ВКЛ пакуль не склалася. І гэта нягледзячы на «другое адкрыццё» адной з найважнейшых крыніц па гісторыі і складзе архіва ВКЛ – рэестра ад 26 лістапада 1623 г. (Д. Антанавічус). Ён амаль не разглядаецца і як асобны, цэласны аб'ект, самастойны ў архівазнаўчым сэнсе. Комплекс пераважна выступае як слабаакрэсленае, дастаткова разрозненае мноства актаў з размытымі храналагічнымі межамі. Пры неабходнасці абазначэння гэтых дакументаў пераважна акцэнтуецца ўвага на дзвюх асноўных характарыстыках – арыгіналы актаў і агульнадзяржаўнае значэнне іх зместу: «дзяржаўныя дакументы», «дакументы дзяржаўнага / агульнадзяржаўнага значэння, дакументы агульнадзяржаўнай важнасці ВКЛ», «публічныя дакументы ВКЛ», «дакументы дзяржаўна-прававога характару» і інш. Яны размяшчаюцца даследчыкамі ў канцылярыі ВКЛ (1570–1584 гг.), у пазнейшы перыяд (1623–1655 гг.) – у архіве / памяшканні скарбу ВКЛ у будынку Ніжняга замка ў Вільні. Для абазначэння другой з ключавых іх прыкмет ужываецца паняцце «арыгінал». Роля дзяржаўнага архіва ВКЛ літоўскімі даследчыкамі адводзіцца пераважна Метрыцы ВКЛ. Пры гэтым сама яе трактоўка ў гістарыяграфіі – розная: гэта і «архіў (цэнтральнай, дзяржаўнай) канцылярыі ВКЛ», і «дзяржаўны архіў ВКЛ», і «цэнтральны / галоўны архіў ВКЛ». Некаторым выключэннем выступаюць працы Р. Рагаўскене, у якой сустракаецца трактоўка комплексу арыгіналаў як часткі «дзяржаўнага архіва ВКЛ», «Архіва ВКЛ» (варыянты – «Архіў Літоўскай Дзяржавы», «Літоўскі дзяржаўны архіў», «дзяржаўны архіў Літвы», «цэнтральны архіў ВКЛ») на роўні з Метрыкай ВКЛ і іншымі групамі дакументаў. Хоць само паняцце «архіў» у дачыненні да аб'екта даследавання перыяду раней за першую трэць ці нават першую палову XVII ст. для ВКЛ яна прызнае ўмоўным, бо ён не ўжываўся. За афіцыйнае, законнае месца захоўвання дакументаў дзяржавы Р. Рагаўскене прымае скарб ці скарбніцу ВКЛ у Віленскім замку, але яна не ўключае гэта як тэрмінаэлемент у назву «Архіў ВКЛ» ці ў яе цытаваныя вышэй варыянты. Падаецца, што ва ўяўленні даследчыцы «Архіў ВКЛ» у XVI ст. і сярэдзіне XVII ст. гэта хутчэй збор дакументаў, інстытуцыя-

нальна звязаны з канцылярыяй вялікіх князёў літоўскіх, месцам фізічнага знаходжання якога ёсць земскі скарб ВКЛ.

Магчыма таксама канстатаваць, што сфармуляваны ў 1990 г. найбуйнейшым літоўскім метрыцыяністам Э. Банёнісам погляд на комплекс арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння як на архіў Вялікага Княства Літоўскага, яго самастойнасць адносна Метрыкі ВКЛ, заклік даследчыка да ўсебаковага і глыбокага вывучэння гэтай праблемы пакуль не атрымаў належнай падтрымкі і развіцця ў яго роднай краіне.

## Крыніцы і літаратура


1. Антанавичюс, Д. Найден реестр оригинальных книг Литовской Метрики XVI в.! // Новости Литовской Метрики. – № 12. – 2010). – Vilnius : LII Leidykla, 2011. – С. 18–25.
2. Антанавичюс, Д. Аннотация на издание: “Выписка из посольских книг” о сношениях Российского государства с Польско-Литовским за 1547 [!]–1572 гг. Подг. к печ. Б. Н. Морозов, под ред. С. О. Шмидта, Москва–Варшава, 1997, 330 с. (Памятники истории Восточной Европы. Источники XV–XVII вв. = Monumenta historica res gestas Europae Orientalis illustrantia. Fontes XV–XVII saec., t. 2) // Новости Литовской Метрики. – № 4. – 2000. – Вильнюс : LII Leidakla, 2000. – С. 20–24.
3. Антанавичюс, Д. Неизвестная известная книга канцелярии скарба Великого Княжества Литовского // Новости Литовской Метрики. – № 7. – 2003 г. – Вильнюс : LII Leidykla, 2005. – С. 29–34.
4. Антанавичюс, Д. Ревизия книг Литовской Метрики 1641 г. и формирование самостоятельной группы вице-канцлерских книг // Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės istorijos šaltiniai. Faktas. Kontekstas. Interpretacija. – Vilnius : Lietuvos istorijos institutas leidykla, 2007. – С. 139–178.
5. Банёнис, Э. Д. Литовская метрика и Архив Великого Княжества Литовского // Спорные вопросы отечественной истории XI–XVIII веков: тезизы докладов и сообщений Первых чтений, посвященных памяти А. А. Зимина, Москва, 13–18 мая 1990 г. – Москва : Институт истории СССР, 1990. – Ч. I. – С. 27–29.
6. Банионис, Э. Д. Введение // Lietuvos metrika. = Lithuanian Metrica. Kn. 5: (1427–1506) / [parengė: E. Banionis]. – Vilnius : Vilnius Mokslo ir enciklopedijų leidykla, 1993. – С. 5–27.
7. Блануца, А. В., Ващук, Д. П. Литовська Метрика // Енциклопедія історії України: в 10 т. / редкол.: В. А. Смолій (голова) [і інш.]. – Київ : Наукова думка, 2003–2013. – Т. 6: Ла – Мі. – 2009. – С. 178–185.
| | | | | | | | ½ | Wasko Dachnow | 1 | 8 |
| | | | | | | | ¾ | Daniło Pawełkow | 1 | 26 |
| | | | | | | | ¾ | Oles Hreczka | 1 | 26 |
| | | | | ⅔ | | | | Po Wasku Karasiu gront pustuie | | |
| | | | | | | | | Place gumienne *w* tyle | | |
| | | | | 1 | | | | Po Kuzmie Szupieniu plac pusty | | |
| | | | | 1½ | | | | Puste dolem idą pułtora placa | | |
| | | | | | | | ⅓ | Chwiodar Szycho*w*ski | | 25 |

*[30]*

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | Daley place gumienne | | |
| | | | | | | | 1 | Osip Karoza | 2 | 15 |

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | ½ | Arciom Budewicz | 1 | 8 |
| | | | | | | | ½ | Wasil Kotlarz | 1 | 8 |
| | | | | | | | | Tomasz Skarczynski, pasierz, Fiesko pachołek po Iwanie Stasielku tenże | | |
| | | | | | ¼ | | | Berko Chaimowicz żyd | 5 | |
| | | | | | | | ½ | Leon Sciepaszko | 1 | 8 |
| | | | | | | | ½ | Wasko Karas | 1 | 8 |
| | | | | | | | ¼ | Jakusz Karputa | | 19 |
| | | | | | | | ¼ | Fiodor Radkiewicz | | 19 |
| | | ¼ | ¼ | | | | ½ | Hryszko Kłypa, bracia Jozef, Łukasz | 8 | 4 |
| | | ½ | ½ | | | | ½ | Andrey Kłypa, zięc Fiedor, wnuk Andrey, Iwan | 15 | 19 |
| | | ¼ | ¼ | | | | ½ | Fiodar Sciepaszko, syn Hryszko | 8 | 4 |
| | | | | | | | ½ | Piotrok Żabka | | 19 |
| | | ½ | ½ | | | | ½ | Iwan Borowiec, syn Fiedor | 15 | 19 |
| | | | | | | | 1 | Jurko Szczytnik | 2 | 15 |
| | | | | | | | ½ | Fiodar Sciepaszko | | 19 |
| | | | | | | | 1 | Jurko Kłypa | 2 | 15 |
| | | | | | | 1 | | Jan Jakuszewicz, woyt, wolny | | |
| | | | | | | | 1 | Jurko Kłypa | 2 | 15 |
| | | | | | | | | Słoboda Kazimierzowo za młynem o iedny*m* kole będącym idąc od miasta po lewie | | |
| | | | | | | | 1 | Jasko Rupinski, syny Władysław, Paweł, Bazyli | 2 | 15 |
| | | | | | | | 1 | Sciepan Kauryha | 2 | 15 |
| | | ¼ | ¼ | | | | 2 | Michno Byk, brat Cieszko, syny Apanas, Dzmitrok | 12 | 15 |

*[31]*

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | Taż słoboda Kazimierzowo | | |
| | | | | | | 1 | | Do cerkwi S(więtej) Praxedy wolny | | |
| | | | | | | | 1 | Sciepan Kauryha po Hryszkowey Kauryhowey trzyma plac | 2 | 15 |
| | | ¼ | ¼ | | | | 2 | Daniło Przybyły | 12 | 15 |
| | ½ | | | | | 1 | | Prokop Ziękiewicz, syny Osip, Sauko, pachołek, wolny | | |
| | | | | | | | 1 | Hryszkowa Buiakowa, syn Isak | 2 | 15 |
| | | | ¼ | | | | 1 | Tomasz Fiedorowicz, syn Pauluk | 7 | 15 |
| | | ¼ | ¼ | | | | 1 | Chwesko Ciwa | 10 | |

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | Siemion Skarzynski, syny Sierhiey, Dziemian, pachołek | | |
| | | ½ | ½ | | | | 1 | Wasko Horanin, syny Iwan, Ausiey | 17 | 15 |
| | | ¼ | ¼ | | | | 1 | Andrey Ryży, syny Pauluk, Hryszko | 10 | |
| | | ¼ | ¼ | | | | 2 | Sciepan Podolak, syny Chwiodar, Ułas | 12 | 15 |
| | | | | | | | | Druga strona słobody powracaiąc ku miastu po lewey ręce | | |
| | | | | 1 | | | | Plac pusty obłoho idzie | | |
| | | | | 2 | | | | Po Alexieju placow dwa puste, z ktorych dola na dwor | | |
| | | | | | | | 1 | Waska Horanina przyio*ł* | 2 | 15 |
| | | | | | | | 1 | Sciepana Skarzy*n*skiego z przyiemu, pachołek | | |
| | | | | | | | 1 | Tomasza Fiedorowicza z przyie*mu* | 2 | 15 |
| | | | | | | | 1 | Prokopa Ziękiewicza z przyie*mu*, pachołek | | |
| ½ | | | | | | | 1 | Jasko Kandzielka | 2 | 15 |
| | | ¼ | ¼ | | | | 1 | Sciepan Kauruha | 10 | |
| | | | | | | | 1 | Iwan Koroza z miasta | 2 | 15 |
| | | | | | | | 1 | Kondrat Zawazaniec, syn Maciey | 2 | 15 |
| | ½ | ¼ | ¼ | | | | 1 | Iwan Rupinski młynarz z puł włocza, wolny, wieprzowszczyzny płaci | 7<br>10 | 15 |
| | | | | | | | | Zascianki mieyskie opisane za opisaniem włok mieyskich niżey | | |

*[35]*

| Zascianki około włok mieyskich będące | Tynfy | Grosze |
|---|---|---|
| Sianożęc woytowiczowa nazwana Jahełowska | 10 | 15 |
| Zascianek Hliniszcze do cerkwi S(więteg)*o* Jana wolny | | |
| Zascianek Woskowski, woyt ma płacić | 10 | |
| Zascianek Reczenkow, Ced y Jurko Kłypa płaci | 10 | |
| Sianożęc, co pop S(więteg)*o* Jana trzyma, płacic ma | 7 | 15 |
| Zascianek Cielatnik Paweł Miecznik | 5 | |
| Sianożęc w Łące Wasil Jakubowicz corocznie | 3 | |
| Zascianek Rakocilowski Wasilonki gdy nie w paraninie | 10 | |
| Zascianek pod Wiaznicze co pop S(więteg)*o* Jana trzyma | | |
| Łąka pod Szankowem według karty ieszcze J(ego)m(ości) Pana Dąbrowki, kto używać będzie, oney płacić powinien | 4 | 20 |

**Powinność mieszczan smolańskich.**

Mieszczanie i żydzi, tak w rynku iako y w ulicach domy swoie maiący, tyle czynszu co rocznie płacić powinni, iak są w linijach wyzey opisani. Żydzi we czworo z placu czynsz daią, dla tego od wszelkich posług wolni. Chrzescianie zas z listami naydaley za mil pięć pieszą lub konną podroż odbywać powinni będą. Ci co gront włoczny przy placach trzymaią, ty*m*że y cwierć placu do grontu zdawna iest przydany, z włoki osiadłey tynfow dwadziescia, z przyiemney tynfow dziesięć płacą. Ktorzy zas na placowy*m* gruncie siedzą tylko, a nie trzymaią grontow, pieszo z listami chodzą, a na dworną usługę bywać powinni. Od zhonu dworney paszni żyta kop trzy, jarzyny kop trzy z każdego domu, ktorzy nie są wolnemi specyfikowani żąc powinni wyiowszy żydow y słobodczykow, ktorzy do swoich czasow według kartek im danych bez żadney przeszkody maią wysiadywać. Pachołcy, rzemiesnicy wolni są od płaty y żniwa, ktorzy są na usłudze dworney. Tylko z pachołkow usługa koleyno zamkowi ustawnie bydz powinna.

*[36]* Ogrodniczy przy dawnieyszey wolności zostawać ma. Do ogrodow iednak dwornych, do plewidła y do polewania jarzy*n* y do posłług folwarkowych, ktore kolwiek są y będą iako to do robenia krup, podsiewania zboż, bielenia płocien, prania chust iść powinni. Na gwałty do młynow Smolanskigo, Hanyszowskiego wszyscy tak wolni iako y niewolni żadnego nie excypuiąc, ile razy potrzeba będzie, chodzić pod winą y karą zamkową będą powinni. Na gwałt pograniczny także wszyscy a wszyscy żadnego nie excypuiąc z czy*m* kolwiek dwor rozkaże osobami swemi stawać maią. Tłok dwie tak chrzescianie iako i żydzi excepto pachołkow y rzemiesnikow odbywać będą powinni.

[…][2].

*Крыніца:* Львоўская навуковая бібліятэка імя В. Стэфаніка Нацыянальнай акадэміі навук Украіны. Аддзел рукапісаў (далей – ЛНБ. АР). – Ф. 5 (Рукапісы бібліятэкі Асалінскіх). Адз. зах. 5160/II. – Архіў князёў Любамірскіх (Дубровенская лінія). Інвентар Смалянскага княства Аршанскага павета. 1744 г. – С. 1–36.

## Дакумент 2

***1710 г. студзеня 15.*** *Смаляны (Белы Ковель).* – Інвентар Белаковельскага (Смалянскага) княства Аршанскага павета князя Паўла Караля Любартовіча Сангушкі, складзены камісарамі стольнікам вендэнскім Станіславам

[2] Далей у тэксце інвентара (с. 37–62) ідзе апісанне Смалянскай воласці з пералікам вёсак, колькасцю ў іх зямлі ў валоках, пазначэннем гаспадароў, сыноў і іншых родзічаў мужчынскага полу, што разам вялі гаспадарку, памераў сялянскіх надзелаў і павіннасцей. Гэта частка інвентара не публікуецца.

Канстанцінам Касцялецкім-Пацынам і скарбнікам інфлянцкім Самуэлем Карлікам. *Фрагмент.*

*[34]* Powinność poddaństwa włości Smolanskiey

Z włoki ciągłey na rok kop sześć. Dziakła żyta beczkę iedną miary wilenskiey, owsa także beczkę, ktora beczka garcow wilenskich sprawiedliwych n(umer)*o* 80 ma być wynosząca. Ktore to dziakło samiż poddani na sw(o)ich dniach wywieść y zasiać maią za naypierwszym rozkazaniem od dworu. Nad tą gęś iedną, kapłuna iednego, kurow dwoie, jaiec dwadzieścia, talek lnu swego n(umer)*o* 4 wydać powinni, a z dwornego lnu talek ośm sprzędać maią. Robotę z czym dwor ukaże po dni cztery w tygodniu wychodziąc na nią o godzinie szostey, a zchodąc o godzinie czwartey pelnić będą powinni pod srogą karą, a ktoryby nad tę opisanie pozniey przyszedł, temu ten dzień niema być rachowany. Straż koleyna ma być. Zgonow sześć konnych ile kto koni ma na paroninę y na jarzynę, tak do orania iako y bronowania, a drugie sześć zgonow pieszych do żniwa sprawiedliwie, stroża tylko w domu zostawiwszy. Gwałty do gnoiow wożenia, gwałty do młynow, ile potrzeba będzie, odprawować maią. Sianożęci dworne urokami na swoich dniach w pogodę porabiać maią. Owo zgoła do dawnych powinności we wszystkim a wszytkim stosować się będą powinni.

Z włoki kuniczney zapłaciwszy po tak wielu, iako się ktory sam w inwentarzu opisał, ci iednak nad złł(otych) 60 wyżey płacić niemaią. Od straży gumna y dziakieł iako ciahli daią y płacą wolni. Podwody iednak dokąd ukaze by w naydalszą drogę, także zgony, uroki y gwałty pograniczne, młynowe y na łowy wespoł z ciahłemi odprawować będą powinni.

Z włoki przyjemney zapłaciwszy kop cztery więcey pełnić ani płacić nie będzie powinni.

Z włoki kozackiey zapłaciwszy złł(otych) dziesięć, posługe kozacką w sukni dobrey z orężem porządnym na koniu dobrym dokąd ieno potrzeba ukaże by w naydalszą drogę odprawować koleyno będą powinni, a ktoryby porządku według opisania nie miał, *[35]* w chłopa kunicznego powrocony być ma i powinność kuniczną pełnić będzie powinen, a porucznik w tym kożdego postrzegać ma.

Z włok wolnych y dożywotnych przy swoich listach od X(ię)stwa Jchm(oś)ci danych zachowani być maią. Dań iednak ieżeli się na co opisali wydawać powinni.

Z włok słobodnych odprawiwszy tylko gonow sześć, trzy do bronowania, a trzy do żniwa, gwałt ieden do wożenia gnoiow y urok sienny, od podatkow y robot innych wolni być maią do wyscia słobod sobie danych.

Z włok pustych z pognoiow snop trzeci, a z pola snop czwarty doli dać powinni, a iesli by kto miał arędować włokę całe pustą z dawnych czasow y zarosłą, tedy nie ma płacić za nią nad złotych pięc na rok do lat piąciu.

Pszczoły we wszystkich ciahłych, kunicznych, ziemian, wolnych alias dożywotnikow wpuły z dworem dzielone być maią. Ktorzy zas dań miodową corocznie daią, od połowy wolni podług kart sobie na dań danych.

Na gwałt pograniczny wszyscy żadnego niewymuiąc za daniem znać od dworu z czym każą kożdy osobą swą stawać będzie powinien.

A ktoby się kolwiek z poddanych temu opisaniu powinności nietylko uczynkiem samym, ale słowem sprzeciwił, winy kop n(umer)*o* 40 zapłacić będzie powinien i więzieniem karany być ma, do doyscia dekretu X(ię)stwa Jchm(oś)ci dobrodzieiow iako buntownik.

*Крыніца:* ЛНБ АР. – Ф. 5. (Рукапісы бібліятэкі Асалінскіх). Адз. зах. 5166/II. – Архіў князёў Любамірскіх (Дубровенская лінія). Інвентар Белаковельскага княства (інакш Смалянаў), беларускіх маёнткаў князя Паўла Караля Любартовіча Сангушкі. 1710 г. – С. 34–35.

## Крыніцы і літаратура

1. ЛНБ. АР. – Ф. 5 (Рукапісы бібліятэкі Асалінскіх). Адз. зах. 5166/II. – Архіў князёў Любамірскіх (Дубровенская лінія). Інвентар Белаковельскага княства (інакш Смалянаў), беларускіх маёнткаў князя Паўла Караля Любартовіча Сангушкі. 1710 г. – 36 с.
2. ЛНБ. АР. – Ф. 5 (Рукапісы бібліятэкі Асалінскіх). Адз. зах. 5160/II. – Архіў князёў Любамірскіх (Дубровенская лінія). Інвентар Смалянскага княства Аршанскага павета. 1744 г. – 240 с.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 19.10.2021

*А. І. Груша, А. Б. Доўнар, С. У. Палехаў*

# Судовае рашэнне архіепіскапа і мітрапаліта Кіеўскага і ўсяе Русі Іосіфа II Солтана за 1510 г.[1]

Нягледзячы на тое, што даныя аб дакуменце, які аформіў судовае рашэнне архіепіскапа і мітрапаліта Кіеўскага і ўсяе Русі Іосіфа II Солтана за 1510 г.[2], былі апублікаваны [37, s. 16], ён сам і яго звесткі да гэтага часу не былі ўведзены ў навуковы абарот[3].

Між тым, значэнне названага дакумента ў вывучэнні Кіеўскай мітраполіі XV–XVI стст., дзейнасці яе іерархаў, царкоўнага правасуддзя, шэрагу іншых пытанняў, якія датычаць гісторыі царквы і не толькі яе, складана пераацаніць. Вялікую каштоўнасць мае гэты дакумент і ў плане вывучэння гісторыі святарскага кліру, цэркваў і манастыроў г. Менска (Мінска).

У чым менавіта заключаецца гэтая каштоўнасць?

Гэта адзінае вядомае нам пісьмовае рашэнне духоўнага суда праваслаўнай царквы ў Вялікім Княстве Літоўскім (ВКЛ) за перыяд да канца 1520-х гг., якое захавалася цалкам і ў арыгінале. Аб іншых падобных рашэннях, у тым ліку мітрапаліцкіх, мы ведаем толькі па іх згадках і

---

[1] Аўтары сардэчна дзякуюць за дапамогу ў падрыхтоўцы публікацыі **Сяргею Гарадзіліну**, **Конраду Жамянецкаму** (**Konrad Rzemieniecki**), **Дзянісу Лісейчыкаву**, **Андрэю Мацуку**, **Фёдару Успенскаму**, **Леаніду Цімашэнку**, **Аляксею Шаланду**.

[2] Дзве даты дакумента – гадавая і паводле індыкту, не ўзгодненыя паміж сабой. Паводле сучаснага летазлічэння яны прыпадаюць на наступныя перыяды: 7018 г. – на 1 верасня 1509 г. – 31 жніўня 1510 г., 14 індыкт – на 1 верасня 1510 г. – 31 жніўня 1511 г. З-за адсутнасці верагодных звестак аб месцы знаходжання Іосіфа і іншых згаданых у дакуменце асоб 31 студзеня 1510 г. і 31 студзеня 1511 г. і ў бліжэйшыя дні складанне дакумента можна ў роўнай ступені аднесці як да аднаго, так і да іншага года. І ўсё ж, на наш погляд, больш верагоднай датай гэтага дакумента з'яўляецца 1510 г. Сярод сведкаў працэсу выступае архімандрыт Кіева-Пячэрскага манастыра Іона (ён узначальвае спіс духоўных асоб). Павінна была існаваць сур'ёзная прычына з'яўлення яго ў настолькі аддаленым ад Кіева месцы. Такой прычынай мог быць яго ўдзел у Віленскім саборы духавенства Кіеўскай мітраполіі, які пачаўся ў самае свята Раства Хрыстовага, 25 снежня 1509 г., і скончыўся 18 студзеня 1510 г. (аб Віленскім саборы гл.: [10, с. 106–110; 32]). У той час, калі разглядалася дадзеная справа, Іона павінен быў знаходзіцца па дарозе з Вільні ў Кіеў. Мяркуем, што па гэтай дарозе ён мог нанесці візіт у Менск да мітрапаліта, у адну з рэзідэнцый першасвяціцеля.

[3] На гэты дакумент, які ўтрымлівае рэтраспектыўныя звесткі пра жыццё ВКЛ, пачынаючы з першай трэці XV ст., звярнуў увагу адзін з аўтараў гэтай публікацыі – С. У. Палехаў – у працэсе падрыхтоўкі «Дыпламатычнага кодэкса Свідрыгайлы».

пераказах, якія, зрэшты, дайшлі да нас у невялікай колькасці [41, p. 269; 43, p. 200 і інш.].

Дзякуючы гэтай крыніцы ў распараджэнне даследчыка пастурае адзін з прыкладаў правасуддзя ў галіне царкоўнага права, здзейсненага да таго ж адным з самых дзейных вярхоўных пастыраў Кіеўскай мітраполіі – Іосіфам ІІ Солтанам (1507–1521/1522). Перад намі адзін з рэдкіх дакументаў, які характарызуе дзейнасць названага мітрапаліта-рэфарматара[4].

Крыніца адлюстроўвае найстарэйшую форму пісьмовага запісу юрыдычнай дамовы – на старонках напрастольнага Евангелля. Згодна з карабарацыяй дадзенага дакумента: «И дла лепшое твердости и памати тое дѣло ц(е)рковное веле*ли* есмо записати и въ Єv(ан)*г*(е)ліе собо*р*ное ц(е)ркви ȣписати». Гэтая форма вядома з XIV ст. (узнікла яна, відавочна, раней[5]). Як традыцыя яна падтрымлівалася духавенствам і свецкімі асобамі і існавала ў XV–XVI стст. Наогул, дадзеная форма запісу з’яўляецца асаблівым рэлігійна-прававым феноменам ВКЛ [4, с. 101–123, 202–203].

Зрэшты, у дадзеным выпадку судовае рашэнне было зафіксавана як у Евангеллі, так і ў форме дакумента на аркушы паперы з пячаткамі ўдзельнікаў духоўнага суда. І калі Евангелле не захавалася і вядома толькі паводле згадкі, то дакумент дайшоў да нас. У пачатку 60-х гг. XVIII ст. ён яшчэ захоўваўся ў архіве ўніяцкіх мітрапалітаў, у далейшым апынуўся ў зборы Браніцкіх у Сухой (Бяскідзкай), а адтуль пасля Другой сусветнай вайны трапіў ва ўроцлаўскую Нацыянальную бібліятэку імя Асалінскіх (Асалінеум) [18, с. 81; 37, s. 16; 47].

У якасці суддзі ў гэтай справе выступіў архіепіскап і мітрапаліт Кіеўскі і ўсяе Русі, які прама называе сябе вяршыцелем правасуддзя ў галіне духоўнага права: «Смотрели есмо т[ого] [дела] [в] наш*ом* д(ȣ)хѡ*в*но*м* праве». Дакумент мае саманазву – «дѣло ц(е)рковное». Відавочна, што ў групе настаяцеляў менскіх цэркваў, якія ўдзельнічалі ў судзе, трэба бачыць саборны крылас, які выконваў адну са сваіх функцый – судовую[6]. Царкоўны характар суда не адмяняе ўдзел у ім свецкіх асоб, а сярод іншых знатнага саноўніка – менскага намесніка князя Багдана Іванавіча Жаслаўскага. Юрыдычны аўтар дадзенага дакумента гэты іх удзел у судзе характарызуе так: «А з нами бы*л*». Аднак ён паказвае, што гэтыя асобы з’яўляліся не маўклівымі сведкамі судовага

---

[4] Аб ім гл.: [10, с. 104–127; 17, с. 112–118; 18, с. 71–83; 33; 34].

[5] Так, на думку Сяргея Каштанава і Любові Сталяровай, адзін з арыгіналаў вядомай жалаваннай дадзенай граматы XII ст. кіеўскага князя Мсціслава Уладзіміравіча і яго сына Усевалада наўгародскаму Юр'еву манастыру на Буіцы першапачаткова з’яўляўся запісам, зробленым у пергаменным кодэксе, хутчэй за ўсё, у напрастольным Евангеллі, які затым быў выразаны з яго [7].

[6] Гэтая думка выказана Л. Цімашэнкам.

працэсу, а іх актыўнымі ўдзельнікамі, знаўцамі права, экспертамі, якія дапамагалі суддзі ва ўстанаўленні ісціны з дапамогай сваіх ведаў аб фактычных абставінах справы, а таксама права і звычаяў. У тым месцы, дзе гаворыцца аб выніках правядзення экспертызы дакумента, які выдаваўся адказчыцай за «судовы» ліст мітрапаліта Іоны, паведамляецца і ад імя суддзі, і ад імя тых, хто «быў» пры ім: «**Всим сѧ нам** видѣло, иж то ес листъ не тверды».

Вывучэнне разгорнутага фармуляра судовага вердыкту пераконвае нас у наступным. Суддзя адказна паставіўся да ацэнкі доказаў бакоў, расследавання абставін справы і іх аналізу. Старанна былі апытаны ісцец і адказчыца. Дарэчы, да следства быў далучаны пісьмовы дакумент, які выдаваўся адным з бакоў у якасці «судовага» ліста. Паводле шэрагу прыкмет ён быў вызначаны як ліст, пісаны «не судовым обычаем», «не твердым». Не знайшоўшы доказы, пададзеныя істцом і адказчыкам, дастатковымі, суддзя з мэтай выяўлення важкіх падстаў для вынясення справядлівага рашэння працягнуў разбор. Крыніца прыводзіць каштоўнае сведчанне, якое ўказвае на рэлігійную матывацыю суддзі. Ён прыняў рашэнне аб яго працягу: «абыхмо ꙋ брег грѣха не попали». Гэтая матывацыя таксама адсылае да рэлігійнага характару правасуддзя, які ўсё яшчэ захоўваўся ў гэты час [4, с. 98].

У ВКЛ зварот да мінулага, успаміны пра тое, «как было здавна», з’яўляўся адным са спосабаў устанаўлення ісціны ў спрэчках, у тым ліку і тых, якія вырашаліся судовым парадкам. Вядома мноства фактаў падобных зваротаў [4, с. 71–72 і інш.]. Аднак сведчанні аб успамінах такой вялікай глыбіні, аб якой гаворыцца ў гэтым дакуменце, з’яўляюцца рэдкімі [4, с. 84–85]. У дадзеным выпадку апытанне сведкаў, «хто бы болшеи з старины помѧтал», г. зн. зварот да асоб, старэйшых па ўзросце, быў наўмысным, бо іх паказанні цаніліся больш за ўсё [4, с. 79–84, 176–177]. Да таго ж, задача суддзяў заключалася ў тым, каб праверыць факты вялікай даўнасці, якая вымяралася 3–4 пакаленнямі. Таму да апытання былі прыцягнуты два «старых чоловека». Адзін з іх сцвярджаў: «Я, деи, помню см(е)ртъ кн(ѧ)зѧ великого Жикгимонта» (памёр у 1440). Другі на пытанне: «Как ѡн ꙋ своеи старости помнит», адказаў: «Вжо [я в] доброи памѧти был по см(е)рти Витовве» (так у рукапісе, трэба чытаць «Витовтове»; памёр у 1430).

Апублікаваны дакумент значны тым, што не проста паўтарае пашыраныя ў пачатку XVI ст. уяўленні аб часах «великого князя Витовта и Жигимонта» як аб ідэальнай «старине» [4, с. 169–171], а ўзнаўляе цалкам канкрэтныя паказанні старых людзей аб гэтым часе. Мабыць, найбольшую цікавасць у гэтых паказаннях уяўляе наступнае месца, якое дазваляе ўпісаць гісторыю менскіх цэркваў і іх святароў у гістарычны кантэкст. Са слоў сведкі, манаха Навума, які даваў паказанні: «[И] как

Швитрикоило з Жикгимонто*м* ва*л*чилъ, и тогды бы*л* того попа Фе*до*-ра зве*л* до Смоле*н*ска. И ѡпѧ*т* ис Смоле*н*ска ѡ*н* пришо*л* къ Ме*н*скꙋ, и иконꙋ Пр(е)ч(и)*с*тое Г(о)*с*(по)д(а)р(ы)ни ѡбра*з* с собою прине*с*». Для характарыстыкі падзей 80-гадовай даўніны тут ужыты той жа самы абарот, што і ў дакуменце 1460-х гг., калі былі жывыя іх шматлікія сведкі [45, p. 268].

Ведаючы ход дынастычнай вайны паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам у 1430-х гг., вывад святара Фёдара з Менска ў Смаленск магчыма ўпэўнена датаваць. Падчас гэтай вайны Свідрыгайла двойчы займаў Менск – у 1432 і 1433 гг. [22, c. 50, 54; 21, c. 312, 341]. Аднак у 1432-м, пацярпеўшы разгром у Ашмянскай бітве, ён неўзабаве страціў кантроль над землямі, якія толькі што, здавалася, адваяваў у Жыгімонта. Да таго ж, дарога назад Свідрыгайлы з Ашмянаў пралягала не праз Менск і была падобная хутчэй на ўцёкі з поля прайгранай бітвы. У 1433-м жа Менск аказаўся адным з гарадоў, спустошаных падчас вяртання Свідрыгайлы з літоўскага паходу. Гэта адбылося прыкладна ў канцы жніўня ці пачатку верасня [21, c. 341, 549]. Крыніцы аднадушна паведамляюць пра шматлікіх палонных, якіх скінуты вялікі князь вывеў у свае ўладанні [23, c. 34, 58, 77; 40, s. 421].

З паказанняў іншага старажыла – Фёдара «Шокало» – можна даведацца, калі святар Фёдар вярнуўся са Смаленска ў Менск. Ён пачынае свае ўспаміны са смерці вялікага князя Жыгімонта (1440), а першым святаром, якога ён памятаў, быў Фёдар. Такім чынам, ён вярнуўся ў Менск пры гэтым князі, гэта значыць тады, калі абодва гарады зноў апынуліся пад уладай аднаго правіцеля. Вядома, што смальняне прызналі ўладу Жыгімонта ў канцы 1435 г., неўзабаве пасля разгрому Свідрыгайлы ў Вількамірскай бітве (адбылася 1 верасня 1435 г.) [5, c. 4–5, 7–8; 21, c. 404–405].

Дакумент зафіксаваў цэлы сегмент арганізацыі праваслаўнай царквы ў адным з рэгіёнаў ВКЛ – у Менску – у пачатку XVI ст. Ён утрымлівае звесткі, якія праліваюць святло на царкоўную ўладу, яе іерархію, гісторыю асобных цэркваў Менска і нават кіраванне Кіеўскай мітрапаліцкай епархіяй, у склад якой уваходзіў Менск.

Як відаць з дакумента, на тэрыторыі дадзенай епархіі яе кіраўнік пастаўляў святароў і «падаваў» ім цэрквы. У яго волі знаходзілася царкоўная маёмасць, якую ён мог перадаваць у часовае карыстанне, але не меў права адчужаць «вѣчно ѡ*т* ц(е)ркви Бо*ж*еѣ». Памер сваёй улады мітрапаліт выказаў у наступных словах: «всѧкое дѣло ц(е)рко*в*ное е*с* ꙋ митрополи*ч*еи во*ли*, дати и ѡ*т*нѧти». Важна ў будучым вызначыць, як суадносілася рэальная ўлада «властеля церковного» з нормамі, зафіксаванымі, у прыватнасці, у «Скрутку правоў вялікага князя Яраслава Уладзіміравіча», які ў канцы XV – пачатку XVI ст. па ініцыятыве іерар-

хаў пацвердзіў праваслаўнай царкве вялікі князь літоўскі [42, р. 126–127, 156–157][7].

Крыніца запаўняе адну лакуну, якая адносіцца да гісторыі кіравання Кіеўскай мітраполіяй. Як вынікае з дакумента: «И ка*к* небо*ж*чи*к* Васья*н*, воло*ди*ми*р*ски*и* еп(и)*с*к(о)пъ, намѣстни*к* бы*л* на митропо*ли* при Казимире, короли, и ѡ*н* тогды собо*р* ꙋчини*л*, повседневнꙋю слоу*ж*бꙋ в тои ц(е)ркви ꙋ Пр(е)ч(и)*с*тое Ꙋспе*нѧ*…». Відавочна, што гаворка тут ідзе аб тым, што ўладзімірскі епіскап Васіян пры каралі польскім і вялікім князі літоўскім Казіміры (1447–1492) з'яўляўся часовым кіраўніком Кіеўскай мітрапаліцкай епархіі[8]. Гэта магло адбыцца пасля смерці мітрапаліта Сімяона і да ўзвядзення ў гэты сан Іоны Глезна (форма імя «Глезн», а не «Глезна» з'яўляецца больш дакладнай[9]). Згодна з чалабітнай аб зацвярджэнні Іоны, накіраванай сходам духавенства і свецкіх асоб ВКЛ Канстанцінопальскаму патрыярху, Кіеўская мітраполія пасля смерці Сімяона «**немало вдовствуя бе**». Сімяон памёр у 1488 г. (паспеўшы ў 1487 г. паставіць Уладзіміру і Бярэсцю епіскапа Васіяна). А ўпершыню альбо як нарачоны мітрапаліт, альбо як часовы кіраўнік мітрапаліцкай епархіі Іона выступае ў 1489 г. [18, с. 60–61; 20]. Такім чынам, часовае кіраванне дадзенай епархіяй, гэтак жа, як і заснаванне Успенскага сабора ў Менску Васіянам, можна датаваць 1488–1489 гг. Было б цікава высветліць, што падштурхнула Васіяна заснаваць гэты сабор.

Крыніца фіксуе месца афіцыйнага знаходжання кіраўніка Кіеўскай мітраполіі – у Навагародку («езди*л* к митрополитꙋ к Новꙋгоро*д*кꙋ»), а таксама месца яго духоўнай адзіноты – у Пустынцы пад Навагародкам («И нашо*л* его за Новы*м*горо*д*ко*м* ꙋ Пꙋсты*н*це» і інш.).

У дакуменце святарскі клір Менска прадстаўлены не толькі настаяцелямі манастыроў («настоятель» і «игумен») і цэркваў («попами»), але і пратапопам (мяркуючы па ўсім, з'яўляўся духоўным намеснікам

---

[7] Аб гэтым «Скрутку» гл.: [3].

[8] Аб падобных часовых кіраўніках вядома з пазнейшых крыніц. Напрыклад: «Попъ Ивановскіи Семіонъ такъ повѣдилъ: **коли былъ намѣстникомъ на митропольи Васіянъ**, владыка Пинскій, и мѣщане просили его за мною, абы мене въ попы поставилъ и церковь ми далъ, и онъ мене въ попы поставилъ въ Новѣгородку и церковь ми далъ светого Ивана, и увязалъ мене отъ Васіяна Василей попъ Пятницкіи и ключи ми далъ» [1, с. 9].

[9] "А то деи было при Глезнѣ Митрополитѣ, коли Мацко попъ Николскій Богу душу далъ и **Глезнъ** далъ былъ тую церковъ попу Полоцкому Зенову безъ мѣщанское прозбы, и онъ не взялъ, и **Глезнъ** далъ тую церковъ Ѳомѣ уставщику молодому». «Попъ Михаиловскій передъ нами такъ повѣдилъ: мене дей въ попы поставилъ **Іона Глезнъ** на мѣщанскую прозбу…». «Одное зимы митрополитъ **Іона Глезнъ** въ Менску былъ…» [1, с. 8, 9, 10].

мітрапаліта[10]). Крыніца прама ці ўскосна (праз намінацыю настаяцеляў манастыроў і святароў) указвае на існаванне ў Менску ў пачатку XVI ст. двух манастыроў (Узнясенскага і Мікольскага) і пяці цэркваў – Св. Казьмы (Кузьмы) і Дзям'яна, Св. Юрыя, Спаскай («Святой Спас», «церковь Святого Спаса»), Міхаіла Архангела («Святой Михаил»), Успення прачыстай Багародзіцы («Пречистая», «Пречистой храм», «Пречистой Успенья», «Пречистой Господарыни», «церковь Пречистое Богоматери Успенья»).

Згадкі ў дадзенай крыніцы аб цэрквах Св. Казьмы і Дзям'яна, Св. Юрыя, Спаса і Міхаіла Архангела, аб Мікольскім манастыры адносяцца да ліку самых ранніх. У ёй ёсць і другая па старажытнасці згадка Прачысценскай царквы, якая вядомая гэтак жа, як і яе святар Фама, з дакумента за 1502 г. [13, с. 141].

Пры гэтым, як вынікае з апублікаванага рукапісу, царква Успення Багародзіцы дзейнічала ўжо падчас канфлікту Свідрыгайлы Альгердавіча і Жыгімонта Кейстутавіча, у 30-х гг. XV ст., а Спаская царква, па крайняй меры, ужо ў 1480-х гг.

Дарэчы, з крыніцы мы даведваемся аб лакацыі царквы Успення. Яна была збудавана «ꙋ Городе», г. зн. у гістарычнай, умацаванай частцы Менска, яго судова-адміністрацыйным цэнтры, больш вядомым з крыніц гэтага часу як Замак. Там жа размяшчаўся і «Святой Спас». Так вынікае з інфармацыі, згодна з якой двор, які з'яўляўся прадметам цяжбы, знаходзіўся «[ꙋ Город]е Ме*н*скꙋ», пры гэтым ён размяшчаўся «пере*д* самою ц(е)рко*в*ю С(вѧ)т(о)го Сп(а)са».

Дакумент інфармуе аб заснаванні ў Менску сабора Успення прачыстай Багародзіцы, якое суправаджалася ўвядзеннем у ім службы некалькіх святароў са штодзённым правядзеннем набажэнства. Гэтае заснаванне адбылося ў 1488–1489 гг. (гл. вышэй). У сувязі з гэтым узнікае пытанне, якая царква ў Менску была саборнай да таго часу. Відавочна, што згаданая тут Спаская [5, с. 5–6].

Са слоў святароў, якія ўдзельнічалі ў працэсе: «А ка*к* Васья*н*, еп(и)*с*к(о)пъ воло*ди*ми*р*ски*и*, собо*р* вчини*л*, повседневнꙋю сл*ꙋж*бꙋ, ꙋ Пр(е)ч(и)*с*тое хра[*м*]оу, **на[*м*] в[с]*им* веле*л* ꙋ соборе слꙋжит*и***…». Гэта сведчыць аб тым, што на момант разгляду гэтай судовай справы ў саборным храме служылі ўсе яны: пратапоп, казмадзям'янскі, прачысценскі, юрыеўскі, а таксама, верагодна, спаскі і міхайлаўскі святары. Дадзенае сведчанне святарскага кліру можа ўказваць на існаванне пры саборнай царкве арганізацыі святароў – крыласа, ужо ў 1488–1489 гг., хоць упер-

---

[10] Сярод найноўшых прац, дзе абагульнены звесткі аб пратапопах Кіеўскай мітраполіі ў XVI ст., ад Іосіфа Солтана да Міхаіла Рагозы, гл.: [31, с. 98–104].

шыню прама аб крылашанах «соборное церкви Пречистыя Богоматери менское» гаворыцца ў крыніцы за 1550 г. [36, s. 311–312][11].

Варта ўказаць і на іншыя важныя звесткі апублікаванай крыніцы.

Дакумент паведамляе аб спадчынным характары пастырскага служэння ў Менску. Грынь, удава якога – Апраня (Апрання), выступіла ў якасці аднаго з бакоў судовага працэсу, з'яўляўся служыцелем культу ў трэцім пакаленні. Святарамі былі яго бацька Валодзя і дзед Фёдар. Пры гэтым абодва служылі ў храме Успення (пасля Валодзя быў пераведзены на службу ў Спаскую царкву). Іерэем з'яўляўся таксама брат Грыні – Пракопей. Гэта не адзінкавы факт спадчыннага характару службы святароў у ВКЛ. З Піншчыны паходзяць звесткі аб пастаўленні на святарства ў чацвёртым пакаленні[12]. Безумоўна, гэтых фактаў недастаткова для абагульняючых высноў у галіне сацыяльнай гісторыі, аднак не лічыцца з імі нельга.

Рукапіс можа ўнесці яснасць у пытанне аб рэгіянальным паходжанні мітрапаліта Кіеўскага і ўсяе Русі Іоны II (1503–1507). Уніяцкія пісьменнікі XVII ст. называлі Іону маскавітам. Аднак аказваецца, што ён з'яўляўся родным дзядзькам двум братам-святарам з Менска, якія яўна нарадзіліся ў гэтым горадзе (іх дзед і бацька служылі ў Менску) – Пракоп'ю і Грыню («…бо Иѡна, митрополи*т*, мꙋжꙋ твоемꙋ Гриню дѧ*д*ко бы*л* рожены*и*»). Яны даводзіліся яму «сестренцами», г. зн. сынамі сястры Іоны. Было б занадта смела толькі на падставе таго факту, што сястра Іоны з'яўлялася жонкай ураджэнца Менска Валодзі, казаць пра верагоднасць паходжання з Менска і Іоны. Тым не менш, дадзеная сувязь архіпастыра з Менскам робіць гэтую верагоднасць высокай, асабліва ў святле таго, што Іона ў 1499–1502 гг., да яго хіратоніі ў епіскапа ўладзімірскага і берасцейскага і да ўступлення на кіеўскую мітрапаліцкую кафедру, з'яўляўся архімандрытам менскага Узнясенскага манастыра [9; 36, s. 76].

Вялікую цікавасць маюць паказанні менскага намесніка князя Багдана Іванавіча Жаслаўскага[13]. Ён успомніў часы саракагадовай даўнасці, калі, паводле яго інфармацыі, ён «грамотѣ, деи, ꙋчи*л* сѧ есми ꙋ діака ꙋ

[11] Гэтая думка выказана Л. Цімашэнкам. Аб крыласе гл.: [19; 30; 31, с. 97–98].

[12] «Билъ намъ чоломъ Богъданецъ, внꙋкъ попа нашого юръевъского, и поведилъ передъ нами, што жъ вже дѣдъ его старъ и служъбы церъковъное не можеть завъжъды зъдолети. Ино, деи, кнѧзь Федоръ Ивановичъ Ярославича для того прылучилъ емꙋ былъ кꙋ це*р*къви некоторого попа владычънего, а то*т*, де*и*, Богъданецъ на тотъ часъ былъ малъ. Ино ѡнъ нине, коли вжо прышолъ къ летомъ своимъ и къ слу*ж*бе це*р*ковъно*и*, мае*т* годенъ быти, и билъ на*м* чоломъ, абы*х*мо его пры то*и* церъкви зоставили светого Юръя, пры которо*и* же, де*и*, дѣдъ и прадедъ, и ѡтецъ его служылъ» [39, l. 28v – 29; 15, арк. 29–29 адв.; 24, с. 252].

[13] Менскі намеснік – з 1499 г. ажно да смерці каля 1530 г. [51, s. 589].

Дмитра». Пісьмовых фактаў, якія пралівалі б святло на навучанне «грамоте», г. зн. пісьму і чытанню, за першую палову XVI ст., захавалася няшмат. Адзін з іх датуецца часам каля 1514 г. Са слоў служэбніка маршалка і слонімскага дзяржаўцы Яна Мікалаевіча Радзівіла Мішкі, ён служыў раней пану Аляксандру Солтанавічу «зъ его молодыхъ летъ, **и его грамоты вчилъ**…» [27, стб. 832]. Другі адносіцца да 1540 г. і вядомы больш за ўсё. У Віцебску разглядалася справа, у якой фігураваў дакумент, што нібыта даказваў правату істцовага боку. Суддзя вырашыў праверыць сапраўднасць гэтага дакумента і дапытаў святара царквы Святога Духа, які навучаў «грамоте» чалавека, імя якога было пазначана як імя складальніка і перапісчыка дакумента – дзяка Ескі Клінца. Святар паведаміў, што ён вучыў Клінца пісаць уставам (графічны від пісьма), а скорапісу не вучыў, паколькі і сам не ўмеў карыстацца гэтым пісьмом. У якасці доказу ён падаў «книжки» і «списки» Клінца – яго пісьмовыя практыкаванні [29, с. 275–276][14].

Сведчанне аб навучанні грамаце, якое ўтрымліваецца ў разглядаемай крыніцы, трэцяе па ліку. Як з яе вынікае, Жаслаўскі навучаўся грамаце ў Менску, а яго настаўнікам быў «діак» Дзмітр. Мяркуючы па абранай форме слова «діак», выключна рэдкай для дакументаў, яна пазначае сан святара (дыякан), а не свецкую пасаду «дьяка» або занятак свецкай асобы, якая займалася аказаннем паслуг па падрыхтоўцы і перапісцы тэкстаў (гэта пасада перадаецца ў актавых крыніцах, як правіла, як «дьяк», «дяк»).

Невядома, у якім узросце Жаслаўскі праходзіў навучанне. Калі дапусціць, што гэта было тады, калі князь з'яўляўся «выростъкомъ молодымъ» (як Клінец з Віцебска), яму было не менш за 7 гадоў [8, с. 112–117], то ў момант разгляду дадзенай справы менскаму намесніку споўнілася не менш за 47 гадоў, такім чынам, ён нарадзіўся каля 1464 г. Гэта дата вельмі верагодная з улікам звестак аб тым, што яго першая пасада – гаспадарскага двараніна – вядомая з крыніц, якія датаваны 1486–1488 гг. [51, s. 589]. У святле гэтых звестак магчыма растлумачыць, чаму Жаслаўскі вучыўся ў Менску. У 1470-х гг. ён як малалетні знаходзіўся пры бацьку Іване Юр'евічу Жаслаўскім у перыяд знаходжання Івана на пасадзе менскага намесніка (1468 – каля 1484 г.) [51, s. 587].

Дакумент інфармуе аб прадстаўніках мясцовай велікакняжацкай і мясцовай мітрапаліцкай адміністрацый. Паведамляецца аб менскім гараднічым (ён, праўда, вядомы і з больш ранніх крыніц), а таксама аб «воротном городском», які выконваў даручэнні менскага дзяржаўцы.

---

[14] Упершыню ў друку на гэтую крыніцу звярнуў увагу Іван Каманін з падказкі Міхаіла Ясінскага [6, с. 10].

У дакуменце згаданы таксама намеснік кіеўскага мітрапаліта – Мітка[15], які стаяў, між іншым, на варце царкоўнай маёмасці.

Крыніца даносіць да нас звесткі пра існаванне ў Менску пасады месцкага (ад слова «места») дзяка. Падобныя дзякі дзейнічалі ў гарадах ВКЛ, што мелі і не мелі магдэбургскага права (у вялікіх гарадах называліся пісарамі). Яны былі, напрыклад, у Вільні, Полацку, Горадні, Берасці, Ваўкавыйску, Коўне, Віцебску [4, с. 386–391]. Пасада месцкага дзяка (пісара) была свецкай. Але цікава, што месцкі дзяк Менска быў звязаны з сям’ёй святара: ён быў жанаты на дачцы святара царквы Міхаіла Архангела.

І апошняе, на чым трэба засяродзіць увагу. Паводле нашай здагадкі, дакумент пралівае святло на паходжанне адной царкоўнай рэліквіі – цудатворнай Мінскай іконы Божай Маці, якая можа аказацца больш старажытнай, чым гэта меркавалася раней. Гэтаму пытанню прысвечаны асобны артыкул, да якога мы і адрасуем чытача [5].

*Правілы публікацыі*. Умовы пандэміі, на жаль, не далі магчымасці наведаць бібліятэку, дзе захоўваецца апублікаваны дакумент, вывучыць яго de visu. Дакумент апісаны, яго тэкст набраны, крытыка тэксту ажыццёўлена на падставе скан-копіі яго правага і адваротнага бакоў. Метрычныя даныя зняты пры дапамозе лінейкі, прыкладзенай да гэтай копіі.

Крыніца падрыхтавана да друку ў адпаведнасці з рэкамендацыямі па выданні кірылічных дакументаў ВКЛ XIII–XVIII стст. [11]. Амаль усе літары, якія выйшлі з ужытку, захоўваюцца. Выключэнне складаюць літара ꙗ, якая замяняецца на «я», і літара «фіта», замест якой набіраецца «ф» (выпадкі выкарыстання «ферта» для абазначэння гуку агаворваюцца). Графічныя варыянты є (рознай вышыні і шырыні) і ε перадаюцца як «е», а два варыянты літары «ук» – петлепадобны, і ў выглядзе «о» з навісаючымі над ёй злучанымі, шырокімі, але не сіметрычнымі «крыламі», як ȣ. Тэкст падзелены на словы, сказы і абзацы. Уведзена сучасная сістэма пунктуацыі. Скарочана напісаныя словы раскрываюцца, прапушчаныя пад тытлай літары прыўносяцца ў радок і заключаюцца ў круглыя дужкі. Вынасныя літары вылучаны курсівам. Канец радка пазначаецца знакам |.

З-за немагчымасці вывучыць дакумент de visu давялося ўстрымацца ад ідэнтыфікацыі і замераў «квадратаў», утвораных лініямі згінаў дакумента.

[15] Аб тым, што гаворка ідзе пра намесніка мітрапаліта, а не менскага дзяржаўцу Багдана Іванавіча Жаслаўскага, вынікае са слоў істца, адрасаваных суддзі: «И **намѣстни*к* вашее м(и)л(о)*с*ти Ми*т*ко**, довѣда*в*ши сѧ того, и*ж* ѡни дво*р* ц(е)рковны*и* хотѧ*т* продати и заповѣда*л* и*м*, не веле*л* продавати».

Дакумент падрыхтавалі да друку А. І. Груша і А. Б. Доўнар (пры ўдзеле С. У. Палехава; памеры дакумента праверыў Конрад Жамянецкі, ён жа даслаў фота выяў вадзяных знакаў арыгінала і спіса; пячаткі № 1–3 і 5 апісаў А. І. Шаланда). Уступны артыкул з'яўляецца вынікам сумеснай працы А. І. Грушы, А. Б. Доўнара і С. У. Палехава. Аўтарства каментарыяў адзначана скарачэннямі: А. І. Груша – *А. Г.*, А. Б. Доўнар – *А. Д.*

Прынятыя для публікацыі скарачэнні: ал. – аловак; вын. – вынасны; выпр. – выпраўлена; інш. – іншы; кв. дуж. – квадратныя дужкі; ліг. – лігатура; пашкодж. – пашкоджаны; поч. – почырк; пр. – просты; рдк. – радок, радкі; ркп. – рукапіс; чрнл. – чарніла.

***[1510 г.] (індыкт 14 – ?) студзень 31.*** *Менск.* – Рашэнне суда архіепіскапа і мітрапаліта Кіеўскага і ўсяе Русі Іосіфа [ІІ Солтана] па цяжбе паміж святаром Спаскай царквы Данілам і пападзёй, удавой святара царквы Міхаіла Архангела, Апраняй аб двары

Zakład Narodowy im. Ossolińskich. – Dział Rękopisów. Zbiór dokumentów. Sygn. BO 3213. – K. 2. Арыгінал-$A_2$ (першы арыгінал-$A_1$ – запіс, зроблены ў Евангелле; згодна з карабарацыяй: «И дл҄ѧ лепшое твердости и пам҄ѧти тое дѣло ц(е)рковное веле*ли* есмо записати и въ Єѵ(ан)*г*(е)ліе собо*р*ное ц(е)ркви ѹписати»). Папера. [32,1]×[41,2]×32,3×44,5 (з улікам памераў наклеек і разгорнутых краёў).

*Захаванасць дакумента не зусім здавальняючая. Папера пашкоджана зацёкамі ад вады, абрывамі, разрывамі, пацёртасцямі (разрывы і пацёртасці – у месцах згіну дакумента) і дзірамі, пакінутымі насякомымі. Частка паперы (верхні, 163 мм, 23 мм, і правы край) і тэксту (яго пачатак) страчаны. Адварот дакумента рэстаўраваны пры дапамозе наклеек.*

*Палі: верхняе – 25 мм; правае – 8–20 мм; ніжняе – 65–67 мм; левае – 15–17 мм.*

*Умераны скорапіс. Сярэдні тэмп пісьма. Сярэдняе па «вазе» (націску) і памеру пісьмо. Вышыня літар (вымерана па літары «п») – 1 мм, шырыня (вымерана па той жа літары) – 1 мм. Вышыня літар з ніжнімі вынаснымі элементамі (вымерана па літары «р») – 5 мм. Вышыня літар з верхнімі вынаснымі элементамі (вымерана па літары «ук» у выглядзе «о» з навісаючымі над ёй «крыламі») – 4 мм. Пісьмо прамое.*

*Змяшаная форма рухаў пяра (прамалінейныя рухі чаргуюцца з крывалінейнымі). Не звязнае пісьмо (асобныя літары выконваюцца не звязнымі рухамі пяра). Прамежкавы тып злучэння рухаў пяра (калі літара складаецца больш чым з двух элементаў, то адны элементы напісаны безадрыўна, іншыя – з прамежкамі). У якасці памежных сігналаў выкарыстоўваюцца: кропкі, у тым ліку ў выглядзе косак, паміж групамі слоў (гэтыя кропкі стаяць на ніжняй лініі рдк.); «а» з верхнім вынасным элементам у якасці пачатко-*

*вай, канчатковай або адзінай літары слова; «и» з павялічанай левай мачтай у якасці пачатковай або адзінай літары слова; «ю» з павялічанай мачтай у якасці канчатковай літары слова. Выкарыстоўваюцца тры варыянты «ук»: «оу», петлепадобная і ў выглядзе «о» з навісаючымі над ёй злучанымі, шырокімі, але не сіметрычнымі «крыламі».*

*Адлегласць паміж рдк. – 6–8 мм. Лігатуры: «а»+«р»+«х», «а»+«у», «т»+«в», «т»+«ѡ». Тытлы маюць наступную форму: для вынасных надрадковых літар – у выглядзе дугі з больш выцягнутай левай ці правай часткай; для кантракцый і лічбаў – часцей за ўсё ў выглядзе скошанай крывой, левы канец якой загнуты ўніз, правы – уверх ці без загіну. Тытлападобныя літары і спалучэнні літар: «д», «да», «ди», «до», «ж», «з», «и», «ли» (адзін раз у апошнім рдк.), «м», «р» (адзін раз у канцы рдк.), «т» (як правіла, над «амегай», у іншых выпадках рэдка), «ти», «х», «ѣ» (адзін раз у канцы рдк.), «ф» («фіта»), «фе» (з выкарыстаннем «фіты»). Надрадковыя знакі рэдкія: галоўным чынам – у выглядзе невялікага паўкружжа, радзей вугалка, звернутых адкрытай часткай уніз, з пашыраным левым элементам; невялікага паўкружжа, звернутага адкрытай часткай уніз; прамой рысачкі з нахілам да пачатку рдк. – у выглядзе варыі (гравісу); прамой гарызантальнай рысачкі; радзей – двух прамых паралельных рысачак з нахілам да пачатку рдк. – у выглядзе падвойнай варыі (кендэмы); паерка (які паказвае на пропуск «ъ» ці «ь»).*

*Карычневае чрнл.*

*Вадзяны знак: круг з пастаўленым на яго перпендыкулярам, які заканчваецца зорачкай, тоесны гл.:* Лихачёв, Н. П. Палеографическое значение бумажных водяных знаков. – Санкт-Петербург : Тип. «В. С. Балашев и К°», 1899. – Ч. 3. Альбом снимков. – № 3403, 3404 (пачатак XVI ст.).

*На ніжнім полі былі прыціснуты 7 пячатак.*

*1) Злева прыціснута круглая з чорнага воску на кустодзіі пячатка. Захаванасць кепская – легенда і выява часткова зацёртыя, рэльефнасць адбітку слабая. У круглым полі выява Багародзіцы, якая сядзіць на троне, з дзіцём Ісусам на каленях, у правай руцэ трымае скіпетр, у нагах – герб Іосіфа II Солтана: на шчыт пакладзены роўнаканцовы крыж[1]. Па акружнасці паміж двух кругоў большага (знешні) і меншага (унутраны) дыяметраў, утвораных суцэльнымі лініямі, выкананы двухлінейным пісьмом надпіс, які разрывае німб над галавой Божай маці ўверсе і герб унізе:* **ПЕЧАТЬ**[2] [**ИѠСИФА**][3] [...][4] **М(ИТ)Р(О)П(О)Л(И)ТЪ КИЕВСКІ**[5] **І ВСЕѦ Р**. *Па баках галавы Багародзіцы:* **МР**|**ФУ**[6]. *Д=3,5. Кустодзія – адразная ромбападобная.*

*2) Справа ад № 1 прыціснута круглая з чорнага воску на кустодзіі пячатка. Захаванасць кепская – легенда і выява часткова зацёртыя, рэльефнасць адбітку слабая. У полі пяцівугольны шчыт, з адным з вуглоў унізе, з выявай стаячага ільва, які сваімі рысамі больш падобны на сабаку. Па акружнасці паміж двух кругоў большага (знешні) і меншага (унутраны) дыяметраў,*

*утвораных суцэльнымі лініямі, выканаы двухлінейным пісьмом надпіс:* **ПЕЧТЬ КН[ѦЗѦ][7] [БОГДАНА][7] ИВАНОВИЧА**[8]. *Д=2,9. Кустодзія – адразная ромбападобная.*

*3) Справа ад № 2 прыціснута круглая з чорнага воску на кустодзіі пячатка. У полі манаграма імя ўладальніка* **IѠНА**. *Па акружнасці паміж двух кругоў большага (знешні) і меншага (унутраны) дыяметраў, утвораных суцэльнымі лініямі, надпіс, выкананы двухлінейным пісьмом:* **ПЧТЬ АРХИМОНДР(И)-Т(А)**[8]. *Д=2,4. Кустодзія – адразная ромбападобная.*

*4) Справа ад № 3 была прыціснута круглая з чырвонага воску на кустодзіі пячатка. Разбурана. Дыяметр следу ад злепка воску – 2,5. Дыяметр фрагмента воску, які захаваўся, па гарызантальнай восі – 0,9, па вертыкальнай восі – 0,8. Адразная ромбападобная кустодзія не захавалася.*

*5) Справа ад № 4 прыціснута круглая з чорнага воску на кустодзіі пячатка. У полі шчыт, які сімвалічна ўтвараюць два вуглы накшталт «Г», з выявай клейнавага знака ў выглядзе пакладзеных у крыж дзвюх стрэл з вастрыямі на абодвух канцах. Наверсе шчыта надпіс, выкананы двухлінейным пісьмом:* **КЕТ**. *$Д_1$=1,2, $Д_2$=1,6. Кустодзія – адразная ромбападобная.*

*6) Справа ад № 5 была прыціснута круглая з зялёнага (?) воску на кустодзіі пячатка. Цалкам разбурана. Дыяметр следу ад злепка воску – 2,3. Адразная ромбападобная кустодзія не захавалася. Уверсе і ўнізе ад следу злепка воску фрагменты зялёнага воску, пры дапамозе якога мацавалася кустодзія.*

*7) Справа ад № 6 была прыціснута круглая з чырвонага воску на кустодзіі пячатка. Разбурана. Дыяметр следу ад злепка воску – 2,7. Дыяметр фрагмента воску, які захаваўся, па гарызантальнай восі – 1,1, па вертыкальнай восі – 0,8. Адразная ромбападобная (?) кустодзія не захавалася. Уверсе ад следу злепка воску фрагмент зялёнага воску, пры дапамозе якога мацавалася кустодзія. Унізе захаваўся толькі след ад гэтага воску.*

Паметкі. *На адвароце бліжэй да верхняга правага вугла цёмна-карычневым чрнл. зверху ўніз ПМ-1*: Dekret Jmo[…][9] | Metropolity[10], ktory[m][11] […][12] | […][12] sąd za grunt Cerk[iewny][13] | Spaski do Cerkwi [Sobor]|ney[14] Minskiey od[…][15] | Sukcessorow[16] Popa [Hrynia][17] | Anno 7018 D 31[18] [Janua]|rij[19] Indictione 1[4][20] *(XVII ст.).*

*Справа ад ПМ-1 інш. поч. карычневым чрнл. зверху ўніз ПМ-2:* […|…|…][21] | 1510. Januarij 31. D.[22] *(XVII ст.)*

*Ніжэй ПМ-2 інш. поч. чырвоным ал. зверху ўніз ПМ-3:* 540[23] (*XIX – ? ст.*).

*На правым баку аркуша на левым полі, насупраць 4–5 рдк. інш. поч. пр. ал. ПМ-4:* 1510 г.) | […]го[24] *(XIX–XX стст.).*

*На ніжнім полі бліжэй да левага вугла пад пячаткай № 1 пр. ал. ПМ-5:* 3213 *(другая палова XX ст.).*

*Справа ад ПМ-5 пад пячаткай № 2 чорным чрнл. штамп:* 3213 *(другая палова XX ст.).*

*Справа ад штампа пад пячаткай № 3 чорным чрнл. штамп:* Biblioteka | Ossolineum *(другая палова XX ст.).*

Спіс: *Б*) Zakład Narodowy im. Ossolińskich. – Dział Rękopisów. Zbiór dokumentów. Sygn. BO 3213. – K. 2b, XVII ст. (на $A_{2,}$ польскім пісьмом).

Рэгесты. 1) Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 1774 (Навагрудскі земскі суд). Воп. 1. Адз. зах. 3. Арк. 944 адв. (1763 г., спіс 1768 г.; публ.: Пазднякоў, В. С. Архіў праваслаўных і грэка-каталіцкіх мітрапалітаў Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVIII стст. (гісторыя, структура, склад) = Archive of Orthodox and Greek Catholic metropolitans of the Grand Duchy of Lithuania in the 16–18th centuries (history, structure, composition). – Мінск : БелНДІДАС, 2014. – С. 81); 2) Katalog dokumentów Biblioteki Zakładu Narodowego im. Ossolinskich. Dokumenty z lat 1276–1979 / oprac. I. Lipiński. – Wrocław : T-wo Przyjacioł Ossolineum, 1999. – S. 16.

Заўвагі

*1) Нягледзячы на дасканаласць дзелавога пісьма дакумента, блізкага да таго, якім карысталіся ў гэты час работнікі велікакняжацкай канцылярыі, некаторыя яго асаблівасці характэрныя больш для пісьма кніг. Гэта выкарыстанне «і» (хоць і рэдка), варыянту «ук» у выглядзе* «о» *з навісаючымі над ёй злучанымі, шырокімі, але не сіметрычнымі «крыламі», «іжыцы» (хоць і рэдка: у двух словах –* Еvстафеи, Єv(ан)г(е)ліе), *літары «ферт» (для перадачы гуку, рэдка), вялікай колькасці лігатур, вынасных тытлападобных* «до». *Названыя асаблівасці выдаюць у выканаўцы пісьма перапісчыка, які паходзіў з духоўнага асяроддзя або быў шчыльна звязаны з ім. Вядомы наступныя пісары і дзякі мітрапаліта Іосіфа Солтана: Васка Алехнаў сын Місуніча, Фёдар, Езаф Федкавіч і Макар (*Пазднякоў, В. С. Архіў праваслаўных і грэка-каталіцкіх мітрапалітаў… – С. 83; Русская историческая библиотека, издаваемая Императорскою Археографическою комиссиею: в 39 т. – Санкт-Петербург, 1872–1927. – Т. 20: Литовская метрика. – Т. 1. – 1903. – Стб. 1470*). Магчыма, адзін з іх і быў складальнікам і перапісчыкам дадзенага дакумента.*

*2) Хутчэй за ўсё, пячаткі прымацоўваліся ў такой паслядоўнасці: ад № 3 да № 1. Пра гэта можа сведчыць той факт, што левы вугал наступнай кустодзіі (злева направа) знаходзіцца пад правым вуглом папярэдняй кустодзіі.*

**М**ы[25], Иѡсиф[26], [м(ило)с]тію[27] Божею [архиеп(и)ск(о)]пъ[28], митрополи[*т*][29] Кие[*в*]скии[30] и [всеѧ Рꙋси[31]. А з[32] нами был кн(ѧ)з Богдан Иванович, наместник менскии; а городничии менскии Волчко Шепелевич[A]; пан Кретов[33] Калени]кович[34]; а архімандритъ[35] Иѡн[а][36 B]; [а][36] [на]|стоятел[36] възнесенскии Сергіи[C]; игꙋмен николскии Нектареи; с(вѧ)щ(е)нноинок Антонеи, протѡпоп[37] м[енскии][38]; по[*п*][39] козмоде[*м*]яньски[*и*][40] Фома; п[о]*п*[41] [п]р(е)ч(и)стенскии[41] Фома; поп юрьевски[*и*][42] Ф[ома][43]; [Монков][44], [бо]ярин[45] клецкии[46]; бꙋрмистры[47] мес[та][48] | Менского Федор Шокало; Еvстафеи Шарипа; Ивашко Воитович; Филип[49] Рылович[D].

Смотрели есмо т[ого][50] [дела][50] [в][50] нашом д(ꙋ)хѡвном праве.

Жаловал перед нами поп сп(а)скии Данило на попадю Гриневꙋ, жонꙋ михаиловского попа, на[51] Ѡпраню, | и на с(ы)на еѣ Ивашка тым ѡбычаем: «Таѧ, деи, попадѧ и з сыном своим живет ꙋ ц(е)рковном дворе звѣчном [ꙋ Город]е[52] Менскꙋ, перед самою ц(е)рковю С(вѧ)т(о)го Сп(а)са. Тое дворище ц(е)ркѡвное подле [ста]росты[53] жомоитского двора[E] а Якова Лавриновича[54], | а з дрꙋгое стороны по Антонов Наоумовича двор а попа кꙋзмодемяньского. А в том дворе здавна[55] и с[тарыны][56] попы живали з митрополичеѣ[57] воли. И девер тое попади Прокопеи, поп ꙋ С(вѧ)т(о)го Сп(а)са, передо мною слꙋжил и в тѡм[58] дворе | жил. А брат того Прокопа, мꙋж еѣ Гринь, ꙋ С(вѧ)т(о)го Михаила слꙋжил а в том же дворе жил. И как Проко[*пѧ*][59], [попа][59] [спас]кого[59], Б(о)гъ собрал, и небожчик Иѡна, митрополит[F], тꙋю ц(е)ркѡв С(вѧ)т(о)го[60] Сп(а)са мнѣ дал, и я его м(и)л(о)сти тогды чолом бил ѡ тѡт | двор ц(е)рковныи, абы ми казал там жити. И ѡн ми так рек: “Как, деи, бꙋдꙋ ꙋ Менскꙋ, тогды [сѧ][61] [довед]аю”[61 G]. И после того ꙋ Менскꙋ его м(и)л(о)сть не был, и Б(о)гꙋ д(ꙋ)шꙋ дал. И нинѣ таѧ поподѧ в том дворе живет въ ц(е)ркѡвном. | И к собѣ вжо зѧтѧ своего впꙋстила, дьяка менского. И тот зѧть еѣ почал тот двор продав[*ати*][62] ѡд[*ным*][63] [зе*м*]лѧном[64] здѣшним. И намѣстник вашее м(и)л(о)сти Митко, довѣдавши сѧ того, иж ѡни двор ц(е)рковныи хотѧт продати | и заповѣдал им, не велел продавати».

И поподѧ Апранѧ[65] так рекла: «Тот двор перед Св(ѧ)тым С[пас]ом[66] мꙋжа[67] моего[68] Гринѧ ѡтчина и дѣдина. И так есми оу мꙋжа моего слыхала, иж предки его ꙋже четвертыи[69] рѡд, все были с(вѧ)ще|нники, а в том дворе живали. Потомꙋ и я з сыном своим живꙋ, иж ес его ѡтчина»[H].

И поп сп(а)скии Данило так р[ек][70]: «И я то[71] вѣдаю, иж предки мꙋжа [тв]оего[72] и мои в том дворе живали а слꙋжили ц(е)ркви Божеи и здавна, а деpживали *то*т *дво*р | и з воли митрополичеѣ. А нинѣ я ꙋ С(вѧ)т(о)го Сп(а)са слꙋжꙋ, а ты з сыном своим живеш ꙋ дворе ц(е)ркѡвном[73]».

И попадѧ миха[иловс]каѧ[74] так рекла: «Смотрел ѡ том дворе небожчик Иѡна, митрополит, мꙋжа моего Гринѧ с тобою. И тот двор мꙋжꙋ моемꙋ присꙋ|дил. И листъ свои емꙋ дал». И тот листъ митрополичии перед нами положила.

Ино в листе Иѡны, митрополита, стои*т*, што *ж* «хотѣ*л* по*п* сп(а)*с*ки*и* Дани[ло][75] [ꙋ]стꙋпати[76] сѧ ꙋ дво*р* попа сп(а)*с*кого *ж*, небо*ж*чика Проко*п*ѧ, ꙋ Городе. И мы того довѣдавши сѧ, | што *ж* то е*с* извѣчныи дво*р* небо*ж*чика Проко*п*ѧ. И би*л* на*м* чоло*м* по*п* михаило*в*ски*и* Гри*н*, абыхмо его не ѡ*т*далил*и* [ѡ]*т*[77] [тое *ж*][78] из[в]ѣ*ч*ное[79] и*х* ѡ*т*чины. Ино мы емꙋ то*т* дво*р* дали. Мае*т* ѡ*н* то*т* дво*р* держати и дѣти и*х*. А попо*м* сп(а)*с*ки*м* не на*до*бѣ ꙋ то*т* дво*р* | ꙋстꙋпати сѧ».

Фонд юстыц-калегіі захаваўся за ўвесь перыяд яе існавання, а ў якасці архіўных даведнікаў выкарыстоўваюцца пераважна складзеныя падчас дзейнасці ўстановы вопісы спраў (храналагічныя рэестры), што характэрна для большасці разгледжаных у артыкуле архіўных фондаў. Спецыфікай дадзенага органа з'яўляецца арганізацыя справаводства і архіўнай справы на нямецкай мове, што было абумоўлена сферай яго паўнамоцтваў. Першы вопіс фонду 284 (РДАСА) падзелены на чатыры часткі, у якіх выкарыстана храналагічная (частка 1) і функцыянальна-храналагічная схемы сістэматызацыі спраў (часткі 3 і 4). Пры гэтым у трэцяй частцы прадстаўлены пераважна судовыя справы, а ў чацвёртай частцы – журналы і пратаколы пасяджэнняў [33]. Улічваючы функцыі юстыц-калегіі, цікавасць для даследавання канфесіянальнай гісторыі Беларусі ў першую чаргу мае распарадчая і ўліковая дакументацыя, а таксама судовыя справы. Арганізацыя дзейнасці органаў кіраўніцтва іншаслаўнымі канфесіямі адлюстравана ў распарадчай і пратакольнай дакументацыі, перапісцы. Пошук па судовых справах мэтазгодны толькі паводле асабовай прыкметы, бо ў вопісе не пазначана месца паходжання істца і адказчыка або кансісторыя, у якую яны звярталіся [33].

У 1817 г. з ГУДСЗВ і Міністэрства народнай асветы было ўтворана Міністэрства духоўных спраў і народнай асветы (МДСНА), якое існавала да 1824 г. [31; 28, арт. 27106]. Адпаведна сферы сваёй кампетэнцыі Міністэрства ўзаемадзейнічала з Сінодам, Рымска-каталіцкай духоўнай калегіяй (РКДК) і юстыц-калегіяй. Дэпартамент духоўных спраў падзяляўся на чатыры аддзяленні: грэка-расійскага веравызнання; рымска-каталіцкага, уніяцкага і армянскага веравызнанняў; пратэстанцкіх веравызнанняў; нехрысціянскіх веравызнанняў [28, арт. 27106]. У першым разглядаліся меморыі і справаздачы Сінода, штогадовыя справаздачы пра дзейнасць Сінода і камісіі духоўных вучылішчаў, перапіска аб узаемадзеянні з міністрамі, зносіны з обер-пракурорам і інш. Гэта прыводзіла да дубліравання функцый Сінода і міністэрства [32, с. 197]. У другім стале першага аддзялення разглядаліся прадстаўленні духавенства да дзяржаўных узнагарод, здарэнні ў цэрквах, вяліся спісы чыноўнікаў і сакрэтныя справы. У другім аддзяленні Дэпартамента духоўных спраў МДСНА мелася тры сталы, у першым з якіх разглядаліся

адміністрацыйныя справы (стварэнне дыяцэзій, пабудова і закрыццё касцёлаў і кляштараў, размеркаванні фундушаў, прызначэнне і звальненне членаў РКДК, дыяцэзіяльнага і кляштарнага кіраўніцтва, скаргі на духавенства, зносіны з Рымам) і ажыццяўляўся збор статыстычных звестак. У другім стале канцэнтраваліся звесткі па аглядзе дыяцэзій і манаскіх ордэнаў, апісанні кляштараў, звесткі пра дзейнасць навучальных устаноў, прызначэнні святароў паводле патрабавання ваенных і цывільных улад, а таксама прыцягненне святароў з-за мяжы. У трэцім стале разглядалі дамоўныя справы аб арэндзе, маёмасныя скаргі, рэвізіі. У трэцім аддзяленні, дзе вяліся справы пратэстанцкіх цэркваў, было два сталы. У першым з іх разглядалі кадравы склад генерал-суперінтэндантаў, суперінтэндантаў і свецкіх дырэктараў і членаў кансісторый, арганізацыю справаводства ў іх, а таксама наданне духоўнага сану і ўзнагароджанне пастараў і ад’юнктаў, выклік святароў з-за мяжы, адміністрацыйныя справы (пабудова і ліквідацыя кірхаў, збор сродкаў у азначаных мэтах), справы аб шлюбаванні, выдзяленні пенсіі і інш. У другім стале разглядаліся маёмасныя справы пратэстанцкіх кірхаў, у тым ліку арэнда, ведамасці даходаў і выдаткаў, ведамасці пра духавенства і колькасць народжаных, шлюбаваных і памерлых прыхаджанаў, навучальных устаноў. Міністр духоўных спраў і народнай асветы асабіста разглядаў адміністрацыйныя (агульныя) справы, якія падаваліся з РКДК у Сенат, маёмасныя справы, рыхтаваў заключэнні па справах другога і трэцяга аддзяленняў для Сената. Судовыя справы паступалі непасрэдна ў Сенат і міністру юстыцыі. Кансістарыяльныя справы па сферы дзейнасці юстыц-калегіі перадаваліся міністру праз пракурора калегіі, а адміністрацыйныя справы разглядаліся паводле аналогіі з парадкам, усталяваным для рымска-каталіцкай духоўнай калегіі. Пры гэтым міністр МДСНА ў выпадку нязгоды з калегіяй мог накіроўваць на выкананне ўласнае рашэнне, якое калегія магла абскардзіць [28, арт. 27106].

Узноўлена дзейнасць ГУДСЗВ і Міністэрства народнай асветы была ў 1824 г. з іх папярэднімі функцыямі, але гэтая сістэма праіснавала непрацяглы час [31]. З зацвярджэннем статутаў іншаземных веравызнанняў у 1832 г. іншаслаўныя канфесіі былі падпарадкаваны Міністэрству ўнутраных спраў (МУС), у якім гэтыя функцыі выконваў Дэпартамент замежных веравызнанняў (Дэпартамент), утвораны з далучанага ГУДСЗВ [29, арт. 5126; 44, арт. 365]. Сферы адказнасці міністра МУС належалі разгляд і распаўсюджванне бул і іншых дакументаў Папы Рымскага, распараджэнні пра спагнанні з прадстаўнікоў духавенства, якія, паводле яго звестак, ажыццяўлялі *«шкодную для дзяржаўнага парадку»* або *«мірнага цячэння рэлігійнага жыцця»* дзейнасць [42, арт. 17]. Рэарганізацыі падпарадкавання дзяржаўным органам асобных канфесій працягваліся. Так, у 1837 г. уніяцкая царква была выведзена з падпарадкавання МУС і

перададзена ў кампетэнцыю обер-пракурора Сінода [29, арт. 9825]. Дэпартамент 6 жніўня 1880 г. атрымаў юрыдычны статус, які захоўваўся да 16 сакавіка 1881 г. [29, арт. 61279; 30, арт. 20].

У архіўным фондзе 821 «Дэпартамент духоўных спраў замежных веравызнанняў МУС» (РДГА) аб'яднаны матэрыялы дзейнасці папярэдніх органаў і структурных адзінак з адпаведнымі функцыямі, якім былі падпарадкаваны іншаслаўныя веравызнанні пасля міністэрскай рэформы [36]. У фондзе справы сістэматызаваны паводле канфесіянальнай і структурна-храналагічнай прыкмет. Пры гэтым вопіс 1 утрымлівае справы пра міжканфесійныя пераходы, адміністрацыйныя справы пра спагнанні на карысць прадстаўніцтваў рымска-каталіцкай царквы, судовыя справы аб дазволе на шлюб за 1810–1901 гг. Вопіс 3 адлюстроўвае наступствы паўстання 1863–1864 гг. Нарматыўнае рэгуляванне дзейнасці царквы адлюстравана ў справах вопісу 125. Стасункі з Рымам, адміністрацыйныя справы (пабудова храмаў, утварэнне прыходаў і інш.), судовыя справы аб скасаванні шлюбу за 1910–1917 гг. маюцца ў вопісе 128, а таксама вопісах 138, 144, 150. Рэгуляванне дзейнасці ўніяцкай царквы па пытаннях міжканфесійных пераходаў адлюстравана ў справах вопісу 128, а адміністрацыйныя і асабовыя справы сістэматызаваны ў вопісе 4 за 1802–1905 гг. Адміністраванне дзейнасці пратэстанцкіх цэркваў у 1820–1912 гг. адлюстравана ў справах вопісу 5, а маёмаснае і прававое становішча ў 1799–1879 гг. – у вопісе 6 [36]. Адпаведна, матэрыялы гэтага архіўнага фонду дазваляюць разгледзець узаемаадносіны іншаслаўных канфесій з замежным канфесіянальным кіраўніцтвам, выявіць асаблівасці развіцця кожнай з канфесій у імперыі і нарматыўнага рэгулявання іх дзейнасці.

Канфесіянальнае кіраўніцтва хрысціянскімі канфесіямі ў Расійскай імперыі прадстаўлена цэнтральнымі органамі і епархіяльнымі органамі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага кіраўніцтва і духоўнага суда. Іх фарміраванне пачалося з падзеламі Рэчы Паспалітай у канцы XVIII ст. і працягвалася ў першай трэці XIX ст., за выключэннем праваслаўнай царквы: кіраўніцтва ёю было з 1772 г. засяроджана ў руках обер-пракурора Сінода [28, арт. 18504]. Адпаведна, інфармацыйны патэнцыял архіўнага фонду яго канцылярыі ўсебакова адлюстроўвае развіццё праваслаўнай царквы і яе ўзаемадзеянне з іншымі веравызнаннямі, у тым ліку на беларускіх землях. Улічваючы, што шэраг вопісаў спраў сфарміраваны паводле структурна-храналагічнай прыкметы падчас дзейнасці фондаўтваральніка, а таксама адсутнасць геаграфічных паказальнікаў да іх, выяўленне матэрыялаў патрабуе мэтанакіраванай работы па пэўным аспекце канфесіянальнай гісторыі [35, воп. 1–92]. Апрача згаданага, даследчыку арганізацыі кіраўніцтва хрысціянскімі цэрквамі будзе цікавы архіўны фонд канцылярыі Сінода [34]. Падчас эўрыстыкі ў ім

неабходна ўлічваць, што найбольш значныя справы перадаваліся на разгляд обер-пракурора, таму можа адбывацца дубляванне інфармацыі.

Фарміраванне органаў канфесіянальнага прадстаўніцтва рымска-каталіцкай царквы пачалося з вызначэння функцый юстыц-калегіі, якая паводле ўказа Сената ад 26 студзеня 1782 г. не павінна была ўмешвацца ў справы рымска-каталіцкага веравызнання, але, калі адказчык па судовай справе быў пратэстантам, то разглядаць справу павінна калегія [28, арт. 16955]. У лютым 1797 г. у яе складзе быў створаны Дэпартамент для рымска-каталіцкіх юстыцкіх спраў, які праіснаваў год [28, арт. 17836]. Са студзеня 1798 г. дэпартамент набыў юрыдычны статус, і яго ўзначаліў арцыбіскуп Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч [28, арт. 18345], што заклала падмурак для стварэння ў 1801 г. РКДК, у склад якой першапачаткова ўвайшлі прадстаўнікі рымска-каталіцкага вышэйшага кліру. Калегія назірала за выкананнем агульнадзяржаўнага заканадаўства, разглядала скаргі на кіраўніцтва дыяцэзіямі, дзейнасць кляштараў, збор звестак пра кляштары, касцёлы і духавенства і інш. [28, арт. 20053]. Яе стварэнне абмяжоўвала традыцыйныя для рымска-каталіцкіх біскупаў правы, што абскарджвалася мітрапалітам [52, арк. 3–5]. Да вырашэння гэтага пытання прадстаўнікі вышэйшага каталіцкага кліру звярнуліся і ў пачатку XX ст., але яна праіснавала да кардынальных змен на грамадска-палітычнай арэне краіны [1; 19, арк. 90–98].

Вопісы 1–5 архіўнага фонду РКДК сістэматызаваны падчас дзейнасці калегіі паводле храналагічнай, вопісы 6–8 – паводле структурна-храналагічнай, вопісы 10–12 – намінальна-храналагічнай прыкмет. Першыя пяць вопісаў ахопліваюць праблематыку адміністрацыйна-тэрытарыяльнай структуры, маёмасці, прыняцця судовых рашэнняў, таму пры даследаванні дзейнасці рымска-каталіцкіх кансісторый яны будуць найбольш актуальнымі. Адначасова неабходна ўлічваць, што сярод матэрыялаў фонду значны аб’ём складае перапіска з вышэйстаячымі органамі дзяржаўнага кіраўніцтва канфесіямі. Дзейнасць уніяцкіх кансісторый адлюстравана абмежавана, у тым ліку з-за перадачы матэрыялаў адпаведных структурных адзінак пры іх перападпарадкаваннях, і толькі да 1828 г. [37].

Уваходжання прадстаўнікоў уніяцкай царквы ў склад РКДК першапачаткова не прадугледжвалася, хаця царква ёй адміністрацыйна падпарадкоўвалася. Толькі ў 1805 г. калегія падзялілася на два дэпартаменты адпаведна цэрквам [28, арт. 21291], а ў 1828 г. была ўтворана Грэка-ўніяцкая духоўная калегія. Матэрыялы дзейнасці апошняй перайшлі да правапераемніка – Беларуска-літоўскай духоўнай калегіі, якая пачала сваё функцыянаванне з падпарадкаваннем уніяцкай царквы Сіноду ў 1837 г. [29, арт. 12133]. У архіўным фондзе калегіі прадстаўлены адміністрацыйныя справы (справаздачы кансісторый), уліковая

дакументацыя (візіты цэркваў і статыстычныя ведамасці аб іх стане), судовыя справы аб скасаванні шлюбу. Пры гэтым справы ў вопісе 1 сістэматызаваны ў адпаведнасці з храналогіяй і падпарадкаваннем пасрэдніцкага органа ўніяцкай царквы архівістамі падчас дзейнасці ўстаноў. Пры складанні другога вопісу выкарыстана намінальна-храналагічная схема сістэматызацыі. Падчас эўрыстыкі неабходна таксама ўлічваць, што шэраг матэрыялаў быў перададзены ў Гаспадарчае ўпраўленне пры Сінодзе ў 1882 г. [39]. Каштоўным здабыткам для даследавання арганізацыі дзейнасці органаў канфесіянальнага кіраўніцтва з'яўляецца архіў уніяцкіх мітрапалітаў [27; 38].

Пратэстанцкія цэрквы ў асноўным былі прадстаўлены рэфарматарскай і лютэранскай цэрквамі, але яны былі нешматлікімі. У 1818 г. усе плыні пратэстантызму былі аб'яднаны ў «евангелічную царкву» [28, арт. 27217], а ў наступным годзе была ўтворана Дзяржаўная евангелічная генеральная кансісторыя, якой былі перададзены кансістарыяльныя справы пратэстанцкага веравызнання з юстыц-калегіі [28, арт. 27897], хаця фактычна яе дзейнасць не распачалася. Хутка юстыц-калегіі пачалі вяртаць паўнамоцтвы ў дачыненні да гэтай канфесіі, напрыклад, у 1820 г. на разгляд спраў аб дазволе на шлюб пры наяўнасці блізкіх роднасных сувязяў [31]. Да пытання ўтварэння Генеральнай кансісторыі ў Санкт-Пецярбургу вярнуліся ў 1828 г., і з прыняццем Статута ў 1832 г. яна распачала сваю дзейнасць, ахопліваючы ўсе плыні пратэстантызму пад сваім кіраўніцтвам. Сфера кампетэнцыі Генеральнай кансісторыі ахоплівала агульнае кіраўніцтва евангелічна-лютэранскай царквой у імперыі, кантроль дзейнасці мясцовых кансісторый і пасярэдніцтва паміж канфесіянальным кіраўніцтвам і вышэйшымі органамі дзяржаўнай улады, дазволы на ўступленне ў шлюб пры розных ступенях сваяцтва і пазбаўленне сану [45, с. 55]. Праз генеральную кансісторыю і МУС пратэстанты звярталіся па дазвол імператара, а таксама па іншых справах у міністэрствы адпаведна іх кампетэнцыі і прадстаўніцтвы іншых канфесій [43, арт. 561, 986]. Сярод матэрыялаў яе дзейнасці пераважная большасць тычыцца дзейнасці абшчын рэгіёнаў, у якіх найбольш быў распаўсюджаны пратэстантызм. Пры гэтым вопісы 1–12 прадстаўлены на нямецкай мове паводле храналагічнай прыкметы, а 13–14 – на рускай мове з выкарыстаннем намінальна-храналагічнай схемы сістэматызацыі [41].

З 1824 г. копыская абшчына з юстыц-калегіі перадавалася ў падпарадкаванне Літоўскага евангелічна-рэфарматарскага сінода (Літоўскі сінод) [28, арт. 29868], а ў перыяд паміж яго з'ездамі пачала дзейнічаць Літоўская рэфарматарская калегія [45, с. 38–39]. Матэрыялы дзейнасці Сінода захоўваюцца ў выглядзе калекцыі ў Літоўскай нацыянальнай бібліятэцы імя Марцінаса Мажвідаса. Сярод іх – адміністрацыйна-гаспадарчая дакументацыя, акты мясцовых сінодаў і візітацыі кірхаў [47].

Непасрэднае кіраванне прадстаўніцтвамі хрысціянскіх цэркваў і іх аб'яднаннямі ў межах епархій ажыццяўлялі кансісторыі як органы, у функцыі якіх уваходзіла адміністрацыйна-тэрытарыяльнае кіраванне і духоўны суд. Матэрыялы іх дзейнасці падзяляюцца на сістэмы агульнай і спецыяльнай (канфесіянальнай) дакументацыі. Першая з іх уключае падсістэмы распарадчай, пратакольнай, кадравай, рэгістрацыйна-ўліковай дакументацыі справаводства і архіваў, перапіску. Сістэма канфесіянальнай дакументацыі адлюстроўвае спецыфіку кожнай з канфесій і ўключае падсістэмы адміністрацыйнай, уліковай, дамоўнай, судовай дакументацыі, дакументальнага афармлення рэгістрацыі грамадзянскага стану прыватных асоб і змены імі канфесійнай прыналежнасці [3, с. 74–146]. Пры гэтым распарадчую і адміністрацыйную дакументацыю вышэйстаячых устаноў кансісторыі хрысціянскіх канфесій захоўвалі нават падчас экспертызы каштоўнасці дакументаў і выдзяленні іх да знішчэння [15, с. 7–10], таму, пры ўмове захаванасці пазначаных матэрыялаў пасля ліквідацыі ўстаноў, у архіўных фондах кансісторый дублюецца дакументацыя органаў дзяржаўнага і канфесіянальнага кіраўніцтва. Таму зварот да архіўных фондаў органаў епархіяльнага кіраўніцтва дазваляе аператыўна вылучыць спецыфіку кіравання кожнай з епархій. У адпаведнасці з пазначаным магчыма сцвярджаць, што матэрыялы справаводства кансісторый пры ўмове іх рэпрэзентатыўнай захаванасці з'яўляюцца галоўнымі крыніцамі пры даследаванні арганізацыі канфесіянальнага кіраўніцтва на епархіяльным узроўні.

На беларускіх землях дзейнічалі Магілёўская, Полацкая, Мінская і Гродзенская праваслаўныя епархіі, у кожнай з якіх былі ўтвораны адпаведныя кансісторыі. Пры гэтым неабходна ўлічваць, што паміж імі адбыўся шэраг тэрытарыяльных рэарганізацый, што абумоўлівае напрамкі выяўлення інфармацыі. Напрыклад, у 1772 г. Віцебская, Дзвінская, Полацкая правінцыі адышлі да Пскоўскай праваслаўнай епархіі [28, арт. 13921], з матэрыялаў яе кансісторыі могуць быць выкарыстаны дакументы за 1772–1788 гг. [6]. Указамі ад 6 мая 1788 г. і 4 жніўня 1799 г. межы епархій спрабавалі прывесці ў адпаведнасць з дзяржаўным адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам [28, арт. 16658, 19070]. Пры гэтым матэрыялы дзейнасці кожнай з кансісторый імкнуліся перадаваць адпаведна падпарадкаванню тэрыторый, таму ў залежнасці ад захаванасці фонды органаў епархіяльнага кіраўніцтва з'яўляюцца прыярытэтнымі пры выяўленні звестак пра арганізацыю дзейнасці органаў кіраўніцтва праваслаўнай царквой на беларускіх землях. Аднак яны захаваліся нераўнамерна. Найбольшы аб'ём дакументаў уласнага справаводства праваслаўных кансісторый знаходзіцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (далей – НГАБ), у прыватнасці, у архіўным фондзе Мінскай кансісторыі. Гэтыя матэрыялы сістэматызаваны паводле хра-

налагічнай прыкметы [11]. Уласнае справаводства Магілёўскай і Полацкай праваслаўных кансісторый захавалася фрагментарна [2; 17; 18]. Гродзенская епархія з адпаведнымі органамі кіраўніцтва была ўтворана ў 1900 г. шляхам вылучэння тэрыторыі адпаведнай губерні з Віленскай і Літоўскай епархіі (утворана ў 1839 г. з Мінскай і Літоўскай), таму для даследавання арганізацыі канфесіянальнага кіраўніцтва неабходна прыцягваць адпаведныя матэрыялы [11; 50]. У архіўным фондзе Гродзенскай праваслаўнай кансісторыі найлепш захаваліся кліравыя ведамасці духавенства, але яны таксама не прадстаўлены цэласным комплексам [23, воп. 2].

Рымска-каталіцкія прадстаўніцтвы з 1773 г. былі адміністрацыйна аб'яднаны ў Беларускую рымска-каталіцкую дыяцэзію [28, арт. 14122], якая была ў 1782 г. рэарганізавана ў Магілёўскую архідыяцэзію з кансісторыяй у ёй [28, арт. 15326, 15876]. Матэрыялы дзейнасці апошняй уключылі яе папярэдніка і захаваліся амаль на 46 % ад першапачатковага складу. Улічваючы, што намінальна кансісторыю ўзначальваў арцыбіскуп, цікавасць маюць таксама матэрыялы дзейнасці канцылярыі каталіцкіх мітрапалітаў (арцыбіскупаў) [40]. Мінская кансісторыя разам з адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай была ўтворана ў 1798 г. [28, арт. 13921]. У выніку перамяшчэнняў яе архіва як падчас дзейнасці, так і пасля ліквідацыі, ён захаваўся амаль на 63 % [3, арк. 69–72, 150; 12; 14]. Заходнія тэрыторыі беларускіх зямель уваходзілі ў склад Віленскай дыяцэзіі. Архіўны фонд апошняй для даследчыка шэрагу напрамкаў канфесіянальнай гісторыі, архіўнай справы і справаводства мае цікавасць таксама з прычыны падпарадкавання ёй тэрыторыі Мінскай дыяцэзіі ў 1869–1883 гг., але пераважна Віленскай кансісторыяй падчас адміністрацыйнага кіравання тэрыторыяй Міншчыны разглядаліся маёмасныя справы і пытанні рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану насельніцтва [48].

Уніяцкая царква мела разгалінаваную адміністрацыйна-тэрытарыяльную структуру падчас уваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі, але ўжо ў 1772 г. колькасць епархій скарацілася з васьмі да чатырох і ў снежні засталіся Полацкая архіепархія (з 1828 г. – Беларуская) і Віленская мітрапалітальная епархія, якія таксама былі ліквідаваны ў 1795 г. Полацкая ўніяцкая кансісторыя пачала дзейнічаць у 1780 г. [28, арт. 15028]. У 1798 г. былі ўтвораны Брэсцкая і Луцкая епархіі, а таксама ўзноўлены Літоўская (Віленская) і Полацкая [9, с. 6; арт. 18503, 23482, 24118]. Паводле ўказа ад 22 красавіка 1828 г. колькасць епархій скарацілася да дзвюх – Літоўскай і Беларускай [29, арт. 1977], а ў 1839 г. засталася толькі адна – Літоўская [29, арт. 11995]. Пасля ліквідацыі епархій матэрыялы іх дзейнасці размяркоўваліся па прыналежнасці тэрыторый, пераважна да праваслаўных епархій [21], але сучаснымі архівістамі

падчас перапрацоўкі архіўных фондаў шэраг з іх вылучаецца ў самастойныя фонды недастатковага інфармацыйнага патэнцыялу для даследавання арганізацыі кіраўніцтва ўніяцкай царквой [13; 20; 22; 24; 25], хаця распарадчая і ўліковая дакументацыя маецца ў архіўным фондзе Брэсцкай уніяцкай кансісторыі [24].

Кальвінісцкія (рэфарматарскія) абшчыны беларускіх зямель не былі аб'яднаны ў епархіяльныя структуры і па бягучых пытаннях звярталіся ў юстыц-калегію да аб'яднання ў евангелісцкую царкву. Кіраўніцтва лютэранскай царквой ажыццяўляла Віленская кансісторыя [29, арт. 21450]. У 1830 г. яна была ліквідавана і яе справы перададзены Курляндскай кансісторыі [29, арт. 3741; 46], акруга якой ахоплівала кірхі Курляндскай, Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губерняў [43, арт. 544; 29, арт. 5870, 21450]. Аднак пры даследаванні арганізацыі кіраўніцтва пратэстанцкімі цэрквамі неабходна ўлічваць пэўную аўтаномнасць абшчын у прыняцці рашэнняў адміністрацыйна-гаспадарчага характару, што адлюстравана непасрэдна ў іх архіўных фондах, якія захаваліся таксама няпоўна [16; 26].

Такім чынам, у выніку шэрагу адміністрацыйных рэформ на дзяржаўным узроўні была сфарміравана сістэма кіраўніцтва хрысціянскімі канфесіямі на беларускіх землях пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, што абумоўлівае напрамкі выяўлення крыніц для даследавання арганізацыі дзейнасці органаў кіраўніцтва імі. Пры правядзенні эўрыстычнай работы неабходна ўлічваць спецыфіку кожнай з канфесій. Так, дзейнасць праваслаўнай царквы ў 1817–1824 гг. рэгулявалася МДСНА. Уніяцкая царква падпарадкоўвалася юстыц-калегіі да 1801 г., ГУДСЗВ (1810–1817 гг.; 1824–1832 гг.), МДСНА (1817–1824 гг.) і Дэпартаменту МУС (з 1832 г.). Падпарадкаванне рымска-каталіцкай царквы было вызначана аналагічным чынам і з 1832 г. было ўніфікавана пад кіраўніцтвам МУС з пратэстанцкімі цэрквамі да 1918 г. Аднак непасрэднае падпарадкаванне апошніх юстыц-калегіі працягвалася да 1817 г., а затым да 1832 г. гэты орган разглядаў кансістарыяльныя справы ў адпаведнасці са сваёй кампетэнцыяй у суаднясенні з іншымі органамі дзяржаўнага кіраўніцтва. Менавіта за пазначаны перыяд для кожнай з канфесій мэтазгодна прыцягваць архіўныя крыніцы. Улічваючы функцыі згаданых дзяржаўных органаў, карысным з'яўляецца прыцягненне ў першую чаргу распарадчай дакументацыі, а таксама перапіскі справаздачнага характару з цэнтральнымі органамі кіраўніцтва хрысціянскімі канфесіямі.

Кіраўніцтва праваслаўнай царквой у Расійскай імперыі з 1772 г. да 1918 г. было засяроджана ў Сінодзе, на чале якога стаяў обер-пракурор. Спробы арганізацыі аналагічнага падпарадкавання для рымска-каталіцкай царквы скончыліся няўдала, таму з 1782 г. шляхам паступовага вылучэння з юстыц-калегіі ствараецца ў 1801 г. РКДК, якая, абмяжоўва-

ючы правы іерархаў царквы, прадстаўляла іх інтарэсы ў дзяржаўных органах і канцэнтравала звесткі гаспадарчага, статыстычнага і асабовага характару, а таксама з'яўлялася апеляцыйным органам на рашэнні кансісторый. Ёю таксама рэгламентавалася дзейнасць уніяцкай царквы, і з 1805 г. дзейнічаў адпаведны дэпартамент. Аднак для гэтай царквы рэарганізацыі на цэнтральным узроўні са стварэннем дэпартамента не спыніліся. У 1828 г. была ўтворана Грэка-ўніяцкая духоўная калегія, а з падпарадкаваннем Сіноду ў 1837 г. – Беларуска-літоўская духоўная калегія, характар матэрыялаў дзейнасці якіх аналагічны РКДК. Пратэстанцкія цэрквы да 1819 г. не мелі цэнтральнага органа кіраўніцтва. Хаця Дзяржаўная евангелічная генеральная кансісторыя была ім названа, яе фактычная дзейнасць запавольвалася. З 1824 г. дзейнічаў аб'яднаны Літоўскі сінод, а для кальвініцкай царквы ў 1831 г. пачала дзейнасць Віленская рэфарматарская калегія.

Епархіяльнае кіраўніцтва для ўсіх канфесій ажыццяўлялі іерархі царквы, а таксама кансісторыі, што аб'ядноўвалі адміністрацыйныя і судовыя функцыі. Менавіта іх архіўныя фонды, якія складаюцца з агульнай і канфесіянальнай дакументацыі, з'яўляюцца асновай крыніцавай базы для выяўлення спецыфікі кожнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі епархіяльнага ўзроўню і даследаванняў у галіне арганізацыі дзейнасці органаў кіраўніцтва хрысціянскімі канфесіямі на беларускіх землях. У іх адкладалася распарадчая дакументацыя органаў дзяржаўнага і канфесіянальнага кіраўніцтва, а таксама назапашваліся матэрыялы справаздачнага і інфармацыйнага характару для прадстаўлення ім. Апрача таго, архіўныя фонды кансісторый дазваляюць дэталёва разгледзець працэс прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў, надання ім юрыдычнай сілы і асаблівасцей выканання. Таму зварот да матэрыялаў дзейнасці органаў канфесіянальнага і дзяржаўнага кіраўніцтва мэтазгодны пры страце адпаведнай часткі архіўных фондаў епархіяльнага ўзроўню.

## Крыніцы і літаратура


1. Антановіч, З. В. Рымска-каталіцкая духоўная калегія: мэты дзейнасці і спробы ліквідацыі // Религия и общество – 9: сборник научных статей / под общ. ред.: В. В. Старостенко, О. В. Дьяченко. – Могилев : МГУ имени А. Кулешова, 2015. – С. 96–98.
2. Антановіч, З. В. Архіў Магілёўскай праваслаўнай кансісторыі: уласцівасці фарміравання, захаванасць, склад дакументаў (па матэрыялах архіўнага фонду 2301 «Магілёўская духоўная праваслаўная кансісторыя Сінода» Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 14 / рэдкал.: Ю. М. Бохан [і інш.]. – Мінск : НГАБ, 2016. – С. 14–33.

3. Антановіч, З. В. Архівы Магілёўскай і Мінскай рымска-каталіцкіх кансісторый: гісторыя, структура, склад дакументаў (1782–1918 гг.). – Мінск : Экоперспектива, 2016. – 226 с.
4. Булавина, М. А. Государственное управление иностранными вероисповеданиями в Российской империи в XIX веке // Вестник РУДН. Серия Государственное и муниципальное управление, 2014. – № 4. – С. 5–10.
5. Галанов, М. М. Политика российского самодержавия и позиция Русской православной Церкви в отношении католиков и униатов в годы царствования Павла I: дисс. доктора ист. н.; спец-ть 07.00.02 / Санкт-Петербургский государственный экономический университет. – Санкт-Петербург, 2014. – 536 с.
6. Государственный архив Псковской области. – Ф. 39. Духовная консистория Псковской губернии. 1727–1918 гг.
7. Лісейчыкаў, Д. В. Штодзённае жыццё ўніяцкага парафіяльнага святара беларуска-літоўскіх зямель 1720–1839 гг. – Мінск : Медысонт, 2011. – 198 с.
8. Лісейчыкаў, Д. В. Святар у беларускім соцыуме. Прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596–1839 гг. – Мінск : Беларусь, 2015. – 719 с.
9. Марозава, С. В. «Сваёй веры ламаць не будзем…»: супраціў дэўнізацыі ў Беларусі (1780–1839 гг.). – Гродна : ЮрСаПрынт, 2014. – 217 с.
10. Назаров, А. А. Основные принципы конфессиональной политики правительства Российской империи в отношении инославных исповеданий // Вестник Исторического общества Санкт-Петербургской Духовной Академии. – 2021. – № 1 (6). – С. 171–186.
11. НГАБ. – Ф. 136. Мінская духоўная праваслаўная кансісторыя. 1724–1951 гг.
12. НГАБ. – Ф. 937. Мінская рымска-каталіцкая кансісторыя. 1499–1930 гг.
13. НГАБ. – Ф. 1633. Брэсцкая ўніяцкая духоўная кансісторыя. 1751–1820 гг.
14. НГАБ. – Ф. 1781. Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя. 1573–1950 гг.
15. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 2. Спр. 4993. – Справа паводле ўказа Рымска-каталіцкай духоўнай калегіі аб складанні праекта аб парадку захавання і знішчэння архіўных спраў. 27.02.1860–18.04.1860. – 24 арк.
16. НГАБ. – Ф. 1952. Калекцыя дакументаў евангелічна-лютэранскіх цэркваў. 1648–1945.
17. НГАБ. – Ф. 2301. Магілёўская духоўная праваслаўная кансісторыя. 1765–1946 гг.
18. НГАБ. – Ф. 2531. Полацкая духоўная праваслаўная кансісторыя. 1676–1948 гг.
19. НГАБ. – Ф. 3244 (Упраўленне Магілёўскай рымска-каталіцкай епархіі). Воп. 1. Спр. 1. – Матэрыялы Я. Цепляка, выконваючага абавязкі магілёўскага арцыбіскупа, якія тычацца адміністрацыйна-тэрытарыяльнага кіравання архідыяцэзіяй. 1914–1915 гг. – 24 арк.
20. НГАБ. – Ф. 3245. Беларуская грэка-ўніяцкая духоўная кансісторыя. 1705–1892 гг.

21. НГАБ. – Ф. 3245. Воп. 3. Спр. 51. – Вопіс спраў архіва кансісторыі за 1828–1841 гг.
22. НГАБ. – Ф. 3367. Полацкая ўніяцкая кансісторыя. 1789–1821 гг.
23. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей – НГАБ у Гродна). – Ф. 561. Гродзенская праваслаўная духоўная кансісторыя. 1900–1915, 1923–1924, 1936–1944 гг.
24. НГАБ у Гродна. – Ф. 1621. Брэсцкая ўніяцкая духоўная кансісторыя. 1553, 1564, 1689, 1723–1846 гг.
25. НГАБ у Гродна. – Ф. 1772. Літоўская ўніяцкая духоўная кансісторыя. 1833–1843 гг.
26. НГАБ у Гродна. – Ф. 1872. Калекцыя дакументаў евангелічна-хрысціянскіх цэркваў Гродзенскай губерні. 1880–1918, 1920–1946 гг.
27. Описание документов западно-русских униатских митрополитов. – Санкт-Петербург : Синод, тип., 1907. – Т. 2: 1701–1839. – 1631 с.
28. Полное собрание законов Российской империи. Собрание первое : в 45 т. – Санкт-Петербург : Тип. II отд. собств. ЕИВ канцелярии, 1649–1825.
29. Полное собрание законов Российской империи. Собрание второе : в 55 т. – Санкт-Петербург : Тип. II отд. собств. ЕИВ канцелярии, 1830–1884.
30. Полное собрание законов Российской империи. Собрание третье : в 33 т. – Санкт-Петербург : Тип. II отд. собств. ЕИВ канцелярии, 1884–1913.
31. Приходько, М. А. Юстиц-коллегия лифляндских, эстляндских и финляндских дел и административные реформы в Российской империи в первой трети XIX века [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/yustits-kollegiya-liflyandskih-estlyandskih-i-finlyandskih-del-i-administrativnye-reformy-v-rossiyskoy-imperii-v-pervoy-treti-xix-veka. – Дата доступа: 30.05.2021.
32. Приходько, М. А. Синод и Министерство духовных дел и народного просвещения в 1817–1824 гг. // Вестник Исторического общества Санкт-Петербургской Духовной Академии. – 2021. – № 1 (6). – С. 193–197.
33. Российский государственный архив древних актов. – Ф. 284. Юстиц-коллегия Лифляндских, Эстлянских и Финляндских дел, 1719–1833 гг.
34. Российский государственный исторический архив (далее – РГИА). – Ф. 796. Канцелярия Синода. 1720–1918 гг.
35. РГИА. – Ф. 797. Канцелярия обер-прокурора Синода. 1704–1918 гг.
36. РГИА. – Ф. 821. Департамент духовных дел иностранных исповеданий МВД. 1218–1917 гг.
37. РГИА. – Ф. 822. Римско-католическая духовная коллегия. 1797–1918 гг.
38. РГИА. – Ф. 823. Канцелярия митрополитов греко-униатских церквей. 1407–1871 гг.
39. РГИА. – Ф. 824. Белорусско-литовская духовная коллегия Синода. 1713–1843 гг.
40. РГИА. – Ф. 826. Канцелярия митрополита римско-католических церквей в России Министерства внутренних дел. 1795–1926 гг.

41. РГИА. – Ф. 828. Генеральная евангелическо-лютеранская консистория МВД. 1754–1918 гг.
42. Свод учреждений и уставов управления духовных дел иностранных исповеданий христианских и иноверных. – Кн. 1. О управлении духовных дел христиан римско-католического и армяно-католического исповеданий // Свод законов Российской империи / сост. Н. П. Балканов, С. С. Войт, В. Э. Герценберг; под ред. И. Д. Мордухай-Болтовского. – Санкт-Петербург : печ. Графического института. Бр. Лукшевиц, 1896. – Т. XI. – Ч. 1. – С. 1–16.
43. Свод учреждений и уставов управления духовных дел иностранных исповеданий христианских и иноверных. – Кн. 2. О управлении духовных дел христиан протестантского исповедания // Свод законов Российской империи / сост. Н. П. Балканов, С. С. Войт, В. Э. Герценберг; под ред. И. Д. Мордухай-Болтовского. – Санкт-Петербург : печ. Графического института. Бр. Лукшевиц, 1896. – Т. XI. – Ч. 1. – С. 26–108.
44. Учреждение министерства внутренних дел // Свод учреждений и уставов управления духовных дел иностранных исповеданий христианских и иноверных. Кн. 5. / сост. Н. П. Балканов, С. С. Войт, В. Э. Герценберг; под ред. И. Д. Мордухай-Болтовского. – Санкт-Петербург : печ. Графического института. Бр. Лукшевиц, 1896. – Т. I.– С. 182–192.
45. Филатова, Е. Н. Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772–1860 гг. – Минск : Бел. наука, 2006. – 192 с.
46. Latvijas Valsts vēstures arhīvs. – F. 629. Kurzemes konsistorija (Jelgava). 1592–1921.
47. Lietuvos nacionaline Martyno Mažvydo biblioteka. – F. 93. Lietuvos evangelikų reformatų sinodo archyvas. 1413–1938.
48. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (далей – LVIA). – F. 604. Vilnius Romos kataliku dvasinė konsistorija. 1421–1915.
49. LVIA. – F. 604. Ap. 1. B. 273. – Рэгламент для рымска-каталіцкага веравызнання ў Расійскай імперыі. 1798 г. – 5 l.
50. LVIA. – F. 605. Vilniaus stačiatikių vyskupystės dvasinė konsistorija. 1589–1942.
51. LVIA. – F. 606. Vilniaus evangelikų reformatų konsistorija. 1620–1940.
52. LVIA. – F. 694 (Vilniaus Romos katalikų kurija). Ap. 1. B. 172. – Выпісы з пратаколаў Сената аб правах рымска-каталіцкага мітрапаліта. 1811–1813 гг. – 42 l.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 28.06.2021

*Т. В. Даўгач*

# Скаргі і прашэнні ўдзельнікаў аграрных адносін другой паловы XIX – пачатку XX ст. як гістарычная крыніца

Аграрная рэформа 1861 г. надала сялянам асабістую свабоду, што кардынальна змяніла характар сацыяльных камунікацый у вёсцы. Так, дэ-юрэ сяляне атрымалі магчымасці ўплываць на некаторыя абставіны ўласнага жыцця, а аднымі з інструментаў, якія дапамагалі ім у гэтым, сталі скаргі і прашэнні. Вышэйшымі мясцовымі ўстановамі, якія павінны былі рэагаваць на сялянскія скаргі, сталі створаныя падчас рэформы губернскія па сялянскіх справах прысутнасці. У іх склад уваходзілі прадстаўнікі губернскай адміністрацыі (губернатар, губернскі маршалак, пракурор), а таксама чацвёра мясцовых дваран [14, с. 153]. У сферу дзейнасці прысутнасцей уваходзілі распарадчыя функцыі ў паслярэформеннай вёсцы, аднак адным з асноўных заняткаў супрацоўнікаў на працягу ўсяго перыяду дзейнасці ўстаноў (да 1901 г. у Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях і да 1903 г. у Гродзенскай і Віленскай губернях) было рэагаванне на скаргі і прашэнні.

На сучасным этапе развіцця гістарычнай навукі адбываецца пераасэнсаванне ролі і месца чалавека ў гістарычным працэсе. Сёння скаргі, прашэнні, даносы і іншыя крыніцы масавага паходжання, у якіх у той ці іншай ступені выражана Я-канструкцыя, маюць вялікую цікавасць для даследчыкаў. Нягледзячы на суб’ектыўны характар інфармацыі, якая змяшчаецца ў дадзеных крыніцах, яны ўтрымліваюць унікальныя звесткі па гісторыі штодзённасці, гісторыі ментальнасці, гендэрнай гісторыі, аб індывідуальнай памяці і поглядах на розныя сацыяльныя з’явы. Сярод сучасных беларускіх даследаванняў усё часцей сустракаюцца працы, прысвечаныя дадзенаму тыпу крыніц (гл., напрыклад: [2; 3; 4]).

Задачай дадзенага артыкула з’яўляецца аналіз скаргаў і прашэнняў, якія паступалі ў губернскія па сялянскіх справах прысутнасці, як гістарычных крыніц. Пад скаргамі ніжэй будуць разумецца афіцыйныя заявы аб незаконных дзеяннях якой-небудзь асобы або ўстановы; пад прашэннямі – пісьмовыя хадайніцтвы аб чым-небудзь.

Фармуляр скаргі або прашэння ўмоўна можна падзяліць на некалькі частак. Першая з іх фіксуе адрасата – асобу або ўстанову, якой накіраваны ліст. Другая частка ўтрымлівае намінатыўную інфармацыю аб адрасанце або адрасантах, калі скарга калектыўная. У гэтай частцы ўказана прыналежнасць заяўніка да саслоўнай групы (дваранін, селянін, мешчанін), прыналежнасць да валасной або сельскай грамады (калі сяляне пражывалі ў іншай воласці, то гэта абавязкова пазнача-

ласся ў канцы ліста), імя і прозвішча (у выпадку, калі заяўнікамі былі сяляне або мяшчане, магло ўказвацца бацькоўскае імя, напрыклад – *«Андрей Осипов сын Седлецкий»*) [12, арк. 8]. У трэцяй частцы скаргі або прашэння прапісаны асноўны змест, у якім звычайна вылучаюцца наступныя элементы: прэамбула – аб'ява, пра што пойдзе гаворка, нарацыя – непасрэдна апісанне сутнасці праблемы, і дыспазіцыя – уласна прашэнне аб пэўных распараджэннях. Дакумент абавязкова завяршаўся подпісамі заяўніка або заяўнікаў. Інфармацыя аб тым, калі і дзе напісана скарга, можа знаходзіцца ў пачатку або ў канцы дакумента. У скаргах і прашэннях вылучаюцца формулы – устойлівыя выразы, а таксама бачыцца пэўная структура, што дае магчымасць прымяняць да іх фармулярны аналіз. Аднак цэласнае ўяўленне аб прадмеце даследавання ў дадзеным выпадку магчыма атрымаць дзякуючы герменеўтычнаму і семіятычнаму падыходам у інтэрпрэтацыі тэксту дакументаў [15, с. 107].

Вялікая колькасць скаргаў і прашэнняў, якія паступалі чыноўнікам па сялянскіх справах, была звязана з тым, што шматлікія праблемы парэформеннай вёскі не былі ўлічаны ў заканадаўстве. Спрэчкі і непаразуменні паміж удзельнікамі аграрных адносін мелі розны змест: аб маёмасці, аб адмове прыняць у сялянскую грамаду, на незаконнае спагнанне з сялян павіннасцей, на дзеянні валаснога начальства і міравых пасрэднікаў і інш. Аналіз скаргаў дазваляе вызначыць найбольш слабыя месцы ў сялянскім парэформенным заканадаўстве. Варта адзначыць, што пераважная большасць скаргаў створана сялянамі, як найбольш незадаволенай рэформай катэгорыяй насельніцтва. Аналіз скаргаў сялян Мінскай губерні[1] паказаў, што з 4868 скаргаў, якія выяўлены ў фондзе Мінскай губернскай па сялянскіх справах прысутнасці, найбольшая колькасць тычыцца пытанняў сялянскіх павіннасцей (29%), значная частка прысвечана маёмасным спрэчкам (16%), немалую долю складаюць скаргі на адмову прыняць сялян у грамаду (18%). Многія скаргі тычацца непрафесійных дзеянняў сельскіх старастаў і валасной адміністрацыі (14%) (гл. Дыяграму). Гэта сведчыць аб тым, што парэформенная вёска мела шмат эканамічных і сацыяльных праблем, а магчымасць скардзіцца была для сялян адзіным законным спосабам іх вырашэння. Вывучэнне і аналіз прычын, якія выклікалі неабходнасць або жаданне напісаць скаргу, дае магчымасць зразумець шырокі спектр праблем, з якімі сутыкаліся ўдзельнікі аграрных адносін пасля рэформы [1, с. 91].

---

[1] Дакументы, выяўленыя ў фондах архіваў, прысвечаных дзейнасці Мінскай губернскай па сялянскіх справах прысутнасці, даюць найбольш поўнае ўяўленне пра цяжкасці, якія хвалявалі ўдзельнікаў аграрных адносін.

***Дыяграма.* Скаргі сялян Мінскай губерні ў губернскую па сялянскіх справах прысутнасць (1861–1901 гг.)**




Пасля адмены прыгоннага права найбольш востра стаялі пытанні надзялення сялян зямлёй, а таксама павіннасцей часоваабавязаных. Менавіта таму большасць скаргаў прысвечана гэтым бакам жыцця парэформеннай вёскі. Скаргі гэтага кшталту аднатыповыя і маюць вельмі падобны або аналагічны змест. Маёмасныя пытанні паміж сялянамі і памешчыкамі вырашаліся падчас складання ўстаўных грамат, што рабілася памешчыкамі або міравымі пасрэднікамі без удзелу сялян. Тым не менш, устаўныя граматы падпісваліся ўсімі ўдзельнікамі аграрных адносін, што абазначала фактычную згоду бакоў з умовамі, прапісанымі ў грамаце і стварала бачнасць юрыдычна законнага пагаднення. Аднак з аналізу скаргаў удзельнікаў аграрных адносін вынікае, што, па-першае, умовы, зафіксаваныя ва ўстаўных граматах, не заўсёды былі задавальняючымі для бакоў, таму яны парушаліся (прычым не толькі сялянамі, але і памешчыкамі); па-другое, найбольшыя цяжкасці ва ўзаемаадносінах паміж землеўладальнікамі і былымі прыгоннымі выклікалі менавіта пытанні сялянскіх павіннасцей або няправільнага спагнання грашовых сродкаў з сялян. Цікава, што на няправільнае спагнанне сродкаў скардзіліся не толькі сяляне, але і памешчыкі: многіх землеўладальнікаў абурала паніжэнне аброку на 20% пасля паўстання 1863–1864 гг. Напрыклад, памешчык маёнтка Залессе Кобрынскага павета Церпілоўскі ў 1864 г. скардзіўся ў губернскую прысутнасць на тое, што замест 999 руб. 18 кап. сяляне выплацілі яму толькі 799 руб. 34 кап., з чаго бачна, што памешчык не ўлічыў зніжэнне аброку [8, арк. 12–18].

Значная колькасць скаргаў, якія паступалі ў губернскія па сялянскіх справах прысутнасці, прысвечана маёмасным адносінам паміж сялянамі. У парэформеннай вёсцы найбольш часта сяляне скардзіліся менавіта на прадстаўнікоў свайго ж саслоўя, а галоўнымі прычынамі скаргаў з’яўляліся маёмасныя спрэчкі. Ва ўмовах малазямелля сялян

пытанне зямельнай маёмасці стаяла вельмі востра, і дадзеныя спрэчкі не толькі ілюструюць цяжкасці эканамічнага становішча сялян, але з'яўляюцца таксама ўскоснымі генеалагічнымі крыніцамі. Аналізуючы скаргі гэтага кшталту, можна знайсці біяграфічныя звесткі пра той ці іншы сялянскі род. Напрыклад, сялянка Шклоўскай воласці Ганна Пятроўна Волкава падала скаргу ў Магілёўскую губернскую па сялянскіх справах прысутнасць на свайго зводнага брата Антона Войцеха, які спрабаваў завалодаць надзелам зямлі, перададзеным у спадчыну Ганне яе маці. А. Войцех здолеў пераканаць валасны суд у тым, што ў тастаменце пазначаны спадчыннік па прозвішчы Войцех, Г. Волкава ж даказвала, што ў тастаменце маці стаіць прозвішча Волкава [7, арк. 1–7]. Як бачна, у дадзенай скарзе згадваюцца імёны ўдзельнікаў спрэчкі, колькасць зямлі, якой валодала сям'я, некаторыя дэталі агульнай сямейнай гісторыі.

Спрэчкі аб зямлі ўзнікалі не толькі ў асяроддзі сялян, часта ў іх былі ўцягнуты і іншыя ўдзельнікі аграрных адносін. Напрыклад, калектыўную скаргу ў Гродзенскую губернскую па сялянскіх справах прысутнасць падалі сяляне Мотальскай воласці Кобрынскага павета. Яе змест тычыўся таго, што мяшчане-яўрэі мястэчка Моталь самавольна занялі сялянскія землі. Мяшчане, у сваю чаргу, не маглі падаць дакументы на зямлю, але пакідаць яе адмаўляліся [9, арк. 279]. На захоп зямель мяшчанамі скардзіліся таксама сяляне вёскі Брылёва Кобрынскага павета, якая размяшчалася паблізу Кобрына [9, арк. 313]. Гэтыя скаргі адлюстроўваюць аспекты ўзаемаадносін розных катэгорый насельніцтва, у прыватнасці, сялян і жыхароў мястэчак, што дае ўяўленне пра мадэлі камунікацыі тагачаснага насельніцтва.

Неабходнасць адстойваць кожны кавалак зямлі з'яўлялася частай нагодай для канфліктных сітуацый, якія маглі справакаваць любыя змены ў звыклым ходзе падзей. Так, сяляне сяла Трыпуціна Мсціслаўскага павета паскардзіліся ў Магілёўскую губернскую прысутнасць на новага святара, які прыехаў з Магілёва і не толькі выказаў прэтэнзію на невялікі кавалак зямлі (2,2 дзес.), які пасля рэформы 1861 г. апрацоўвалі сяляне, але і, са слоў мясцовага насельніцтва, *«начал всех грабить»* [6, арк. 1–5]. Эмацыянальнасць і спецыфічная сістэма аргументацыі, уласцівая дадзеным скаргам, ілюструе ўзровень сацыяльнай напружанасці ў вёсцы пасля рэформы.

Незадаволенасць і напружанасць былі характэрны не толькі для сялянскага асяроддзя. Складаныя ўзаемаадносіны назіраліся, напрыклад, паміж праваслаўнымі святарамі і мясцовымі землеўладальнікамі каталіцкага веравызнання, таму памешчыкі даволі часта скардзіліся на святароў. Так, у другую гадавіну адмены прыгоннага права мясцовы святар у Пінскім павеце ашальмаваў дваран, абвінаваціўшы ў тым, што

яны хацелі закабаліць сялян у рабства, і схіляў сялян да прысяжнага абяцання перапыніць з дваранамі ўсе адносіны і *«предать их вечному забвению»*, што стала прычынай калектыўнай дваранскай скаргі ў губернскую прысутнасць [5, арк. 27]. Святар прапанаваў сялянам падпісаць адрас, згодна з якім уся зямля пераходзіла ў іх рукі. Памешчыкі адзначалі, што дадзеная прамова падзейнічала, і сяляне ў многіх маёнтках перасталі выконваць павіннасці. Падобнае здарылася 19 лютага 1863 г. у Ляхавіцкай царкве Пінскага павета, дзе чалавек, які назваў сябе «Старшым Духоўным», сказаў, што сяляне павінны 3 дні святкаваць дадзеную ім волю, а ў суботу павінны *«...вырезать своих помещиков каждый деревню свою»* [5, арк. 28]. Зразумела, што ў дадзеных памешчыцкіх скаргах чытаецца занепакоенасць сітуацыяй, аднак варта азначыць, што вышэйапісаныя падзеі адбыліся на другія ўгодкі аграрнай рэформы. Гэта ўскосна сведчыць аб чаканні сялянамі “сапраўднай волі” якраз у 1863 г., таму “падбухторванні” мелі такі выразны эфект.

Адным з самых цікавых сюжэтаў сацыяльнага ўзаемадзеяння з’яўляецца камунікацыя паміж сялянамі і прадстаўнікамі сістэмы самакіравання (фактычна – мясцовага дзяржаўнага кіравання). Паводле заканадаўства сельскія старасты і валасныя старшыні павінны былі абірацца сялянамі, аднак фактычна яны зацвярджаліся на сваіх пасадах міравымі пасрэднікамі, што рабіла іх падначаленымі адміністрацыі і пазбаўляла сістэму асноўнага кампанента самакіравання.

Як паказвае аналіз скаргаў, асаблівага даверу да сельскіх старастаў і валасных старшыняў з боку сялян на працягу даследаванага перыяду не назіралася. Аб тым, як складваліся адносіны паміж органамі сялянскага самакіравання і сялянамі, красамоўна сведчыць колькасць скаргаў, якія паступалі ў прысутнасці ад апошніх. Каля 14% ад агульнай колькасці сялянскіх скаргаў былі справакаваны некарэктнымі паводзінамі валаснога або сельскага начальства [2, с. 100–101]. Сярод службоўцаў сялянскага самакіравання здараліся выпадкі злоўжывання ўладай, п’янства, карупцыя, ігнараванне службовых абавязкаў.

Варта адзначыць, што сяляне ставіліся з недаверам не толькі да прадстаўнікоў сельскай і валаснай адміністрацыі, але і да сістэмы кіравання вёскай у цэлым. Аднак пры гэтым у асяродку сялянства жыла “вера ў добрага цара”, што прама пацвярджаецца на падставе аналізу сукупнасці эга-дакументаў. Ілюстрацыйнай у гэтым плане выглядае справа жыхара мястэчка Дзятлава Слонімскага павета селяніна Пятра Бурдуна, якая цягнулася больш за 4 гады, а пачалася са скаргі на нявестку селяніна. П. Бурдун атрымаў зямлю разам са сваім родным братам Іванам у 1865 г. Пасля смерці Івана ў 1875 г. яго жонка Ганна стала патрабаваць у Пятра ўсю зямлю, паколькі яна была запісана на імя яе мужа. Ні валаснае праўленне, ні міравы пасрэднік, ні нават гу-

бернская па сялянскіх справах прысутнасць не сталі ўнікаць у абставіны справы, што вымусіла селяніна накіраваць прашэнне наўпрост імператару. Гэта мела поспех, і ў 1879 г. ён атрымаў 47 дзесяцін зямлі [13, арк. 2–11].

Варта адзначыць, што скаргі на імя імператара моцна паскаралі вырашэнне праблемы. У выпадку праходжання скаргі праз усю шматступенную бюракратычную іерархію адказ на яе магчыма было чакаць літаральна дзесяцігоддзямі. Паказальнай з’яўляецца справа аб адмове ўключэння ў Добрамысльскую сельскую грамаду Слонімскага павета былога зняволенага селяніна Івана Сяргейчыка. Яна пралівае святло на складаны механізм прыняцця рашэнняў у паслярэформеннай вёсцы, звязаны з праходжаннем скаргаў і прашэнняў сялян праз шэраг інстанцый мясцовай улады. Прайшоўшы праз усе інстанцыі і дайшоўшы да Міністэрства ўнутраных спраў, скарга І. Сяргейчыка разглядалася з 1881 г. па 1904 г., што склала 23 гады [10, арк. 5– 17].

Не дачакаўшыся справядлівасці з боку мясцовых улад, сяляне Капылоўскай воласці Брэсцкага павета таксама вырашылі адрасаваць сваё прашэнне імператару. Сутнасць прашэння заключалася ў тым, што пакуль землеўладальніца – графіня Пуслоўская – пражывала ў Францыі, усімі справамі маёнтка займаўся яе павераны Плашкевіч, які *«прежде губил нас, поотбирал самую лучшую землю, сенокосы, так, что ныне не только сами не имеем с чего жить, ибо озимого посева на одну с половиной четверть ржи имеем, а что несчастной скотины удержать ниже прокормить не имеем где, леса совершенно не отпустил, одну деревню называемую Сушки, которая была отвечно построена в хорошем месте, перенес на пусто порожнее и неудобное, погубил крестьян до крайности, не дал им совершенно ничего с собой забрать, как с хлеба так и съестных запасов, картофеля, капусты и пр., а особенно четырёх, которым причинил убытка до 10 000 руб. серебром, ибо остались овощные де овощные деревья*[2]*, пчелы и пр. ...»* [12, арк. 7]. Зыходзячы з вышэйзгаданага, сяляне не бачылі іншага выйсця (*«...не имеем мы несчастные крестьяне к кому бы обратиться, как только к вашему императорскому величеству и покровителю нас осчастливленных уже нас своей милостью ...»*), а таму прасілі перавесці іх у разрад дзяржаўных або надзяліць сядзібнай аселасцю, дазволіць вярнуцца на тыя землі, дзе яны пражывалі, а таксама выплаціць страты, якія сяляне панеслі з-за дзеянняў паверанага. Цікава, што дадзенае прашэнне вытрымана ў стылістыцы тагачаснай канцылярскай мовы, аднак шэраг арфаграфічных і сінтаксічных памылак

---

[2] Верагодна, пісар для складання скаргі перакладаў словы сялян з польскай мовы (drzewa owocowe (пол.) – пладовыя дрэвы).

дае падставы меркаваць, што ліст быў напісаны не валасным пісарам, а адным з зацікаўленых у вырашэнні пытання. Магчыма, адстаўным паштальёнам Андрэем Сядлецкім, імя якога фігуруе сярод заяўнікаў, і які *«за всю волость по личной их просьбе росписался, как они все неграмотные»* [12, арк. 7].

Пры аналізе тэксту скаргаў і прашэнняў становіцца бачна, што іх пераважная большасць запісвалася валаснымі пісарамі са слоў сялян, таму мова пісьма мае прыкметнае канцылярскае адценне. У сувязі з гэтым вялікую цікавасць выклікаюць тыя прашэнні, якія былі напісаны самімі сялянамі спецыфічнай лексікай і ў якія трапляюць выразныя беларусізмы. Так, жыхары вёсак Мілавіды, Скарынкі і Кулікі Слонімскага павета былі вымушаны самастойна пісаць ліст, бо скардзіліся на валаснога пісара, які *«…выбрал шесть хозяев и* ***примушал***[3] *их подписываться на какой-то бумаге»* [11, арк. 37]. Сяляне Антон і Мірон Хітрыкі, а таксама Паўлюк Говар у адвольнай форме спецыфічнай лексікай апісваюць сітуацыю, у якую трапілі праз дзеянні пісара: *«…то ответили, что мы не будем подписываться* ***бо*** *не знаем на что, на другой день приехал м[ировой] посредник и назначил 12 человек до подписки, мы ответили не будем подписываться на этой бумаги ибо мы не знаем какая это бумага и об чем. Мировой посредник с помещиком, сказали нам подпишитесь, а когда здесь не подпишетесь, то пойдёте до Слонима в земский суд то там* ***муситесь*** *подписаться, но ежели не подпишетесь, то вас солдаты* ***позасекают*** *лозами то побоялись эти 12 человек идти в Слоним и начали просить хозяинов чтобы с ними пошли то всех в Слониме было 26 человек…»*. Гэтай скарзе, як і шэрагу дакументаў, напісаных уласна сялянамі, уласцівы паліфанізм (разнастайнасць узнятых пытанняў) [16, с. 163] і даволі эмацыянальная падача аргументаў. Так, сяляне пішуць не толькі пра сваю незадаволенасць паводзінамі пісара, але таксама пра рукапрыкладства валаснога старшыні (*«…то старшина за это* [адмова сельскага старасты ставіць пячатку на дакуменце. – *Т. Д.*] *ударил 2 раза в лицо старосту и заставил на двое суток молоть в жорнах жито»*), пра памешчыка, які забраў жыта з запаснога магазіна для ўласнага бровара і перагнаў на гарэлку; пра немагчымасць паўплываць на сітуацыю законным шляхам (*«…мы не желаем ни писаря ни старшину, хотели других собрать, но начальство не дозволило нам и сказали не ваше дело обирать писаря и старшину»*) і ўвогуле пра безвыходнасць і надзею толькі на “добрага цара” (*«…приклоняем колени и кланяемся к ногам вашему превосходительству и просим явите божескую и отеческую свою милость, то тепериче нам приходит тесно, что хотят то делают, а жаловаться некому»*) [11, арк. 38–40]. Праз скаргі такога кшталту

[3] Тут і ніжэй пазначана тлустым мной. – Т. Д.

магчыма скласці ўяўленне аб ладзе жыцця сялянскага насельніцтва, іх патрэбах і праблемах, пры гэтым падрабязны лінгвістычны аналіз можа даць каштоўныя звесткі аб тагачаснай псіхалогіі сацыяльных груп і культуры грамадства ў цэлым.

Такім чынам, скаргі і прашэнні ўдзельнікаў аграрных адносін з’яўляюцца каштоўнымі крыніцамі па гісторыі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. Гэтыя дакументы дазваляюць уявіць асяроддзе жыцця і асноўныя патрэбы розных катэгорый насельніцтва. Скаргі праліваюць святло на ўзаемаадносіны паміж саслоўнымі групамі, адлюстроўваюць успрыманне насельніцтвам дзеянняў мясцовай адміністрацыі ўсіх узроўняў – ад валаснной да губернскай. Скаргі і прашэнні нясуць адбітак светаўспрымання асоб, якія іх складалі, таму іх аналіз дапамагае атрымаць агульную карціну ўяўленняў аб сацыяльнай сферы азначанага перыяду, стварыць наратыў гісторыі штодзённасці, дэталёва рэканструяваць мінулае праз вывучэнне яго мікраструктур.

## Крыніцы і літаратура


1. Долгач, Т. В. Губернские по крестьянским делам присутствия: формирование, структура, деятельность (1861–1903 гг.): дис. … канд. ист. наук / Т. В. Долгач. – Минск, 2019. – 200 с.
2. Лойка, П. А. Шляхецка-сялянскія міжсаслоўныя адносіны на беларускіх землях у другой палове XVI – першай палове XVII ст. / П. А. Лойка // Российские и славянские исследования: науч. сб. Вып. 4 / редкол.: А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. – Минск : БГУ, 2009. – С. 67–74.
3. Маслоўскі, Я. В. Скаргі рабочых беларускіх губерняў у фабрычную інспекцыю ў 1907–1914 гг. / Я. В. Маслоўскі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2018. – № 1. – С. 22–29.
4. «Міласці вашай просім…», альбо Адзін год у навейшай гісторыі Беларусі, адлюстраваны ў лістах, заявах, скаргах і іншых формах звароту грамадзян. Зборнік дакументаў / укладанне, прадмова, каментар А. А. Гужалоўскага. – Мінск : НАРБ, 2006. – 280 с.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 320 (Мінскі губернскі маршалак). Воп. 1. Спр. 396. – Цыркуляры Міністэрства ўнутраных спраў пра вызваленне памешчыцкіх сялян у вольныя хлебаробы, перапіска з павятовымі маршалкамі і валаснымі праўленнямі пра непадначаленне сялян. 11.01.1863–09.03.1863. – 61 арк.
6. НГАБ. – Ф. 2014 (Магілёўская губернская прысутнасць). Воп. 1. Спр. 786. – Справа паводле скаргі ўпаўнаважанага дзяржаўных сялян сяла Трыпуціна Мсціслаўскага павета Грыгор’ева Антона на захоп мясцовым святаром дзвюх дзесяцін зямлі ва ўрочышчы Азярышча. 26.07.1873–19.11.1873. – 8 арк.

7. НГАБ. – Ф. 2014. Воп. 1. Спр. 1086. – Справа пра рэвізію губернатарам павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей і валасных праўленняў Магілёўскай губ. 04.11.1893–25.09.1896. – 10 арк.
8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей – НГАБ у Гродна). Ф. 10 (Гродзенская губернская па сялянскіх справах прысутнасць). Воп. 1. Спр. 300. – Справа па спрэчцы сялян Юхнавецкай воласці Беластоцкага павета Скалінскага Івана з братам Мацвеем аб маёмасці і зямлі. 13.03.1871–27.11.1871. – 18 арк.
9. НГАБ у Гродна. – Ф. 10. Воп. 2. Спр. 210. – Справа аб праверцы грашовых спагнанняў і вызначэнні выкупных плацяжоў з сялян маёнтка Мількі Ваўкавыскага павета памешчыц Крываблоцкай і Калантай. 08.12.1864. – 332 арк.
10. НГАБ у Гродна. – Ф. 10. Воп. 13. Спр. 18. – Справа аб увядзенні ўрочнага палажэння ў Гродзенскай губерні. 12.04.1861–17.08.1862. – 46 арк.
11. НГАБ у Гродна. – Ф. 10. Воп. 13. Спр. 194. – Справа па скаргах часоваабавязаных сялян Слонімскага павета аб прыгнятанні іх памешчыкамі. 18.10.1862–24.01.1863. – 342 арк.
12. НГАБ у Гродна. – Ф. 10. Воп. 13. Спр. 221. – Справа па скарзе сялян мястэчка Капылы Брэсцкага павета аб абцяжарванні іх паншчынай і захоп зямлі памешчыцай Пуслоўскай. 16.01.1863–22.05.1863. – 16 арк.
13. НГАБ у Гродна. – Ф. 10. Воп. 14. Спр. 1343. – Справа па скарзе мешчаніна мястэчка Дзятлава Слонімскага павета аб абцяжарванні яго валасным старшынёй падводнай павіннасцю. 02.12.1874–19.06.1876. – 36 арк.
14. Положение о губернских и уездных по крестьянским делам учреждениях // Крестьянская реформа в России. Сборник законодательных актов. – Москва : Госюриздат, 1954 г. – С. 135–158.
15. Фарсобин, В. В. Нерешенные вопросы дипломатики // Фарсобин, В. В. Источниковедение и его метод: Опыт анализа понятий и терминологии / В. В. Фарсобин. – Москва : Наука, 1983. – С. 101–118.
16. Храмцов, А. Б. Письма граждан во власть как источник изучения повседневной жизни Тюмени начала XX века / А. Б. Храмцов // Вестник РГГУ. Серия: История. Филология. Культурология. – 2011. – № 12. – С. 157–168.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 30.06.2021

*Ю. М. Лаўрык*

# Палемічна-дагматычны зборнік сярэдзіны XVIII ст. з калекцыі «Рукапісныя кнігі» Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

Гэты артыкул працягвае цыкл публікацый, прысвечаных археаграфічнаму вывучэнню прадметаў фондавай калекцыі «Рукапісныя кнігі» Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь (далей – НГМ РБ). Цыкл быў распачаты ў папярэдніх выпусках «Архіварыуса» артыкулам, у якім разглядаліся манускрыпты са слуцкімі правененцыямі [5]. У публікацыі быў агучаны намер працягваць даследаванне тых рукапісаў, якія такіх правененцый не маюць, але паводле тых ці іншых меркаванняў могуць быць звязаны паходжаннем ці бытаваннем з манастырамі Слуцкай архімандрыі. Менавіта адным з такіх манускрыптаў з’яўляецца рукапісны зборнік, які захоўваецца ў фондах НГМ РБ пад шыфрам КП 540. Дэталёвае даследаванне яго не пацвердзіла версію пра стварэнне ў Слуцку. Наадварот, былі выяўлены рысы, якія схіляюць да думкі пра ўкраінскае паходжанне рукапісу, а запісы ўказваюць на яго пазнейшае бытаванне ў Вохарскім манастыры на Чэрыкаўшыне. Аднак гэты кніжны помнік мае несумненную цікавасць як для гісторыкаў кнігі і літаратуры, так і ў цэлым для вывучэння міжканфесійнай барацьбы на тэрыторыі Беларусі і Украіны ў XVI–XVIII стст.

Манускрыпт з’яўляецца рукапісным зборнікам праваслаўных палемічна-дагматычных тэкстаў, скіраваных супраць уніяцтва і Рымска-каталіцкай царквы. У вузкім сэнсе больш слушна казаць пра канвалют, паколькі першапачаткова дзве часткі гэтага рукапісу бытавалі асобна, хоць і ў межах адной бібліятэкі. Тым не менш, той факт, што ўсе тэксты былі перапісаны прыкладна ў адзін час адной асобай і прысвечаны пэўнай, даволі вузкай, тэматыцы, а таксама фармальная адсутнасць такой важнай рысы канвалюта, як наяўнасць тытульных лістоў у асобных алігатаў, дазваляе разглядаць манускрыпт як зборнік.

***Апісанне знешняга выгляду***. Зборнік мае фармат у ¼ долю аркуша (20,5×16 см). Аправа паўскураная XVIII ст.: папера на кардоне, куткі са скуры, рэшткі скураных завязак; спінка, ніжняе вечка аправы і завязкі страчаны. Выходныя звесткі адсутнічаюць.

Арганізацыя старонкі бязрамачная; кустоды сустракаюцца на працягу ўсёй кнігі, а калантытулы – спарадычна (апрача таго, у шэрагу выпадкаў яны абрэзаны пры сшыванні). Сігнатуры (а$^{е}$1–а$^{е}$9, астатнія абрэзаны) прысутнічаюць толькі ў тэксце «Книга Нарасколъ Папистовъ», які налічвае значную колькасць сшыткаў.

Нумарацыя па лістах (фаліяцыя) мае два шэрагі: лацінскімі лічбамі (першы сшытак) – лісты 1–15 і кірылічнымі (астатняя частка кнігі) – лісты а҃–оа҃+. Прысутнасць фаліяцыі, зробленай рознымі спосабамі, ставіць пытанне пра час злучэння тэкстаў пад адной аправай. Блок часткова разбрашураваны. Страчаны першы ліст блока, які месціўся перад пачаткам першага тэксту і выконваў ролю тытульнага або ахоўнага, а таксама лісты 2-й фаліяцыі: на҃, нв҃, нѕ҃, ѯз҃, ѯѕ҃, ѯн҃, ѯѳ҃ і наступныя пасля ліста оа҃ (за выключэннем двух лістоў са страчанай фаліяцыяй, якія моцна пашкоджаны).

Колькасць радкоў на старонцы вагаецца ад 24 да 32 у розных месцах кнігі. Для напісання тэкстаў выкарыстаны атрамант карычневага і чорнага колераў рознай гушчыні, у першым тэксце спарадычна ўжываецца кінавар. Як паказаў аналіз накрэслення асобных літар, усе тэксты манускрыпта (за выключэннем чытацкіх інскрыпцый) напісаны адной рукой, хоць неаднаразовая змена пісьмовых матэрыялаў і ўмоў пісання стварае на першы погляд уражанне працы некалькіх чалавек. Почырк з'яўляецца прамежкавым варыянтам паміж паўуставам і курсівам; прычым у адных тэкстах (або іх частках) пераважаюць прыкметы курсіва, а ў іншых – паўустава. На падставе палеаграфічных прыкмет пісьмо можна датаваць XVII–XVIII стст.

***Папера і філіграні***. Папера ручнога адліву. Першы сшытак пачаткова складаўся з 16 лістоў (4 аркушы, сфальцаваныя ў чатыры разы); іншыя наяўныя сшыткі налічваюць, як правіла, па 4 лісты (за выключэннем некалькіх сшыткаў напрыканцы кнігі). На паперы зборніка выяўлены філіграні, якія будуць разгледжаны ніжэй.

1. Першы тэкст зборніка («Історіꙗ Олистрикійско*м* … синодѣ») змешчаны ў адным сшытку і займае лісты 1–15. Першы ліст гэтага сшытка граў, верагодна, ролю тытульнага або ахоўнага і быў страчаны яшчэ перад пазначэннем фаліяцыі, у сувязі з чым яна пачынаецца з першага ліста тэксту, які ў сшытку быў 2-м па парадку. На паперы гэтага сшытка прысутнічае толькі адна філігрань: выява Найсвяцейшай Панны Марыі з дзіцяткам Ісусам без кантрамаркі (лісты 1, 4, 5, 7, 8, 10, 11, 14). Найбольш блізкі да нашай філіграні варыянт змяшчае альбом Эдмундаса Лаўцявічуса пад № 2345, з указаннем на ўжыванне такога вадзянога знака ў 1741 г. [10, t. 1, p. 207], што дазваляе датаваць стварэнне гэтай часткі ў рукапісе 1740-мі гг.

2. Другі тэкст («Книга Нарасколъ Папистовъ», а҃–на҃) напісаны на паперы, складзенай у 14 сшыткаў. Першыя 11 з іх налічваюць па 4 лісты, астатнія – 2–3. Папера гэтай часткі рукапісу змяшчае некалькі вадзяных знакаў, якія варта разгледзець паводле іх прысутнасці ў асобных сшытках.

*Сшыткі 1, 2* складаюцца з лістоў, на якіх прысутнічае філігрань з выявай Найсвяцейшай Панны Марыі з дзіцяткам Ісусам (лл. а҃, д҃; ѕ҃, з҃) і

кантрамарка «ZL» (лл. в҃, г҃; є҃, и҃). У альбомах філіграняў не ўдалося знайсці выяву, якую можна было б суаднесці з такой (ад зафіксаваных там яна адрозніваецца шэрагам дэталяў), аднак, паводле Э. Лаўцявічуса, кантрамарка «ZL» на паперы з такім тыпам вадзянога знака ўжывалася ў 1750-я і 1780-я гг. (№№ 2418, 2420) [10, t. 1, s. 208].

*Сшыткі 3, 5, 10, 11* маюць філіграні з літар «РѲ» (лл. ѳ҃, и҃; ѳі҃, иі҃; лд҃, ле҃; ли҃, лѳ҃) і кантрамаркай «ЗС» (лл. і҃, аі҃; зі҃, к҃; лг҃, лѕ҃; лз҃, м҃). Найбольш блізкая, але адрозная ў дэталях (у прыватнасці, з іншай кантрамаркай) выява паказана ў альбоме Сакрата Клепікава (№№ 658, 660); паводле даследчыка, такі вадзяны знак ужываўся ў 1752 і 1760 гг., а падобная да такой кантрамарка «ЗС» пры іншай абрэвіятуры таго ж вытворцы «РФ» (№ 663) – у 1750 г. [4, с. 43, 142].

*Сшытак 4* складзены з лістоў, якія маюць філігрань, аналагічную прысутнай на паперы першага тэксту зборніка – з выявай Найсвяцейшай Панны Марыі без кантрамаркі (лл. ді҃, еі҃).

*Сшытак 6* змяшчае на паперы філігрань «АГ» (лл. ка҃, кд҃) з кантрамаркай у выглядзе вензеля (лл. кв҃, кг҃) (Лаўцявічус, № 3445). Паводле звестак літоўскага даследчыка, такі вадзяны знак выкарыстоўваўся ў 1764 і 1767 гг. [10, t. 1, p. 221]. Карнелій Трамонін указвае на прысутнасць выявы, падобнай да такой кантрамаркі (№ 588), у рукапісе 1742 г. [8, с. 15, 17].

*Сшыткі 7–9* маюць на паперы філігрань у выглядзе літар «ГУБР» (лл. кѕ҃, кз҃ ; кѳ҃, лв҃; лг҃, лѕ҃) і кантрамарку «ФСМП» (лл. кє҃, ки҃; л҃, ла҃; лд҃, лє҃). Такія філіграні, прычым узятыя паасобку, сустракаюцца толькі ў паказальніку К. Трамоніна. Будучы адным з першых у Расіі дапаможнікаў па філігранезнаўстве, гэты альбом мае шэраг недакладнасцей, таму да змешчаных у ім звестак належыць ставіцца з пэўнай асцярогай. К. Трамонін фіксуе *«каля 1780 г.»* [8, с. 16] (у адной крыніцы?) сюжэтны вадзяны знак з літарамі «ГУВР» (№ 529) і літары «ФСГП» (№ 528), магчыма, недакладна расчытаныя. Гэтыя ж абрэвіятуры даследчык падае пад № 538 і № 714 з той жа датай. Наяўнасць уласна абрэвіятуры «ФСМП» (№ 1101) ён указвае ў рукапісе 1703 г. [8, с. 20], што зноў жа выклікае пэўныя сумненні з прычыны занадта працяглага храналагічнага разрыву.

*Сшыткі 12–14* маюць на паперы філігрань з выявай узорчыстага картуша з крыжам зверху, на картушы злучаны літары РФ, а пад імі – І і М (лл. ма҃, мд҃); кантрамарка – у выглядзе вензеля сярэдняга памеру (лл. мв҃, мг҃). С. Клепікаў паказвае такую філігрань пад № 673, але зноў жа з іншай кантрамаркай (паштовы ражок на картушы пад каронай, што, магчыма, нагадвае хутчэй самастойны вадзяны знак). Выкарыстанне гэтай філіграні даследчык фіксуе ў 1740 і 1776 гг. [4, с. 43, 143]. Падобны вадзяны знак, але без літары «І» (№ 792) і ўказання на наяўнасць кантрамаркі дапаможнік К. Трамоніна змяшчае пад 1754 г. [8, с. 15, 17].

Указаныя сшыткі характарызуюцца нестабільным колькасным складам. *Сшытак 12* налічвае 3 лісты, а паколькі тэкст працягваецца без пропуску на першым лісце наступнага сшытка, значыць 4-ты ліст гэтага сшытка быў не страчаны падчас бытавання, а выдалены яшчэ падчас перапісвання тэксту (сапсаваны ?). На паперы *сшытка 13*, які складаецца ўсяго з 2 лістоў (паловы аркуша) (лл. мі҃ і мѳ҃), прысутнічае толькі асноўная частка гэтай філіграні, а на адзіным ацалелым лісце *сшытка 14* (л. н҃) – фрагмент кантрамаркі ў выглядзе вензеля; тэкст абрываецца, значыць л. на҃ быў страчаны ў працэсе бытавання. Відавочна, пісар меў намер скончыць сваю працу ў межах 2-х лістоў *сшытка 13*, але не разлічыў аб’ём і быў вымушаны далучыць яшчэ адзін 2-лістовы сшытак – 14-ты.

3. Трэці тэкст («ѡ ѡпреснокахъ», лл. [нв҃]–нє҃) змяшчаецца на адным сшытку, які пачаткова складаўся з 4 лістоў. Сшытак часткова расцярушаны, л. нв҃ страчаны. На паперы прысутнічае філігрань з выявай Найсвяцейшай Панны Марыі (лл. нг҃) і кантрамарка «ZL» (лл. нд҃, нє҃), аналагічная прысутнай на паперы першых двух сшыткаў другога тэксту зборніка.

4. Чацвёрты тэкст («Налистъ … ИПатия володиме*р*скаго и берестейскага Епископа», лл. нз҃–оа҃+) быў змешчаны на некалькіх сшытках, першапачатковая колькасць якіх невядомая з прычыны страты шэрагу лістоў канцавой часткі. Захаваўся першы сшытак з 6 лістоў (лл. нз҃–ѯг҃; апошні ліст адлучаны ад сшытка, але ёсць у наяўнасці), а таксама разрозненыя лісты з наяўнай фаліяцыяй (лл. ѯг҃, ѯд҃, ѯє҃, о҃, оа҃) і страчанай (2 лісты без нумарацыі).

З другога сшытка ацалелі толькі злучаныя між сабой лісты з пазначэннямі ѯе҃ і о҃ (палова аркуша), што павінна было б указваць на страту чатырох унутраных лістоў сшытка: ѯз҃, ѯѕ҃, ѯн҃ і ѯѳ҃. Іначай кажучы, гэты сшытак нібы таксама павінен быў бы мець 6 лістоў; аднак у гэтым выпадку ўзнікаюць сумненні адносна магчымасці змясціць на страчаных лістах фрагмент тэксту адпаведнага аб’ёму. Параўнанне рукапісу з апублікаваным тэкстам твора [7] дало магчымасць прыкладна разлічыць як аб’ём страчанага фрагмента, так і ў цэлым аб’ём тэксту ў рукапісе. Падлік па радках паказаў, што рукапісны тэкст прыкладна на 20% карацейшы за друкаваны (прапорцыя 16 : 20). Колькасць радкоў у публікацыі тэксту паміж адпаведнымі радкамі на лл. ѯе҃ і о҃ складае 332 радкі; значыць, аб’ём страчанага фрагмента рукапісу – каля 266 радкоў. Старонкі ліста ѯе҃ змяшчаюць па 24 радкі, старонкі ліста о҃ – 25 і 27. Выходзячы з гэтага, аб’ём страчанага фрагмента павінен складаць каля 11 старонак або 5,5 лістоў, а з улікам адступаў паміж часткамі тэксту мог дасягаць поўных 6 лістоў. Такім чынам, сумарна ў сшытку павінна было налічвацца 8 лістоў (2+6=8).

Недастатковы пропуск у нумарацыі палос, які назіраецца ў другім сшытку тэксту «Налистъ … ИПатия володиме*р*скаго и берестейскага Епископа» (4 замест 6), тлумачыцца тым, што фаліяцыя другога шэрагу была прастаўлена пасля злучэння ўсіх тэкстаў у адзін зборнік, калі некаторыя лісты ўжо былі страчаны ў працэсе бытавання. Пра гэта сведчаць яшчэ некалькі назіранняў, якія будуць прыведзены ніжэй.

Для таго, каб выказацца пра склад наступных сшыткаў, даных недастаткова, аднак магчыма разлічыць гіпатэтычны аб’ём рукапіснага тэксту ў цэлым. Пасля радка публікацыі, які адпавядае апошняму радку ў рукапісе на л. оа҃ адв., да канца тэксту налічваецца крыху больш за 900 радкоў. Значыць, першапачаткова рукапісны тэкст павінен быў мець каля 780 радкоў, што складае амаль 18 старонак або 9 лістоў. Вышэйсказанае схіляе да думкі, што нумарацыя заканчвалася прыкладна на л. п҃. (71+9=80). Безумоўна, у сувязі з непастаяннай колькасцю радкоў на старонцы гэтыя падлікі маюць умоўны характар, аднак наўрад ці перавысіць 1–2 старонкі ў той ці ў іншы бок. Высветліць, ці знаходзіўся ў манускрыпце пасля «Водпісу» яшчэ нейкі тэкст, на сённяшні дзень немагчыма.

Вяртаючыся да аналізу вадзяных знакаў, варта адзначыць, што першы сшытак разгляданага тэксту мае на сваёй паперы згаданую вышэй філігрань з выявай узорчыстага картуша з літарамі РФ і ІМ (лл. ма҃, мд҃) і кантрамаркай у выглядзе вензеля (лл. ни҃, ѯа҃), а таксама два лісты (палову аркуша) з неідэнтыфікаванай выявай на картушы (лл. нѳ҃, ѯ҃). Разрозненыя лісты з наяўнай фаліяцыяй маюць фрагменты наступных філіграняў: лл. ѯд҃ і оа҃ – згаданай вышэй філіграні з выявай узорчыстага картуша з літарамі РФ і ІМ, а лл. ѯє҃ і ѯ҃[и?] – кантрамаркі названай філіграні ў выглядзе вензеля. Лісты са страчанай фаліяцыяй маюць фрагменты філіграні з гербам Амстэрдама; паводле класіфікацыі Таццяны Дзіанавай, выява належыць да восьмай разнавіднасці гэтага знака, якая ўжывалася з 1698 па 1745 г. [2, с. 8]. Адсутнасць кантрамаркі не дазваляе датаваць гэтую філігрань больш дакладна, аднак ажыццёўленая маскоўскай даследчыцай грунтоўная спроба сістэматызацыі выяў вадзянога знака з гербам Амстэрдама дае магчымасць з вялікай верагоднасцю аднесці стварэнне рукапісу на гэтай паперы да часу не пазней за 1740-я гг.

Такім чынам, сучасныя даведнікі філіграняў фіксуюць ужыванне паперы другой часткі рукапісу ў асноўным паміж 1740 і 1776 гг. Разам з тым, супольнай рысай практычна ўсіх прысутных у гэтай частцы зборніка вадзяных знакаў з’яўляецца ўжыванне іх (ці блізкіх да іх філіграней) у 1740-я або ў 1750-я гг., што дае падставы датаваць напісанне часткі зборніка з другой пагінацыяй менавіта гэтымі гадамі. Таму ў цэлым магчыма аднесці час стварэння зборніка да сярэдзіны XVIII ст.

Наколькі пазней пасля «Историі Олистрикійско*м* … синодѣ» пачалі перапісвацца тэксты другой часткі, цяпер вызначыць складана, аднак

наўрад ці гэта адбывалася пасля вельмі доўгага перапынку, бо ў пісара яшчэ захоўваліся рэшткі паперы ад папярэдняга тэксту. Разам з тым, такі перапынак, напэўна, быў, паколькі гэтае пісанне было распачата на новазакупленай паперы, а старую паперу пісар выкарыстаў толькі пазней і фрагментарна – у адным з сярэдзінных сшыткаў. Перапісванне другой часткі кнігі магло заняць ад некалькіх тыдняў да некалькіх месяцаў ці нават гадоў – у залежнасці ад магчымасцей пісара. У кожным разе, шматразовая змена пяра, атраманту і асвятлення на працягу пісання прысутных у зборніку тэкстаў указвае на даволі працяглы ў часе працэс.

Гаворачы пра паслядоўнасць напісання асобных тэкстаў, варта адзначыць, што існуюць сур'ёзныя падставы сумнявацца, ці сшыты яны сёння ў тым самым парадку, у якім перапісваліся. Так, у прыватнасці, трэці тэкст зборніка («ѡ ѡпреснокахъ») напісаны на паперы з тымі ж вадзянымі знакамі (філігрань «Найсвяцейшая Панна Марыя з дзіцяткам Ісусам» і кантрамарка «ZL»), што і першыя сшыткі «Книги Нарасколъ Папистовъ». Гэта дазваляе са значнай ступенню верагоднасці меркаваць, што ён ствараўся раней, а на цяперашняе месца трапіў пры перасшыванні – магчыма, з прычыны вузейшай тэматыкі. Гэтая думка пацвярджаецца і тым фактам, што тэкст «ѡ ѡпреснокахъ» пачынаецца з другога ліста сшытка, прычым страта першага не прынесла шкоды яго цэласнасці – гэта значыць, першы ліст сшытка, як і ў выпадку «Исторіи Олистрикійско*м* … синодѣ», выступаў у якасці тытульнага або ахоўнага. Апошнім жа перапісваўся тэкст «Налистъ … ИПатия володиме*р*скаго и берестейскага Епископа», бо яго першы сшытак змяшчае паперу з тым жа вадзяным знакам, што і апошнія сшыткі «Книги».

Такім чынам, паслядоўнасць напісання тэкстаў другой часткі наступная: 1) «ѡ ѡпреснокахъ»; 2) «Книга Нарасколъ Папистовъ»; 3) «[Отписъ] Налистъ … ИПатия володиме*р*скаго и берестейскага Епископа». Паколькі лішні (тытульны / ахоўны) ліст напачатку сшытка меў толькі тэкст «ѡ ѡпреснокахъ», ёсць падставы сцвярджаць, што пачаткова ўсе тры тэксты былі аб'яднаны ў асобны зборнік.

***Змест***. Крыніцамі трох тэкстаў паслужылі друкаваныя выданні, паходжанне чацвёртага («ѡ ѡпреснокахъ») на дадзены момант не высветлена.

*Першы тэкст* мае загаловак «Исторіа Олистрикійско*м*. то е*ст* о разбойническо*м*: ферарском Альбо Фліоре*н*ско*м* синодѣ вкра*т*цѣ правдиве описанны*м*» і размешчаны на лістах 1–15 адварот першага шэрагу фаліяцыі. Гэты твор дастаткова вядомы ў спецыяльнай літаратуры, таму праблемы з яго атрыбуцыяй не ўзнікаюць. Разам з тым, указанне на крыніцу, з якой тэкст перапісаны, прысутнічае ў калафоне на л. 15 адв.: «А́покризи*с* а́лбо ѿповедь книги Особо́рѣ берестей-

ско*м* Імене*м* люде*и* Старожи*т*но*и* ре́л[иг]іи греческо*и* кр[и]*с*тофира[!] то есть Хрі*с*тоносца Филарета[!] то е*ст* Істинолюбца врихлидана[!]. дрꙋкована острозскаго дрꙋкꙋ». Гэта патрабуе пэўных тлумачэнняў. Справа ў тым, што кнігазнаўцы традыцыйна разглядаюць «Апакрысіс» Хрыстафора Філалета і «Гісторыю пра лістрыкійскі сінод» аўтарства Клірыка Астрожскага (з «Водпісам на ліст епіскапа Іпація Пацея») як два самастойныя выданні, а наш калафон сведчыць, што пісар карыстаўся канвалютам, у якім знаходзіліся абодва гэтыя тэксты. Прычым, як бачна, ён шчыра перакананы, што канвалют меў выдавецкі, а не ўладальніцкі характар.

Укладзены Аляксандрай Гусевай фундаментальны каталог кірылічных выданняў другой паловы XVI ст. паказвае, што і сёння, прынамсі, некаторыя асобнікі «Апакрысіса» і «Водпісу» злучаны ў канвалюты (напрыклад, у зборах Нацыянальнай бібліятэкі Украіны імя Вярнадскага) [1, с. 1079, 1088]. Колькасць ацалелых да сённяшняга дня асобнікаў гэтых выданняў таксама суадносная – 28 і 20 [1, с. 1079, 1088], што ўказвае на такі самы ці блізкі паводле велічыні наклад. Гэта прымушае задацца пытаннем: ці не выйшлі гэтыя тэксты сапраўды разам у выглядзе выдавецкага канвалюта?

Падставы для такога меркавання дае таксама і т. зв. “тытульны ліст” «Водпісу», кампаноўка якога істотна адрозніваецца ад тытульнага ліста «Апакрысіса» і шэрагу іншых астрожскіх выданняў разгляданага перыяду (характэрна, між іншым, што ўверсе тытульнай старонкі «Водпісу» змяшчаецца застаўка, ужываная звычайна друкарамі для азначэння пачатку раздзела, а рамку з элементаў адліванага арнаменту астрожцы выкарыстоўвалі не толькі для тытульных старонак, але і ўсярэдзіне выданняў). Разам з тым, «Водпіс» мае самастойны шэраг сігнатур і адмысловую прадмову «До чительника», якая была б лішняй у выпадку публікацыі гэтага твора ў якасці раздзела.

У сітуацыі адсутнасці дакументаў пра дзейнасць друкарні адказ на пытанне пра самастойнасць ці несамастойнасць «Водпісу» мог бы даць параўнаўчы аналіз філіграней, прысутных на паперы абодвух выданняў. Аднак у мінскіх бібліятэчных і музейных зборах, на жаль, маецца ў наяўнасці толькі выданне «Апакрысіса» (у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі), а друкаваная «Гісторыя пра лістрыкійскі сінод» адсутнічае, у сувязі з чым ажыццявіць параўнанне філіграней не ўдалося.

У гэтым артыкуле пры параўнанні тэксту рукапісу з першаўзорам выкарыстоўвалася публікацыя згаданага твора ў томе 19 «Рускай гістарычнай бібліятэкі» (далей – «РГБ»). Асаблівасцю рукапіснага тэксту з’яўляецца не толькі чаканыя разыходжанні з тэкстам друкаваным у арфаграфіі (у т. л. са зменамі, уведзенымі ў тэкст публікатарамі «РГБ»), але таксама і пэўныя лексічныя праўкі. Напрыклад, замест «вˁкоротцѣ

правдиве списаная» – «вкра*т*цѣ правдиве ѡписанны*м*», замест «кгды» – «егда», замест «хотя ся троха от предсявзятои речи отступит*ь*, приточити потребно» – «хотꙗсꙗ о*т* предПрiꙗто*и* Исторiи Уде*р*жати: А вспомянути Мало Оисидорѣ По*т*ребно», і інш.

Варта меркаваць, пісар ужо ўспрымаў аўтэнтычны тэкст XVI ст. як архаічны і падчас капіравання свядома (а ў асобных выпадках, магчыма, і падсвядома: «кгды» – «егда») імкнуўся адаптаваць яго да нормаў свайго часу. Прычым біблейныя цытаты ён замяняў на царкоўнаславянскія: замест «Боже! Пришли погане в дѣдицтво Твое…» – «боже Прiидоша ꙗзыцы вдостоянiе Твое…». З гэтага пункту гледжання гэты рукапіс, несумненна, можа даць філолагам нямала матэрыялу для разважанняў. Што тычыцца асаблівасцяў арфаграфіі манускрыпта, то ў пісьме як разгляданага твора, так і іншых тэкстаў зборніка, выяўлена такая характэрная рыса як блытанне гукаў «ѣ» і «і» (замест «спѣвали» – «спивали», замест «врихлѣ» – «врихли», замест «Константиновича» – «Константиновѣча»), што, магчыма, указвае на паходжанне пісара з Украіны. Дарэчы, прысутнасць сярод тэкстаў зборніка перакладу з валашскага выдання – «Книга Нарасколъ Папистовъ» – таксама з’ява для тагачаснай беларускай кніжнай культуры абсалютна нетыповая і сведчыць хутчэй пра «ўкраінскі след» у паходжанні манускрыпта.

*Другі тэкст* размешчаны на лістах а҃–на҃ другога шэрагу фаліяцыі і азагалоўлены наступным чынам: «Книга Нарасколъ Папистовъ Сочиненная Мудрiйшим Іеромонахо*м* Маѯимо*м* пелопонискимъ, Повелѣниемъ же Свѣтл Господарꙗ ивладѣтельнаго всей волоской Земли Кнꙗзꙗ Iѡанна Константиновѣча басаралабы(!) воеводы Бранковяна всобственной Его тѵпографiи Что вбȣкерестѣ, влѣто Спасителꙗ во 1690омъ».

Як вынікае з працытаванага загалоўка, дадзены тэкст надрукаваны паводле бухарэсцкага выдання 1690 г., што не можа не выклікаць здзіўлення з прычыны выкарыстання кірыліцы, ужо нехарактэрнай для валашскага кнігадрукавання гэтага часу. Удакладненне звестак паводле рэтраспектыўнага паказальніка нацыянальнай румынскай бібліяграфіі «Bibliografia românéscă veche» паказала, што наша сумненне было апраўдана: такое выданне ў згаданым годзе сапраўды выходзіла ў свет, але па-грэцку – «ΕΧΓΕΙΡΙΔΙΟΝ ΚΑΤΑ ΤΟΥ ΣΧΙΣΜΑΤΟΣ Τών Παπιστών (…)» [9, p. 297–298]. Такім чынам, тут мае месца пераклад.

Мову перакладу магчыма ахарактарызаваць як царкоўнаславянскую з беларуска-ўкраінскімі элементамі. Загаловак тэксту ў цэлым адпавядае грэцкаму арыгіналу, але прысутнічаюць пэўныя стылёвыя праўкі (у прыватнасці, з мэтай пазбегнуць паўтору геаграфічных назваў). Апрача таго, назва «ΕΧΓΕΙΡΙΔΙΟΝ» перакладзена як «Книга», хоць больш пашы-

раным адпаведнікам з’яўляецца слова «Дапаможнік», а грэцкі генетыў «Ἰωάννου Κωνσταντίνου» увогуле ўвёў перакладчыка ў зман, у выніку чаго імя валашскага гаспадара ён падае як «Іѡанна Константиновѣча» замест «Іѡанна Константина».

Адсутнасць згаданага выдання ў беларускіх дзяржаўных кнігазборах (у інтэрнэце яго лічбавая копія таксама не выяўлена) не дазваляе правесці больш шырокае параўнанне перакладу з арыгінальным тэкстам. Тым не менш, няма падстаў сумнявацца ў тым, што гэты тэкст быў перакладзены паводле згаданага выдання; трэба думаць, яно насамрэч з’яўляецца яго першаснай крыніцай. Разам з тым, белавы, без істотных правак, запіс тэксту паказвае, што кніга не перакладалася тут жа на месцы, а перапісвалася з ужо гатовага пратографа ці, прынамсі, чарнавіка. Гэта не дазваляе паставіць знак роўнасці паміж асобамі пісара і перакладчыка, хоць такая магчымасць і не выключана.

*Трэці тэкст* мае загаловак «ѡ ѡпреснокахъ» і пачаткова быў размешчаны на лістах [н҃в]–н҃є другога шэрагу фаліяцыі. Твор прысвечаны праблеме выкарыстання ў літургіі кваснага і прэснага хлеба – аднаму са спрэчных момантаў хрысціянскай абраднасці (а па сутнасці, і дагматыкі, паколькі праблема набыла тэалагічнае гучанне). Гэтая тэма часта ўздымалася ў палемічнай літаратуры XVI–XVIII стст., асабліва з праваслаўнага боку: і ў адмысловых трактатах, і ў працах, у якіх дыскутаваліся адрозненні паміж праваслаўнай і каталіцкай цэрквамі. Аднак прагляд праваслаўных дагматычных і палемічных твораў, апублікаваных беларускімі і ўкраінскімі друкарнямі XVI – першай паловы XVIII ст., не даў вынікаў. Таксама не ўдалося знайсці аналагічнага тэксту ў даступных у Беларусі рукапісах. Паколькі мова разгляданага твора з’яўляецца блізкай да мовы «Книги Нарасколъ Папистовъ», магчыма дапусціць, што гэты тэкст таксама з’яўляецца перакладным. Такая гіпотэза адкрывае шырокую прастору для пошукаў арыгінала, з якога пераклад мог быць зроблены. Тым не менш, на дадзены момант крыніца тэксту не высветлена.

*Чацвёрты тэкст* (апошні) зборніка азагалоўлены «Налистъ вбозѣ велебнаго о*т*ца ИПатия володиме*р*скаго и берестейскага Епископа. доⷢ҇асне Освѣцонаго кнⷢ҇ажати. Константина Остро*з*скаго. Воеводы киевскаго: Озалеценю иПрехвалении Восточно*й* Це*р*кви З Захо*д*нимъ костеломъ унии албо Згоды; в Року 1598. Писаный; Черезъ Одного наменшаго клирика. Церкви Острозкой втомже рокꙋ Отъ Писаный». Пачаткова ён займаў, наколькі магчыма меркаваць, лісты н҃з–п҃ 2-га шэрагу фаліяцыі. Як відаць з загалоўка, гэта копія яшчэ аднаго твора з таго самага выдання, у якім была апублікавана «Гісторыя пра ліструкійскі сінод». Такое меркаванне таксама пацвердзіла параўнанне рукапісу з першаўзорам. Для параўнання была выкарыстана публікацыя твора ў 19 томе «РГБ»

[7], а таксама факсімільнае ўзнаўленне прадмоўнай часткі выдання ў каталогу А. Гусевай [1, рыс. 165.1–165.5].

Паміж раздзеламі гэтага тэксту размешчана адзіная ў кнізе аздоба – рысаваная пяром канцоўка ў выглядзе вензеля з літар імя «MARIA», якая знаходзіцца пасля прадмовы да тэксту – перад пачаткам яго асноўнай часткі, азагалоўленай як «Листъ» (л. н҃ѳ). Наяўнасць канцоўкі ў гэтым месцы друкаванага выдання адзначана таксама публікатарамі «РГБ»: *«тут, пад «Предмовою» невялікае ўпрыгожанне»* [7, с. 384], а факсімільнае ўзнаўленне старонкі з канцоўкай падае А. Гусева ў згаданым вышэй каталогу [1, рыс. 165.5]. На факсіміле бачна, што ў старадруку выкарыстана канцоўка фёдараўскага тыпу, а значыць рысунак у манускрыпце з'яўляецца праявай уласнай творчасці пісара (зрэшты, трэба адзначыць, што такога роду вензелі былі сімвалам, які досыць нярэдка сустракаецца ў рэлігійным ужытковым мастацтве Рэчы Паспалітай [6, с. 182–183]).

У гэтым тэксце істотныя стылістычныя праўкі не выяўлены. Прысутнічаюць толькі дробныя замены пад уплывам «унутранага дыктанта» («што» / «что» і «кгды» / «егда»), а цытаты даюцца згодна з першаўзорам. Фактычна, назіраюцца толькі разбежнасці арфаграфічнага характару і рэдкія выпадкі перастаноўкі слоў, якія (апрача даволі рэгулярнага пераносу часціцы «сѧ» на месца пасля дзеяслова) выкліканы, верагодна, няўважлівасцю. Таксама няўважлівасцю або пашкоджаннем старонкі старадрука магчыма растлумачыць і адсутнасць у загалоўку першага слова – «Отписъ».

***Штампы***. На форзацы, л. н҃ і ў іншых месцах кнігі шасцікутны штамп фіялетавай масцікай «Беларускі Дзяржаўны | Музэй | № ___».

***Надпісы***. На форзацы: 1) слабачытэльны надпіс выгаслым карычневым атрамантам «Евгеніи папа рымскі … [нрзб]»; 2) карычневым атрамантам почыркам XVIII ст.: «Kniha narosko ... [нрзб]»; 3) чорным атрамантам почыркам XVIII ст. іншай рукі: «B: Phociusz Patriarcha Konstantynopolski | 8 Synod był wCarogrodzie Michal Cesarż | Carogrodzki. Apapież Rzymski 8 Jan:».

На форзацы і л. 1 аб'ёмны надпіс выгаслым чорным атрамантам на рускай мове дробным почыркам XIX ст. са згадкай даты 16 лістапада 1876 г.

На л. 12 адв. аб'ёмны надпіс выгаслым чорным атрамантам на рускай мове дробным почыркам XIX ст.

На лл. з҃ адв.–и҃ надпіс выгаслым чорным атрамантам на рускай мове дробным почыркам XIX ст.

На л. еı҃ надпіс выгаслым чорным атрамантам на рускай мове дробным почыркам XIX ст. «Книга родства Ивана Барановскаго …».

На лл. мв҃ адв. – мг҃ надпіс выгаслым чорным атрамантам на рускай мове дробным почыркам XIX ст.

На л. ме҃ спроба пяра выгаслым чорным атрамантам на рускай мове каліграфічным почыркам XIX ст. «Его Преподобію».

На л. нз҃ надпіс выгаслым чорным атрамантам на рускай мове дробным почыркам XIX ст. На л. ѯд҃ надпіс на рускай мове дробным почыркам XIX ст. са згадкай даты 13 студзеня 1844 г.: «13 Ген[варя] 1844о года взбунтовалась въ Охор. монастырѣ шляхта / съ старцевъ оданинах [?], вмѣстѣ съ ними единомышленники / … [нрзб.] отвратительныя Дер. Устьей»[1].

***Музейныя і бібліятэчныя адзнакі.*** На форзацы: 1) простым алоўкам «5665$^{6}$»; 2) чырвоным алоўкам «88».

На л. 1 карычневым атрамантам почыркам XVIII ст.: «N: ~~4~~ (перакрэслена) 50».

На лл. 1–15 фаліяцыя арабскімі лічбамі, прастаўлена карычневым атрамантам почыркам XVIII ст. (пазнейшым за почырк самога рукапісу).

На лл. а҃–оа҃ фаліяцыя скразная чорным атрамантам, прастаўлена славянскімі лічбамі.

На л. ѯд҃ адв.: 1) чорнай тушшу "~~ИНВ 863 ГИМ~~" (перакрэслена); 2) фіялетавым атрамантам «540 БДМ».

На л. ѯг҃ адв. 2-й фаліяцыі: чорнай тушшу «ИНВ 863 ГИМ».

***Гісторыя прадмета.*** Рукапіс з’яўляецца зборнікам праваслаўных тэкстаў палемічна-дагматычнай накіраванасці, перапісаных невядомай асобай у сярэдзіне XVIII ст., верагодна, на ўкраінскіх землях Рэчы Паспалітай.

Пачаткова дзве часткі зборніка з рознай пагінацыяй бытавалі ў якасці асобных рукапісаў і былі сшыты разам толькі ў другой палове XVIII ст., прычым паслядоўнасць тэкстаў другога рукапісу была зменена. Паколькі другі шэраг фаліяцыі ўлічвае змены ў першапачатковым парадку тэкстаў, ён быў прастаўлены ўжо пасля аб’яднання іх пад адзінай аправай. У гэты час канвалют (ці, магчыма, толькі першы яго алігат) уваходзіў у склад пэўнай бібліятэкі, пра што сведчыць надпіс карычневым атрамантам «№ 50», аналагічным атраманту фаліяцыі першага шэрагу.

У XIX ст. рукапіс, мяркуючы па наяўнасці надпісаў са згадкай Вохарскага манастыра Праўтварэння Господняга і вёскі Вусце, бытаваў на Чэрыкаўшчыне.

У міжваенны час канвалют належаў Беларускаму Дзяржаўнаму Музею. Як вынікае з музейных адзнак, падчас Другой сусветнай вайны ён быў вывезены ў Германію, аднак пасля заканчэння вайны вернуты ў

---

[1] Вохарскі манастыр Пераўтварэння Господняга (сёння не існуе) знаходзіўся ў Чэрыкаўскім павеце на левым беразе ракі Сож насупраць вёсак Міхалін і Вусце (абедзве ў цяперашні час знаходзяцца ў Рэчыцкім сельсавеце Чэрыкаўскага раёна Рэспублікі Беларусь).

Беларусь і перададзены ў фонд планаванага Дзяржаўнага гістарычнага музея, на базе якога, аднак, быў створаны Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Напрыканцы 1950-х гг. разам з іншымі гістарычнымі фондамі кніга была перададзена Дзяржаўнаму гісторыка-краязнаўчаму музею БССР (папярэдніку сённяшняга НГМ РБ), рашэнне пра стварэнне якога было прынята ў той час.

## Крыніцы і літаратура


1. Гусева, А. А. Издания кирилловского шрифта второй половины XVI века : сводный каталог : в 2 кн.; под общей ред. Л. И. Сазоновой; Российская государственная библиотека. – Москва : Индрик, 2003.
2. Дианова, Т. В. Филиграни XVII–XVIII вв. «Герб города Амстердама»: [каталог]. – Москва : Государственный Исторический музей, 1998. – 166, [2] с. : ил. – (Труды Государственного Исторического музея).
3. История о разбойничьем Флорентийском соборе, изданная Клириком Острожским в 1598 г. // Русская историческая библиотека, издаваемая Археографической комиссией. – Т. 19: Памятники полемической литературы в Западной Руси, кн. 3. – Санкт-Петербург, 1903. – Стб. 433–476.
4. Клепиков, С. А. Филиграни на бумаге русского производства XVIII – начала XX века. – Москва : Наука, 1978. – 238 с. : ил.
5. Лаўрык, Ю. М. Манускрыпты са слуцкімі правенецыямі ў калекцыі «Рукапісныя кнігі» Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. – Вып. 16. – Мінск : НГАБ, 2018. – С. 44–65; Вып. 17. – Мінск : НГАБ, 2019. – С. 57–79; Вып. 18. – Мінск : НГАБ, 2020. – С. 18–27.
6. Лаўрык, Ю. М. Па слядах аднаго міфа: Да пытання пра пазаканфесійнае ўжыванне манаграмы IHS на айчынных кніжных апраўах XVI–XVIII стст. // Здабыткі: навук. зб. – Вып. 23. – Мінск : НББ, 2020. – С. 177–191.
7. Ответ Клирика Острожскаго Ипатию Потею 1598 г. // Русская историческая библиотека, издаваемая Археографической комиссией. – Т. 19: Памятники полемической литературы в Западной Руси, кн. 3. – Санкт-Петербург, 1903. – Стб. 378–432.
8. Тромонин, К. Я. Изъяснения знаков, видимых в писчей бумаге, посредством которых можно узнавать, когда написаны или напечатаны какие-либо книги, грамматы, рисунки, картинки и другие старинные дела, на которых означено годов. – Москва : В тип. А. Семена, 1844. – [2], 22 с., CIV л. ил.
9. Bibliografia românéscă veche, 1508–1830 / de Ioan Bianu si Nerva Hodoş. – Tomul I. 1508–1716. – Bucuresci : Stabilimentul grafic J. V. Socec, 1903. – IX, [1], 571, [1] p. – (Ediţiunea Academiei Române).
10. Laucevičius, E. Popierius Lietuvoje XV–XVIII a. [su 2 t.]. – Vilnius : Mintis, 1961.


Артыкул паступіў у рэдакцыю 02.03.2021

*Д. В. Лісейчыкаў, М. А. Плавінскі*

# «Цуд на востраве сярод водаў»: Браслаўскі Прачысценскі манастыр у святле пісьмовых крыніц і археалагічных даследаванняў*

Браслаўскі Прачысценскі манастыр з'яўляецца надзвычай цікавым прыкладам рэлігійнай абшчыны, жыццядзейнасць якой адбывалася на вузка абмежаванай тэрыторыі на працягу доўгага перыяду – больш за тры стагоддзі. Гэтая акалічнасць дае магчымасць даволі лёгка лакалізаваць яго былое месцазнаходжанне. Адносная цяжкадаступнасць месца, дзе знаходзіўся манастыр, паспрыяла добрай захаванасці культурнага слоя. Усё разам дае рэдкую магчымасць рэканструяваць асноўныя этапы гісторыі манастыра, а таксама асноўныя асаблівасці матэрыяльнай культуры і побыту яго жыхароў, спалучыўшы комплекснае вывучэнне пісьмовых крыніц з археалагічнымі і нумізматычнымі матэрыяламі.

На сённяшні дзень востраў пад назвай Манастыр, на якім калісьці размяшчаўся культавы аб'ект (мал. 1), знаходзіцца ў паўднёвай частцы возера Неспіш, якое мае плошчу 4,57 кв. км, найбольшую глыбіню 6,3 м і даўжыню берагавой лініі 16,5 км [5, с. 306]. Тэрыторыя вострава ўваходзіць у склад Слабодкаўскага сельскага савета Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці.



Мал. 1. Выгляд вострава Манастыр з вышыні. *Фота Гальяша Сялявы, 2019 г.*

* Гістарычная частка артыкула была падрыхтавана ў рамках даследчага праекту «Bazylianie prowincji litewskiej w latach 1617–1839», які здзяйсняецца за кошт сродкаў Narodowe Centrum Nauki nr. UMO-2020/39/B/HS3/01232 (104/21/G).

## Пісьмовыя і іканаграфічныя крыніцы

Адзін з першых дакументаў, які дайшоў да нашага часу, дзе згадваецца манастыр у Браславе, датуецца 1540-м годам. Гэта прывілей вялікага князя літоўскага Жыгімонта I на браслаўскае прачысценскае ігуменства гаспадарскаму двараніну Міцьку Васільевічу [6]. З прывілея вынікае, што папярэдні ігумен Арсень памёр незадоўга да 1540 г. У дакуменце згадваецца вялікая княгіня літоўская Алена, якая калісьці мела права падавання браслаўскіх ігуменаў. Лічыцца, што Алена атрымала Браслаў у 1501 г., а ў дакуменце маецца фармуліроўка *«оныи монастыръ взела ку своему подаванью»* (цыт. паводле: [6, с. 14]). Гэта значыць, паводле стану на 1501 г. ён не проста існаваў, а ўжо функцыянаваў. Такім чынам, карані манастыра сягаюць як мінімум у XV ст.

Падрабязнае апісанне манастырскага архіва, якое было зроблена ў 1819 г., называе наступныя асноўныя дакументы, паводле якіх манастыр фактычна і існаваў: *«Калі грунтавацца на самой толькі копіі з фундуша каралевы Алены, выпісанай з Полацкага земскага суда 1621 года, то фундуш гэты зацверджаны каралём польскім і вялікім князем літоўскім Аляксандрам, яе мужам, атрымлівае свой пачатак з 1503 года. Гэтае першапачатковае дароўнае паднашэнне царкве і Браслаўскаму манастыру ўтрымлівала ў сабе 15 гаспадарак у Браслаўскім павеце з іх павіннасцямі, палову Неспішскага возера і млын на рацэ Вусвіцы, звыш таго ў самім Браславе 7 сялянскіх гаспадарак, ворныя палі і сенажаці, але ў якой працягласці і межах невядома. Пасля, у 1631 годзе, троцкі ваявода Януш Скумін Тышкевіч, пабудаваўшы ў Браслаўскім замку капліцу і далучаючы да манастыра, усклаў на яго пэўныя абавязкі, запісаў свой фальварак Княгіні, а цяпер засценак Княжына званы, які знаходзіцца ў тым жа павеце, з будынкамі, агародамі і палямі і інш. Гэтае ахвяраванне зацверджана прывілеямі польскага караля Уладзіслава IV 1633 года. Каля гэтага часу, у 1634 годзе, князь Іван Масальскі надаў гэтаму манастыру палі Каралі і Шыпкаўшчына, цяпер засценак Міцкевічы*[1] *званы, таксама замак Гарадзішча (гэтай мясцовасці манастыр ужо ва ўласнасці не мае)»* [10, арк. 35 адв.–36].

Як бачна, згодна з пералічанымі ў апісанні архіва дакументамі, манастыр працягваў дзейнічаць і ў 1630-я гг., пасля заключэння Брэсцкай уніі 1596 г. Паколькі ў якасці фундатараў манастыра ўзгаданы Скуміны-Тышкевічы, магчыма дакладна сцвярджаць, што манастыр вызнаў юрысдыкцыю ўніяцкай іерархіі. У 1598–1599 гг. згадваецца браслаўскі архімандрыт айцец Клімент, у міры Багдан Одкінскі (Годкінскі) [14, арк. 36–38 адв.]. Паводле распаўсюджанай практыкі тых часоў, ён па-

[1] У цяперашні час – вёска Маскавічы Слабодкаўскага с/с Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці.

стрыгся ў манахі ў сталым узросце, маючы пры гэтым і жонку, і сям'ю (падрабязней пра гэтую практыку на тэрыторыі Кіеўскай мітраполіі гл.: [9]). Гэта наводзіць на думку, што браслаўскі манастыр у той час ужо не меў паўнавартаснай структуры, а з'яўляўся, па сутнасці, звычайным маёнткам. Пацвярджаюць гэта і матэрыялы актавых кніг Браслаўскага земскага суда 1603–1614 гг. [11; 12; 13]. За гэты перыяд манастыр у іх згаданы толькі аднойчы і выключна ў сувязі з гаспадарчай дзейнасцю таго ж браслаўскага архімандрыта Клімента. У студзені 1608 г. яго аканом напаў і збіў падданых суседняга маёнтка Кажынічы, які належаў браслаўскаму ксяндзу [13, арк. 118 адв.–120 адв.]. З дакументаў 1598–1608 гг. вядома, што Клімент сумяшчаў дзве пасады – адначасова з'яўляўся і браслаўскім, і гродзенскім каложскім архімандрытам. З гэтага магчыма дапусціць, што браслаўская архімандрыя была ганаровым дадаткам да асноўнай пасады гродзенскага архімандрыта, а сам айцец Клімент жыў у Гродне.

Браслаўскі манастыр практычна не згадваецца і ў тэкстах пасяджэнняў капітул базыльянскага ордэна з 1617 па 1709 гг. [4]. Гэта таксама сведчыць на карысць таго, што ён не функцыянаваў як паўнавартасны манастырскі комплекс. Пад 1661 г. у матэрыялах кангрэгацыі ордэна прама гаворыцца, што Браслаўскай архімандрыі не існуе [4, с. 68]. У матэрыялах кангрэгацыі 1667 г. згаданы без імя браслаўскі архімандрыт, які паралельна з'яўляўся архімандрытам гродзенскім [4, с. 94], а ў матэрыялах кангрэгацыі 1683 г. – браслаўскі архімандрыт і паралельна настаяцель манастыра ў вёсцы Касута Ашмянскага павета Стэфан Селюжынскі [4, с. 194]. Абодва, відавочна, жылі не ў Браславе. Няма ніводнай згадкі пра дзейсны манастыр і ў матэрыялах першай суцэльнай генеральнай візітацыі базыльянскіх манастыроў Літоўскай правінцыі 1704–1705 гг. [17]. Аднак вядома, што, прынамсі, намінальна пасада браслаўскага архімандрыта працягвала існаваць і ў гэты час. Так, у 1703 г. памёр архімандрыт Пафнуцій Савіцкі[2] [16, арк. 18; 18, арк. 13]. Дакладна невядома, ці жыў ён у Браславе і ці быў пахаваны ў сваім манастыры. Магчыма, як і ў яго папярэднікаў, пасада браслаўскага архімандрыта была толькі ганаровым дадаткам. Затое маюцца дакладныя звесткі, што ўжо наступны архімандрыт Канстанцін Булгак[3], які памёр 25 сакавіка 1724 г. *«ад калтуна»*, быў пахаваны ў манастыр-

---

[2] **Савіцкі Пафнуцій** (свецкае імя – **Павел**) (1660–1703, г. Браслаў) – сын навагрудскага падстаросты, 22.03.1676 уступіў у ордэн у мястэчку Быцень Слонімскага павета, 17.10.1677 склаў манаскія шлюбы, да 1703 г. архімандрыт Браслаўскага манастыра.

[3] **Булгак Канстанцін** (свецкае імя – **Казімір**) (каля 1662–25.03.1724) – з сям'і слонімскага падстолія і падстаросты Уладзіслава-Канстанціна, 03.04.1683 уступіў у ордэн у мястэчку Быцень Слонімскага павета, у 1684 г. *«спрабаваў служыць пры вялікіх дварах»*, 30.04.1684 склаў манаскія шлюбы, настаяцель манастыра ў мястэчку Ба-

скім будынку на востраве [16, арк. 37 адв., 42 адв.–43; 18, 35]. Такім чынам, пісьмовыя крыніцы даюць падставы сцвярджаць, што як мінімум з сярэдзіны XVII ст. (з часоў Трынаццацігадовай вайны Маскоўскай дзяржавы з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг.) да заканчэння Вялікай Паўночнай вайны, г. зн. да сярэдзіны 1720-х гг. Браслаўскі манастыр дэ-факта не дзейнічаў.

Першыя падрабязныя звесткі аб яго дзейнасці і аб асабовым складзе брацііі маюцца ў матэрыялах генеральнай візітацыі 1738 г., якая захавалася ў фондах Аўстрыйскай Нацыянальнай бібліятэкі ў Вене [3, арк. 258–260]. Актывізацыя манастырскага жыцця звязана з прызначэннем на пасаду архімандрыта Антонія Праслаўскага ў 1738 г. Штат манастыра быў цалкам укамплектаваны – разам з архімандрытам у ім пражывала 5 манахаў. Пачалася разбудова жылых і гаспадарчых памяшканняў. Найбольшага росквіту манастыр дасягнуў пры наступным архімандрыце Яне-Гераніме Нерэзіі[4], які заняў гэтую пасаду ў сярэдзіне 1760-х гг.

Менавіта пры Яне-Гераніме Нерэзіі манастыр у Браславе займеў уласную рэліквію, якая з’яўляецца “візітнай карткай” хрысціянства на Браслаўшчыне, – цудатворны абраз Маці Божай Браслаўскай, які сёння вядомы пад назвай «Уладарка Азёраў» і захоўваецца ў парафіяльным Браслаўскім касцёле. Пры архімандрыце Гераніме ў Вільні выйшлі дзве брашуры яго аўтарства [1; 2], прысвечаныя апісанню цудаў абраза Браслаўскай Божай Маці, а таксама была выпушчана друкарскім спосабам гравюра з яго выявай (мал. 2). Папулярнасць культу абраза прыносіла вялікія матэрыяльныя дывідэнды самому манастыру. У другой палове XVIII ст. ён стаў папулярным месцам паломніцтва.

Найбольш поўнае апісанне манастырскіх будынкаў, незадоўга да таго, як манастыр перастаў дзейнічаць, утрымлівае пратакол яго візітацыі за май 1819 г., складзены кіраўніком Літоўскай правінцыі базыльянскага ордэна Цэзарыем Каменскім. Паколькі важна параўнаць даныя пісьмовых крыніц з данымі археалагічных даследаванняў, варта прывесці цалкам фрагменты дакумента, якія ўтрымліваюць адпаведныя звесткі: *«Царква, якая знаходзіцца пры гэтым манастыры пад назвай Унебаўзяцця Божай Маці, пабудавана са склюдаванага дрэва*

---

руны Ашмянскага павета (на 1703 г. ужо былы), з 1703 па 25.03.1724 архімандрыт Браслаўскага манастыра.

[4] **Нерэзій (Нерэзіюш) Ян-Геранім** (свецкае імя невядомае) (1720–20.09.1790) – 17.10.1741 уступіў у ордэн базыльянаў у Быцені, у 1745 г. прапаведнік у манастыры Св. Тройцы ў Вільні, у 1750–1765 гг. настаяцель манастыра ў Бучачы пад Львовам, дзе заснаваў калегіум на 200 вучняў, у 1750-я гг. настаяцель манастыроў Св. Барыса і Глеба ў Навагрудку і ў вёсцы Лаўрышава Навагрудскага павета, у 1765–1790 гг. архімандрыт Браслаўскага манастыра. Аўтар шэрагу кніг на польскай і лацінскай мовах.




Мал. 2. Цудатворны абраз Маці Божай з Браслаўскага базыльянскага манастыра.
*Гравюра невядомага аўтара, другая палова XVIII ст.*

*на каменнай аснове, ужо значна сапсаваная, у выглядзе крыжа з дзвюма ад фронту вежамі, са столлю пад вялікім алтаром і званочкам, абабітай навокал дошкамі, дах з гонты, якая праз сваю спарахнеласць згніла і працякае, ад чаго скляпенне і вуглы царквы так згнілі, што могуць хутка разбурыцца. (...) Паблізу ад царквы стаіць драўляная двухузроўневая васьмівугольная званіца, пабудаваная з цясанага дрэва, з дахам з гонты, якая праз старасць мае адну скрыўленую сцяну, у якой знаходзіцца два званы сярэдняй велічыні, а трэці меншы. (...) Тут утрымліваецца шпіталь коштам манастыра і міласцінамі, асобнага ж фундуша не мае. У гэтым шпіталі змяшчаюцца чатыры чалавекі жабракі. Манастыру належыць палова Несвіжскага возера і млын на рацэ Вусвіцы. (...) Пры вышэйзгаданай царкве знаходзіцца манастыр, пабудаваны са склюдаванага дрэва, у адзін паверх і дзве лініі, накрыты гонтай. У першай лініі знаходзіцца кватэра архімандрыта на каменнай аснове, якая ўтрымлівае ў сабе чатыры пакоі з двума гардэробамі, зручна размешчанымі, пад якімі маюцца чатыры склепы, пабудаваныя з дрэва і значна сапсаваныя вільгаццю, у другой лініі знаходзяцца чатыры ардынарныя келлі, пятая з пакойчыкам, і дзве каморкі. Абодва калідоры, гэтак жа як і ўсе пакоі, са столлю. На калідорах падлога цагляная, а ў пакоях – з дошак. Вокны з рамамі. Печкі з кафлі. Дзверы старыя на петлях з простымі замкамі, у пакоі ж архімандрыта замкі французскія. (...) У канцы другой манастырскай лініі знаходзіцца кухонны флігель са склюдаванага дрэва, нядаўна накрыты саломай, даволі спарахнелы, з двума крыжападобнымі калідорамі, і шасцю па абодвух баках пакоямі, паміж якімі знаходзіцца трапезная, пякарня і іншыя каморы і жылыя пакоі для работнікаў. Непадалёк ад гэтага флігеля двух'ярусная вяндлярня, накрытая гонтай, патрабуе рамонту. Таксама як і сумежныя з ім памяшканні са склюдаванага бярвення патрабуюць новага даху. Ззаду названага флігеля старая лядоўня, якая цяпер перабудоўваецца нанова. Непадалёк ад яе хлеў. Мост жа мясцовай царквы, пабудаваны на палях з парэнчамі, патрабуе рамонту і ўмацавання. У канцы гэтага моста па левы бок стаіць шпітальны дом з буйнога будаўнічага лесу са страхой, які таксама патрабуе рамонту. Насупраць яго жылы дом для аканома, нанова перабудаваны. Насупраць жа квадратнае гумно з хлявамі стаіць і з іншымі эканамічнымі выгодамі са страхой. Каля яго пабудаваны лаўкі ў 15 прыдзелаў. У недалёкай адлегласці – стайні, пабудавана паветка са старога дрэва, далей пуня і летняе гумно, адрына, сялянскі склад са страхой. На пагорку за фальваркавай агароджай – вятрак, даволі яшчэ моцны, і бровар з саладоўняй, пабудаваны пры фальварку. У баку ад фальварка, блізка ад паштовай дарогі, заезная карчма, пабудаваная часткова са склюдаванага, часткова з круглага бярвення. Пры гэтай карчме дом*




Мал. 3. «Браславль. Местечко Ковенской губ. Новоалександровского уезда. Озеро Неспиж. В 5-ти верстах от местечка остров, где был мужской Успенский мон. Святой Остров, где был чуд. крест». *Акварэль Д. М. Струкава, 1864 г.*

*для вандроўнікаў, падклець, лядоўня і юрыдычная пабудова[5] (...)»* [10, арк. 33 адв.–41 адв.].

Апошнія гады існавання манастыра звязаны з асобай архімандрыта Адрыяна (Антона Галаўні)[6]. У 1812 г. ён актыўна падтрымаў Напалеона падчас ваеннай кампаніі супраць Расіі. Яго подпіс маецца пад актам далучэння Вялікага Княства Літоўскага да генеральнай канфедэрацыі Каралеўства Польскага. Улетку 1812 г. на засеяных збожжам палях, якія належалі Браслаўскаму манастыру, быў размешчаны на пастой лагер

---

[5] У рускамоўным арыгінале – «юридическое строение». Магчыма, гэта спецыфічны пераклад тэрміна «афіцына» (пол. – «oficyna»), якім абазначалася спецыяльная пабудова, куды з жылога комплексу выносіліся службовыя памяшканні.

[6] **Галаўня Адрыян** (свецкае імя – **Антон**) (нар. 09.04.1750, памёр 01.02.1831 у кляштары бернардзінцаў у Вільні) – паходзіў з рымска-каталіцкай сям'і, вучыўся ў Віцебскім калегіуме езуітаў, Віленскім Папскім алюмнаце, Віленскай акадэміі езуітаў, у 1767 г. уступіў у ордэн у мястэчку Беразвечча Полацкага ваяводства, у 1776 г. высвечаны ў сан, у 1792–1801 гг. каад'ютар і ў 1801–1831 гг. архімандрыт Браслаўскага манастыра; у 1809–1828 гг. епіскап-суфраган Літоўска-Віленскай епархіі, у 1811–1831 гг. дапаможны епіскап аршанскі.




Мал. 4. «План Браславля и окрестностей. Делано наглядно с натуры, без размера». *Акварэль Д. М. Струкава, 1864 г.*

французскага маршала Мішэля Нэя. Гэты факт пасля ставіўся расійскімі ўладамі ў віну архімандрыту, якога прыцягнулі да адказнасці за растрату фундушовых сродкаў. Адрыян практычна не жыў у сваёй манастырскай рэзідэнцыі, што ўскосна паспрыяла заняпаду манастыра. Пасля таго, як расійскія ўлады ў 1809 г. аднавілі дзейнасць Літоўска-Віленскай уніяцкай епархіі, абмежаваўшы яе тэрыторыяй Віленскай губерні і паловы Мінскай, Адрыян заняў пасаду літоўска-віленскага епіскапа і пачаў пастаянна пражываць у Вільні. Верагодна, у гэты ж час ён перавёз у Вільню і цудатворны абраз Маці Божай Браслаўскай. Таму абраз не пацярпеў падчас пажару, які адбыўся на востраве ў пачатку 1830-х гг. і паклаў канец існаванню манастыра. З гэтага часу манастыр не аднавіў сваёй дзейнасці.

У 1864 г. віленскі генерал-губернатар Міхаіл Мураўёў запрасіў вядомага мастака Дзмітрыя Струкава правесці экспедыцыю па так званым «Паўночна-Заходнім краі» з мэтай выяўлення і фіксацыі старадаўніх помнікаў праваслаўя альбо звестак пра тыя з іх, якія не захаваліся да таго часу. Вынікам экспедыцыі стала з'яўленне серыі акварэляў, якія маюць выключную навуковую каштоўнасць. Сярод іх маюцца і выявы вострава Манастыр (мал. 3–5) [20, с. 42–45, 204–205].




Мал. 5. «От Браславля в 5-ти верст. план острова и фундаментов мужского успенского монастыря». *Акварэль Д. М. Струкава, 1864 г.*

На час правядзення Д. Струкавым экспедыцыі манастыр ужо тры дзесяцігоддзі як перастаў існаваць. Нягледзячы на тое, што выявы вострава на вакамерных планах Струкава арыентаваны па-рознаму і ні ў адным з выпадкаў арыентацыя не адпавядае рэальнай, іх магчыма параўнаць з сучаснымі планамі і спадарожнікавымі здымкамі. З улікам звестак пратакола візітацыі Ц. Каменскага 1819 г. і даных плана Д. Струкава № 16 магчыма сцвярджаць, што царква знаходзілася ў паўночнай частцы вострава, а манастыр – у паўднёвай (мал. 5).

## Археалагічныя даследаванні

Нягледзячы на тое, што востраў Манастыр не застаецца без увагі гісторыкаў [6], колькі-небудзь значных археалагічных даследаванняў гэтага помніка да нядаўняга часу не праводзілася. Выключэннем былі разведачныя работы, ажыццёўленыя Людмілай Дучыц у 1978 г. Даследчыца заклала на востраве 4 шурфы памерам 1 кв. м, у якіх былі выяўлены фрагменты познесярэднявечнай керамікі і кафлі. На жаль, інфармацыя аб дакладным месцы размяшчэння шурфаў у яе справаздачы адсутнічае [7, с. 123, рис. 3–5]. Апрача таго, у 2005 г. Мікалай Плавінскі абследаваў тэрыторыю селішча Манастыр, якое знаходзіцца злева ад шашы

Браслаў – Слабодка – Друя на паўвыспе паўднёвага берага возера Несціш. Тут была сабрана вялікая калекцыя пад'ёмнага матэрыялу – фрагментаў керамічнага і шклянога посуду і кафлі XVI–XIX стст. Магчыма ўпэўнена меркаваць, што дадзенае селішча маркіруе тэрыторыю, на якой размяшчалася частка гаспадарчых пабудоў Прачысценскага манастыра [15, с. 119–124].

Правядзенне раскопак на востраве Манастыр у 2019 г. было абумоўлена меркаваннямі як навуковага парадку (вызначэнне часу засваення тэрыторыі вострава Манастыр, храналогіі і асаблівасцей яго функцыянавання і г. д.), так і практычнага характару. Браслаўскія грамадскія актывісты на чале з Аленай Шэўчык у шчыльным супрацоўніцтве з каталіцкім касцёлам і ўніяцкай царквой выпрацавалі канцэпцыю па ажыццяўленні комплексу мерапрыемстваў па рэкрэацыі вострава Манастыр і ўключэнні яго ў існуючыя турыстычныя маршруты па тэрыторыі Браслаўскага раёна.

Даследаванні праводзіліся ў цэнтральнай частцы вострава, бліжэй да яго ўсходняга берага (мал. 6–7). Тут былі закладзены Раскоп I і Шурфы I–III агульнай плошчай 54 кв. м (Раскоп I – 26 кв. м, Шурф I – 10 кв. м, Шурф II – 8 кв. м, Шурф III – 10 кв. м) (мал. 8).

**Раскоп I** меў прамавугольную форму памерам 13×2 м і быў выцягнуты па лініі поўнач – поўдзень. Магутнасць культурных напластаванняў у раскопе дасягала ад 0,22–0,26 м у яго паўднёвай частцы да 0,43–0,58 м у паўночнай. Культурны слой у раскопе дастаткова моцна перамяшаны на глыбіню да 0,2–0,3 м, верагодна, у выніку неаднаразовага разворвання. Апрача таго, тэрыторыя вострава доўгі час (прынамсі, з другой паловы 1990-х гг.) прыцягвала пільную ўвагу аматараў металапошуку. Слой утрымліваў таксама значную колькасць фрагментаў будаўнічага смецця – пераважна дробных кавалкаў цэглы, вапны і камянёў.

**Шурф I** быў прырэзаны да Раскопу I з усходу. Шурф меў прамавугольную форму памерам 5×2 м і быў выцягнуты па лініі захад – усход. На плошчы шурфа назіраўся значны перапад вышыняў – 0,4–0,5 м па лініі захад – усход.

У шурфе быў выяўлены падмурак шырынёй каля 1 м (мал. 9), арыентаваны па лініі поўнач – поўдзень з невялікім адхіленнем да захаду. Падмурак складаўся з камянёў памерам ад 0,1 да 0,35 м і кавалкаў буйнафарматнай цэглы, укладзеных на вапнавай рошчыне.

У квадратах 4 і 6 у мацерыку была выяўлена **Яма 1**, якая мела блізкія да прамавугольных абрысы і была выцягнута па лініі паўднёвы захад – паўночны ўсход. На ўзроўні мацерыка Яма 1 мела дастаткова няроўныя контуры, яе шырыня дасягала ад 0,21 да 0,34 м, даўжыня ў межах шурфа – 1 м. У працэсе выбаркі Ямы 1 выявілася, што яна з'яўляецца грунтавой магілай. Глыбіня ямы ад узроўню мацерыка дасягала 0,6 м. На дне магільнай ямы было выяўлена пахаванне па абрадзе інгумацыі, арыен-




Мал. 6. Сумяшчэнне паветранага здымку вострава Манастыр з планам яго цэнтральнай часткі ў гарызанталях. *Малюнак М. А. Плавінскага.*




Мал. 8. Археалагічныя даследаванні на востраве Манастыр у 2019 г. (далей – Манастыр 2019). Схема ўзаемаразмяшчэння Раскопу I і Шурфоў I–III. *М. А. Плавінскі.*



Мал. 7. 3D-мадэль дзённай паверхні цэнтральнай часткі вострава Манастыр (гарызанталі праведзены праз 0,2 м). *Малюнак В. А. Макоўскай.*



Мал. 9. Манастыр 2019. 3D-мадэль падмуркаў у Шурфах I і III. *Малюнак В. А. Макоўскай.*

таванае галавой на паўднёвы захад. Магільная яма ўвайшла ў межы Шурфа I часткова, таму ў сезоне 2019 г. была даследавана прыкладна напалову. Левая рука нябожчыка была сагнута ў локці і пакладзена на жывот. На ўзроўні дна магільная яма мела шырыню ад 0,48 м (у нагах) да 0,75 м (у раёне таза). З паўночна-заходняга, паўночна-ўсходняга і паўднёва-ўсходняга бакоў ад ног пахаванага ўздоўж бакоў магільнай ямы былі выяўлены праслойкі тлену шэрага колеру таўшчынёй 0,02–0,03 м – рэшткамі труны. Шырыня труны ў раёне ног складала каля 0,4–0,55 м. Труна, верагодна, была зроблена з дошак, змацаваных пры дапамозе каваных цвікоў. У выбарцы магільнай ямы выяўлены шэраг фрагментаў кругавога посуду, сярод якіх варта адзначыць фрагмент зялёнапаліванага (мураўлёнага) кубка (?), які можа быць аднесены да XVII ст., што дазваляе датаваць час здзяйснення пахавання.

Варта адзначыць, што падмурак амаль перакрываў (але не пераразаў) магільную яму, а развал будаўнічых матэрыялаў падмурка сфарміраваўся праз пэўны час пасля здзяйснення пахавання, бо над магільнай ямай спачатку сфарміраваўся культурны слой, які пасля быў перакрыты восыпам камянёў, бітай цэглы і вапнавай рошчыны ад падмурка.

Ва ўсходняй частцы Шурфа I (квадраты 7–8, 9–10) культурныя напластаванні былі даследаваны на глыбіню да 0,3 м і складаліся пераважна з будаўнічага смецця – бітай цэглы і шматлікіх фрагментаў вапнавай рошчыны. У паўночна-ўсходнім куце шурфа, у квадраце 9, на глыбіні 0,12–0,14 м ад узроўню сучаснай дзённай паверхні была выяўлена выкладка з буйнафарматнай цэглы чырвонага колеру шырынёй каля 0,18 м.

З мэтай больш дэталёвага вывучэння выяўленых падмуркаў з усходу да Шурфа I быў прырэзаны **Шурф III**, які меў прамавугольную форму памерам 5×2 м і быў выцягнуты па лініі захад – усход. На плошчы шурфа назіраўся значны перапад вышыняў – 0,18–0,27 м па лініі захад – усход.

У Шурфе III быў выяўлены падмурак шырынёй 0,6–0,8 м, арыентаваны па лініі поўнач – поўдзень з невялікім адхіленнем да захаду, які складаўся з камянёў памерам ад 0,1 да 0,65 м і кавалкаў буйнафарматнай цэглы, укладзеных на вапнавай рошчыне. У паўночна-заходняй частцы шурфа, на глыбіні 0,12–0,2 м ад узроўню сучаснай дзённай паверхні быў расчышчаны працяг выкладкі з буйнафарматнай цэглы чырвонага колеру шырынёй каля 0,18 м, заходняя частка якой была выяўлена ў Шурфе I.

Відавочна, што ў Шурфах I і III былі выяўлены падмуркі аднаго з крылаў манастыра, апісанага ў 1819 г. Ц. Каменскім. Шырыня памяшкання, падмуркі якога былі даследаваны ў 2019 г., складала 3 м, а выкладка з буйнафарматнай цэглы, верагодна, з’яўляецца рэшткамі падлогі.

**Шурф II** быў прырэзаны да Раскопу I з захаду. Ён меў прамавугольную форму памерам 4×2 м і быў выцягнуты па лініі захад – усход. У заходняй частцы шурфа была выяўлена выкладка з буйных камянёў

памерам да 0,3–0,35 м, арыентаваная па лініі поўнач – поўдзень. Камяні ўкладзены ў два шэрагі, адлегласць паміж якімі складала каля 0,4–0,5 м. Плошча паміж вялікімі камянямі была забутавана дробнымі камянямі памерам да 0,1–0,15 см, а ў заходняй частцы выкладкі выяўлена праслойка глінянай абмазкі. Магчыма меркаваць, што дадзены падмурак маркіруе месца размяшчэння нейкай гаспадарчай пабудовы.

У працэсе раскопак 2019 г. была сабрана прадстаўнічая калекцыя індывідуальных і масавых знаходак. Ніжэй будзе засяроджана ўвага толькі на тых матэрыялах, якія маюць найбольшую каштоўнасць для вызначэння храналогіі культурных напластаванняў на востраве Манастыр.

Пачатак чалавечай жыццядзейнасці на востраве можа быць аднесены да эпохі неаліту – бронзавага веку, аб чым сведчаць знаходкі апрацаванага крэменю, у тым ліку адшчэпаў і медыяльнай часткі пласціны[7].

Наступны этап гаспадарчай актыўнасці фіксуецца ў сярэдзіне – другой палове I тыс. н. э. Ён засведчаны невялікай серыяй фрагментаў ляпной керамікі гладкасценнага посуду, які быў выраблены з цеста з дамешкам некаліброванай жарствы.

Пэўная гаспадарчая дзейнасць на востраве магла адбывацца і ў старажытнарускі час, пра што сведчыць выяўленне фрагмента венца кругавой пасудзіны з S-падобным профілем і акруглым краем, які можа быць аднесены да полацкай керамікі тыпу IIIA паводле Георгія Штыхава. Такая кераміка з’яўляецца ў культурным слоі Верхняга замка ў Полацку ўжо ў XI ст. і колькасна пераважае над іншымі тыпамі на працягу XII – першай паловы XIII ст. [21, с. 81–82].

Аднак на працягу ўсіх пералічаных перыядаў гаспадарчае засваенне вострава насіла абмежаваны характар і не прывяло да фарміравання колькі-небудзь магутнага культурнага слою. У сваю чаргу, актыўная жыццядзейнасць на востраве пачынаецца толькі з часу заснавання тут праваслаўнага манастыра.

Сярод індывідуальных знаходак варта асобна адзначыць прадстаўнічую нумізматычную калекцыю, якая складаецца з 64 манет канца XV – першай трэці XIX ст. (мал. 10). Найбольш раннія манеты належаць да перыяду панавання Аляксандра Ягелончыка (1492–1506), што добра суадносіцца з першай згадкай манастыра ў пісьмовых крыніцах. Найбольш позняя манета – 10 грошаў 1827 г. Каралеўства Польскага – маркіруе фінал актыўнай гаспадарчай дзейнасці на востраве, які супадае з часам гібелі манастыра ў пажары[8].

---

[7] Вызначэнне крамянёвых артэфактаў з раскопак на востраве Манастыр ажыццявіў навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі **Аляксандр Гаршкоў**.
[8] Апрацоўку нумізматычнай калекцыі ажыццявіў магістр гістарычных навук **Аляксей Краснагір**.



Мал. 10. Манастыр 2019. Манеты: 1 – дэнарый, Вялікае Княства Літоўскае, білон, 1492–1506 гг.; 2 – паўгрош, Каралеўства Польскае, білон, 1501–1506 гг.; 3 – двудынарый, Вялікае Княства Літоўскае, білон, 1570 г.; 4 – двудэнарый, Вялікае Княства Літоўскае, білон, 1620 г.; 5 – тэрнер (падвойны пені), Шатландыя, медзь, 1632/33 г.; 6 – солід, Вялікае Княства Літоўскае, медзь, 1666 г.; 7 – солід, горад Рыга пад шведскай акупацыяй, білон, 1656 г.; 8 – 20 капеек, Расійская імперыя, срэбра, 1771 г.; 9 – 5 грошаў, Герцагства Варшаўскае, білон, 1812 г.; 10 – 5 грошаў, Царства Польскае, білон, 1821 г. (1–2, 4, 6–7 – Шурф II; 3, 8–10 – Шурф I; 5 – Шурф III).
*Фота М. А. Плавінскага, 2020 г.*




Мал. 11. Манастыр 2019. Дэталі вопраткі, прадметы побыту і прылады працы: 1 – гузік, шкло; 2 – гузік, жалеза; 3–7 – пяцелькі для зашпільвання вопраткі (3–4, 7 – жалеза, 5–6 – каляровы метал); 8–9 – нашыўкі, каляровы метал;

Храналагічна, зыходзячы з частотнасці знаходак, усе манеты магчыма падзяліць на тры групы:

1) канец XV – канец 1570-х гг. (мал. 10: 1–3);
2) 1600-я – канец 1660-х гг. (мал. 10: 4–7);
3) 1710-я – канец 1820-х гг. (мал. 10: 8–10).

У калекцыі пераважаюць манеты рэгіянальнай чаканкі, выпушчаныя манетнымі дварамі Вялікага Княства Літоўскага (30 адзінак) і Польшчы (17 адзінак), а таксама тэрыторый, якія знаходзіліся з імі ў шчыльнай палітычнай і эканамічнай сувязі (Рыга, Мітава, Каралявец – 9 адзінак). Улічваючы вядомы «інтэрнацыяналізм» манетнага абарачэння ў разглядаемы перыяд, не з'яўляецца выпадковай таксама наяўнасць некаторай колькасці іншаземнай манеты (капейкі, адчаканеныя ў Вялікім Ноўгарадзе, Маскве і Санкт-Пецярбургу, тэрнер з Эдынбурга – усяго 4 адзінкі).

Выяўленыя манеты з'яўляліся найбольш тыповымі прадстаўнікамі грашовага абарачэння свайго часу і прызначаліся ў першую чаргу для паўсядзённых разлікаў. У цэлым, гэта можа адначасова сведчыць як аб інтэнсіўных таварна-грашовых адносінах, так і аб невысокім узроўні эканамічнага развіцця манастыра.

Апрача манет, да ліку індывідуальных знаходак належаць дэталі вопраткі (гузікі, зашпількі, нашыўкі, спражка) і ўпрыгажэнні (пярсцёнак), прадметы побыту (фрагмент люлькі, ключ, фрагмент рагавога двухбаковага грабенчыка, шыла, лязо нажа, тыльная накладка на тронкі нажа, фрагмент бронзавага ланцужка), прылады працы (рыбалоўныя кручкі) (мал. 11). Цікавай знаходкай, звязанай з рэлігійным жыццём манастыра, з'яўляецца каменная пацерка шаснаццаціграннай формы, верагодна, ад ружанца (мал. 11: 10).

Як ужо было адзначана, у Шурфе I выяўлена пахаванне, датаванне якога можа быць вызначана ў межах XVII ст. Апрача таго, у працэсе даследаванняў 2019 г. у Раскопе I і Шурфах I–III было выяўлена ў пераадкладзеным выглядзе 11 асобных костак чалавека. На падставе праведзенага антрапалагічнага аналізу вызначана, што гэтыя косткі

➲ 10 – пацерка ад ружанцу, камень; 11 – спражка, жалеза; 12 – пярсцёнак, каляровы метал; 13 – ланцужок, каляровы метал; 14 – фрагмент кубачка ад люлькі, гліна; 15 – фрагмент ключа, жалеза; 16 – шыла, жалеза; 17 – фрагмент грабеньчыка, рог; 18 – фрагмент ляза нажа, жалеза; 19 – тыльная накладка на рукаяць нажа, каляровы метал; 20–21 – рыбалоўныя кручкі (20 – каляровы метал, 21 – жалеза); 22 – прадмет з вінтавой нарэзкай, жалеза; 23 – фігурная накладка, каляровы метал; 24 – фрагмент кованага фігурнага вырабу, жалеза (1–5, 7, 12, 14, 20–21 – Раскоп I; 6, 11, 15–19, 24 – Шурф II; 8–10 – Шурф I; 13, 22–23 – Шурф III).
*Малюнкі і фота М. А. Плавінскага, 2020 г.*

належаць некалькім індывідам (ад трох да адзінаццаці)[9]. Выяўленне непатурбаванага пахавання і цэлага шэрагу перааdкладзеных чалавечых парэшткаў дазваляе меркаваць, што на даследаваным участку вострава Манастыр у XVII ст. функцыянаваў некропаль, у якім маглі хаваць мясцовых манахаў.

Сярод масавых знаходак магчыма вылучыць наступныя асноўныя катэгорыі: кераміка, шкляныя вырабы, будаўнічыя матэрыялы, астэалагічныя і іхтыялагічныя матэрыялы (косткі і луска рыб).

Пры характарыстыцы асартыменту керамічнага і шклянога посуду, звязанага з функцыянаваннем на востраве манастыра, магчыма адзначыць наяўнасць сярод посуду серыі фрагментаў з празрыстага зеленаватага шкла, якія мелі раскрытыя, адагнутыя вонкі венцы дыяметрам 10–12 см (мал. 12). Падобныя пасудзіны найбольш надзейна інтэрпрэтуюцца ў якасці лампадак. Варта адзначыць, што экзэмпляры з манастыра знаходзяць вельмі блізкія аналогіі сярод лампадак другой паловы XVIII ст. з бібліятэкі Полацкага езуіцкага калегіума [19, с. 133, рис. 4].




Мал. 12. Манастыр 2019. Фрагменты шкляных лампадак (усе – Шурф I). *Малюнкі М. А. Плавінскага, 2020 г.*

Выяўленыя будаўнічыя матэрыялы могуць быць падзелены на дзве групы. Будаўнічыя матэрыялы першай групы належаць да манастырскіх будынкаў, апісанне якіх было зроблена ў 1819 г., незадоўга да таго, як манастыр згарэў. Да гэтай групы належаць шматлікія жалезныя каваныя цвікі, пакрытыя акалінай (1085 адзінак), кавалкі жалезнай бляхі ад даху са слядамі знаходжання ў агні, фрагменты аконнага шкла, частка з якіх аплаўлена, і свінцовыя аканіцы. Да гэтай жа групы належаць пліткі ад падлогі, якія былі пакрыты палівай шэрага і цёмна-карычневага (амаль чорнага) колеру, частка з якіх нясе на сабе сляды другаснага абпалу (мал. 13: 1–3). Да другой групы будаўнічых матэрыялаў адносяцца нешматлікія дробныя фрагменты кафлі. У працэсе раскопак

[9] Антрапалагічнае вызначэнне парэшткаў чалавека з раскопак на востраве Манастыр ажыццявіла студэнтка Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага інстытута імя А. Д. Сахарава Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта **Валянціна Віннікава**.

2019 г. кафлі было знойдзена надзвычай мала. Сярод наяўных знаходак маюцца фрагменты вонкавых пласцін тэракотавай і зялёнапаліванай кафлі (мал. 13: 4–12) і фрагменты румпы.

Цікавасць мае выяўлены ў Шурфе ІІІ фрагмент гаршковай кафлі з квадрыфольным вусцем (мал. 13: 13), які сведчыць аб магчымасці існавання на востраве кафляных печаў ужо ў XVI ст. (лічыцца, што выраб гаршковай кафлі з квадрыфольным вусцем на тэрыторыі Беларусі працягваўся з другой паловы XIV да пачатку XVI ст., хаця ў наборах кафлі некаторых печаў яны маглі выкарыстоўвацца яшчэ на працягу некалькіх наступных дзесяцігоддзяў [8, с. 321–322].

У тым жа Шурфе ІІІ быў выяўлены таксама фрагмент цэглы-пальчаткі (мал. 13: 14). Нягледзячы на сваю адзінкавасць, ён мае вялікую цікавасць, бо дазваляе меркаваць аб пэўнай будаўнічай актыўнасці з выкарыстаннем цэглы на востраве Манастыр да ўзвядзення будынка манастыра, апісанага ў 1819 г.

## Высновы

Адметнай асаблівасцю рэканструкцыі гісторыі Браслаўскага Прачысценскага манастыра з'яўляецца тое, што ў распараджэнні даследчыкаў маецца значная колькасць пісьмовых крыніц, а таксама прадстаўнічая нумізматычная калекцыя, сабраная ў працэсе раскопак 2019 г. Карэляцыя звестак з пісьмовых крыніц, археалагічных і нумізматычных даных дазваляе дастаткова падрабязна рэканструяваць асноўныя этапы гісторыі манастыра:

1) праваслаўны манастыр на востраве на возеры Неспіш узнікае ў XV ст., у 1501 г. манастыр ужо функцыянаваў, а прадстаўнічая серыя манет Аляксандра Ягелончыка сведчыць аб актыўнай гаспадарчай дзейнасці на востраве ў канцы XV – пачатку XVI ст.;

2) пасля заключэння Брэсцкай царкоўнай уніі ў 1596 г. манастыр вызнаў юрысдыкцыю ўніяцкай іерархіі і дзейнічаў, прынамсі, да 1630-х гг.;

3) з сярэдзіны XVII ст. (з часоў Трынаццацігадовай вайны) і да заканчэння Вялікай Паўночнай вайны (да 1720-х гг.) манастыр дэ-факта не дзейнічаў, а на працягу гэтага часу, пасля 1660-х гг., амаль не фіксуецца выпадзенне ў культурны слой помніка манетных знаходак, якое аднаўляецца толькі ў 1710-я гг., таму варта меркаваць, што менавіта ў той час, калі функцыянаванне манастыра прыпыняецца (ці згортваецца), на даследаваным у 2019 г. участку існаваў некропаль;

4) першыя дакладныя і падрабязныя дадзеныя аб дзейнасці Браслаўскага Прачысценскага манастыра ў XVIII ст. адносяцца да 1730-х гг., перыяд яго росквіту пачынаецца з сярэдзіны 1760-х гг., і паводле апісання 1819 г. на востраве меліся наступныя будынкі: царква са склюдаванага




Мал. 13. Манастыр 2019. Будаўнічыя матэрыялы: 1–3 – фрагменты плітак ад падлогі, 4–13 – фрагменты кафлі, 14 – фрагмент цэглы-пальчаткі; 1–3, 6, 8 – гліна, паліва, 4–5, 7, 9–14 – гліна (1–2, 9–11 – Шурф I; 3, 13–14 – Шурф III; 4–8 – Раскоп I; 12 – Шурф II). *Малюнкі і фота М. А. Плавінскага, 2020 г.*

дрэва на каменным падмурку, васьмівугольная двух’ярусная званіца са склюдаванага дрэва, аднапавярховы манастыр са склюдаванага дрэва (меў два крылы, у левым пражываў архімандрыт, у правым знаходзіліся манаскія келлі), кухарскі флігель са склюдаванага дрэва ў канцы правага крыла манастыра, вяндлярня са склюдаванага дрэва, лядоўня, стайня, гумно і хлявы;

5) на пачатку 1830-х гг. на востраве адбыўся пажар, які паклаў канец існаванню манастыра і які выразна прасочваецца паводле археалагічных даных; з канца 1820-х гг. спыняецца выпадзенне на востраве манетнага матэрыялу.

Відавочна, у працэсе раскопак 2019 г. былі выяўлены падмуркі аднаго з крылаў манастыра, што быў узведзены на месцы магілак, якія былі спляжаны ў працэсе разбудовы. Датаванне часу разбудовы манастыра на дадзеным этапе можа быць аднесена да сярэдзіны – другой паловы XVIII ст.

## Крыніцы і літаратура


1. Kazanie o Przenaydostoyniejszey Matce Boskiey Maryi Pannie na wszystkie iey uroczystości podług obrządku Kościoła Wschodniego przez xiędza Jana Hieronima Nereziusza, bazylianina, opata brasławskiego, miane. – Wilno : w drukarni bazylianów, 1774. – 358 s.
2. Kazanie w dzień Wniebowzięcia Nayswiętszey Maryi Panny przez xiędza Heronima Nereziusza, bazylianina, opata brasławskiego, w cerkwi swoiey opatskiey roku 1777 miane. – Wilno : w drukarni bazylianów, 1777. – 34 s.
3. Österreichische Nationalbibliothek. Nr. 3847. – Visitationes Monasteriorum Ordinis S. Basilii. 1736–1741. – 292 p.
4. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северозападной Руси, издаваемый при Управлении Виленского Учебного Округа. – Т. 12. – Вильна : Типография А. Г. Сыркина, 1900. – XLVII + 230 с.
5. Блакітны скарб Беларусі: рэкі, азёры, вадасховішчы, турысцкі патэнцыял водных аб’ектаў. – Мінск : БелЭн, 2007. – 480 с.: іл. 280, карт 239, схем 321.
6. Варонін, В. А. Браслаўскі Прачысценскі манастыр на востраве паводле прывілея Жыгімонта I 1540 года // Браслаўскія чытанні. Матэрыялы VI-й навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 150-й гадавіне з дня нараджэння браслаўскага лекара, грамадскага дзеяча С. Нарбута (1853–1926), 7–8 мая 2003 г. / рэд. рада: К. Шыдлоўскі [і інш.]. – Браслаў : [б/в], 2003. – С. 13–15.
7. Дучиц, Л. В. Отчет о полевых исследованиях в 1978 г. // Фонд археалагічнай навуковай дакументацыі Цэнтральнага навуковага архіва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – Спр. № 576.

8. Заяц, Ю. А. Кафля і кафляныя печы // Археалогія Беларусі. – Т. 4: Помнікі XIV–XVIII стст. – Мінск : Беларуская навука, 2001. – С. 319–348.
9. Лісейчыкаў, Д. В., Бобер, І. М. «Варуючы и милуючы малъжонку мою законную веньчалъную…»: жыццё і смерць мітрапаліта-«дваяжэнца» Анісіфара Дзевачкі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2018. – №. 5. – С. 11–23.
10. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 136 (Мінская духоўная праваслаўная кансісторыя). Воп. 1. Спр. 41257. – Генеральныя візіты базыльянскіх манастыроў Літоўскай правінцыі. 1819 г. – 310 арк.
11. НГАБ. – Ф. 1747 (Браслаўскі земскі суд). Воп. 1. Спр. 1. – Актавая кніга Браслаўскага земскага суда. 1603–1606 гг. – 314 арк.
12. НГАБ. – Ф. 1747. Воп. 1. Спр. 2. – Актавая кніга Браслаўскага земскага суда. 1610–1614 гг. – 324 арк.
13. НГАБ. – Ф. 1747. Воп. 1. Спр. 37. – Актавая кніга Браслаўскага земскага суда. 1606–1610 гг. – 324 арк.
14. НГАБ. – Ф. 1755. Воп. 1. Спр. 16. – Актавая кніга Гродзенскага земскага суда за 1599–1601 гг. – 1072 арк.
15. Плавінскі, М. А. Познесярэднявечныя селішчы Браслаўскага Паазер'я (па матэрыялах раскопак 2004–2005 гадоў) // Віцебскія старажытнасці: матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 150-годдзю з дня нараджэння У. Г. Краснянскага, Віцебск, 17–18 кастрычніка 2013 г. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2017. – С. 110–126.
16. Санкт-Петербургский институт истории Российской академии наук (далей – СПбИИ РАН). Архив. – Ф. 52 (Калекцыя П. Дабрахотава). – Оп. 1. – Д. 324 – Памяннік базыльянаў Літоўскай правінцыі ордэна. 1686–1723 гг. – 107 арк.
17. СПбИИ РАН. Архив. – Ф. 52. – Оп. 1. – Д. 328. – Генеральныя візіты манастыроў Літоўскай правінцыі базыльянскага ордэна. 1704–1705 гг. – 224 арк.
18. СПбИИ РАН. Архив. – Ф. 52. – Оп. 1. – Д. 377. – Метрыка ўступлення ў ордэн Святога Васіля Вялікага Кангрэгацыі Святой Тройцы правінцыі Літоўскай, Рускай і Валынскай. 1674–1697 гг. – 61 арк.
19. Соловьёв, А. А. Помещения библиотеки Полоцкого иезуитского коллегиума XVII – начала XIX вв. по археологическим и документальным данным (проблемы изучения и реконструкции) // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. – 2020. – № 1. – С. 129–136.
20. Струков, Д. М. Альбом рисунков. 1864–1867. – Минск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2011. – 308 с. : ил.
21. Штыхов, Г. В. Древний Полоцк (IX–XIII вв.). – Минск : Наука и техника, 1975. – 136 с.: ил.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 27.05.2021

*А. А. Скеп'ян*

## Гербавыя пячаткі князёў Алелькавічаў

У апошнія гады гісторыкі ў сваіх даследаваннях звяртаюць асабліваю ўвагу на сумежныя дысцыпліны, якія дазваляюць паглыбіць нашыя веды пра розныя бакі функцыянавання родавых традыцый, захавання памяці і надання легітымнасці дакументам. Адну з важнейшых роляў для вывучэння гэтай праблематыкі адыгрываюць генеалогія, геральдыка і сфрагістыка.

Апошняя даволі даўно вывучае княжацкія пячаткі часоў Вялікага Княства Літоўскага, пра што сведчаць працы ў польскай, украінскай і беларускай гістарыяграфіі [20; 35; 40; 41; 43, с. 29–44]. Пячаткі аналізуюцца і як самастойныя артэфакты ў межах сфрагістыкі, так і як сімвалы самасвядомасці іх уладальнікаў. У невялікім па памеры малюнку было неабходна размясціць толькі тыя сімвалы і выявы, якія найбольш яскрава характарызавалі ўласніка, яго род, дэманстравалі іх месца ў грамадстве і палітычныя амбіцыі.

Князі Алелькавічы былі адным з адгалінаванняў Гедымінавічаў, а менавіта той галіны Альгердавічаў, якая з самага пачатку прэтэндавала на вышэйшыя ўрады і нават на велікакняжацкі сталец у Вялікім Княстве Літоўскім. Свой радавод яны вялі ад Аляксандра (Алелькі) Уладзіміравіча (?–1454) – вялікага князя кіеўскага (1401/1411, 1440–1454), князя слуцкага і капыльскага (прыкладна 1398–1440) [27, s. 327, 337].

Практычна ўсе прадстаўнікі першых пакаленняў Альгердавічаў карысталіся ўласнымі знакамі-клейнамі, якія мелі аналагічны статус як і гербы, гэта значыць, былі адзнакай прыналежнасці да пэўнага роду ці асобы [43, с. 57]. Пры гэтым нярэдка яны прыўносілі ў свае асабістыя знакі адрозныя ад бацькоўскіх клейнаў элементы, хаця ўжо з сярэдзіны XIV ст. яны сталі паступова афармляцца як гербы, шляхам размяшчэння на гербавых тарчах (часцей за ўсё, так званага гатычнага тыпу), з рэдкім выкарыстаннем іншых гербавых элементаў – у першую чаргу без клейнота і кароны.

Гэтыя асаблівасці выразна прасочваюцца ў пячатках першых Алелькавічаў. Паводле дадзеных Алега Однарожанкі, вядома некалькі асабістых пячатак Алелькі (дыяметрам 27–32 мм) і пячатак яго сыноў [35, с. 132–133]. У адрозненне ад пячаткі князя Уладзіміра Альгердавіча, які карыстаўся гербам, вельмі блізкім да дынастычнага (вершнік на кані, які ў правай руцэ трымае дзіду, як пры кіданні [37, с. 240–241]), яго сыны Аляксандр, Іван і Андрэй сталі выкарыстоўваць уласныя клейны, якія значна адрозніваліся ад дзяржаўнага герба ці герба пануючай

дынастыі. Гэта было распаўсюджанай з'явай у XIV – пачатку XV ст. Вельмі рэдка хто з Альгердавічаў размяшчаў «Пагоню» на пячатках як уласны герб. Так, узгадаем, што асабістым гербам Ягайлы быў крыж, магчыма Андрэя Полацкага – пешы ваяр [25]. Не выбіваўся з гэтага шэрагу і Алелька Уладзіміравіч. Так, яго асабістым гербам стаў знак у выглядзе перакрыжаванай стралы, вастрыём уверх, якая стаіць на паўмесяцы, што ляжыць канцамі дагары.

Прадстаўнікі ўсіх пакаленняў Алелькавічаў яскрава ўсведамлялі сваю прыналежнасць да пануючай дынастыі, але на геральдычным ці сфрагістычным узроўні ніяк гэта не падкрэслівалі, апрача выкарыстання чырвонага воску, што ў той час стала прывілеем вялікіх князёў літоўскіх і іншых Гедымінавічаў. Ім жа карысталіся біскуп віленскі, а з пачатку XV ст. і іншыя каталіцкія біскупы ВКЛ. Фактычна прыналежнасць выяўленых сфрагістычных помнікаў роду Алелькавічаў вызначаецца дзякуючы кірылічным надпісам, што ішлі ў атоку пячатак. На пячатцы самога Алелькі бачны даволі разгорнуты надпіс «ПЕЧАТЬ КНѦЗѦ ОЛЕКСАNРА ВОЛОДІМІРОВІЧ» [35, с. 132].

Пра выкарыстанне менавіта гэтага знака як родавага герба Алелькавічаў могуць сведчыць не толькі самі ўласна пячаткі, але і манеты, якія чаканіліся ім [20, s. 697, табл. IX]. Яны ж суправаджалі Алелькавічаў у апошні шлях (так званыя аболы памерлых), як сведчаць раскопкі ў асабістай крыпце Алелькавічаў у нартэксе Успенскага сабора ў Кіева-Пячэрскай Лаўры. Аднак даследаванні нумізматаў сцвярджаюць, што першыя манеты, якія капіруюць дырхемы ардынскага хана Джанібека I, пачаў біць яшчэ Уладзімір Альгердавіч, а значыць, яго сыны і ўнукі проста маглі працягнуць традыцыю яго выкарыстання, зрабіўшы ардынскую тамгу сваім уласным клейнам [32, с. 78, 81]. Насамрэч гэты клейнавы знак быў мясцовага паходжання, на што ўказваюць выявы крыжа на ім [36, с. 377, 437–438].

Зыходзячы з гэтага, паўстаюць пытанні: калі асабістыя клейны былі заменены на «Пагоню» і чаму гэта адбылося? Ці карысталіся князі Алелькавічы адразу і ўласным гербам, і «Пагоняй»?

У XVI ст. пачынаецца паступовы адыход ад шматгербавасці ці выкарыстання адначасова асабістага і родавага (ці дынастычнага) герба. Па княжацкай сфрагістыцы ВКЛ XV ст. бачна, што часта асабістыя клейны не сягаюць далей за некалькі пакаленняў. Так, сыны Алелькі Сямён і Міхаіл яшчэ карысталіся знакам, атрыманым у спадчыну ад бацькі (пра што, верагодна, могуць сведчыць манеты, знойдзеныя ў Мсціславе і датаваныя некаторымі нумізматамі 1480–1490-мі гадамі [39, с. 15–16]), тады як ужо іх дзеці карысталіся выключна «Пагоняй». Такая ж самая тэндэнцыя, але характэрная для больш ранняга часу – сярэдзіны XV ст., назіраецца ў іншых галінах Гедымінавічаў. Так, нашчадкі пінскага князя

Аляксандра Юр’евіча Носа, князя Фёдара Любартавіча, Чартарыйскія змянілі знакі сваіх бацькоў на «Пагоню» [37, с. 243; 43, с. 75–76].

Аднак калі такая змена адбылася сярод Алелькавічаў?

Захаваліся згадкі пра пячаткі на чырвоным воску кіеўскага князя Сямёна Аляксандравіча, слуцкага князя Міхаіла Аляксандравіча (прыкладна 1420–1481) і пра супольныя акты яго жонкі княгіні Ганны і сына Сямёна, на якіх у розных варыяцыях выступае выява вершніка на кані, які ў правай руцэ трымае меч («Пагоня») [22; 30, с. 126].

У гістарыяграфіі пераважна аналізуюцца пячаткі, што належалі мужчынскім прадстаўнікам гэтых родаў, пакідаючы фактычна без увагі жаночыя пячаткі. Прычын для гэтага можа быць некалькі – як малая колькасць захаваных, у параўнанні з мужчынскімі, пячатак, так і дастаткова малая інфарматыўнасць саміх адбіткаў. Тое, што жанчыны карысталіся гербавымі выявамі нароўні з мужчынамі не выклікае сумнення і пацверджана знаходжаннем свінцовых пломбаў полацкіх княгінь і больш познімі артэфактамі [38]. Тым не менш, да пачатку XV ст. фактычна невядома ніводнай княжацкай, не гаворачы ўжо пра шляхецкую, жаночай пячаткі. Пра іх знаходзяцца згадкі ў дакументах Метрыкі ВКЛ, пазначэнні пра іх наяўнасць маюцца ў пазнейшых копіях (выявай круга з ініцыяламі L.S. (locus sigillum)). На большасці пергамінаў засталіся толькі сляды ад шнуроў (прарэзаныя адтуліны), рэшткі саміх шнуроў, на якія мацаваліся васковыя міскі, тады як самі пячаткі страчаны і пра іх змест ці знешні выгляд магчыма толькі здагадвацца.

Для жанчыны выкарыстанне пячаткі з’яўлялася сведчаннем яе грамадскага статусу. Звычайна незамужняя дзяўчына не мела пячаткі, магчыма таму, што амаль ніколі не магла самастойна зацвярджаць ніякіх актаў. Пра гэта выразна пісала ў сваім дакуменце ад 1 мая 1547 г. Яўгенія Іванаўна Гарнастай: *«как же есми яко панна будучи не мела на тот час своее печати»* [1, s. 80]. Аднак з моманту ўступлення ў валоданне маёмасцю нават у паненак з’яўляліся пячаткі (як, напрыклад, у сясцёр Доўгірд [28, с. 304]). Часцей за ўсё, на жаночым сыгнеце размяшчаўся яе ўласны (бацькоўскі) герб з ініцыяламі ўладальніцы. Рэдкай з’явай было размяшчэнне шлюбнага герба, які спалучаў у сабе гербавыя выявы мужа і жонкі [43, с. 187].

Аднак у дачыненні да Алелькавічаў адбылося так, што найбольш старажытнымі (з выяўленых на цяперашні час), апрача пячатак самога Алелькі, сталі менавіта жаночыя пячаткі. Гэта пячатка княгіні Ганны, прыкладзеная да пацвярджальнага ліста мядовай даніны і грашовай падаці на карысць замкавай царквы Св. Варвары ў Слуцку ад 21 снежня 1481/1482 г. Пячатка дыяметрам 31 мм захавалася дрэнна. Паставўлены на чырвоным воску адбітак амаль не чытаецца, па колу бачны рэшткі кірылічнага надпісу (а не лацінскага гатычнага шрыфту, як мяркуе Васіль

Варонін). Сама пячатка знаходзіцца ў чашцы з жоўтага воску [22; 30, с. 126].

Другая яе вядомая пячатка захавалася на ўкладным лісце Слуцкаму Свята-Троіцкаму манастыру ад 4 снежня 1487 г. [33, с. 196]. Круглая пячатка дыяметрам 31 мм адбіта на адразной квадратнай кустодзеі на чырвоным воску. На гатычнай тарчы змешчана выява вершніка. Сама пячатка часткова змазана. Па коле размешчаны кірылічны надпіс «ПЕЧАТЬ <…> » [33, с. 189]. Яе памеры, элементы герба і надпіс сведчаць, што матрыца ў гэтыя гады не мянялася. Паходжанне княгіні Ганны да цяперашняга часу не выяўлена, аднак, зыходзячы з аналізу аналагічных помнікаў, магчыма сцвярджаць, што яна таксама належала да княжацкага роду з дынастыі Гедымінавічаў, на што можа ўказваць і колер воску для пячаткі, і сама выява. Як правіла, жанчыны з роду Алелькавічаў карысталіся на працягу ўсяго жыцця сваімі родавымі гербамі, а не гербамі мужа, што пацвярджаюць ніжэйпрыведзеныя матэрыялы.



Мал. 1. Пячатка Аляксандры Сямёнаўны Алелькавіч Пінскай, 1512 г. [23]

Пячатка дачкі апошняга вялікага князя кіеўскага Аляксандры (Алены) Сямёнаўны, княгіні пінскай (†1518), захавалася значна лепш, чым яе цёткі (мал. 1). Аляксандра (Олька, Алена) Сямёнаўна была апошняй дачкой кіеўскага князя Сямёна Алелькавіча (да 1420–1470). Пасля яго смерці ўдава Марыя Янаўна, народжаная Гаштольд, (†1501), з дзецьмі пасля ліквідацыі Кіеўскага княства ў якасці кампенсацыі атрымалі Пінск з ваколіцамі [17, s. 9–11]. Да канца XV ст. у жывых засталася толькі дачка Аляксандра, якая і была выдадзена замуж за клецкага князя Фёдара Іванавіча Яраславіча Бароўскага (†1521) [27, s. 327–331]. Нягледзячы на вялікую колькасць выдадзеных князямі пінскімі дакументаў, пячатка княгіні захавалася толькі на адзіным з іх. Гэта ліст княгіні Аляксандры (Олькі) Сямёнаўны Алелькавіч з запісам на карысць царквы Нараджэння Прачыстай Багародзіцы ў Пінску новага дварца Крапотчычы з пашняй, бортным дрэвам, сенажацямі, млыном і парабкам на штодзённую малітву па сваю душу і душы бацькоў князя Сямёна і княгіні Марыі, напісаны ў Пінску 5 сакавіка 1518 г. Сам дакумент быў апублікаваны яшчэ ў XIX ст. [28, с. 13–14], тады як пячатка да цяперашняга часу не аналізавалася даследчыкамі. На круглай пячатцы дыяметрам 18 мм, якая адбіта ў васковай місцы натуральнага колеру на цёмным (не чырвоным!)

воску, выразна бачна выява вершніка, які ў правай руцэ трымае меч, у левай – шчыт з шасціканцовым крыжам («Пагоня») [23]. Па атоку пячаткі бачны кірылічны надпіс (на жаль, паколькі пячатка не расчышчана, чытаецца дрэнна) «…МЕ .. ФЕДОРОВА».

Як і на ранейшых пячатках, на ёй бачны пакладзены на тарчу герб і кірылічны надпіс па коле. Па-ранейшаму на ёй адсутнічаюць іншыя геральдычныя адзнакі, у першую чаргу княжацкая мітра. Магчыма, паколькі «Пагоня» ўжывалася выключна на пячатках прадстаўнікоў дынастыі Гедымінавічаў, яна сама па сабе была прыкметай прыналежнасці да правячай дынастыі і не патрабавала дадатковых указанняў на княжацкі тытул.

Незахаванасць арыгінальных дакументаў Алелькавічаў Слуцкіх першай паловы XVI ст. фактычна выключае магчымасць аналізу пячатак князёў Сямёна Міхайлавіча (1460–1505) і яго сына Юрыя Сямёнавіча (1492–1542). Адзіным выключэннем з'яўляецца малюнак герба з генеалагічнай праграмай князя Канстанціна (Васіля) Канстанцінавіча Астрожскага (герб бацькі Канстанціна Іванавіча і князёўны Аляксандры Сямёнаўны Алелькавіч Слуцкай, размешчаны Барталамеем Папроцкім у сваім творы ў 1584 г. і ў шэрагу выданняў астрожскай друкарні [36, с. 411]). Малюнак утрымлівае ўжо знаёмую па пячатцы Алелькі выяву перакрыжаванай стралы, вастрыём уверх, якая стаіць на паўмесяцы, што ляжыць канцамі дагары, як асабістага герба Алелькаўны і «Пагоні», як родавага [24, s. 206]. Аднак трэба памятаць, што дадзены малюнак убачыў свет ужо пасля смерці славутага гетмана і ў той час, калі князі Слуцкія актыўна змагаліся за наданне ім спадчыннага месца ў Сенаце Рэчы Паспалітай. Таму цалкам магчыма, што з'яўленне гэтага канструкту было адсылкай да родавай памяці, напамінам пра вялікае кіеўскае княжанне першых Алелькавічаў і пра іх права на трон, а таксама пра высакароднасць паходжання Канстанціна (Васіля) Астрожскага. У раздзеле, прысвечаным нашчадкам Гедыміна, Б. Папроцкі каля партрэтаў Уладзіміра Альгердавіча і Алелькі не паказвае ніякага ўласнага герба, у адрозненне ад іншых нашчадкаў Гедыміна [24, s. 1148–1152]. Тым больш, што, апрача вышэйзгаданага, у прысвечаным князям Алелькавічам Слуцкім панегірыку каралеўскі сакратар і аўтар знакамітай «Epitome Principum Lituaniae» Аўгустын Ратундус падкрэслівае, што большасць княскіх родаў у Літве і Русі вядзе сваё паходжанне ад Гедыміна і ўжывае герб Віценева роду – «Узброенага вершніка», – асабліва князі Слуцкія [31, с. 277].

Не да канца вывучаны лісты князя Юрыя Сямёнавіча да Альбрэхта Гогенцоллерна і магчыма менавіта сярод іх карэспандэнцыі за 1530-я гг. у ордэнскім архіве з Круляўца захаваліся пячаткі гэтага слуцкага князя.

Наўрад ці віленскі войт і каралеўскі сакратар, які меў доступ да дзяржаўных папер, не ведаў бы, што князі Алелькавічы яшчэ зусім нядаўна альбо ў адзін час з ім карысталіся зусім іншым гербам. Гэтае ж сцвярджэнне пацвярджае сфрагістычны матэрыял прадстаўнікоў апошніх пакаленняў князёў Алелькавічаў Слуцкіх, захаваны да цяперашняга часу. Характэрнай асаблівасцю ўсіх іх пячатак з'яўляецца знікненне кірылічных надпісаў ці літар на адбітках і замена іх лацінскімі. Пры гэтым большасць актаў па-ранейшаму падпісваецца ўласнаручна кірыліцай. Толькі апошняе пакаленне, нават калі і вызнавала праваслаўе, падпісвалася выключна па-польску. Такую карціну магчыма ўбачыць таксама ў прадстаўнікоў іншых праваслаўных родаў, якія пры актыўнай падтрымцы праваслаўя ва ўсіх астатніх сферах жыцця пераймалі заходнія традыцыі [34, с. 107–108; 40, с. 58, 68].



Мал. 2. Пячатка Сямёна II Юр'евіча Слуцкага, да 1558 г. [15, k. 15]

З выяўленых пячатак сыноў князя Юрыя Сямёнавіча Юрыя Юр'евіча (каля 1530–1579) і Сямёна Юр'евіча (каля 1534–1560) найбольш раннімі магчыма лічыць адбіткі, прыкладзеныя да недатаваных лістоў, дадзеных прапойскаму і чачэрскаму старасце Юрыю Зяновічу.

Наогул, усе вядомыя пячаткі князя Сямёна Юр'евіча Алелькавіча датуюцца другой паловай 1550-х гг. Характэрнай асаблівасцю іх матрыц пячатак з'яўляецца адсутнасць надпісаў, якія заменены ініцыяламі S D S, размешчанымі над тарчай. Можна меркаваць, што гэта менавіта асабістыя ініцыялы князя, якія магчыма прачытаць паводле аналогіі з ініцыяламі з пячаткі яго брата як S(imeon) D(ux) S(lucensis), а не S(igillum) D(ux) S(lucensis).

Найбольш ранняй трэба прызнаць вялікую дыяметрам 24 мм пячатку [15, s. 15] (мал. 2). На ёй на рэнесанснай тарчы размешчана выява вершніка на кані, які правай рукой уздымае меч, у левай трымае шчыт, пры гэтым конь пакрыты папонай з чатырма кутасамі, хвост каня ўзняты ўверх («Пагоня»). Над тарчай ініцыялы *S*D*S*. Па баках тарчы размешчаны пяціканцовыя зоркі.

Датаваць іх можна па ўскосных дадзеных. Гэта добра бачна на прыкладзе дакументаў, выдадзеных для ўрэгулявання маёмасных спрэчак братоў Алелькавічаў з Юрыем Зяновічам у адказ на яго скаргі на ваўкалацкага намесніка князёў Слуцкіх. Да лістоў, якія датаваны толькі днём




Мал. 3. Пячатка Сямёна II Юр'евіча Слуцкага, да 1558 г. [15, k. 9]

і месяцам выстаўлення дакумента (адпаведна 8 чэрвеня (дадзены ў Старым Сяле) і 7 верасня (дадзены ў Капылі)) і падпісаны аднолькава «Юри а Семен княжати Слуцкиє», прыкладзены дзве розныя пячаткі князя Сямёна, тады як яго старэйшага брата Юрыя яны засталіся нязменнымі. Увесну 1557 г. пачаўся падзел маёмасці паміж братамі і сястрой, які канчаткова быў зацверджаны ў снежні 1557 г. Паводле яго вынікаў Ваўкалата адышла да князя Юрыя Юр'евіча і Соф'і Юр'еўны (у пасаг), а значыць, князь Сямён ужо не мог быць удзельнікам судовых спрэчак [21, p. 101].

На другой круглай пячатцы дыяметрам 17 мм з ліста ад 7 верасня бачная на рэнесанснай тарчы выява вершніка на кані, які правай рукой уздымае меч, а левай трымае шчыт («Пагоня»). Ніжні канец картуша завостраны і прымыкае да вобада пячаткі. Па баках тарчы размешчана выява крыжа (птушкі?) (мал. 3) [15, s. 9].

Улетку 1556 г. пячатка князем Сямёнам была зменена. Пра прычыну замены матрыцы магчыма выказаць наступнае меркаванне. У жніўні 1556 г. кн. Сямён Юр'евіч Слуцкі паведаміў пра страту пячаткі, якой ён *«свае лісты пячатаваў»* і паклаў адпаведны ліст у кнігі Метрыкі ВКЛ [21, p. 54]. Такім чынам, і названыя вышэй дакументы магчыма датаваць 1556 г., а подпіс князя на вераснёўскім лісце быў зацверджаны ўжо новай пячаткай.

Такім чынам, магчыма сцвярджаць, што першай пячаткай князь Сямён Юр'евіч карыстаўся з 1553 па жнівень 1556 г. – з моманту, калі ён выйшаў з-пад апекі старэйшага брата, і да страты пячаткі ў Цімкавічах, а другой – са жніўня 1557 па 1560 г.

У дадатак да сярэдняй гербавай пячаткі ў гэты ж прамежак часу малодшы з князёў Слуцкіх карыстаўся яшчэ і малой (дыяметрам 16 мм) пячаткай, вядомай па кампрамісным лісце братоў Слуцкіх з князем Лукашам Баляслававічам Свірскім ад 15 чэрвеня 1558 г. аб размежаванні маёнткаў Візны, Усава і Прусы. Яна вылучаецца спрошчанай прамалёўкай выявы вершніка, хаця вакол тарчы праглядаюцца элементы фігурнага намёту [7] (мал. 4).

Ранняя пячатка князя Юрыя Юр'евіча (якая фіксуецца да студзеня 1556 г.) не вылучаецца вялікімі памерамі – яе дыяметр складае 14 мм.

На рэнесанснай тарчы размешчана выява вершніка на кані, які правай рукой уздымае меч, у левай трымае шчыт, хвост каня ўзняты ўверх («Пагоня»), ніжні завостраны канец тарчы заступае на рант (мал. 5). Дарэчы, такая форма тарчы стане традыцыйнай для пазнейшых пячатак гэтага князя. Па баках тарчы знаходзяцца выявы роўнаканцовых крыжоў (+). Звяртаюць на сябе ўвагу размешчаныя над шчытом ініцыялы «IV(ri) D(ux) S(lucensis)» [15, s. 12]. Пры гэтым бачна, што тут яшчэ не выкарыстоўваецца лацінская версія яго імя (Georgius), а перададзена лацінскімі літарамі ўласцівая для Усходняй Еўропы форма Юрый. Цікава, як яна перадавалася ва ўспрыманні самога князя. Так, у сваіх лістах лацінскімі літарамі ён падпісваўся як «Jurgi Slucki» «Jury kx Slucky» [5, s. 1; 18]. Цалкам магчыма, што і расшыфроўваць ініцыялы трэба менавіта ў такой форме.

Адначасова з малой ён карыстаўся сярэдняй круглай пячаткай дыяметрам 22 мм, што фіксуецца ўжо на дакументах 1556 г. Яна адрозніваецца ад апісанай вышэй і ініцыяламі, і стылем выканання матрыцы. Пячатка добра вядомая як па захаваных дакументах [5, s. 2; 15, s. 9, 15, 37; 18], так і ў літаратуры [35, c. 139, 285] (хаця ў апошнім выпадку магчыма адзначыць не зусім дакладную передачу выявы). На рэнесанснай тарчы размешчана выява вершніка, які правай рукой уздымае меч, у левай трымае шчыт з шасціканцовым крыжам, хвост каня пры гэтым ужо апушчаны ўніз («Паго-



Мал. 4. Пячатка Сямёна II Юр'евіча Слуцкага, 1558 г. [9]



Мал. 5. Пячатка Юрыя II Юр'евіча Слуцкага, да 1558 г. [15, k. 12]



Мал. 6. Пячатка Юрыя II Юр'евіча Слуцкага, 1558 г. [15, k. 15]



Мал. 7. Пячатка Юрыя II Юр'евіча Слуцкага, 1575–1578 гг. [19, k. 65]

ня»). Па баках тарчы кветкавыя гірлянды. Над тарчай знаходзяцца ініцыялы «S(igillum) •G(eorgii) •D(uci) •S(lucensis)» (мал. 6).

Заключэнне Люблінскай уніі, пазбаўленне князёў Алелькавічаў спадчыннага сенатарскага месца ў наваствоpанай Рэчы Паспалітай, прэтэнзіі (даволі эфемерныя) князёў Слуцкіх на трон знайшлі свой адбітак і ў сфрагістыцы. Асабліва яскрава гэта бачна на прыкладзе вялікай (дыяметрам 32 мм) пячаткі, прыкладзенай да тастамента князя Юрыя Юр'евіча [12, s. 65; 19, s. 78; 39] (мал. 7). Менавіта ёю ён зацвярджаў свае дакументы не пазней як з 1575 г. Якасць мастацкага і тэхнічнага выканання пячаткі значна вышэйшая за ранейшыя. Сам герб мяняецца нязначна: на рэнесанснай тарчы змешчана выява вершніка, які правай рукой уздымае меч, у левай трымае шчыт з шасціканцовым крыжам, хвост каня ўзняты ўверх («Пагоня»). Змены выразна бачныя ў форме картуша, ніжні, завостраны канец якога заходзіць на легенду, а сам змешчаны ва ўнутранае кола. На ёй упершыню ў геральдыцы і сфрагістыцы князёў Алелькавічаў з'яўляецца такі геральдычны элемент як княжацкая мітра. Лацінскі надпіс «[GE] ORGIVS DEI GRATIA DVX SLVCENSIS EC.» размешчаны па атоку пячаткі на стужцы, якая разрываецца ўверсе мітраю. На думку Аляксея Шаланды, за ўзор была ўзята малая пячатка вялікага князя літоўскага і караля польскага Жыгімонта II Аўгуста [40, с. 125].

Пасля смерці князя Юрыя Юр'евіча з цені выйшла яго ўдава Кацярына (каля 1544–1592) – дачка кракаўскага ваяводы Габрыэля Тэнчынскага, з 1558 г. жонка князя Юрыя Юр'евіча Слуцкага [18], з 1582 г. у другім шлюбе з Крыштафам Радзівілам Перуном. Яе пячатак дайшло да нас нават болей, чым адбіткаў, якія завяралі лісты яе мужа.

Паводле тастамента мужа менавіта ёй было перададзена кіраванне ўсёй маёмасцю князёў Слуцкіх да перадачы яе ў рукі сыноў. Менавіта на час яе ўдаўства (1579–1582 гг.) прыпадае асноўная колькасць вядомых пячатак. Пры гэтым адначасова яна карысталася адразу пяццю пячаткамі рознай формы, якія адрозніваліся не толькі памерамі і формай, але і парадкам размяшчэння выяў на чатырохчасткавым картушы. Найбольш ранняй трэба прызнаць авальную пячатку, якой запячатваліся даніны і фундушы ў 1579–1582 гг. [8, s. 30; 40, с. 84, № 174]. На жаль, час выстаўлення аўтографаў, а значыць, і з'яўлення матрыц вызначыць магчыма не

заўжды, бо для асабістай перапіскі ўдовай княгіні Слуцкай было характэрна неахайнае пазначэнне даты і месца напісання ліста. У лепшым выпадку адзначаўся дзень і месяц, тады як год не ставіўся амаль ніколі, і вылічыць яго можна толькі на падставе звестак, прыведзеных у самім тэксце.



Мал. 8. Пячатка Соф'і, народжанай Мялецкай, княгіні Слуцкай, 1592 г. [7, k. 8]

Для запячатвання асабістых лістоў княгіня Слуцкая карысталася адразу трыма сыгнетамі авальнай формы. Кожны з іх мае сваё выразнае мастацкае вырашэнне тарчы, на якой размешчаны герб Тэнчынскіх. Прыналежнасць пячаткі княгіні Слуцкай магчыма вызначыць толькі дзякуючы ініцыялам, размешчаным над ці па баках картуша. Цікава, што, будучы княгіняй Слуцкай, Кацярына не карысталася чырвоным воскам, як яе муж і сыны, а запячатвала свае лісты бацькоўскім гербам на чорным воску (як і Аляксандра Алелькавіч Пінская, потым і жонка Яна Сімяона Соф'я з Мелецкіх [7] (мал. 8)). Дарэчы, апошняя была адзінай прадстаўніцай роду, якая карысталася падвоенай гербавай выявай – адначасова гербам бацькі і маці). Пайшоўшы замуж другі раз, як княгіня Радзівіл яна перайшла на выкарыстанне чырвонага воску для сваіх пячатак.



Мал. 9. Пячатка Кацярыны, народжанай Тэнчынскай, княгіні Слуцкай, 1580–1582 гг. [6, k. 55]

На першай (мал. 9) авальнай пячатцы памерам 15×17 мм бачны картуш, падзелены на чатыры часткі, дзе ў 1-ай і 4-яй размешчана выява двухгаловага арла, у 2-ой і 3-ай – выява сякеры, павернутай лязом улева (родавы «Тапор»). Над тарчай ініцыялы «K(atherina) T(enczinska) D(ei) G(ratia)» па баках тарчы ініцыялы «D(ucissa) S(lucensis)» [6, s. 55]. На другой сыгнетавай пячатцы такога ж памеру і формы, якая датуецца жніўнем 1581 г., бачны практычна ідэнтычны па тэхніцы выканання картуш. Адзіным адрозненнем стала размяшчэнне ўсіх ініцыялаў над тарчай «K(atherina) T(enczinska) D(ei) G(ratia) D(ucissa) S(lucensis)» [13, s. 37].



Мал. 10. Пячатка Кацярыны, народжанай Тэнчынскай, княгіні Слуцкай, 1582 г. [6, k. 45]



Мал. 11. Пячатка Кацярыны, народжанай Тэнчынскай, княгіні Слуцкай, 1582 г. [8, k. 30]



Мал. 12. Пячатка Кацярыны, народжанай Тэнчынскай, княгіні Слуцкай, 1581–1582 гг. [6, k. 30]

На пячатцы 1582 г. бачна люстэркавае размяшчэнне гербаў: картуш падзелены на чатыры часткі, дзе ў 1-ай і 4-яй – выява сякеры, павернутай лязом улева (родавы «Тапор»), у 2-ой і 3-ай – выява двухгаловага арла. Над тарчай з княжацкай мітрай (?) размешчаны часткова зацертыя ініцыялы « . D(ucissa) S(lucensis)». Сама пячатка мае васьмікутную форму 14×16 мм [6, s. 45]. Якасць выканання матрыцы ў параўнанні з папярэдняй пячаткаю больш нізкая (мал. 10).

Да сыгнетавых пячатак магчыма аднесці і яшчэ адну з пячатак Кацярыны Тэнчынскай, якая сустракаецца на яе асабістых лістах 1581–1582 гг. Яна мае няправільную васьмікутную форму, крыху звужаную ўнізе пры памеры ў 13(12)×18 мм. Картуш на ёй таксама падзелены на чатыры часткі, дзе ў 1-ай і 4-яй – выява двухгаловага арла, у 2-ой і 3-ай – выява сякеры, павернутай лязом улева (родавы «Тапор»). Над тарчай ініцыялы «KAT(herina) D(ucissa) S(lucensis)» (мал. 12) [6, s. 30].

Толькі адна з пячатак удовай княгіні Слуцкай раней трапіла ў поле ўвагі спецыялістаў [40, с. 86]. Гэта вялікая авальная пячатка (20×22 мм) са значна большай колькасцю элементаў аздаблення, якая выкарыстоўвалася для запячатвання актавых дакументаў не пазней за 1579 і да 1582 г. Картуш ужо традыцыйна падзелены на чатыры часткі, дзе ў 1-ай і 4-яй – выява двухгаловага арла, у 2-ой і 3-ай – выява сякеры, павернутай лязом улева (родавы

«Тапор»). Перавіты касіцамі рант унізе і ўверсе спалучаецца бантам (у Анатоля Цітова паказаны толькі верхні рант). Над ініцыяламі праглядаюцца элементы раслiннага арнаменту. Над тарчай, як і на адной з сыгнетавых пячатак, размешчаны ініцыялы «K(atherina) T(enczinska) D(ei) G(ratia) D(ucissa) S(lucensis)», па баках тарчы – выявы пяціканцовых зорак [16, s. 11] (мал. 11).

Пячаткі наступнага пакалення князёў Слуцкіх, апошніх мужчынскіх прадстаўнікоў гэтага роду, вылучаліся зусім іншай стылістыкай і напаўненнем поля пячаткі. Большая частка іх прадстаўлена ў літаратуры па геральдыцы і сфрагістыцы [35, с. 285–286; 40, с. 86–87], таму няма патрэбы падрабязна спыняцца на іх характарыстыках. Варта толькі дапоўніць інфармацыю, якая адсутнічае ў гістарыяграфіі, і разгледзець падрабязней тыя пячаткі, што ўпершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак.

Уласнымі пячаткамі апошнія князі Слуцкія сталі карыстацца амаль адразу пасля смерці бацькі, нягледзячы на тое, што малодшы з іх яшчэ не дасягнуў паўналецця. Разам з маці браты выдалі 15 мая 1579 г. ліст на карысць слуцкага касцёла, да якога і прыклалі свае пячаткі, выкананыя паводле аднаго шаблону. Круглыя (дыяметрам 22 мм) з рантам-касіцай па коле, перахопленым сіметрычна чатырма бантамі па баках, уверсе і ўнізе яны ўтрымлівалі выяву вершніка на кані, які правай рукой уздымае меч, а левай трымае шчыт з шасціву-



Мал. 13. Пячатка Юрыя III Юр’евіча Слуцкага, 1579 г. [8, s. 30]



Мал. 14. Пячатка Яна Сімяона Слуцкага, 1579 г. [8, s. 30]



Мал. 15. Пячатка Аляксандра Слуцкага, 1579 г. [8, s. 30]



Мал. 16. Пячатка Юрыя III Юр'евіча Слуцкага, 1582 г. [2, k. 2]



Мал. 17. Пячатка Аляксандра Слуцкага, 1582 г. [2, k. 20]

гольным крыжам («Пагоня»). Ніжні канец картуша завостраны і прымыкае да вобада пячаткі. Па баках тарчы размешчаны выявы галіны з кветкамі. Адзіным адрозненнем паміж пячаткамі братоў сталі размешчаныя над тарчай ініцыялы. Адпаведна «GDGDS» – Юрыя, «SDGDS» – Сямёна, «ADGDS» – Аляксандра [8, s. 30] (мал. 13, 14, 15). Магчыма, гэтае падабенства вымусіла двух з князёў адмовіцца ў далейшым ад іх выкарыстання.

На дадзены момант выяўлена пяць пячатак старэйшага сына князя Юрыя Юр'евіча і Кацярыны Тэнчынскай Юрыя III (1559–1586) [3; 35, с. 286 № 490–492; 40, с. 86–87], якія паслядоўна змянялі адна адну на працягу 1582–1586 гг.

З іх невядомай да цяперашняга часу з'яўляецца авальная (у адрозненне ад іншых, якія маюць круглую форму) малая пячатка сыгнетавага тыпу памерам 10×11 мм (мал. 16), змешчаная на лістах да Крыштафа Радзівіла ад 2 лістапада 1582 г. і 2 студзеня 1585 г. Яна не мае ніякіх асабістых прыкмет, легенды ці ініцыялаў. На рэнесанснай тарчы пад княжацкай мітрай размешчана «Пагоня». Гэта адна з першых выяў у сфрагістычнай традыцыі Алелькавічаў, калі на пячатцы была размешчана княжацкая мітра, што стане традыцыяй як для самага Юрыя, так і яго малодшых братоў [2, s. 2; 3, s. 50]. Цяжка растлумачыць адсутнасць на ёй якіх-небудзь прыкмет, якія ўказвалі б на ўласніка пячаткі, магчыма таму яна выкарыстоўвалася толькі ў ліставанні разам з подпісам. Пры гэтым на вялікіх круглых пячатках, якімі князь Юрый III карыстаўся на працягу 1582–1583 гг. [35, с. 286 № 490–491], пры паступовым ускладненні малюнка мітра так і не з'явілася.

Сыгнет яго малодшага брата князя Аляксандра Юр'евіча (1562/1563–1591), якім той запячатаў ліст аб падзеле бацькоўскай спадчыны ад 20 ліпеня 1582 г., вылучае менавіта наяўнасць ініцыялаў па баках кароны

«A(lexander) D(ei) || G(ratia) D(ux) || S(lucensis)». Пры гэтым звяртае на сябе ўвагу вялікая, амаль на трэць барочнага шчыта, княжацкая мітра (мал. 17) [2, s. 20; 9]. Пры малых памерах (8×10 мм) на пячатцы размешчана значна больш інфармацыі пра ўласніка, чым на пячатцы яго брата. Аднак ужо праз некалькі месяцаў ён пачаў карыстацца іншай васьмікутнай (8×10 мм) пячаткай, з павялічанай гербавай тарчай і аналагічным парадкам размяшчэння ініцыялаў «A D || G D || S» па баках ад мітры і тарчы (мал. 18) [2, s. 2]. Паколькі першы варыянт сыгнетавай пячаткі сустракаецца ў лістах 1585 г., магчыма сцвярджаць, што абедзве пячаткі выкарыстоўваліся ў адзін і той жа прамежак часу – у 1582–1585 гг.



Мал. 18. Пячатка Аляксандра Слуцкага, 1582 г. [2, k. 2]

Адначасова з імі ў 1583–1589 гг. для запячатвання дакументаў і асабістых лістоў князь Аляксандр выкарыстоўваў і вялікую (дыяметрам 28 мм) круглую пячатку з надпісам на коле «* ALEXANDER D(ei) G(ratia) DVX SLVCENSIS» [2, s. 13, 34; 40, с. 86 № 175]. Ёй на змену ў 1589 г. прыйшла вялікая авальная пячатка (27×31 мм) з надпісам па атоку «ALEXANDER DEI GRACIA DUX SLUCENSIS» [2, s. 22; 40, с. 86 № 176]. З пяці вядомых на сённяшні дзень пячатак толькі адна – 1579 г. – не мела выявы княжацкай мітры [35, с. 286 № 483]. Характэрнай асаблівасцю пячатак князя Аляксандра стала знікненне варыятыўнасці ў знешнім выглядзе герба. На кожнай пячатцы размешчана выява вершніка, які правай рукой уздымае меч, у левай трымае шчыт з шасціканцовым крыжам, пры гэтым хвост каня ўзняты ўверх.

Пячатак князя Яна Сімяона Слуцкага (каля 1560–1592) вядома тры. Аналіз дакументаў да 1579–1586 гг. дазваляе сцвярджаць, што для запячатвання яго дакументаў выкарыстоўвалася адна і тая ж матрыца (дыяметрам 22 мм), якая А. Цітовым была пазначана як дзве асобныя пячаткі, што было паўторана за ім А. Аднарожанкам [35, с. 285, № 486–487; 40, с. 86–87, № 179–180]. Магчыма, гэта была найбольш ранняя пячатка, якая выкарыстоўвалася сярэднім з братоў яшчэ з 1579 года, а потым для запячатвання лістоў падчас свайго падарожжа па краінах Заходняй Еўропы [4, s. 3].

Пазней яе замянілі вялікая (пра якую сказана вышэй) і васьмікутная (11×13 мм) пячаткі, на якой на познерэнесанснай авальнай тарчы паказана выява вершніка, які правай рукой уздымае меч, у левай трымае



Мал. 19. Пячатка Яна Сімяона Слуцкага, 1582 г. [9, н/н]

шчыт («Пагоня»), над картушам княжацкая мітра. У атоку пячаткі на стужцы, падзеленай зверху княжацкай мітрай, размешчаны надпіс па-лацінску «SIM(eon) D(ei) G(ratia) D(ux) SLVCENSIS» (мал. 19) [9]. Згаданай пячаткай ён карыстаўся на працягу некалькіх гадоў – у 1582–1589 гг. [2, s. 2; 4, s. 32].

Цікава, што нягледзячы на прыняцце каталіцтва ў 1581 г. у Балонні [39, с. 122], а з ім і другога імя – Ян (Ioannis), змен у ініцыялах у пачатку 1580-х гг. не адбылося. Князь па-ранейшаму выкарыстоўвае літару S – Simeon (Сямён) для пазначэння імя, хаця адразу пасля канверсіі ён пачынае падпісвацца як Ян Сімяон (JSimeon, Jan Symeon) [4, s. 2, 7]. Змены імя адбываюцца на самай позняй з вядомых гербавых пячатак апошняга князя Слуцкага, якой ён карыстаўся ў 1589–1592 гг., калі ў атоку да імя Сямён дадаецца Ioan(nis). Значна змяняецца і аздабленне тарчы. Як і на позняй пячатцы князя Юрыя (1584 г.), апрача намёту, каля авальнага барочнага шчыта бачны анёлы-шчытатрымальнікі [4, s. 50, 63; 35, с. 286, № 488; 40, с. 86–87, № 181].

На сённяшні дзень выяўлена аналагічная колькасць (3) пячатак апошняй прадстаўніцы роду – князёўны Соф'і Юр'еўны Алелькавіч-Слуцкай, княгіні Радзівіл (1586–1612). З іх адну круглую дыяметрам 24 мм з выявай «Пагоні» на паўкруглым барочным шчыце [10, s. 88; 14, s. 13; 35, с. 286, № 493; 39, с. 187; 40, с. 87, № 182] вылучае наяўнасць цікавых ініцыялаў па баках клейноту «Z(ophya) || X(iężna)» і тарчы «S(łucka) || O(lelkowicz)» (мал. 20). Пячатка, якая вядомая з дакументаў 1600–1602 гг., не мае ніякіх прыкмет яе статусу як замужняй жанчыны, нягледзячы на тое, што ўжо з верасня 1600 г. яна з'яўлялася княгіняй Радзівіл, выйшаўшы замуж за падчашага ВКЛ Януша Радзівіла [39, с. 187]. Магчыма, яна была замоўлена і выканана яшчэ да яе выхаду замуж, а неабходнасць урэгулявання маёмасных спрэчак з апекунамі і складанае матэрыяльнае становішча маладой пары не дало магчымасці замяніць яе раней за 1603 г. [39, с. 188–191].

На сыгнетавай прамавугольнай пячатцы (9×10 мм) 1603 г. ужо бачны змены. Так, герб («Пагоня») размешчаны на авальным барочным шчыце пад княжацкай мітрай. Па кутах пячаткі бачны ініцыялы «Z(opfia) || X(iężna), S(łucka) || R(adziwiłowa)» (мал. 21) [13, s. 67].

Большай дасканаласцю выканання вылучаецца наступная яе пячатка ад 1605 г., дзе герб зноў размешчаны на авальным барочным шчыце пад княжацкай мітрай, але вялікія памеры авальнай пячаткі (21×24 мм), наяўнасць намёту і лацінскага надпісу ў атоку, а таксама характар дакумента, да якога яна прыкладзена (пацвярджальны ліст Палоніі Багушоўне і Рыгору Валадковічу на мястэчка Грозава), дазваляюць сцвярджаць, што яна прыйшла на змену ранейшай круглай [11, s. 12] (мал. 22).

Цікава, што за ўвесь час існавання дынастыі Алелькавічаў, ніводная з яго галін не размясціла на пячатцы (сыгнетавай, сярэдняй ці вялікай) складаны ці шлюбны герб, хаця пры выкарыстанні ў родзе аднолькавых імёнаў гэта дапамагло б выразней ідэнтыфікаваць пячаткі. Характэрнай рысай для прадстаўнікоў кожнага пакалення з'яўлялася выкарыстанне так званага асабістага адзінкавага герба. У геральдыцы Алелькавічаў самастойнае выкарыстанне герба «Пагоня» функцыянавала як афіцыйнае геральдычнае прадстаўленне амаль усіх князёў. Таму магчыма казаць не пра кананічную выяву родавага герба, а выключна як пра выявы, характэрныя для пячатак кожнага прадстаўніка [26, s. 473]. Нават у межах жыцця аднаго чалавека выява каня і вершніка, яго зброі мянялася ў дэталях, прапорцыях, тэхніцы выканання. Пры гэтым да 1570-х гг. пячатка мела просты герб – толькі шчыт з гербам «Пагоня».



Мал. 20. Пячатка Соф'і Юр'еўны, народжанай Алелькавіч, Радзівіл, 1600–1602 гг. [10, k. 88]



Мал. 21. Пячатка Соф'і Юр'еўны, народжанай Алелькавіч, Радзівіл, 1603 г. [13, k. 67]



Мал. 22. Пячатка Соф'і Юр'еўны, народжанай Алелькавіч, Радзівіл, 1605 г. [11, k. 12]

Змены ў сфрагістыцы князёў Алелькавічаў магчыма патлумачыць як палітычнымі фактарамі, у прыватнасці, іх прэтэнзіямі на трон і спадчыннае месца ў Сенаце наваствoранай Рэчы Паспалітай, так і змяненнем эстэтыкі той эпохі. Пры гэтым, герб, увянчаны шляхецкай каронай з кляйнотам, з'яўляецца адзінкавым выпадкам і хутчэй стаў вынікам запазычвання з першаўзору (пячаткі Жыгімонта ІІ Аўгуста).

Пералом у аздабленні, а менавіта з'яўленне княжацкай мітры і намёту, само аздабленне матрыцы, выкарыстанне лацінскага надпісу з раскрыццём усіх тытулаў характарызуе пячаткі толькі апошніх прадстаўнікоў роду, што праявілася не толькі ў сфрагістыцы, але і наогул у геральдычнай традыцыі апошніх князёў Алелькавічаў, у прыватнасці, у панегірычнай літаратуры. У сваю чаргу гэта сведчыць пра пераасэнсаванне ў родзе сваёй гербавай выявы і наданні ёй рэпрэзентатыўнай функцыі.

Аднак пры тым, што князі добра разумелі рэпрэзентатыўную ролю любой вялікай пячаткі ці гербавай выявы, што выразна бачна ва ўскладненні яе элементаў і інфармацыі, змешчанай у надпісах, яны ні разу не выкарыстaлі складаны герб, які мог бы не толькі раскрыць генеалогію роду, але і паказаць іх роднасныя сувязі з рознымі кіруючымі дынастыямі Усходняй Еўропы, падмацаваўшы іх палітычныя амбіцыі. Бачна, што князі Алелькавічы яўна недаацанілі прапагандысцкія магчымасці сфрагістыкі для ўслаўлення свайго роду, а, можа, і не бачылі ў гэтым неабходнасці, выкарыстоўваючы іншыя метады рэпрэзентацыі.

## Крыніцы і літаратура


1. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie (далей – AGAD). – Archiwum Potockich z Radzynia. Sygn. 345. – Akta Iwana Iwanowicza Hornostaja, dotyczące działów rodzinnych po ojcu. 1547–1569. – 87 k.
2. AGAD. – Archiwum Radziwiłłów (далей – AR). Dz. V. Sygn. 14631. – Słucki książe Aleksander. 1582–1589. – 25 k.
3. AGAD. – AR. Dz. V. Sygn. 14632. – Słucki książe Jerzy. 1580–1585. – 51 k.
4. AGAD. – AR. Dz. V. Sygn. 14633. – Słucki książe Symeon. 1582–1614. – 71 k.
5. AGAD. – AR. Dz. V. Sygn. 14634. – Słucki książe Jerzy. 1558. – 2 k.
6. AGAD. – AR. Dz. V. Sygn. 14635. – Słucka księżna Katarzyna. 1581–1582. – 57 k.
7. AGAD. – AR. Dz. V. Sygn. 14636. – Słucka księżna Zofia. 1590–1594. – 79 k.
8. AGAD. – AR. Dz. VIII. Sygn. 511. – Akta t.s. procesu między plebanami słuckimi a Radziwiłłami i ich sukcesorami o uposażenie nadane plebanii słuckiej na dobrach radziwiłłowskich, pierwotnie Olelkowiczów. – 4910 k.
9. AGAD. – AR. Dz. X. Akty niesygnowane. – Papiery Słuckich Olelkowiczów. – [182 k.].
10. AGAD. – AR. Dz. XI. Sygn. 41. – Małżeństwo Janusza Radziwiłła z Zofią Olelkowiczówną ks. Słucką. 1595–1613. – 173 k.

11. AGAD. – AR. Dz. XXIII. Teka 65. Pl.14. – Akta tyczące się dzierżaw zastawnych. Unichowski, po nim Wołodkowicz, a w stopniu ostatniego Kiersnowski, z zastawnej dzierżawy Hrozowa oraz proces ostatniego z książętami Radziwiłłami o gwałtowne zdepossydowanie. 1583–1663. – 71 k.
12. AGAD. – AR. Dz. XXIII. Teka 116. Pl. 1. – Księstwa słuckie i kopylskie. Akta ściągające się do dziedzictwa. Z czasów posiadania księstwa słuckiego i kopylskiego przez Olelkowiczów książąt słuckich. 1497–1592. – 151 k.
13. AGAD. – AR. Dz. XXIII. Teka 116. Pl. 3. – Proces Hieronima Chodkiewicza kasztelana wileńskiego z Krzysztofem i Januszem oraz małżonką jego Zofią księżniczką Słucką książętami Radziwiłłami w sądzie głównym trybunalnym prowadzony o niezadośćuczynienie opisom jakie Krzysztof książę Radziwiłł przy układzie zawarł. 1600-1602. – 580 k.
14. AGAD. – AR. Dz. XXIII. Teka 136. Pl. 4. – Akta sumowe. 1554–1622. – 70 k.
15. AGAD. – AR. Dz. XXIII. Teka 169. Pl. 1. – Głębokie i Propoliszcze Zienowicza od Wołkołaty dóbr książąt słuckich. 1522, 1555–1556. – 89 k.
16. AGAD. – AR. Dz. XXIII. Teka 176. Pl. 4. – Kopylskie księstwo. 1581–1807. – 124 k.
17. AGAD. – tzw. Metryka Litewska III a. Ks. 28. – Regestrum Privilegiorum super bona, quae Serenissima princeps domina domina Bona, Dei gratia Regina Poloniae, suprema dux Litwaniae etc. in eodem Ducatu Litvaniae in summis pecuniariis vel alio quovis modo obtinet Anno Domini 1544 factam et scriptum. 1509–1544. – 511 k.
18. AGAD. – Zbiór dokumentów pergameniowych. Sygn. 7737. – Jerzy, ks. Słucki zapisuje małżonce swej wiano. 1558. – 2 k.
19. Archiwum Narodowe w Krakowie. – Zbiór Ruseckich 66. – Akta i listy pisane do Gabriela Hornostaja woj. mińskiego, star. kamienieckiego, później woj. brzeskiego z lat 1558–1588. – 238 k.
20. Gumowski, M. Pieczęcie książąt litewskich / M. Gumowski // Ateneum Wileńskie. – R. 7. – 1930. – Zesz. 3–4. – S. 684–725.
21. Lietuvos Metrika. [Knyga № 251] (1552–1561). 37-oji Teismų bylų knyga / Par. I. Valikonitė, L. Steponavičienė. – Vilnius : Lietuvos istorijos institutas, 1993. – 314 s.
22. Lietuvos nacionalinis muziejus. – Rankraščių kolekcija. R-841. – 2 p.
23. Lietuvos nacionalinis muziejus. – Rankraščių kolekcija. R-847. – 2 p.
24. Paprocki, B. Gniazdo cnoty: skąd herby rycerstwa sławnego Królestwa Polskiego, Wielkiego Księstwa Litewskiego, Ruskiego, Pruskiego, Mazowieckiego, żmudzkiego i inszych państw do tego Królestwa należących, książat i panów początek swoj mają / B. Paprocki. – Kraków : z drukarniey Andrzeia Piotrkowczyka, 1578. – 1242 s.
25. Polechow, S. W. Pieczęć kniazia Iwana Olgimuntowicza Holszańskiego / S. W. Polechow, M. N. Butyrski // Inter Regnum et Ducatum: studia ofiarowane Profesorowi Janowi Tęgowskiemu w siedemdziesiątą rocznicę urodzin / pod red. P. Guzowskiego, M. Liedke i K. Borody. – Białystok : Instytut Badań nad Dziedzictwem Kulturowym Europy, 2018. – S. 441–461.

26. Rogulski, J. Pieczęcie herbowe książąt Sanguszków od XVI do XVIII wieku / J. Rogulski // Dawne pieczęcie. Typologia – metody badań – interpretacje / pod red. Z. Piecha. – Warszawa : DiG, 2015. – S. 435–475.
27. Wollf, J. Kniaziowie litewsko-ruscy do końca czternastego wieku / J. Wollf. – Warszawa : Drukiem J. Filipowicza, 1895. – XXV, 698 s.
28. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные археографической комиссиею. – Т. 5. – Санкт-Петербург : тип. Э. Праца, 1853. – 288 с.
29. Алехнович, Р. Правовое положение незамужних девушек в ВКЛ во второй половине XV – первой половине XVI в. / Р. Алехнович // Вялікае Княства Літоўскае: палітыка, эканоміка, культура : зб. навук. арт. У 2 ч. Ч. 2 / уклад.: А. А. Скеп'ян; рэдкал.: У. Р. Гусакоў [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2017. – С. 301–311.
30. Воронин, В. А. Князья Олельковичи – претенденты на власть в Великом Княжестве Литовском / В. А. Воронин // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы : науч. сб. – Вып. 9. – Минск : РИВШ, 2016. – С. 96–126.
31. Глінскі, Я.С. "Epitome principum Lituaniae" ў кантэксце гістарычнай думкі Вялікага Княства Літоўскага ў XVI ст. / Я. Глінскі // Studia Historica Europae Orientalis. = Исследования по истории Восточной Европы : науч. сб. – Вып. 4. – Минск : РИВШ, 2011. – С. 263–299.
32. Івакін, Г. Ю. Поховальний комплекс XV ст. у нартексі Успеньского собору Кієво-Печерської Лаври / Г. Ю. Івакін, С. А. Балакін // Лаврьский альманах. Кієво-Печерськая Лавра. – Вип. 2. – Київ : Фенікс, 1999. – С. 76–81.
33. Наданні князёў Алелькавічаў цэрквам у Слуцку ў XV ст. / падр. да друку Ю. М. Мікульскі // Беларуская даўніна. Studia et Fontes. – Вып. 3. – Мінск : Выдавец А. М. Вараксін, 2016. – С. 185–200.
34. Однороженко, О. А. Герб князів Вишневецьких / О. А. Однороженко // Січеславський альманах. Зб. наук. праць з історії українського козацтва. – Вип. III. – Дніпропетровськ : выдавецтва, 2008. – С. 106–121.
35. Однороженко, О. А. Руські королівські, господарські та князівські печатки XIII–XVI стст. / О. А. Однороженко. – Харків : Просвіта, 2009. – 319 с.
36. Однороженко, О. А. Родові, династичні та територіальні знаки в литовсько-руській князівській геральдиці XIV – першої половини XVII століть / О. А. Однороженко // Записки Наукового товариства імені Шевченка. – Т. CCLXXI: Праці Комісії спеціальних (допоміжних) історичних дисциплін. – Львів, 2018. – С. 366–453.
37. Полехов, С. Несохранившаяся печать князя Александра Патрикеевича Стародубского / С. Полехов // Средневековая нумизматика Европы. – Вып. 6. – Москва : РИА Внешторгиздат, 2017. – С. 236–244.
38. Пчелов, Е. В. Печать Софьи Витовтовны и изображение на ней // Tarptautinė numizmatikos konferencija. Pranešimų tezės. Vilnius, 2012 m. gegužės 23–25 d. Lietuvos nacionalinis muziejus. – Vilnius : Lietuvos nacionalinis muziejus, 2012. – S. 142–143.

39. Скеп'ян, А.А. Князі Слуцкія / А. А. Скеп'ян. – Мінск : Беларусь, 2013. – 246 с.
40. Цітоў, А. К. Пячаткі старажытнай Беларусі. Нарысы сфрагістыкі / А. К. Цітоў. – Мінск : Полымя, 1993. – 293 с.
41. Шаланда, А. І. Геральдыка князёў Агінскіх: генезіс, легенда, факты / А. І. Шаланда // Герольд Litherland. – 2013. – № 19. – С. 14–22.
42. Шаланда, А. И. Гербы князей Друцких и Льва Сапеги / А. І. Шаланда // Друцк : Друцк и Друцкая волость (княжество) в IX–XII вв., летопись древних слоев, князья Друцкие и их владения в XIII–XVIII вв., ремесло промыслы, торговля (по данным археологии, нумизматики, письменных источников), памятники архитектуры и объекты туризма / О. Н. Левко [и др.]; редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.); науч. ред. О. Н. Левко. – Минск : Белоруская наука, 2014. – С. 316–362.
43. Шаланда, А. І. Таямнічы свет беларускіх гербаў. Шляхецкая геральдыка Вялікага княства Літоўскага / А. І. Шаланда. – Мінск : А. М. Янушкевич, 2014. – 220 с.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 21.06.2021

# Навукова-даведачны апарат

*Ю. М. Снапкоўскі*

## Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі ў спецыяльных гістарычных дысцыплінах біяграфічнага профілю (на прыкладзе анлайн-картатэкі прафесара Эрыка Амбургера «Іншаземцы ў дарэвалюцыйнай Расіі»)

Развіццё сучаснага грамадства наўрад ці магчыма ўявіць без шырокага ўкаранення і выкарыстання інфармацыйных тэхналогій, якія працягваюць рабіць усё большы ўплыў на самыя розныя сферы чалавечай дзейнасці, уключаючы навукі гуманітарнага профілю. Прычым да гэтага часу роля інфармацыйных тэхналогій узрасла настолькі істотна, што яны выкарыстоўваюцца не толькі ў працэсе гуманітарных даследаванняў, але і для пашырэння межаў гэтых даследаванняў саміх па сабе. Відавочна, што сёння перад гуманітарнымі навукамі паўстаюць новыя задачы, звязаныя з асэнсаваннем тэмпаў развіцця і патрэбнасцей сучаснага (інфармацыйнага) грамадства, дзе перавага аддаецца перадавым тэхналогіям і інавацыям, павелічэнню маштабаў цыфравізацыі, максімальнаму пашырэнню камунікацыі і г. д.

Паколькі прадметная вобласць дадзенай публікацыі звязана з галінамі гістарычнай навукі, галоўным чынам біяграфічнай накіраванасці, у ёй застаюцца незакранутымі іншыя спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны, якія ці займаюцца вырашэннем выключна крыніцазнаўчых задач, ці паводле прадмета і метадаў свайго даследавання маюць цягу хутчэй да дакладных навук. Пад спецыяльнымі гістарычнымі дысцыплінамі пры гэтым трэба разумець адносна аўтаномныя галіны гістарычнай навукі, якія ўласцівымі для іх метадамі вывучаюць пэўныя віды ці асобныя бакі формы і зместу гістарычных крыніц для максімальнага выкарыстання апошніх у гістарычных даследаваннях. Кола гэтых дысцыплін даволі шырокае і змяшчае ў сабе палеаграфію, кадыкалогію, дыпламатыку, сфрагістыку, генеалогію, геральдыку, біяграфіку, некрапалістыку, эпіграфіку, анамастыку, антрапаніміку,

нумізматыку, баністыку, фалерыстыку, метралогію, храналогію і шэраг іншых.

Назіраемыя ў наш час ускладненне інфармацыйных патокаў, фарміраванне новых тыпаў крыніц, развіццё навуковых метадаў і тэхналогій заўважна ўплываюць на характар гістарычных даследаванняў, накіроўваючы іх у бок міждысцыплінарнасці. З улікам таго, што такія працы ў рэчышчы сучаснай айчыннай гістарыяграфіі метадалагічна знаходзяцца нібы на стыку адразу некалькіх ключавых спецыяльных гістарычных дысцыплін біяграфічнага профілю – біяграфікі, генеалогіі і некрапалістыкі [32; 35; 56], паўстае пытанне аб разглядзе і выкарыстанні перадавых інфармацыйных тэхналогій, якія скарыстоўваюцца ў гэтых абласцях. Пад біяграфікай трэба разумець дысцыпліну, што распрацоўвае тэарэтычныя і практычныя праблемы біяграфічнай рэканструкцыі, а таксама ўключае ўласна біяграфічныя веды: складанне біяграфій і іншых відаў біяграфічных звестак і сукупнасць вынікаў гэтай дзейнасці [46, с. 12]. У той жа час даследаванні біяграфікі падразумяваюць цесную ўзаемасувязь як шэрагу спецыяльных гістарычных дысцыплін, так і некаторых гуманітарных навуковых кірункаў – бібліяграфіі, энцыклапедыстыкі, літаратуразнаўства і інш. У гэтым сэнсе да біяграфікі прымыкае генеалогія, якая займаецца сістэматычным зборам звестак аб паходжанні індывідаў, вызначэннем адносін сваяцтва паміж імі, а таксама вывучэннем гісторыі асобных сем’яў і родаў. Выключную ролю ў біяграфічных і генеалагічных даследаваннях, перш за ўсё ў якасці «пастаўшчыка» арыгінальнай рэтраспектыўнай інфармацыі, адыгрывае некрапалістыка, у кампетэнцыю якой уваходзіць апісанне, вывучэнне і захаванне могілак (некропаляў) і асобных пахаванняў (надмагілляў). Можна нават сказаць, што біяграфіка ў шырокім разуменні ўключае ў сябе вынікі генеалагічных і некрапалістычных адшуканняў [41; 65].

З прычыны таго, што прадметная вобласць спецыяльных гістарычных дысцыплін біяграфічнай накіраванасці падразумявае вялікую практычную працу як з профільнай літаратурай, так і з разнастайнымі матэрыяламі дзяржаўных і прыватных архіваў, асаблівую актуальнасць набываюць інфармацыйныя тэхналогіі, у першую чаргу, з пункту гледжання выяўлення, назапашвання, сістэматызацыі і эфектыўнага выкарыстання рэтраспектыўнай інфармацыі. Адначасова, незалежна ад запытаў у нашы дні з боку саміх спецыяльных гістарычных дысцыплін, істотны ўплыў на іх развіццё, так бы мовіць, па змоўчанні, робіць удасканаленне метадаў выкарыстання сеткавых рэсурсаў, баз даных, інструментаў апрацоўкі крыніц, што функцыянальна спрашчае і паскарае даследчую працу, узбагачае магчымасці апрацоўкі і перадачы інфармацыі.

Біяграфіка, генеалогія і некрапалістыка, з’яўляючыся складальнікамі адносна адзінай вобласці навуковай дзейнасці, маюць падобныя кі-

рункі прымянення сучасных інфармацыйных тэхналогій. Перш за ўсё, гэтыя спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны шмат у чым грунтуюцца на агульным крыніцавым фундаменце – дакументальных зборах дзяржаўных архіваў, музеяў і бібліятэк.

Сучасныя архівы і бібліятэкі, з’яўляючыся буйнымі цэнтрамі біяграфічных і генеалагічных даследаванняў і разумеючы значнасць развіцця адпаведных дысцыплін, актыўна працуюць над укараненнем тэхналогій аддаленага доступу да сваіх дакументальных комплексаў і навукова-даведачнага апарату. У межах гэтых мерапрыемстваў ажыццяўляюцца скаміраванне вопісаў фондаў, найбольш запатрабаваных і інфарматыўных відаў дакументаў, дарэвалюцыйных і старадрукаваных выданняў і размяшчэнне іх лічбавых вобразаў у сетцы Інтэрнэт на сайтах устаноў і на знешніх носьбітах памяці [3; 18; 19; 20; 21; 22; 27; 29; 30; 33; 34; 36; 37; 39; 40; 44; 45; 48; 49; 52; 58; 59; 60; 62; 63; 64; 70].

З укараненнем новых інфармацыйных тэхналогій у сучасную архіўную справу непасрэдна звязаны адзін з прыярытэтных кірункаў дзейнасці архіўных устаноў – удасканаленне і пашырэнне навукова-даведачнага апарату да іх дакументальных комплексаў шляхам індэксацыі (машынапіснага набору) вопісаў фондаў, стварэння электронных паказальнікаў (унутраных вопісаў) да адзінак захавання (спраў) і тэматычных баз даных на падставе асобных відаў дакументаў для аператыўнага забеспячэння даследчыкаў рэтраспектыўнай інфармацыяй, перш за ўсё біяграфічнага і генеалагічнага характару – як самай запатрабаванай [19; 21; 24; 29; 30; 34; 36; 37; 38; 39; 40; 44; 48; 58; 59; 60; 62; 70].

Вялікая роля ў фарміраванні, асваенні і аператыўным выкарыстанні крыніцавай базы спецыяльных гістарычных дысцыплін адводзіцца сучасным тэхнічным сродкам для стварэння і захоўвання лічбавых вобразаў архіўных дакументаў, лічбавай фіксацыі аўдыёінфармацыі ў працэсе інтэрв’юіравання носьбітаў «вуснай гісторыі», лічбавай фотафіксацыі месцаў пахавання і надмагільных надпісаў, лабараторнага даследавання біялагічных матэрыялаў і г. д. [13; 34; 57; 79; 85].

Для спецыяльных гістарычных дысцыплін біяграфічнага профілю ў цэлым характэрна прымяненне шырокага спектра спецыялізаваных праграмных сродкаў. Разам з тым, у адносінах да асобных дысцыплін яны прымяняюцца нераўнамерна. Так, уласна ў біяграфіцы спецыялізаваныя праграмныя сродкі выкарыстоўваюцца даволі нязначна. Аднак заўважную ролю яны сёння адыгрываюць у генеалогіі і некрапалістыцы. Асабліва гэта тычыцца такога спецыфічнага кірунку ў сучасных генеалагічных даследаваннях, як генетычная генеалогія, ці ДНК-генеалогія, перад якой ставіцца задача вырашэння метадалагічных праблем класічнай дакументальнай генеалогіі ў сувязі з частай недастатковасцю (фрагментарнасцю) яе крыніцавай базы [28; 43]. Вузкаспецыяліза-

ванае праграмнае забеспячэнне выкарыстоўваецца на лабараторным этапе ДНК-тэсціраванняў і пры супастаўленні іх вынікаў у агульным банку даных. Для візуалізацыі вынікаў генеалагічных даследаванняў і вызначэння іх далейшых кірункаў шырокае прымяненне атрымалі праграмы пабудовы генеалагічных дрэваў (схем, табліц) неабмежаванага аб’ёму [1]. Што ж датычыцца некрапалістыкі, то ўласцівыя гэтаму кірунку праграмныя сродкі грунтоўна задзейнічаны ў працэсе індэксацыі, каталагізацыі і віртуальнай рэканструкцыі пахаванняў [85].

Выключная роля ў межах адзначанай праблематыкі адведзена фарміруемым пад эгідай розных навукова-даследчых цэнтраў, грамадскіх ініцыятыў і аб’яднанняў, дзяржаўных устаноў і камерцыйных арганізацый як лакальным рэсурсам, так і агульнадаступным інтэрнэт-рэсурсам – тэматычным базам і банкам даных, анлайн-картатэкам і форумам, якія дазваляюць акумуліраваць, выяўляць і эфектыўна выкарыстоўваць арыгінальную рэтраспектыўную інфармацыю [2; 4; 6; 7; 8; 10; 11; 14; 15; 16; 17; 24; 25; 26; 30; 31; 38; 40; 42; 44; 45; 47; 48; 51; 52; 54; 59; 60; 66; 67; 68; 69; 70]. Прычым гэтыя рэсурсы можна адначасова разглядаць і як электроннае інфармацыйнае забеспячэнне навукова-даследчых прац у галіне спецыяльных гістарычных дысцыплін біяграфічнага профілю, і як электронныя сродкі апрабацыі вынікаў саміх даследаванняў. Істотнай інфармацыйнай падмогай таксама з’яўляюцца тэматычныя электронныя бібліятэкі [55], якія дазваляюць не толькі атрымоўваць аператыўны доступ да неабходнай галіновай літаратуры, але і, напрыклад, маніторыць узровень навуковай распрацоўкі некаторых пытанняў. Асаблівы ўплыў інтэрнэт-тэхналогіі сёння робяць на сферу генеалогіі, спрыяючы імкліваму развіццю службаў генетычнага тэсціравання і забяспечваючы ў анлайн-рэжыме дэманстрацыю вынікаў ДНК-тэстаў і выяўленне новых роднасных сувязяў. Самымі вядомымі рэсурсамі гэтага кірунку з’яўляюцца база даных ДНК-тэстаў амерыканскай прыватнай кампаніі «FamilyTreeDNA» [82] і сайт ізраільскай генеалагічнай кампаніі «MyHeritage» [84].

У цэлым можна канстатаваць, што сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі адкрываюць шырокае кола новых магчымасцей у працэсе вывучэння пытанняў, якія ўваходзяць у кампетэнцыю спецыяльных гістарычных дысцыплін біяграфічнай накіраванасці, тым самым выстаўляючы гэтыя дысцыпліны на яшчэ больш высокі ўзровень запатрабаванасці з боку грамадства.

Адным з ключавых сегментаў крыніцавай базы сучасных гістарычных даследаванняў з выкарыстаннем метадаў біяграфікі і генеалогіі становяцца анлайн-картатэкі. Значнасць гэтых электронных інфармацыйных рэсурсаў, прадстаўленых у вольным інтэрнэт-доступе, цяжка пераацаніць. Яны не толькі ўзбагачаюць даследаванні арыгінальным

фактычным матэрыялам, але і значна скарачаюць і спрашчаюць аналітычную працу. Сярод найбольш буйных і значных з іх трэба назваць анлайн-картатэкі афіцэраў Рускай імператарскай арміі – удзельнікаў Першай сусветнай вайны [50], ахвяр палітычных рэпрэсій у СССР [23], «Біяграфіка» [9], картатэку прафесара Эрыка Амбургера «Іншаземцы ў дарэвалюцыйнай Расіі» («Ausländer im vorrevolutionären Russland») [81]. Апошняя як цалкам нямецкамоўная (значыць, у некаторай ступені абмежаваная для ўсходнеславянскай аўдыторыі), а таксама з прычыны спецыфікі свайго прадмета («іншаземны элемент» у Расійскай імперыі) менш вядомая ў навуковых колах беларускай грамадскасці. Таму мы вырашылі засяродзіць на ёй асобную ўвагу. На наш погляд, картатэка прафесара Амбургера з'яўляецца адным з самых інфарматыўных і тэматычна рэлевантных па цэлым шэрагу аспектаў гістарычных даследаванняў завершаных (непапаўняемых) электронных рэсурсаў. Аб самой яе практычнай значнасці ў беларускім кантэксце лішні раз няма неабходнасці казаць: яна, напрыклад, была актыўна задзейнічана пры падрыхтоўцы такіх вядомых выданняў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, як зборнік дакументаў «Беларусь в годы Первой мировой войны (1914–1918)» [5] і біяграфічны даведнік «Минские губернаторы, вице-губернаторы и губернские предводители дворянства (1793–1917)» [35].

Анлайн-картатэка «Іншаземцы ў дарэвалюцыйнай Расіі» («Ausländer im vorrevolutionären Russland») не з’яўляецца самастойным інтэрнэт-рэсурсам, але з'яўляецца структурнай часткай сайта Інстытута даследавання Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы імя Лейбніца (г. Рэгенсбург, Германія) [83]. Доступ да яе на сайце здзяйсняецца праз асобную ўкладку («Amburger-Datenbank») у падраздзеле «Электронныя паслугі» («eServices») раздзела «Інфармацыйная інфраструктура» («Informationsinfrastruktur») [80].

У аснову анлайн-картатэкі пакладзены даныя з папяровай картатэкі вядомага нямецкага гісторыка і генеалога прафесара Эрыка Амбургера (1907–2001), які завяшчаў Інстытуту даследавання Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы свой навуковы архіў, які з’яўляецца ўнікальным зборам біяграфічных і генеалагічных звестак пра іншаземцаў, пераважна немцаў, што жылі ў Расійскай імперыі, і шырока выкарыстоўваецца навукоўцамі са шматлікіх краін свету.

Эрык Амбургер, ураджэнец Санкт-Пецярбурга і прадстаўнік абруселага нямецкага роду, пасля 1917 г. разам з маці эмігрыраваў у Германію, дзе з цягам часу стаў выбітным гісторыкам, спецыялістам галоўным чынам па Расійскай імперыі. Яго аўтарству належыць шэраг манаграфічных даследаванняў, сярод якіх найбольш вядомыя «Гісторыя пратэстантызму ў Расіі» [76], «Гісторыя органаў дзяржаўнай улады ў Расіі ад Пятра Вялікага да 1917 г.» [75], «Прыцягненне іншаземных кваліфіка-

ваных спецыялістаў у эканоміку Расіі» [72], «Адукацыйная палітыка ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе: навуковыя таварыствы, акадэміі і вышэйшыя школы ў XVIII і пачатку XIX ст.» [78], «Інгерманландыя. Новая руская правінцыя ў сферы ўплыву жылога і касмапалітычнага горада Санкт-Пецярбурга – Ленінграда» [77], «Немцы ў дзяржаве, эканоміцы і грамадстве Расіі. Сям'я Амбургераў у Санкт-Пецярбургу. 1770–1920» [71], а таксама біяграфічныя слоўнікі «Члены Германскай Акадэміі навук у Берліне. 1700–1950» [73] і «Пастары евангелічных цэркваў Расіі з канца XVI ст. да 1937 г.» [74].

Асноўная частка архіва прафесара Амбургера прадстаўлена вялікай картатэкай, што налічвае звыш 94000 картак (фармату А7), якія складаюць 23 скрыні агульнай групы (большасць прозвішчаў размешчана ў алфавітным парадку), 7 скрынь з данымі прыбалтыйскіх немцаў, якія перасяліліся ў Расійскую імперыю (асноўная частка прозвішчаў таксама прадстаўлена ў алфавітным парадку), і адну скрыню, азагалоўленую «Varia» («Рознае»), дзе асобы іншаземнага паходжання згрупаваны паводле прафесій [4, с. 47–48].

Большая частка картатэкі прафесара Амбургера была адлічбавана пры падтрымцы розных фондаў да канца 1990-х гг. у Мюнхенскім інстытуце Усходняй Еўропы працоўнай групай пад кіраўніцтвам доктара Германа Байер-Тома і аформлена ў выглядзе базы даных. У 2007 г. базу даных перавялі ў фармат MySQL, у выніку чаго яна стала даступнай праз Інтэрнэт пад назвай «Erik-Amburger-Datenbank: Ausländer im vorrevolutionären Russland» («Банк даных Эрыка Амбургера: Іншаземцы ў дарэвалюцыйнай Расіі») [4, с. 52; 80].

У цяперашнім выглядзе анлайн-картатэка адлюстроўвае дасягненні складанай шматгадовай працы. Цягам доўгага працэсу канвертацыі першапачатковай базы даных усплывала вялікая колькасць фармальных памылак, з-за якіх частка звестак не паддавалася распазнаванню і фактычна была згублена. Больш за тое, інфармацыйную сістэму трэба было папоўніць данымі з тых картак, якія былі прапушчаны пры адлічбоўцы ў 1990-я гг. Разам з гэтым, спецыялістамі аж да 2013 г. выпраўлялася вялікая колькасць відавочных памылак накшталт некарэктнага і неаднолькавага напісання адных і тых жа прозвішчаў і геаграфічных назваў [4, с. 53].

Рэсурс «Іншаземцы ў дарэвалюцыйнай Расіі» налічвае 95409 персанальных картак, ці «запісаў даных» («Datensatz»), кожная з якіх мае два ідэнтыфікацыйныя нумары – новы (ID) і стары (OID), які быў сапраўдны да пераводу адлічбаванай картатэкі ў фармат MySQL.

Па сваёй сутнасці анлайн-картатэка з'яўляецца камп'ютарным наборам рукапіснай/машынапіснай картатэкі прафесара Амбургера, паколькі кантэнт віртуальных картак цалкам уключае ў сябе змест папяровых

картак, якія Амбургер складаў на працягу ўсёй сваёй навуковай дзейнасці. Больш за тое, пры адлічбоўцы картак была захавана паслядоўнасць размяшчэння ў іх пэўных блокаў інфармацыі.

У той жа самы час разглядаемы электронны рэсурс нельга лічыць проста інфармацыяй, механічна перанесенай з папяровага носьбіта. Дзеля таго каб лепей зразумець сутнасць працы, праведзенай спецыялістамі, паспрабуем параўнаць прынцыпы і асаблівасці падачы звестак на папяровых картках прафесара Амбургера з «фармулярам» персанальных запісаў у анлайн-картатэцы.

На вонкавым баку карткі біяграфічныя даныя расстаўляліся Амбургерам у пэўнай паслядоўнасці. Імёны і прозвішчы галоўнай асобы, на якую была заведзена картка, і яе мужа ці жонкі друкаваліся на пішучай машынцы, а астатнія звесткі, якія Амбургер лічыў часовымі ці маючымі патрэбу ў пацвярджэнні, дапісваліся асадкай ці алоўкам. Пад імёнамі пазначаліся даты нараджэння і смерці, а таксама месца, дзе нарадзіўся і памёр чалавек, часта паведамлялася і пра месца яго пахавання (гэтыя даныя адзначаліся чатырохвугольнікам, які абазначаў труну). Пад запісамі аб нараджэнні і смерці пазначаліся звесткі пра бацькоў альбо пакідаліся свабодныя месцы для такіх звестак. Далей ішлі запісы пра атрыманую адукацыю і жыццёвы (кар’ерны) шлях. Таксама пералічваліся чыны (калі такія меліся), дасягнутыя цягам прасоўвання па службе (цывільнай ці ваеннай). На адваротным баку карткі пазначаліся крыніцы, з якіх здабывалася інфармацыя [4, с. 48–49].

Кожная картка, ці «запіс даных», у анлайн-картатэцы мае новы (асноўны) і стары ідэнтыфікацыйныя нумары. Пад імі размешчаны раздзелы «Асоба» («Person»), «Паходжанне» («Herkunft») і «Смерць» («Tod»), якія пазначаюцца толькі адзін раз у кожнай картцы. Усе астатнія раздзелы, такія як «Жыццёвы шлях» («Lebensweg») ці «Крыніца» («Quellen»), могуць налічваць дзве і болей пазіцый. Кожны раздзел утрымлівае некалькі пэўных палёў, з якіх адлюстроўваюцца толькі тыя, што запоўнены інфармацыяй (гл. іл. 1).

Такім чынам, кожная картка (запіс), аснову кантэнта якой складаюць біяграфічныя даныя пра іншаземца, у анлайн-картатэцы мае наступную структуру (прыводзіцца намі ў выніку аналізу некалькіх дзясяткаў картак):

• ідэнтыфікацыйны нумар (па змоўчанні новы – ID);
• стары ідэнтыфікацыйны нумар (OID);
• асоба (Person):
а) пол (Geschlecht);
б) прозвішча (Nachname);
в) імя (Vornamen);
г) рускі варыянт імені (Russische Vornamen);
д) першапачатковая нацыянальнасць (ursp. Nation);

• паходжанне (Herkunft):
а) месца нараджэння (geburtsort);
б) дата нараджэння (geboren);
• смерць (Tod):
а) месца смерці (todesort);
б) дата смерці (gestorben);
в) могілкі (friedhof);
• веравызнанне (Religion): дэнамінацыя (konfession);
• бацька (Vater):
а) імя (Vornamen);
б) прафесія ці пасада (beruf);
в) месцажыхарства (wohnort);
• маці (Mutter):
а) імя (Vornamen);
б) прозвішча (Nachname);
в) саслоўе (stand);
• браты і сёстры (Geschwister):
а) пол (Geschlecht);
б) імя (Vornamen);
• муж/жонка (Ehepartner):
а) дата шлюбу (hochzeitstag);
б) імя (Vornamen);
в) прозвішча (Nachname);
г) дата нараджэння (geboren);
д) месца нараджэння (geburtsort);
е) дата смерці (gestorben);
ж) месца смерці (todesort);
з) саслоўе (stand);
• дзіця (Kind) (дадзены раздзел структурна прымыкае да раздзела «Муж/жонка»):
а) пол (Geschlecht);
б) імя (Vornamen);
в) дата нараджэння (geboren);
г) дата смерці (gestorben);
• адукацыя (Ausbildung):
а) краіна (land);
б) спецыяльнасць (Ausbildung);
в) населены пункт (ort);
г) ступень ці званне (bildungsabschluss);
д) да якога часу праходзіла навучанне (bis / bildungsabschlussdatum);
• жыццёвы шлях (Lebensweg):
а) краіна знаходжання (stammland);
б) з якога часу працаваў ці займаў пасаду (von-ab);
в) прафесія ці пасада (beruf);
г) населены пункт (ort);
д) да якога часу працаваў ці займаў пасаду (bis);
е) на які момант часу працуе ці займае пасаду (belegt);
ж) рэгіён (territorium);
• узнагарода ці ганаровае званне (Ehren):
а) краіна (land);
б) узнагарода ці ганаровае званне (ehren);
в) месца надання (ort);
г) час надання (von-ab);
• чын ці званне (Rang):
а) краіна (land);
б) час надання (von-ab);
в) чын ці званне (Rang);
• саслоўе (stand):
а) краіна (land);
б) саслоўе (stand);
• крыніца (Quellen):
а) назва (bezeichnung);
б) спасылка на год выдання, старонку ці раздзел (fundstelle).

Анлайн-картатэка ўтрымлівае галоўнае меню, якое прысутнічае на кожнай яе старонцы. Асноўнымі раздзеламі з’яўляюцца «Шаблон пошуку» («Suchmaske») і «Імянны спіс» («Namensliste»), звязаныя паміж сабой сістэмай пошуку. Прысутнічаюць таксама дадатковыя раздзелы «Бібліяграфія» («Quellenverzeichnis»), «Паказальнік фамільных родаў» («Stammfolgen»), «Вопіс навуковага архіва [прафесара Эрыка Амбургера]» («Inventar des Forschungsarchivs») і «Каталог бібліятэкі [прафесара Эрыка Амбургера]» («Bestandsverzeichnis der Bibliothek»), якія, маючы дапаможны характар, адкрывюцца ў асобных укладках і даступны для спампавання ў выглядзе файлаў з разрозненнем .pdf.

Раздзел «Імянны спіс» («Namensliste»), зручны для ручнога пошуку, з'яўляецца алфавітным паказальнікам усіх персон картатэкі і падзелены на 27 падраздзелаў, з якіх 26 адпавядаюць лацінскім літарам нямецкага алфавіту і адзін з’яўляецца асобным падраздзелам з назвай «Іншыя» («Sonstige»), куды аднесены персоны з нестандартным напісаннем (з асобымі дыякрытычнымі знакамі ў вялікай літары і г. д.) прозвішча. У кожным падраздзеле прадстаўлены ключавыя звесткі пра персону, аформленыя ў выглядзе базы даных (табліцы), якая ўтрымлівае палі «Ідэнтыфікацыйны нумар» («ID»), «Стары ідэнтыфікацыйны нумар» («OID»), «Пол» («Geschlecht»), «Прозвішча» («Name»), «Першапачатковая нацыянальнасць» («ursp. Nation»), «Прафесійны статус» («Berufsklasse»), «Дата нараджэння» («geboren»), «Дата смерці» («gestorben») і пэўную колькасць запісаў, адпаведную ліку наяўных персанальных картак на канкрэтную літару алфавіта. У кожным запісе ячэйка з ідэнтыфікацыйным нумарам («ID») утрымлівае гіперспасылку на адпаведную картку («Datensatz») (гл. іл. 2).

Наяўнасць такога раздзела («Імяннога спіса») са мноствам падраздзелаў (алфавітных літар), у якіх інфармацыя зведзена ў таблічную форму, дае падставу называць разглядаемы інфармацыйны рэсурс базай ці банкам даных. Аднак у нашым выпадку база даных з’яўляецца, так бы мовіць, «пабочным прадуктам» адлічбоўкі картатэкі прафесара Амбургера, у выніку якой паўстала неабходнасць стварэння арганізаванай структуры, здольнай забяспечыць максімальна эфектыўны пошук звестак, якія ўтрымлівае картатэка.

Раздзел анлайн-картатэкі «Шаблон пошуку» («Suchmaske») з’яўляецца яе галоўнай старонкай [81]. Паколькі структура базы даных («Імяннога спіса») даволі складаная, вынік пошуку абмяжоўваецца трыма відамі звестак, а менавіта – уласнымі імёнамі («Name»), геаграфічнымі назвамі («Ort / Territorium / Land») і параметрам «Beruf», які аб’ядноўвае інфармацыю аб прафесіі, адукацыі і розных этапах біяграфіі. Магчыма правядзенне пошуку паводле злучэння палёў. Станоўчы вынік пошуку ўяўляе сабой зведзеныя разам запісы базы даных, якія ўтрымліваюць

шукаемыя звесткі (гл. іл. 3 і 4). Прычым разам з вынікам адлюстроўваецца колькасць знойдзеных запісаў і працягласць запыту да базы даных (у секундах). Магчымы таксама пошук паводле новага («Datenbank-ID») і старога («alte ID») ідэнтыфікацыйных нумароў, прымяненне якога вядзе да аўтаматычнага адкрыцця непасрэдна самой персанальнай карткі, мінаючы табlіцу з запісамі. Разам з тым, характэрны для анлайн-картатэкі шаблон пошуку не прыведзены ў строгую (поўную) адпаведнасць з цяперашняй структурай запісаў базы даных. Таму, як сам адзначае адзін з распрацоўшчыкаў праекта адлічбоўкі картатэкі прафесара Амбургера Герман Байер-Тома, на бягучы момант спосаб пошуку па картатэцы з’яўляецца толькі «бэта-версіяй» і ў будучыні плануецца яшчэ чацвёрты пошукавы падыход – паводле гадоў [4, с. 53, 55].

У выпадку працы з анлайн-картатэкай праз «Шаблон пошуку» трэба ўлічваць, што калі запісы павінны змяшчаць **усе** паняцці, то выкарыстоўваецца UND-звязка; каб указаць **альтэрнатыўныя** паняцці, якія шукаюцца (ODER-звязка), то трэба раздзяляць іх коскамі (паняцці могуць быць згрупіраваны з дапамогай дужак); каб **выключыць** пэўныя паняцці пры пошуку, то напе-


oid: 58458
Person
Person
Geschlecht: männlich
Nachname: Hindenburg; von Hindenburg - im Original: (1834)
Vornamen: Wilhelm Pastorius - im Original: 'Pastorius' 1834
Russische Vornamen: Danilovič
ursp. Nation: Deutscher
Herkunft
Herkunft
geburtsort: Minsk
geboren: 0.0.1799
Tod
Tod
todesort: Minsk
gestorben: 18.2.1877 os; 2.3.1877 ns - im Original: 84 J.!
Religion
Religion(1)
konfession: evangelisch-lutherisch
Ehepartner
Ehepartner(1)
hochzeitstag: -0.0.1834
Vornamen: Julie
Nachname: Graf
Ehepartner(2)
Vornamen: Rosa
Nachname: Weber
Ausbildung
Ausbildung(1)
land: Rußland
ausbildung: stud. med.
ort: Wilna
bis: 0.0.1821
Lebensweg
Lebensweg(1)
stammland: Rußland
von-ab: 0.0.1833
beruf: Accoucheur d. Med.verw.
ort: Minsk
belegt: 0.0.1855; 0.0.1862
Lebensweg(2)
stammland: Rußland
von-ab: 0.0.1840
beruf: Gefängnisarzt
Ehren
Ehren(1)
land: Rußland
ehren: Präs. d. Kirchenrats
ort: Minsk
Rang
Rang(1)
land: Rußland
von-ab: 25.10.1847
rang: Koll.Rat
Rang(2)
land: Rußland
rang: Stabsarzt
Quellen
Quellen(1)
bezeichnung: Sp.gr.?.
fundstelle: 1855, 385
Quellen(2)
bezeichnung: RBS
fundstelle: 1916, 217
Quellen(3)
bezeichnung: Adres-kalendar'
fundstelle: 1862, 63 II 158
Quellen(4)
bezeichnung: Kb.Minsk

Іл. 1. Від персанальнай карткі (запісу) у анлайн-картатэцы «Іншаземцы ў дарэвалюцыйнай Расіі» на прыкладзе Гіндэнбурга Вільгельма Данілавіча (Hindenburg Wilhelm Danilovič)

**Namensliste**

A B C D E F G H I J K L M N O P Q R S T U V W X Y Z Sonstige

| ID | OID | Geschlecht | Name | ursp. Nation | Berufsklasse | geboren | gestorben |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 16277 | 16907 | männlich | Faas, Alexander / Vil'gel'movič | Deutscher | Bergingenieur | | |
| 16278 | 16908 | männlich | Faas, Friedrich / Vil'g. | Deutscher | | | |
| 16279 | 16909 | männlich | Faas, Jakob / Vilgelmov. | Deutscher | Jurist | | |
| 16280 | 16910 | männlich | Faas, Michael / Vil'gel'mov. | Deutscher | Beamter | | |
| 16281 | 16911 | männlich | Faas, Woldemar / Vladimir Vil'g. | Deutscher | Forstbeamter | | |
| 53324 | 54050 | männlich | Faber, Abraham David | Deutscher | | | |
| 65566 | 66486 | männlich | Faber, Albert / Karlov. - im Original: Fed.! | Deutschbalte | | 21.3.1834 | 12.5.1892 |
| 65567 | 66487 | männlich | Faber, Bernhard Johann Balthasar Adam | Deutschbalte | | 27.1.1777 Kreuzberg | 22.11.1856 Vjazniki |
| 16284 | 16914 | männlich | Faber, Fedor Petrovič | Deutscher | kaufm. Angestellter | | |
| 16285 | 16915 | männlich | Faber, Friedrich | Deutscher | Beamter | | -17.5.1868 - im Original: 35 Jahre? St. Pbg. |
| 16286 | 16916 | männlich | Faber, Gabriel | Deutscher | Justizbeamter | | |
| 16287 | 16917 | männlich | Faber, Gotthilf Theodor / Fedor Andr. | Deutschbalte | Diplomat; Schriftsteller | 4.2.1766 Riga | 28.11.1847 Paris |
| 65565 | 66485 | männlich | Faber, Gotthilf Theodor / Fedor Andr. | Deutschbalte | | 4.2.1766 | 28.11.1847 Paris |
| 94693 | 95639 | männlich | Faber, Johann Christian | | | zwischen 0.0.1742 und 0.0.1746 Barten | 22.3.1816 Kreuzburg |
| 16288 | 16918 | männlich | Faber, Johann Heinrich | Deutscher | Tapezierer | | -13.5.1884 - im Original: 46 Jahre, 10 Monate St. Pbg. |
| 94695 | 95641 | männlich | Faber, Johann Wilhelm | | | 9.10.1794 Kreuzburg | 24.8.1847 Windau |
| 94694 | 95640 | männlich | Faber, Johannes Christopherus | Holländer | | | Archangel'sk |
| 65568 | 66488 | männlich | Faber, Julius | Deutschbalte | | 22.10.1818 Riga | |
| 16290 | 16920 | männlich | Faber, Karl / Karlov. | Deutscher | Offizier | | |
| 53325 | 54051 | männlich | Faber, Karl Friedrich | Deutscher | | | |
| 65569 | 66489 | männlich | Faber, Theodor | Deutschbalte | | Riga | |

Іл. 2. Від раздзела «Імянны спіс» («Namensliste») = базы дадзеных анлайн-картатэкі «Іншаземцы ў дарэвалюцыйнай Расіі»

радзе трэба паставіць знак «мінус» (NICHT-звязка). Пры гэтым словазлучэнні бяруцца ў двукоссе, уключаючы ўсе прабелы і коскі.

У цэлым працу з раздзеламі разглядаемага рэсурсу і пошук па ім трэба прызнаць даволі зручнымі. Картатэка лаканічна афармлена ў адзіным стылі без лішняй інфармацыі. Пошук па персаналіях можна ажыццяўляць, так бы мовіць, інтуітыўна, нават без ведання нямецкай мовы. Усе карткі афармлены аднастайна, у адзінай колеравай гаме, з вызначанай логікай размяшчэння звестак. Кожная група звестак вылучана ў блокі, а іх назва – кантрастным цёмна-чырвоным колерам. Афармленне картатэкі прыемнае для ўспрыняцця, выконвае таксама функцыі структуравання матэрыялу. Элементы кіравання знаходзяцца ў зручным месцы і дазваляюць без замінак вяртацца да ўдакладнення пошуку ці стварэння новага пошуку па базе.

Анлайн-картатэка цалкам прадстаўлена на нямецкай мове. Аднак пажадана, каб інтэрфейс быў афармлены і на іншых еўрапейскіх мовах, напрыклад, англійскай як найбольш універсальнай, што будзе садзейнічаць пашырэнню кола карыстальнікаў. Тым больш што асноўная інфармацыя сайта Інстытута даследа-

**Suchergebnisse**

Suche nach:
**Name:** *Hindenburg*
Anzeige der Ergebnisse 1 bis 8 von insgesamt insgesamt 8

Gehe zu Seite: 1

| ID | Vorname | Name | geboren | gestorben |
|---|---|---|---|---|
| 23495 | Elisabeth Rosalie | Hindenburg | 27.9.1873 Davidpol b. Minsk | 29.1.1934 Minsk |
| 23496 | Samuel / Danil. | Hindenburg | | |
| 23497 | Samuil Davidovič | Hindenburg | | |
| 23498 | Wilhelm / Vilgel'movič | Hindenburg | 0.0.1852 Minsk | 0.0.1907 Obeniany b. Wilna |
| 53189 | Rudolf Karl Ludw. | Cohen van Baren | 14.4.1831 | 14.4.1875 Sankt Petersburg |
| 57552 | Leopold Daniel / Vilgelmovič | Hindenburg | 21.4.1833 os; 3.5.1833 ns | 9.2.1897 os; 21.2.1897 ns Moskau |
| 57553 | Wilhelm Pastorius - im Original: 'Pastorius' 1834 / Danilovič | Hindenburg; von Hindenburg - im Original: (1834) | 0.0.1799 Minsk | 18.2.1877 os; 2.3.1877 ns - im Original: 84 J.! Minsk |
| 79607 | Wilhelm Karl | von Timroth | 19.7.1872 Pokrovkoe bei Pskov | 11.3.1942 Minsk |

Dauer der Datenbankabfrage: 0.359432935715 Sekunden

Іл. 3. Від выніку пошуку паводле прозвішча ў анлайн-картатэцы «Іншаземцы ў дарэвалюцыйнай Расіі» на прыкладзе «Гіндэнбург» («Hindenburg»)

**Suchergebnisse**

Suche nach:
**Ort:** *Minsk*
Anzeige der Ergebnisse 1 bis 100 von insgesamt insgesamt 304

Gehe zu Seite: 1 2 3 4

| ID | Vorname | Name | geboren | gestorben |
|---|---|---|---|---|
| 181 | Nikolai Karl Adolf / Ivanovič | Andersohn | 24.9.1845 Kullina, Sankt Jacoby | 9.3.1905 Narva |
| 182 | Walter Arthur Alexander | Anderson | 27.9.1885 os; 10.10.1885ns Minsk | 23.8.1962 Kiel |
| 183 | Oskar / Nikolaevič | Anderson | 2.8.1887ns? - im Original:ns? Minsk | 12.2.1960 München |
| 325 | Julius / Julian Julianovič | Bächly | 28.8.1856 | |
| 326 | Dmitrij Julievič | Bächly | | |
| 707 | Filipp Ernestov. | Baron Behr | 25.3.1861 | |
| 1121 | Robert August Karl / Andreevič | Bruttan | 3.10.1870 Dorpat | |
| 1257 | Eduard Ludwig / Christian | Bürger | 4.11.1864 Nurmhusen | |
| 1277 | Alexander / Vladimirovič | Buhrmann | 6.8.1872 os; 18.8.1872 ns | |
| 1335 | Michael Alexis / Fed | Burmeister | 28.9.1827 St. Pbg. | 26.8.1871 St. Pbg. |
| 1336 | Konstantin / Fillipovič | Burmeister | 9.11.1829 St. Pbg. | 10.11.1868 Moskau |
| 2169 | Paul / Michajlovič | von Bradke | 8.6.1837 os; 20.6.1837ns Elisavetgrad | |
| 2216 | Rudolf Richard | von Braunschweig | 7.10.1864 Weidenhof (Wolmar) | St. Pbg. |
| 2799 | Adolf / Ottonovič | Dannenberg | 0.0.1849 | |
| 2894 | Gustav Adolf / Fedorovič | Dellingshausen | 5.4.1771 Ksp. Carmel | |
| 3018 | Karl Christian / Karlovič | Dieberg | 5.1.1826 os; 17.1.1826 ns Reval | 14.11.1893 Minsk |
| 3084 | David / Egorovič | Dieterichs | | 24.10.1891 os; 5.11.1891ns Minsk |
| 3217 | Nikolai Wilhelm | Dobbert | 6.5.1839 os; 18.5.1839ns St. Pbg. | 17.4.1913 os; 30.4.1913ns Kovno |
| 3229 | Wilhelm Friedrich - im Original: Friedrich Wilhelm? | Döllen | 8.5.1855 Pullovo | |
| 3419 | Alexander Friedrich Gustav Leutsch / Fedorovič | von Dröbusch | 6.12.1782 Hapsal | 21.5.1856 os; 2.6.1856ns |
| 3471 | Sergej Aleksandrovič | Düsterloh | 6.9.1872 os; 18.9.1872 Putivl' | |
| 4066 | August / Ioganov. | Andresen | 0.0.1879 | |

Іл. 4. Від выніку пошуку паводле геаграфічнай назвы ў анлайн-картатэцы «Іншаземцы ў дарэвалюцыйнай Расіі» на прыкладзе «Мінск» («Minsk»)

вання Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы прадстаўлена на дзвюх мовах – нямецкай і англійскай.

Адваротная сувязь забяспечана толькі адрасам электроннай пошты, на які прапаноўваецца пісаць «па пытаннях, звязаных з кантэнтам». Зрэшты, на самім сайце Інстытута пазначана ўся неабходная інфармацыя для сувязі. Лічым важным падкрэсліць, што доступ да кантэнту картатэкі вольны і не патрабуе персанальнай рэгістрацыі.

Наяўнасць у «фармуляры» карткі («запісу даных») вялікай колькасці раздзелаў і палёў (у тым ліку спасылак на крыніцы), якія прадстаўляюць біяграфічныя і генеалагічныя звесткі аб персоне максімальна поўна, робіць анлайн-картатэку вельмі інфарматыўным рэсурсам з перспектывай яго шырокага акадэмічнага асваення, што, уласна кажучы, ужо і адбываецца.

Разглядаемы электронны рэсурс карысны, на наш погляд, як для асобных біяграфічных і генеалагічных даследаванняў (у тым ліку цягам напісання навуковых артыкулаў і дысертацый), так і для доўгатэрміновых навукова-даследчых праектаў. Даведачны характар наяўных у ім звестак вызначае неабходнасць звяртання да яго спецыялістаў пры складанні навукова-даведачнага апарату да розных выданняў (зборнікаў дакументаў, біяграфічных даведнікаў, энцыклапедый, манаграфій і г. д.). Найбольшую цікавасць картатэка мае для гісторыкаў, генеалогаў, архівістаў, бібліятэкараў.

Важна ўлічваць завершаны характар анлайн-картатэкі «Іншаземцы ў дарэвалюцыйнай Расіі». Яе змест не абнаўляецца і не прадугледжвае абнаўленняў, паколькі яна з’яўляецца поўным адлічбаваным варыянтам папяровай картатэкі прафесара Амбургера, якая зяўляецца гістарычна складзенай і непапаўняемай сукупнасцю даведачных матэрыялаў. Аднак разам з тым, абнадзейваюць і некаторыя глабальныя перспектывы ад распрацоўшчыкаў: «*...мы зацікаўлены,* – піша Байер-Тома, – *ва ўзаемадзеянні з партнёрамі, напрыклад, у вобласці стварэння метапошукавай сістэмы генеалагічнага ці навукова-гістарычнага характару. У межах доўгатэрміновага праекта плануецца ўключэнне базы даных Эрыка Амбургера ў геаграфічную інфармацыйную сістэму па Цэнтральнай, Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропе, якая грунтуецца ў асноўным на рэсурсах, што маюцца ў распараджэнні Навукова-даследчага інстытута Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы ў Рэгенсбургу і яго партнёраў. Такая інфармацыйная сістэма можа звязваць геаграфічныя даныя з асабістымі, таксама як і з гістарычнымі і эканамічнымі звесткамі, даваць спасылкі на літаратуру і адлічбаваныя матэрыялы. Гэта, несумненна, прадугледжвае сумесную дзейнасць партнёраў, асабліва калі рэсурсы знаходзяцца ў розных фондах і зборах»* [4, с. 56].

Існуючыя сёння анлайн-картатэкі адрозніваюцца па сваіх аб'ёме, афармленні і кантэнце, аднак усе яны з'яўляюцца дапаможнымі, а часта і незаменным рэсурсам пры правядзенні навукова-даследчай працы ў сферы біяграфікі.

Важным сегментам навуковага архіва прафесара Амбургера, завешчанага Інстытуту даследавання Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы, таксама з'яўляюцца складзеныя ім пакаленныя роспісы 2960 родаў замежнага паходжання ў Расійскай імперыі. *«Яны надрукаваны на пішучай машынцы на аркушах фармату А4 і акуратна ўкладзены ў празрыстыя папкі»* [4, с. 49]. Каштоўная генеалагічная крыніца была не толькі адсканіравана, але і перададзена ў выглядзе лічбавых вобразаў Нямецка-балтыйскаму генеалагічнаму таварыству (г. Дармштат, Германія), а ў 2013 г. – і Расійскай нацыянальнай бібліятэцы, дзе яна цяпер даступна для даследчыкаў у лакальнай інфармацыйнай сетцы [4, с. 50; 53, с. 22–23]. Справай будучыні павінна стаць пашырэнне доступу да гэтых пакаленных роспісаў шляхам публікацыі іх у Інтэрнэце [4, с. 50].

## Крыніцы і літаратура


1. 5 программ для построения семейного древа [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://projectlife24.ru/genealogy/5-programm-dlya-postroeniya-semejnogo-dreva.html. – Дата доступу: 26.08.2021.
2. Андреева, А. Н. Краеведческая база данных как источник биографической информации // Источники по биографике и генеалогии в фондах библиотек, архивов и музеев : материалы 7-й научно-практической конференции по информационным ресурсам петербурговедения, 12 марта 2014 г. / Центральная городская публичная библиотека им. В. В. Маяковского. – Санкт-Петербург : [б.и.] : 2014. – С. 86–90.
3. Ачкевич, А. Ю. Оцифровка как метод обеспечения широкого доступа к архивным документам / А. Ю. Ачкевич // Роль архивов в информационном обеспечении исторической науки: сборник статей / авт.-сост. Е. А. Воронцова; отв. ред. В. Ю. Афиани, Ю. А. Петров. – Москва : Этерна, 2017. – С. 605–609.
4. Байер-Тома, Г. База данных Эрика Амбургера : история, современное состояние, перспективы / Г. Байер-Тома // Выходцы из Германии и их российские потомки : сборник материалов конференции, состоявшейся 13–14 ноября 2012 г. и посвященной памяти профессора Э. Амбургера / науч. ред. И. В. Сахаров. – Санкт-Петербург : Президентская библиотека, 2015. – С. 46–56.
5. Беларусь в годы Первой мировой войны (1914–1918) : сборник документов / сост. В. В. Врублевский [и др.]; редкол. : В. И. Адамушко (пред.) [и др.]. – Минск : Беларусь, 2014. – 356 с.
6. Беляев, Л. А. Информационная система поиска для корпуса русских средневековых надгробий / Л. А. Беляев, Г. П. Беспалова // Русское сред-

невековое надгробие XIII–XVII века : материалы к своду / отв. ред. и сост. Л. А. Беляев. – Москва : Наука, 2006. – Вып. 1. – С. 301–307.

7. Бем, В. Принципы построения компьютерной информационно-поисковой системы «Петербургские немцы» / В. Бем // Немцы в Санкт-Петербурге (XVIII – XX века) : биографический аспект / сост. Т. А. Шрадер ; отв. ред. А. С. Мыльников и Ю. А. Петров. – Санкт-Петербург : МАЭ РАН, 2003. – Вып. I. – С. 8–9.
8. Бибиков, В. В. «Первая мировая война, 1914–1918 гг.» Проект Союза возрождения родословных традиций / В. В. Бибиков // Генеалогический вестник. – 2015. – Вып. 51. – С. 89–93.
9. Биографика // Государственная публичная историческая библиотека России [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://unis.shpl.ru/Pages/Search/Personalities/PersonalitiesSearch.aspx. – Дата доступу: 01.09.2021.
10. Богданов, А. Б. Проект реляционной базы данных «Врачи морского ведомства Российской Империи, 1762–1849 гг.» / А. Б. Богданов, В. В. Лапин, С. В. Хмельницкий // Источниковедческие и методологические проблемы биографических исследований : сборник материалов научно-практического семинара (Санкт-Петербург, 4–5 июня 2002 г.) / ред.-сост. Г. В. Калашников, А. И. Раздорский, Д. Н. Шилов. – Санкт-Петербург : Издательство Санкт-Петербургского университета, 2002. – С. 197–202.
11. Буланый, Н. Ю. Род Перетцов: материалы онлайн-лаборатории «Прожито» в изучении семейной истории / Н. Ю. Буланый // Актуальные проблемы источниковедения : Материалы VI Международной научно-практической конференции, Витебск, 23–24 апреля 2021 г. / редкол. : А. Н. Дулов (отв. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2021. – С. 34–38.
12. Бурцева, Е. 7 секретов интернет-поиска генеалогической информации / Е. Бурцева // Альманах ГенЭкспо. – 2020. – № 1. – С. 11–13.
13. Веригин, И. С. Новые сканеры для архивов. Разбираемся в моделях ЭларСкан С2, А1, А0 / И. С. Веригин // Отечественные архивы. – 2019. – № 5. – С. 93–96.
14. Войтович, М. Реализация принципов автоматического построения указателей по электронному тексту источника на материале переписей войска ВКЛ 16 в. / М. Войтович // Актуальныя пытанні вывучэння і выдання Метрыкі Вялікага княства Літоўскага : Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 11–12 лістапада 2003 г. / рэд. кал. : С. П. Віцязь і інш. – Мінск : Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2005. – С. 50–62.
15. Волков, С. В. Базы данных по персональному составу российского служилого сословия / С. В. Волков // Вестник архивиста. – 2006. – № 2–3. – С. 319–324.
16. Гарскова, И. М. Базы и банки данных в исторических исследованиях / И. М. Гарскова. – Москва : МГУ ; Göttingen : Max-Planck-Institut für Geschichte, [1994]. 215 с. – (Серия «Новые учебные пособия по историческим дисциплинам»).

17. Гарскова, И. М. О новой роли баз данных в исторических исследованиях / И. М. Гарскова // Вспомогательные исторические дисциплины в современном научном знании: Материалы XXVIII Международной научной конференции. Москва, 14–16 апреля 2016 г. / редкол. : Ю. Э. Шустова (отв. ред.) и др. – Москва : Аквилон, 2016. – С. 171–172.
18. Гарькуша, И. О. Биографические и генеалогические источники в фондах государственных архивов Санкт-Петербурга и их представление в сети интернет. Сегодняшние возможности. Завтрашние перспективы / И. О. Гарькуша // Источники по биографике и генеалогии в фондах библиотек, архивов и музеев : материалы 7-й научно-практической конференции по информационным ресурсам петербурговедения, 12 марта 2014 г. / Центральная городская публичная библиотека им. В. В. Маяковского. – Санкт-Петербург, 2014. – С. 48–53.
19. Горбачев, Г. Л. Применение информационных технологий для совершенствования справочного аппарата к документам по эвакуации польского населения с территории БССР в 1944–1947 гг. / Г. Л. Горбачев, И. В. Дударь, Ф. М. Сороговец // Новые информационные технологии в учебном процессе : Материалы научно-методической конференции, Минск, 15–16 ноября 1994 г. ; ред. кол. : В. П. Шмерко и др. – Минск : БГТУ, 1994. – С. 136–137.
20. Дзярновіч, А. Кніга № 28 Метрыкі ВКЛ на кампакт-дыску / А. Дзярновіч / Metriciana : Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага княства Літоўскага. – Мінск : Athenaeum – Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2001. – Т. 1 – С. 176–180.
21. Друзин, М. Научно-справочный аппарат РГИА и информатизация : проблемы, достижения, перспективы / М. Друзин // Альманах ГенЭкспо. – 2020. – № 1. – С. 185–188.
22. Елинская, М. Сканирование архивных геральдических источников и их цветная адаптация при помощи графических редакторов Adobe Photoshop / М. Елинская // Archives in the New Age. The Strategic Problems of the Automatization of Archives. Papers of the International Conference, Warsaw, September 28–29, 2001 / ed. by E. Rosowska – Warszawa : General Head Office of State Archives, the Open Society Archives, 2002. – S. 168–172.
23. Жертвы политического террора в СССР [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://base.memo.ru. – Дата доступу: 01.09.2021.
24. Жолнеркевич, Г. Создание и использование баз данных архивных источников по сфрагистике религиозных учреждений при помощи системы управления базами данных Microsoft Access / Г. Жолнеркевич // Archives in the New Age. The Strategic Problems of the Automatization of Archives. Papers of the International Conference, Warsaw, September 28–29, 2001 / ed. by E. Rosowska – Warszawa : General Head Office of State Archives, the Open Society Archives, 2002. – S. 162–167.
25. Иванов, А. С. Источнико-ориентированные базы данных в изучении локальной истории / А. С. Иванов // XI Zinātnisko lasījumu materiāli : Vēstures sekcija. 5. krājums / Daugavpils Pedagoģiskā universitāte. – Daugavpils : Saule, 2001. – Lpp. 37–42.

26. Иванов, А. С. Методологические проблемы создания базы данных для региональных исследований: (Пример Латгальского края) / А. С. Иванов // Новые информационные ресурсы и технологии в исторических исследованиях и образовании : сборник тезисов докладов и сообщений Всероссийской конференции. Подмосковье, «Боровое», 6–9 апреля 2000 г. – Москва, 2000. – С. 71–72.
27. Калтачэнка, А. Магчымасці інтэрнэт-рэсурсаў у працы з фамільнымі архівамі магнацкіх родаў Беларусі / А. Калтачэнка // Лёс фамільных скарбаў магнацкіх родаў Беларусі : зборнік матэрыялаў Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Лёс фамільных скарбаў магнацкіх родаў Беларусі» (Нясвіж, 10 лістапада 2020 г.) і Міжнароднага навуковага семінара «Крыпта князёў Радзівілаў у Нясвіжы : гісторыя, сучасны стан, даследаванні, перспектывы выкарыстання» (Нясвіж, 4 кастрычніка 2019 г.) / уклад. У. У. Караленак, С. М. Клімаў. – Нясвіж : Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж», 2020. – С. 161–180.
28. Клёсов, А. А. Общие принципы ДНК-генеалогии (новая редакция) / А. А. Клёсов // Вестник Российской Академии ДНК-генеалогии. – 2009. – Т. 2, № 7. – С. 1264–1330 [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://dna-academy.ru/wp-content/uploads/2_7_2009.pdf. – Дата доступу: 17.08.2021.
29. Копылова, О. Н. Справочно-поисковые средства Государственного архива Российской Федерации к документам по истории Российской Империи конца XIX – начала XX вв. и генеалогический поиск / О. Н. Копылова, Т. Н. Котлова // Генеалогический вестник. – 2017. – Вып. 58. – С. 78–98.
30. Кузнецов, И. Н. Развитие исторической генеалогии как фактор переориентации информационно-поисковых систем и научно-справочного аппарата архива (из опыта работы Государственного архива Вологодской области) / И. Н. Кузнецов, Н. А. Овчинникова // Роль архивов в информационном обеспечении исторической науки: сборник статей / авт.-сост. Е. А. Воронцова; отв. ред. В. Ю. Афиани, Ю. А. Петров. – Москва : Этерна, 2017. – С. 449–457.
31. Кунавин, К. С. База данных «Члены Государственного совета Российской империи второй половины XIX – начала XX века» как инструмент анализа и типизации политической элиты / К. С. Кунавин // Вспомогательные исторические дисциплины в современном научном знании: Материалы XXVIII Международной научной конференции. Москва, 14–16 апреля 2016 г. / редкол. : Ю. Э. Шустова (отв. ред.) и др. – Москва : Аквилон, 2016. – С. 319–321.
32. Лісейчыкаў, Д. В. Святар у беларускім соцыуме. Прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596–1839 гг. / Д. В. Лісейчыкаў. – Мінск : Беларусь, 2015. – 720 с.
33. Лицкевич, О. К проблеме создания электронного архива Метрики Великого княжества Литовского / О. Лицкевич // Актуальныя пытанні вывучэння і выдання Метрыкі Вялікага княства Літоўскага : Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 11–12 лістапа-

да 2003 г. / рэд. кал. : С. П. Віцязь і інш. – Мінск : Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2005. – С. 42–50.

34. Любовець, Н. І. Мемуари в епоху Digital Humanities (DH) : локальний вимір / Н. І. Любовець // Актуальные проблемы источниковедения : Материалы VI Международной научно-практической конференции, Витебск, 23–24 апреля 2021 г. / редкол. : А. Н. Дулов (отв. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2021. – С. 32–34.
35. Минские губернаторы, вице-губернаторы и губернские предводители дворянства (1793–1917) : биографический справочник / сост. Ю. Н. Снапковский ; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск : Беларусь, 2016. – 400 с.
36. Михеенок, Т. С. Автоматизированный научно-справочный аппарат к документам НИАБ : проблемы использования и пути улучшения / Т. С. Михеенок // Архіварыус : зборнік навуковых паведамленняў і артыкулаў. – Вып. 4 / рэдкал. : Ю. М. Бохан [і інш.]. – Мінск : БелНДІДАС, 2006. – С. 189–193.
37. Михеенок, Т. С. Информационные технологии в Национальном историческом архиве Беларуси : состояние, проблемы, перспективы развития / Т. С. Михеенок // Архівы Беларусі на рубяжы ХХ–ХХІ стст. : гісторыя, стан, перспектывы развіцця : Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 8–9 лютага 2000 г. – Мінск : БелНДІДАС, 2001. – С. 146–152.
38. Михеенок, Т. С. О достоверности выдаваемой информации [из баз данных, составленных на основании исторических документов генеалогического характера] / Т. С. Михеенок // Информационный бюллетень ассоциации «История и компьютер». – 2002. – № 30: Материалы VIII конференции (Санкт-Петербург, 26–29 июня 2002 г.). – С. 130–132.
39. Михеенок, Т. С. Современные возможности автоматизированного поиска по документам НИАБ / Т. С. Михеенок // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі : гісторыя і сучаснасць. Матэрыялы юбілейнай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 70-годдзю Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (Мінск, 8 ліпеня 2008 г.) / уклад. З. Л. Яцкевіч ; навук. рэд. У. І. Адамушка. – Мінск : НАРБ, 2008. – С. 212–218.
40. Мысякина, Е. Г. К вопросу о невозможности просмотра гражданами России документов архивов РФ на сайте familysearch.org / Е. Г. Мысякина // Генеалогический вестник. – 2016. – Вып. 52. – С. 59–66.
41. Назарова, В. Некрополистика на службе генеалогии / В. Назарова // Альманах ГенЭкспо. – 2020. – № 1. – С. 58–61.
42. Насевіч, В. Рэалізацыя праекта «Вернутыя імёны» як спроба стварэння адзінага банка даных па рэпрэсаваных на постсавецкай прасторы / В. Насевіч, І. Кашталян // Архивы и делопроизводство. – 2003. – № 4. – С. 105–109.
43. Нилогов, А. С. Генетика как дополнительный инструмент генеалогии / А. С. Нилогов // Генеалогический вестник. – 2017. – Вып. 54. – С. 85–91.
44. Носевич, В. Л. Программа «Родовод» : итоги и перспективы / В. Л. Носевич // М. М. Улашчык і праблемы беларускай гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археаграфіі (да 90-х угодкаў вучонага) : Матэрыялы навукова-

ковай канферэнцыі, Мінск, 14–15 лютага 1996 г. – Мінск : БелНДІДАС, 1997. – С. 250–255.

45. Петриченко, М. Б. Практические рекомендации по поиску генеалогической информации с помощью интернета / М. Б. Петриченко ; под. ред. С. Э. Экземплярова. – Москва : Старая Басманная, 2020. – 188 с.
46. Петровская, И. Ф. Биографика. Введение в науку и обозрение источников биографических сведений о деятелях России 1801–1917 годов / И. Ф. Петровская; 2-е изд., исправл. и доп. – Санкт-Петербург : Издательский дом «Петрополис», 2010. – 384 с.
47. Раздорский, А. И. Проект «Информационно-поисковая система «Государственные служащие екатерининской эпохи (по материалам «Адрес-календаря Российской Империи», 1765–1796 гг.)» / А. И. Раздорский // Источниковедческие и методологические проблемы биографических исследований : сборник материалов научно-практического семинара (Санкт-Петербург, 4–5 июня 2002 г.) / ред.-сост. Г. В. Калашников, А. И. Раздорский, Д. Н. Шилов. – Санкт-Петербург : Издательство Санкт-Петербургского университета, 2002. – С. 194–197.
48. Румянцев, А. Г. Информационно-поисковые системы ЦГИА СПб и их использование на современном этапе / А. Г. Румянцев // Генеалогический вестник. – 2019. – Вып. 60. – С. 60–69.
49. Румянцев, А. Г. Опыт использования Интернет-портала «Архивы СПб» в генеалогических исследованиях (на примере ЦГИА СПб) / А. Г. Румянцев // Источники по биографике и генеалогии в фондах библиотек, архивов и музеев : материалы 7-й научно-практической конференции по информационным ресурсам петербурговедения, 12 марта 2014 г. / Центральная городская публичная библиотека им. В. В. Маяковского. – Санкт-Петербург, 2014. – С. 53–57.
50. Русская армия в Первой мировой войне. Картотека проекта [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.grwar.ru/persons/list. – Дата доступу: 01.09.2021.
51. Рыкова, О. В. М. И. Смирнов и его компьютерный банк данных по генеалогии / О. В. Рыкова // Генеалогический вестник. – 2016. – Вып. 53. – С. 62–71.
52. Сахаров, И. В. Поколенные росписи и другие генеалогические материалы из собрания Эрика Амбургера, относящиеся к выходцам из-за границы и их российским потомкам / И. В. Сахаров [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://nlr.ru/nlr_visit/RA2418/pokolennyie-rospisi-erika-amburgera. – Дата доступу: 02.09.2021.
53. Сахаров, И. В. Эрик Амбургер (1907–2001) – выдающийся германский историк и генеалог / И. В. Сахаров // Выходцы из Германии и их российские потомки : сборник материалов конференции, состоявшейся 13–14 ноября 2012 г. и посвященной памяти профессора Э. Амбургера / науч. ред. И. В. Сахаров. – Санкт-Петербург : Президентская библиотека, 2015. – С. 19–26.
54. Семёнов, В. В. Базы в интернете : коллективный разум тебе в помощь / В. В. Семёнов // Генеалогия : Кодекс Семёнова / В. В. Семёнов. – Москва : Эдитус, 2018. – Разд. 2, гл. 3. – С. 61–65.

55. Силантьева, О. Ю. Электронная библиотека российских немцев : какой ей быть? / О. Ю. Силантьева // Немцы новой России : Проблемы и перспективы развития : материалы 2-й международной научно-практической конференции, Москва, 7–9 декабря 2009 г. / науч. ред. А. А. Герман. – Москва : МСНК-пресс, 2010. – С. 170–171.
56. Смалянчук, А. Ф. Раман Скірмунт (1868–1939) : жыццяпіс грамадзяніна Краю / А. Ф. Смалянчук. – Мінск : Выдавец Зміцер Колас, 2018. – 700 с.
57. Технические средства для генеалогии // Генеалогия и архивный поиск [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://myroots.ru/2012/05/22/tehnicheskie-sredstva-dlya-genealogii. – Дата доступу: 31.08.2021.
58. Тихонова, А. В. Использование научно-справочного аппарата архивов при поиске информации об иностранных подданных в Российской империи первой половины XIX века / А. В. Тихонова // Известия Смоленского государственного университета. – 2019. – № 2. – С. 218–230.
59. Тищенко, А. С. Создание и использование электронной базы данных «Именной указатель лиц, выезжающих за границу по данным паспортов» к фонду Национального исторического архива Беларуси «Канцелярия минского гражданского губернатора» / А. С. Тищенко // Архіварыус : зборнік навуковых паведамленняў і артыкулаў. – Вып. 13 / рэдкал. : Ю. М. Бохан (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : НГАБ, 2015. – С. 14–19.
60. Урублеўскі, В. В. Імянны паказальнік да комплексу спраў аб перасяленні ў Сібір з фонду Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі «Мінская губернская па сялянскіх справах прысутнасць» : актуальнасць, змест, стан распрацоўкі / В. В. Урублеўскі // Теоретические и практические проблемы документоведения и архивоведения : ретроспектива и современность : материалы международной научно-практической конференции, Минск, 2–3 декабря 2015 г. / редкол. : Э. М. Савицкий, С. В. Жумарь, П. А. Левчик и др. – Минск : БелНИИДАД, 2016. – С. 128–139.
61. Чертков, Д. Онлайн-картотека награжденных и погибших героев Первой мировой войны / Д. Чертков // The Village [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.the-village.ru/city/situation/259144-voina. – Дата доступу: 21.08.2021.
62. Чудакова, Е. Электронные базы данных в работе архива : витебский опыт / Е. Чудакова // Архивы и делопроизводство. – 2019. – № 3. – С. 72–78.
63. Шаповал-Конопацкая, А. Интернет-портал «Партизаны Беларуси» – уникальный источник информации и акт мемориализации / А. Шаповал-Конопацкая, С. Кулинок // Архивы и делопроизводство. – 2019. – № 3. – С. 64–71.
64. Шелестин, В. С чего начать? Сводный реестр онлайн-источников для генеалогического поиска / В. Шелестин // Альманах ГенЭкспо. – 2020. – № 1. – С. 280–289.
65. Шумков, А. А. Биографика и генеалогия : Вопрос соотношения / А. А. Шумков // Источниковедческие и методологические проблемы биографических исследований : сборник материалов научно-практического семинара (Санкт-Петербург, 4–5 июня 2002 г.) / ред.-сост. Г. В. Ка-

лашников, А. И. Раздорский, Д. Н. Шилов. – Санкт-Петербург : Издательство Санкт-Петербургского университета, 2002. – С. 58–64.

66. Экземпляров, С. О. База данных именных указателей в Интернете / С. О. Экземпляров // Источниковедческие и методологические проблемы биографических исследований : сборник материалов научно-практического семинара (Санкт-Петербург, 4–5 июня 2002 г.) / ред.-сост. Г. В. Калашников, А. И. Раздорский, Д. Н. Шилов. – Санкт-Петербург : Издательство Санкт-Петербургского университета, 2002. – С. 202–205.
67. Экземпляров, С. О. Компьютерная база данных «Гербовладельцы Российской империи» / С. О. Экземпляров // Известия Русского генеалогического общества. – 2017. – Вып. 32. – С. 345–347.
68. Экземпляров, С. О. Новые он-лайн базы данных о жителях Петербурга на Портале petergen.com / С. О. Экземпляров // Источники по биографике и генеалогии в фондах библиотек, архивов и музеев : материалы 7-й научно-практической конференции по информационным ресурсам петербурговедения, 12 марта 2014 г. / Центральная городская публичная библиотека им. В. В. Маяковского. – Санкт-Петербург, 2014. – С. 17–20.
69. Юмашева, Ю. Ю. Историко-биографические исследования : методы и базы данных / Ю. Ю. Юмашева // Уральский исторический вестник. – 2015. – № 4. – С. 146–152.
70. Юмашева, Ю. Ю. Тематические архивные базы данных и информационные ресурсы / Ю. Ю. Юмашева // Вестник Московского университета. – Серия 8: История. – 2016. – № 4. – С. 107–120.
71. Amburger, E. Deutsche in Staat, Wirtschaft und Gesellschaft Rußlands. Die Familie Amburger in St. Petersburg. 1770–1920 / E. Amburger. – Wiesbaden : Otto Harrassowitz, 1986. – 308 s. – (Veröffentlichungen des Osteuropa-Institutes München. Reihe Geschichte. – Bd. 54).
72. Amburger, E. Die Anwerbung ausländischer Fachkräfte für die Wirtschaft Rußlands vom 15. bis ins 19. Jahrhundert / E. Amburger. – Wiesbaden : Otto Harrassowitz, 1968. – 200 s.
73. Amburger, E. Die Mitglieder der Deutschen Akademie der Wissenschaften zu Berlin. 1700–1950 / E. Amburger. – Berlin : Akademie-Verlag, 1950. – 216 s.
74. Amburger, E. Die Pastoren der evangelischen Kirchen Rußlands vom Ende des 16. Jahrhunderts bis 1937. Ein biographisches Lexikon / E. Amburger. – [Lüneburg] : Institut Nordostdeutsches Kulturwerk; [Erlangen] : Martin Luther Verlag, 1998. – 566 s.
75. Amburger, E. Geschichte der Behördenorganisation Russlands von Peter dem Grossen bis 1917 / E. Amburger. – Leiden : Brill, 1966. – 654 s.
76. Amburger, E. Geschichte des Protestantismus in Russland / E. Amburger. – Stuttgart : Evangelisches Verlagswerk, 1961. – 210 s.
77. Amburger, E. Ingermanland. Eine junge Provinz Russlands im Wirkungsbereich der Residenz- und Weltstadt St. Petersburg-Leningrad / E. Amburger. – Köln; Wien : Böhlau, 1980. – I. und II. Teilband. – 1064 s.

78. Amburger, E. Wissenschaftspolitik in Mittel- und Osteuropa: wissenschaftliche Gesellschaften, Akademien und Hochschulen im 18. und beginnenden 19. Jahrhundert / E. Amburger. – Berlin : Camen, 1976. – 386 s.
79. Czyż, A. S. Podręcznik do inwentaryzacji polskich cmentarzy i nagrobków poza granicami kraju / A. S. Czyż, B. Gutowski ; red. : Z. Jurkowlaniec. – Warszawa : POLONIKA, 2020. – 108 s.
80. Datenbank zu Ausländern im vorrevolutionären Russland // Leibniz-Institut für Ost- und Südosteuropaforschung [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.ios-regensburg.de/informationsinfrastruktur/eservices/amburger-datenbank.html. – Дата доступу: 01.09.2021.
81. Erik-Amburger-Datenbank: Ausländer im vorrevolutionären Russland [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://amburger.ios-regensburg.de. – Дата доступу: 01.09.2021.
82. FamilyTreeDNA [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.familytreedna.com. – Дата доступу: 03.09.2021.
83. Leibniz-Institut für Ost- und Südosteuropaforschung [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.ios-regensburg.de. – Дата доступу: 01.09.2021.
84. MyHeritage [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.myheritage.com. – Дата доступу: 03.09.2021.
85. Owain. Billion Graves Review – Where Are Your Ancestors Buried! / Owain [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://thegenealogyguide.com/billion-graves-review-where-are-your-ancestors-buried. – Дата доступу: 07.08.2021.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 25.10.2021

# Гісторыя

*М. М. Кароль*

## Змена канфесійнай прыналежнасці як спосаб сацыяльнай адаптацыі ў беларускіх губернях у другой палове XIX ст. (паводле матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі)

Масавыя пераводы з каталіцызму ў праваслаўе з'яўляліся складовай часткай агульнай канфесійнай палітыкі Расійскай імперыі ў другой палове XIX ст. Звязаны яны былі як з задушэннем паўстання 1863–1864 гг., так і з ліквідацыяй уніі ў 1839 г. Большасць пераведзеных у другой палове XIX ст. складалі прадстаўнікі сялянскага насельніцтва, частка якога спакойна ўспрыняла змену канфесіі і прыняла праваслаўную абраднасць. Пры гэтым істотная колькасць былых católікоў (па некаторых рэгіёнах яна дасягала трэцяй часткі пераведзеных) намагалася вярнуцца ў каталіцызм і адмаўлялася прызнаваць сябе вернікамі праваслаўнай царквы, што цягнула за сабой шматгадовыя разбіральніцтвы і канфлікты.

Аднак існавала катэгорыя людзей, якіх можна акрэсліць як умоўна добраахвотных канвертытаў. Яны мянялі веравызнанне ў залежнасці ад жыццёвых абставін, розных знешніх перашкод. У некаторых выпадках такія канверсіі вынікалі з унутраных рэлігійных перакананняў.

Самы заўважны пласт людзей, якія адносна добраахвотна прынялі праваслаўе, складалі прадстаўнікі чыноўніцтва. У другой палове XIX ст. расійскія ўлады ажыццяўлялі рэарганізацыю дзяржаўнага апарату на тэрыторыі Беларусі. Віленскі генерал-губернатар Міхаіл Мураўёў разумеў ролю чыноўніцтва ў арганізацыі кіравання і надаваў вялікае значэнне фарміраванню і дзейнасці бюракратычнага апарату. Адным з важных крокаў у правядзенні такой палітыкі па фарміраванні чыноўніцкага апарату было пытанне замены мясцовых кадраў – звальненне мясцовых чыноўнікаў каталіцкага веравызнання з большасці пасад і

пазбаўленне магчымасці нароўні з рускімі чыноўнікамі прысутнічаць у «публічных месцах». Перавага асоб «рускага паходжання» (ураджэнцы велікарускіх губерняў праваслаўнага веравызнання) у адміністрацыі павінна была змяніць палітычнае, сацыяльнае і эканамічнае аблічча беларускіх губерняў. Чыноўнікі, якіх накіроўвалі ў беларускія губерні, атрымлівалі шэраг ільгот і надбавак. 10 лютага 1864 г. быў выдадзены ўказ, які прадугледжваў павелічэнне заробку ў два разы асобам «рускага паходжання» і ўраджэнцам так званых остзейскіх губерняў, якія займалі пасады інспектараў дзяржаўных вучылішчаў, дырэктараў і інспектараў гімназій, старшых і малодшых настаўнікаў і наглядчыкаў за вучнямі гімназій і іншых па Віленскай навучальнай акрузе [27, с. 103]. Такія ільготы маглі атрымаць не толькі чыноўнікі «рускага паходжання», але ў адпаведнасці з указам ад 7 красавіка 1864 г. чыноўнікі і выкладчыкі духоўнага ведамства праваслаўнага веравызнання мясцовага паходжання. Ім было прызначана выдаваць з кантрыбуцыйнага збору з памешчыцкіх маёнткаў грашовую дапамогу, але ў памеры не большым за 50% ад заробку [29, с. 6].

У 1850-я гг. доля службоўцаў-каталікоў у Мінскай губерні складала 65,6%, у Гродзенскай – 79,7%, а праваслаўных у адзначаных губернях налічвалася адпаведна 28,9% і 18%, (а таксама мусульман – 4% і 0,7%, пратэстантаў – 0,9% і 4% адпаведна) [32, с. 105]. Паўстанне 1863–1864 гг. прывяло да чысткі ў кадравым складзе чыноўніцтва і замены «асоб польскага паходжання каталіцкага веравызнання» на праваслаўных чыноўнікаў. У другой палове XIX ст. у Гродзенскай губерні з 1260 асоб, якія знаходзіліся на дзяржаўнай службе і былі дапушчаны да працы па найму ва ўстановах ведамстваў Міністэрстваў унутраных спраў, фінансаў і дзяржаўных маёмасцей, праваслаўныя складалі 61,8%, каталікі – 27,9% (адпаведна астатнія месцы займалі пратэстанты – 4,9%, мусульмане – 4,6%, іудзеі – 0,7%» [3, с. 48]. Як бачна, пасля паўстання адбыліся карэнныя змены ў канфесійным складзе чыноўнікаў.

Працэс замены каталіцкага чыноўніцтва на праваслаўнае зацягнуўся ў некаторых паветах да 1865 г. Паводле звестак з Вілейскага павета Віленскай губерні, у ім у 1864 г. колькасць праваслаўных чыноўнікаў і каталікоў была прыблізна аднолькавая: з 43 чыноўнікаў – 22 былі рымска-каталіцкага веравызнання і 19 праваслаўнага [16, с. 124–134]. Аднак ужо ў 1866 г. прапорцыі змяніліся на карысць праваслаўных: іх колькасць павялічылася да 38, а каталікоў, адпаведна, зменшылася да 8 асоб [17, с. 174–185]. У 1870-я гг. такая тэндэнцыя захоўвалася. У 1874 г. у Вілейскім павеце ў павятовых установах працаваў 31 чыноўнік праваслаўнага веравызнання, 3 – каталіцкага і па 2 прадстаўнікі лютэранства і іудаізму [17, с. 179–182].

Аналагічная сітуацыя склалася і ў іншых губернях: чыноўнікі каталіцкага веравызнання таксама масава замяняліся праваслаўнымі. У Навагрудскім павеце Мінскай губерні ў 1865 г. праваслаўных і каталіцкіх чыноўнікаў было 17 і 18 чалавек адпаведна [23, с. 223–233], а ў 1874 г. – 40 праваслаўных і 10 каталікоў [24, с. 126–137]. У Дрысенскім павеце Віцебскай губерні ў 1865 г. налічвалася па 16 прадстаўнікоў праваслаўнага і каталіцкага веравызнання [19, с. 86–88], а ўжо ў 1869 г. – 20 праваслаўных і 5 каталіцкіх [20, с. 90–93]. У Кобрынскім павеце Гродзенскай губерні на 1865 г. налічвалася 18 праваслаўных чыноўнікаў і 17 каталікоў [21, с. 124–130], а ў 1874 г. – 60 праваслаўных і 6 каталікоў [22, с. 130–142]. У Горацкім павеце Магілёўскай губерні ўжо ў 1865 г. працавалі 29 праваслаўных чыноўнікаў і толькі 13 каталікоў [25, с. 140–155], у 1871 г. колькасць праваслаўных павялічылася да 45 чалавек, а каталікоў зменшылася да 8 [26, с. 106–112].

Такім чынам, новая кадравая палітыка істотна паўплывала на рэлігійнае жыццё. Цяпер для паспяховай кар'ернай службы неабходна было належаць да «пануючага» веравызнання, што спрыяла пераходам з каталіцызму ў праваслаўе. Пры генерал-губернатары Аляксандры Патапаве, нягледзячы на яго адносна ліберальную палітыку ў дачыненні да каталіцкага насельніцтва, колькасць праваслаўнага чыноўніцтва на дзяржаўных пасадах па-ранейшаму складала пераважную большасць. Як бачна з вышэйпрыведзеных лічбаў, колькасць чыноўнікаў праваслаўнага веравызнання ў 1870-я гг. істотна перавышала колькасць каталікоў, нават улічваючы той факт, што амаль трэць з тых, хто быў запрошаны з цэнтральнарасійскіх губерняў на пасады падчас кіравання М. Мураўёва, была адпраўлена назад праз прафесійную непрыдатнасць: у беларуска-літоўскія губерні прыехалі больш за 3000 чыноўнікаў, з якіх каля 1000, як выявілася, не адпавядалі патрабаванням і былі адпраўлены на ранейшыя месцы службы [1, с. 27].

Тое значэнне, якое надавалася веравызнанню чыноўнікаў пасля задушэння паўстання 1863–1864 гг., адлюстроўвае і той факт, што ў губернскіх памятных кніжках да 1863 г. адсутнічалі пазнакі пра веравызнанне чыноўнікаў, але пасля 1863 г. яго пазначэнне з'яўляецца побач са звесткамі аб пасадзе і часе, з якога чыноўнік яе займаў.

З 1870-х гг. у некаторых выданнях памятных кніжак веравызнанне пазначалася толькі ў выпадках, калі яно адрознівалася ад праваслаўнага, што сведчыць пра павелічэнне працэнту праваслаўных сярод чыноўнікаў. Як ужо адзначалася, кадравая палітыка расійскіх улад была накіравана на павелічэнне колькасці праваслаўных службоўцаў. Забаранялася прымаць на адміністрацыйныя пасады асоб каталіцкага веравызнання, але, як бачна з памятных кніжак, гэта патрабаванне выконвалася недакладна. Нярэдка свае пасады захоўвалі чыноўнікі рымска-каталіцкага

веравызнання, якія знаходзіліся на пасадзе не адзін год або мелі медаль «за ўціхамірванне польскага мяцяжу 1863–1864 гг.» [30, с. 88]. У губернях, слаба закранутых паўстаннем, большасць мясцовых чыноўнікаў здолела застацца на сваіх пасадах [2, с. 64].

Варта прывесці некалькі найбольш яскравых прыкладаў канфесійных канверсій чыноўнікаў і вайскоўцаў. У сувязі са знаходжаннем на дзяржаўнай службе змяніў веравызнанне бацька знакамітага беларускага гісторыка Мітрафана Доўнар-Запольскага Віктар Марцінавіч Доўнар-Запольскі, які ў маленстве быў ахрышчаны ў Рэчыцкім касцёле [14, арк. 50]. У 1863–1870 гг. ён працаваў столаначальнікам Рэчыцкага паліцэйскага ўпраўлення і па стане на 1866 г. ужо належаў да праваслаўнага веравызнання [11, арк. 205–206].

Дваранін Ігнат-Аляксандр Журомскі немаўлём быў у 1823 г. ахрышчаны ў Ільянскім касцёле Вілейскага павета. Усё жыццё ён знаходзіўся на вайсковай службе і актыўна ўдзельнічаў у задушэнні паўстання 1863–1864 гг., у тым ліку атрымаў перамогу над атрадам паўстанцаў каля вёскі Падбярэззе Барысаўскага павета, за што быў узнагароджаны бронзавым медалём. Аднак пасля гэтага ён трапіў пад палкавы суд за ўтойванне грошай, забраных у паўстанцаў пасля бою (быў апраўданы за недаказанасцю), і замах шабляй на фельдфебеля. За апошняе яго прысудзілі да арышту на гаўптвахце на працягу 1 месяца. Хутчэй за ўсё, падчас судовага разбіральніцтва ён вырашыў змяніць веравызнанне не толькі ў сувязі з неспрыяльнай для католікаў грамадска-палітычнай сітуацыяй, якая склалася пасля паўстання, але і з намерам паказаць лаяльнасць да ўлад, што гіпатэтычна магло дазволіць яму пазбегнуць суровага пакарання [15, арк. 115 адв.].

Дваранін Леан Забела, ахрышчаны ў 1824 г. у Карпілаўскім касцёле, з маладосці працаваў на розных чыноўніцкіх пасадах. У 1864 г. ён быў звольнены з пасады старшага памочніка наглядчыка 6-й акругі піцейна-акцызнага ўпраўлення Мінскай губерні па «хатніх абставінах», а ў 1866 г., пасля прыняцця праваслаўя, зноў аказаўся на цывільнай службе – стаў сакратаром Бабруйскай гарадской думы [11, арк. 345–350].

4 жніўня 1864 г. у Мінскім кафедральным саборы далучыўся да праваслаўя Дамінік Урублеўскі, які ў праваслаўным хрышчэнні атрымаў імя Пётр. Ён нарадзіўся 2 жніўня 1842 г. у сям'і католікаў Тадэвуша і Уршулі Урублеўскіх і быў ахрышчаны ў Мінскім дамініканскім касцёле [12, арк. 105–106]. Спачатку ён па стане здароўя звольніўся з дзяржаўнай службы 5 жніўня 1861 г., але пасля прыняцця праваслаўя 17 лістапада 1866 г. быў уключаны ў штат канцылярыі мінскага губернатара [13, арк. 477–478].

Дваранін Мінскага павета Іпаліт Сямёнавіч Кернажыцкі ў 1871 г. падаў скаргу на арандатарку фальварка Лапаравічы Мінскага павета

ўдаву Леанору Мурашка. Ён меркаваў, што яна нацкавала сабаку на яго жонку з-за рэлігійнай нецярпімасці, бо сям'я Кернажыцкіх перайшла з каталіцызму ў праваслаўе. У скарзе сцвярджалася, што Л. Мурашка адкрыта выказвала агіду ў дачыненні да канвертытаў: *«людзей, якія не трымаюцца сваёй рэлігіі, а прынялі праваслаўе, то такіх людзей няхай сабакі рвуць»*. У сваю чаргу жонка І. С. Кернажыцкага была вымушана прыняць праваслаўе ў 1866 г., бо ён працаваў паліцэйскім, а былы мясцовы спраўнік Аляксандр Сараеў загадаў звальняць *«тых тысяцкіх і пяцісоцкіх, у каго жонкі каталічкі»* [9, арк. 1 адв.].

Праблемы з-за родзічаў-каталікоў узнікалі не толькі ў чыноўнікаў ці паліцэйскіх, але таксама і ў праваслаўных святароў і царкоўных служыцеляў. Так, жонка праваслаўнага святара Морацкай царквы Слуцкага павета Елісея Квяткоўскага Настасся была каталічкай. Муж пастаянна пераконваў яе прыняць праваслаўе, але яна адмаўлялася, спасылаючыся на тое, што яе бацька быў уніяцкім святаром, а маці належала да каталіцкага веравызнання (Настасся па традыцыі была ахрышчана ў канфесіі маці). Е. Квяткоўскага павінны былі ўзнагародзіць набедранікам за добрую службу, але ў дакументацыі Мінскай праваслаўнай кансісторыі адзначалася, што гэтага не адбудзецца, пакуль яго жонка застаецца каталічкай. Гэта аргументавалася тым, што калі ён не можа пераканаць жонку прыняць праваслаўе, значыць, не можа *«пераконваць у гэтай веры і добрай маралі сваіх прыхаджан»*, а таму не можа далей належаць да праваслаўнага кліру. 24 лістапада 1865 г. кансісторыя пастанавіла адхіліць Е. Квяткоўскага ад выканання святарскіх абавязкаў як нядобранадзейнага да моманту, пакуль яго жонка не прыме праваслаўе. У выніку Н. Квяткоўская перайшла ў праваслаўе 1 сакавіка 1866 г. [5, арк. 4].

Аналагічная сітуацыя склалася з дзячком Смілавіцкай царквы Анціповічам, жонка якога Апалонія была каталічкай. Паколькі яна адмаўлялася прымаць праваслаўе, было вырашана пакінуць пытанне выбару веравызнання на яе сумленні, але пры гэтым Свяцейшы Сінод указам ад 7 верасня 1865 г. загадаў царкоўнай адміністрацыі Мінскай епархіі вызначыць, ці можа Анціповіч заставацца ў складзе праваслаўнага кліру або належыць выключыць яго разам з сям'ёй з духоўнага звання, бо яго жонка ўпарта трымаецца каталіцызму [5, арк. 3 адв.].

Справа наяўнасці ў некаторых праваслаўных святароў (як правіла, былых уніятаў) жонак-каталічак знаходзілася ў полі зроку прадстаўнікоў вышэйшай царкоўнай адміністрацыі. У выпуску газеты «Віленскі веснік» ад 15 жніўня 1865 г. была выкладзена пазіцыя літоўскага праваслаўнага мітрапаліта Іосіфа (Сямашкі) па пытанні шлюбу праваслаўных святароў. Мітрапаліт прапаноўваў не дазваляць жаніцьбу святароў з дзяўчынамі неправаслаўнага веравызнання. Гэта прапанова, сярод іншага, была абумоўлена меркаваннем М. М. Мураўёва, які называў

«гаротным» становішча, калі жонкі святароў не маглі даць неабходнага першапачатковага праваслаўнага выхавання сваім дзецям. Прыняць аналагічныя меры генерал-губернатар прапаноўваў таксама полацкаму і віцебскаму архіепіскапу Васілю Лужынскаму [31, с. 27].

Відавочна, што выхаванню дзяцей надавалася вялікае значэнне. Да інструкцыі, выдадзенай 24 мая 1863 г., 1 студзеня 1864 г. было зроблена дапаўненне, якое прапісвала, што займацца навучаннем сялян, без атрымання папярэдняга дазволу на гэта, маглі толькі прадстаўнікі праваслаўнага святарства [31, с. 154]. Для дасягнення гэтай мэты быў выдадзены загад 25 мая 1864 г. пра арганізацыю 30 стыпендый па 300 рублёў у Дэрпцкім універсітэце для настаўнікаў, якія павінны быць накіраваны ў школы заходніх губерняў і праслужыць там шэсць гадоў. На дадзеную стыпендыю маглі прэтэндаваць толькі ўраджэнцы рускіх і остзейскіх губерняў праваслаўнага або пратэстанцкага веравызнання [27, с. 483]. Указ ад 23 мая 1866 г. прадугледжваў прызначэнне дадатковага заробку законавучыцелям праваслаўнага веравызнання на такіх жа правах, як і настаўнікам рускага паходжання [28, с. 593].

Змена веравызнання магла быць абумоўлена эканамічнымі абмежаваннямі, якія накладаліся на асоб польскага паходжання, напрыклад, неабходнасць выплачваць 10-працэнтны кантрыбуцыйны збор. Праваслаўнае духавенства неаднаразова прапаноўвала адмяніць кантрыбуцыйны збор з асоб, якія далучаліся да праваслаўя. Так, напрыклад, канцылярыст Мінскай духоўнай кансісторыі дваранін Францішак Урачэнскі прыняў праваслаўе разам са сваёй сям'ёй у 1869 г. і спадзяваўся, што паводле закона канверсія вызваліць яго ад падаткаў з маёнтка, якія павінны былі плаціць землеўладальнікі каталіцкага веравызнання. Аднак з яго не толькі не знялі падатак, але і налічылі штраф за неаплачаныя ў 1869–1871 гг. зборы. У сувязі з гэтым, акцэнтуючы ўвагу на прыняцці праваслаўя, Ф. Урачэнскі прасіў заступніцтва ў епіскапа мінскага і бабруйскага Аляксандра (Дабрыніна), каб той хадайнічаў аб яго справе перад мінскім губернатарам Уладзімірам Токаравым. У лістападзе 1869 г. ён ужо звяртаўся з просьбай зняць падатак да прыстава 2-га стана Мінскага павета, дзе знаходзіліся яго маёнтак Лісаўшчына і засценак Шчадроўшчына, але атрымаў адмову. Рашэннем мінскага губернатара ад 11 верасня 1870 г. Ф. Урачэнскі вызваляўся ад выплаты працэнтнага збору *«як далучаны ў мінулым годзе з усёй сям'ёй з лацінства ў праваслаўе»* [8, арк. 12]. У далейшым у прашэнні ад 14 сакавіка 1872 г. яго ўдава Эмілія Урачэнская таксама прасіла вызваліць ад кантрыбуцыйнага збору за 1869 г. маёнткі Лісаўшчына і Шчадроўшчына, і яе прашэнне было задаволена [8, арк. 35].

Такую ж просьбу на імя епіскапа ў 1870 г. падала прыхаджанка Смілавіцкай царквы Ігуменскага павета ўдава Пульхерыя Дарашкевіч (фар-

мальна яна была прыпісана да мяшчан г. Мінска). Да 1864 г. яна была каталічкай і, як усе каталікі, плаціла пазямельны кантрыбуцыйны збор за 1,5 валокі ўласнай зямлі. У 1865 г. П. Дарашкевіч разам з дзецьмі перайшла ў праваслаўе і спадзявалася на вызваленне ад збору, але гэтага не адбылося – яго працягвалі спаганяць. Таму яна хадайнічала *«вызваліць мяне ад выплаты кантрыбуцый і тым абавязаць нас, няшчасных, з ахвотай цвёрда пераканацца ў ісцінасці праваслаўнай царквы»* [8, арк. 14]. Яе просьба таксама была задаволена [8, арк. 15].

Такое ж вызваленне атрымала сялянка ваколіцы Застарынне Ігуменскага павета ўдава Юзэфа Лапкоўская, якая перайшла з каталіцызму ў праваслаўе ў 1866 г. і стала прыхаджанкай вышэйзгаданай Смілавіцкай царквы [8, арк. 18].

Прымалі праваслаўе і замежныя падданыя. З каталіцызму ў праваслаўе ў 1869 г. перайшлі шэсць чэхаў (падданыя Аўстрыйскай імперыі), якія раней былі парафіянамі Мазырскага касцёла. Пасля гэтага яны прыпісаліся да Даманавіцкай сельскай грамады Рэчыцкага павета [7, арк. 7]. Магчыма, як канверсія, так і прыпіска да грамады былі абумоўлены жаданнем набыць зямлю. Наяўнасць забароны на продаж зямлі «асобам польскага паходжання» магла паўплываць на намеры чэхаў, якіх – як каталікоў – маглі прыняць за «палякаў».

Аўстрыйскія падданыя (17 чалавек), якія пражывалі ў маёнтку Ліпава Рэчыцкага павета памешчыка Отана Горвата, вызнавалі каталіцызм і выявілі жаданне далучыцца да праваслаўя. У 1863 г. яны напісалі прашэнне, каб іх прынялі ў расійскае падданства і дазволілі пасяліцца на «пустуючых» казённых землях з выдачай «матэрыяльнай дапамогі». У якасці доказу лаяльнасці і трываласці памкненняў яны таксама выказалі жаданне перайсці з каталіцызму ў праваслаўе [4, арк. 1 адв.].

Усе вышэйзгаданыя прыклады сведчаць пра наяўнасць знешніх – пазаканфесійных і пазарэлігійных – фактараў, якія ўплывалі на пераходы з каталіцтва ў праваслаўе. Аднак нельга адмаўляць магчымасць змены канфесіі з выключна ўнутраных асабістых перакананняў. Так, дачка памерлага обер-афіцэра Юзафіна Аляксандраўна Міхалоўская перайшла з каталіцызму ў праваслаўе (пасля канверсіі ў праваслаўе яна атрымала імя Алімпіяда), і ў 1871 г. яна прасіла мінскага і бабруйскага епіскапа дазволіць ёй стаць паслушніцай Пінскага Варварынскага жаночага манастыра. Такое жаданне яна падмацоўвала нібыта пераследаваннем з боку каталікоў за адступніцтва ад заходняга абраду [10, 7 арк., арк. 1]. Аднак, у рэшце рэшт, у манастыр яна выпрашыла не ісці [10, арк. 7].

У Мінскім турэмным замку ўтрымлівалася незамужняя жанчына Антаніна (Антося) Вінцэнтаўна Гіржавід (каталічка). Прашэннем ад 3 ліпеня 1868 г. яна выказала жаданне прыняць праваслаўе, каб пасля выхаду з турмы застацца жыць у Мінску, бо яна сірата і *«не мае ніякага*

*прытулку ў сваёй грамадзе»*. Аднак духоўнік мінскага турэмнага замка святар Кіпрыян Мігай адзначаў, што А. Гіржавід адмовілася прымаць праваслаўе непасрэдна ў турме і збіралася гэта зрабіць ужо пасля вызвалення. Такія ўмовы, натуральна, не былі прыняты, і справа канверсіі на гэтым спынілася [6, арк. 4–5].

Такім чынам, прычыны пераходу з каталіцызму ў праваслаўе ў другой палове XIX ст. былі шчыльна звязаны з абставінамі грамадска-палітычнага і эканамічнага характару, якія склаліся ў выніку правядзення ў Беларусі новай палітыкі пасля задушэння паўстання 1863–1864 гг. У сітуацыі, калі працяг кар'еры залежаў, сярод іншага, ад веравызнання, некаторыя асобы выбіралі шлях канфесійнай канверсіі. Найперш гэта тычылася чыноўнікаў, якія нярэдка нанава ўладкоўваліся на службу ўжо пасля прыняцця праваслаўя або прымалі яго непасрэдна падчас знаходжання на службовай пасадзе. Таксама пераходзілі ў праваслаўе жонкі чыноўнікаў і асабліва праваслаўных святароў. У выпадку апошніх лічылася вельмі непажаданым, каб у іх сем'ях заставаліся вызнаўцы каталіцызму.

## Крыніцы і літаратура

1. Воспоминания П. А. Черевина. 1863–1865 / [предисл.: Ф. Рязановский]. – Кострома : Костромское науч. о-во по изучению местного края, 1920. – IV, 76 с.
2. Комзолова, А. А. Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ / А. А. Комзолова. – Москва : Наука, 2005. – 380 с.
3. Кузьмин, А. Д. Конфессиональный подход в кадровой политике царских властей на территории белорусских губерний в 1864–1914 гг. / А. Д. Кузьмин // Религия и общество – 10 : сб. науч. ст. [сб. материалов X Междунар. науч.-практ. конф. «Религия и общество», г. Могилев, 10–23 марта 2016 г.] / под общ. ред. В. В. Старостенко, О. В. Дьяченко. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2016. – С. 47–49.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 136 (Мінская духоўная праваслаўная кансісторыя). Воп. 1. Спр. 30942. – Справа аб далучэнні з рыма-каталіцкага веравызнання да праваслаўя 17 сямей аўстрыйскіх падданых. 01.10.1865–25.08.1871. – 16 арк.
5. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 31268. – Справа аб жонцы святара Морацкай царквы Слуцкага павета Елісея Квяткоўскага каталічцы Настассі, якая адмаўлялася прымаць праваслаўе. 27.10.1865–29.11.1865. – 4 арк.
6. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 32401. – Справа аб заяве Антаніны Гіржавід, якая ўтрымлівалася ў турэмным замку г. Мінска, аб жаданні далучыцца да праваслаўя. 12.07.1868–25.08.1871. – 5 арк.
7. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 32516. – Справа паводле рапарта святара Ліпаўскай царквы рэчыцкага протаіерэя Адама Фірасевіча аб далучэнні

да праваслаўя шасці чэхаў і прыняцці іх у падданства Расійскай імперыі. 16.11.1868–25.08.1871. – 8 арк.

8. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 33214. – Справа паводле рапарта святара Смілавіцкай царквы Ігуменскага павета Іаана Фалевіча аб вызваленні асоб, далучаных да праваслаўя, ад кантрыбуцыйнага збору. 21.02.1870–18.06.1872 – 36 арк.
9. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 33409. – Справа аб ганьбаванні праваслаўя жыхаркай Мінскага павета Леанорай Мурашка. 15.02.1871–07.10.1871. – 11 арк.
10. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 33443. – Справа аб далучэнні з каталіцызму да праваслаўя і аб прыняцці ў паслушніцы Пінскага Варварынскага жаночага манастыра дачкі памерлага обер-афіцэра Юзафіны Аляксандраўны Міхалоўскай. 27.02.1871–09.06.1871. – 7 арк.
11. НГАБ. – Ф. 299. Воп. 7. Спр. 242. – Фармулярныя спісы чыноўнікаў Мінскай губерні. 1866 г. – 482 арк.
12. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 598. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Урублеўскіх. – 545 арк.
13. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 606. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Урублеўскіх. – 525 арк.
14. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 962. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Доўнараў-Запольскіх. – 268 арк.
15. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 1104. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Журомскіх. – 141 арк.
16. Памятная книжка Виленской губернии на 1864 год / Виленский губернский статистический комитет. – Вильно, 1864. – 183 с.
17. Памятная книжка Виленской губернии на 1866 год / Виленский губернский статистический комитет. – Вильно, 1866. – 210 с.
18. Памятная книжка Виленской губернии на 1874 год / Виленский губернский статистический комитет. – Вильно, 1874. – 320 с.
19. Памятная книжка Витебской губернии на 1865 год / Витебский губернский статистический комитет. – Спб., 1865. – 310 с.
20. Памятная книжка Витебской губернии на 1869 год / Витебский губернский статистический комитет. – СПб., 1869. – 193 с.
21. Памятная книжка Гродненской губернии на 1865 год / Гродненский губернский статистический комитет. – Гродно, 1865. – 221 с.
22. Памятная книжка Гродненской губернии на 1874 год / Гродненский губернский статистический комитет. – Гродно, 1874. – 271 с.
23. Памятная книжка Минской губернии на 1865 год / Минский губернский Статистический комитет. – Минск : губернская типография, 1864. – 297 с.
24. Памятная книжка Минской губернии на 1874 год / Минский губернский статистический комитет. – Минск : Минская Губернская Типография, 1874. – 259 с.

25. Памятная книжка Могилевской губернии на 1865 год / Могилевский губернский статистический комитет. – Могилев : Типография Губернского Правления, 1865. – 283 с.
26. Памятная книжка Могилевской губернии на 1871 год / Могилевский губернский статистический комитет. – Могилев на Днепре: Типография Губернского Правления, 1871. – 177 с.
27. Полное собрание законов Российской империи (далей – ПСЗ РИ) : Собрание второе. – В 55 т. – Санкт-Петербург : Тип. II Отд-ния собств. Е. И. В. канцелярии, 1830–1885. – Т. 39. – Отделение первое. – 1867. – 976 с.
28. ПСЗ РИ : Собрание второе. – В 55 т. – Санкт-Петербург : Тип. II Отд-ния собств. Е. И. В. канцелярии, 1830–1885. – Т. 41. – Отделение первое. – 1868. – 1081 с.
29. ПСЗ РИ : Собрание второе. – В 55 т. – Санкт-Петербург : Тип. II Отд-ния собств. Е. И. В. канцелярии, 1830–1885. – Т. 44. – Отделение второе. – 1873. – 523 с.
30. Правила для раздачи бронзовой медали в память усмирения польского мятежа 1863–1864 годов // Литовские епархиальные ведомости. – 1865. – № 3. – С. 87–88.
31. Сборник распоряжений графа Михаила Николаевича Муравьева по усмирению польского мятежа в северо-западных губерниях, 1863–1864 / Сост. Н. Цылов. – Вильна : Тип. А. Киркора и бр. Ромм, 1866. – 383 с.
32. Токць, С. М. Дзяржаўны апарат царызму ў Беларусі ў 30–60-х гг. XIX ст. (структура, функцыі, чыноўніцкі корпус) : дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / С. М. Токць. – Мінск, 1997. – 150 с.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 14.09.2021

*М. Д. Макараў*

## Выкананне «падводнай» павіннасці мяшчанскай абшчынай і гарадскія «падводныя» землі Віцебска ў XV–XVII стст.[1]

У XV–XVI стст. насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага як вясковае, так і гарадское, выконвала разнастайныя камунікацыйныя павіннасці, якія магчыма падзяліць на тры групы: 1) «падводныя», звязаныя з выдачай вялікаму князю, яго ўраднікам, паслам і ган-

[1] Даследаванне выканана ў рамках рэалізацыі навуковага праекта «Антрапалогія дарогі: камунікацыя руска-беларускага пагранічча ў XIV–XVIII стст.» (Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў, № Г20Р-166).

цам, а таксама замежным пасольствам, якія перамяшчаліся па тэрыторыі краіны, верхавых коней ці (у некаторых выпадках) вазоў; 2) «стацыйныя», звязаныя з абавязкам забеспячэння згаданых у папярэднім пункце падарожных правіянтам і фуражом; 3) дарожныя і маставыя, звязаныя з правядзеннем работ па падтрыманні ў добрым тэхнічным стане паверхні найважнейшых дарог і мастоў.

Выключна важную ролю ў гэтай сістэме адыгрывала «падводная» служба. У канцы XV – першай палове XVI ст. яе ў натуральным выглядзе выконвалі практычна ўсе тэрытарыяльныя адзінкі ВКЛ, у тым ліку гарады і мястэчкі. На гэтым фоне некалькі інакш выглядала становішча, у якім знаходзілася мяшчанская абшчына Віцебска. Дзякуючы таму, што горад як калектыўная асоба валодаў нададзенымі яму вялікімі князямі літоўскімі «падводнымі» землямі, насельніцтва якіх пастаўляла коней для забеспячэння камунікацыйных патрэб дзяржаўнай адміністрацыі, ганцоў і паслоў, самі мяшчане былі вызвалены ад нясення гэтай павіннасці. Склалася цікавая сітуацыя, калі мяшчанская абшчына фактычна выконвала «падводную» службу, а самі віцебскія мяшчане, з якіх яна складалася – не. Варта паспрабаваць прасачыць гісторыю «падводных» зямель Віцебска, якія запэўнілі яму такую спецыфіку.

Спачатку неабходна высветліць, калі і кім з вялікіх князёў літоўскіх «падводныя» землі былі нададзены мяшчанскай абшчыне Віцебска. Адказ на гэта пытанне магчыма знайсці ў пацвярджальным прывілеі Жыгімонта III Вазы віцебскім мяшчанам ад 8 сакавіка 1623 г. аб замене фізічнай камунікацыйнай павіннасці са згаданага комплексу нерухомасці грашовым падаткам. Гэты дакумент утрымлівае пераказ прывілея Жыгімонта Аўгуста тым жа атрымальнікам па тым жа пытанні ад 3 красавіка 1558 г., у якім гаворыцца, што *«тые земъли подводные, люди оселые кгрунъты зо въсими прыналежъностями»* віцебскім мяшчанам на вечныя часы надалі *«светобливоя паметь Жыкгимонт, великий княз, и их милости короли польские светобливое памети Алекъсанъдеръ и Казимеръ»* [13, арк. 33]. Такім чынам, магчыма меркаваць, што наданне Віцебску «падводных» зямель упершыню адбылося ў гады панавання вялікага князя літоўскага Жыгімонта Кейстутавіча (1432–1440). Храналагічны прамежак, калі адбылася падзея, магчыма звузіць яшчэ больш, бо гэта магло адбыцца толькі ў перыяд паміж летам 1436 г., калі згаданы манарх у ходзе дынастычнай вайны 1432–1438 гг. у ВКЛ здолеў падпарадкаваць сабе Віцебск, і 20 сакавіка 1440 г., калі ён быў забіты [15, с. 416, 470]. Немагчыма выключаць, што перадача «падводных» зямель мяшчанам была адным з пунктаў верагоднага пагаднення паміж віцяблянамі і Жыгімонтам Кейстутавічам, паводле ўмоў якой першыя адмовіліся ад падтрымкі Свідрыгайлы і прызналі ўладу апошняга.

Неабходна адзначыць, што пры капіраванні тэксту прывілея караля Жыгімонта III Вазы ад 8 сакавіка 1623 г. у склад першай Кнігі прывілеяў Віцебска (створана ў 1733–1735 гг. [11, с. 44–60]) яго найбольш важны для датавання надання фрагмент быў моцна зменены недастаткова кваліфікаванымі перапісчыкамі і набыў наступную форму: «святая памяць Жыгімонт, вялікі князь літоўскі, кароль польскі, святой памяці Аляксандр і Казімір» («swetobliwaia pamiat Żyghimont, welikiy kniaz litowskiy, korol polskiy, swetobliwoie pameti Alexander y Kazimer») [3, арк. 28 адв.]. Магчыма, перапісчыкі проста не ведалі пра існаванне Жыгімонта Кейстутавіча, таму ў адпаведнасці са сваімі гістарычнымі ўяўленнямі звязалі згадку пра яго з добра вядомым ім Жыгімонтам Старым. У такім выглядзе дакумент у канцы XIX ст. і быў уведзены ў навуковы ўжытак Аляксеем Сапуновым [4, с. 102–104]. У першай палове 1730-х гг. арыгінал прывілея Жыгімонта Аўгуста віцебскім мяшчанам ад 3 красавіка 1558 г., несумненна, захоўваўся ў Віцебскай ратушы ў «скрыні» прывілеяў [3, арк. 1]. Дзе ён знаходзіцца ў цяперашні час, невядома. Пошукі копіі гэтага дакумента ў кнігах Літоўскай Метрыкі не далі станоўчага выніку.

Другі аспект пытання пра датаванне надання «падводных» зямель менавіта мяшчанам звязаны з праблемай храналогіі выдзялення мяшчан як асобнай саслоўнай групы з масы свабоднага насельніцтва Віцебшчыны. Іншымі словамі, на момант надання адрасаванага ёй прывілея мяшчанская абшчына ўжо павінна была характарызавацца пэўнай суб’ектнасцю. Сам тэрмін «мяшчане» пранік на тэрыторыю Беларускага Падзвіння ў пачатку 1430-х гг. у выніку ўплыву тэрміналогіі, што выкарыстоўвалася на захадзе ВКЛ, на лексіку ўсходніх рэгіёнаў дзяржавы. Першапачаткова ён абазначаў купецтва буйных гарадоў, але ў хуткім часе ахапіў таксама і іншыя катэгорыі гандлёва-рамеснага насельніцтва. У тэксце віцебскага земскага прывілея, які набыў свой канчатковы выгляд у 1440–1447 гг., мяшчане Віцебска як асобная саслоўная група згадваюцца неаднаразова [7, с. 63–64, 179–181]. У XV – першай палове XVI ст. віцебскія мяшчане з’яўляліся аднымі з атрымальнікаў гэтага дакумента і разам з мясцовымі князямі, баярамі і слугамі карысталіся адзіным для ўсіх катэгорый свабоднага насельніцтва Віцебшчыны лакальным земскім правам. Першыя надзейныя звесткі пра існаванне асобных мяшчанскіх улад (войтаўства) як паказчыка суб’ектнасці гэтай групы адносяцца да сярэдзіны 1480-х гг. [8, с. 157–158], аднак немагчыма пераканана сцвярджаць, што яны не існавалі тут раней. Такім чынам, датаванне велікакняжацкага надання «падводных» зямель 1436–1440 гг. хоць і звязвае яго з самым раннім этапам фарміравання мяшчанскай абшчыны Віцебска, але не стварае яўнай супярэчнасці.

У тэксце віцебскага земскага прывілея (канчаткова сфарміраваўся не пазней за 1447 г.), што адрасаваўся, сярод іншага, мяшчанам, прысутнічала пастанова, якой вярхоўныя ўлады вызвалялі гарадское насельніцтва Віцебска ад «падводнай» павіннасці: *«А и в подводы коней в городских людей и в поселских путных не брати»* [7, с. 147, 179]. Менавіта пры дапамозе гэтай нормы віцебскія мяшчане ў ліпені 1549 г. адстойвалі сваю свабоду ад такой службы на судовым працэсе супраць «падводнікаў» (падрабязней гл. ніжэй) [12, с. 111–112], і магчыма канстатаваць, што ў выпадку Віцебска гэтая норма дзейнічала на практыцы. Цікава, аднак, што пры наяўнасці вельмі падобнай пастановы ў складзе выключна блізкага віцебскаму паводле формы і зместу полацкага земскага прывілея (*«А въ подводы намъ конеи в полочанъ не брати, ни въ поселскихъ путъниковъ, ни въ сябровъ городских»* [16, с. 654]), у Полацку яна не запэўнівала насельніцтву горада падобнай вольнасці. У XV – пачатку XVI ст. полацкія мяшчане павінны былі даваць коней *«въ подводы»* паслам і ганцам: да 7 кастрычніка 1498 г. без усялякіх абмежаванняў, а пасля ўвядзення магдэбургскага права – толькі ў выпадках, *«коли увидять подводныи лист»*, запячатаны велікакняжацкім *«сыкгнетом»* [26, s. 184–185].

У канцы XV – першай палове XVI ст. віцебскія гарадскія «падводнікі» і «падводныя» землі неаднаразова траплялі ў поле зроку судоў вялікіх князёў літоўскіх і іх віцебскіх наместнікаў. Варта прывесці матэрыялы некаторых выяўленых судовых працэсаў, каб мець магчымасць выкарыстаць іх далей для пацвярджэння выказаных меркаванняў.

У канцы сакавіка – першай палове красавіка 1495 г. у Вільні знаходзілася дэлегацыя віцебскіх мяшчан, у склад якой уваходзілі таксама прадстаўнікі «падводных» людзей. Гэтыя віцябляне ўдзельнічалі ў некалькіх працэсах, што разглядаліся судом вялікага князя літоўскага Аляксандра Ягелончыка. Першая з разгледжаных тады манархам спраў мела дастаткова даўнюю гісторыю і распачалася яшчэ пры віцебскім наместніку Іване Юр’евічы Заслаўскім (прызначаны на пасаду прыблізна ў 1484 г. і заставаўся на ёй да часу не пазней за 1486 г. [25, s. 587–588]), калі віцебскія кажамякі *«Иванъ Зобейчинъ а Семенъ Тимошковичъ, и съ своими товарыши»* паскардзіліся папярэдняму вялікаму князю літоўскаму Казіміру *«на мещанъ витебских, подводныхъ людей»*, што тыя спрабавалі прымусіць іх выконваць камунікацыйныя павіннасці горада разам з імі (*«ихъ приискивали къ собе въ подъводу»*). Вялікі князь даручыў згаданаму віцебскаму наместніку на месцы разгледзець справу і высветліць у войта і *«старыхъ»* мяшчан, ці выконвалі згаданыя кажамякі «падводную» службу раней. Войт Івашка і мяшчане паведамілі наместніку і баярам, што раней яны не мелі такіх абавязкаў, таму кажа-

мякі выйгралі працэс і атрымалі ад гаспадарскага намесніка адпаведны *«листъ судовый»*.

Праз пэўны час віцебскія *«люди подводныи»* ізноў паспрабавалі прымусіць кажамякаў удзельнічаць у выкананні падводнай павіннасці і паскардзіліся на іх ужо Аляксандру Ягелончыку. Новы вялікі князь запытаў войта Івашку, які на той момант знаходзіўся пры ім, пра іх абавязкі, але войт рашуча адмовіўся ад таго, што ўвогуле ўдзельнічаў у даўнім працэсе *(«при томъ суду не былъ, а ни того светчилъ»*). На падставе яго слоў манарх ануляваў рашэнне былога віцебскага намесніка і загадаў кажамякам выконваць падводную павіннасць разам з асобамі, якія на іх скардзіліся. Тады І. Ю. Заслаўскі напісаў гаспадару, што разглядаў тую справу не адзін, а ў прысутнасці масы сведкаў, і што войт Івашка, несумненна, удзельнічаў у працэсе. Віцебскія баяры і мяшчане, якія прысутнічалі на тым пасяджэнні суда, таксама пацвердзілі словы былога намесніка. Пад цяжарам доказаў войт Івашка быў вымушаны прызнаць, што ў папярэднім выпадку сказаў гаспадару няпраўду. 31 сакавіка 1495 г. Аляксандр Ягелончык канчаткова прызнаў праўду за кажамякамі і загадаў ім выконваць толькі тую службу, *«што и передъ тымъ они на замокъ нашъ служивали»*. Само ж *«кривое сведецство»* войта, за якое ён быў пакараны, магчыма патлумачыць, хіба што, жаданнем аблегчыць жыццё шчыльна звязаным з мяшчанскай абшчынай «падводнікам» [1, с. 67–68; 17, стб. 589–591].

Вынікі разгляду Аляксандрам Ягелончыкам другой справы з удзелам віцебскіх «цяглых» людзей, якія выконвалі «падводную» службу, знайшлі адлюстраванне ў велікакняжацкім лісце віцебскаму намесніку Міхаілу Іванавічу Заслаўскаму ад 11 красавіка 1495 г. «Падводнікі», якія скардзіліся на дзеянні намесніка, названы ў дакуменце людзьмі «цяглымі». Аднак паколькі іх скарга была пададзена манарху ў кантэксце агульнай петыцыі віцебскіх мяшчан, магчыма меркаваць, што размова ідзе менавіта пра насельніцтва гарадскіх «падводных» зямель. *«Люди тяглые»* скардзіліся на намесніка за тое, што ён, калі сам ехаў у сталіцу дзяржавы ці адпраўляў туды сваіх слуг, у выпадку стомленасці коней загадваў неадкладна мяняць іх. Таксама віцебскія «падводнікі» былі незадаволены тым, што М. І. Заслаўскі прымушаў іх суправаджаць яго да самай Вільні, а падчас знаходжання там не адпускаў дамоў. Як яны даказвалі, пры папярэдніх намесніках яны абслугоўвалі іх шлях з Віцебска ў сталіцу толькі да Барысава, дзе замяняліся на мясцовых выканаўцаў той жа павіннасці. Аляксандр Ягелончык задаволіў, прынамсі, другую частку скаргі падданых і сваім лістом загадаў віцебскаму намесніку *«подводы ихъ (...) обменивати тамъ, где будуть первей того мениваны»* [2, с. 150–151; 17, стб. 593–596].

Захавалася яшчэ адна судовая справа часоў Аляксандра Ягелончыка, у якой размова, па ўсёй верагоднасці, таксама ідзе пра віцебскіх «падводнікаў», хоць у дакуменце яны так не называюцца. У самым пачатку панавання гэтага гаспадара (другая палова 1492 г. – першая палова 1494 г.) да яго звярнуўся віцебскі мешчанін Даніла Логвінавіч са скаргай на тое, *«штожъ издавна дедъ его и отецъ службу путную конемъ служивали; ино какъ отецъ его привбожалъ, и подвойские витебские кривду отцу его вделали и новину увели, привернули его въ службу тяглую и въ подводу съ тяглыми людьми»*. Аляксандр скіраваў справу да віцебскага намесніка М. І. Заслаўскага, каб той разгледзеў яе акалічнасці на месцы. Апошні апытаў *«старыхъ мещанъ витебскихъ»*, высветліў *«штожъ дедъ ани отецъ»* Данилы *«тяглую службу не служивали»* і выдаў яму свой судовы *«листъ»* [1, с. 49–50]. 16 ліпеня 1494 г. Даніла Логвінавіч з гэтым дакументам яшчэ раз з'явіўся да вялікага князя ў Трокі. Разам з ім туды прыбылі *«люди витебские тяглые на имя Трохимъ, Андрей а Гридко и товарищи ихъ»*, якія *«иншыхъ людей къ собе въ тотъ часъ приискивали въ тяглую службу»*, а Данілу *«вызволили съ того»* перад гаспадаром. Аляксандр Ягелончык загадаў апошняму *«службу путную конемъ служить по давному»* і праінфармаваў пра сваё рашэнне віцебскага намесніка [1, с. 49–50].

1 лютага 1539 г. *«люди господарские витебъские подводные на имя Карпъ, десятъникъ, Отрохимъ Грибовъ, Пашъко Боборика, Демъянъ Кропивинъ з ынъшыми попълечъники своими»* скардзіліся ў судзе віцебскага ваяводы Мацея Войнахавіча Клочкі на віцебскага мешчаніна *«Хроля Мануилова сына Грибова»* і *«приискивали его к собе у подводную службу»*. Згаданыя «падводнікі» паведамілі М. В. Клочку, што *«дед и отецъ»* Хрола *«здавъна посполъ с нами тую службу подводную служивали и коня под послы и гонъцы даивали, а онъ с нами тое службы не служит»*, у сувязі з чым прасілі гаспадарскага ўрадніка прымусіць апанента выконваць свае абавязкі. Выкліканы на суд ваяводы Хрол адказаў, што ні яго дзед (якога ён не памятаў) і бацька, ні ён сам у мінулым не выконвалі падводную службу, і што ён не трымаў *«земъли подводное никоторое под собою, с чего бы мела служба тая быти»*. Абвінавачаны таксама дадаў, што меў у сваёй уласнасці землі, занятыя домам і дваром сям'і, з якіх ён, як і абодва яго продкі па мужчынскай лініі, выконваў *«поспол з мещаны службу панъцерную»* (вайсковую). Ваявода папрасіў бок абвінавачання пацвердзіць свае тэзісы вартымі даверу сведчаннямі, аднак віцебскія «падводнікі» былі не ў стане зрабіць гэта і толькі дадаткова паведамілі, што некалі дзед Хрола *«Илья Грибовъ»*, не жадаючы *«тое службы самъ с нами служити»*, прадаў свой надзел віцябляніну Азарку Капусту, пасля чаго разам з сынам перастаў выконваць падводную службу. Абвінавачаны Хрол адказаў на гэта, што раней ужо судзіўся

з «падводнікамі» перад намеснікам віцебскага ваяводы Клімам Фёдаравічам і *«перед паны бояры земъли Витебъское, и воитомъ, и мещаны»*, і тады выйграў працэс менавіта на той падставе, што А. Капуста замяніў сабой на службе яго дзеда. Выслухаўшы довады бакоў ваявода М. В. Клочка прызнаў довады *«Хрола Мануилова»* справядлівымі, зняў з яго абвінавачанні, а «падводнікам» рэкамендаваў судзіцца з нашчадкамі А. Капусты. Для праблематыкі дадзенага даследавання істотна, што адным з удзельнікаў разгледжанага вышэй судовага пасяджэння быў віцебскі войт Іван Грыгор'евіч Крупеніч [19, с. 220–222].

20 красавіка 1539 г. *«люди господарскии витебъские подводные»* (у склад іх групы ўвайшлі *«Карпъ, десятъникъ, а Пашъко Боборика, а Отрохимъ Грибовъ, а Дракуля, а Ольфер Плешивъцовъ»* і шэраг іншых не названых у дакуменце асоб) ізноў звярнуліся ў суд віцебскага ваяводы М. В. Клочкі. На гэты раз яны намагаліся *«приискивать» «к собе у подводную службу»* віцебскага каваля Сахона Коненава, які не жадаў яе выконваць. Віцебскія «падводнікі» паведамілі велікакняжацкаму намесніку, што згаданы Сахон *«есть чоловекъ подводныи»* і што *«дед и отецъ его посполъ»* з імі *«службу подводную служивалъ»*. Саму ж службу разам з нерухомай маёмасцю, з якой яна выконвалася, дзед Сахона *«небожчикъ Озарко»* нібыта выкупіў за *«два рубли грошеи широких»* у іх *«поплечъничъка»*, *«у Мануила, у деда Хролова Нелидова»*, вызваліўшы тым самым апошняга ад яе нясення. Сахон запярэчыў гэтаму і паведаміў М. В. Клочку, што ён і яго продкі па бацькоўскай лініі – *«огородники звечъные витебъские, а не подводные люди»*. Паводле словаў абвінавачанага, сам ён саступіў *«отъчызну свою» «огородницъкую»* сваім сваякам і ўзяў *«ковальскую службу»*, але *«подводное службы»* ні ён, ні яго блізкія *«николи не служивали»*. Ваявода ізноў папрасіў «падводнікаў» пацвердзіць свае словы пераканаўчымі сведчаннямі, але яны і на гэты раз не здолелі зрабіць гэтага. Сахон жа прывёў на судовае пасяджэнне цэлы шэраг сваякоў-агароднікаў, якія пацвердзілі тое, што ён раней распавёў пра свой жыццёвы шлях. Пасля агучвання рэплік апошніх абвінавачаны быў цалкам апраўданы ваяводам [19, с. 213–214].

7 ліпеня 1549 г. *«подводники витебъские Еремеи Ивановичъ Мороз а Олифер Семеновичъ Солоха, а Ширко Плешивец а Иванъ Кощеевъ а Сергеи Дрокула и з ынъшыми поплечники своими»* скардзіліся перад судом віцебскага ваяводы Станіслава Пятровіча Кішкі на *«воита витебъского Гришу Гутора и на всих мещанъ господарьских витебских»*. Яны былі востра незадаволены тым, што войт і мяшчане *«велели»* ў іх *«взяти десятъ конеи у подводы под посла его милости господарьского пана Анътонея Мора»*, у той час, калі, на думку бока абвінавачання, *«таковые подводы»* мяшчане *«сами з места колко будеть потреба винъни давати»*. Сваю ж павіннасць Ерамей Мароз і яго супольнікі акрэслілі

так: *«мы под гонъца только одну подводу а проводника даем»*. Войт і мяшчане рашуча запярэчылі «падводнікам» і адказалі ім наступным чынам: *«мы николи под посла подводъ не даивали и тепер не даем и давати не будем, бо вы сами колько васъ есть а иле потреба будеть, то есте винъни под посла давати»*. Тады ваявода папрасіў ініцыятараў судовага працэсу пацвердзіць слушнасць іх пазіцыі пры дапамозе дакументаў ці сведкаў, але «падводнікі» ніякага «доводу» прывесці не здолелі. Мяшчане ж бараніліся пры дапамозе віцебскага земскага прывілея, у тэксце якога прысутнічала разгледжаная вышэй гарантыя віцяблянам з боку вярхоўных улад дзяржавы *«у городских людеи и в посельских путных конеи в подводы не брати»*. На гэтай падставе ваявода прызнаў довады мяшчан справядлівымі, канстатаваў, што яны не павінны выконваць падводную службу, і выдаў ім свой *«листъ судовый»*. 29 лістапада 1551 г. прысуд С. П. Кішкі быў пацверджаны каралём Жыгімонтам Аўгустам. Паводле пастаноў складзенага з гэтай нагоды каралеўскага прывілея, віцебскія мяшчане былі абвешчаны вольнымі ад выканання камунікацыйных павіннасцей, а віцебскія «падводнікі» не павінны былі больш *«их ку тымъ подводамъ прытягивати»* [12, с. 111–112].

Прыведзеныя матэрыялы дазваляюць зрабіць наступныя высновы. Службе «падводнікаў» з адпаведных зямель, што належалі мяшчанскай абшчыне Віцебска, была ўласціва высокая ступень спецыялізацыі. Для насельніцтва гэтых зямель, якое пастаўляла падводы і праваднікоў для камунікацыйных патрэб мясцовых гаспадарскіх намеснікаў (1495 г.), велікакняжацкіх ганцоў і паслоў (1539 і 1549 гг.), яна была адзінай службай альбо, прынамсі, абсалютнай дамінантай у сістэме павіннасцей. Вельмі падобна, што да перадачы «падводных» зямель мяшчанам іх насельніцтва ўжо працяглы час выконвала тую ж самую службу, але было падпарадкавана непасрэдна віцебскай замкавай адміністрацыі.

Служба накладалася на ўвесь комплекс гарадскіх «падводных» зямель як адзінае цэлае ў неабходным уладам памеры і ўжо на больш нізкім узроўні ў кожным канкрэтным выпадку дзялілася паміж гаспадарамі двароў. Асобныя «падводнікі» выконвалі сваю службу з дакладна вызначаных зямельных дзялянак, якімі яны карысталіся, і маглі пакінуць яе толькі перадаўшы свой надзел разам з прывязанымі да яго абавязкамі (звычайна, шляхам продажу) іншай асобе. Віцебскія «падводнікі» мелі сваю ўнутраную арганізацыю і сваіх старшынь, што кіравалі раскладкай павіннасці. У дакументах 1539 г. згадваецца іх дзясятнік (верагодна, дзясяткаў было некалькі), а ў інвентары 1638 г. – нават войт [10, с. 41].

Звычайна ў ВКЛ за кожнай вясковай ці гарадской абшчынай, якая выконвала «падводную» павіннасць, замацоўваўся нейкі канкрэтны прамежак дарогі. На падставе судовай справы красавіка 1495 г. магчыма меркаваць, што насельніцтва віцебскіх «падводных» зямель, прынамсі,

першапачаткова, абслугоўвала перамяшчэнне гаспадарскіх намеснікаў і іх слуг, а таксама велікакняжацкіх паслоў і ганцоў на шляху з Віцебска ў сталіцу дзяржавы Вільню на яго адлегласці да Барысава. Аднак неабходна прызнаць, што для канчатковага вырашэння гэтага пытання аднаго дакумента выразна недастаткова.

У XVI ст. на беларускіх і літоўскіх землях тэрмін «падвода» (пачатковае значэнне – выдача для патрэбы падарожных верхавых коней і праваднікоў) выцесніў сабой тэрмін «павоз», якім раней акрэслівалася павіннасць выдачы вазоў з цяглай жывёлай для перамяшчэння грузаў [22, p. 108–109]. У святле гэтага сцвярджэння становіцца актуальным пытанне пра характар «падвод», якія выдаваліся гаспадарскім намеснікам, паслам і ганцам з віцебскіх «падводных» зямель. Неабходна канстатаваць, што матэрыялы пацвярджальнага прывілея Жыгімонта III Вазы ад 8 сакавіка 1623 г. і судовых спраў канца XV – першай паловы XVI ст. утрымліваюць звесткі толькі пра коней і праваднікоў, іншымі словамі, «верхавыя падводы».

Варта паспрабаваць разгледзець пытанне, кім былі віцебскія «падводнікі» з пункту гледжання іх саслоўнай прыналежнасці. У дакументах часоў Аляксандра Ягелончыка яны выступаюць і як мяшчане (*«мяшчане віцебскія, падводныя людзі»*), і як асобы з больш нізкім, чым у першых, сацыяльным статусам (проста *«падводныя людзі»*, людзі *«цяглыя»*). Цікава таксама, што бяспраўны перавод мешчаніна з іншай службы на «падводную» не пазбаўляў яго аўтаматычна прыналежнасці да мяшчанскага саслоўя. У судовых справах 1539 г., што паходзяць са складу кнігі 228 Метрыкі ВКЛ, віцебскія «падводнікі» выступаюць як *«людзі гаспадарскія віцебскія падводныя»*, мяшчанамі яны не называюцца. Аднак з іншых спраў той жа кнігі Метрыкі вынікае, што адзін з «падводнікаў» (*«Ольфер Плешивъцовъ»*), несумненна, з'яўляўся віцебскім мешчанінам [19, с. 136, 156]. Магчыма меркаваць, што ва ўмовах Віцебскай зямлі канца XV – першых дзесяцігоддзяў XVI ст., калі яшчэ не існавала дакладных межаў паміж саслоўямі, такая блытаніна не была рэдкасцю.

Больш значная сацыяльная адлегласць падзяляе віцебскіх «падводнікаў» і мяшчан у судовай справе ліпеня 1549 г., дзе першыя займаюць выразна падначаленае ў адносінах да другіх становішча. Уласна кажучы, сярэдзіна XVI ст. стала тым часам, калі мяшчанская абшчына Віцебска выразна адасобілася ад іншых саслоўных груп насельніцтва зямлі і атрымала ў сваё распараджэнне шэраг камунальных аб'ектаў (напрыклад, гасцінны двор [9, с. 70–74]) на тэрыторыі горада, і калі ў Віцебску аформілася і пасля надання каралём Жыгімонтам Аўгустам 6 чэрвеня 1561 г. адпаведнага прывілея пачала функцыянаваць уласная арыгінальная сістэма гарадскога права, у рамках якой мяшчане не плацілі падаткаў, а выконвалі прэстыжную конную вайсковую службу [7, с. 82–93].

Фактарам, які, нягледзячы на розніцу ў статусе, аб'ядноўваў дзве згаданыя катэгорыі насельніцтва, было тое, што да надання Віцебску 17 сакавіка 1597 г. магдэбургскага права як мяшчане, так і «падводнікі» знаходзіліся пад непасрэднай адміністрацыйнай і судовай уладай віцебскага ваяводы.

Галоўнай праблемай, якая ў канцы XV – першай палове XVI ст. стаяла перад віцебскімі «падводнікамі», была цяжкасць выканання службы, аб'ёмы якой, як магчыма меркаваць, перавышалі фізічныя магчымасці іх групы. З гэтай прычыны яны ўвесь час хаатычна і па большай частцы беспаспяхова шукалі асоб, якіх магчыма было б прыцягнуць да нясення іх службы. Згаданая цяжкасць не з'яўлялася выключна праблемай віцебскіх «падводнікаў». У той ці іншай ступені яна была характэрнай з'явай для ўсіх гарадскіх і сельскіх абшчын ВКЛ, якія выконвалі камунікацыйныя павіннасці. Другой праблемай для віцебскіх «падводнікаў» былі злоўжыванні з боку мясцовых намеснікаў-ваявод, якія перыядычна парушалі асвечаны даўнасцю парадак выканання службы.

Варта адзначыць, што ў сярэдзіне XVI ст. традыцыйны натуральны спосаб выканання падводнай павіннасці насельніцтвам ствараў дзяржаўнай адміністрацыі ВКЛ больш праблем, чым прыносіў карысці. Галоўнай прычынай паступовага развалу сістэмы «падводнай» службы стала феадалізацыя краіны, у выніку чаго значная частка насельніцтва трапіла пад уладу свецкіх і духоўных феадалаў і перастала яе выконваць, а рэшта абавязаных даваць «падводы» проста не спраўлялася з ранейшымі аб'ёмамі працы.

3 красавіка 1558 г. кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт Аўгуст выдаў віцебскім мяшчанам спецыяльны прывілей, якім змяніў парадак нясення службы віцебскімі «падводнікамі». Паводле каралеўскага распараджэння горад быў вызвалены ад фізічнага выканання павіннасці. Замест гэтага на віцебскіх мяшчан быў ускладзены абавязак *«въ кождыи рокъ»* выплачваць у каралеўскі скарб *«по двадцат копъ грошеи литовъскихъ»* за карыстанне «падводнымі» землямі [13, арк. 33]. У далейшым атрыманыя такім шляхам сродкі павінны былі перадавацца гаспадарскім паслам і ганцам, каб тыя мелі магчымасць наймаць коней за наяўныя грошы.

Замена павіннасці, што раней выконвалася з віцебскіх «падводных» зямель у натуральнай форме, грашовым падаткам не была нечым прынцыпова новым для ВКЛ. Падпісанае манархам 3 красавіка 1558 г. рашэнне цалкам кладзецца ў рэчышча ўнутранай палітыкі ўлад дзяржавы сярэдзіны XVI ст. па гэтым пытанні. Магчымасць манетызацыі падводнай павіннасці з падданых шляхты і духавенства (*«абы который слушный платъ на рокъ з людей ихъ шолъ, жебы за то подводы наймовано, ижъ бы гонъцы и послы въ справахъ господарьских и земъскихъ никото-*

*рого омешканья не прыймовали»*) абмяркоўвалася яшчэ на Берасцейскім вальным сойме 1551 г. [18, стб. 218–219; 26, s. 22]. 20 чэрвеня 1558 г. Жыгімонт Аўгуст выдаў нават спецыяльную Уставу, у якой скрупулёзна рэгламентавалася выкананне падводнай павіннасці насельніцтвам гарадоў, мястэчак і «рускіх валасцей», дзе яшчэ не была праведзена валочная рэформа. Гэтай Уставай (што вельмі істотна) сама павіннасць у агульнадзяржаўным маштабе замянялася грашовым падаткам [18, стб. 592–599].

У другой палове 1560-х – пачатку 1570-х гг., калі на землях Беларускага Падзвіння вяліся актыўныя баявыя дзеянні цяжкай і далёка не заўсёды паспяховай для ВКЛ Лівонскай вайны (1558–1583), віцебскі ваявода Станіслаў Пац гвалтам прымушаў віцебскіх мяшчан даваць коней пад патрэбы замкавай адміністрацыі. 30 мая 1571 г. скарга мяшчан на дзеянні гаспадарскага ўрадніка па цэлым шэрагу пытанняў (у тым ліку і па пытанні аб «падводах») была разгледжана ў Варшаве судом караля Жыгімонта Аўгуста. На працэсе бок абвінавачання паведаміў манарху, што ваявода браў коней у мяшчан, якія *«от подводъ вызволены сут»*, але не прымушаў выконваць гэтую службу тых людзей, *«которие тои повинъности подданы»*. У апошняй са згаданых катэгорый магчыма бачыць віцебскіх «падводнікаў». У сваё апраўданне С. Пац паведаміў, што гэтыя злоўжыванні здарыліся ў цяжкі ваенны час і з прычыны няведання ім зместу мяшчанскіх прывілеяў. Такім чынам, ён фактычна не аспрэчваў таго, што віцебскія мяшчане былі вызвалены ад нясення падводнай павіннасці [5, с. 158].

17 сакавіка 1597 г. Жыгімонт III Ваза сваім прывілеем надаў віцебскім мяшчанам магдэбургскае права. Дакумент утрымліваў пастанову, якая цалкам звальняла яго атрымальнікаў ад фізічнага выканання падводнай павіннасці: *«А подъвод подъ посланъцы наши, яко перед тымъ не давали, такъ и теперъ давати не мают вечными часы»* [7, с. 198]. Гэта можа ўскосна сведчыць пра тое, што ў канцы XVI – пачатку XVII ст. горад працягваў карыстацца «падводнымі» землямі і ўносіць у дзяржаўны скарб адпаведныя штогадовыя выплаты.

8 сакавіка 1623 г. Жыгімонт III Ваза пацвердзіў прывілей Жыгімонта Аўгуста віцебскім мяшчанам на «падводныя» землі ад 3 красавіка 1558 г. Пры гэтым быў у чарговы раз замацаваны парадак, паводле якога мяшчане за карыстанне гэтым комплексам нерухомасці павінны былі *«не коньми въ подводы служити»*, а штогод выплачваць на карысць гаспадарскага скарбу па 20 коп грошаў [13, арк. 32 адв.–33 адв.]. Звесткі пра тое, дзе ў цяперашні час можа зберагацца і ці ўвогуле захаваўся арыгінал гэтага прывілея (у 1730-я гг. ён, несумненна, знаходзіўся ў Віцебску), адсутнічаюць. У той жа дзень, 8 сакавіка 1623 г., Жыгімонт III Ваза накіраваў асобны ліст двараніну Юрыю Аляхновічу, у якім загадаў

апошняму паехаць у Віцебск і *«падаць»* «падводныя» землі мясцовай мяшчанскай абшчыне [3, арк. 30–30 адв.; 4, с. 104–105].

Аднак паводле іроніі лёсу пасля сакавіка 1623 г. віцебскія «падводныя» землі як адзіны цэльны комплекс, што належаў гораду, праіснавалі вельмі нядоўга. Прычынай іх драблення, частковага пераходу пад шляхецкую юрысдыкцыю і фактычнай ліквідацыі стала наступнае. Пасля таго, як 12 лістапада 1623 г. віцебскія праваслаўныя мяшчане забілі полацкага ўніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча, згодна з распараджэннем Жыгімонта ІІІ Вазы ад 9 снежня 1623 г. і дэкрэтам камісарскага суда ад 22 студзеня 1624 г., горад быў пазбаўлены ўсіх правоў, якімі да гэтага карыстаўся, а яго насельніцтва пераведзена непасрэдна пад юрысдыкцыю віцебскага ваяводы [4, с. 223–238]. Органы гарадскога самакіравання (магістрат) былі ліквідаваны, а віцебская мяшчанская абшчына, вінаватая з пункту гледжання ўлад Рэчы Паспалітай у выключна цяжкім злачынстве, часова згубіла ўсялякія магчымасці бараніць свае правы. Карыстаючыся такой спрыяльнай сітуацыяй, мясцовая шляхта (а таксама, верагодна, і духавенства) неадкладна распачала чыніць *«бяспраўны разбор маёмасці рознай, дамоў, пляцаў і ўсялякіх грунтаў мяшчан віцебскіх»*. Вынікам свавольства прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя стала тое, што ў 1624 г. у Віцебску так і не было сабрана ніякіх дзяржаўных падаткаў [14, арк. 350–350 адв.], а вельмі значная частка гарадскіх зямель разам з іх насельніцтвам, як пераканаўча сведчаць інвентары Віцебска 1638, 1639 і 1641 гг., за кароткі час апынулася ў межах шляхецкіх і царкоўных юрыдык.

У інвентары замка і горада Віцебска, складзеным у пачатку верасня 1638 г. скарбовым слугой Янам Быкоўскім у мэтах іх перадачы новаму ваяводу Яну Ракоўскаму, згадваецца ўсяго 10 двароў «падводнікаў», якія пражывалі на землях Шыркаўшчына, Шэркаў, Дзям’янаўшчына і працягвалі адносіцца да гарадскіх структур. Гэта былі: *«289) Дом Пароціка і агарод; 290) дом і агарод Янкі; 291) дом і агарод Копача; 292) дом і агарод Фёдара, дойліда; 293) дом і агарод Багдана Маскаля; 294) дом і агарод Юркі Мікіціна; 295) дом і агарод Барташа; 296) дом і агарод Івана Вакарэнта; 297) дом і агарод Апанаса, войта; 298) дом і агарод Хласа»*. У дакуменце гаворыцца, што некалі насельніцтва гэтых зямель выконвала «падводную» службу на карысць віцебскага замка, але на момант складання інвентара кожны з гаспадароў пералічаных сядзіб мусіў замест гэтага штогод выплачваць па 12 грошаў [10, с. 41–42]. Няцяжка падлічыць, што агульны гадавы збор з 10 двароў павінен быў складаць 120 грошаў ці, інакш кажучы, 2 капы грошаў. Гэта ўсяго толькі дзясятая частка той сумы, што была зафіксавана ў прывілеі Жыгімонта ІІІ Вазы віцебскім мяшчанам і лісце таго ж манарха двараніну Юрыю Аляхновічу ад 8 сакавіка 1623 г. Таму, магчыма меркаваць, што на пачатак 1623 г.

(а, магчыма, і ў 1558 г., на момант пераводу з натуральнай павіннасці на грашовы падатак) на гарадскіх «падводных» землях знаходзілася каля 100 двароў. Аднак, як ужо адзначалася, да 1638 г. пераважная іх частка была незаконна пераведзена пад уладу шляхты.

У інвентары Віцебска, што датуецца лістападам 1641 г. (складзены дваранінам Ярашам Мацкевічам у сувязі з вяртаннем гораду магдэбургскага права), пры апісанні шляхецкіх юрыдык згадваецца *«зямля падводная за горадам і пасадам Узгорскім, з якой, згодна з правамі і прывілеямі, горад Віцебск скарбу Яго Каралеўскай Міласці кожны год па дваццаць коп плаціў»*, якую на момант стварэння дакумента шляхціц *«Ян Вільбутовіч Паплонскі, невядома якім правам забраўшы, трымае ў лічбе дамоў 32»* [3, арк. 77; 4, с. 368–369]. Гэты запіс непасрэдна сведчыць пра тое, што двароў віцебскіх «падводнікаў» першапачаткова было значна больш за 10, але, падобна, і тут у поле зроку трапляюць далёка не ўсе яны.

Орган самакіравання ў постаці «старшых» мяшчан, што быў аднoўлены ў Віцебску пасля вяртання гораду 7 кастрычніка 1633 г. яго дамагдэбургскіх правоў [7, с. 110–111, 128–129], прыкладаў пэўныя намаганні, каб паставіць пад свой кантроль страчаныя землі. Так, 19 кастрычніка 1638 г. прадстаўнікі мяшчан (верагодна, у мэтах абароны сваіх маёмасных правоў) падалі земскім ураднікам Віцебскага ваяводства разгледжаны вышэй прывілей Жыгімонта III Вазы ад 8 сакавіка 1623 г. [3, арк. 29; 4, с. 104]. Невядома, аднак, ці мелі ў гэтым выпадку іх дзеянні хоць нейкія пазітыўныя наступствы.

У 1654–1667 гг. Віцебск знаходзіўся пад кантролем Маскоўскай дзяржавы. Пасля вяртання ў склад Рэчы Паспалітай горад з прычыны цяжкіх разбурэнняў быў на 4 гады вызвалены ад выплаты ўсіх падаткаў. На віцебскія «падводныя» грошы ўлады ізноў звярнулі ўвагу толькі ў пачатку 1670-х гг. Гэтыя сродкі, пачынаючы з 1673 г., у тэорыі павінны былі скіроўвацца на ўтрыманне паштовай службы ВКЛ і перадавацца генеральнаму паштмайстру Райнхольду Бізінгу. Аднак мяшчане ўпарта не жадалі выплачваць грошы згаданаму ўрадніку, што выклікала шэраг працяглых судовых працэсаў паміж ім і горадам.

2 красавіка 1676 г. кароль Ян III Сабескі сваім лістом забараніў Бізінгу патрабаваць ад мяшчан выплаты «падводных» грошаў [3, арк. 89], але распараджэнне манарха фактычна павісла ў паветры. 26 лістапада 1676 г. справа па скарзе паштмайстра на горад разглядалася Скарбовым трыбуналам ВКЛ і была адкладзена да наступнага сейма [3, арк. 90–91]. 14 снежня 1677 г. працэс працягнуўся ў камісарскім судзе, які таксама не прыняў канчатковага рашэння. Цікава, што ў гэтым выпадку мяшчане спрабавалі даказаць, што не павінны плаціць «падводныя» грошы, пры дапамозе, сярод іншага, прывілея Жыгімонта Аўгуста 1558 г., дзе

фактычна было напісана адваротнае [3, арк. 94–95]. Урэшце, 16 лістапада 1685 г. Скарбовы трыбунал сваім дэкрэтам вызваліў мяшчанскую абшчыну Віцебска ад аплаты за «падводныя» землі [3, арк. 96–99].

Пры стварэнні ў 1733–1735 гг. віцебскім магістратам першай «Кнігі прывілеяў Віцебска» прывілей Жыгімонта III Вазы на «падводныя» землі і каралеўскі ліст дваранін Юрыю Аляхновічу з распараджэннем *«падаць»* іх магдэбургіі ад 8 сакавіка 1623 г. былі ўключаны ў яе склад [3, арк. 28–29, 30–30 адв.]. Яны прысутнічаюць таксама ва ўсіх копіях «Кнігі прывілеяў» 1760-х гг. і больш позняга часу [21, k. 66v–68, 69v–70v; 24, k. 76v–78v, 80v–81v; 23, k. 76v–79v, 81v–82v; 20, k. 25–27]. Па ўсёй верагоднасці, гарадскія ўлады ўсведамлялі гістарычнае значэнне гэтых дакументаў і на іх падставе да канца знаходжання горада ў складзе Рэчы Паспалітай мелі ілюзорныя надзеі на вяртанне страчаных тэрыторый. Аднак у рэальнасці ў канцы XVII – першай палове XVIII ст. былымі «падводнымі» землямі гарадская абшчына ўжо не валодала.

Варта паспрабаваць знайсці адказ на пытанне, дзе размяшчалася нерухомасць, з якой віцебскія «падводнікі» выконвалі сваю службу. У прывілеі Жыгімонта III Вазы ад 8 сакавіка 1623 г. пералічана 5 зямель, што належалі да гэтага комплексу: Дзям'янаўская, Крапіўшчына, Згодшчына, Шыркаўшчына і Шэрчын (Шэркаў) [4, с. 103; 13, арк. 33]. Цікава, што некаторыя са згаданых тапонімаў сугучныя імёнам віцебскіх «падводнікаў» з судовых спраў першай паловы XVI ст. («Демъянъ Кропивинъ», «Ширко Плешивец» [19, с. 220; 12, с. 111]) і, магчыма, утвораны ад іх. Прывілей 8 сакавіка 1623 г. паведамляе, што ўвесь комплекс «падводных» зямель знаходзіўся *«за горадам Віцебскам пад сцяной»*, а землі Дзям'янаўская, Крапіўшчына і Згодшчына, апрача таго, – *«ва Уланавічах»* [3, арк. 28 адв.; 4, с. 103]. Паводле звестак інвентара 1638 г., землі Шыркаўшчына і Шэркаў размяшчаліся непасрэдна *«за ручаём Слізкім»* [10, с. 41]. Інвентар 1641 г. лакалізуе 32 двары «падводнікаў», незаконна захопленыя шляхціцам Янам Вільбутовічам Паплонскім, *«за горадам і пасадам Узгорскім»* [3, арк. 77; 4, с. 368].

Калі меркаваць паводле планаў Віцебска XIX – пачатку XX ст., ручай Слізкі пачынаўся ў раёне сучаснай плошчы Леніна і нёс свае воды ў Дзвіну па глыбокім яры ўздоўж паўднёвага боку сучаснай вуліцы Чэхава. На бягучы момант значная частка яго рэчышча засыпана, а даўжыня фрагмента, што застаецца на паверхні, складае каля 250 м. У першай палове XVII ст. лінія ўмацаванняў Узгорскага пасада Віцебска абапіралася менавіта на ручай Слізкі. Таму ўсе тры вызначэнні месцазнаходжання «падводных» зямель з крыніц 1620–1630-х гг. (*«за горадам Віцебскам пад сцяной»*, *«за ручаём Слізкім»*, *«за горадам і пасадам Узгорскім»*) рознымі словамі апісваюць адну і тую ж тапаграфічную сітуацыю. Мясцовасць Уланавічы, што да 1964 г. утварала асобны населены пункт,

а ў затым была ўключана ў склад Віцебска, знаходзіцца на адлегласці каля 3,5 км на паўночны захад ад захаванага фрагмента ручая Слізкага. Такім чынам, у XVI – першай палове XVII ст. «падводныя» землі Віцебска пачыналіся ад трасы сучаснай вуліцы Чэхава і цераспалосна з іншымі мяшчанскімі, шляхецкімі і царкоўнымі ўладаннямі цягнуліся ў кірунку Уланавічаў. У сучаснай гарадской тапаніміцы гэта мясцовасць вядома пад назвай Пескавацік.

Неабходна прывесці яшчэ адзін цікавы факт, што можа мець пэўныя адносіны да тэмы гэтага даследавання. У дакуменце ад 10 лістапада 1721 г. адзначана, што ў Дзвіне насупраць Пескаваціка (а значыць, некалькі вышэй за вусце ручая Слізкага) ляжаў вялікі «камень Пароцік» [6, с. 419]. Немагчыма выключаць, што яго назва можа паходзіць ад імя аднаго з «падводнікаў» інвентара 1638 г. («Дом Пароціка і агарод»), гаспадарка якога знаходзілася якраз недзе тут.

Такім чынам, наданне мяшчанскай абшчыне Віцебска «падводных» зямель адбылося пры вялікім князі літоўскім Жыгімонце Кейстутавічы ў перыяд з лета 1436 г. па сакавік 1440 г. Валоданне гэтым комплексам нерухомасці, які размяшчаўся ў мясцовасці Пескавацік на поўнач ад горада, з насельніцтвам, што выконвала «падводную» службу, запэўніла самім віцебскім мяшчанам вызваленне ад яе цяжару. У 1558 г. улады ВКЛ замянілі выкананне натуральнай службы з віцебскіх «падводных» зямель штогадовым грашовым падаткам у памеры 20 коп грошаў. Пасля забойства 12 лістапада 1623 г. уніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча і часовай ліквідацыі гарадскіх улад віцебскія «падводныя» землі былі ў асноўнай сваёй масе незаконна захоплены мясцовай шляхтай і перасталі існаваць як адзіны комплекс.

## Крыніцы і літаратура

1. Акты Литовской Метрики / Собраны Ф. И. Леонтовичем. – Т. 1. – Вып. 1: (1413–1498). – Варшава : издание Императорского Варшавского университета, 1896. – 169 с.
2. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою Комиссиею: в 5 т. – Санкт-Петербург : в типографии II отделения е. и. в. канцелярии, 1846–1853. – Т. 1: 1340 – 1506. – 1846. – IV, 375, 24, 15 с.
3. Віцебскі абласны краязнаўчы музей. – КП 7261. – Кніга прывілеяў Віцебска (копіі). 1730–1750-я гг. – 103 арк.
4. Витебская старина / Сост. А. П. Сапунов. – Т. 1: с приложениями и рисунками в тексте. – Витебск : Типография губернского правления, 1883. – XXII, 668 с.
5. Доўнар, А. Б. Дэкрэт 1571 г. па справе віцебскіх мяшчан з віцебскім ваяводай як гістарычная крыніца / А. Б. Доўнар // Актуальные проблемы источниковедения: Материалы III Международной научно-практиче-

ской конференции, Витебск, 8–9 октября 2015 г. / редкол. А. Н. Дулов и М. Ф. Румянцева (отв. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2015. – С. 156–159.

6. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящихся в центральном архиве в Витебске / под ред. М. Веревкина. – Вып. 26. – Витебск : в Типо-Литографии Г. А. Малкина, 1895. – [2], 516, XXXIV с.
7. Макараў, М. Д. Ад пасада да магдэбугіі: прававое становішча насельніцтва местаў Беларускага Падзвіння ў XIV – першай палове XVII ст. / М. Д. Макараў. – Мінск : Экаперспектыва, 2008. – 248 с.
8. Макараў, М. Д. Мейскія ўлады Віцебска да ўвядзення магдэбургскага права (канец 15 ст. – 1597 г.) / М. Д. Макараў // Гістарычны альманах. – 2004. – № 10. – С. 156–168.
9. Макараў, М. Д. Пра пачаткі ансамбля ратушнай плошчы ў Віцебску // Віцебскі край: матэрыялы IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Віцебскі край», прысвечанай 80-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці, 22 лістапада 2018 г., г. Віцебск. – Т. 4. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2019. – С. 70–74.
10. Макараў, М. Д., Волкаў, М. А. Інвентар замка і горада Віцебска 1638 года / М. Д. Макараў, М. А. Волкаў // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт.; вып. 18 / рэд. В. Ф. Голубеў [і інш.]. – Мінск : НГАБ, 2020. – С. 28–58.
11. Макаров, М. Д. К истории создания «Книги привилеев Витебска» и «Летописи Панцырного и Аверки» / М. Д. Макаров // Віцебскі сшытак. – 2019. – № 6. – С. 44–60.
12. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 35 (1551–1558): кніга запісаў № 35 (копія канца XVI ст.) / Падрыхтаваў А. А. Мяцельскі. – Мінск : Беларуская навука, 2020. – 538 с.
13. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – КМФ-18 (Метрыка ВКЛ). Воп. 1. Спр. 99. – Прывілеі на розныя пасады, староствы, арэнды і пажалаванні ў ВКЛ. У другой частцы прывілеі на пасады і маёнткі ў княствах Смаленскім і Северскім. 1623–1631 гг. – 535 арк.
14. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 100. – Метрыка ВКЛ за караля Жыгімонта III, у якой прывілеі, даніны, фундушы, пацвярджэнні, арэнды, кантракты і іншыя справы за падканцлерства Паўла Сапегі. 1623–1626 гг. – 622 арк.
15. Полехов, С. В. Наследники Витовта. Династическая война в Великом княжестве Литовском в 30-е годы XV века / С. В. Полехов. – Москва : Индрик, 2015. – 712 с.
16. Полоцкие грамоты XIII – начала XVI века / Институт славяноведения Российской академии наук [и др.]. Т. 1 / подготовили: А.Л. Хорошкевич (ответственный редактор) [и др.]. – Москва: Русский фонд содействия образованию и науке, 2015. – 864 с.: XVI с. ил.
17. Русская историческая библиотека, издаваемая Императорскою Археографическою комиссиею: в 39 т. – Т. 27: Литовская Метрика. Отдел 1. –

Ч. 1: Книги записей. – Т. 1 / под ред. И. И. Лаппо. – Петербург : Сенатская типография, 1910. – 872 стб.

18. Русская историческая библиотека, издаваемая Императорскою Археографическою комиссиею: в 39 т. – Т. 30: Литовская Метрика. Отделы 1–2. – Ч. 3: Книги публичных дел. – Т. 1 / под ред. И. И. Лаппо. – Юрьев : Тип. К. Маттисена в Юрьеве, 1914. – 896 стб., 78 с.
19. Судебная книга витебского воеводы, господарского маршалка, волковыского и оболецкого державцы М. В. Клочко. 1533–1540 (Литовская метрика. Книга № 228. Книга судных дел № 9) / [публ. подгот. В. А. Воронин и др.]. – Москва : Наука, 2008. – 525 с.
20. Archiwum Główne Akt Dawnych. – Zbiór Branickich. – 276/346. – Кніга прывілеяў Віцебска (копіі). Другая палова XVIII ст. – 116 s.
21. Biblioteka Polskiej Akademii Umiejętności i Polskiej Akademii Nauk w Krakowie. – Rękopis 3141. – Кніга прывілеяў Віцебска (копіі). 1767–1768 гг. – 277 k.
22. Jurkiewicz, J. Powinności podwodowe włościan w Wielkim Księstwie Litewskim (XVI–XVIII w.). Z zagadnień terminologii i klasyfikacji / J. Jurkiewicz // Istorijos akiračiai. – Vilnius : Lietuvos istorijos institutas, 2004. – P. 101–126.
23. Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka (далей – LMAVB). – Rankraščių skyrius. – F17-208. – Хроніка Віцебска. 1768 г. – 326 арк.
24. LMAVB. – Rankraščių skyrius. – F22-69. – Кніга прывілеяў Віцебска (копіі). 1768 г. – 299 арк.
25. Wolff, J. Kniaziowie Litewsko-Ruscy od końca czternastego wieku / J. Wolff. – Warszawa : drukiem J. Filipowicza, 1895. – 696 s.
26. Wysłouch, S. Posługi komunikacyjne w miastach W. Ks. Litewskiego na prawie magdeburskiem do połowy XVI w. / S. Wysłouch. – Wilno : Instytut Naukowo-Badawczy Europy Wschodniej, 1936. – 207 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 28.06.2021

*А. У. Мацук*

## Полацкія соймікі ў 1704–1707 гг.

Паўночная вайна прынесла беларускім землям вялікія дэмаграфічныя і эканамічныя страты. Гэта робіць актуальным у першую чаргу вывучэнне вайсковай, эканамічнай і дэмаграфічнай гісторыі Паўночнай вайны ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Пры такім падыходзе куды менш увагі надавалася даследаванню іншых праблем, адной з якіх было вывучэнне ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў ВКЛ і ў яго асобных ваяводствах і паветах. Вялікую цікавасць пры гэтым выклікаюць паветы

і ваяводствы ВКЛ, дзе размяшчаліся значныя кантынгенты замежных войскаў. Асабліва актуальным з’яўляецца пытанне функцыянавання парламенцкіх структур у гэтых адміністрацыйных адзінках (сойміках) у суседстве з замежнымі войскамі. Менавіта такім соймікам з’яўляўся полацкі. Яго функцыянаванне ў 1704–1707 гг. ніколі не было ў цэнтры ўвагі даследчыкаў. Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца даследаванне функцыянавання полацкіх соймікаў у 1704–1707 гг. у час знаходжання ў Полацкім ваяводстве замежных (расійскіх) войскаў.

Унутрыпалітычная сітуацыя ў Рэчы Паспалітай ускладнілася, калі праціўнікі Аўгуста II пры шведскай падтрымцы 19 чэрвеня 1704 г. абралі новым каралём Станіслава Ляшчынскага. Яго прыхільнікі нечакана з’явіліся ў межах Полацкага ваяводства. У гэты час Аўгусту II удалося дамагчыся згоды на ўвядзенне ў ВКЛ расійскіх войскаў для дапамогі “рэспубліканцам”. Улетку 1704 г. у Полацкае ваяводства ўступілі першыя расійскія войскі. Гэта былі падраздзяленні смаленскай шляхты (колькасць усяго атрада складала 4–5 тысяч чалавек) пад камандаваннем Багдана Корсака. У гэты атрад зноў увайшлі стралецкія палкі Юрыя Нячаева і Міхаіла Пратапопава, якія 3 ліпеня 1704 г. злучыліся з расійскім драгунскім палком Рыгора Сухоціна, а пасля злучэння пад Дзіснай з атрадам войска ВКЛ пад камандаваннем Рыгора Агінскага накіраваліся ў Курляндыю. Расійскія падраздзяленні былі нерэгулярнымі і са слабай дысцыплінай, таму наносілі значныя шкоды ўладанням мясцовай шляхты [1, s. 502, 513; 2, с. 345, 702; 3, с. 55–56]. Значныя страты панесла таксама войска ВКЛ. 5 жніўня 1704 г. аб’яднанае злучэнне Б. Корсака і Міхала Вішнявецкага было разбіта пад Якабштадам шведамі і сапежынцамі, таму было вымушана вярнуцца ў межы Полацкага ваяводства – у Друю. Напэўна, таму ў жніўні–верасні 1704 г. адбыўся наступны полацкі соймік, дзе былі праведзены выбары паслоў да М. Вішнявецкага. 29 верасня 1704 г. пад Друяй у абозе вялікі гетман ВКЛ М. Вішнявецкі даў свой адказ полацкім паслам Ігнату Навацкаму і полацкаму земскаму суддзічу Францішку Пакашу. Вішнявецкі дзякаваў полацкай шляхце за захаванне вернасці Аўгусту II і патрабаваў трымацца ў гатоўнасці пад камандаваннем полацкага харужага Крыштафа Бенядыкта Шчыта, бо можа спатрэбіцца іх дапамога. Апрача таго, Вішнявецкі абяцаў разгледзець выпадкі, калі войска ВКЛ нанесла шкоды ўладанням Шчытоў (полацкага падсудка, полацкага войскага і кушліцкага старосты) [3, 56–57; 4, с. 80–87; 5, арк. 5–6, 9–11 адв.]. У гэтым адказе бачна, што Вішнявецкі разглядаў менавіта прадстаўнікоў роду Шчытоў як галоўных лідараў прыхільнікаў Аўгуста II у Полацкім ваяводстве. Менавіта дзякуючы Вішнявецкаму лідар гэтага роду – полацкі харужы К. Б. Шчыт – атрымаў урад чашніка ВКЛ [6, s. 568–569].

Пра наступны полацкі соймік вядома, што ён адбыўся 11 кастрычніка 1704 г.[1]. На ім было прынята рашэнне пра тое, што хоць на падставе каралеўскіх віцяў не дайшло да склікання паспалітага рушэння, але неабходна, для лепшай гатоўнасці, абраць полацкага палкоўніка, якім стаў мясцовы ваявода Дамінік Слушка. «Патэнт» яму падпісалі 11 шляхціцаў: дырэктар сойміка полацкі кашталян Міхал Казімір Пац, намінат і полацкі архімандрыт, чарэйскі абат Хрызастом Радзімінскі-Францкевіч, полацкі войскі Юрый Шчыт-Забельскі, полацкі стольнік Ян Пакаш, полацкі падстолі Андрэй Корсак, полацкі земскі пісар Даміян Рыпінскі, полацкі падваявода Геранім Жаба, опсаўскі староста Іпаліт Цеханавецкі, смаленскі стольнік Аляксандр Рыпінскі, полацкі падчашы і полацкі ротмістр Юзаф Францішак Буйніцкі, полацкі стражнік Аляксандр Корсак. У канцы дакумента было коратка зазначана, што свае подпісы пакінулі і іншыя шляхціцы [5, арк. 55–55 адв.]. Такім чынам, свае подпісы пад крэдэнсам Слушкі пакінулі прадстаўнікі мясцовай эліты, за выключэннем прадстаўнікоў роду Неміровічаў-Шчытоў (у адрозненне ад Шчытоў Забельскіх). Дакладна вядома, што лідар гэтага роду – полацкі харужы і чашнік ВКЛ К. Б. Шчыт – знаходзіўся ў гэты час у абозе войска ВКЛ пад камандаваннем М. Вішнявецкага [6, s. 568–569; 7, k. 28].

Ужо 9 лістапада 1704 г. полацкая шляхта сабралася на свой соймік на падставе ўніверсалаў полацкага ваяводы Дамініка Слушкі. Мэтай было даць адказ расійскім войскам, якія 1 лістапада 1704 г. пад камандаваннем князя Анікіты Рапніна ўвайшлі ў Полацк, размясціліся і запатрабавалі выдачы правіянту. Прычым гэтаму корпусу было загадана размясціцца кампактна, не прасоўваючыся ўглыб ВКЛ, не далей за *«100 вёрст»*[2] ад Полацка [1, s. 522]. У такой сітуацыі амаль увесь цяжар размяшчэння расійскіх войскаў прыпадаў на Полацкае ваяводства.

Полацкая шляхта пагадзілася выдаць з кожнага дыма па *«дзве асьміны полацкай меры жыта, асьміну ячменю, асьміну аўса і воз сена»* [5, арк. 52]. Сабраць правіянт меркавалася на працягу трох тыдняў у Полацку і аддаць абранаму паборцу Раману Лянкевічу ці асобам, прызначаным расійскім генералам Рапніным. Таксама было прынята рашэнне аб зборы падатку па 15 грошаў з кожнага дыма для выплаты каралеўскаму камісару Ціфенгофу, які павінен быў ажыццявіць выплаты расійскаму войску. Апрача таго, Р. Лянкевічу было прызначана ўзнагароджанне ў 3 грошы з кожнага сабранага злотага. Свае подпісы пад пастановай паставілі 45 шляхціцаў на чале з дырэктарам сойміка полацкім

---

[1] У сярэдзіне кастрычніка 1704 г. расійскія войскі пад кіраўніцтвам Багдана Корсака выйшлі з Полацкага ваяводства, бо саступалі сваё месца для размяшчэння рэгулярных войскаў пад кіраўніцтвам Анікіты Рапніна [1, s. 522].

[2] 1 вярста – 1066,8 метра.

земскім суддзёй Самуэлем Прысецкім. Пастанову аб выплаце ўзнагароджання каралеўскаму камісару і паборцу падпісалі ўсяго 20 шляхціцаў [5, арк. 51, 52]. Звесткі пра прыняцце пастаноў былі перададзены праз паслоў А. Рапніну (у цяперашні час выяўлены толькі пераклад на рускую мову адпаведнай інструкцыі). Так, полацкая шляхта пагаджалася выдаць расійскаму войску правіянт з кожнага дыма па 2 лофа[3] жыта, 1 лоф грэчкі, 1 лоф аўса і 1 воз сена. Правіянт планавалася перадаць ад камісара Полацкага ваяводства камісару, прызначанаму ад расійскіх войскаў. Драгуны, якія размяшчаліся ў дварах, павінны былі браць правіянт толькі з двароў. Размясціцца расійскія войскі павінны былі ў дзяржаўных, духоўных і сапежынскіх уладаннях, а таксама ў мястэчках Лепелі і ў *«Оронжне»*[4]. Полацкая шляхта выказвала пажаданне, каб адзінкі расійскага войска, якія не знаходзіліся пад камандаваннем Рапніна, усё роўна забяспечваліся ім з атрыманага правіянту. Жаўнерам дазвалялася збіраць правіянт з манастырскіх сялян, але забаранялася размяшчацца ў саміх манастырах. Паводле інструкцыі, паслы павінны былі дамагацца, каб шляхецкія двары ў каралеўскіх уладаннях былі вызвалены ад пастою, бо жаўнеры ўжо размяшчаліся ў іх у сялянскіх двapax, і каб быў дазволены вольны праезд шляхты і іх падданых у Полацк і з Полацка [2, с. 673].

Безумоўна, такія ўмовы не задаволілі Рапніна. У першую чаргу гэта датычылася памераў правіянту, бо яму было загадана расійскім царом Пятром І збіраць правіянт на 7 месяцаў для ўсяго расійскага войска (40 тысяч жаўнераў) [1, s. 522]. У выніку полацкім паслам быў дадзены адказ, у якім адзначалася, што вызначаны правіянт складаў толькі малую частку ад неабходнага, і яго патрабавалася значна больш. Рапнін пагаджаўся на вызначэнне камісараў для перадачы сабранага правіянту, але катэгарычна заяўляў, што драгуны будуць браць фураж для коней там, дзе размешчаны. Ён таксама згаджаўся, што войскі не павінны былі жыць у шляхецкіх дварах, але ў выпадках, калі там не жылі шляхціцы, то афіцэры маглі там пасяляцца. Наконт вываду вайсковых адзінак, якія яму не падначальваліся, Рапнін абяцаў напісаць фельдмаршалу Барысу Шарамецьеву. Апрача гэтага, дазваляўся вольны праезд шляхты і іх падданых у Полацк і з Полацка [2, с. 672–673].

Полацкае ваяводства цалкам аказалася пад кантролем расійскіх войскаў, якія пачалі выбіраць значны правіянт, прыводзячы да спусташэн-

---

[3] Лоф – мера збожжавага хлеба ў Ліфляндыі, роўная ⅓ рускай чвэрці (=2,625 чацверыка). У дадзеным выпадку выкарыстоўвалася расійскімі перакладчыкамі замест асьміны.

[4] Напэўна, трэба чытаць разам: «и Воронжне». Тады магчыма, што маецца на ўвазе Варанеч.

ня дзяржаўныя, духоўныя і шляхецкія ўладанні. Пры гэтым яны слаба лічыліся з пажаданнямі полацкіх соймікаў, а ўлічвалі толькі ўласныя інтарэсы.

У 1705 г. першым вядомым соймікам быў грамнічны. На ім дэпутатамі на Трыбунал ВКЛ былі абраны смаленскі падстолі Геранім Корсак і Антоні Рыпінскі [8, s. 59]. Таксама на гэтым сойміку быў прыняты дэкрэт па справе Глыбоцкага кармеліцкага кляштара супраць Вырвічаў. Справа разглядалася яшчэ на полацкім грамнічным сойміку ў 1704 г., але Вырвічы папрасілі перанесці яе разгляд на наступны грамнічны соймік, каб падаць неабходныя дакументы. Аднак яны не зрабілі гэтага і ўвогуле не з'явіліся на соймік, таму рашэнне было прынята не на іх карысць. Адпаведны дэкрэт падпісалі 54 полацкія шляхціцы на чале з соймікавым дырэктарам Д. Слушкам, полацкім харужым і чашнікам ВКЛ К. Б. Шчытом, полацкім падкаморыем Янушам Зяновічам, полацкім земскім суддзёй С. Прысецкім, полацкім падсудкам Канстанцінам Шчытом, полацкім земскім пісарам Д. Рыпінскім, полацкім падваяводам Г. Жабай, полацкім гродскім суддзёй Рэмігіянам Сяліцкім, Ю. Шчытом-Забельскім, полацкім гродскім пісарам Стэфанам Корсакам-Удзельскім, І. Цеханавецкім, полацкім падкаморычам Антоніем Зяновічам, полацкім гараднічым Казімірам Жабай, полацкім стражнікам Юзафам Корсакам-Удзельскім і полацкім падчашым і полацкім ротмістрам Ю. Ф. Буйніцкім [9, арк. 2–4 адв.]. Як бачна па гэтых подпісах, на полацкім грамнічным сойміку 1705 г. прысутнічалі ўсе лідары мясцовай эліты на чале з мясцовым ваяводам.

У гэты час у Полацкім ваяводстве размясціліся асноўныя сілы расійскіх войскаў пад кіраўніцтвам фельдмаршала Рыгора Агільві. Паводле падлікаў расійскага дыпламата Фёдара Куракіна, у Полацку і ваколіцах размясцілася 31 тысяча пехацінцаў. Апрача таго, паводле падлікаў англійскага дыпламата Чарльза Уітварта, тут жа знаходзілася 16200 чалавек конніцы [10, s. 232–233].

У такіх умовах полацкая шляхта сабралася на свой соймік 3 чэрвеня 1705 г. На ім, пад дырэкцыяй С. Прысецкага, былі абраны паслы да Р. Агільві. Яны павінны былі нагадаць аб выдачы полацкай шляхтай правіянту ад пачатку размяшчэння расійскіх войскаў у Полацкім ваяводстве, а таксама вазоў і жалеза для іх рамонту. Нягледзячы на гэта, расійскія войскі наносілі вялікія шкоды: *«штодзённа турбуюць, коней бяруць з-пад шляхты, а [збожжа. – А. М.] нават з двароў, у сялян з сох і барон выграбаюць»* [11, л. 1–1 об.]. Як бачна, знаходжанне асноўных сіл расійскіх войскаў у Полацкім ваяводстве ўвосень 1704 – пачатак лета 1705 г. прывяло да спусташэння ваяводства. Гэта вымушала склікаць новыя соймікі і абіраць паслоў, абавязкамі якіх былі прашэнні аб абароне ад злоўжыванняў расійскіх войскаў падчас збору правіянту і фуражу.

У сярэдзіне чэрвеня 1705 г. у Полацку адбылася скліканая расійскім царом Пятром I нарада расійскага камандавання. На ёй было прынята рашэнне аб руху расійскіх войскаў углыб ВКЛ і размяшчэнні на лініі ракі Нёман. Амаль адразу расійскія войскі рушылі праз Друю на Вільню, дзе затрымаліся ад ліпеня да верасня 1705 г. Далей яны рушылі на захад і размясціліся каля Гродна [1, s. 547; 10, s. 233]. Гэта аблегчыла сітуацыю ў Полацкім ваяводстве, бо знікла неабходнасць забеспячэння правіянтам і фуражом большай часткі расійскай арміі. Аднак Полацк працягваў заставацца галоўным цэнтрам у Падзвінні, дзе збіраўся правіянт для расійскіх войскаў. Менавіта таму тут працягваў размяшчацца расійскі гарнізон.

Вядома, што на полацкім грамнічным сойміку 1706 г. былі абраны дэпутаты. Нават вядома, што адным з іх быў чарнігаўскі стражнік Дамінік Корсак-Удзельскі [8, s. 63]. Полацкая шляхта, якая сабралася на гэтым сойміку, абрала паборцамі гіберны полацкага стражніка Даджыбога Ладзяту, Юрыя Цяпінскага, мазырскага падчашага Крыштафа Аскерку і Ваўрынца Паўлоўскага. Адпаведную пастанову падпісалі толькі 11 шляхціцаў: соймікавы дырэктар полацкі падсудак К. Шчыт, полацкі земскі пісар Д. Рыпінскі, полацкі падваявода Г. Жаба, полацкі гродскі суддзя Р. Сяліцкі, полацкі падчашы Пётр Корсак-Удзельскі, Аляксандр Снарскі, Міхал Рыпінскі, Юзаф Корсак-Удзельскі, Ян Рыпінскі, полацкі канюшы Альбрэхт Шалуха і полацкі лоўчы і полацкі памежны суддзя Казімір Астравух [9, арк. 406–406 адв.]. Як магчыма меркаваць, на сойміку прысутнічала больш шляхты, а дакумент не ўтрымлівае подпісы ўсіх прысутных. Тым не менш, гэты соймік не быў шматлікім. Пра іншыя полацкія соймікі ў 1706 г. больш нічога невядома.

Шведскія войскі на чале з каралём Карлам XII накіраваліся ў Саксонію, каб прымусіць Аўгуста III 5 кастрычніка 1706 г. адмовіцца ад трона Рэчы Паспалітай. Яго прыхільнікі вырашылі сабрацца на Вальную Раду ў Львове, каб абмеркаваць свае далейшыя дзеянні ў такой складанай сітуацыі. Полацкая шляхта на грамнічным сойміку 1707 г. абрала паслом на "канвакацыю" ў Львоў полацкага падстолія Аляксандра Корсака, але не магла адразу выдаць яму пасольшчыну, што абяцала гэта зрабіць пазней. Адпаведную пастанову сойміка падпісаў 61 полацкі шляхціц на чале з соймікавым дырэктарам полацкім земскім суддзёй С. Прысецкім, полацкім падсудкам К. Шчытом, полацкім падваяводам Г. Жабай, полацкім войскім Ю. Шчытом-Забельскім, І. Цеханавецкім і полацкім падчашым Ю. Ф. Буйніцкім [12, арк. 34–35]. Патэнт на ўрад полацкага ротмістра абранаму на гэтым сойміку Базылю Рыпінскаму падпісалі 15 полацкіх шляхціцаў на чале з С. Прысецкім, К. Шчытом, І. Цеханавецкім, Ю. Шчытом-Забельскім і С. Шчытом [12, арк. 36–36 адв.]. У сваю чаргу толькі 8 полацкіх шляхціцаў на чале з С. Прысец-

кім, К. Шчытом і І. Цеханавецкім падпісалі патэнт абраным на сойміку сямі скарбовым (фіскальным) суддзям, якія разам з гродскімі і земскімі ўраднікамі павінны былі ўвайсці ў склад асобнага скарбовага (фіскальнага) суда [12, арк. 37–37 адв.].

На гэтым жа сойміку мясцовая шляхта выступіла ў абарону мазырскага стольніка Францішка Аскеркі, на ўладанне якога напаў інтурскі староста Ян Тызенгаўз. Пастанову аб гэтым падпісаў толькі соймікавы дырэктар С. Прысецкі [12, арк. 14–14 адв.]. На гэтым жа сойміку былі абраны паслы да расійскіх міністраў: полацкі падстолі Аляксандр Корсак і кашанскі староста Ян Жаба. Гэтыя паслы, успамінаючы пра выдачу правіянту расійскім войскам, павінны былі скардзіцца на значныя шкоды ад гэтых войскаў, калі збіралася больш правіянту, чым было вызначана (асабліва значныя шкоды нанесла дзейнасць войскаў пад камандаваннем генерала Радыёна Баура), і прасіць данесці расійскаму цару скаргу на расійскі атрад Р. Сухоціна, які разрабаваў уладанні Ю. Шчыта-Забельскага, а яго самога і яго сына захапіў у палон[5]. Інструкцыя гэтым полацкім паслам была падпісана 71 полацкім шляхціцам на чале з соймікавым дырэктарам полацкім земскім суддзёй С. Прысецкім, полацкім войскім Ю. Шчытом-Забельскім, полацкім падсудкам К. Шчытом, полацкім падчашым Пятром Корсакам-Удзельскім і полацкім стражнікам А. Корсакам [13, л. 1–2 об.]. Як бачна, на полацкі грамнічны соймік сабралася даволі шмат шляхты (каля 60–70 чалавек). Прадстаўнічым была таксама прысутнасць вышэйшых земскіх ураднікаў – земскі суддзя, падсудак, падваявода і войскі. Адказ полацкім паслам ад расійскіх міністраў быў дадзены 16 сакавіка 1707 г. у Львове [14, арк. 101–101 адв.]. Як бачна, полацкая шляхта лічыла, што абірае паслоў на *«канвакацыю»* ў Львоў, пад чым разумеўся канвакацыйны сойм, на якім планавалася абмяркоўваць пытанні склікання элекцыйнага сойма, дзе планаваліся выбары новага караля. Аднак Львоўская рада ў сакавіку 1707 г. у асноўным занялася пытаннямі ўзаемадзеянняў з расійскімі саюзнікамі, а галоўнае – забеспячэння расійскіх войскаў [15, s. 45–64]. Адначасова галоўнай тэмай соймікаў становяцца знішчэнні, якія рабіліся расійскімі войскамі.

Полацкі рэляцыйны соймік быў скліканы 23 мая 1707 г. ва Ушачах пасламі з Вальнай Рады ў Львове. Месца правядзення менавіта там было вызначана з прычыны знаходжання ў Полацку расійскіх войскаў і нежадання шляхты праводзіць побач з імі сваё пасяджэнне. Задачай сойміка быў выбар паслоў на Вальную Раду ў Любліне. На ім былі абраны таксама паслы на *«элекцыйны сойм у Люблін»*: чашнік ВКЛ і полацкі харужы К. Б. Шчыт, полацкі войскі Ю. Шчыт-Забельскі, кашанскі староста

---

[5] Выпадак з полацкім войскім Юрыем Шчытом-Забельскім адбыўся яшчэ ў 1704 г. [7, k. 30].

Ян Жаба, полацкі падстолі А. Корсак, вякшнянскі цівун Каспер Радзімінскі-Францкевіч, полацкі мастаўнічы Даніэль Шпакоўскі, Ян Рагоза, Ян Рыпінскі, кушліцкі староста Аляксандр Шчыт-Забельскі, наваградскі стольнік Ян Слонскі, Філіп Місуна, К. Астравух, Язафат Пятровіч, Баніфацы Дабашынскі, полацкі падчашыч Аляксандр Буйніцкі, троцкі чашнік Пётр Вазгірд, Мацей Пятровіч і Юзаф Война. Як бачна, полацкая шляхта лічыла, што, як звычайна падчас бескаралеўя, у Львове праводзіўся канвакацыйны, а цяпер у Любліне павінен быў адбыцца элекцыйны сойм. Суплемент да інструкцыі гэтым паслам на чале з соймікавым дырэктарам полацкім падчашым Ю. Ф. Буйніцкім, Я. Х. Радзімінскім-Франкевічам і полацкім земскім суддзёй С. Прысецкім падпісалі 74 полацкія шляхціцы [12, арк. 28–29]. У сваю чаргу інструкцыю гэтым паслам падпісалі 73 шляхціцы [12, арк. 32–33 адв.]. У любым выпадку атрымліваецца, што на гэтым сойміку (разам з пасламі) прысутнічала больш за 90 шляхціцаў. На тым жа сойміку паўторна была прынята пастанова аб абароне Ф. Аскеркі ў справе з Я. Тызенгаўзам. Адпаведную пастанову падпісалі 45 полацкіх шляхціцаў на чале з соймікавым дырэктарам Ю. Ф. Буйніцкім, С. Прысецкім, а таксама Г. Жабай, Ю. Шчытом-Забельскім, С. Корсакам-Удзельскім [12, арк. 5–5 адв.]. Як бачна, праціўнікі С. Ляшчынскага ў Полацкім ваяводстве згуртаваліся і масава ўдзельнічалі ў пасольскім сойміку на Люблінскую Вальную Раду[6].

Даволі хутка – ужо 18 жніўня 1707 г. – прайшоў новы полацкі соймік. На ім былі абраны паслы да расійскага цара Пятра I – ваўкавыскі лоўчы Юрый Радавіцкі і Траян Ласоўскі. Полацкая шляхта нагадвала, што дакладныя памеры правіянту для расійскіх войскаў былі вызначаны на Львоўскай Радзе, але, нягледзячы на гэта, А. Рапнін выдаў універсалы пра збор новага правіянту, які мясцовая шляхта не магла сабраць з-за знішчэнняў у сваіх уладаннях. Пры гэтым асабліва падкрэслівалася, што Полацкае ваяводства *«вынішчана»* ў выніку трохгадовага размяшчэння ў ім дапаможных расійскіх войскаў. Апрача таго, полацкая шляхта скардзілася на нападзенне атрада расійскага войска пад камандаваннем Сцяпана Стрэкалава на ўладанне Юзафа Друцкага-Сакалінскага. Значныя шкоды былі таксама нанесены іншымі расійскімі войскамі, якія праходзілі праз Полацкае ваяводства. Менавіта для спынення нанясення шкоды полацкая шляхта прасіла даслаць царскі ўказ, які дазволіў бы расійскаму каменданту ў Полацку судзіць расійскіх жаўнераў з іншых вайсковых адзінак. У канцы інструкцыі шляхта наракала, што яшчэ не дайшоў царскі ўказ, які дазволіў бы праводзіць набажэнствы ў Полацкай замкавай царкве[7], а таму прасіла прыслаць новы падобны ўказ. Ін-

[6] Больш падрабязна пра Вальную Раду ў Любліне гл.: [15, s. 98–102, 110–122].
[7] Напэўна, маецца на ўвазе Сафійскі сабор.

струкцыя падпісана 30 мясцовымі шляхціцамі на чале з соймікавым дырэктарам полацкім падчашым і полацкім ротмістрам Ю. Ф. Буйніцкім, полацкім земскім суддзёй С. Прысецкім, полацкім падваяводам Г. Жабай, полацкім гараднічым С. Шчытом, полацкім канюшым А. Шалухам і полацкім чашнікам Базылём Рыпінскім [16, л. 1–2 об.]. Як бачна, гэта быў прадстаўнічы соймік, хоць і нешматлікі.

На Вальным з'ездзе ў Любліне 7 ліпеня 1707 г. было прынята рашэнне аб прызнанні адмовы Аўгуста II ад трона Рэчы Паспалітай і аб пачатку бескаралеўя. Гэта аслабіла пазіцыі праціўнікаў С. Ляшчынскага. Улетку 1707 г. услед за сваім магнацкім патронам М. Вішнявецкім перайшоў на бок Ляшчынскага полацкі харужы К. Б. Шчыт [6, s. 569; 15, s. 103–110; 17, с. 121–122; 18, s. 417–418]. Прыхільнікі Аўгуста II былі моцна аслаблены ў Полацкім ваяводстве і ў цэлым у ВКЛ такім крокам Шчыта.

Такім чынам, галоўны ўплыў на функцыянаванне полацкіх соймікаў у 1704–1707 гг. аказвала прысутнасць расійскіх войскаў у межах Полацкага ваяводства. Асноўным пытаннем, якое разглядалася на сойміках у гэты час, было забеспячэнне іх правіянтам. Гэта вымушала мясцовую шляхту абіраць паслоў да расійскіх военачальнікаў і нават да расійскага цара Пятра I. Прысутнасць войскаў у Полацку прымусіла полацкую шляхту змяніць месца правядзення сойміка і перанесці яго з цэнтра ваяводства ва Ушачы. У гэты час у сойміках удзельнічала ад 11 да 90 шляхціцаў. Пры гэтым была прадстаўнічай прысутнасць мясцовых ураднікаў на чале з сенатарамі, ваяводам і кашталянам. Полацкія сойміхі працягвалі выказвацца ў падтрымку Аўгуста II, а пасля яго адмовы выказвалі зацікаўленасць у абранні новага манарха, але не прызнанні каралём С. Ляшчынскага. Аднак ужо ўлетку 1707 г. частка былых лідараў прыхільнікаў Аўгуста II сярод полацкай шляхты пачала пераходзіць на бок Ляшчынскага.

## Крыніцы і літаратура


1. Burdowicz-Nowicki, J. Piotr I, August II i Rzeczpospolita. 1697–1706. – Kraków : Arcana, 2010. – 766 s.
2. Письма и бумаги императора Петра Великого. – Т. 3: 1704–1705 гг. – Санкт-Петербург : Государственная типография, 1893. – XXXII, 1066, LXIV с.
3. Великанов, В. Смоленские полки в Великой Северной войне // Родина. – 2009. – № 9. – С. 53–57.
4. Великанов, В. «Якобштадская конфузия»: русский корпус Б. С. Корсака в сражении при Якобштадте 5 августа 1704 г. // Старый Цейхгауз. – 2013. – № 55. – С. 80–87.

5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 1734 (Полацкі гродскі суд). Воп. 1. Спр. 8. – Актавая кніга Полацкага гродскага суда. 12.01.1704–12.1704. – 775 арк.
6. Rachuba, A. Szczytt Niemirowicz Krzysztof Benedykt // Polski Słownik Biograficzny (далей – PSB). – T. XLVII. – Warszawa – Kraków : Zakład Narodowy im. Ossolińskich [etc.], 2010–2011. – S. 568–570.
7. Archiwum Główne Akt Dawnych (далей – AGAD). – Archiwum Radziwiłłów (далей – AR). – Dział V. Sygn. 15677. – Szczytt Krzysztof. 1693–1718. – 78 k.
8. Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1697–1794): Spis / pod red. A. Rachuby; oprac.: A. Rachuba i P. P. Romaniuk, przy współpr. A. Macuka i J. Aniszczenki. – Warszawa : DiG, 2004. – 448 s.
9. НГАБ. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 9. – Актавая кніга Полацкага гродскага суда. 01.1705–12.1706. – 478 арк.
10. Kamiński, A. Przeciwko Szwedom i Leszczyńskiemu. Działania wojsk rosyjskich na terenie Polski w 1705–1706 roku // Studia i Materiały do Historii Wojskowości. – 1966. – T. XII, cz. 2. – S. 230–259.
11. Российский государственный архив древних актов (далее – РГАДА). – Ф. 79 (Сношения России с Польшей – (коллекция) из фондов Боярской Думы, Посольского приказа, Посольской канцелярии, Коллегии иностранный дел 1718–1719 гг.). Оп. 1. 1705 г. Д. 33. – Статьи воеводства Полоцкого данныя фельдмаршалу Огильвию, отправленному в Россию для испрошения о нетребовании вторичном помянутого воеводства провианту. 03.06.1705. – 1 л.
12. НГАБ. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 1. – Актавая кніга Полацкага гродскага суда. 1660, 04.1707–12.1707. – 637 арк.
13. РГАДА. – Ф. 79. Оп. 1. 1707 г. Д. 55. – Наказ от Полоцкого воеводства послам подстолию Александру Корсаку и кошанскому старосте Яну Жабе. 01.02.1707. – 6 л.
14. НГАБ. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 11. – Актавая кніга Полацкага гродскага суда. 1712 г. – 1093 арк.
15. Kamiński, A. Konfederacja Sandomierska wobec Rosji w okresie poaltransztadzkim. 1706–1709. – Wrocław–Warszawa–Kraków : Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1969. – 159 s.
16. РГАДА. – Ф. 79. Оп. 1. 1707 г. Д. 123. – Наказ от Полоцкого повету послам Юрию Радевецкому ловчему волковыскому и Троянови Лоссовскому отправленным к государю Петру I с представлением о несносных обидах, налогах и разорениях причиняемых в их земле российской армиею. 18.08.1707. – 5 л.
17. Князі Вишневецькі. – Київ : Балтія-Друк, 2016. – 320 с.
18. Czamańska, I. Wiśniowieccy. Monografia rodu. – Poznań : Wydawnictwo Poznańskie, 2007. – 552 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 01.10.2021

*С. Н. Рындин*

# Марковщинский лагерь военнопленных во время Первой мировой войны (по материалам Национального исторического архива Беларуси)

В минувшем десятилетии человечество отметило столетние юбилеи начала и конца Первой мировой войны. Этот глобальный конфликт стал беспрецедентным по своим масштабам. Воюющие государства мобилизовали в ряды своих армий свыше 73 млн человек. В ходе военных действий стороны несли колоссальные потери. Невиданными также стали потери военнопленными. За годы войны в плен попало около 8 млн военнослужащих и более 200 тыс. мирных граждан [25, с. 627–629]. На Восточном фронте из почти 2 млн военнослужащих, взятых в плен российской армией, около 1 млн 737 тыс. служили в австро-венгерской армии [1, с. 183]. Воюющие страны размещали «неприятельских» военнопленных в тыловых лагерях. В России в годы Первой мировой войны было организовано 400 таких лагерей [2, с. 14].

С начала военных действий западные губернии, включая белорусские, являлись для большинства военнопленных в первую очередь транзитной зоной. С полей битв их перевозили в железнодорожных эшелонах на восток. Со временем российские власти, как и власти других государств, участвовавших в войне, начали широко привлекать военнопленных к труду в промышленности и сельском хозяйстве. Это становилось особенно актуальным в виду того, что затянувшаяся война забирала в действующую армию наиболее трудоспособных членов общества. Территорию Беларуси (в пределах 35 белорусских уездов) в числе мобилизованных и беженцев покинула значительная часть населения – около 2 млн из 7,5–8 млн на начало 1914 г. Это были преимущественно крестьяне. Также сократилось и количество местных рабочих – с 519 тыс. в 1913 г. до 270 тыс. в 1917 г. [23, С. 445]. При этом предприятия, выполнявшие военные заказы, значительно (на 15–50%) увеличили объемы своего производства. В частности, в Витебской губернии нарастили выпуск продукции льнопрядильная фабрика «Двина», табачно-махорочные фабрики Колбановского и Ривлина, Витебский сухарный завод, пуговичная фабрика Натансона и ряд других [14, л. 20]. Эти обстоятельства существенно повышали спрос на рабочую силу.

В белорусских губерниях постоянное использование труда военнопленных, главным образом в интересах фронта, началось в конце весны–начале лета 1915 г. 12(25) ноября 1915 г. начальник штаба верховного главнокомандующего М. В. Алексеев приказал формировать из

военнопленных рабочие роты по установленному общему принципу. В течение декабря 1915 – февраля 1916 г. роты сводились в дружины, каждая из которых состояла из шести рот [24, с. 260–261]. К маю 1917 г. в распоряжении учреждений Западного фронта пребывали 10 380 рабочих из числа военнопленных [3, л. 8].

Российские военные власти не допускали постоянного размещения в прифронтовых губерниях военнопленных из коренных немцев, венгров и турок. Можно предположить, что военнопленные в западных губерниях состояли из лиц славянских национальностей (в основном, чехов, словаков русинов и поляков). Это подтверждают и их именные списки, в небольшом количестве сохранившиеся в Национальном историческом архиве Беларуси (далее – НИАБ).

О создании лагерей для военнопленных на территории белорусских губерний в отечественной и зарубежной историографии долгое время ничего не было известно. НИАБ хранит подробные сведения об одном из таких лагерей на территории Витебской губернии. Лагерь был развернут в районе села Марковщина в Витебском уезде (в настоящее время – район в юго-западной части г. Витебска) и, согласно архивным документам, просуществовал в течение всей войны. О Марковщинском лагере, как о важном тыловом объекте российской армии, говорилось в письме из штаба Двинского военного округа витебским военным властям в сентябре 1915 г.: *«По шоссе на Марковщизну, за железнодорожным переездом, образовался военный городок с населением до 10 тысяч нижних воинских чинов и более 2 тысяч военнопленных. Там собраны самые разнородные части: полевые хлебопекарни, запасный артиллерийский дивизион, мортирные дивизионы, пересыльные команды нижних чинов этапного пункта и военнопленные <…>»* [5, л. 1001]. В этой местности располагались и армейские госпитали [7, л. 165 об.]. Лазарет действовал также в Марковом Свято-Троицком мужском монастыре, от которого, по преданию, произошел топоним «Марковщина» [8, л. 91]. Факт существования в этом районе лагеря военнопленных времен Первой мировой войны в настоящее время практически неизвестен. В литературе упоминаются только лагеря в центральных и восточных губерниях Российской империи.

В данной статье будет проведен обзор выявленных документов и проанализирована их информативность: период существования лагеря, условия содержания военнопленных, отношения заключенных иностранных военнослужащих с лагерной администрацией, руководством и персоналом хозяйственных объектов, использовавших труд военнопленных, масштаб применения труда. Большой интерес представляют документы, содержащие сведения о самих военнопленных: подданство, национальность, именные списки.

Все выявленные документы относятся к источникам официального делопроизводства. Они хранятся в фондах как военных, так и гражданских учреждений. Наиболее информативны фонды Марковщинского и Витебского комендантских управлений. Преимущественно они состоят из приказов и рапортов.

Приказы обычно предельно лаконичны, но могут пролить свет на некоторые реалии жизни военнопленных. Военные власти часто предписывали строгий надзор за «неприятельскими» солдатами. Но на практике такой надзор не всегда соблюдался. В одном из приказов по Марковщинскому комендантскому управлению, датированном 12(25) ноября 1915 г., констатируются пьянство и небрежность среди солдат-конвоиров. Как утверждал марковщинский комендант, он застал колонну военнопленных, которые шли по шоссе с работ *«кто как хотел»* в сопровождении сильно нетрезвого конвоира [17, л. 6]. В мае 1916 г. главный начальник Двинского военного округа, генерал от инфантерии Д. П. Зуев писал местным властям о военнопленных австрийцах и германцах, свободно гуляющих по г. Витебску без сопровождения, и требовал усилить надзор за военнопленными и не допускать их увольнения в город вовсе [21, л. 219].

Приказы содержат также информацию о применении труда военнопленных на оборонных предприятиях Витебской губернии. Например, в феврале 1916 г. марковщинский комендант полковник Кулинский приказал ежедневно с 6 утра направлять 25 человек из смешанной рабочей команды военнопленных на льнопрядильную фабрику «Двина». Приказ был отдан на основании прошения фабрики, одобренного военными властями [21, л. 109]. При этом директор фабрики Д. А. Тфельд обещал отпускать рабочим из средств фабрики паек в качестве оплаты и ежедневное питание [21, л. 129].

В сентябре этого же года новый марковщинский комендант полковник Соболев решил посетить военнопленных на фабрике «Двина». Об увиденном он написал начальнику рабочей команды: *«1) Помещения содержатся грязно, 2) воздух спертый, 3) не имея матов, спят на рогожах, шинелях или на досках, 4) обед – горох, был слегка теплый»* [21, л. 364].

Разнообразная информация представлена в рапортах. Например, серьезную обеспокоенность у военных чиновников вызывали побеги военнопленных. Такие донесения составляют значительную часть всех сохранившихся рапортов. Об одном из наиболее ранних случаев побега из Марковщинского лагеря было доложено в августе 1915 г. Военнопленный бежал из 43-й смешанной рабочей роты, занятой на постройке заразных бараков на Марковском поле [4, л. 470]. В августе 1916 г. марковщинский комендант Кулинский докладывал об участившихся

случаях побегов военнопленных из 6-й рабочей команды военнопленных. Указывалось, что военнопленные скрываются в лесу, в окрестных деревнях и фольварках, идут в батраки к местным крестьянам, а для установления соответствующего надзора недостаточно людей [19, л. 106]. В январе 1917 г. командир 6-й рабочей команды из военнопленных штабс-капитан Сафонов описал марковщинскому коменданту несколько случаев, когда военнопленные самовольно отлучались, чтобы поступить на частные работы в промышленности и сельском хозяйстве. Там иностранцы рассчитывали на высокую плату и комфортные условия проживания. Спрос на рабочие руки оставался очень большим, а военные власти предоставляли военнопленных только ограниченному кругу предприятий, обслуживавших фронт [12, л. 1262–1263].

Ко многим рапортам прикладывались списки войсковых частей, именные списки, протоколы осмотра помещений лагеря, сдаточные описи бараков и землянок, сведения о штатном и наличном составе рабочих команд и т. п.

Большой интерес представляют списки войсковых частей, располагавшихся в г. Витебске и его окрестностях. В них упоминаются также части, размещавшиеся в Марковщине. Сохранились сведения о штатном и наличном составе трудовых формирований из военнопленных. Например, согласно списку войсковых частей, дислоцированных в г. Витебске и его ближайших окрестностях в 1916 г., в лагере побывали смешанные рабочие роты 41 по 47 включительно, 132-я и 133-я железно-дорожные рабочие роты, 6-я запасная железно-дорожная рабочая рота и т. д. [7, л. 116 об., 121]. Но количество военнопленных в лагере часто менялось, поскольку трудовые команды прибывали и выбывали.

В документах НИАБ нередко упоминается смешанная команда, расквартированная в землянках Марковщинского лагеря. Документы из Российского государственного военно-исторического архива позволили установить, что это была крупная смешанная рабочая команда иностранных военнопленных, насчитывавшая в конце 1915 г. 2 000 человек. При управлении витебского этапного коменданта она состояла с августа 1915 г. и до перевода в Витебскую губернию находилась на окопных работах в Сувалкской губернии [22, л. 251–252]. В приказе по войскам Марковщинского гарнизона от 21 марта (3 апреля) 1916 г. было упомянуто, что смешанная команда покинула марковщинские бараки [9, л. 53–53 об.].

Обширные сведения о бытовых условиях военнопленных в Марковщинском лагере имеются в отчете инспекторского осмотра 6-й рабочей команды военнопленных от 26 сентября (9 октября) 1916 г. Этот материал также хранится в фонде Марковщинского комендантского управления. 6-я рабочая команда являлась одним из крупных (свыше 700 чел.)

формирований в Марковщине, где она пребывала бессменно с 1(14) сентября 1915 г. [12, л. 1262]. Труд этой команды, состоявшей исключительно из австро-венгерских подданных, был широко востребован на оборонных предприятиях Витебской губернии. 21 сентября (4 октября) 1916 г. главный начальник Двинского военного округа Д. П. Зуев приказал марковщинскому коменданту Соболеву провести инспекторский осмотр команды и о результатах доложить в штаб округа. В этом отчете были проанализированы практически все стороны жизнедеятельности команды: списочный и наличный состав, организация команды, размещение, довольствие горячей пищей, чайное, мыльное, табачное довольствие, удовлетворение религиозных нужд, почтовая связь, санчасть, баня, вооружение, снаряжение, обмундирование, обувь, белье, денежные суммы, цейхгаузы, мастерские, делопроизводство, журнал взысканий [21, л. 351–355 об.]. В ходе работы над отчетом были также опрошены 46 кадровых военных и 528 военнопленных. В целом вид людей комендант оценил как *«здоровый и бодрый»*. Из отчета можно узнать, что команда занимала 16 землянок, в каждой из которых проживало 50 человек. Землянки освещались керосиновыми лампами. Для водоснабжения личного состава имелся колодец. Кроме этого, около землянок выставлялись ушаты с кранами, наполненные остуженной кипяченой водой. Были предусмотрены умывальники. Одна из землянок представляла собой прачечную с горячей водой. Команда была устроена как армейская единица, делилась на роты и взводы [21, л. 351–351 об.].

В рацион команды входили мясо, хлеб, крупа, пшено, масло, чай, сахар, которые поставлялись за счет государства. На средства команды покупались и другие продукты. Столовая команды вмещала 540 человек. Однако паек военнопленных был меньше, чем у российских солдат. Например, российским военным полагалось 3 фунта хлеба в сутки, а военнопленным – 2,5 [21, л. 352–353].

Для исполнения религиозных обрядов военнопленные отпускались в свои церкви. При команде был также ящик для почтовых сообщений. Письма отправлялись ежедневно, но обязательно проходили через цензурную комиссию. Команда располагала санитарной частью с 10 койками и изоляционной комнатой. В санчасти дежурили два врача из военнопленных, но при необходимости больные направлялись в госпиталь. Военнопленным рабочим делались прививки от тифа. Один раз в месяц устраивался банный день. Обмундирование и обувь команды комендант охарактеризовал как *«удовлетворительные»* [21, л. 353–353 об.]. Сапоги пленным уже не полагались. 7(20) апреля 1916 г. главнокомандующий армиями Западного фронта, генерал от инфантерии А. Е. Эверт приказал прекратить отпуск пленным сапог *«в виду недостатка кожаной обуви»*. Вместо сапог выдавались лапти [20, л. 60]. Но «казенные»

лапти быстро изнашивались, поэтому в команде наладили производство собственных лаптей с веревочными подошвами, что делало их более крепкими. При команде был устроен целый ряд мастерских: сапожная, столярная, портняжная, кузнечная. Кроме обслуживания нужд команды, мастера занимались также и частными заказами [21, л. 353 об.–354 об.].

Взысканиям подверглись 48 человек: 25 – за отлучки, 23 – за уклонение от работ. Провинившихся обычно сажали под арест на 1–2 суток [21, л. 354 об.]. Приложение к отчету с информацией о побегах не сохранилось.

В целом комендант дал положительную оценку состоянию команды. Особенно подчеркнул службу ее командира, штабс-капитана Сафонова. По его словам, командир руководит со *«знанием дела и широкой инициативой»* [21, л. 355 об.]. С 16(29) июля 1916 г. Сафонов являлся также военным полицмейстером Марковщинского гарнизона *«в целях поддержания наружного порядка, чистоты и урегулирования между расположенными частями в лагере военнопленных вблизи Марковщинского шоссе»* [9, л. 164].

Комендант обозначил и ряд недостатков: малочисленность караула, нехватка у военнопленных второй смены белья, недостаточность банных дней, отсутствие полевой кухни для зимнего времени, некомплект противопожарного инвентаря и т. д. [21, л. 355–355 об.]. Об энергичности командира команды Сафонова можно судить по его сохранившимся рапортам. Вскоре после инспекции Соболева Сафонов докладывал, что все пленные обеспечены спальными матами, недостающие комплекты белья заказаны на фабрике Даненберга [21, л. 366–366 об.].

Поименные списки военнопленных, пребывавших в Марковщинском лагере, в фондах НИАБ почти отсутствуют. Преобладают списки солдат конвоя. Сохранились именные списки хозяйственных работников Витебского заразного госпиталя, состоящих из военнопленных 6-й рабочей команды [13, л. 142–143]. В архивном фонде канцелярии старшего фабричного инспектора Витебской губернии имеются немногочисленные именные списки военнопленных, трудившихся на заводах Витебской губернии. Однако имена военнопленных чаще фигурируют в документах о розыске беглецов. В этих материалах сообщаются также и личные приметы. К сожалению, до настоящего времени не выявлено ни одной фотокарточки.

В НИАБ хранятся также описи всех землянок, бараков и хозяйственных строений в Марковщине за 1915–1917 гг., где детально описаны жилые и хозяйственные постройки для размещения военнопленных. Согласно этим материалам, к 30 октября (12 ноября) 1916 г. в ведении Марковщинского комендантского управления всего находились 40 землянок для военнопленных на 50 человек каждая, 2 землянки на 60 воен-

нопленных каждая, 1 столовая-кухня на 2 000 военнопленных и 112 кадровых нижних чинов [11, л. 1634].

В случае дальних и продолжительных трудовых командировок военнопленных селили недалеко от места работ. Это могло быть и частное жилье. Сохранилось прошение жителя г. Витебска мещанина А. Н. Кузьмина, просившего в августе 1917 г. выселить из его квартиры военнопленных 6-й рабочей команды в виду стеснения. Рабочие занимались строительством колодца [10, л. 1004–1004 об.].

Об отношениях военнопленных и их конвоиров сохранившиеся документы почти ничего не сообщают. 3(16) декабря 1916 г. начальник 6-й рабочей команды из военнопленных Сафонов получил письмо от марковщинского коменданта Соболева, проводившего очередную инспекцию. Комендант заявил, что ужин, приготовленный военнопленными для солдат караула гауптвахты, *«был очень плохой, жидкий, почти одна вода»*. По словам Соболева, подобное случалось неоднократно, в то время как пища на кухне всегда была хорошей. Комендант стал подозревать, что военнопленные умышленно отпускают российским солдатам пищу пожиже [6, л. 964–964 об.].

Также в документах НИАБ не прослеживается отношение иностранных военнопленных к политическим событиям в России после февраля 1917 г. В фонде Витебского комендантского управления встречаются только сведения о настроениях среди конвоя военнопленных осенью 1917 г. накануне прихода к власти большевиков. Во всех рапортах отмечается, что солдаты конвоя проявляют лояльность Временному правительству.

Трудовые команды из военнопленных продолжили свое существование и после установления советской власти. Но в фондах НИАБ эта информация очень ограничена. В кассовой книге фабрики «Двина» последняя выдача зарплаты *«пленным австрийцам»* зафиксирована 24 февраля 1918 г. [15, л. 126] Командный состав 6-й рабочей команды военнопленных состоял к апрелю 1918 г. уже из самих военнопленных (формально после заключения 3 марта 1918 г. Брестского сепаратного мира они считались свободными людьми) [18, л. 23]. В кассовой книге акционерного общества «Левенбрей» имеются сведения об использовании труда военнопленных в хлебопекарне и кофейной фабрике с сентября 1916 г. по июнь 1918 г. Но этот хронологический отрезок определяется сохранившимися в деле документами, полный период пребывания военнопленных в распоряжении «Левенбрея» остается неизвестным [16].

Таким образом, Марковщинский лагерь существовал приблизительно с лета 1915 г. и активно использовался в течение всей войны. Основу его трудового контингента составляла 6-я рабочая команда из австро-

венгерских военнопленных, восполнявшая острую нехватку рабочих рук на многих промышленных предприятиях Витебщины. Документы, хранящиеся в НИАБ, позволяют осветить такие аспекты, как количественный состав иностранных военнопленных в Марковщинском лагере, их организацию, использование труда, бытовые условия, этническую принадлежность. Обнаруженные именные списки могут быть востребованы в ходе генеалогических исследований. В меньшей степени источники НИАБ позволяют увидеть адаптацию военнопленных в новой для них среде, их взаимные отношения и отношения с местной администрацией, населением. Тем не менее, выявленные документы позволяют утверждать, что условия жизни и труда военнопленных Марковщинского лагеря были удовлетворительными. Лагерное начальство воспринимало этих людей, прежде всего, как рабочих, а не заключенных, и в меру своих возможностей старалось обеспечить их всем необходимым для продуктивной работы на фоне острого дефицита рабочей силы. В историографии приводятся различные примеры обращения с военнопленными в России в период Первой мировой войны. Обращается внимание на высокую смертность в азиатских лагерях, тяжелые условия работы на Мурманской железной дороге и т. д. Документы НИАБ подтверждают точку зрения, что качество жизни военнопленных в Российской империи варьировалось в зависимости от региона. Этническая принадлежность также имела значение. Отношение к военнопленным славянам было лучше. Определенную роль играли и личные качества начальников трудовых команд и вышестоящих инстанций. Многое зависело от уровня их компетентности, ответственности, энергичности и человечности.

## Источники и литература


1. Белова, И. Б. Вынужденные мигранты : беженцы и военнопленные Первой мировой войны в России. 1914–1925 гг. (По материалам центральных губерний Европейской России) : дис. … д-ра ист. наук : 07.00.02 / И. Б. Белова. – Брянск, 2014. – 461 с.
2. Идрисова, Э. С. Иностранные военнопленные Первой мировой войны на Южном Урале в 1914–1921 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Э. С. Идрисова ; Оренбург. гос. пед. ун-т. – Оренбург, 2008. – 24 с.
У межах гэтай серыі ад самага пачатку планаваліся асобныя тамы, якія павінны былі асвятляць выступленне ў Беларусі і Літве. Гэта ставіла перад беларускімі даследчыкамі дастаткова важныя задачы, у першую чаргу арганізацыйнага плана. Неабходна было арганізаваць працу прыкладна паўтара дзясятка чалавек, ніводзін з якіх не з'яўляўся спецыялістам у гісторыі непасрэдна паўстання. Паміж літоўскімі і беларускімі даследчыкамі адбыўся своеасаблівы падзел кірункаў работы ў адпаведнасці са знаходжаннем на тэрыторыі той ці іншай савецкай рэспублікі (БССР і ЛітССР) архіўных сховішчаў. Выяўленнем і падрыхтоўкай да друку матэрыялаў з фондаў Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Літоўскай ССР (далей – ЦДГА ЛітССР) займаліся яго супрацоўнікі і спецыялісты з Інстытута гісторыі Акадэміі навук ЛітССР. Імі ў асноўным выяўляўся матэрыял для агульнага (уводнага) раздзела, а таксама раздзелаў па Ковенскай і Віленскай губернях.

У Беларусі над каардынацыяй выяўлення і капіравання дакументаў працавалі некалькі чалавек:

• намеснік начальніка, затым начальнік аддзела дарэвалюцыйных фондаў Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці (1956–1964) Тамара Лявонцьева – у сферу яе адказнасці ўваходзілі матэрыялы па Мінскай губерні;

• намеснік дырэктара Філіяла Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва (далей – ЦДГА) БССР у г. Гродна (1957–1959), рэдактар навукова-інфармацыйнага бюлетэня Архіўнага ўпраўлення (далей – АУ) МУС (з 1960 г. – пры Савеце Міністраў) БССР (1959–1962) і начальнік навукова-выдавецкага аддзела таго ж упраўлення (1962–1969) Людміла Аржаева – адказвала за матэрыялы па Гродзенскай губерні;

• малодшы навуковы супрацоўнік сектара публікацыі дакументаў і матэрыялаў Інстытута гісторыі АН БССР (1959–1963) Нера Булдакова – адказвала за матэрыялы па Віцебскай і Магілёўскай губернях.

У кожным з беларускіх архіваў, дзе захоўваліся неабходныя для праекта матэрыялы, былі арганізаваны рабочыя групы (брыгады), якія непасрэдна выяўлялі і капіравалі дакументы. Гэта і былі, так бы мовіць, нізавыя звенні, рукамі якіх выконвалася вялікая частка даследавання

на пачатковым этапе. У іх задачы ўваходзіла выяўленне неабходных матэрыялаў і фіксацыя звестак пра выяўленыя дакументы на асобных картках (1958 – першая палова 1960 г.), а на наступным этапе (з ліпеня 1960 г.) – капіраванне адабраных дакументаў. У Філіяле ЦДГА БССР у г. Гродна, які з 1964 г. стаў самастойным архівам – ЦДГА БССР у г. Гродне, – такую групу складалі Карына Батракова, Вера Барэйкіна, Валянціна Кісялёва, Фаіна Храброва, Э. А. Марэнка і Л. П. Панова[1]. У Дзяржаўным архіве Мінскай вобласці ў падобную групу ўваходзілі Тамара Вараб'ёва, Іван Рошчын і Дзіна Шорахава. У ЦДГА БССР, які яшчэ размяшчаўся ў г. Магілёве, падобнай дзейнасцю займаўся толькі Уладзімір Пахвалаў [13, с. LI–LII]. Варта адзначыць, што гэта – дастаткова прадстаўнічы спіс. Нягледзячы на тое, што ў той час (канец 1950-х – пачатак 1960-х гг.) гэта былі пераважна маладыя супрацоўнікі, якія прыйшлі ў архіўную галіну незадоўга да таго, у далейшым многія з іх дасягнулі значных поспехаў, а як мінімум шасцёра сталі кіраўнікамі рэспубліканскіх архіваў альбо іх намеснікамі (біяграфічныя звесткі пра большую частку згаданых асоб гл.: [2]).

У вышэйпрыведзеным шэрагу архіваў вылучаецца ЦДГА БССР, у фондах якога выяўленне неабходных матэрыялаў праводзілася, як бачна, у невялікай ступені. Тлумачыцца гэта тым фактам, што ў канцы 1950-х – пачатку 1960-х гг. ён перажываў перыяд сваёй рэарганізацыі і пераезду з г. Магілёва ў г. Мінск, што было завершана толькі ў 1964 г., калі працэс выяўлення і археаграфічнай падрыхтоўкі дакументаў ужо быў скончаны.

Неабходна таксама згадаць, што ў выяўленні матэрыялаў па гісторыі паўстання ў фондах Дзяржархіва Мінскай вобласці ўдзельнічаў таксама супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР Анатоль Грыцкевіч – у далейшым знакаміты беларускі гісторык [12, арк. 104; 13, с. XX].

Пра аб'ём праведзенай работы гавораць выніковыя даныя. Так, у Дзяржархіве Мінскай вобласці было прагледжана 1500 спраў, а выяўленыя матэрыялы апісаны на 3858 картках [12, арк. 2]. У ЦДГА БССР У. Пахвалавым прапрацавана 459 спраў (47006 аркушаў) і выяўленыя матэрыялы анатаваны на 273 картках [11, арк. 106–107].

Архівістамі праводзілася першаснае выяўленне і капіраванне матэрыялаў, аднак абавязкі па непасрэдным фарміраванні зборнікаў, у тым ліку адборы дакументаў, іх навуковай апрацоўцы і падрыхтоўцы да друку ў выглядзе паўнавартаснага рукапісу былі ўскладзены на Інстытут гісторыі АН БССР. У яго межах гэтым займаўся спачатку сектар публікацый, які пасля структурнай рэарганізацыі ў 1959 г. быў рэфармава-

---

[1] На жаль, ідэнтыфікаваць больш дакладна імёны двух апошніх супрацоўнікаў ЦДГА БССР у г. Гродна не ўдалося.

ны, і пэўная частка яго супрацоўнікаў перайшла ў наваствораны сектар эпохі капіталізму[2]. Абодвума сектарамі кіраваў Канстанцін Шабуня, і менавіта ён прадстаўляў Інстытут гісторыі ў складзе рэдакцыйных калегій абодвух прысвечаных Беларусі і Літве тамоў (яшчэ адным прадстаўніком беларускага боку з’яўляўся начальнік выдавецкага аддзела АУ БССР Віктар Жыгалаў). Для арганізацыі адпаведнай работы ў Інстытуце ўводзілася асобная навуковая тэма «Паўстанне 1863 г. Зборнік дакументаў» (фармулёўка тэмы ў розных планах і справаздачах Інстытута магла мець пэўныя адрозненні). У 1959 г. выканаўцамі гэтай тэмы з’яўляліся Сусана Байкова (з 1964 г. – Самбук), Н. Булдакова і А. Грыцкевіч [15, арк. 41]. Пра ролю дваіх апошніх ужо згадана вышэй, а вось менавіта першай з іх – С. Байковай – належыць найбольшая заслуга ў працы над зборнікам у Інстытуце гісторыі. З 1959 г. яна з’яўлялася адказнай за складанне тых раздзелаў тамоў серыі, якія тычыліся гісторыі паўстання ў Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях [4, с. XVI; 13, с. XX]. Менавіта яна прадстаўляла (разам з К. Шабунем) Інстытут гісторыі на нарадзе 17–18 мая 1960 г. у Вільні, дзе беларускімі і літоўскімі даследчыкамі абмяркоўваліся пытанні ўзаемадзеяння пры рабоце над зборнікам [11, арк. 109].

Варта адзначыць, што ў Інстытуце С. Байкова з 1959 г. была адказнай не толькі за падрыхтоўку зборніка дакументаў, але і ў цэлым за распрацоўку навуковай тэмы «Паўстанне 1863 г.». Раздзел па гісторыі паўстання ў Беларусі быў падрыхтаваны ёю для другога выдання акадэмічнай «Гісторыі Беларускай ССР», першы том якога выйшаў з друку ў 1961 г. [3]. Прычым у гэтым раздзеле адбыўся перагляд шэрагу ўжо састарэлых на той час ацэнак важных праблем паўстання, напрыклад, агульная ацэнка яго характару, дадзеная ў папярэднім выданні акадэмікам Уладзімірам Перцавым. Дзейнасць па рэдагаванні матэрыялаў для тамоў серыі зборнікаў дакументаў была завершана С. Байковай таксама паспяхова і ў запланаваны час – у снежні 1963 г. [15, арк. 19–19 адв., 40, 41–42; 16, арк. 12, 22 адв., 39–39 адв., 83–85, 100–101, 116 і інш.; 17, арк. 4, 8].

Прыцягненне да рэалізацыі праекта ў Беларусі як архівістаў, так і гісторыкаў дазволіла ў дастаткова кароткі час сабраць і апрацаваць неабходны матэрыял. У выніку ў 1964 і 1965 гг. з’явіліся ў свет два тамы, у якіх асвятляўся працэс падрыхтоўкі паўстання [13] і непасрэднага выступлення і яго задушэння [4] у 1859–1864 гг. У іх апублікаваны 608 дакументаў пераважна з архіўных сховішчаў Беларусі, Літвы і Расіі, забяспечаныя высакаякасным навукова-даведачным апаратам (прадмова,

---

[2] У 1963 г. сектары эпохі капіталізму і эпохі феадалізму былі аб’яднаны ў адзіны сектар гісторыі Беларусі дасавецкага грамадства. Яго кіраўніком таксама застаўся К. Шабуня.

каментарыі, паказальнікі і інш.). Гэта стала самай маштабнай акцыяй па выяўленні і публікацыі дакументаў па гісторыі паўстання ў Беларусі за ўвесь савецкі перыяд.

Аднак яшчэ падчас рэалізацыі ўсяго праекта некаторымі гісторыкамі выказваліся пэўныя крытычныя заўвагі. Напрыклад, Мікалай Улашчык у 1968 г. выказаў сумненне ў абгрунтаванасці суадносін колькасці апублікаваных дакументаў па пэўных тэрыторыях. У прыватнасці, яго не задавальняў той факт, што паўстанню ў Правабярэжнай Украіне, дзе яно было развіта найбольш слаба з усіх ахопленых ім тэрыторый, прысвечаны два асобныя тамы, у той час, як паўстанню ў Беларусі і Літве, дзе яно разгарнулася непараўнальна больш шырока і інтэнсіўна, было аддадзена таксама два. Апрача гэтага, ён лічыў больш мэтазгоднай падрыхтоўку асобнага тома, прысвечанага падзеям у Літве, і асобнага – падзеям у Беларусі [14, с. 71–75].

Ацэньваючы ўдзел беларускіх даследчыкаў у рэалізацыі праекта, немагчыма не згадаць пра ролю Генадзя Кісялёва, хоць на той час ён знаходзіўся на працы ў Вільні – у ЦДГА ЛітССР і АУ МУС (з 1960 г. – пры Савеце Міністраў) ЛітССР. Яго роля ў складанні тамоў, прысвечаных Беларусі і Літве, была вельмі важнай. Падчас працы над ханалагічна першым з іх ён з'яўляўся кіраўніком літоўскай групы архівістаў, якія займаліся выяўленнем дакументаў, у другім з'яўляўся яшчэ і складальнікам усіх раздзелаў, якімі не займалася С. Байкова (агульны раздзел, а таксама раздзелы па Віленскай, Ковенскай і Аўгустоўскай губернях). І ў прадмовах да абодвух тамоў пазначана: *«Рэдагаванне археаграфічнай апрацоўкі дакументаў зроблена Г. В. Кісялёвым; ён жа падрыхтаваў археаграфічную частку прадмовы»* [4, с. XLI; 13, с. LII]. Пры гэтым ён не проста зрабіў рэдагаванне і паўдзельнічаў у напісанні прадмовы, а на падставе назапашанага досведу распрацаваў асобную памятку (ці рабочую інструкцыю) па археаграфічнай апрацоўцы выяўленых дакументаў, якая ў 1962 г. была прынята за аснову не толькі для тамоў па Беларусі і Літве, а для ўсёй "савецкай" часткі серыі, прынамсі, тых тамоў, што яшчэ не былі падрыхтаваны да друку [19].

Гаворачы пра беларускіх гісторыкаў у рэалізацыі праекта, немагчыма абмінуць увагай яшчэ аднаго даследчыка – вышэйзгаданага Стэфана Кяневіча, які нарадзіўся ў 1907 г. у в. Дарашэвічы Мазырскага пав. (у цяперашні час – Ляскавіцкага с/с Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці) і паходзіў са старажытнага беларускага шляхецкага роду. Задоўга да Другой сусветнай вайны ён пасяліўся ў Варшаве, дзе і адбылося яго станаўленне як гісторыка. Прычым не шараговага, а аднаго з найлепшых у сваім пакаленні спецыялістаў па гісторыі зямель былой Рэчы Паспалітай перыяду «доўгага XIX стагоддзя». У межах польска-савецкага праекта, а таксама далёка па-за імі, ён выконваў ролю акумулятара

дасягненняў у галіне даследаванняў паўстання, прычым як з польскага, так і з савецкага бакоў. Ён выступаў з праграмнымі дакладамі [5; 24; 25], аглядамі і прамежкавымі справаздачамі аб дасягнутых выніках [20; 21; 23; 26], рэцэнзіямі на працы іншых даследчыкаў [27; 28; 29; 30], уваходзіў у склад рэдакцыйнай калегіі ўсёй серыі і непасрэдна займаўся падрыхтоўкай шматлікіх тамоў. Гэта дазволіла яму сабраць вельмі багаты матэрыял, апрацаваць яго і выдаць у выглядзе галоўнай працы пасляваеннага перыяду гістарыяграфіі паўстання – аб'ёмнай манаграфіі пад назвай «Студзеньскае паўстанне», якая выйшла ў 1972 г. [22].

Апрача ўвядзення ў навуковы ўжытак значнай колькасці каштоўных гістарычных крыніц, для развіцця беларускай гістарыяграфіі паўстання паспяховая рэалізацыя дадзенага праекта важная яшчэ з некалькіх прычын. Па-першае, беларускія гісторыкі атрымалі магчымасць кантактаў і ўзаемаабмену досведам з прадстаўнікамі іншых гістарыяграфічных традыцый, прычым асаблівую важнасць тут мае ўдзел польскага боку. Нават у адным з лістоў Інстытута славяназнаўства пра неабходнасць такога праекта пісалася: *«Няма патрэбы даказваць якое вялікае грамадска-палітычнае значэнне міжнародных навуковых сувязей, у асаблівасці ў поўным сэнсе слова сумеснай працы і сумесных выданняў. У галіне гістарычнай навукі такіх прыкладаў <…> яшчэ не было. Такая сумесная праца, пры гэтым праца па гісторыі Польшчы, якая мае на мэце выяўленне традыцый сумеснай рэвалюцыйнай барацьбы польскага і рускага народу, – палітычна важная і патрэбная справа»* [11, арк. 3]. Апускаючы выразную палітызаванасць усяго абгрунтавання, варта яшчэ раз падкрэсліць – для свайго часу гэта быў выпадак выключны.

Па-другое, падбор дакументаў, а таксама прадмовы да тамоў, якія з упэўненасцю магчыма разглядаць як асобныя гістарыяграфічна-гістарычныя працы, выразна засведчылі пра канчатковы адыход ад палажэння прынятых у 1948 г. «Тэзісаў аб асноўных пытаннях гісторыі БССР» аб "сялянскасці" паўстання ў Беларусі (пра канцэпцыю «сялянскага паўстання» 1863 г. у Беларусі гл.: [9]). З таго часу яно пачало разглядацца не як наступства выключна сялянскага руху, а як вынік збегу шэрагу прычын: з аднаго боку, аграрнага крызісу ў Расійскай імперыі і, як выніку, узмацнення сялянскіх выступленняў і распаўсюджання рэвалюцыйных ідэй, з другога, развіцця «нацыянальна-вызваленчага» руху на землях былой Рэчы Паспалітай. Асноўнай перадавой рухаючай сілай паўстання абвяшчаліся не «сялянскія рэвалюцыянеры», а «рэвалюцыйныя дэмакраты», да якіх адносіўся К. Каліноўскі і кола яго бліжэйшых паплечнікаў (лагер «чырвоных»). Хаця менавіта на аграрным пытанні і стаўленні сялянства да паўстання будзе канцэнтравацца значная ўвага беларускіх даследчыкаў на працягу ўсяго савецкага пасляваеннага перыяду.

У цэлым, высокі ўзровень падрыхтоўкі тамоў серыі, прысвечаных Беларусі і Літве, гарантаваў ім працяглае “жыццё”, бо без іх выкарыстання да цяперашняга часу не абыходзіцца ніводнае хаця б больш-менш сур’ёзнае даследаванне па гісторыі паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі. Іх навуковая актуальнасць, мяркуючы па сённяшняй тэндэнцыі, яшчэ доўга не будзе страчана. Як бачна з вышэйпрыведзенага матэрыялу, беларускія архівісты і гісторыкі зрабілі істотны ўнёсак у рэалізацыю праекта па іх выданні. Дасягнуты высокі ўзровень яшчэ некалькі наступных дзесяцігоддзяў будзе заставацца недасягальным для даследчыкаў. Чарговыя маштабныя (хоць і не настолькі) праекты па масавым выяўленні ў беларускіх архіўных сховішчах матэрыялаў па гісторыі паўстання і ўвядзенні іх у навуковы ўжытак будуць рэалізаваны толькі ў пачатку XXI стагоддзя.

## Крыніцы і літаратура


1. Аржаева, Л. В. Публикация исторических источников в БССР // Вопросы архивоведения и источниковедения в БССР : Материалы научной конференции архивистов и историков, посвященной 50-летию архивного строительства в СССР (г. Минск, 1968 г.). – Минск : Вышэйшая школа, 1971. – С. 293–305.
2. Архівісты Беларусі: біябібліяграфічны даведнік / склад.: С. У. Жумар, М. Ф. Шумейка. – Мінск : БелНДІДАС, 2020. – 303 с.
3. Байкова, С. М. Восстание 1863 г. в Белоруссии // История Белорусской ССР. – 2 изд., дополненное. – В 2 т. / Академия наук БССР, Институт истории. – Т. 1 / [З. Е. Абезгауз и др.]. – Минск : Изд-во Академии наук БССР, 1961. – С. 351–369.
4. Восстание в Литве и Белоруссии 1863–1864 гг.: Сб. документов / АН СССР, Ин-т славяноведения и др. – Москва; Вроцлав : Наука, 1965. – 586 с. – (Восстание 1863 года : Материалы и документы / [гл. ред. серии: С. Кеневич и др.]).
5. Кеневич, С. Из проблематики восстания 1863–1864 гг. // Краткие сообщения Института славяноведения. – Т. 24. – Москва : Издательство АН СССР, 1958. – С. 47–57.
6. Королюк, В. Д., Миллер, И. С. О совместной советско-польской публикации источников по истории восстания 1863–1864 годов // Новая и новейшая история. – 1958. – № 5. – С. 178–181.
7. Костюшко, И. И. К столетию восстания 1863 г. в Царстве Польском, Литве, Белоруссии и Правобережной Украине // Вопросы истории. – 1963. – № 1. – С. 86–99.
8. Макарова, Г. В. Изучение истории восстания 1863 г. в Институте славяноведения в 1960–1970-х гг. // Powstanie styczniowe. 1863–1864. Walka i uczestnicy. Represje i wygnanie. Historiografia i tradycja / pod red. W. Cabana i W. Śliwowskiej. – Kielce : Wydawnictwo Akademii Świętokrzyskiej, 2005. – S. 259–266.

9. Матвейчык, Д. Ч. «Сялянскае паўстанне 1863 года»: нараджэнне і няпоўная смерць адной гістарыяграфічнай канцэпцыі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2021. – № 10. – С. 10–17.
10. Миллер, И. С. «Восстание 1863 года» (Об опыте подготовки советско-польского серийного издания документов) // Археографический ежегодник за 1972 год. – Москва : Наука, 1974. – С. 36–48.
11. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Ф. 249 (Дэпартамент па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь). Воп. 5. Спр. 637. – Матэрыялы да падрыхтоўкі да выдання зборніка дакументаў «Паўстанне 1863–1864 гг.» (пагадненні, інструкцыі, планы, указанні, перапіска). 07.10.1957–10.07.1965. – 412 арк.
12. НАРБ. – Ф. 249. Воп. 5. Спр. 1063. – Матэрыялы (планы, дакументы, паведамленні, заключэнні) семінара работнікаў архіўных устаноў БССР па публікацыйнай рабоце. 13.07.1965–03.12.1965. – 172 арк.
13. Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861–1862 гг. / редкол.: В. Дьяков и др.; подгот.: Л. Аржаева и др. – Москва : Наука, 1964. – LXXI+707 с. – (Восстание 1863 года : Материалы и документы / [гл. ред. серии: С. Кеневич и др.]).
14. Улащик, Н. Н. [рецензия на:] Восстание 1863 года. Материалы и документы // Советское славяноведение. – 1966. – № 4. – С. 70–75.
15. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей – ЦНА НАНБ). – Ф. 3 (Інстытут гісторыі). Воп. 1. Спр. 340. – Гадавыя справаздачы аб навукова-даследчай рабоце сектараў і навуковых супрацоўнікаў. 1959 г. – 169 арк.
16. ЦНА НАНБ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 444. – Пратаколы пасяджэнняў сектара гісторыі Беларусі перыяду капіталізму. 02.01.1962–26.11.1962. – 118 арк.
17. ЦНА НАНБ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 473. – Справаздача Інстытута гісторыі АН БССР аб выкананні плана навукова-даследчых работ за 1963 год. – 22 арк.
18. Шумейко, М. Ф. Белорусская археография в XIX–XX вв. (Проблемы теории, истории, методики). – Минск : БелНДИДАД, 2007. – 496 с.
19. Шумейко, М. Ф. Из истории подготовки международных публикаций (Методические рекомендации по археографической обработке документов серии сборников «Восстание 1863 г.») // Беларускі археаграфічны штогоднік. – Вып. 11. – Мінск : БелНДІДАС, 2010. – С. 273–291.
20. Kieniewicz, S. A propos du centenaire de l’insurrection de 1863–1864 // Acta Poloniae Historica. – T. VIII. – 1963. – P. 31–53.
21. Kieniewicz, S. Pokłosie rocznicy powstania styczniowego // Przegląd Historyczny. – 1964. – № 1. – S. 46–61.
22. Kieniewicz, S. Powstanie styczniowe. – Warszawa : PWN, 1972. – 800, [3] s., [20] s. tabl. : il., mapy.
23. Kieniewicz, S. Powstanie styczniowe. Materiały i dokumenty // Studia źródłoznawcze. – T. XIII. – Warszawa, Poznań : PWN, 1968. – S. 161–166.
24. Kieniewicz, S. Rewolucyjny sojusz polsko-rosyjski w dobie powstania styczniowego // Związki rewolucjonistów polskich i rosyjskich w XIX wie-

ku : Materiały Sesji Naukowej, Poznań, 12–14 listopada 1970 r. / przyg. do druku W. Śliwowska; PAN, Zakład Historii Stosunków Polsko-Radzieckich. – Wrocław : Zakład Narodowy im. Ossolińskich, Wydawnictwo PAN, 1972. – S. 111–123.

25. Kieniewicz, S. Uwagi o stanie i potrzebach badań historycznych nad wiekiem XIX // Kwartalnik Historyczny. – R. 80. – 1973. – № 2. – S. 290–294.
26. Kieniewicz, S. W przededniu setnej rocznicy powstania styczniowego // Kwartalnik Historyczny. – R. 69. – 1962. – № 4. – S. 799–818.
27. Kieniewicz, S. [recenzja na:] A. F. Smirnow, Rewolucionnyje swiazi narodow Rossii i Polszi 30–60 gody XIX wieka. Izd. soc.-ekonom. literatury, Moskwa 1962, ss. 426 // Kwartalnik Historyczny. – R. 69. – 1962. – № 4. – S. 969–974.
28. Kieniewicz, S. [recenzja na:] M. W. Misko, Polskoje wosstanije 1863 goda, Instytut Słowianoznawstwa Akademii Nauk ZSRR, Moskwa 1962, s. 335 // Przegląd Historyczny. – T. 54. – 1963. – № 2. – S. 353–356.
29. Kieniewicz, S. [recenzja na:] R. F. Leslie, Reform and Insurrection in Russian Poland. 1856–1865. University of London, The Athlone Press, 1963, ss. X+272 // Kwartalnik Historyczny. – R. 71. – 1964. – № 1. – S. 189–192.
30. Kieniewicz, S. [recenzja na:] Traugutt. Dokumenty, listy, wspomnienia, wypisy. Zebrał i opracował ks. Józef Jarzębowski. Nakładem Zgromadzenia Księży Marianów, Londyn 1970, s. 264 // Przegląd Historyczny. – 1972. – T. 63. – № 1. – S. 174–178.
31. Niebielski, E. Znaczenie wydawnictwa „Powstanie Styczniowe. Materiały i Dokumenty" dla badań nad dziejami 1863 r. // Powstanie styczniowe. 1863–1864. Walka i uczestnicy. Represje i wygnanie. Historiografia i tradycja / pod red. W. Cabana i W. Śliwowskiej. – Kielce : Wydawnictwo Akademii Świętokrzyskiej, 2005. – S. 267–272.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 01.10.2021

# Генеалогія

*Я. С. Глінскі*

## Зямяне маёнткаў Урэчча, Новы Двор і Яромічы Слуцкага княства ў другой палове XVI – пачатку XVIII ст.: фарміраванне супольнасці і генеалагічная свядомасць

Маёнткі Слуцкага княства, якія знаходзіліся на ўсход ад Слуцка, не вылучаліся вялікай колькасцю зямянскага насельніцтва, што адрознівала іх ад іншых двароў латыфундыі (Баславічы, Вызна, Івань, Пагост, Прусы, Старчыцы), а таксама Капыльскага княства, дзе прысутнасць зямян на працягу XVII–XVIII стст. была значнай[1]. Ва ўсходніх маёнтках найбольш выразнай наяўнасць зямян была на землях, падпарадкаваных Урэцкаму двару. Пачынаючы з інвентароў 1670-х гг., да гэтага двара адносілася вялікае зямянскае сяло Сорагі (Сорага)[2], у якім налічвалася 70 валок і адпаведна 12 зямянскіх «каней»[3], і некалькі больш дробных засценкаў, якія ўзніклі на працягу другой паловы XVII – XVIII ст. [43, арк. 11–12]. У маёнтках Новы Двор[4] і Яромічы знаходзіліся толькі невялікія зямянскія паселішчы – адпаведна Мохарты і Мардзві-

---

[1] Аўтар выказвае падзяку загадчыку аддзела выкарыстання дакументаў і інфармацыі Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, магістру гістарычных навук **Вользе Чарвінскай** за значную дапамогу ў зборы матэрыялаў, неабходных для напісання артыкула.

[2] Пры гэтым яшчэ ў інвентары ад 1667 г. сярод паселішчаў Урэцкай воласці Сорагі не адзначаны [38, арк. 36–50]. Магчыма, да 1670-х гг. зямянскае сяло ў Сорагах складала асобную тэрытарыяльную адзінку. Пра гэта ўскосна сведчаць звесткі інвентара Слуцкага княства ад 1600 г., у якім фігуравалі зямяне «з Сорага» [28, арк. 7].

[3] «Конь» – адзінка нясення зямянамі ваеннай службы, з «каня» (як правіла, надзела ў пяць валок зямлі) зямяне павінны былі выстаўляць аднаго вершніка ў радзівілаўскае войска.

[4] У дадзеным артыкуле маёнтак Новы Двор разглядаецца без фальваркаў Ушаловічы і Прошчыцы.

навічы (Мардзвілавічы). У Дарогах і Скаўшыне па стане на сярэдзіну XVIII ст. зямяне наогул не фіксаваліся [29, арк. 4–5 адв.].

У выпадку Сорагаў фарміраванне зямянскай супольнасці прасочваецца яшчэ для другой паловы XVI ст. – часу, калі Слуцкім і Капыльскім княствамі валодалі апошнія пакаленні роду князёў Алелькавічаў. Гэта адлюстравана ў інвентары Слуцкага княства ад 1600 г., дзе жыхары Сорагаў вылучаны ў асобную групу, а таксама рэестры Слуцкага княства ад 1566 г. [28, арк. 7; 54, k. 64–66; 70, с. 330–331; 79]. У апошнім з іх службоўцы Алелькавічаў паказаны агулам, без падзелу па паселішчах, але прадстаўнікоў Сорагаў у ім магчыма вызначыць на падставе матэрыялаў судовага працэсу ад 1679 г. паміж Гурыновічамі і Шубамі [14, арк. 44–45], дзе рэтраспектыўна згадваліся жыхары Сорагаў, паказаныя ў рэестры ад 1566 г.

З асоб, пазначаных у 1566 г., несумненна шляхецкае паходжанне мелі Капцевічы. Тады згадваліся Пратас, Рыгор і Міхайла Капцевічы, якія валодалі службамі прыгонных сялян у Слуцкім княстве. Пры гэтым Рыгор і Міхайла асобна фігуравалі ў пераліку шляхты Слуцкага княства [54, k. 65–66]. Ніводзін з Капцевічаў не паказаны (з невядомых прычын) у інвентары ад 1600 г., але іх старадаўняе пражыванне ў Сорагах пацвярджаецца існаваннем у сяле «каня» з назвай, утворанай ад іх прозвішча[5]. З часоў правядзення зямянскіх рэвізій 1730-х гг. Капцевічы называлі сябе выхадцамі з Пінскага павета, але ў якасці падмацавання гэтага імі выстаўляўся вельмі няўдалы фальсіфікат – прывілей князя Юрыя Юр’евіча Алелькавіча ад 6 чэрвеня 1523 г. пінскаму шляхціцу Фёдару Пеньку-Капцевічу на два кані ў засценку Сорагі [56, k. 54–55]. У 1523 г. Слуцкім княствам кіраваў не Юрый Юр’евіч, а Юрый І Сямёнавіч Алелькавіч [87, s. 331–332]. Зрэшты, такую неадпаведнасць магчыма было б растлумачыць памылкай у перадачы ў копіі даты надання, але ў дакуменце згадваўся «слаўнай памяці» кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт ІІІ Ваза, а ніводзін з князёў Алелькавічаў гэтага манарха не пераджыў. Пры гэтым на Піншчыне ў першай трэці XVI ст. сапраўды жыў Фёдар Капцевіч, які з’яўляўся пінскім войтам і ў 1503 г. атрымаў ад князя Фёдара Іванавіча Яраславіча дварышча Насуціцкае ў сяле Красава [63, с. 133–134; 68, с. 256]. Цалкам магчыма, што пазначаныя ў 1566 г. Капцевічы былі нашчадкамі Фёдара, якія трапілі на службу да Алелькавічаў[6]. У такім выпадку выклікае цікавасць той факт, што

---

[5] Дзявяты па ліку «конь» Капцевічаўскі пазначаўся ў інвентарах да канца XVIII ст. [30, арк. 9–9 адв.].

[6] Пры гэтым мяшчане Капцевічы (у тым ліку сын Фёдара Барыс) працягвалі жыць у Пінску ў сярэдзіне XVI ст. Больш за тое, у Пінскім княстве ў гэты час былі падданыя, якія мелі патронім «Капцевічы» і жылі ў сяле Марозавічы, але яны наўрад ці мелі нейкае дачыненне да слуцкіх зямян [63, с. 89–90, 94, 126, 146].

памяць пра пачынальніка Фёдара пратрывала ў родзе да першай трэці XVIII ст., калі быў выраблены згаданы вышэй фальсіфікат. Сярод іншага, Капцевічы апелявалі да пінскага паходжання (і звязаных з імі несапраўдных дакументаў) нават у пачатку XIX ст. – падчас «разбору шляхты» [8, арк. 44–46 адв.; 15, арк. 2 адв.–3 адв.]. Тады яны падавалі ў якасці доказу шляхецкай годнасці сфабрыкаваную недзе напрыканцы XVIII ст. (упершыню яна была ўнесена ў судовыя кнігі ў 1793 г.) «генеалогію», паводле якой Капцевічы трапілі ў шэрагі слуцкіх зямян у канцы XVI – пачатку XVII ст., калі былі запрошаны на службу Юрыем, Мікалаем (!) і Сямёнам Алелькавічамі[7] [33, арк. 357–357 адв.]. Аднак нельга выключаць магчымасць, што супадзенне імёнаў пінскага войта Фёдара і меркаванага продка сорагаўскіх зямян Капцевічаў паўстала ў выніку выпадковасці.

Іншым родам мясцовых зямян, чые шляхецкія карані акрэсліваюцца дастаткова выразна, з'яўляліся Шубы. У 1600 г. згадваўся сорагаўскі зямянін Шубка (!), які ў адрозненне ад сваіх аднавяскоўцаў выстаўляў не аднаго, а двух каней [28, арк. 7], што адпавядала будучай структуры паселішча Сорагі, у якім фіксаваліся два Шубінскія «кані» [43, арк. 11 адв.; 50, арк. 56–57]. Асаблівасцю акрэслення Шубаў у інвентарах маёнтка Урэчча з'яўлялася тое, што ў 1670–1680-я гг. яны адзіныя сярод мясцовых зямян пазначаліся як «паны» [43, арк. 11–11 адв.; 44, арк. 13 адв.–14; 45, арк. 16 адв.; 46, арк. 45]. Нягледзячы на тое, што ў далейшым такое адасабленне перастала практыкавацца, яно сведчыць пра асаблівы статус Шубаў. Апрача Сорагаў, на былых землях Алелькавічаў Шубы таксама пражывалі ў Капыльскім княстве, дзе ў інвентары ад 1665 г. яны таксама названы панамі (зрэшты, такое найменне было ўжыта не толькі да іх) [1, арк. 60 адв.]. Браты Раман і Андрэй Шубы, якія жылі ў Сорагах у 1630–1640-я гг., былі жанаты на жанчынах з сямей Радзівановічаў і Дубяйкоўскіх, а гэтыя роды фігуравалі сярод капыльскіх зямян [24, арк. 29–30 адв., 94 адв.–95; 62, с. 205–207, 209–210]. Верагодна, менавіта матрыманіяльныя стасункі садзейнічалі перасяленню часткі Шубаў у Капыльскае княства. Капыльскія Шубы ў XIX ст. выводзілі сябе ад Яна, які па стане на 1631 г. з'яўляўся ўладальнікам часткі маёнтка Сакалятычы каля Клецка [23, арк. 122]. Аднак такому радаводу супярэчыць не толькі факт перасялення Шубаў у Капыль менавіта з Сорагаў, але і тое, што меркаваны продак роду згадваўся сярод слуцкіх зямян яшчэ ў рэестры ад 1566 г. У ім фігуравалі Шубіч і Гурын Радкавічы [54, k. 65]. Не з'яўляецца магчымым дакладна інтэрпрэтаваць звесткі: ці то Шубіч быў сынам Радкі (у такім выпадку Гурын быў яго братам), ці то ў захаванай копіі дакумента прысутнічае

[7] Ніводзін з князёў Алелькавічаў не меў імя Мікалай.

недакладнасць, і сынам Радкі з'яўляўся толькі Гурын, а Шубіч – гэта не звязаны з ім роднаснымі сувязямі чалавек, акрэслены ў пераліку пры дапамозе не імя, а патроніма. Так ці інакш, не выключана, што аднай з прычын таго, што ў ранніх інвентарах Шубы называліся панамі, з'яўлялася іх паходжанне. У XV ст. на гістарычнай Навагрудчыне жыў род Шубаў, найперш вядомы тым, што яго прадстаўнікі рабілі ўклады на карысць знакамітага Лаўрышаўскага манастыра [69, с. 243–245; 78, s. 68–69]. Магчыма, адна з галін роду апынулася ў Сорагах. У такім выпадку Шубы былі старажытнай шляхтай і найменне іх панамі робіцца вытлумачальным.

Апошнім аспектам, які ўскладняе высвятленне каранёў роду Шубаў, з'яўляецца тое, што ў XIX ст. яны прэтэндавалі на паходжанне ад «экзулянтаў», якія страцілі свае землі пасля вайны 1654–1667 гг. і вымушаны былі перасяліцца ўглыб ВКЛ. Абедзве галіны (сорагаўская і капыльская) сцвярджалі, што іх продкі атрымалі за ваенную службу ад Уладзіслава IV землі ў Старадубскім павеце[8] [23, арк. 1–6; 24, арк. 1–2, 15–15 адв., 18, 23–24 адв.]. Знаходжанне зямян у дзяржаўным войску і атрыманне зямель на набытых тэрыторыях (разам з іх стратай у наступным) не з'яўляюцца неверагоднымі. Напрыклад, смаленскім «экзулянтам» з'яўляўся Цімафей Корзун, верагодна, выхадзец са слуцкага баярска-зямянскага роду [83, s. 117, 265], які ў другой палове XVII ст. пасля страты валоданняў на Смаленшчыне перасяліўся ў Рэчыцкі павет, дзе яго нашчадкі адносіліся да ваколічнай шляхты [10, арк. 227–232 адв.; 58, с. 85–86; 75, с. 274–275]. Аднак у дакументах на землі ў Старадубскім павеце, якія меліся на руках у Шубаў, іх прозвішча перадавалася як «Шубы-Яблонскія»[9]. Паколькі на дадзены момант немагчыма абгрунтавана даказаць або ўпэўнена абвергнуць тоеснасць «экзулянтаў» з радзівілаўскімі зямянамі Шубамі, пытанне з'яўлення прыдомку «Яблонскі» магчыма было б пакінуць без разгляду, калі б не тое, што сярод жыхароў Сорагаў яшчэ ў 1566 і 1600 гг. згадваліся зямяне менавіта з такім прозвішчам, якія выразна адасабляліся ад Шубаў [28, арк. 7; 54, k. 65]. Больш за тое, калі ў 1647 г. у Слуцкім замкавым судзе вялася справа аб спадчыне Рамана Шубы, адвакатам яго жонкі з'яўляўся якраз Ян Яблонскі [24, арк. 6–8 адв.]. У ранніх інвентарах Сорагаў згадваўся «конь» Яблонскіх (гл., напрыклад: [43, арк. 11]), але з канца 1680-х гг. замест яго стаў згадвацца «конь» Ляхаўскі [47, арк. 36; 48, арк. 22 адв.; 49, арк. 37–38]. Акалічнасці гэтай трансфармацыі дастаткова празрыстыя. Яблонскія

[8] У выпадку сорагаўскіх Шубаў у якасці надання фігуравала вёска Налбогіна з пяццю валокамі зямлі.

[9] Менавіта з такой нехарактэрнай для інвентароў формай род спрабаваў прайсці праз «разбор шляхты» ў XIX ст.

былі выхадцамі з Польшчы[10], дзе падобнае прозвішча сярод шляхты сустракалася вельмі часта [85, s. 302–307], ад іх этнічнай прыналежнасці і ўтварылася новая назва «каня»[11]. Так ці інакш, сорагаўскія Шубы і Яблонскія былі двума асобнымі родамі.

З сямейнай гісторыяй Шубаў шчыльна звязана праблема высвятлення паходжання наступнага сорагаўскага зямянскага роду – Гурыновічаў. Перш за ўсё, таму што самыя раннія звесткі пра іх генеалагічныя ўяўленні паходзяць з працэсу аб «нагане шляхецтва», ініцыяванага Шубамі ў дачыненні да Яна Гурыновіча ў 1679 г. Абвінавачанне ў нешляхецтве падсумавала шматгадовы канфлікт, справакаваны тым, што апякун жонкі Яна Гурыновіча Зоф'і (дачкі згаданага вышэй Рамана Шубы) Іван Шуба затрымаў пры сабе яе маёмасць. Пасля смерці апекуна не аддалі належнага Зоф'і і яго пляменнікі і спадкаемцы – Гальяш, Габрыэль, Матэвуш і Тэадор Андрэевічы Шубы [24, арк. 25–28]. З дакументаў судовага працэсу вынікае, што яшчэ на мяжы 1660–1670-х гг. Гурыновічы былі абвінавачаны ў нешляхецтве іншымі зямянамі – Міхневічамі. Ужо тады яны адначасова выкладалі дзве версіі свайго паходжання. Паводле першай, іх продкамі былі Іван і Сямён Жданавічы Глушскія, якія адносіліся да паўнапраўнай шляхты і па стане на 1560-я гг. валодалі маёнткамі. У адпаведнасці з другой версіяй, іх продкам быў хтосьці з асоб, паказаных у рэестры Слуцкага княства ад 1566 г., – Прохар Жданавіч, Гурын і Шубіч Радкавічы, Васька Жданавіч ці Гурын Стэфанавіч[12] [14, арк. 44–45]. З улікам патранімічнага характару іх прозвішча («Гурыновіч») іх продкам мог быць Гурын Радкавіч[13] або Гурын Стэфанавіч.

Аднак самі Гурыновічы ўжо ў 1679 г., падчас працэсу супраць Шубаў, трывала спыніліся на варыянце ўласнага паходжання ад Івана і Сямёна Жданавічаў Глушскіх. У гэты час яны падавалі пацвярджальны прывілей Жыгімонта II Аўгуста ад 1567 г. Сямёну і Івану Жданавічам на наданне іх «продку»[14] Юшку Афанасьевічу Корсаку князем Глебам

---

[10] На службе ў Алелькавічаў у другой палове XVI ст. было шмат палякаў [70, с. 338].

[11] Цікава, аднак, што ў дачыненні да аднаго з Яблонскіх, які жыў у канцы XVII ст., ужывалася тыповая ўсходнеславянская форма «Іван» (пры тым іншыя зямяне ў тых жа інвентарах фігуравалі як «Яны») [48, арк. 22 адв.; 49, арк. 37], што сведчыць пра пэўную рутэнізацыю зямян польскага паходжання.

[12] Гурын Стэфанавіч у наяўнай зараз копіі рэестра ад 1566 г. не паказаны [54, k. 64–66]. Магчыма, ён прапушчаны ў ёй або, наадварот, яго наўмысна дадалі ў інтарэсах Гурыновічаў падчас судовых працэсаў.

[13] Калі продкам Гурыновічаў быў сын Радкі, то яны маглі быць найбліжэйшымі родзічамі Шубаў.

[14] У дадзеным выпадку пад «продкам» меўся на ўвазе продак па жаночай лініі або наогул папярэдні ўладальнік маёнтка, які мог не мець наогул генетычнай сувязі з Іванам і Сямёнам.

Сямёнавічам Гальшанскім сёлаў і людзей каля Глуска [14, арк. 46–46 адв.]. Іван і Сямён Жданавічы сапраўды існавалі і атрымалі падобны дакумент [53, арк. 103–104; 71, с. 128–148]. У матэрыялах Метрыкі ВКЛ браты Жданавічы фіксаваліся і раней: у 1549 г.[15] яны выслужылі ў Жыгімонта ІІ тры пустаўшчыны ў сяле Радуцічы Глускай воласці, а ў 1564 г. Сямён Жданавіч набыў у сваіх «братоў»[16] Богуша і Рыгора Фёдаравічаў Зяньковічаў маёнтак у Бабруйскай воласці [52, арк. 74–75, 395–397]. Таксама Сямён з'яўляўся падстаростам бельскім [64, с. 225].

Такі вывад паходжання Гурыновічаў меў выразныя хібы. Перш за ўсё, ён ніяк не тлумачыў этымалогію іх прозвішча. Іван і Сямён не былі Гурыновічамі, сінхронна ім у 1560-я гг. у Сорагах жылі людзі, якія нашмат лепей падыходзілі на ролю продкаў Гурыновічаў. З іншага боку, «браты» Сямёна Жданавіча Зяньковічы з'яўляліся баярамі жонкі князя Канстанціна Іванавіча Астрожскага Аляксандры Сямёнаўны, якая паходзіла з роду Алелькавічаў [52, арк. 395 адв.]. Такім чынам, пэўная (хоць і крайне ўскосная) сувязь Сямёна і Івана Жданавічаў са Слуцкім княствам мела месца.

Прыняцце ў якасці продкаў гаспадарскіх шляхціцаў Івана і Сямёна Жданавічаў[17] садзейнічала таму, што Гурыновічы пачалі выкарыстоўваць прозвішча ў форме «Гурыновічы-Ждановічы». Яно было замацавана падчас правядзення зямянскіх рэвізій (праверак прыналежнасці да зямянскага стану) 1730-х гг. Тады, як і ў 1670-я гг., падаваўся прывілей ад 1567 г. [32, арк. 627–630 адв.], але ў дадатак да яго выстаўляўся прывілей князя Юрыя ІІІ Юр'евіча Алелькавіча ад 1585 г. тым жа Івану і Сямёну Жданавічам (натуральна, яны пазначаны з прозвішчам Гурыновічы) на чатыры «кані» ў сяле Сорагі [56, k. 53]. Апрача таго, каб растлумачыць прычыны ўжывання прозвішча «Гурыновіч», дадаткова прыцягвалася напісаная Андрэем Алабышам у 1567 г. хроніка навагрудскай шляхты Гурынаў, у якую, верагодна, былі інтэрпаляваны звесткі аб тым, што іх продак Аляксей Ходкавіч у сярэдзіне XV ст. атрымаў ад князя Міхайлушкі Жыгімонтавіча маёнтак у Сорагах[18] [32, арк. 625–

---

[15] У той час Сямён з'яўляўся гаспадарскім дваранінам.

[16] Стрыечных або зводных.

[17] Верагодна, у якасці непасрэднага продка Гурыновічаў быў абраны Іван Жданавіч, бо ў матэрыялах працэсу аб «нагане шляхецтва» згадваўся недатаваны запіс Івана Жданавіча Гурыновіча жонцы яго сына Мікалая Ганне Прохараўне на дзявятую частку «каня» ў Сорагах [14, арк. 44–45].

[18] Зварот да сямейнай хронікі Гурынаў у рэчаіснасці таксама ніяк не тлумачыў паходжанне прозвішча сорагаўскіх Гурыновічаў. У ёй Гурыновічы выводзіліся ад Сямёна Аляксеевіча, унука Ходкі, але імя Гурын насіў пляменнік Сямёна Гурын (Рыгор) Пятровіч – фактычны пачынальнік роду Гурынаў з Навагрудскага ваяводства [32, арк. 625 адв.]. Зразумела, што ад яго імя не магло ўтварыцца прозвішча сорагаў-

626 адв.]. Тым самым, сорагаўскія Гурыновічы адначасова выводзіліся і ад Гурынаў, і ад братоў Жданавічаў Глушскіх[19]. Прывілей Юрыя ІІІ таксама выклікае падазрэнні. Ён не фігураваў у матэрыялах больш ранніх зямянскіх рэвізій [55], ды і самі Гурыновічы не згадвалі пра яго яшчэ ў 1670-я гг., калі вымушаны былі пацвярджаць шляхецтва падчас працэсаў супраць Міхневічаў і Шубаў.

Застаецца адкрытым наступнае пытанне: калі Гурыновічы не былі нашчадкамі Івана і Сямёна Жданавічаў, то адкуль яны атрымалі звесткі пра іх? Працэс 1679 г. аб «нагане шляхецтва» дае падставы сцвярджаць, што сорагаўскія зямяне (у тым ліку Гурыновічы) у сярэдзіне XVII ст. маглі пахваліцца дастаткова высокім інтэлектуальным узроўнем. Сярод іншага, Ян і Зоф'я Гурыновічы спрачаліся з братамі Шубамі за кнігу «Гісторыі і Александрыі»[20] [24, арк. 25 адв.]. Апрача таго, яны маглі звярнуцца да паслуг асоб, якія адшукалі б дакументы, што падмацоўвалі іх шляхецтва. Зрэшты, нельга цалкам выключаць магчымасць таго, што Гурыновічы сапраўды паходзілі ад Жданавічаў Глушскіх, але не па мужчынскай лініі. Падчас першага працэсу аб «нагане шляхецтва» (супраць Міхневічаў) Гурыновічы згадвалі пра запіс Кацярыны Глушанкі (у першым шлюбе Васькевіч, у другім – Лазоўскай) ад 1643 г. [14, арк. 44–44 адв.]. Непасрэдна Гурыновічы ў ім ніяк не адзначаны, але, магчы-

скіх зямян, якія не былі яго непасрэднымі нашчадкамі. Гурын Пятровіч памёр да 3 студзеня 1541 г. [80, р. 80] і ніякім чынам не мог быць тоесным аднаму з Гурынаў, пазначанаму ў рэестры слуцкіх зямян ад 1566 г. Пры гэтым Гурын Пятровіч сапраўды ў першай трэці XVI ст. служыў князям Слуцкім, але выслужаны ім маёнтак затым быў адабраны назад князем Юрыем Сямёнавічам Слуцкім [67, с. 100–101, 239]. У XVII ст. Гурыны знаходзіліся на службе ў Слуцкім княстве, самым вядомым з іх стаў Уладзіслаў Гурын (†1664) – камісар Слуцкага княства ў часы Багуслава Радзівіла [81, s. 209–211, 232–233, 273; 83, s. 149–150, 402]. У гістарыяграфіі на падставе меркавання Станіслава Дзядулевіча прынята лічыць Гурынаў родам татарскага паходжання [77, s. 403; 83, s. 149]. Як вынікае з іх родавай хронікі, гэта не адпавядае рэчаіснасці. Так ці інакш, малаверагодна, што сорагаўскія Гурыновічы і Гурыны з Навагрудскага ваяводства мелі супольнае паходжанне.

У хроніцы Гурынаў згадваўся таксама Іван Жданавіч, які тэарэтычна мог быць атаясамлены з адным з атрымальнікаў прывілея ад 1567 г., але яго з'яўленне ў дакуменце стала вынікам надзвычай няўдалай інтэрпаляцыі. Іван Жданавіч называўся братам складальніка хронікі Андрэя Алабыша [32, арк. 625 адв.], але ў такім разе ён не мог насіць імя па бацьку Жданавіч, бо бацьку Івана і Андрэя Алабышаў звалі Грынькам (што непасрэдна адзначана ў тэксце хронікі) [74, с. 205].

[19] Іван і Сямён Жданавічы былі сучаснікамі дзяцей Гурына Пятровіча – Льва (Леўкі), Івана, Цімафея і Васіля.

[20] Вядомы прыгодніцкі раман «Александрыя» ў XVI–XVII стст. часта ўключаўся ў зборнікі з творамі на гістарычную тэматыку [73, с. 217]. Верагодна, пра падобны зборнік вялася спрэчка падчас суда.

ма, яны былі родзічамі Кацярыны, а яе прозвішча з’яўлялася жаночай формай прозвішча «Глушскі». У такім выпадку менавіта яна з’яўлялася спадкаеміцай Жданавічаў Глушскіх.

Несумненна, аднак, што Гурыновічы поруч з названымі вышэй Капцевічамі і Шубамі адносіліся да старадаўніх сорагаўскіх зямян. Больш за тое, яны валодалі развітай генеалагічнай свядомасцю, якая грунтавалася на разнастайных дакументах (не заўсёды безумоўна аўтэнтычных) і ўключала ў сябе звесткі, пачынаючы з сярэдзіны XVI ст.

Механізм таго, як у 1730-я гг. адбываліся маніпуляцыі з дакументамі на зямлю ў Сорагах, дэманструе прыклад яшчэ адных даўніх жыхароў вёскі – Міхневічаў (Міхновічаў). У 1730-я гг. яны падалі адміністрацыі Слуцкага княства ліст намесніка слуцкага Яна Кавецкага ад 1591 г. Якіму Міхневічу-Гурылевічу на восем пустых валок (на два «кані») у Сорагах з умовай нясення зямянскай службы [56, k. 52]. Такі дакумент сапраўды існаваў – на яго Міхневічы спасылаліся падчас судовага працэсу ў 1688 г., дзе згадвалі свайго прадзеда Якіма Міхнавіча[21]. Аднак у 1688 г. гаворка ішла не пра два «кані», а пра адзін, а таксама нідзе не фігуравала другое прозвішча атрымальніка ліста – Гурылевіч [26, арк. 336–339 адв.]. Апрача таго, у 1730-я гг. Міхневічы апелявалі да яшчэ больш ранняга дакумента – прывілея гетмана польнага ВКЛ Крыштафа Радзівіла ад 9 красавіка 1513 г. (!) полацкаму шляхціцу Тэафілу Міхневічу-Гурылевічу на набытыя ў харужыча навагрудскага Дамініка Францкевіча 10 валок у фальварку ва ўрочышчы Рогавец з падданымі [32, арк. 582–583 адв.; 56, k. 51–52]. Зразумела, што Крыштаф Радзівіл у 1513 г. яшчэ нават не нарадзіўся і не мог выдаць падобны прывілей[22]. Нарэшце, у 1733 г. яны актыкавалі дэкрэт Навагрудскага гродскага суда ад 1683 г., з якога вынікала, што прадстаўнік роду валодаў маёнткам у Навагрудскім ваяводстве і тым самым адносіўся да паўнапраўнай павятовай шляхты [17, арк. 5–6 адв.; 32, арк. 584–585 адв.]. Усе гэтыя дакументы мелі на мэце даказаць шляхецкае паходжанне роду (для гэтага былі патрэбны згадкі аб паходжанні Тэафіла з полацкай шляхты[23] і валоданні родам маёнткам на Навагрудчыне). Верагодна, з той жа мэтай быў

---

[21] Якім Міхнавіч у некаторых месцах дакумента памылкова называўся Міхалам Якімавічам.

[22] Крыштаф Радзівіл стаў польным гетманам толькі ў 1615 г. Аднясенне дакумента да 1513 г. было патрэбна для таго, каб вытрымаць паслядоўнасць – Тэафіл не мог атрымаць пацвярджэнне раней, чым яго меркаваны нашчадак (Якім) зямлю ў Сорагах. Тэафіла ў якасці першапродка Міхневічы згадвалі і падчас «разбору шляхты» [6, арк. 21 адв; 17, арк. 5–6 адв.].

[23] Да паходжання з Полацкага ваяводства ў XVIII ст. таксама апелявалі радзівілаўскія зямяне Міхневічы з іншага маёнтка – Уселюб Навагрудскага ваяводства [3, арк. 557–558; 65, с. 82].

«падкарэктаваны» ліст Я. Кавецкага. Магчыма, з яго сапраўднага зместу вынікала, што Якім Міхнавіч да атрымання зямлі ў Сорагах быў не зямянінам, а путным (лістоўным) баярынам. Пра гэта ўскосна сведчыць і тое, што ні з ім, ні з яго бацькам немагчыма ідэнтыфікаваць ніводнага чалавека з рэестра ад 1566 г.

Калі Гурыновічы, Капцевічы, Міхневічы і Шубы стала замацаваліся ў мясцовай зямянскай супольнасці і пражывалі ў Сорагах да канца XVIII ст. [11, арк. 23 адв.–24 адв., 43 адв.–44, 58 адв.–59; 25, арк. 813–831 адв.], то некаторыя з сямей зямян, якія знаходзіліся ў Сорагах у першай палове XVII ст., надоўга там не затрымаліся. Пратасовічы[24], Васьковічы (Васькевічы)[25] і Місевічы[26] не паказаны ў інвентары ад 1671 г. [43, арк. 11–12]. У дачыненні да Васьковічаў на тое былі натуральныя прычыны. Са згаданага вышэй запісу Кацярыны Глушанкі вынікае, што ў яе не было дзяцей з першым мужам Даніэлем Васьковічам, таму атрыманы ад яго надзел яна запісала дачцэ ад другога шлюбу Ганне Андрэеўне Лазоўскай [14, арк. 44–44 адв.]. Такім чынам, род Васьковічаў згас фізічна. У адрозненне ад Васьковічаў Лазоўскія працягвалі існаваць, але з Сорагамі сувязь згубілі. У 1600 г., апрача Сорагаў, носьбіт гэтага прозвішча быў паказаны ў зямянскай вёсцы Шулякі, але ў другой палове XVII ст. асноўным месцам пражывання Лазоўскіх сталі засценкі Старыцкага двара Капыльскага княства [2, арк. 462 адв., 463 адв., 465 адв.][27].

Выпадак Лазоўскіх дазваляе прасачыць змяненні ў складзе зямянскай супольнасці Сорагаў у першай палове XVII ст. Мужам Ганны Андрэеўны Лазоўскай стаў Ян Няронскі, які такім чынам у 1640-я гг. стаў жыхаром Сорагаў [14, арк. 44–44 адв.]. З гэтага часу Няронскія замацаваліся ў Сорагах, дзе на працягу наступных некалькіх стагоддзяў складалі істотную частку насельніцтва[28] [9, арк. 432 адв.–433; 11, арк. 46 адв.]. Няронскія (Нерановічы) паходзілі з лістоўных баяр сяла Вужа Грозаўскага двара [55, k. 324–325], але ў XVII ст. жылі таксама ў Клешаве (Баславіцкі двор) і ў засценках, якія належалі да Пагосцкага маёнтка [55, k. 276; 56, k. 43–44; 57, k. 10]. Дакладна вызначыць, адкуль з гэтых трох мясцін прыбыў Ян, не з'яўляецца магчымым.

---

[24] У 1600 г. носьбіт прозвішча фігураваў без імя [28, арк. 7], у 1625 г. згадваўся Хама Пратасовіч [14, арк. 46 адв.].

[25] Магчыма, нашчадкі паказанага ў 1566 г. Ваські Жданавіча [54, k. 65].

[26] Яны не адзначаны ў інвентары ад 1600 г., але носьбіт гэтага патранімічнага прозвішча згадваўся ў дакуменце ад 1625 г. [14, арк. 46–46 адв.]. Апрача таго, у Сорагах існаваў Місевічаўскі «конь» [43, арк. 11].

[27] Пасля Паўночнай вайны пачатку XVIII ст. частка роду Лазоўскіх аказалася ў Нясвіжскай ардынацыі, дзе асела ў засценках Затур'я і Пляшэвічы [4, арк. 721 адв.–722].

[28] У некаторых дакументах апошняй чвэрці XVIII ст. іх прозвішча перадавалася як «Яромскія» [30, арк. 9 адв.–10 адв.; 33, арк. 260–260 адв.].

Шлюбныя сувязі наогул істотна ўплывалі на з'яўленне новых родаў сярод сорагаўскіх зямян. Найбольш выразна гэта адлюстравана ў выпадку спадкаемцаў зямян Воўкаў (Ваўковічаў), паказаных у інвентары ад 1600 г. [28, арк. 7]. У 1605 г. Міхайла Стэфанавіч Воўк падараваў частку свайго надзелу ў Сорагах жыхару сяла Касынічы (Старчыцкі двор) Прохару Пятровічу Чарнышэвічу. Паміж контрагентамі здзелкі меліся сваяцкія адносіны – Чарнышэвіч з'яўляўся зяцем Воўка [22, арк. 27–28 адв.]. У дакуменце згадвалася, што вылучаная Прохару Чарнышэвічу зямля межавала з часткай яшчэ аднаго зяця Міхайлы Воўка – Кандрата Каспаравіча Браткоўскага (Брадкоўскага). Такая раздача зямель мужам дачок ускосна сведчыць пра тое, што сыноў у Міхайлы не было. Сапраўды, у інвентарах другой паловы XVII ст. Воўкі сярод сорагаўскіх зямян не фігуравалі, засталася толькі ўтвораная ад іх прозвішча назва «каня» [43, арк. 11]. Асобным пытаннем з'яўляецца сацыяльная прыналежнасць зяцёў Міхайлы Воўка. П. Чарнышэвіч у дароўным запісе выразна акрэслены як «зямянін» [22, арк. 27]. Аднак Касынічы да сярэдзіны 1620-х гг. з'уляліся паселішчам, жыхары якога неслі баярскую павіннасць[29]. Зрэшты, у больш позні час Чарнышэвічы валодалі прывілеем князя Юрыя Юр'евіча Алелькавіча ад 1576 г., з якога вынікала, што іх продак Іван Чарныш атрымаў зямлю ў Касынічах з умовай нясення ваеннай службы [22, арк. 21]. Падобны дакумент быў на руках і ў Браткоўскіх: яны мелі прывілей князя Яна Сімяона Алелькавіча ад 1589 г. аб наданні зямлі (на два «кані») у Касынічах на ўмовах выканання ваеннай павіннасці [13, арк. 26–27 адв.; 35, арк. 267–268 адв.; 60, с. 336]. Гэтыя дакументы маюць пэўнае падабенства. У прывілеі для Чарнышэвічаў за іх продка перад Алелькавічамі прасіў брацлаўскі ваявода князь Андрэй Вішнявецкі, у лісце для Браткоўскіх наўпрост адзначалася, што іх продак Павел Каспаравіч (!) Браткоўскі паходзіў з Валыні. Такім чынам, абодва гэтыя роды нібыта прыбылі ў Слуцкае княства з зямель сучаснай Украіны. Версія аб пераездзе з Валыні была развіта Браткоўскімі ў напаўлегендарнай «генеалогіі», створанай у канцы XVIII ст. З яе вынікала, што іх продкі ў першай палове XVI ст. валодалі маёнткам з 45 дымамі падданых у Луцкім павеце [13, арк. 28 адв.][30]. Аднак калі адкінуць звесткі позняй «генеалогіі», выклад акалічнасцей атрымання

---

[29] Толькі ў 1626 г. іх вызвалілі ад абавязкаў па дастаўцы грузаў і карэспандэнцыі і перавялі на зямянскую службу [55, k. 301].

[30] Структурна дадзеная «генеалогія» падобна на згаданы вышэй выклад паходжання Капцевічаў. У ім таксама ішла гаворка пра валоданне ў XVI ст. дастаткова вялікім маёнткам з 47 валокамі зямлі [33, арк. 357]. Пра заможныя валоданні на Валыні згадвалася і ў легендарным радаводзе Сеўрукоў [34, арк. 188; 72, с. 346]. Цікава, што аўтары «генеалогіі» Браткоўскіх па нейкіх прычынах не ўлічылі звесткі прывілея Яна Сімяона ад 1589 г., таму ў ёй не згадваліся ні Каспар, ні Павел, а ў якасці пер-

Браткоўскімі зямлі ў Касынічах не выглядае беспадстаўным. Адрасатам надання называўся Павел Каспаравіч, а з ліста Міхайлы Воўка вядомы Кандрат Каспаравіч, верагодна, яго брат. На Валыні сапраўды пражываў разгалінаваны шляхецкі род Браткоўскіх [76, s. 113–114; 84, s. 380–382]. Найбольш верагодна, што лісты Алелькавічаў для Чарнышэвічаў і Браткоўскіх на зямлю ў Касынічах існавалі, але былі інтэрпаляваны ў больш позні час, каб падкрэсліць шляхецкае паходжанне родаў і іх спрадвечнае знаходжанне на зямянскай, а не на баярскай службе[31]. Аднак у Сорагах яны лічыліся зямянамі ўжо ў пачатку XVII ст. (пра што сведчыць і запіс М. Воўка). Гэта было абумоўлена тым, што яны перасяляліся ў паселішча, жыхары якога здаўна знаходзіліся на зямянскай ваеннай павіннасці.

Побытава-сямейнымі акалічнасцямі не абмяжоўваліся прычыны, па якіх у сорагаўскую зямянскую супольнасць у XVII ст. траплялі новыя роды. У 1679 г. Марцін Масакоўскі быў абвінавачаны ў нешляхецтве іншымі зямянамі Мохартамі. Насуперак гэтаму ён падаў на імя генеральнага аканома Слуцкага княства Казіміра Крыштафа Клакоцкага супліку, дзе распавёў пра карані свайго роду. Паводле яе, яго бацька паходзіў з Плоцкага ваяводства, служыў пад камандаваннем гетмана Хадкевіча, каля 60 гадоў таму прыбыў у Сорагі, дзе ажаніўся. Адзіным знешнім аргументам, які павінен быў пацвердзіць словы М. Масакоўскага, былі сведчанні яго аднавяскоўцаў Шубаў[32] [18, арк. 10–10 адв.]. Выкладзеная Марцінам гісторыя роду не ўтрымлівае відавочных супярэчнасцей. Разгалінаваны шляхецкі род Масакоўскіх сапраўды жыў у гістарычнай Мазовіі (гняздо іх, аднак, знаходзілася не ў Плоцкай, а ў размешчанай непадалёк ад яе Цяханаўскай зямлі) [86, s. 296–297], згаданы ў супліцы гетман – гэта Ян Караль Хадкевіч (†1621), які ў пачатку XVII ст. узначальваў войска ВКЛ у працяглай вайне супраць Швецыі. Масакоўскія, нягледзячы на выразна немясцовае паходжанне, выдатна інтэграваліся ў мясцовае зямянскае асяроддзе. Той жа Марцін у 1679 г. з'яўляўся сорагаўскім зямянскім харужым. Асіміляцыя этнічных палякаў Масакоўскіх стала яшчэ выразнейшай у XVIII ст.: у гэты час яны, як і ўсе мясцовыя зямяне, вызнавалі праваслаўе[33] [18, арк. 59–59 адв.].

---

шага прадстаўніка роду, які прыбыў на службу ў Слуцкае княства, выстаўляўся Ян [13, арк. 29–29 адв.].

[31] Паказальна, што ліст Чарнышэвічам прадстаўляўся падчас зямянскіх рэвізій у 1678 і 1684 гг. [22, арк. 22 адв.]. У прывілеях Браткоўскім і Чарнышэвічам падкрэслівалася, што яны павінны служыць Алелькавічам, «як і іншая шляхта».

[32] Магчыма, з гэтага роду паходзіла маці Марціна.

[33] Наколькі незвычайным для сорагаўскіх зямян было неправаслаўнае веравызнанне сведчыць неаднойчы згаданая «генеалогія» Капцевічаў. У ёй асабліва адзначалася, што адзін з прадстаўнікоў роду прыняў каталіцызм, бо выхоўваўся апекунамі – вызнаўцамі гэтай канфесіі [33, арк. 357 адв.].

Аддаленае ад Слуцка і Капыля месцазнаходжанне Сорагаў паўплывала на тое, што мясцовая зямянская супольнасць не так істотна пацярпела падчас разбуральнай вайны 1654–1667 гг.[34]. Больш за тое, сорагаўскія жыхары пасля яе ўзялі ўдзел у загаспадаранні новых зямель у іншых маёнтках Слуцкага княства. Так, выхадзец з Сорагаў Фёдар Гурыновіч[35] (разам з іншымі зямянамі Янам Корбутам, Геранімам Рудакоўскім і Амяллянам Валатоўскім) у 1670-я гг. атрымаў на ільготных умовах 8 валок пусташы ва ўрочышчы Панічы (Пагосцкі двор) [55, k. 287; 56, k. 46–47]. З цягам часу ўрочышча ператварылася ў аднайменны засценак, у якім Гурыновічы складалі істотную частку насельніцтва [27, арк. 56; 61, с. 680–695; 72, с. 153 і далей].

Задзейнічаны былі зямяне і ў асваенні новых зямель непасрэдна ў маёнтку Урэчча. Незадоўга да 1662 г. сорагаўскі зямянін Тамаш Левановіч атрымаў востраў Вярхуцін (Вярхуціна), з якога павінен быў таксама несці ваенную службу (або выплачваць грашовую кампенсацыю замест яе – паконшчыну) [56, k. 61–62]. Гэты востраў (будучы засценак) знаходзіўся на істотнай адлегласці ад Сорагаў – каля 20 км. Пераезд Т. Левановіча ў Вярхуцін быў, несумненна, абумоўлены гаспадарчымі патрэбамі маёнтка. Пра гэта сведчыць і тое, што на першыя сем гадоў (пакуль зямля не будзе стабільна ўведзена ў сельскагаспадарчы ўжытак) Тамаш быў вызвалены ад выканання любых павіннасцей [56, k. 61–62]. Гісторыя засценка Вярхуцін, сярод іншага, ілюструе працэс драбнення зямянскіх надзелаў на працягу другой паловы XVII – XVIII ст. Так, сам Тамаш атрымаў 5 валок зямлі, ужо ў 1683 г. ён дзяліў надзел з іншым Левановічам – Трахімам, у пачатку XVIII ст. у Вярхуціне было пяць асобных зямянскіх гаспадарак, і, нарэшце, у 1789 г. у засценку налічвалася 13 гаспадароў, ніводзін з якіх не меў нават аднавалочнага надзелу [30, арк. 10; 46, арк. 47; 50, арк. 58][36]. У 1660-я гг. быў закладзены яшчэ адзін

---

[34] На зямянскі попіс 1657 г., які адбыўся пасля першай актыўнай фазы ваенных дзеянняў (1654–1655 гг.), з усіх 12 «каней» былі выстаўлены казакі (зрэшты, адзін з воінаў з'явіўся пешшу, а не вярхом), што выразна кантраставала са становішчам зямян у іншых маёнтках, дзе было многа збяднелых жыхароў або яны наогул не прыйшлі на попіс [31, арк. 504].

[35] У інвентары ад 1671 г. ён яшчэ паказаны ў Сорагах, але побач з яго імем дапісана, што замест яго надзел заняў Геранім Гурыновіч. Той самы Геранім паказаны на надзеле Фёдара ў наступным інвентары ад 1677 г. [43, арк. 11; 44, арк. 13 адв.]. Пры гэтым Фёдар трымаў дастаткова вялікі надзел у 1 1/9 валокі. Такім чынам, матывам яго перасялення з'яўлялася не нястача зямлі.

[36] Фактычна гаспадароў было яшчэ больш. Верагодна, у інвентарах члены «вялікіх» сямей пазначаліся пад адной гаспадаркай. Насуперак такой рэдукцыі рэвізская сказка 1795 г. праз шэсць гадоў пасля складання інвентара налічыла ў Вярхуціне 22 асобныя двары [25, арк. 663–663 адв.].

зямянскі засценак Сліўка, які атрымаў назву ад ракі, на якой знаходзіўся [56, k. 63–68]. У адрозненне ад Вярхуціна гэтае паселішча ўтварылі прышлыя зямяне Бенядыкт, Ян і Сымон Кунцэвічы, якія паходзілі з сяла Касынічы Старчыцкага двара [31, арк. 507], а таксама Сямён Рудакоўскі.

У сваю чаргу, Левановічы з'яўляліся даўнімі мясцовымі жыхарамі. У Сорагах яны паказаны ў інвентары ад 1600 г. У гэтым дакуменце пазначаны яшчэ адзін уладальнік дадзенага патранімічнага прозвішча – Яраш Левановіч, які знаходзіўся на баярскай павіннасці пры Іванскім двары [28, арк. 7–7 адв.]. Аднак зямянскі статус сорагаўскіх Левановічаў у другой палове XVI ст. несумненны: яны пазначаны ўжо ў рэестры ад 1566 г. Пры гэтым на той момант яны былі дастаткова заможнымі – Багдан і Карп Левановічы распараджаліся шасцю службамі сялян [54, k. 65][37]. Такім чынам, іх магчыма ўпэўнена аднесці да старажытных зямян. У 1730-я гг. у распараджэнні роду меўся прывілей князя Юрыя ІІІ Юр'евіча Алелькавіча ад 1584 г. Яну Левановічу і Пятру Валгу (Воўку?) на два «кані» ў сяле Сорагі [56, k. 54]. Як адзначалася вышэй, падобным прывілеям далёка не заўсёды магчыма безумоўна давяраць. Аднак самі яго звесткі не супярэчаць зямянскаму статусу Левановічаў, зафіксаванаму ў дакументах 1566 і 1600 гг. Нягледзячы на выразна зямянскія карані, падчас «разбору шляхты» ў XIX ст. Левановічы з маёнтка Урэчча занядбалі любыя згадкі пра сваё зямянскае мінулае з XVI–XVII стст. і прыпісалі сабе паходжанне ад рэчыцкай павятовай шляхты Воўкаў-Левановічаў [16, арк. 173–177 адв.; 58, с. 30–32]. Адным з яскравых наступстваў гэтага стала змяненне іх прозвішча – з гэтага часу выхадцы з Сорагаў таксама пачалі пісацца «Воўкамі-Левановічамі». Напрыклад, менавіта такую форму прозвішча выкарыстоўваў нашчадак слуцкіх зямян, вядомы беларускі мовазнавец Іосіф Васільевіч Воўк-Левановіч (1891–1943) [16, арк. 693–703; 66, с. 62].

Такім чынам, нават старадаўнія зямяне з Сорагаў, многія з якіх пражывалі ў гэтым сяле з сярэдзіны XVI ст. і з тых часоў знаходзіліся на ваеннай павіннасці, вымушаны былі ажыццяўляць маніпуляцыі пры выкладзе ўласнага радаводу. Яны былі абумоўлены неабходнасцю даказаць шляхецкае паходжанне падчас зямянскіх рэвізій, а затым – у XIX ст. – пры «разборы шляхты». Тым больш, такія праблемы маглі назірацца ў выпадку нашчадкаў баяр, якія толькі ў XVII ст. дасягнулі зямянскага статусу. Такімі былымі баярамі з'яўляліся жыхары засценка Мардзвінавічы (Мардзвілавічы), які падпарадкоўваўся Яроміцкаму двару. У інвентары ад 1646 г. згадваліся «баяры Мардзвінаўцы» Тарас і Лявон Васільевічы, якія сядзелі на пяці валоках і павінны былі плаціць

---

[37] Сярод безумоўна сорагаўскіх зямян больш падданых па стане на 1566 г. мелі толькі Капцевічы.

за карыстанне надзелам 12 коп грошаў штогод. Пры гэтым асобна адзначалася, што яны да наступнага рашэння князя Багуслава Радзівіла не будуць прыцягвацца да дастаўкі пасылак [37, арк. 53]. Атрымліваецца, што яны былі пераведзены з баярскай на зямянскую службу якраз недзе ў 1640-я гг. У цэлым, павышэнне іх сацыяльнага статусу ўпісвалася ў агульны кантэкст мерапрыемстваў радзівілаўскай адміністрацыі ў дачыненні да зямян і баяр. Прыкладна ў гэты час былі канчаткова павышаны да зямянскіх абавязкаў баяры ў Вужы (фальварак Грозава), Клешаве (Баславіцкі двор), Млынцы (фальварак Прусы) [32, арк. 558–559 адв.; 55, k. 309, 323–324; 56, k. 101–102].

У пасляваенных інвентарах жыхары Мардзвінавічаў ужо былі паказаны зямянамі. Пры гэтым, пачынаючы з самага ранняга з іх (ад 1667 г.), у асноўным, фіксаваліся носьбіты двух прозвішчаў – Тарасовічы (Тарасевічы) і Мардзвіновічы (Мардзвіловічы) [38, арк. 33 адв.]. У рэестры слуцкіх зямян ад 1657 г. і інвентарах 1670-х гг. Тарасовічы таксама паказаны ў Сорагах [31, арк. 504; 43, арк. 11 адв.; 44, арк. 13 адв.–14; 45, арк. 16 адв.]. Магчыма высунуць версію, што ў Сорагі частка роду Тарасовічаў перасялілася менавіта з Мардзвінавічаў, дзе ўжо ў 1660–1680-я гг. жылі чатыры сям’і з гэтым прозвішчам [38, арк. 33 адв.; 39, арк. 40; 40, арк. 53]. Такая вялікая колькасць носьбітаў прозвішча сведчыць, што ў гэтай вёсцы Тарасовічы былі аўтахтоннымі жыхарамі. Апрача таго, адзін з «баяр Мардзвінаўцаў», паказаных у інвентары ад 1646 г., насіў імя Тарас Васільевіч. У такім выпадку Тарасовічы былі наўпрост яго дзецьмі і ўнукамі. Гэта пацвярджаецца рэестрам зямян ад 1657 г., у якім адзначаны Лявон, Мікалай і Яська Тарасавічы [31, арк. 506 адв.]. У гэтым пераліку маецца недакладнасць. Лявон – гэта, найбольш верагодна, Лявон Васільевіч з інвентара ад 1646 г., у такім выпадку сынамі Тараса маглі быць толькі Мікалай і Яська.

Аднак Урэчча і Яромічы былі не адзінымі маёнткамі Слуцкага княства, у якіх жылі Тарасовічы ў другой палове XVII ст. У рэестры ад 1657 г. у засценку Смольгава (Пагосцкі двор) былі пазначаны Апанас, Логвін, Грышка і ўдава Рамана Тарасовічы, а ў зямянскай рэвізіі 1685 г. там жа былі паказаны Міхал і Дзям’ян Тарасовічы, якія былі прызнаны радзівілаўскай адміністрацыяй «даўнімі зямянамі» [27, арк. 55 адв.; 31, арк. 506]. Больш за тое, вядомы дакумент, на падставе якога быў пацверджаны іх зямянскі статус. Гэта прывілей часовага ўладальніка Слуцкага княства Гераніма Хадкевіча ад 1599 г. прыхожаму баярыну Якіму Тарасовічу (Тарасавічу?) і яго сынам[38] на адзін «конь» у засценку Цыганаўскі[39] з умовай нясення зямянскай коннай службы [55, k. 289]. У дадзе-

[38] З іх па імёнах названы толькі Фёдар і Юхна.

[39] Ранейшая назва засценка Смольгава.

ным выпадку найменне «баярын» магло пазначаць як «баярына-шляхціца», так і путнага баярына. Так ці інакш, пагосцкія Тарасовічы ніяк не звязвалі сябе з Мардзвінавічамі і баярамі, якія жылі ў гэтым засценку. Калі прызнаць прывілей ад 1599 г. сапраўдным, то атрымліваецца, што ў Слуцкім княстве існавалі два самастойныя роды Тарасовічаў – смольгаўскія зямяне і мардзвінавіцкія баяры, а адгалінаванне аднаго з гэтых родаў таксама аказалася ў Сорагах[40].

Пры гэтым у XIX ст. смольгаўскія, мардзвінавіцкія і сорагаўскія Тарасовічы (Тарасевічы) ажыццяўлялі супольны вывад шляхецтва, у якім цалкам адпрэчылі зямянскі радавод і апелявалі да паходжання ад мсціслаўскай павятовай шляхты Тарасевічаў. У вывадзе сцвярджалася, што іх продкі жылі на Мсціслаўшчыне яшчэ ў першай палове XVIII ст. [7, арк. 270–273 адв.; 20, арк. 76–81 адв., 106–108 адв.], у той час як са згаданых вышэй інвентароў непасрэдна вынікае, што ўсе тры галіны Тарасовічаў жылі ў Слуцкім княстве ўжо ў сярэдзіне XVII ст.

Суседзі (і магчымыя родзічы Тарасовічаў[41]) Мардзвіловічы таксама не пазбеглі звароту да выразных містыфікацый. На праверку доказаў зямянскага паходжання, якая адбывалася ў 1730-я гг., яны падалі ліст, нібыта выдадзены іх продкам Фаме і Івану з «зямлі Мінскай» па справе супраць Аляксандра і Базыля Тоўкачаў аб маёнтку каля вёскі Ліцвяны. Дакумент быў датаваны 1550 г., але выстаўлены ад імя Жыгімонта III Вазы [32, арк. 517–518 адв.], які, зразумела, не панаваў у ВКЛ у гэты час.

Складана вызначыць час узнікнення зямянскага анклава ў пераважна цяглай вёсцы Обчын (Яроміцкі двор). У інвентары ад 1646 г. зямяне ў гэтым населеным пункце не згадваюцца наогул, у 1667 г. паказаны людзі з зямянскімі прозвішчамі (Ян Харастовіч, Яраш Сыцька, Пётр Мазалеўскі), але яны пазначаны на звычайных сялянскіх чыншавых валоках. Толькі ў наступным інвентары ад 1673 г. частка жыхароў Обчына акрэслена як зямяне [37, арк. 36–36 адв., 38 адв.–39; 38, арк. 13–13 адв.; 39, арк. 17–17 адв.]. Калі інтэрпрэтаваць выключна звесткі інвентароў, то атрымліваецца, што недзе ў 1650-я гг., пасля актыўнай фазы баявых дзеянняў, зямяне з іншых тэрыторый аселі ў Обчыне, дзе ва ўмовах ліхалецця пагадзіліся трымаць звычайныя сялянскія надзелы, і толькі праз пэўны час яны былі пераведзены на ўласцівыя іх статусу павіннасці. Аднак у пацвярджальным лісце камісара Самуэля Уладзіслава Вішнеў-

[40] Ужо ў 1657 г. у Смольгаве жылі чатыры асобныя сям'і Тарасовічаў. Натуральна, усе гэтыя людзі разам з Тарасовічамі з Мардзвінавічаў і Сорагаў не маглі быць сынамі аднаго Тараса Васільевіча.

[41] Калі прызнаць Тарасовічаў нашчадкамі Тараса Васільевіча, то Мардзвіловічы павінны быць нашчадкамі Лявона Васільевіча.

скага ад 1672 г. для обчынскіх зямян адзначалася, што яны пасяліліся ў вёсцы яшчэ да маскоўскага нападу і адразу на зямянскай службе [55, k. 275]. Зямяне, якія ў другой палове XVII ст. жылі ў Обчыне, пераважна не мелі каранёў у мясцовай ваенна-служылай супольнасці. Напрыклад, Сыцькі паходзілі з засценка Клешаў Баславіцкага двара, Мазалеўскія (Мадзалеўскія), а таксама згаданы ў інвентары ад 1673 г. Ежы Рудзінскі маглі наогул прыбыць з Нясвіжскай ардынацыі і Мірскага графства, дзе фігуравалі носьбіты гэтых прозвішчаў [5, арк. 728–729 адв.; 41, арк. 72–74; 57, k. 10; 82, p. 159; 83, s. 286, 307, 317][42]. Што тычыцца Харастовічаў (Гарастовічаў, Арастовічаў), з якіх у Обчыне жылі Ян і Васіль, то такія зямяне ў іншых маёнтках Слуцкага княства не фіксаваліся [83, s. 234][43]. Магчыма, яны паходзілі з лістоўных баяр і былі адзінымі з обчынскіх зямян сталымі жыхарамі Яроміцкага маёнтка.

Жыхары засценка Мохарты (фальварак Новы Двор) – уласна носьбіты прозвішча «Мохарт», а таксама Чарапанскія[44] – яшчэ ў 1625 г. называліся баярамі, хоць тады ўжо выконвалі ваенную службу [55, k. 251]. Што тычыцца Мохартаў, то іх сацыяльны статус у гэты час быў плынным. У тым жа інвентары ад 1600 г. пан Мохартавіч згадваўся сярод зямян [28, арк. 6 адв.]. Нягледзячы на хутчэй зямянскі радавод, Мохарты адчувалі недахоп прывілеяў, якія маглі б яго пацвердзіць. Падчас рэвізій сярэдзіны XVII ст. яны спасылаліся выключна на дакументы, якія зыходзілі ад радзівілаўскай адміністрацыі – лісты рэвізораў ад 1612 і 1625 гг., выдадзеныя ім супольна з Чарапанскімі [55, k. 250–251]. У 1720–1730-я гг. сітуацыя змянілася. Мохарты сталі апеляваць да пратэстацыі, нібыта пададзенай у Слуцкі замкавы суд у 1631 г., з якой вынікала, што прадстаўнікі роду «з Багданава Бойча-Мохартавічаў» з'яўляліся шляхтай, некалі валодалі маёнткамі ў Смаленскім ваяводстве і Аршанскім павеце, адкуль і прыйшлі на службу да Алелькавічаў [19,

---

[42] Пры гэтым у інвентары ад 1600 г. згадваўся слуцкі зямянін Васіль Мазоль [28, арк. 6 адв.].

[43] Зрэшты, цалкам нельга адкідаць экстравагантную версію, што іх прозвішча не ўтворана ад каляндарнага імені «Арэст» («Арост»), а з'яўляецца скажонай формай прозвішча іванскіх зямян Хаўстовічаў, вядомых яшчэ з інвентара ад 1600 г. [21, арк. 11 адв.–12 адв., 15, 21 адв.; 28, арк. 6 адв.; 36, арк. 36 адв.–37]. У другой палове XVIII ст. Харастовічы жылі ў засценках Урэцкага двара (пераважна ў Сорагах і Сліўцы) [30, арк. 9, 10; 51, арк. 15–17], але туды яны трапілі якраз з Обчына (у інвентары ад 1708 г. іх ва Урэччы яшчэ не было [50, арк. 55–59]). Наяўныя ў літаратуры звесткі пра валоданне Харастовічамі маёнтка Рачуны Ашмянскага павета не адпавядаюць рэчаіснасці і грунтуюцца на фальсіфікатах, створаных падчас «разбору шляхты» ў XIX ст. [12, арк. 1–2 адв.; 59, с. 259].

[44] Мохарты і Чарапанскія былі адзінымі жыхарамі засценка нават у пачатку XVIII ст. [42, арк. 36].

арк. 1–4; 56, k. 56–60]. Аднак гэта – фальсіфікат [83, s. 132]. У пачатку XVIII ст. адна з галін роду перасялілася ў Нясвіжскую ардынацыю. Верагодна, менавіта для праходжання зямянскай рэвізіі, якую ў 1722 г. ажыццяўляла ў Нясвіжы княгіня Ганна Кацярына Радзівіл, і спатрэбілася фабрыкаваць пратэстацыю ад 1631 г. Якраз прадстаўнікі «нясвіжскай» галіны роду, якія, сярод іншага, не толькі жылі на ленных землях, але і бралі фальваркі ў заставу ў навагрудскай павятовай шляхты, першымі пачалі выкарыстоўваць названы ў дакуменце ад 1631 г. прыдомак «Бойча» [5, арк. 425 адв.; 19, арк. 5–8 адв.; 32, арк. 380–381 адв.].

Чарапанскія таксама сцвярджалі, што некалі прыбылі ў Слуцкае княства з іншых земель. Пры гэтым у якасці сваёй «прарадзімы» яны ў канцы XVIII ст. называлі Нясвіжскую ардынацыю[45], адкуль Ян Чарапанскі нібыта выехаў на Случчыну ў 1605 г. [7, арк. 453 адв.; 33, арк. 220–220 адв.]. Гэта не супярэчыць наяўным звесткам. У Слуцкім княстве Чарапанскія ўпершыню згадваліся толькі ў 1612 г. (якраз Ян Чарапанскі!) [55, k. 250]. Аднак, паводле незалежных крыніц, ніякіх згадак пра нясвіжскіх зямян Чарапанскіх не прасочваецца [41, арк. 72–80; 82, p. 152–160]. Не выключана, што ўся гісторыя пра выезд з Нясвіжскай ардынацыі мела на мэце прыхаваць мясцовае, хутчэй за ўсё, баярскае паходжанне роду.

Такім чынам, зямянская супольнасць маёнткаў, размешчаных на ўсходзе Слуцкага княства, пачала фарміравацца яшчэ ў XVI ст. Самым вялікім зямянскім паселішчам у гэтым рэгіёне з’яўляліся Сорагі (Сорага). Значная частка родаў, якія згадваліся ў гэтым сяле ў другой палове XVI ст., захавала свой зямянскі статус да канца існавання Рэчы Паспалітай. Вайна 1654–1667 гг. істотна не паўплывала на склад мясцовага зямянскага асяроддзя. Змяненні ў складзе грамады былі абумоўлены натуральнымі (фізічнае выгасанне некаторых сямей), матрыманіяльнымі (пераезд у выніку шлюбу) і гаспадарчымі (прыбыццё новых зямян у маёнтак з мэтай асваення незагаспадараных земель) прычынамі. Жыхары невялікага засценка Мардзвінавічы першапачаткова знаходзіліся на баярскай павіннасці, на зямянскую службу яны былі пераведзены ў 1640-я гг. Верагодна, на некалькі дзесяцігоддзяў раней гэты шлях прайшлі Мохарты і Чарапанскія, хаця ў іх выпадку нельга выключаць магчымасць старадаўняй прыналежнасці да зямянскага стану. Пры гэтым не толькі баяры, якія з’яўляліся выхадцамі з вярхоў сялянскага саслоўя, але і мясцовыя зямяне, многія з якіх мелі несумненна шляхецкае паходжанне, ужо ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст. вымушаны былі падмацоўваць свой сацыяльны статус (падчас судовых працэсаў аб «нагане шляхецтва» і пры правядзенні зямянскіх рэвізій) спасылкамі

---

[45] У якую, у сваю чаргу, іх продак пераехаў з Ваўкавыскага павета.

на сфальсіфікаваныя дакументы. Адным з неспадзяваных наступстваў гэтага стала складанне выразнай генеалагічнай свядомасці ў часткі зямянскіх родаў, якая выяўлялася ў апеляцыі да паходжання з паўнапраўнай павятовай шляхты, ужыванні прыдомкаў, якія ўзыходзілі да патронімаў і прозвішчаў уяўных продкаў, у больш позні час – у стварэнні «генеалогій», у змесце якіх сапраўдныя звесткі спалучаліся з выразнымі містыфікацыямі.

## Крыніцы і літаратура


1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 160 (Ігуменскі павятовы суд). Воп. 1. Спр. 16. – Справа аб адшуканні волі ад прыгоннай залежнасці жыхароў мястэчка Пясочнае Ігуменскага павета з-пад валодання памешчыкаў Ёдкаў. Інвентары Капыльскага княства. 1665, 1734, 1780, 1781 гг. – 238 арк.
2. НГАБ. – Ф. 160. Воп. 1. Спр. 23. – Справа аб адшуканні волі ад прыгоннай залежнасці жыхароў вёскі Пырашаўская Слабада Ігуменскага павета з-пад валодання памешчыкаў Ёдкаў. 1831–1853 гг. – 1007 арк.
3. НГАБ. – Ф. 319 (Мінскі дваранскі дэпутацкі сход). Воп. 1. Спр. 10. – Пастановы Літоўскага дваранскага дэпутацкага сходу аб дваранскім паходжанні жыхароў Навагрудскага павета. 1798–1801 гг. – 654 арк.
4. НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 1. – Спр. 31. – Пастановы Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу аб дваранскім паходжанні розных асоб. Снежань 1802 г. – 1074 арк.
5. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 1. Спр. 32а. – Пастановы аб дваранстве розных асоб. 1802 г. – 829 арк.
6. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 1. Спр. 62. – Пастановы аб дваранскім паходжанні розных асоб. 1815 г. – 608 арк.
7. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 1. Спр. 71. – Пастановы аб дваранскім паходжанні розных асоб. 1816 г. – 772 арк.
8. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 1. Спр. 86. – Пастановы аб дваранскім паходжанні розных асоб. 1818 г. – 282 арк.
9. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 1. Спр. 133. – Пастановы аб дваранскім паходжанні розных асоб. 1826 г. – 1014 арк.
10. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 1. Спр. 162. – Пастановы аб дваранскім паходжанні розных асоб. 1830 г. – 442 арк.
11. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 1. Спр. 791. – Алфавітная ведамасць шляхты Слуцкага павета. 1796 г. – 71 арк.
12. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 64. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Арастовічаў. – 56 арк.
13. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 285. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Браткоўскіх. – 285 арк.
14. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 851. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Гурыновічаў-Ждановічаў. – 1124 арк.

15. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 1333. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Капцевічаў. – 128 арк.
16. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 1783. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Воўкаў-Левановічаў. – 759 арк.
17. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 2000. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Міхневічаў. – 272 арк.
18. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 2102. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Масакоўскіх. – 188 арк.
19. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 2155. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Мохартаў. – 253 арк.
20. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 3183. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Тарасевічаў. – 570 арк.
21. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 3386. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Хаўстовічаў. – 56 арк.
22. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 3611. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Чарнышэвічаў. – 864 арк.
23. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 3700. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Шубаў-Яблонскіх. – 257 арк.
24. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 3703. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Шубаў-Яблонскіх. – 313 арк.
25. НГАБ. – Ф. 333 (Мінская казённая палата). Воп. 9. Спр. 168. – Рэвізская сказка шляхты, сялян, святароў Слуцкага павета 1795 г. – 1358 арк.
26. НГАБ. – Ф. 694 (Радзівілы, князі). Воп. 2. Спр. 1239. – Актавая кніга Слуцкага замкавага суда. 1686–1689 гг. – 458 арк.
27. НГАБ. – Ф. 694. Воп. 2. Спр. 6419. – Дакументы на маёнтак Пагост Слуцкага княства. – 1634–1810 гг. – 1088 арк.
28. НГАБ. – Ф. 694. Воп. 2. Спр. 7381. – Інвентар Слуцкага княства. 1600 г. – 8 арк.
29. НГАБ. – Ф. 694. Воп. 2. Спр. 7432. – Рэестр вольных, застаўных і арандаваных маёнткаў і фальваркаў Слуцкага княства. 1760 г. – 48 арк.
30. НГАБ. – Ф. 694. Воп. 2. Спр. 9012. – Інвентар маёнтка Урэчча Слуцкага княства. 1789 г. – 17 арк.
31. НГАБ. – Ф. 694. Воп. 4. Спр. 6029. – Матэрыялы аб маёнтках Біржанскага і Капыльскага княстваў, Койданаўскага графства і іншых; рэестры дакументаў; попіс зямян Слуцкага і Капыльскага княстваў. 1526–1830 гг. – 585 арк.
32. НГАБ. – Ф. 1730 (Навагрудскі гродскі суд). Воп. 1. Спр. 11. – Актавая кніга Навагрудскага гродскага суда. 1732–1733 гг. – 801 арк.
33. НГАБ. – Ф. 1738 (Случарэскі гродскі суд). Воп. 1. Спр. 1. – Актавая кніга Случарэскага гродскага суда. 1793–1794 гг. – 751 л.
34. НГАБ. – Ф. 1774 (Навагрудскі земскі суд). Воп. 1. Спр. 16. – Актавая кніга Навагрудскага земскага суда. 1785 г. – 1301 арк.
35. НГАБ. – Ф. 1787 (Случарэскі земскі суд). Воп. 1. Спр. 2. – Актавая кніга Случарэскага земскага суда. 1793–1795 гг. – 1039 арк.

36. НГАБ. – КМФ-5. Воп. 1. Спр. 1417. – Інвентар маёнтка Івань Слуцкага княства. 1654 г. – 38 арк.
37. НГАБ. – КМФ-5. Воп. 1. Спр. 1538. – Інвентар маёнтка Яромічы Слуцкага княства. 1646 г. – 79 арк.
38. НГАБ. – КМФ-5. Воп. 1. Спр. 1539. – Інвентар маёнтка Яромічы і іншых маёнткаў, фальваркаў і валасцей Слуцкага княства. 1667 г.– 158 арк.
39. НГАБ. – КМФ-5. Воп. 1. Спр. 1540. Інвентар маёнтка Яромічы Слуцкага княства. 1673 г. – 42 арк.
40. НГАБ. – КМФ-5. Воп. 1. Спр. 1541. – Інвентар маёнтка Яромічы Слуцкага княства. 1682 г. – 59 арк.
41. НГАБ. – КМФ-5. Воп. 1. Спр. 2666. – Інвентар Нясвіжскага княства. 1628–1629 гг. – 387 арк.
42. НГАБ. – КМФ-5. Воп. 1. Спр. 2785/2. – Інвентар маёнтка Новы Двор Слуцкага княства. 1717 г. – 40 арк.
43. НГАБ. – КМФ-5. Воп. 1. Спр. 4446. – Інвентар маёнтка Урэчча Слуцкага княства. 1671 г. – 12 арк.
44. НГАБ. – КМФ-5. Воп. 1. Спр. 4447. – Інвентар маёнтка Урэчча Слуцкага княства. 1676 г. – 14 арк.
45. НГАБ. – КМФ-5. Воп. 1. Спр. 4448/1. – Інвентар маёнтка Урэчча Слуцкага княства. 1677 г. – 20 арк.
46. НГАБ. – КМФ-5. Воп. 1. Спр. 4449. – Інвентар маёнтка Урэчча Слуцкага княства. 1683 г. – 57 арк.
47. НГАБ. – КМФ-5. Воп. 1. Спр. 4450/1. – Інвентар маёнтка Урэчча Слуцкага княства. 1687 г. – 41 арк.
48. НГАБ. – КМФ-5. Воп. 1. Спр. 4451/1. – Інвентар маёнтка Урэчча Слуцкага княства. 1690 г. – 26 арк.
49. НГАБ. – КМФ-5. Воп. 1. Спр. 4452. – Інвентар маёнтка Урэчча Слуцкага княства. 1692 г. – 43 арк.
50. НГАБ. – КМФ-5. Воп. 1. Спр. 4454. – Інвентар маёнтка Урэчча Слуцкага княства. 1708 г. – 76 арк.
51. НГАБ. – КМФ-5. Воп. 1. Спр. 4455. – Інвентар маёнтка Урэчча Слуцкага княства. 1767 г. – 19 арк.
52. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 41. – Метрыка прывілеяў, наданняў, пацвярджэнняў і іншых розных спраў Жыгімонта II Аўгуста падчас канцлерства ваяводы віленскага Мікалая Радзівіла. 1558–1566 гг. – 377 арк.
53. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 50. – Наданні, пацвярджэнні мыт Жыгімонта II Аўгуста. 1566–1572 гг. – 368 арк.
54. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie (далей – AGAD). – Archiwum Warszawskie Radziwiłłów (далей – AR). – Dz. 23. Teka 137. Plik 4. – Rejestry, rachunki, sumariusze intrat, przychodu i rozchodu z miasta Słucka. 1566–1810. – 546 k.
55. AGAD. – AR. – Dz. 23. Teka 159. Plik 2. – Akta tyczące się szlachty, ziemian i bojar osiadłych na gruntach w księstwach słuckim i kopylskim. – 381 k.

56. AGAD. – AR. – Dz. 23. Teka 160. Plik 1. – Prawa ziemian księstwa słuckiego. – 283 k.
57. AGAD. – AR. – Dz. 25. Sygn. 50. – Inwentarz majętności Basławce. R. 1662. – 17 k.
58. Анищенко, Е. К. Шляхта Речицкого повета: Список XVIII ст. / Е. К. Анищенко. – Минск : Изд. В. Хурсик, 2015. – 316 с.
59. Гербоўнік беларускай шляхты. – Т. 1. А / Т. Капіца, А. Леўчык, С. Рыбчонак [і інш.]. – Мінск : БелНДІДАС, 2002. – 493 с.
60. Гербоўнік беларускай шляхты. – Т. 2. Б / С. Рыбчонак [і інш.]. – Мінск : НАРБ, 2007. – 672 с.
61. Гербоўнік беларускай шляхты. – Т. 4. Г / Д. Ч. Матвейчык [і інш.]; навук. рэд. А. Рахуба. – Мінск : Беларусь, 2016. – 959 с.
62. Глінскі, Я. С. Зямянская супольнасць Капыльскага княства ў XVII–XVIII стст. / Я. С. Глінскі // Архіварыус: Зб. навук. арт. і паведамл. – Вып. 16. – Мінск : НГАБ, 2018. – С. 198–225.
63. Грушевский, А. С. Пинское Полесье, XIV–XVI вв.: исторические очерки / А. С. Грушевский. – Киев : Типография Н. Т. Корчак-Новицкого, 1903. – II, 192, IV, 194 с.
64. Малиновский, И. Рада Великого Княжества Литовского в связи с Боярской думой древней России. – Ч. 2: Рада Великого Княжества Литовского. – Вып. 2: 1492–1569 / И. Малиновский. – Томск : Типолитография Сибирского товарищества печатного дела, 1912. – С. VII, XVIII, 492, XXXVI, 2 с.
65. Малы гербоўнік Наваградзкай шляхты / склад. С. А. Рыбчонак; маст. А. Леўчык. – Мінск : БелНДІДАС, 1997. – 161 с.
66. Малюгин, О. И. И. В. Волк-Леванович и его воспоминания: штрихи к портрету лингвиста / О. И. Малюгин, А. Н. Максимчик // Журнал Белорусского государственного университета. История. – 2020. – № 2. – С. 59–79.
67. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 30 (1480–1546). Кніга запісаў № 30 (Копія канца XVI ст.) / Падрыхт. В. С. Мянжынскі. – Мінск : Беларуская навука, 2008. – 386 с.
68. Ревизия пущ и переходов звериных в бывшем Великом княжестве Литовском, с присовокуплением грамот и привилегий на входы в пущи и на земли, составленная старостою мстибоговским Григорием Богдановичем Воловичем в 1559 году. – Вильна : Типография Губернского правления, 1867. – V, 382 с.
69. Семянчук, А. Лаўрышаўскае Евангелле / А. Семянчук // Silva rerum nova: Штудыі ў гонар 70-годдзя Георгія Я. Галенчанкі. – Вільня ; Мінск : Aidai ; Athenaeum, 2009. – С. 236–246.
70. Скеп'ян, А. А. Двор і слугі князёў Слуцкіх у канцы XV – 80-х гг. XVI ст. / А. А. Скеп'ян // Arche. – 2014. – № 6. – С. 305–339.
71. Статкевіч-Чабаганаў, А. В. Я – сын Ваш: Некрашэвічы герба «Любіч». Татуры герба «Данброва». Сеўрукі герба «Курч». Кернажыцкія герба «Юноша». Маствіловічы герба «Даленга» / А. В. Статкевіч-Чабаганаў. – Мінск : Роднае слова, 2012. – 592 с.

72. Стецкевич-Чебоганов, А. В. Я – сын Ваш: Сыцько герба «Остоя». Ждановичи-Гуриновичи герба «Любич». Мещанские роды Казанкины и Чебогановы. Арцишевские герба «Роля». Забелло герба «Топор» / А. В. Стецкевич-Чебоганов. – Минск : Белорусская Православная Церковь, 2013. – 576 с.
73. Чамярыцкі, В. «Александрыя» / В. Чамярыцкі // Вялікае Княства Літоўскае : Энцыклапедыя : У 2 т. – Т. 1: Абаленскі – Кадэнцыя ; 2-е выд. – Мінск : БелЭн, 2007. – С. 217.
74. Чарняўскі, Ф. В. Урадніkі (пасады, тытулы) Менскага ваяводства XVI–XVIII ст. : біяграфічны даведнік. – Вып. 6. Ч. 1: Падстарасты судовыя гарадскія, гродскія суддзі / Ф. В. Чарняўскі. – Мінск : Выд. В. Хурсік, 2021. – 496 с.
75. Яцкевіч, З. Л. Малы гербоўнік Рагачоўскай шляхты / З. Л. Яцкевіч // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. – Вып. 7. – Мінск : БелНДІДАС, 2009. – С. 267–281.
76. Boniecki, A. Herbarz polski / A. Boniecki. – T. 2. – Warszawa : Gebethner i Wolff, 1900. – 398 s.
77. Dziadulewicz, S. Herbarz rodzin tatarskich w Polsce / S. Dziadulewicz. – Wilno : Nakładem autora ; Komitet funduszu kultury narodowej, 1929. – XXX, 498 s.
78. Friedelówna, T. Ewangeliarz Ławryszewski. Monografia zabytku / T. Friedelówna. – Wrocław et al. : Zakład Narodowy imienia Ossolińskich, Wyd-wo PAN, 1974. – 280 s.
79. Klechta, A. Inwentarz księstwa słuckiego 1600 roku / A. Klechta // Rocznik bialskopodlaski. – T. 24. – Biała Podlaska, 2016. – S. 210–229.
80. Lietuvos Metrika (1540–1541). 10-oji Teismų bylų knyga (XVI a. pabaigos kopija) / Parengė S. Lazutka, I. Valikonytė, S. Viskantaitė-Saviščevienė, J. Karpavičienė. – Vilnius : Vilniaus universiteto leidykla, 2003. – LXVIII, 262 p.
81. Miłuński, M. Zarząd dóbr Bogusława Radziwiłła w latach 1636–1669 / M. Miłuński // Administracja i życie codzienne w dobrach Radziwiłłów XVI–XVIII wieku / pod red. U. Augustyniak. – Warszawa : DiG, 2009. – S. 195–283.
82. Siekierski, M. M. Landed Wealth in the Grand Duchy of Lithuania : The Economic Affairs of Prince Nicholas Christopher Radziwiłł : Dissertation of Doctor of Philosophy / M. M. Siekierski. – Berkeley : University of California, 1984. – 404 p.
83. Sienkiewicz, W. Ziemianie zależni w Wielkim Księstwie Litewskim od połowy XVI do połowy XVIII wieku. Studium z dziejów feudalizmu litewskiego : maszynopis pracy doktorskiej / W. Sienkiewicz. – Warszawa, 1982. – 460 s.
84. Uruski, S. Rodzina. Herbarz szlachty polskiej / S. Uruski. – T. 1. – Warszawa : Gebethner i Wolff, 1904. – 400 s.
85. Uruski, S. Rodzina. Herbarz szlachty polskiej / S. Uruski. – T. 5. – Warszawa : Gebethner i Wolff, 1908. – 396 s.
86. Uruski, S. Rodzina. Herbarz szlachty polskiej / S. Uruski. – T. 11. – Warszawa : Gebethner i Wolff, 1914. – 380 s.

87. Wolff, J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku / J. Wolff. – Warszawa : Drukiem J. Filipowicza, 1895. – XXV, 698 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 01.09.2021

*Ф. В. Чарняўскі*

# Маршалак Ашмянскага павета Ян Свалынскі (?–1646): паходжанне, грамадска-палітычная дзейнасць, маёмаснае становішча

Важнай крыніцай па гісторыі беларускай шляхты з'яўляюцца матэрыялы, якія захоўваюцца ў фондах дваранскіх дэпутацкіх сходаў (далей – ДДС) – органаў, якія ў перыяд знаходжання беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі ажыццяўлялі «разбор шляхты» – праверку прыналежнасці да шляхецкага саслоўя. З улікам таго, што судовыя кнігі паветаў ВКЛ за другую палову XVI – пачатак XVII ст. у большасці выпадкаў знішчаны часам і людзьмі, то дакументы, якія падаваліся падчас «разбору шляхты», даюць нам магчымасць прасачыць раннюю гісторыю шэрагу значных шляхецкіх родаў.

Пры падрыхтоўцы жыццяпісу Канстанціна Антонія Свалынскага, які знаходзіўся на пасадзе менскага гродскага суддзі ў 1694–1714 гг., у фондзе Мінскага ДДС былі адшуканы матэрыялы па генеалогіі Свалынскіх – шляхецкага роду, які паходзіў з Полацкага ваяводства. Дакументы былі пададзены ў ДДС у 1821 г. памешчыкам Дрысенскага павета Віцебскай губерні надворным радцам Траянам Адамам Свалынскім [1, арк. 1]. Сярод іншага, яны тычацца дзейнасці Яна Свалынскага, які ў першай палове XVII ст. займаў важны ўрад маршалка Ашмянскага павета, а таксама змяшчаюць звесткі пра яго продкаў. Зразумела, што цалкам давяраць дакументам, якія былі пададзены праз шмат гадоў пасля апісаных у іх падзей, немагчыма. Нават калі над імі і не працавалі спецыялісты па складанні фальшывых генеалогій, накшталт Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, то вялікая колькасць інфармацыі паступова сціраецца з памяці нашчадкаў. Таму неабходна пастаянна праводзіць верыфікацыю атрыманых звестак.

Згодна з родавымі паданнямі, Свалынскія паходзілі ад зямян Полацкага ваяводства Зяновія і яго сыноў: Уласнага і Ахрамея Свалонскіх (іх нашчадкі ў XVII–XVIII стст. пачалі называцца Свалынскімі) [1, арк. 1–2]. У канцы XV – пачатку XVI ст. Зянові і яго сыны валодалі землямі ў вёсцы Свольна, размешчанай на беразе аднайменнай ракі.

Непадалёк ад вёскі на левым беразе Заходняй Дзвіны знаходзіўся моцна ўмацаваны замак Дрыса.

Згадкі пра Свалонскіх не сустракаюцца ў матэрыялах попісу войска ВКЛ, праведзенага ў 1528 г. Свалонскія адносіліся да дробнай шляхты, якая падчас правядзення попісу была ўлічана істотна горш, чым уладальнікі больш значных маёнткаў з падданымі [2, с. 4].

Першая згадка пра Свалынскіх у матэрыялах Метрыкі ВКЛ тычыцца падзей сярэдзіны XVI ст. У гэты час ВКЛ было ўцягнута ў вайну з Маскоўскай і Шведскай дзяржавамі за валоданне тэрыторыяй Лівонскага ордэна. У пачатку баявых дзеянняў войска ВКЛ панесла вялікія страты і вымушана было адступіць з тэрыторыі ўсходніх паветаў краіны. Маскоўскія войскі занялі землі Віцебскага і Полацкага ваяводстваў і ўмацаваліся на ўсходзе Інфлянтаў. У гэты час Зянові і яго сыны Уласны і Ахрамей ужо не жылі, удзел у Інфлянцкай вайне бралі іх нашчадкі: Іван і Уласны Уласнавічы і іх стрыечныя браты Якуб, Іван, Сямён і Лукаш Ахрамеевічы (Ерамеевічы) [1, арк. 1–1 адв.; 4, арк. 72 адв.–73]. Іх землі ў Свольне былі захоплены, а маёмасць разрабавана. Вядома, што Іван Ахрамеевіч Свалонскі служыў у роце каралеўскага ротмістра Анікея Корсака [4, арк. 73]. Не выключана, што Іван і Уласны Уласнавічы, Якуб, Сямён і Лукаш Ахрамеевічы Свалонскія таксама ўзялі ўдзел у супрацьстаянні захопнікам пад яго харугвай.

Падчас ваенных дзеянняў Сямён і Лукаш Ахрамеевічы трапілі ў палон і пасля доўгага знаходжання ў маскоўскім зняволенні былі выкуплены родзічамі [3, арк. 3]. 8 красавіка 1571 г. кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт II Аўгуст накіраваў ліст дзяржаўцу дзісенскаму Баркулабу Іванавічу Корсаку аб вяртанні полацкім зямянам Сямёну і Лукашу Ахрамеевічам Свалонскім вотчынных і застаўных зямель, раней далучаных да дзяржаўнага маёнтка Дзісна [3, арк. 3–3 адв.]. У гэты ж дзень падобны ліст быў накіраваны дзяржаўцу дрысенскаму Яну Лопату, які павінен быў вярнуць братам Свалонскім маёнткі *«Стукачево, Свиреневщизну*[1] *и въ Княжичахъ з людьми и зъ земълями»*, а таксама два дамы ў Дрысе і пляц у Дрысенскім замку [3, арк. 3 адв.–4 адв.]. Пасля вяртання з палону Сямён Свалонскі прасіў у вялікага князя дапамогі, згадваючы, што для выкупу з палону ён улез у немалыя даўгі. Для іх кампенсацыі Жыгімонт Аўгуст у 1571 г. выдаў яму прывілей на *«пустовщину в земли Полоцкои в селе Кнежичах, над рекою Дрысою лежачую, прозываемую Боришово и Ковшелево»* [4, арк. 374 адв.–375; 5, арк. 415 адв.–416]. Праз шмат гадоў, 9 студзеня 1745 г., прывілей Жыгімонта Аўгуста Свалын-

---

[1] У іншым месцы ліста назва перададзена як «Свиревщина».

скім быў пацверджаны каралём польскім і вялікім князем літоўскім Аўгустам III скарбніку інфлянцкаму Яну Свалынскаму [6, арк. 626–627].

У такім жа становішчы, як Свалонскія, аказалася вялікая колькасць шляхты з Полаччыны і Віцебшчыны, якая страціла свае землі. Вялікі князь літоўскі надаў у пачатку 1560-х гг. Свалонскім, да вяртання з-пад улады непрыяцеля страчаных маёнткаў, землі ў Свіслацкай воласці [7, с. 97]. Верагодна, палачане аказаліся людзьмі заслужанымі і праявілі сябе добрымі ваярамі, бо ў іх часовае карыстанне былі перададзены землі ў сяле Гарадзец Свіслацкай воласці памерам у 2 мілі ўздоўж і ўпоперак. На іх знаходзіліся 6 службаў з 27 дымамі падданых [4, арк. 72 адв.–73; 7, с. 97].

Атрымаць землі было не самай цяжкай справай. Цяжэй было замацаваць іх у сваім карыстанні да моманту вызвалення родных краёў ад непрыяцеля. У 1561 г. Свіслацкая воласць знаходзілася ў пажыццёвым валоданні пісара гаспадарскага Міхаіла Гарабурды (у будучыні менскага кашталяна). Ён вельмі варожа паставіўся да нечаканых суседзяў, якія значна паменшылі яго ўладанні. У жніўні 1561 г. слугі і падданыя гаспадарскага пісара напалі на свіслацкія землі братоў і моцна спустошылі іх. Свалонскія паскардзіліся вялікаму князю на дзеянні Гарабурды і атрымалі падтрымку [4, арк. 72 адв.–73]. Супрацьборства палачанаў з Міхаілам Гарабурдам працягвалася яшчэ ў 1565 г.

Іван Ахрамеевіч Свалонскі 14 лістапада 1558 г. узяў удзел у судовай справе, дзе абараняў хворую Уршулю Войцехаўну Боркавую (Барысавую) Жабіну (у першым шлюбе Аляксандравую Тарноўскую). Праз свайго ўпаўнаважанага яна паклікала ў суд суседзяў – Станіслава Дзевялтоўскага і яго жонку Зафею. Варожасць паміж імі ўзнікла праз нявырашанасць межавых пытанняў. Пасля неатрымання згоды Уршулі Войцехаўны на саступку спрэчнага кавалка зямлі Зафея Дзевялтоўская разам з памочнікамі і слугамі вытаптала ў полі *«свежую маладую ярыцу»*, якая належала Уршулі [8, арк. 990 адв.–991].

У XIX ст., падчас «разбору шляхты», згадваліся нашчадкі трох братоў Свалонскіх: Якуба, Лукаша і Івана Ахрамеевічаў. Аднак галіны Якуба і Івана, у адпаведнасці з родавымі паданнямі, нібыта хутка спыніліся, іх сыны – Севярын Якубавіч і Якуб Іванавіч – не пакінулі нашчадкаў. У Івана таксама была дачка Шчасная, якая ўзяла шлюб з Нячаем [1, арк. 1–1 адв.]. Паводле пададзеных у Мінскі ДДС звестак, усе Свалынскія, якія згадваліся ў XVII–XVIII стст., паходзілі выключна ад Лукаша Ахрамеевіча Свалонскага. У пачатку XIX ст. Свалынскія сцвярджалі, што Лукаш меў сына Гальяша, які пакінуў сыноў Даніэля, Юзафа, Аляксандра (памёр без нашчадкаў) і Івана (Яна) – будучага маршалка Ашмянскага павета. Аднак незалежнымі крыніцамі пацвярджаецца нараджэнне ў сям'і Гальяша Свалонскага сыноў Даніэля, Юзафа і, маг-

чыма, Аляксандра. З вядомых на дадзеным этапе даследавання звестак вынікае, што Гальяш быў не бацькам маршалка Ашмянскага павета, а толькі яго малодшым братам.

З пачатку XVII ст. прадстаўнікі гэтага полацкага зямянскага роду сталі называць сябе Свалынскімі. Пры вывучэнні матэрыялаў судоў ВКЛ была выяўлена згадка аб нараджэнні ў сям'і не пазначанага па імені Свалынскага трох сыноў: Івана (Яна), Багдана і Гальяша [9, арк. 403–403 адв., 412–413]. Іх бацька і брат Багдан памерлі да сакавіка 1617 г. Таму як будучы ашмянскі маршалак Іван (Ян) Свалынскі неаднаразова згадваўся ў ранніх дакументах з імем па бацьку Іванавіч (Янавіч), бацькам братоў мог быць толькі адзін чалавек – Іван Ахрамеевіч Свалонскі. У пачатку сакавіка 1617 г. Ян Іванавіч Свалынскі адмовіўся на карысць брата Гальяша ад валодання часткамі маёнткаў Стукачэўшчына і Свіраёўшчына, размешчаных на рацэ Свольне [9, арк. 403–403 адв., 412–413]. Верагодна, пры падзеле спадчыны памерлага бацькі браты прыйшлі да згоды, Ян атрымаў землі на Ашмяншчыне, а Гальяш стаў адзіным уладальнікам большай часткі бацькоўскіх уладанняў у межах Полацкага ваяводства. У яго валоданні апынуліся таксама вотчынныя землі ў сяле Свольна. У 1660-я гг. Свольна належала нашчадку Гальяша – Севярыну Свалынскаму [10, с. 489–490].

Вядомыя звесткі пра пачатак дарослага жыцця Яна Свалынскага кароткія і не даюць магчымасці для паўнавартаснага асвятлення яго дзейнасці. У крыніцах ён фігуруе з канца студзеня 1599 г., калі засведчыў запіс Яна Снарскага, яго жонкі Ганны Маркаўны Шыпілаўны і яе брата Андрэя Шыпілы аб маёнтку Уліна Полацкага ваяводства [11, арк. 246а–247 адв.].

Паведамленне пра яшчэ маладога Яна Іванавіча Свалынскага (Свалонскага), якое тычыцца яго дзейнасці ў Менскім павеце, захавалася ў дакуменце, унесеным у кнігі Галоўнага Трыбунала ВКЛ 24 лістапада 1609 г. [12, арк. 543]. У пачатку XVII ст. у валоданне Войцеха Мілеўскага і яго жонкі Гальшкі Падоскай перайшла ад Рагозаў частка маёнтка Хаценчыцы Менскага павета. 22 лістапада 1609 г. Ян Іванавіч набыў за 30 коп літоўскіх грошаў у Мілеўскіх Карпавіцкую пушчу [12, арк. 543–545 адв.]. Зразумела, што набываць пушчу мэтазгодна было толькі пры наяўнасці побач уласных зямель. У прадажным лісце адзначалася, што пушча размяшчалася *«пры мяжы пана Свалонскага маёнтка Хаценчыцкага»* [12, арк. 543 адв.–544].

Ужо на 1607 г. Ян Свалынскі меў значныя заслугі перад каралём, за што быў узнагароджаны Жыгімонтам III. 12 лістапада 1607 г. падскарбі ВКЛ Яраш Валовіч атрымаў загад аб штогадовай выплаце Свалынскаму юргельта памерам у 150 злотых. Раней гэты юргельт атрымліваў нядаўна памерлы Станіслаў Пілецкі, які таксама меў заслугі перад уладаром.

Першапачаткова меркавалася, што юргельт будзе выплачвацца Яну Свалынскаму з даходаў каралеўскіх уладанняў, але высветлілася, што падчас ваенных дзеянняў ім былі нанесены вялікія шкоды, і яны былі не ў стане забяспечваць нават каралеўскія патрэбы. Таму 5 красавіка 1613 г. Яну Свалынскаму быў нададзены новы каралеўскі прывілей – з дазволам за час, пачынаючы з лістапада 1612 г., выбраць прызначаныя яму грошы з *«мыт старых менскай каморы»* [13, арк. 210 адв.].

Да пачатку 1616 г. моцна сапсаваліся адносіны Яна Свалынскага і менскага месціча Фёдара Заляцелага. У жніўні 1616 г. Ф. Заляцелы вымушаны быў звярнуцца да Жыгімонта III па атрыманне заручнага ліста, які гарантаваў бы яму бяспеку ад нападаў Свалынскага [9, арк. 205]. Аднак гэта не значыць, што Ян пасварыўся з усімі менскімі месцічамі. Улічваючы яго вопыт і вялікія сувязі ў адміністрацыі ВКЛ, тыя неаднаразова запрашалі яго і яго сваякоў для абароны сваіх правоў у судовых працэсах супраць навакольнай шляхты.

У пачатку XVII ст., акрамя Яна Свалынскага, у Менскім павеце жылі і некаторыя іншыя прадстаўнікі роду. На 29 студзеня 1619 г. было прызначана судовае пасяджэнне, на якім разглядаліся прэтэнзіі менскіх месцічаў да нашчадкаў менскага войта Яна Карэйвы: Войцеха Каспаравіча і дзяцей яго памерлага брата Канстанціна [14, арк. 72]. У валоданні Карэйваў знаходзіліся абшары зямель у паселішчы Сухарава, якое знаходзілася побач з Менскам. Служэбнікі і падданыя Карэйваў не лічыліся з правамі месцічаў на памежныя землі і пры кожным зручным выпадку наносілі менчукам вялікія шкоды пад кіраўніцтвам сухараўскага адміністратара Яна Гадлеўскага. Таму месцічы запрасілі Міхала Свалынскага, родзіча будучага маршалка ашмянскага, для абароны сваіх інтарэсаў у гэтай справе. У судзе ён даказаў, што Карэйвы не толькі рабавалі ўладанні жыхароў горада, але і мелі ў горадзе дамы, населеныя рамеснікамі, а таксама крамы, за якія не плацілі ў скарб горада падаткаў [14, арк. 72–73].

Да 1617 г. у Яна Свалынскага ўзніклі сур'ёзныя супярэчнасці з канцлерам ВКЛ Львом Сапегам. Губскае староства ў Ашмянскім павеце, размешчанае непадалёк ад Куранца, знаходзілася ў пажыццёвым карыстанні канцлера ВКЛ і межавала з землямі ў маёнтку Вузлы – уласнасці Свалынскага [15, арк. 255]. З-за неакрэсленасці межаў падданыя абодвух паноў стараліся нанесці як мага больш шкоды суседзям. 16 ліпеня 1617 г. Сапега і Свалынскі дасягнулі мірнай дамовы і правялі размежаванне зямель. З боку канцлера ВКЛ г\тым займаліся яго служэбнікі – Канстанцін Залескі, Дзяметрый Кердзей і Ян Смажэўскі. У сваю чаргу Я. Свалынскі паклікаў для правядзення размежавання сваіх прыяцеляў – стольніка літоўскага Аляксандра Слізня, суддзю гродскага ашмянскага Станіслава Карэйву і Яна Войну [15, арк. 255 адв.]. Падчас

размежавання былі ўсталяваны капцы, якія павінны былі адасобіць Губскую пушчу ад уладанняў Свалынскага. У 1619 г. дакумент аб размежаванні быў пацверджаны Жыгімонтам III Вазам [15, арк. 255–257 адв.].

Ян Свалынскі, як і яго продкі, браў удзел у ваенных выправах, якія былі выкліканы неабходнасцю абароны інтарэсаў краіны, і атрымоўваў за гэта ўзнагароды. 30 кастрычніка 1626 г. ён атрымаў права прэтэндаваць у судовым парадку на валоданне адной службай, размешчанай ва ўрочышчы Мікуноўшчына, каля рэк Свольна і Старыца, непадалёк ад Любецкага сяла Полацкага ваяводства [16, арк. 490]. Гэтыя землі трапілі ў распараджэнне каралеўскага двара пасля смерці былога полацкага бурмістра Івана Мацвеевіча Місуны. У гэтым прывілеі, як і ў некаторых іншых, даецца высокая ацэнка ваенным справам Яна Свалынскага і згадваецца яго ўдзел у войнах супраць Маскоўскай дзяржавы і Швецыі [16, арк. 490].

У 1627 г. Ян Свалынскі дамовіўся з Ежы Слізнем і Ганнай Слізнянкай Ежыеўнай Камароўскай, дачкой нябожчыка Германа Слізня, аб пераходзе ў яго вячыстае леннае трыманне часткі маёнткаў Вузлы, Матыкі, Княгінін і Студзёнкі Ашмянскага павета [17, арк. 211]. 23 лістапада 1627 г. быў выдадзены каралеўскі прывілей, які зацвярджаў пераход зямель у яго валоданне. У гэтым дакуменце таксама згадваўся яго ўдзел у ваенных кампаніях па абароне межаў краіны [17, арк. 211–211 адв.].

У некаторых выпадках Ян Свалынскі нёс страты ад дзеянняў сваіх нядобразычліўцаў. У 1634 г. суседзі Свалынскага браты Альбрыхт і Францішак Сулістроўскія нечакана напалі вялікай грамадой на яго маёнтак у Ашмянскім павеце [18, s. 318–319]. Падчас нападу моцна пацярпеў сам гаспадар, які быў паранены, а таксама быў забіты войт маёнтка і пакалечана некалькі слуг.

У пачатку XVII ст. абшары зямель Менскага павета, якія знаходзіліся ў валоданні Свалынскага, павялічыліся. Верагодна, атрыманне ім новых маёнткаў у Менскім павеце было звязана са шлюбам з Зосяй (Зафеяй) Тамковічаўнай Сялецкай, дачкой памерлага каля 1596 г. Каспара Тамковіча і яго жонкі Гальшкі Ляўковічаўны. Каспар Тамковіч і яго сыны першымі з гэтага роду пачалі карыстацца прыдомкам Сялецкія. Гэты ж прыдомак ужывала і жонка Яна Свалынскага.

Захаваліся згадкі аб сумесных дзеяннях у пачатку 1620-х гг. Яна Свалынскага і сыноў К. Тамковіча па абароне ад нападаў татар Кадышавічаў зямель у сяле Слагавішча, якія трапілі ў іх рукі як спадчына пасля К. Тамковіча [19, арк. 31]. Несумненна, што большая частка ўладанняў апошняга перайшла да яго жонкі Гальшкі (якая затым узяла другі шлюб з Андрэем Кянсоўскім) і яго сыноў. Магчыма, Зося Тамковічаўна, апрача грашовых сум, таксама прынесла ў дом мужа землі, размешчаныя на захад ад Лагойска, каля Гайны і Слагавішча. К. Тамковіч набыў каля

1596 г. за 3000 коп літоўскіх грошаў у старасціны снятынскай Настассі Васільеўны Тышкевічаўны Мікалаевай Юр'евічавай з Бучача Язлавецкай вялікія абшары зямель у Сяльцы непадалёк ад Лагойска. Тым самым ён стаў адным з найбуйнейшых землеўладальнікаў павета. Яго сыны Філон, Траян і Юрый Тамковічы бралі актыўны ўдзел у жыцці Менскага павета і неаднаразова згадваюцца ў актавых кнігах Менскага гродскага суда.

Верагодна, Ян Свалынскі ўзяў шлюб з Зосяй Тамковічаўнай Сялецкай каля 1610 г. Першая вядомая згадка пра іх як сямейную пару датавана 6 верасня 1619 г. У гэты дзень у Менскім гродскім судзе разглядалася скарга Яна Свалынскага і яго жонкі Зосі на дзеянні менскага зямяніна Яна Віхароўскага [9, арк. 949]. Пасля вяртання Свалынскімі пазыкі, забяспечанай перададзенымі ў застаўное валоданне землямі ў Раванічах і Дрэкчы, Віхароўскі не аддаў ім аблігацыйны ліст на гэтыя маёнткі.

У пачатку студзеня 1622 г. браты Філон, Траян і Юрый Тамковічы Сялецкія з дапамогай Яна Свалынскага і яго жонкі (і сваёй сястры) Зафеі працягвалі дабівацца ад татарскага харужага Абрагама Алеевіча Кенскага і яго сваякоў з роду Кадышавічаў адмовы ад прэтэнзій на землі ў наваколлі сяла Слагавішча [19, арк. 30 адв.–32 адв.]. Гэтыя спробы не мелі поспеху, таму Тамковічы і Свалынскі надалей удзельнічалі ў судовых працэсах па справе аб прыналежнасці зямель, якія яшчэ ў 1551 г. былі набыты ў татараў маршалкам гаспадарскім, ваяводам смаленскім, старастам судовым менскім і пінскім Васілём Тышкевічам. Паведамленні пра Зосю Тамковічаўну перастаюць сустракацца пасля 1623 г.

На нашу думку, яшчэ пры жыцці Зосі Тамковічаўны Ян Свалынскі прыняў каталіцызм. Магчымасці для займання ўрадаў і атрымання ў пажыццёвае карыстанне зямель у каралеўскіх староствах былі істотна вышэйшымі ў шляхціцаў каталіцкага веравызнання, чым у прадстаўнікоў іншых канфесій.

Вялікія змены ў жыцці Яна Свалынскага адбыліся пасля яго шлюбу з Тэадорай Зафеяй Адамаўнай Трызнянкай [20, s. 239]. Яна нарадзілася ў сям'і Адама Трызны, трэцяга сына ваяводы парнаўскага Пятра Трызны. Акрамя дачкі, у ваяводзіча парнаўскага быў сын Клеменс Казімір, які ўзяў шлюб з Ломскай, а потым развёўся і стаў архімандрытам віленскім [21, s. 125]. Дата шлюбу Свалынскага і Трызнянкі застаецца невядомай. У якасці жонкі Яна Тэадора Зафея ўпершыню згадвалася ў 1637 г. [22, арк. 99 адв.]. Звесткі пра нараджэнне дзяцей у гэтым шлюбе невядомыя.

Узвышэнне роду Трызнаў пачалося ў канцы XVI ст. Першапачаткова яго прадстаўнікі займалі пасады і трымалі ганаровыя ўрады пераважна ў Ваўкавыскім, Вількамірскім, Гарадзенскім і Слонімскім паветах ВКЛ. Сыны і ўнукі маршалка гаспадарскага, кашталяна падляшскага Рыгора Трызны спачатку атрымлівалі ўрады крайчых, стольнікаў, падстоліяў

ВКЛ, а потым займалі і высокія пасады падскарбія і рэферэндара ВКЛ. Яны заключалі шлюбы з прадстаўніцамі родаў Вадынскіх, Валовічаў, Сапегаў, выдавалі сваіх дачок за прадстаўнікоў знатных літоўскіх родаў, напрыклад, Пацаў.

Верагодна, асаблівы ўплыў на ўзвышэнне Яна Свалынскага маглі аказаць сыны маршалка слонімскага Рыгора Трызны: Марцыян (каад'ютар віленскі, духоўны рэферэндар ВКЛ, а ў канцы жыцця падканцлер ВКЛ (з 1641 г.)), Мікалай (з 1635 г. падскарбі ВКЛ) і Гедэон Міхал (з 1644 г. падскарбі ВКЛ) [23, s. 148, 157, 170].

Дзякуючы падтрымцы Трызнаў Ян Свалынскі каля 1640 г. атрымаў прывілей на пасаду каралеўскага сакратара, а да пачатку 1642 г., пасля смерці Тамаша Воляна, заняў высокую пасаду маршалка Ашмянскага павета [20, s. 239]. Яшчэ 6 мая 1641 г. ён згадваўся ў матэрыялах Метрыкі ВКЛ толькі як сакратар яго каралеўскай міласці [24, арк. 856]. Упершыню на пасадзе маршалка Ашмянскага павета ён згаданы 8 снежня 1642 г. [20, s. 239]. Неабходна заўважыць, што Зафея Трызнянка была ў сваяцтве з такімі прадстаўнікамі дзяржаўнай эліты, як ваявода віленскі Крыштаф Хадкевіч і яго жонка князёўна Зафея Друцкая-Горская [25, s. 174].

Роднасныя сувязі ў ВКЛ гралі таксама вялікую ролю пры ажыццяўленні маёмасных здзелак. 9 лютага 1637 г. падскарбі і пісар ВКЛ Мікалай Трызна саступіў родзічам частку старостваў. Да падкаморыя слонімскага Габрыэля Шэмета і яго жонкі Раіны Трызнянкі трапілі землі, аддзеленыя ад Ожскага староства. Падкаморы берасцейскі Казімір Тышкевіч і яго жонка Тэадора Трызнянка атрымалі землі, вылучаныя з Пераломскага староства. Сын Мікалая стараста вількамірскі Тэафіл Трызна разам з жонкай Ізабэлай Ляцкай набыў землі, аддзеленыя ад Блудзенскага староства [26, арк. 9–10 адв., 11 адв.–13]. Праз чатыры месяцы, 18 чэрвеня гэтага ж года, Уладзіслаў IV надаў новы консэнс – на гэты раз стольніку ВКЛ, адміністратару Гарадзенскай эканоміі Гедэону Міхалу Трызну на перадачу сяла Ятвеск Ваўкавыскага павета ў пажыццёвае трыманне Яна Свалынскага і яго жонкі Тэадоры Трызнянкі [22, арк. 99 адв.–100]. Гэтыя землі толькі нядаўна трапілі да Гедэона Міхала пасля смерці падкаморыя лідскага Аляксандра Трызны, а адмова ад іх была выклікана неабходнасцю ў вялікай суме грошай для вяртання бацькавых пазык.

Праз пяць гадоў высветлілася, што Свалынскія пасля атрымання ад Гедэона Трызны маёнтка Ятвеск не выдавалі дзесяціны на карысць мясцовага Поразаўскага касцёла [24, арк. 856–856 адв.]. Аднак на каралеўскі суд па гэтай справе Ян і Тэадора Свалынскія не з'явіліся. У выніку 6 мая 1641 г. поразаўскаму плябану Барталамею Высоцкаму была прысуджана кампенсацыя ў памеры 6 тысяч злотых [24, арк. 856–857].

29 ліпеня 1643 г. той жа Гедэон Міхал Трызна (ужо як падчашы ВКЛ) склаў запіс аб продажы за 1000 коп літоўскіх грошаў Яну Свалынскаму вёскі Вавулічы і вуліцы Васілішчаўскай у вёсцы Бездзеж Пінскага павета [27, арк. 279–281 адв.]. Гэтая маёмасць трапіла ў валоданне падчашага ВКЛ пасля смерці брата Марцыяна. Атрыманыя за іх грошы Гедэон Трызна меркаваў выкарыстаць на аплату пазык брата.

Захавалася некалькі паведамленняў аб першых гадах знаходжання Яна Свалынскага на высокіх пасадах каралеўскага сакратара і маршалка Ашмянскага павета. 6 сакавіка 1641 г., яшчэ як каралеўскі сакратар, Ян Свалынскі пазваў у суд менскага зяманіна Мальхера Цадроўскага [28, арк. 684]. На пасяджэнні Менскага гродскага суда, якім кіраваў сам стараста судовы менскі Крыштаф Завіша, быў прыняты дэкрэт на карысць Свалынскага – М. Цадроўскі быў пакараны вялікім штрафам. Аднак, адчуваючы сябе пакрыўджаным і падазраючы падман, ён пазваў у суд самога старасту судовага менскага. Да пачатку лістапада гэтага ж года міравым пагадненнем скончылася справа Свалынскага з менскім харужым Янушам Уніхоўскім і яго жонкай. Уніхоўскі выказаў прэтэнзіі на некаторыя маёнткі Свалынскага і напаў на іх. Аднак бакі хутка прыйшлі да пагаднення – Ян Свалынскі атрымаў кампенсацыю за панесеныя страты і перадаў Уніхоўскаму квітанцыйны ліст [29, арк. 349–349 адв.].

Да снежня 1641 г. у Яна Свалынскага пачаўся судовы працэс супраць радашковіцкіх арандатараў Ізаака Аронавіча і Герша Шаевіча па справе аб невяртанні пазыкі. Галоўны Трыбунал ВКЛ 12 чэрвеня 1642 г. па скарзе каралеўскага маршалка вынес баніцыю на арандатараў [30, арк. 120]. Яшчэ ў папярэднім годзе каралеўскі суд вынес дэкрэт аб правядзенні спагнання пазыкі за кошт дома арандатараў у Радашковічах, але яны сабралі вялікі натоўп сваіх прыхільнікаў і не дапусцілі каралеўскага двараніна да выканання дэкрэта. Да пачатку снежня 1642 г. бакі прыйшлі да прымірэння, і даўжнікі пагадзіліся выплаціць пазыку [29, арк. 656].

4 красавіка 1642 г. у Менскім гродскім судзе разглядалася скарга Яна Свалынскага на застаўнога трымальніка аднаго з яго шматлікіх маёнткаў. На гэты раз суд таксама прызнаў абгрунтаванымі прэтэнзіі каралеўскага сакратара і ўсклаў на яго праціўніка выплату кампенсацыі ў памеры 520 коп літоўскіх грошаў [28, арк. 14]. Хаця застаецца невядомым, ці пагадзіўся крыўдзіцель маршалка ашмянскага з пастановай суда.

За ўсімі справамі ашмянскі маршалак забыўся аб неабходнасці ўнясення ў скарб краіны падаткаў. 8 жніўня 1645 г. Яна Свалынскага паклікаў у гаспадарскі суд паборца пінскі Ян Крупка, які абвінаваціў высокага ўрадніка ВКЛ у нявыплаце другой раты (часткі) падатку, ухваленага 6 ліпеня 1644 г. соймам Рэчы Паспалітай [31, арк. 1а адв.]. Аднак на судовы разбор Свалынскі не з'явіўся.

Памёр каралеўскі сакратар і маршалак Ашмянскага павета Ян Свалынскі ў другой палове 1646 г. У апошні раз ён згаданы на сваіх пасадах 26 сакавіка 1646 г. [20, s. 239]. Ужо 8 снежня 1647 г. каралеўская намінацыя на вакантную пасаду маршалка ашмянскага была нададзена Яну Уладзіславу Дэспату-Зяновічу, суддзічу земскаму віленскаму, каралеўскаму пакаёваму двараніну.

Жонка Свалынскага Тэадора Зафея Трызнянка каля 1649 г. заключыла новы шлюб са старастам крычаўскім Мікалаем Стэфанам Пацам [20, s. 239]. Дзякуючы падтрымцы родзічаў, Мікалай Пац зрабіў бліскучую кар’еру. 24 красавіка 1651 г. ва ўзросце каля 28 гадоў ён стаў ваяводам троцкім, а да 10 ліпеня 1670 г. быў прызначаны кашталянам віленскім, тым самым заняўшы адну з самых высокіх пасад у ВКЛ. Пры гэтым крыху раней, 1 ліпеня, ён быў высвечаны ў духоўны сан суфраганам беларускім Мікалаем Слупскім. Гэта было неабходна, каб стаць віленскім біскупам. Ваявода троцкі яшчэ ў 1669 г. атрымаў згоду жонкі на развод, але неабходныя цырымоніі для атрымання біскупскай годнасці ён праходзіў, калі ўжо дэ-факта з’яўляўся біскупам. Такое незвычайна хуткае ўзвышэнне прывяло Мікалая Стэфана Паца да супрацьстаяння з Віленскай капітулай. Святары сабралі неабходныя матэрыялы і накіравалі іх у Рым з прашэннем аб пераглядзе згоды папы рымскага на прызначэнне магната віленскім біскупам. Усе фармальнасці, неабходныя для паўнапраўнага выканання Мікалаем Пацам святарскіх абавязкаў, былі выкананы толькі ў пачатку 1680-х гг. [32, s. 738–741; 33, s. 170].

Адносіны віленскага біскупа да рэлігіі былі неадназначнымі. Мікалаю Пацу няспынна патрабаваліся грошы на рэалізацыю яго шматлікіх прадпрыемстваў. У лютым 1679 г. ён, выпраўляючыся за мяжу дзяржавы для лячэння, перадаў у застаўное валоданне Вінцэнту Ляшчынскаму за 3000 злотых галоўную адзнаку сваёй пасады – біскупскую мітру. Памёр Мікалай Стэфан Пац 8 мая 1684 г. [32, s. 738–741; 33, s. 170].

Пасля смерці мужа Тэадоры Трызнянцы давялося шмат часу прысвяціць удзелу ў судовых працэсах, звязаных з вяртаннем шматлікіх пазык, атрыманых яе мужам. На адным з першых судовых працэсаў, які адбыўся адразу пасля смерці Паца, стольнік менскі Андрэй Касакоўскі дабіваўся спагнання з удавы 180 злотых [25, s. 185]. Іншыя судовыя справы з удзелам таго ж Андрэя Касакоўскага, мечніка мсціслаўскага Станіслава Дзмітра Вышамірскага, старасты будавіцкага Станіслава Невяроўскага, падкаморычаў навагародскіх Храптовічаў прыносілі Трызнянцы значна большыя матэрыяльныя страты [25, s. 185–186].

Тэадора Трызнянка згадвалася ў 1690 г. у рэестры збору падымнага як шляхцянка Сольскай парафіі Ашмянскага павета [34, s. 183]. У гэты час ёй належалі маёнткі Данюшава і Казяняты, якія ёй дасталіся яшчэ ад першага мужа – Яна Свалынскага. Яна выкарыстоўвала тытул ва-

водзіны троцкай, бо яе другі муж трымаў гэты ўрад у 1669 г. – падчас вызвалення ад шлюбнай прысягі [25, s. 173].

Шлюб Яна Свалынскага з Тэадорай Трызнянкай быў бяздзетным. У першым шлюбе маршалка Ашмянскага павета з Зафеяй Тамковічаўнай Сялецкай нарадзіліся сын Міхал Казімір і дачка Алена. Верагодна, яны маглі нарадзіцца яшчэ да 1620 г.

Упершыню згадка пра маршалковіча ашмянскага Міхала Казіміра Свалынскага сустракаецца ў квітанцыйным лісце ад 14 снежня 1648 г., складзеным кашталянам парнаўскім Тамашом Касакоўскім з нагоды атрымання грошай і вяртання Свалынскаму аддадзенага ў застаўное валоданне маёнтка Ятвеск [35, арк. 92 адв.–93 адв.]. 26 студзеня 1649 г. Ян (муж сястры Міхала Казіміра Алены) і яго браты Аляксандр і Генрык з Райска Райскія атрымалі права прэтэндаваць у судовым парадку на ўсе маёнткі Міхала Казіміра Свалынскага. Неабходнасць пакарання швагра, паводле тлумачэння Райскіх, вынікала з узяцця ім *«неналежнага шлюбу» («nieporządnego małżeństwa»)* [36, арк. 12 адв.–13]. Зразумела, што ў гэтай справе супраць брата выступала і яго сястра Алена.

Аб сямейным жыцці маршалковіча ашмянскага звестак захавалася мала. 3 сакавіка 1664 г. згадана пра яго развод з жонкай Багумілай Радашынскай (Радасанскай) [37, арк. 4 адв.]. Паведамленняў пра нараджэнне ў гэтым шлюбе дзяцей не выяўлена. У Міхала Казіміра былі моцныя сувязі з родзічамі яго маці Зафеі Тамковічаўны Сялецкай. У пачатку сакавіка 1676 г. ён засведчыў (разам з Пятром Невяровічам) тастамент свайго дзядзькі Юрыя Каспаравіча Тамковіча Сялецкага [38, арк. 77].

Жыццё маршалковіча ашмянскага пасля смерці бацькі ў значнай ступені было звязана з пошукам грошай, а потым з удзелам у судовых працэсах, ініцыяваных ашуканымі крэдыторамі. 6 сакавіка 1652 г. у дачыненні Міхала Казіміра асэсарскі суд Рэчы Паспалітай вынес чарговы дэкрэт з прысудам на баніцыю за супраціўленне рашэнню Галоўнага Трыбунала ВКЛ аб спагнанні грашовай кампенсацыі [39, арк. 96]. Справа аб вяртанні пазыкі, атрыманай Свалынскім ад яўрэя Лазара Файталовіча яшчэ ў 1652 г., цягнулася да 1676 г. і, магчыма, не скончылася нават у гэтым годзе. 11 сакавіка 1676 г. Свалынскаму давялося звярнуцца да караля па атрыманне глейта на часовае прыпыненне судовага пераследу [40, арк. 96–98].

22 ліпеня 1673 г. харужы ашмянскі Раман Данілевіч сустрэўся ў судзе з Міхалам Казімірам (як асноўным адказчыкам), а таксама з ваяводзінай віленскай Кацярынай князёўнай Радзівілаўнай Ежыеўнай Глябовічавай і Казімірам Шумлянскім (застаўным трымальнікам маёнтка Вялікія Вузлы Ашмянскага павета) [41, арк. 219]. Некалі Ян Свалынскі пазычыў у яўрэя Міхаловіча грошы, забяспечыўшы пазыку на маёнтку Вялікія Вузлы, але так яе і не вярнуў. Яго сын таксама не хацеў аддаваць доўг.

Страціўшы надзею вырашыць гэтае пытанне, Міхаловіч пераўступіў правы на пазыку Раману Данілевічу. У выніку шматлікіх працэсаў да ліпеня 1673 г. агульная сума, якую неабходна было вярнуць, складала ўжо 120 255 злотых. Большую частку яе складалі штрафы, накладзеныя на Міхала Казіміра за нез'яўленне на судовыя пасяджэнні і непавагу да суда. На судовым працэсе, які праходзіў 27 сакавіка 1668 г. у задворным асэсарскім судзе Рэчы Паспалітай, высветлілася, што маршалковіч ашмянскі паспеў прадаць маёнтак віленскай ваяводзіне, а атрыманыя грошы выкарыстаў на свае патрэбы. Суды працягваліся з пераменным поспехам. 17 ліпеня 1677 г., пасля вынясення судом чарговага дэкрэта аб пакаранні Міхала Казіміра, ён паспеў ізноў атрымаць рэлаксацыю на гэтае пакаранне [42, арк. 55–56]. Гэта – апошняя вядомая згадка пра Міхала Казіміра Свалынскага. Як ужо адзначалася, ён не меў дзяцей. Род Свалынскіх быў працягнуты толькі па лініі малодшага брата маршалка ашмянскага – Гальяша, нашчадкі якога гралі важную ролю ў Полацкім ваяводстве ў XVIII ст.

Захавалася некалькі згадак пра дачку маршалка ашмянскага Алену. Так, яна заключыла шлюб з Янам Райскім, які памёр да пачатку 1673 г. Браты яе мужа – стольнік старадубскі Аляксандр і чашнік полацкі Генрык з Райска Райскія – у сярэдзіне 1673 г. пачалі патрабаваць ад удавы перадачы ў іх валоданне некаторых маёнткаў яе мужа. Алене давялося пагадзіцца з патрабаваннямі шваграў і саступіць ім частку зямель, пакінутых ёй мужам Янам у пажыццёвае трыманне. У пачатку сакавіка 1674 г. яна перадала братам мужа фальварак Верачата, вылучаны з маёнтка Стары Мядзел Ашмянскага павета [43, арк. 300–300 адв.]. Канчаткова бакі прыйшлі да прымірэння толькі ў канцы гэтага года. 6 кастрычніка 1674 г. быў актыкаваны вячысты ліст ад Алены Свалынскай Янавай Райскай братам памерлага мужа аб канчатковым улагоджанні розных прэтэнзій [44, арк. 345].

Яшчэ раз Алена Свалынская згадваецца ў матэрыялах працэсу, які адбыўся ў 1679 г. у Ашмянскім гродскім судзе і быў выкліканы тым, што маршалкоўна ашмянская не разлічылася за пазыку з падчашым сандамірскім Грабкоўскім [37, арк. 12 адв.]. Дата смерці маршалкоўны застаецца невядомай.

У некаторых выпадках сынам маршалка ашмянскага лічыцца таксама суддзя гродскі менскі Канстанцін Свалынскі, але гэта, верагодна, памылкова, бо ў дакументах, складзеных пры яго жыцці, ён ніколі не называўся маршалковічам ашмянскім. Канстанцін Свалынскі нарадзіўся ў сям'і пляменніка маршалка ашмянскага – Даніэля Гальяшавіча. Пра гэта вядома з матэрыялаў судовай справы, якая разглядалася ў Менскім земскім судзе 8 кастрычніка 1767 г. [45, арк. 23–26 адв.]. У гэты дзень падчашы рэчыцкі Ежы Адам Прысецкі пазваў у суд сваякоў былога суд-

дзі гродскага менскага – яго пляменніка падстолія полацкага Канстанціна Свалынскага і іншых, абвінаваціўшы іх у захопе падданых [45, арк. 23–23 адв.].

У XVIII ст. нашчадкі Гальяша Іванавіча ўваходзілі ў склад эліты Полацкага ваяводства і аказвалі вялікі ўплыў на падзеі, якія адбываліся ў гэтай частцы ВКЛ. У шлюбе Юзафа Гальяшавіча з Медунецкай нарадзіліся сыны Адам Юзаф, Мацей і Вінцэнт [1, арк. 1–2]. Скарбнік інфлянцкі Адам Юзаф Свалынскі пакінуў сына Юзафа Канстанціна, які ў 1739 г. быў абраны полацкай шляхтай дэпутатам Галоўнага Трыбунала ВКЛ, а з цягам часу атрымаў прывілей на ганаровы тытул падстолія полацкага [46, s. 186].

Такім чынам, Свалынскія (Свалонскія) упершыню трапляюць у гістарычныя крыніцы падчас Інфлянцкай вайны. У пачатку 1560-х гг. некалькі прадстаўнікоў роду служылі ў войску ВКЛ і часова страцілі маёнткі ў Полацкім ваяводстве, якія былі заняты маскоўскімі войскамі. У якасці кампенсацыі яны атрымалі ад Жыгімонта II Аўгуста ў карыстанне землі ў дзяржаўнай Свіслацкай воласці. Узвышэнне роду адбылося ў першай палове XVII ст., калі дзейнічаў маршалак ашмянскі і каралеўскі сакратар Ян Іванавіч Свалынскі, які вылучыўся не толькі на цывільнай, але і на ваеннай службе. Апрача таго, ён істотна пашырыў родавыя валоданні. У адрозненне ад папярэдніх пакаленняў роду, якія пераважна адносіліся да полацкай шляхты, Ян Свалынскі сканцэнтраваў свае маёнткі ў Ашмянскім і часткова Менскім паветах. Галіна Яна Свалынскага перарвалася на яго дзецях, таму знаходжанне роду ў шэрагах лакальнай і нават дзяржаўнай эліты атрымалася непрацяглым.

## Крыніцы і літаратура

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 2884. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Свалынскіх. – 10 арк.
2. Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 года. Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кніга 523. Кніга публічных спраў 1 / падрыхт. А. І. Груша, М. Ф. Спірыдонаў, М. А. Вайтовіч; рэдкал.: Г. Я. Галенчанка (адказны рэдактар) [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2003. – 444 с.
3. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 54. – Прывілеі, наданні Жыгімонта Аўгуста. 1570–1572 гг. – 76 арк.
4. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 50. – Наданні, пацвярджэнні арэнды мыт Жыгімонта Аўгуста. Кніга падканцлера Астафія Валовіча. 1566–1572 гг. – 368 арк.
5. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 48. – Наданні, пацвярджэнні арэнды мыт Жыгімонта Аўгуста. 1565–1567 гг. – 414 арк.
6. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 173. – Кніга канцылярыі падканцлера Міхала Чартарыйскага. 1741–1745 гг. – 359 арк.

7. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага: Кніга 44: Кніга запісаў 44 (1559–1566) / падрыхт. А. І. Груша. – Мінск : Арты-Фэкс, 2001. – 229 с.
8. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 247. – Кніга віленскага замкавага суда ваяводы Мікалая Радзівіла. 1554–1558 гг. – 998 арк.
9. НГАБ. – Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 2. – Актавая кніга Менскага гродскага суда. Студзень 1616 г. – кастрычнік 1620 г. – 1727 арк.
10. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской / под ред. М. Веревкина. – Вып. 22. – Витебск : Типолитография Г. А. Малкина, 1891. – X, 501, XXXVIII с.
11. НГАБ. – Ф. 1778. Воп. 1. Спр. 1. – Актавая кніга Полацкага земскага суда. 12.01.1623–21.06.1623. – 324 арк.
12. НГАБ. – Ф. 1769. Воп. 1. Спр. 13. – Актавая кніга Менскага земскага суда. 08.01.1782–21.12.1782. – 683 арк.
13. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 293. – Сублевацыі, баніцыі, ахоўныя граматы, выдадзеныя падчас панавання Жыгімонта III пры канцлеры Льву Сапегу. 1609–1616 гг. – 388 арк.
14. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 298. – Судовыя рашэнні Жыгімонта III і паноў-рады падчас падканцлерства Яраша Валовіча. 1618–1619 гг. – 90 арк.
15. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 93. – Судовыя справы і сазнанні падчас канцлерства Льва Сапегі. 1600–1607, 1616–1622 гг. – 599 арк.
16. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 100. – Прывілеі, даніны, фундушы, пацвярджэнні, арэнды, кантракты і іншыя справы падчас падканцлерства Паўла Сапегі. 1623–1626 гг. – 512 арк.
17. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 99. – Прывілеі на розныя пасады, староствы, арэнды і наданні ў ВКЛ. Прывілеі на пасады і маёнткі ў Смаленскім і Северскім княствах. 1623–1631 гг. – 621 арк.
18. Żychliński, T. Złota księga szlachty polskiej / T. Żychliński. – R. 5. – Poznań : Jarosław Leitgeber, 1883. – 490 s.
19. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 301. – Судовыя справы падчас канцлерства Льва Сапегі. 1622–1623 гг. – 172 арк.
20. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. – T. 1: Województwo wileńskie. XIV–XVIII wiek / pod red. A. Rachuby. – Warszawa : Wydawnictwo DiG, 2009. – 764 s.
21. Niesiecki, K. Herbarz polski / K. Niesiecki; wyd. J. N. Bobrowicz. – T. 9. – Lipsk : Breitkopf i Haertel, 1842. – 468 s.
22. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 112. – Кнігі прывілеяў, наданняў, пацвярджэнняў падчас падканцлерства Стэфана Паца. 1635–1639 гг. – 186 арк.
23. Urzędnicy dawnej Rzeczypospolitej XII–XVIII wieku. Spisy: w 11 t. / pod red. A. Gąsiorowskiego. – Wrocław [etc.] : Ossolineum, 1985–1994. – T. 11: Urzędnicy centralni i dostojnicy Wielkiego księstwa Litewskiego XIV–XVIII wieku. Spisy / oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba. – Kórnik : Biblioteka Kórnicka, 1994. – 255 s.
24. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 319. – Дэкрэты асэсарскага суда падчас панавання караля Уладзіслава IV. Кніга канцлера Альбрыхта Станіслава Радзівіла. 1639–1641 гг. – 239 арк.

25. Wolff, J. Pacowie. Materyjaly historyczne-genealogiczne / J. Wolff. – Petersburg : Drukarnia F. Suszczyńskiego, 1885. – VII, 374 s.
26. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 113. – Кніга прывілеяў і пацвярджэнняў Уладзіслава IV падчас канцлерства Альбрыхта Станіслава Радзівіла. 1637–1641 гг. – 651 арк.
27. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 115. – Прывілеі, даніны, пацвярджэнні Уладзіслава IV падчас канцлерства Альбрыхта Станіслава Радзівіла. 1637–1641 гг. – 305 арк.
28. НГАБ. – Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 34. – Кніга дэкрэтаў Менскага гродскага суда. 04.04.1641–07.11.1665. – Т. 1. – 996 арк.
29. НГАБ. – Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 3. – Актавая кніга Менскага гродскага суда. 01.1640–06.12.1649. – 1727 арк.
30. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 323. – Баніцыі, сублевацыі, глейты падчас падканцлерства Марцыяна Трызны. 1641–1643 гг. – 230 арк.
31. НГАБ. – Ф. 1733. Воп. 1. Спр. 91. – Паточныя пратаколы Пінскага гродскага суда. 01.08.1645–12.05.1649. – 96 арк.
32. Rachuba, A. Pac Mikolaj Stefan / A. Rachuba // Polski słownik biograficzny. – T. 24. – Wrocław [et al.] : Zakład Narodowy im. Ossolińskich; Wydawnictwo PAN, 1980. – S. 738–741.
33. Żychliński, T. Złota księga szlachty polskiej / T. Żychliński. – R. 8. – Poznań : Jarosław Leitgeber, 1886. – 496 s.
34. Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo wileńskie 1690 r. / oprac. A. Rachuba. – Warszawa : PWN, 1989. – 374 s.
35. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 122. – Прывілеі, наданні і пацвярджэнні. Кніга канцлера ВКЛ Альбрыхта Станіслава Радзівіла. 1646–1648 гг. – 182 арк.
36. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 123. – Прывілеі, наданні і пацвярджэнні. Кніга канцлера ВКЛ Альбрыхта Станіслава Радзівіла. 1649–1650 гг. – 668 арк.
37. НГАБ. – Ф. 1732. Воп. 1. Спр. 35. – Рэестр дакументаў да актавых кніг Ашмянскага гродскага суда. 1652–1794 гг. – 285 арк.
38. НГАБ. – Ф. 1732. Воп. 1. Спр. 2. – Актавая кніга Ашмянскага гродскага суда. 23.08.1661–07.05.1741. – 838 арк.
39. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 336. – Дэкрэты асэсарскага і рэляцыйнага судоў. 1648–1655 гг. – 779 арк.
40. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 138. – Кнігі прывілеяў, пацвярджэнняў, наданняў і лістоў Яна III падчас канцлерства Крыштафа Паца. 1676–1690 гг. – 138 арк.
41. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 360. – Дэкрэты асэсарскага і рэляцыйнага судоў падчас канцлерства Крыштафа Паца. 1669–1673 гг. – 897 арк.
42. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 368. – Баніцыі, сублевацыі падчас канцлерства Крыштафа Паца. 1676–1678 гг. – 872 арк.
43. НГАБ. – Ф. 1732. Воп. 1. Спр. 46. – Паточная кніга Ашмянскага гродскага суда. 10.08.1628–16.02.1729. – 765 арк.

44. НГАБ. – Ф. 1776. Воп. 1. Спр. 1. – Актавая кніга Ашмянскага земскага суда. 1667, 1673–1679 гг. – 1460 арк.
45. НГАБ. – Ф. 1769. Воп. 1. Спр. 29. – Кніга дэкрэтаў Менскага земскага суда. 01.07.1767–16.02.1775. – 637 арк.
46. Deputaci Trybunału Glównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1697–1794): Spis / pod red. A. Rachuby. – Warszawa : Wydawnictwo DiG, 2004. – 448 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 02.02.2021

# Рэцэнзіі і водгукі

***Адынец, А. Э.*** *Успаміны пра мінулае / А. Э. Адынец. – Мінск : Лімарыус, 2020. – 360 с. – (Бібліятэка «Наша XIX стагоддзе»).*




Успаміны Антонія Эдварда Адынца, выдадзеныя выдавецтвам «Лімарыус», – гэта працяг шматгадовай навуковай працы Аляксандра Фядуты па адкрыцці для сучаснікаў спадчыны XIX стагоддзя, вяртанню нам, грамадзянам Беларусі, імёнаў нашых суайчыннікаў, тых, каго мы ўключаем у падручнікі па гісторыі і ў свой штодзённы карагод. Значнасць названай працы я ўжо адзначала ў водгуку на дакументальную аповесць А. Фядуты пра Францішка Малеўскага [6]. Спадчына філарэтаў і філаматаў і ў цэлым выхаванцаў Віленскага ўніверсітэта – невычэрпная крыніца для разумення грамадска-палітычнага жыцця першай трэці XIX ст., побыту і звычак літоўскай (у гістарычным значэнні слова) шляхты. Першым сярод роўных паводле аўтарытэту і ўплыву на віленскую моладзь пачатку 1820-х гг. быў Тамаш Зан, што выразна адзначана ва ўспамінах Адынца, таму гутарка пра яго яшчэ пойдзе ў тэксце гэтага водгуку. Без біяграфіі Зана, асэнсавання трансфармацыі яго поглядаў і ўплыву на сучаснікаў, любыя даследаванні філаматаў і філарэтаў будуць няпоўнымі. Праца па складанні яго жыццяпісу ўжо распачата А. Фядутам, таму застаецца толькі чакаць яе паспяховага завяршэння. А зараз да «Успамінаў пра мінулае».

***Хто такі Антоні Эдвард Адынец?***

Шчаслівчык. Адынец меў найлепшае ў свеце дзяцінства, юнацтва і сяброўства, якому ў яго сталыя гады зайздросціла моладзь Вільні і Варшавы. Ён двойчы знаходзіўся пад следствам, быў арыштаваны (у 1823 і 1841 гг.), але заўсёды выходзіў сухім з вады. Усё жыццё ён займаўся

ўлюбёнай справай: пісаў вершы, рабіў пераклады, рэдагаваў перыядычныя выданні. Антоні Эдвард удосталь павандраваў па Еўропе, але ў адрозненне ад многіх польскіх эмігрантаў 1830-х гг. вярнуўся дадому, дзе на схіле жыцця меў павагу і нечаканы поспех у літаратурных салонах Варшавы. Убачым яго біяграфію такой, якой яна вымалёўваецца на старонках успамінаў.

Антоні Эдвард нарадзіўся ў 1804 г. у вёсцы Гейстуны Ашмянскага павета Віленскай губерні і быў трэцім дзіцём у сям'і Тадэвуша Адынца і Тэрэзы Гнатоўскай. Аднак першыя дзве дзяўчынкі памерлі да нараджэння сына, таму, зразумела, бацькі любілі і песцілі яго звыш меры (с. 37). Хлопец рос летуценнікам, мог *«гадзінамі ляжаць на траве нерухома, углядаючыся ў неба»* (с. 38). Бацька, мяккі па натуры, не мог абыходзіцца з ім сурова, таму для навучання вырашыў аддаць да гувернёра ў дом сяброў. Увесну 1811 г. Эдвард выехаў з бацькоўскага дому на вучобу да бліжэйшых суседзяў Скшыдлеўскіх. На новым месцы хлопец знайшоў сябра (Тадэвуша Скшыдлеўскага), настаўніка (Адама Барановіча), а галоўнае дабрыню і пяшчоту з боку гаспадароў Крыштафа Скшыдлеўскага і яго жонкі Ганараты Янушкевіч. Апошняя была хроснай маці яго роднай матулі і любіла яго як бабуля (с. 39–40). Як успамінаў Адынец: *«хоць не ведаў я, што такое паэзія, ранняе маё дзяцінства… само было паэзіяй»* (с. 37).

З 1813 г. Антоні Эдвард стаў вучнем адной з лепшых у той час Барунскай базыльянскай школы, дзе правучыўся 6 гадоў, знайшоў сапраўдных сяброў і займеў першую славу як паэт і павагу як перакладчык.

У 1820 г. Эдвард уліўся ў шэраг студэнтаў Віленскага ўніверсітэта. Менавіта там ён пазнаёміўся з зоркамі першай велічыні сярод тагачаснай моладзі – Адамам Міцкевічам, Тамашам Занам, Янам Чачотам. Паводле волі бацькі Адынец мусіў наведваць юрыдычны факультэт, але як вольны слухач меў доступ да лекцый па польскай і лацінскай літаратуры на філалагічным. Дэканамі абодвух факультэтаў у той час былі асобы, якія самі пісалі вершы: юрыдычнага – ксёндз Ян Канты Ходані, перакладчык «Генрыяды» Вальтэра; філалагічнага – ксёндз Філіп Нэрэуш Галянскі, аўтар працы «Пра красамоўства і паэзію» (с. 79). Уся віленская атмасфера, прасякнутая паэтычным эфірам, спрыяла таму, што Эдвард упэўніўся ў сваім жаданні пісаць вершы, упарта ўдасканальваў свой стыль і веды.

Ва ўніверсітэце Адынец стаў сябрам Таварыства філарэтаў, якому прысвяціў «Песню філарэтаў». Убачыўшы яго паэтычныя здольнасці, Чачот узяў яго пад сваю апеку, за што сябры празвалі Чачота Ментарам, а Адынца — Тэлемахам. Разам з сябрамі Эдвард быў зняволены ў лістападзе 1823 г. па справе таварыства. Аднак яго дзейнасць засталася без наступстваў, напэўна, з прычыны таго, што двое з тых, ад каго залежаў

лёс арыштаваных удзельнікаў таемных таварыстваў, – прафесар Аўгуст Бекю і член следчай камісіі Вінцэнт Лаўрыновіч – мелі да яго ласку [14, с. 12]. Вызвалены Адынец вырашыў выехаць на пэўны час у Варшаву, дзе правёў 1826–1829 гг.

У сталіцу былой Рэчы Паспалітай Эдвард прыбыў пасля выхаду яго першага зборніка «Poezje». Зборнік быў непрыхаваным перайманнем Міцкевіча, а Адынец – адным з першых польскамоўных рамантыкаў. Варшава ж у той час была апорай прыхільнікаў адыходзячага літаратурнага кірунку – класіцызму [14, с. 13]. Міцкевіча сталічная публіка яшчэ не прызнала, а Адынца не заўважыла. Таму малады паэт вырашыў адправіцца ў замежнае падарожжа. Эдварду зноў пашанцавала: воляй лёсу яго спадарожнікам стаў Адам Міцкевіч. У 1829 г. два паэты выправіліся вандраваць па Германіі, Швейцарыі і Італіі.

У гэтым месцы адносна біяграфіі Адынца паўстае важнае пытанне: ці ўдзельнічаў ён у паўстанні 1830–1831 гг.? Ва ўступным артыкуле А. Фядуты да «Успамінаў…» двойчы сказана, што сумеснае падарожжа двух паэтаў доўжылася два з паловай гады, да 1831 г. [14, с. 12, 14]. Гэта значыць, што Адынец не ўдзельнічаў у паўстанні, бо фізічна не мог знаходзіцца на радзіме і за мяжой адначасова.

Разам з тым, у артыкулах Кастуся Цвіркі [15] і Алены Дзенісенка [5, с. 120], якія даследавалі літаратурную спадчыну Адынца, гутарка ідзе пра тое, што паэты развіталіся ў 1830 г. Апошняя дата дае Адынцу шанец для ўдзелу ў паўстанні. Сярод удзельнікаў паўстання Дзісенскага павета яго называе Вольга Гарбачова і сцвярджае, што справа была прыпынена паводле рашэння Мінскай губернскай следчай камісіі ад 12 верасня 1834 г. [3, с. 25 ]. На жаль, А. Фядута не звяртае ўвагі на гэтую супярэчнасць і згадвае пра 1831 г. як пра нешта, што не падлягае сумневу.

Я схіляюся да думкі, што Адынец у паўстанні не ўдзельнічаў, нават у тым выпадку, калі ён развітаўся з Міцкевічам у 1830 г. У тым жа годзе Эдвард сустракаўся ў Парыжы з Віктарам Гюго, пазней наведаў Лондан. У 1832 г. ён дакладна жыў у Дрэздэне (с. 288), дзе перакладаў творы Вальтэра Скота і Джорджа Байрана. Да яго прыехала каханая дзяўчына – Зоф'я Мацкевіч, з якой ён узяў шлюб і ў гонар якой Міцкевіч назваў Зосяй адну з галоўных гераінь паэмы «Пан Тадэвуш» [15, с. 9].

Адсюль узнікаюць пытанні: 1) як у такім графіку можна паспець стаць удзельнікам паўстання на радзіме? 2) чаму было не ўзяць шлюб у родных пенатах, калі з мемуараў вынікае, што закахаўся ён значна раней за ад'езд за мяжу ў 1829 г.? 3) нарэшце, чаму сам Адынец утойвае такі важны факт біяграфіі?

З іншага боку, калі Адынец не быў удзельнікам паўстання, чаму яго імя згадваецца ў матэрыялах следчай камісіі і нават адзначаецца дакладны час, калі справа была прыпынена? На гэтае пытанне могуць быць

розныя адказы. На мой погляд, галоўным быў той хаос, які панаваў у працы камісій. Напрыклад, у матэрыялах Мінскага губернскага праўлення за верасень 1836 г. мною была выяўлена ведамасць пра цёзак па прозвішчы ўдзельнікаў паўстання (89 шляхецкіх прозвішчаў). У ведамасці пазначаны сумы, якія неабходна было выплаціць вышэйназваным асобам за незаконна секвестраваныя маёнткі [9, с. 39–40]. У Адынца нічога секвестравана не было. Нават факт прыпынення справы, нягледзячы на тое, што Антоні Эдвард быў арыштаваны ў 1823 г., хутчэй сведчыць пра адсутнасць яго ўдзелу ў паўстанні. Гэта ўскосна пацвярджаюць яшчэ два эпізоды яго біяграфіі. Па-першае, у 1841–1859 гг. Антоні Эдвард рэдагаваў «Kurier Wileński» («Віленскі веснік») і нават заснаваў уласную друкарню. Цяжка ўявіць, што ў гады царавання Мікалая I да гэтага дапусцілі ўдзельніка паўстання. Па-другое, калі ў 1840–1841 гг. у Вільні раскручваўся махавік чарговай палітычнай справы, пакаранне зноў не закранула Адынца (падрабязней пра падзеі 1840-х гг. гл. ніжэй).

У 1840 г. віленскі ваенны губернатар Фёдар Міркавіч узяўся раскручваць справу пра антыўрадавую змову. Яго актыўна падтрымалі мясцовыя чыноўнікі, бо перад тымі, хто раскрыў палітычную змову, адкрываліся значныя службовыя перспектывы. У такіх умовах лёгка было перайсці межы дазволенага. Сярод падазраваных апынуліся многія віленчукі, у тым ліку Антоні Эдвард Адынец. Ён быў арыштаваны ў лістападзе 1841 г., пра што сведчаць дакументы, якія ўнесены ў дадатак выдання (с. 332–334).

Паводле матэрыялаў канцылярыі Віленскага ваеннага губернатара магчыма выявіць дэталі следчай справы. У ліпені 1840 г. паблізу Стаўрапаля быў затрыманы беглы юнкер Эрыванскага карабінерскага палка Часноўскі. Высветлілася, што да ўцёкаў яго падштурхнуў удзельнік паўстання 1830–1831 гг. Ліберацкі. Апошні сцвярджаў, што прыбыў на Каўказ, каб схіліць да ўцёкаў палякаў, якія служылі там. Ліберацкі нібыта паказваў Часноўскаму зварот французскага консула з заклікам да барацьбы супраць расійскай улады. Гэтыя трывожныя весткі сталі прычынай ператрусаў у сяброў Часноўскага. У аднаго з іх – выпускніка Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі 1839 г. Мацвея Лавіцкага – знайшлі лісты і вершы патрыятычнага характару, якія сведчылі пра існаванне сярод студэнтаў таемнага таварыства. Пачаліся арышты. Ваенны міністр Расійскай імперыі Аляксандр Чарнышоў палічыў неабходным правесці ператрусы ва ўсіх выпускнікоў медыцынскай акадэміі 1835–1839 гадоў выпуску, што ў агульнай колькасці складала 1183 чалавекі.

У жніўні 1841 г. імператар прызначыў новага старшыню следчай камісіі генерал-лейтэнанта Аляксандра Кавеліна. Першапачаткова апошні пагадзіўся з версіяй існавання шырокай змовы, але неўзабаве змяніў меркаванне. Ён выявіў сярод арыштаваных доктара медыцыны Юзафа

Мяноўскага, пра сувязь якога са змоўшчыкамі меўся данос *«спадара N»*. Прафесар адмаўляў абвінавачванні і сцвярджаў, што з N. не быў нават знаёмы. Тады Кавелін правёў вочную стаўку, дзе даносчык не толькі не пазнаў доктара, але і накінуўся з абвінавачваннямі на іншага чалавека. Мяноўскі быў вызвалены, даносчык кінуты ў турму, аператрус зладзілі ў сяброў Лавіцкага. У выніку прысуд па справе прагучаў толькі для сямі чалавек. У далёкую ссылку адправіліся Мацвей Лавіцкі, Аляксандр Вейштарт і Валяр'ян Вялічка, Іосіф Адамоўскі стаў салдатам Сібірскага асобнага корпуса, Казімір Рапчынскі быў накіраваны на службу ў Арэнбургскі корпус, Віктар Маліноўскі і Зянон Пілецкі вярнуліся на ранейшае месца працы ў ваенных шпіталях [7, с. 129–131]. Не дзіўна, што пасля спроб прыцягнуць да следства больш за тысячу чалавек, дзеянні А. Кавеліна выклікалі ў краі ўсеагульную любоў і павагу. Паводле сцвярджэння Юзафа Пшацлаўскага, *«ва ўсёй Літве не было дома, дзе партрэт Кавеліна не красаваўся б на першым плане»* [11, с. 233]. У 1858 г. Адынец удзельнічаў у выданні «Віленскага альбома» ў гонар Аляксандра II. Публічная дэманстрацыя лаяльнасці да расійскай улады выклікала абурэнне сярод прыхільнікаў адраджэння польскай дзяржавы. Здавалася, панегірычны верш у гонар расійскага імператара назаўсёды выкрасліў імя Адынца са спісу змагароў за нацыянальнае вызваленне. Аднак лёс наканаваў яму іншае. У 1867 г. Адынец апублікаваў у варшаўскім часопісе «Kronika Rodzinna» («Сямейная хроніка») лісты да сяброў, якія распавядалі пра вандроўку разам з А. Міцкевічам пад агульнай назвай «Лісты з падарожжа». У той час Міцкевіча не было ў жывых, і ўжо не толькі ў Вільні, а і ў Варшаве абагаўлялі яго імя.

Адынец, які ў 1866 г. пераехаў у Варшаву, меў неверагодны поспех. Ён стаў жаданым госцем у варшаўскіх салонах, яму ўсё часцей даводзілася распавядаць не толькі пра Міцкевіча, але і пра сябе [14, с. 23]. Вынікам гэтых размоў сталі «Успаміны пра мінулае», выдадзеныя ў Варшаве ў 1884 г. Як паведамляе ў прадмове А. Фядута, фармальным адрасатам аповеду стала дачка гаспадыні аднаго з найбуйнейшых літаратурных салонаў Магдалены (Ніны) Лушчэўскай – Ядвіга, вядомая таксама як паэтка-імправізатарка пад псеўданімам Дэатыма. А. Фядута выказвае здагадку, што менавіта яна сваімі роспытамі справакавала Адынца запісаць успаміны пра свае дзяцінства і юнацтва [14, с. 24].

***Чаму публікацыя ўспамінаў Адынца – істотны ўнёсак у фарміраванне нашых уяўленняў пра XIX стагоддзе?***

Па-першае, ён асабіста ведаў столькі значных для беларускай гісторыі асоб, што толькі гэтага факта і тых, часам кароткіх, але вельмі істотных заўваг адносна іх жыцця дастаткова, каб захаваць цікавасць да яго мемуараў на доўгія гады. На старонках кнігі мы сустракаем звесткі пра Адама Міцкевіча, Тамаша Зана, Яна Чачота, Аляксандра

і Леанарда Ходзькаў, Ваўжынца і Марыю Путкамераў, Юльюша Славацкага, Юльяна Урсын Нямцэвіча, Адольфа і Яўстафія Янушкевічаў, Адама Сузіна, прафесараў Віленскага ўніверсітэта ў 1820-я гг. і многіх іншых. Напрыклад, Адынец неаднойчы падкрэсліваў асаблівую ролю ў Таварыстве філаматаў Т. Зана і Я. Чачота. Нават першая сустрэча з імі ў 1820 г. зрабіла на яго моцнае ўражанне: *«На чале шматлікай кампаніі ішоў юнак, якому было дваццаць з лішнім гадоў, з валасамі колеру крумкачынага крыла, якія віліся кольцамі, з чорнымі, сапраўды прамяністымі вачыма, усмешка і твар якога свяціліся такой далікатнай дабрынёй, што адразу хапала за сэрца. Побач з ім ішоў хлопец ніжэйшы ростам, хоць крыху старэйшы па ўзросце, на яго фізіяноміі таксама адлюстроўвалася дабрыня, толькі не такая вясёлая і жывая, не так прамяністая вонкава, а нібы ўсмешка сентыментальнай пяшчоты. Абодва яны, было відаць, верхаводзілі над усімі. Гэта былі Тамаш Зан і Ян Чачот»* (с. 70–71).

Менавіта Зан, які меў звычку пісаць невялікія вершы сваім вучням, дзе ўспаміналіся сяброўскія сувязі, навёў А. Міцкевіча на думку, што сапраўдныя скарбы паэзіі магчыма знайсці *«ў звычайных дэталях рэальнага жыцця»* (с. 92). Гэтая ідэя моцна ўразіла паэта і неаднойчы ўвасобілася ў яго творах.

У сваіх успамінах Адынец даў адказ на хвалюючае мяне пытанне: якім чынам прамяністаму Зану ўдалося аказаць уплыў не толькі на сяброў-студэнтаў, але і на дзяўчат, на віленскае грамадства ў цэлым. Справа ў тым, што з першага дня прыбыцця Зана ў Вільню (1815 г.) ён быў вымушаны зарабляць грошы на сваё ўтрыманне. Паводле пратэкцыі ўніверсітэцкага бібліятэкара Казіміра Контрыма, Зан атрымаў пасаду настаўніка матэматыкі і фізікі пры адным з першых пансіёнаў для паненак. Хутка яго настаўніцкая слава атрымала такі розгалас, што літаральна ўсе пансіёны Вільні лічылі за гонар, каб Зан стаў адным з іх настаўнікаў. Зразумела, гэта было немагчыма, таму ён рэкамендаваў замест сябе здольных таварышаў, і *«такім чынам з цягам часу настаўнікамі ва ўсіх жаночых установах сталі выключна самыя давераныя яго сябры»* (с. 127). Пазней шмат яго выпускніц перайшлі *«з пансіённых лавак на танцавальныя паркеты і крэслы віленскіх салонаў і дапамагалі мацяркам рабіць гонар дому»* (с. 127).

Па-другое, асоба Антонія Эдварда Адынца ўвасабляе прыклад паэта эпохі рамантызму. Яго ўспаміны даносяць да нас высокія ўяўленні таго часу пра ўласнае ўдасканаленне, юнацкае братэрства, атмасферу напружанага абмену ідэямі, думкамі, пачуццямі, у якой выспела цэлая плеяда таленавітых людзей. Паказальная ў гэтым плане характарыстыка паэта Стэфана Гарчынскага: *«канчатковай, галоўнай мэтай яго намаганняў была маральная дасканаласць, якая разлічана, паводле яго, на развіццё*

*і ўдасканальванне ўсіх сваіх прыроджаных здольнасцей, каб па меры іх найбольш старанна і найбольш карысна служыць грамадству і сваёй краіне, гэта значыць радзіме»* (с. 260). Альбо, напрыклад, замалёўка пра тое, якім чынам віленскія студэнты ладзілі сяброўскія зборы, дзе галоўнымі пачастункамі былі свабодныя размовы, вершы паэтаў, музыка ды студэнцкія гульні ў жмуркі. Зборы праходзілі так весела, што Антоні Эдвард удакладняе для тых, хто лічыў прычынай той весялосці спіртовыя напоі: *«Віно, пунш, піва, не кажучы ўжо пра моцныя напоі, былі яўна выключаны з праграмы. Малако, гарбата са здобай, крыху лепшай простых булак, лустачкі хлеба з сырам і садавіна складалі ўвесь запас наедку і ласункаў. Адзін-адзіны тост у гонар героя ўрачыстасці выконваўся калі не з малаком, то з малым кілішкам ковенскага мёду; і толькі для аднаго Адама, калі ён прысутнічаў, як выключэнне ставілася бутэлька портару. Ён таксама адзін меў прывілею курыць люльку, ад якой на зборах, па пастанаўленні, іншыя ўстрымліваліся. Цыгар і папярос тады яшчэ не ведалі, прынамсі ў Вільні»* (с. 122).

Адзначым, Адынец – рамантык да мозгу касцей. Для мяне ўсё ў яго неяк занадта, з пераборам: і ўзнёслы настрой, і захапленне нейкай асобай, і выкарыстанне найвышэйшай ступені параўнання прыметнікаў. Вось як ён піша пра першую сустрэчу з Саламеяй Бэкю і Зоф'яй Балінскай: *«я не ведаў, што стаю побач з дзвюма найпаэтычнейшымі душамі, вышэйшых за якія ў гэтых адносінах у тагачасным віленскім грамадстве не было; перад дзвюма найсвятлейшымі і найжывейшымі розумамі ў сферы пяшчотных пачуццяў і найшляхетнейшых разуменняў, азораных абаяльнасцю прыроджанай дабрыні і эстэтычнымі формамі вышэйшага свету»* (с. 130). Як вы думаеце, ці лёгка перакладаць гэткі тэкст? Я ўпэўнена, што не. Не раз я бралася за польскі арыгінал успамінаў Адынца і кідала ў адчаі, скаланаючыся ад усіх «найпаэтычнейшых» і «найшляхетнейшых» зігзагаў тэксту.

Адзначу якасны літаратурны пераклад арыгінала ўспамінаў на беларускую мову ў сучасным выданні. Сапраўдная асалода гартаць старонкі такой кнігі. Вялікая ўдзячнасць перакладчыцы празаічнай часткі кнігі Яніне Кісялёвай, рэдактарам перакладу Марыі Мартысевіч і Пятру Рудкоўскаму за іх працу. Добры пераклад навуковага апарату зрабіла Марына Чарнякевіч. Дадам, што М. Мартысевіч стала таксама перакладчыцай большасці вершаваных фрагментаў успамінаў (а іх шмат, бо мы маем справу з паэтам). Адынец не лепшы з паэтаў свайго часу, узровень яго твораў розны: ад удалых да такіх, што нагадваюць мне шырокавядомае: «Я поэт, зовусь я Цветик. От меня вам всем приветик!». На мой погляд, Марыя Мартысевіч зрабіла немагчымае. Калі можна так сказаць, яна апаэтызавала творы Антонія Эдварда, узняла іх на стабільна годны ўзровень.

Трэцяя прычына, якая тлумачыць вартасць мемуараў Адынца, заключаецца ў апісанні жыццядзейнасці базыльянскай школы ў Барунах і Віленскага ўніверсітэта ў эпоху іх росквіту. На маю думку, іх досвед да гэтага часу не асэнсаваны і не выкарыстаны, хоць сучасная сістэма адукацыі відавочна знаходзіцца ў стагнацыі і мае патрэбу ў рэфармаванні. Возьмем, напрыклад, штодзённую неабходнасць настаўнікаў правяраць хатняе заданне ў навучэнцаў, на што марнуецца шмат сіл і часу. Як слушна адзначае Адынец, калі б настаўнік пытаўся ва ўсіх вучняў, ці вывучыў кожны з іх урок, *«дык яму ніколі не хапала бы часу на выкладанне»* (с. 52). У Барунах настаўнік выбіраў больш здольных, якія павінны былі выслухаць папярэдні ўрок у кожнага вучня і дакласці свае высновы настаўніку. Бачым высокі ўзровень даверу паміж вучнямі і настаўнікамі, да якога ў XXI стагоддзі мы яшчэ не дараслі.

Галоўнай асалодай у жыцці Эдварда і яго сяброў было чытанне. Так, «Энеіду», а потым «Іліяду» ў перакладзе Дмахоўскага яны чыталі ўсе разам і потым нават гулялі ў грэкаў і спартанцаў. Прычым падзел гэты быў не адвольны, а вынікаў са схільнасцяў іх характараў (с. 59–60).

Як пярліны, па кнізе рассыпаны звесткі пра побыт навучэнцаў базыльянскай школы, умовы жыцця гувернёраў. Зараз мы ведаем, што падчас сваіх літаратурных вечароў хлопцы звычайна ласаваліся яблыкамі, а калі яны канчаліся – сырой морквай і рэпай. Кожны прыходзіў са сваім ножыкам і, *«у думках глытаючы нябесныя мігдалы, скрабаў ім сабе моркву або лупіў рэпу»* (с. 58).

Агульнапрызнаным сёння з’яўляецца меркаванне, што ў гады праўлення Аляксандра I у адукацыйнай і культурнай сферах расійская ўлада падтрымлівала на землях былога ВКЛ польскі ўплыў. У пачатку XIX ст. – кіраваць значыла ўключаць у сістэму ўлады мясцовыя эліты, а не задзейнічаць масы. Аляксандр I быў перакананы, што лепшай глебай для такога ўключэння стануць агульныя прынцыпы асветы, якія распаўсюджваў у Віленскай навучальнай акрузе яго сябар Адам Чартарыйскі [12, с. 70]. Вынікам дзейнасці А. Чартарыйскага стала далейшая паланізацыя жыхароў беларускіх губерняў, прычым менавіта шляхты, а не сялян, да якіх адукацыя яшчэ не дабралася. Магчыма ацэньваць гэты гістарычны досвед адмоўна, а магчыма пераняць для шырокага распаўсюджвання беларускай мовы ў сучасным грамадстве.

Нарэшце, чацвёртае і апошняе ў гэтым водгуку, але ж першае паводле значнасці для яго аўтара. Успаміны Адынца – той пазл, якога мне не хапала, каб сабраць патрэбную карціну. Малюнак існаваў у тэорыі. Нарэшце, я сустрэлася з аўтарам, які перанёс яго ў рэальнасць.

З лістоў і мемуараў ліцвінаў XIX стагоддзя мне добра вядома тое адчуванне страчанага раю, якім прасякнуты іх працы. Што як не апісанне раю, радкі з «Пана Тадэвуша» Адама Міцкевіча пра блакітнае неба,

смарагдавыя краявіды, прыгожых паненак і мужных паноў? Толькі ружовымі фарбамі малюе карціну свайго дзяцінства ліцвін Тадэвуш Булгарын [1]. Міхал Ходзька расказвае ў лісце да брата, як невыносна жыць у Парыжы, дзе неба не тое, ды прыроды няма [8]. І на хвіліну не змог заснуць перад сустрэчай з родным краем Ігнат Дамейка [4]. Тысячы іншых эмігрантаў марылі пра вяртанне, менавіта ў іх лістах вобраз Радзімы пераўтварыўся ў Рай. Ці існаваў ён на самой справе? Ці з'яўляўся фантазіяй асоб сталага веку пры ўспамінах маладосці? Гэтыя пытанні мяне турбавалі.

Адынец расставіў кропкі над "і". Рай дакладна існаваў у 1810–1820-я гг. для заможнай і сярэднезаможнай шляхты на прасторах былога Вялікага Княства Літоўскага і вось яго відавочныя прыкметы:

***1) Любоў і свабода.***

Не першы раз сустракаю гэтую карціну. Дзіця аточана любоўю не толькі бацькоў, але і шматлікіх родных і рэзідэнтаў (так называлі тых, хто жыў у доме за кошт гаспадароў). Маленькага Эдварда песцілі не толькі бацькі, але і 1) шаснаццацігадовая сястра ад першага шлюбу яго бацькі; 2) асірацелая Малгося Кунцэвіч, якая жыла ў іх доме; 3) выхавальніца маці Эдварда і кіраўніца ўсяго дома панна Карнелія; 4) яе муж пан Заблоцкі; 5) яшчэ адзін рэзідэнт пан Эйдзятовіч (с. 37–38). І гэта не ўсё. Яшчэ былі шматлікія суседзі, сярэднезаможныя ўласнікі, прыбыткі якіх у тыя гады раслі з прычыны высокіх коштаў на збожжа, што часта збіраліся, гулялі ў карты, скакалі, спявалі, палуднавалі і вячэралі, *«словам забаўляліся – не пампезна, але ад душы і весела»* (с. 39). Дзеці былі амаль паўнавартаснымі ўдзельнікамі розных забаў, бо не было нейкіх асобных аддаленых пакояў, дзе яны існавалі б у цішыні і спакоі. Дом Адынцоў звычайна быў такі шумны, што ў ім нават не знайшлося ані спакою для навучання, ані ціхага месца для настаўніка. Пра тое ж узгадвае Альжбета Пакаш з Рудамінаў-Дусяцкіх (1804 – пасля 1860-х гг.). Прыватныя вечары ў доме яе бацькоў не часта здараліся, бо рэдка які дзень у маёнтку Дукшты не было гасцей [10, с. 330].

Пры гэтым у дзіцяці было права на асабістую свабоду. Калі Леанард Ходзька прывёз Эдварду Адынцу новую кнігу, той *«падрыхтаваўся чытаць гэты дарагі скарб, выбраўшы сабе ціхае і самотнае месца на полі пасярод жыта»* (с. 62). Вядома, такія дзеці павінны задыхацца ў Лондане, Дрэздэне ці Парыжы. У іх не заўсёды быў асобны пакой, але ім належалі навакольныя палі і бары, нябёсы і аблокі. Нехта спытае, а як жа навучанне ў закрытых школах базыльянскага і каталіцкіх ордэнаў? Як дэманструюць успаміны Адынца, яно не было закрытым і адрознівалася ад устаноў Расійскай імперыі (напрыклад, кадэцкіх карпусоў), як французскі рэгулярны парк ад пейзажнага англійскага.

***2) Безупынны фэст.***

Пад гэтым выразам я разумею тую вясёлую карусель, калі шляхціцы выпраўляліся адзін да аднаго на вяселлі і імяніны, рэлігійныя святы і паляванне, адзначалі дажынкі і ад'езд сына на службу, добрае і дрэннае надвор'е… У заможнай і сярэднезаможнай шляхты сапраўды быў нейкі безупынны фестываль, які не скончыўся, а толькі перапыніўся з пачаткам вайны 1812 г. Дазволю сабе доўгую цытату, каб вы зразумелі, як Антоні Эдвард Адынец правёў лета 1825-га года (с. 210):

*«Праз два тыдні пасля майго вяртання дамоў у вёску мяне таксама адведаў Корсак, якому і мая сям'я, і ўсе нашы шматлікія суседзі стараліся па магчымасці неяк адплаціць за гасціннасць, што я зведаў у яго доме. Напярэдадні святога Ігната (30 ліпеня) мы разам з ім паехалі ў Дзевятню на імяніны гаспадара (Ходзькі), якія ў гэтым годзе ўрачыста спраўляла ўжо яго маладая жонка. А паколькі праз пару дзён потым былі імяніны панны Анэлі (2 жніўня), якія таксама не менш урачыста адзначаў яе брат у Рускім Сяле, дык і там увесь тыдзень нашага знаходжання кожны дзень пастаянна быў нібы святочны. Урэшце ў той дзень, калі Корсак збіраўся вяртацца дамоў, я з лёгкасцю даў згоду на паездку як прыбылы госць разам з маладой парай і яе сястрой з першым сямейным візітам, за дзясятак міль, да чатырох родных дзядзькаў самой пані, паноў Багдановічаў, якія жылі ў Вілейскім павеце, у некалькіх мілях адзін ад другога – у Стайках, Мануйлах, Забор'і і Абадоўцах. Усе чатыры заможныя заслужаныя саноўнікі, выбраныя грамадствам, вялі дом з размахам, а агульная ўсіх радня налічвала ні больш ні менш як чатырнаццаць мілых, прыгожых, добра выхаваных або якія яшчэ выхоўваліся кузін, больш-менш равесніц маіх і сяброўак падарожжа, і дзевяць розных па ўзросце кузін, якія ў гэты менавіта час былі на канікулах дома. Прыезд маладой пары ў дом найперш самога старэйшага дзядзькі, у Стайкі, даў сігнал усяму сваяцкаму колу пра сустрэчы з імі і зборы каля іх, кожны раз у іншым складзе, як тут, так і падчас іншых чарговых візітаў, тым больш ветлівая гасціннасць гаспадароў старалася папераменна збіраць усіх разам для паляпшэння і больш разнастайнага побыту сваіх гасцей, кожны ў сваім доме. Дык былі і дажынкі (жыта), і паляванне, і рыбалоўства, і паходы ў арэхі і грыбы, не кажучы ўжо пра хатнія шпацыры і вячэрнія танцы пад фартэпіянную музыку».*

Калі вы думаеце, што гэта фінал, то дрэнна сабе ўяўляеце тагачасную шляхту. Пры вяртанні дадому Ходзька з жонкай вырашылі наведаць паноў Юзафа Рагойшу і Вінцэнта Ляўковіча. Абодва халасцякі, якія гаспадарылі ў вёсцы, для аказання пашаны сяброўскаму наведванню запрасілі ўсіх сваіх суседзяў, так што гасцяваць давялося цэлы тыдзень. Калі ж напрыканцы жніўня Адынец вярнуўся-такі дадому, каб заняцца сваім улюбёным паляваннем, то атрымаў запрашэнне ад Ваўжынца

Путкамера і яго жонкі Марылі. У Бальценіках ужо сабраліся госці, якія прывялі каля дваццаці зграй ганчакоў. Адны больш увагі надавалі ўласна паляванню, іншыя – чароўным амазонкам з суседскіх маёнткаў. На змярканні ўсе збіраліся ў доме, дзе ўжо палалі камінкі і чакалі накрытыя сталы, ды *«што ўжо казаць пра вясёлыя размовы і спрэчкі пры гэтых сталах і тых камінках!»* (с. 212).

Адынцу ішоў 22-гі год. Фестываліць ён пачаў у дзень святога Яна 24 чэрвеня 1825 года, а ў родныя Гейстуны канчаткова вярнуўся ў кастрычніку. Вось такое доўгае лета 1825-га!

Што шляхціцы елі ды пілі на зборах даведаемся ад жанчыны – вышэйзгаданай Альжбеты Пакаш з Рудамінаў-Дусяцкіх. Калі госць з'яўляўся ранкам, то яму прапаноўвалі невялікае сняданне, што складалася з вяндліны, масла і сыроў. Абед быў з пяці страў. Для сваіх падавалі мясны або курыны булён, зразкі або катлеты, вараных качак або куранятаў з соусам, каўбасы або белыя кішкі (страва, прыгатаваная з грачанай дробнай крупы, яек, малака і інш., налітая ў кішку, звараная і падсмажаная); у пятніцу або суботу – суп з рыбы, нагрэтае піва, клёцкі з рэдкага цеста на малацэ, блінцы альбо, у рэшце рэшт, бульбу з маслам або смажаную ў смятане. Падчас прысутнасці знатных гасцей стол бываў найбольш раскошны: студзень, марозіва, цукровыя пірагі і г. д. Пасля абеду пілі каву. А трэцяй альбо чацвёртай гадзіне падаваліся яблыкі, пернічкі, сухафрукты або ў адпаведную пару суніцы, клубніцы, агуркі з мёдам, цукровы гарох, чарэшні або вішні, дыні або кавуны [10, с. 329–330].

Калі госць прыязджаў пасля абеду, яго спачатку частавалі кавай, а пазней і падвячоркам, складзеным ажно з чатырох гарачых страў. Гэта бывалі катлеты з гарошкам, кураняты, збітая смятана з карыцай, цукрам, якое-небудзь цеста з варэннем. З садавіной падчас сяброўскіх сустрэч пілі вішнёвыя і малінавыя настойкі. Да гарэлкі на закуску падавалі хатнія пернікі. Кальтэшаль (халодны суп з піва) меў вялікую папулярнасць сярод мужчын. Аднак жа першае месца займаў пунш, які падавалі ў прыгожых крыштальных вазах [10, с. 329–330].

Да вышэйсказанага Альжбета дадае: *«Забаўляць гасцей, цалкам імі займацца, было задачай усяго нашага дому, і гэта лёгка ўдавалася ў тыя часы, калі ахвотна гулялі ў любую гульню: шахматы, шашкі, крэпасць, чэкіна па чарзе займалі ўсіх. Вельмі быў у модзе бадмінтон. Складанне галаваломак таксама займала некаторых, пры гэтым любілі пісаць карткі з разнастайнымі пытаннямі, часта задавалі шарады, неаднойчы справа даходзіла і да моцных спрэчак»* [9, с. 330]. Ад яе ж даведваемся, што пры кожным больш-менш шматлікім зборышчы абавязкова былі танцы. Яны распачыналіся класічным паланэзам, дзе часцей за ўсё сталы кавалер быў апрануты ў стары польскі строй і ўрачыста вёў сваю даму. Потым наставаў час вальса, кадрылі і вясёлай мазуркі [10, с. 330].

Калі ўсё вышэйсказанае – не апісанне раю, то што вы ўвогуле маеце на ўвазе, калі ўжываеце гэтае слова?

***3) Сяброўства і еднасць.***

Такім чынам, нашы шляхціцы елі і пілі, кахалі і балявалі, слухалі музыку і гулялі ў бадмінтон, дэкламавалі вершы і гарцавалі на конях, але што было галоўным у гэтых сустрэчах? Ежа ці пітво? Добрае паляванне? Картачны выйгрыш? Не, не і не. Галоўнымі былі сваяцкія сувязі, сяброўства, пачуццё еднасці, прыналежнасці да агульнай суполкі, дзяржавы, зямлі. Нават за мяжой, у вымушанай эміграцыі, яны ўваскрасаюць і становяцца здольнымі да творчасці, калі збіраюцца разам. Ва ўспамінах Адынца ёсць эпізод, які тычыцца жыцця польскай дыяспары ў Дрэздэне, дзе на пачатку 1832 г. адначасова сабралася значная колькасць яго сяброў. Кожны быў *«у паэтычным натхненні і задоры, і тое, што хто ўдзень або ў папярэднюю ноч напісаў, прыносіў на вечар для абмеркавання»* (с. 294). Нават Міцкевіч жартам казаў, што заразіўся паэзіяй ад сяброў і замест працы над перакладам паэмы Байрана, напісаў трэцюю частку «Дзядоў», якую любіў чытаць на штодзённых вячэрніх зборах. У яго лістах ёсць згадкі, як менавіта гэтае чытанне дадавала яму стымулу для працы (с. 269).

Зараз пра **недахопы выдання** «Успаміны пра мінулае». Чаго мне не хапіла? Каментарыяў. З фармальнага пункту гледжання ўсё на месцы. Пераклад успамінаў Адынца выкананы па адзіным прыжыццёвым выданні і забяспечаны прадмовай, імянным паказальнікам, каментарыямі, а таксама дадаткамі з вершамі аўтара і дакументальнымі матэрыяламі з фондаў Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва (у г. Вільнюсе). Аднак імянны паказальнік і каментарыі лапідарныя, часам не даюць дакладнага ўяўлення пра нейкую асобу ці гістарычную з’яву. У прыватнасці, я ніколі не чула пра Казіміра Брагінскага (1791–1835), пра якога сказана толькі тое, што гэта *«польскі паэт і літаратурны крытык»* (с. 337). У пошуках інфармацыі зайшла ў імянны паказальнік іншага выдання, дзе тая ж асоба характарызуецца, як *«паэт-сентыменталіст, літаратурны крытык, творца перадрамантызму ў Польшчы»* [13, с. 182]. Здаецца, дададзена ўсяго некалькі слоў, а ўяўленне атрымоўваецца значна больш глыбокае.

Яшчэ адзін прыклад. Выраз «пасажная панна» трактуецца як «прыгонная, аддадзеная ў пасаг паненцы, якая пакідае бацькоўскі дом» (с. 306). Хутчэй за ўсё, ён выкарыстоўваўся ў такім значэнні, але ж, напэўна, было іншае тлумачэнне. Цяжка ўявіць, што прыгонная жанчына кіравала домам Адынцоў, узяла шлюб з пляменнікам ксяндза панам Заблоцкім (які менавіта з гэтай прычыны асеў у іх доме на дармовым хлебе), ведала на памяць «Жыцці святых» і «Тысячу і адну ноч» ды пераказвала іх дамачадцам. Хутчэй за ўсё, Карнелія Рэнчыньская паходзіла

з дробнай шляхты, прыслужвала сваёй пані яшчэ ў доме Гнатоўскіх, а пасля шлюбу гаспадыні перайшла з ёй да Адынцоў.

На мой погляд, ва «Успамінах пра мінулае» таксама ёсць словы ці выразы, якія неабходна пракаментаваць, але ж гэта не зроблена. Не ўпэўненая, што кожны ведае, што такое «сваяк па кудзелі» (с. 48) ці «Віленская капітула» (с. 79).

Нават простыя колькасныя паказчыкі – 25 старонак каментатарскага тэксту на амаль 300 старонак тэксту арыгінальнага – паказваюць наколькі слабай засталася гэтая частка навукова-даведачнага апарату. Да таго ж, у працэсе падрыхтоўкі кнігі адбыўся выразны тэхнічны збой. У выніку, у нумарах старонак у імянным паказальніку ўжо пасля нумара 130 пачынаюць з'яўляцца памылкі, а патрэбныя звесткі пачынаюць знаходзіцца на адну старонку раней. Па меры росту нумароў памылка толькі павялічваецца і да канца тэксту розніца ўжо складае дзве старонкі.

Вышэй я дзякавала перакладчыкам і рэдактарам за якасны пераклад. Гэта сапраўды так і ёсць, аднак некаторыя наяўныя хібы ўсё ж неабходна адзначыць. Па-першае, сумнеўная перадача некаторых прозвішчаў. Так, застаецца незразумелым, чаму пры перадачы прозвішчаў не перадаецца традыцыйнае для беларускай мовы аканне, а пакінута характэрнае для польскае мовы эканне ў ненаціскных складах, напрыклад, «Рэнчыньская», «Пшэмыслаў», «Пшэцішэўскі», «Жэброўскі» і г. д. І калі гэты прынцып яшчэ магчыма прызнаць дыскусійным, то чаму і (галоўнае) навошта кіраўнік паўстання 1830–1831 гг. у Ковенскім павеце Маўрыцы Прозар стаў Празорам, застаецца толькі здагадвацца, бо ва ўсіх вядомых беларускамоўных працах гэтае простае 6-літарнае прозвішча з націскам на першы склад перадаецца менавіта як Прозар.

Па-другое, у беларускі тэкст усё ж закраліся непасрэдныя паланізмы. Напрыклад, польскае «przebywanie» перакладаецца калькай «перабыванне» (с. 43 і інш.), хаця слоўнік падае дастаткова простае і лагічнае слова «знаходжанне» [2, с. 502]. І яшчэ адзін прыклад: польскае словазлучэнне «zdać sprawy z» стабільна памылкова перакладаецца калькай «здаць справы з», што ператварае фразы ў бессэнсоўныя, напрыклад, *«былі здадзеныя справы з пасяджэнняў іншых груп»* (с. 96), *«здаць па іх справы Фебу»* (с. 112) і інш. Гэтае словазлучэнне павінна перакладацца як «даць справаздачу пра» [2, с. 610], што вяртае сэнс у вышэйзгаданыя фразы – «была дадзена справаздача пра пасяджэнні іншых груп», «даць Фебу справаздачу пра іх» і да т. п. Хаця з іншага боку, колькасць падобных паланізмаў не асабліва вялікая.

Адзначу, аўтар прадмовы і каментарыяў А. Фядута сам паставіў высокую планку ў падрыхтаваных раней да публікацыі мемуарах, прывучыў чытачоў да разгорнутых характарыстык гістарычных персанажаў, параўнання розных пунктаў гледжання на адну і тую ж падзею і

да т. п. У свой час яго каментары да ўспамінаў Булгарына зрабілі якасны зрух у маім успрыманні доўгага XIX стагоддзя. Вядома, з 2003 г. я трохі пасталела, так што ўжо неяк няёмка клікаць няньку на дапамогу, але ж за гэты час з'явілася новае пакаленне даследчыкаў, і іх арыентацыю на высакаякасную падрыхтоўку да выдання твораў XIX стагоддзя неабходна падтрымліваць усялякім чынам і ў кожным выданні.

## Крыніцы і літаратура


1. [Булгарин, Ф.] Воспоминания Фаддея Булгарина. Отрывки из виденного, слышанного и испытанного в жизни // Булгарын, Ф. Выбранае / укл. А. Фядуты. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2003. – (Беларускі кнігазбор; Серыя II. Гісторыка-літаратурныя помнікі). – С. 49–170.
2. Волкава, Я. В., Авілава, В. Л. Польска-беларускі слоўнік: звыш 40 000 слоў. – Мінск : БелЭн, 2004. – 880 с.
3. Гарбачова, В. В. Удзельнікі паўстання 1830–1831 гг. на Беларусі: Біябібліяграфічны слоўнік / В. В. Гарбачова. – Мінск : БДУ, 2004. – 400 с.
4. Дамейка, І. Мае падарожжы / пер. з пол. З. Сіцько. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2002. – 496 с. – (Беларускі кнігазбор. Серыя II. Гісторыка-літаратурныя помнікі).
5. Дзенісенка, А. П. Прыжыццёвыя выданні філаматаў і філарэтаў у фондах Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі // Філаматы і філарэты: творчы лёс пакалення ў гісторыі і сучаснасці (да 200-годдзя ўтварэння таварыства) : зб. навук. арт. / навук. рэд.: І. Л. Капылоў, І. Э. Багдановіч; адк. рэд. В. У. Міцкевіч. – Мінск : Беларуская навука, 2020. – С. 116–122.
6. Луговцова, С. Л. [Отзыв о:] Федута, А. И. Филомат в Империи: документальная повесть о Франтишке Малевском. – Минск : Лимариус, 2019. – 464 с. // Архіварыус : Зб. навук. паведамл. і арт. – Вып. 17. – Мінск : НГАБ, 2019. – С. 285–292.
7. Луговцова, С. Л. Деятельность системы местного управления Российской империи в первой четверти XIX века глазами Осипа Пржецлавского // Kintančios Lietuvos visuomenė: struktūros, veikėjai, idėjos: mokslinių straipsnių rinkinys, skirtas Tamaros Bairašauskaitės 65-mečio sukakčiai Lietuvos istorijos institutas / sudarytojai O. Mastianica, V. Pugačiauskas, V. Žaltauskaitė. – Vilnius : Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2015. – P. 118–137.
8. Луговцова, С. Л. Переполох в администрации Минской губернии, как следствие частного письма М. Ходько // Проблемы истории России, Беларуси и Украины XIX – начала XX века : научный «круглый стол», 28 октября 2013 г., к 135-летию со дня рождения академика В. И. Пичеты и 80-летию со дня рождения профессора И. В. Оржеховского: сб. ст. / редкол.: О. А. Яновский, В. В. Сергеенкова. – Минск : БГУ, 2014. – С. 69–75.
9. Луговцова, С. Л. Политика российского самодержавия по отношению к дворянству Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX в. – Минск : БГПУ, 1997. – 78 с.

10. Пакаш з Рудамінаў, Альжбета. Успаміны (Урыўкі) / падрыхтоўка да друку і каментары Марыны Ярашук // Arche. – 2014. – № 1–2 (122–123). – С. 307–361.
11. Пшацлаўскі, В. Калейдаскоп успамінаў: У 2 т. Т. 2 / уклад., прад., камент. і імён. паказ. А. Фядуты; навук. рэд., камент. А. Рэйтблат. – Мінск : Лімарыус, 2012. – 368 с.
12. Снайдэр, Т. Рэканструкцыя нацый: Польшча, Украіна, Літва і Беларусь, 1569–1999 гг. / пер. з англ. мовы М. Раманоўскага і В. Калацкай. – Мінск : Медысонт, 2010. – 424 с.
13. Станкевіч, С. Беларускія элементы ў польскай рамантычнай паэзіі. – Вільня : Інстытут беларусістыкі; Беласток : Беларускае гістарычнае таварыства, 2010. – 211 с.
14. Фядута, А. Ф. Трэба жыць доўга і пераражыць усіх: Антоні Эдвард Адынец і яго ўспаміны // Адынец, А. Э. Успаміны пра мінулае. – Мінск : Лімарыус, 2020. – С. 7–26.
15. Цвірка, К. Тэлемак з-пад Ашмянаў: Жыццё і творчасць Антонія Эдварда Адынца // Роднае слова. – 1994. – № 3. – С. 7–11.

*С. Л. Лугаўцова*

Артыкул паступіў у рэдакцыю 30.06.2021

***Ryčkov, A.*** *Judo bučinys : valdovo išdavystės samprata Lietuvoje (XIII a. pabaiga – XVI a. vidurys) / A. Ryčkov. – Vilnius : Lietuvos Istorijos Institutas, 2018. – 278 p.*




Перыяд з канца 1980-х гг. па 2010-я гг. ужо ўвойдзе ў гісторыю гістарычнай думкі Цэнтральна-Усходняй Еўропы як эпоха ўсплёску зацікаўленасці да гісторыі Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ), асабліва да мінуўшчыны княства далюблінскага перыяду. Таму не дзіўным стаў і выхад вялікай колькасці прац, прысвечаных прававым адносінам жыхароў дзяржавы – спачатку такія даследаванні выходзілі ў межах больш знаёмага нам разгляду пытанняў гісторыі права ВКЛ, тады як у выпадку з 2000-мі гадамі магчыма казаць пра зрух увагі навукоўцаў да культурных і інтэлектуальных зрэзаў такіх праблем: сталі з'яўляцца працы, якія закраналі праблемы прававой свядомасці, выкарыстання дзе-

лавога дакумента ў прававых дачыненнях, сімвалізму ўлады, спосабаў адпраўлення ўлады і г. д.[1].

Цалкам лагічным у такім гістарыяграфічным кантэксце быў выхад у 2018 г. манаграфіі, загаловак якой вынесены ў пачатак нашага тэксту, – «Пацалунак Іуды: паняцце здрады правіцелю ў Літве (канец XIII ст. – сярэдзіна XVI ст.)»[2], аўтарства навуковага супрацоўніка аддзела археаграфіі Інстытута гісторыі Літвы (Lietuvos istorijos institutas), доктара гуманітарных навук Андрэя Рычкова. Дакладна зададзеная ў загалоўку мэта працы стварае, як уяўляецца, прэтэнзію на закрыццё адпаведнай лакуны ў гістарыяграфіі гісторыі ВКЛ. Усё пералічанае вышэй зацікавіла нас наблізіцца да адказу, наколькі паспяхова аўтар вырашыў гэтую праблему.

Зразумець аўтарскую задуму немагчыма без звароту да структуры манаграфіі. Кніга ўключае прадмову, уводзіны, дзве главы, заключэнне, спіс скарачэнняў, бібліяграфічны спіс, анатацыю на англійскай мове, асабовы і геаграфічны паказальнікі. З пералічаных структурных частак уводзіны дадаткова падзяляюцца на структурныя часткі, не адлюстраваныя ў змесце, – «Метады даследавання», «Храналагічныя межы», «Гістарыяграфія» і «Крыніцы». Глава 1 «Развіццё паняцця злачынства здрады правіцелю ў Літве» ставіць задачу вывучэння развіцця прававых ідэй аб здрадзе ў ВКЛ на фоне ўсё большага павелічэння колькасці пераходаў падданых вялікага князя літоўскага да непрыяцеля, у главе 2 «Паняцце злачынства здрады правіцелю ў галіне прававой і палітычнай культур» даследчык меў намер вывучыць канцэпцыю здрады на фоне панарамы тагачасных з’яў прававой культуры ў княстве. Главы падзяляюцца на раздзелы: у главе 1 – «Асаблівасці развіцця паняцця ў Заходняй Еўропе», «Тэрміналогія, звязаная са здрадай, у Літве», «Вытокі фарміравання паняцця», «Прававое вызначэнне паняцця», «Высновы»; у главе 2 – «Гнеў і злосць правіцеля», «Публічнае выкананне смяротнага прысуду», «Высновы». Некаторыя раздзелы дзеляцца дадаткова на

---

[1] Такі падыход пераклікаецца з тэкстамі заходніх аўтараў, якія ўсё часцей ставяць пад сумнеў мэтазгоднасць даследавання галіны «гісторыі права». Падобны скепсіс выклікаецца, напрыклад, тым, што гісторыкі-правазнаўцы не могуць не абапірацца ў той ці іншай ступені на паняцце «канцэпцыі закона» («the conception of law»), якое нярэдка наканаванае быць анахранічным [12, p. 598]. У якасці выйсця з падобнага становішча прапануеваецца вывучэнне, напрыклад, «пэўных праяў дзяржаўнай улады» («certain exercises of state power») [12, p. 599], «злачынства як феномену культуры» («crime as a cultural phenomenon») [12, p. 610] і г. д. Не прымаючы ўказаны вышэй скепсіс поўнасцю, выкажам меркаванне, што такая даследчая пазіцыя выглядае больш прадуктыўнай за традыцыйную галіну «гісторыю права».

[2] На абодвух баках вокладкі кнігі выяўлены па 15 кружкоў серабрыстага колеру – алюзія да біблейскага сюжэту пра 30 срэбранікаў Іуды.

падраздзелы, а некаторыя з падраздзелаў – нават на далейшыя структурныя часткі. Асобныя главы манаграфіі прадстаўлены аўтарам у трох яго артыкулах і дысертацыі, абароненай у 2016 г. (с. 13)[3]. Англамоўная анатацыя, немалаважна, вылучаецца вялікім аб'ёмам і падрабязнасцю, што, думаецца, зробіць лягчэйшым карыстанне кнігай па-за межамі Літвы, дзе літоўскамоўныя працы часам абмінаюць увагай з прычыны моўнага бар'ера. Зрэшты, некаторыя з разваг аўтара, пакладзеныя ў аснову падраздзела 3.3 раздзела 3 главы 1, публікаваліся таксама на англійскай мове (гл.: [17]). Завяршаючы апісанне структуры, загадзя адзначым адзін плюс працы – гэта рашэнне ўключыць у кнігу паказальнікі. У прыватнасці, вялікую службу даследчыкам блізкіх тэм зробіць асабовы паказальнік (с. 265), бо пытанне здрады непарыўна звязана з канкрэтнымі персаналіямі, і некаторыя гісторыкі, зацікаўленыя ў здрадах асобных постацей, змогуць спрасціць сабе пошук патрэбнай інфармацыі і высноў.

Першы раздзел першай главы адкрываецца сціслым, але насычаным канкрэтнымі звесткамі з крыніц экскурсам у храналогію паўстання норм антычных і сярэднявечных узаконенняў, прысвечаных здрадзе правіцелю і абразе яго маястату (асабліва: с. 38–40). Адпаведныя тэзісы вянчаюцца зводкай пра самыя раннія прыклады бытавання адпаведных лексем у ВКЛ. Так, аўтар справядліва ўзводзіць пачаткі фарміравання адпаведнай лексікі (с. 43) да часоў канцылярыі Вітаўта. Аднымі з найбольш вартых увагі параграфамі главы 1 з'яўляюцца тэзісы (с. 46–48, 51, 65), у якіх аўтар паглыбляецца ў этымалагічныя штудыі над лексікай, што выкарыстоўвалася пры фарміраванні паняццяў аб здрадзе манарху, і тым самым прыўносіць герменеўтычнае бачанне паўсядзённай прававой практыкі і інтэлектуальную прастору, у якой тварыліся гэтыя ідэі ў ВКЛ. Спробы такога даследчага падыходу А. Рычкова трэба вітаць, бо і ў цяперашні час магчыма казаць пра даволі заўважнае адчужэнне гісторыкаў-літуаністаў ад мовазнаўчых распрацовак. Такім чынам, праца А. Рычкова можа паказаць высокую перспектыўнасць сінтэзу мовазнаўства і гісторыі для даследавання ВКЛ. Пры пабудове канцэпцыі раздзела А. Рычкоў надае значэнне таксама прававому звычаю (teisės paprotys) (с. 55) і прававой практыцы (teisinės praktikos) (с. 57), якія неабходна мець на ўвазе пры даследаванні адносінаў улады і падданых, прававых адносінаў у дамадэрных грамадствах з прычыны адсутнасці ўласцівых Новаму часу дакладна выкрышталізаваных, трывалых прававых сістэм. Герменеўтычнае бачанне дае пра сябе ведаць і ў падраздзеле «Знешнія ўплывы», дзе яно рэалізуецца на прыкладзе крыніц, якія паходзяць з дзяржавы Нямецкага ордэна, а таксама на прыкладзе кананічнага права

---

[3] Гл. таксама: [18; 21].

(с. 62–63). Асаблівую ўвагу звернем на прыклад прыцягнення кананічнага права – тут даводзіцца прызнаць, што яно, асабліва кананічнае права каталіцкай царквы, у даследаванні гісторыі прававых праблем ВКЛ прыцягваецца яшчэ не настолькі часта, як бы гэта магло быць.

У падраздзелах 3.3. і 3.4., якія завяршаюць раздзел 3 першай главы, аўтар сінтэзуе свае герменеўтычныя штудыі на адным з найбольш вузлавых матэрыялаў для вывучэння пытання – гісторыі ВКЛ 1400–1440-х гг., дзе, на нашу думку, найбольш перспектыўна ў аўтара атрымаліся даследаванні поглядаў на здраду ўнутры роду Гедымінавічаў (с. 69) і семантыкі адпаведных слоў у пагадненнях правіцеляў з гэтага роду з іншымі бакамі (с. 71–73, 77, 79). У выніку, пры наяўнасці не самага шырокага кола крыніц, аўтар пераканаўча паказвае не толькі адсутнасць здрады як менавіта злачынства ў строгім сэнсе гэтага слова (і такое заключэнне, між іншым, поўнасцю лагічнае па прычыне шырока вядомай літуаністам адсутнасці бюракратыі і адзіных прававых сістэм у тагачасным ВКЛ), але і заключае, што, у прыватнасці, здрада разумелася ў ВКЛ да сярэдзіны XV ст. толькі як адносіны вернасці і варожасці ў рамках дамадэрных сувязей паміж правячымі асобамі і падданымі (с. 74, 79).

У выпадку раздзела 4 арыгінальна выглядае меркаванне аўтара, што норма агульназемскага прывілея 1447 г. аб пакаранні толькі самога злачынцы і аб захаванні калектыўнай адказнасці ў выпадках злачынстваў супраць правіцеля можа ўзыходзіць да «рэлікта язычніцкага перыяду» (pagoniškojo laikotarpio reliktu) і рымскага права. Важна, што закрануўшы ролю рымскага права ў фарміраванні гэтай нормы прывілея, А. Рычкоў не абмяжоўваецца, як гэта нярэдка здараецца ў тэматычных даследаваннях па літуаністыцы, простай канстатацыяй аб магчымасці запазычання замежнай прававой ідэі і выказвае дапушчэнні аб асобах, дзякуючы якім такое запазычанне магло адбыцца. Такімі асобамі маглі стаць, як мяркуе даследчык, віленскі біскуп Мацей (або іншая высокая духоўная асоба каталіцкай царквы ў княстве) і гаспадарскі канцлер Міхаіл Кезгайла ці блізкі да яго чалавек (с. 87–88). Таксама ў станоўчым ключы адзначым меркаванне, што незахаваны «абласны» прывілей вялікага князя літоўскага Казіміра Ягелончыка Кіеўскай зямлі павінен быў быць створаны пасля 1481 г., што вынікае з адрознення яго норм пра пакаранне за здраду правіцелю ад крокаў, зробленых супраць удзельнікаў змовы супраць Казіміра, якая адбылася менавіта ў 1481 г. (с. 95). Адной з цэнтральных і вартых увагі ідэй раздзела з’яўляецца заключэнне, што ва ўказаны перыяд нормы аб здрадзе вялікаму князю літоўскаму з’яўляліся, па сутнасці, кангламератам слабазвязаных паміж сабой канкрэтных рашэнняў супраць кожнага асобнага выпадку здрады (с. 93, 95). І калі так, тады, як нам падаецца, пералік гэтых норм было б лагічна дапоўніць старэйшым актам – прывілеем Кнетаўскай воласці Жамойці, створаным паміж ве-

раснем 1441 і жніўнем 1442 г. (гл. тэкст: [22, № 4, р. 35–36]). Стварэнне гэтага акта адбывалася ў кантэксце наладжвання адносінаў паміж, з аднаго боку, правіцелем і яго правячай элітай, і з другога, часткай жамойтаў, якая выступіла супраць Казіміра [19, р. 120–123, 126; 5, с. 485–486], а сам акт загадваў жыхарам воласці захоўваць вернасць Казіміру так, як яны захоўвалі вернасць Вітаўту і Ягайлу («Як здаўна князю нашаму вялікаму каралю і дзядзьку нашаму вялікаму князю Вітаўту служылі, а цяпер ані (sic) нам гэтак жа служыць»[4]) [22, № 4, р. 36], а таксама прабачаў жыхарам рэгіёна «ўсе злосці, хітрасці»[5] [19, р. 126; 22, № 4, р. 35][6]. Такім чынам, прывілей жыхарам гэтай воласці таксама магчыма аднесці да праблемы фарміравання норм пра здраду правіцелю ў ВКЛ. Паходжанне норм перыяду I Статута ВКЛ 1529 г. аўтар манаграфіі разглядае падобным шляхам, што бачна з моцнай фрагментацыі падраздзела – ён падзяляецца на чатыры структурныя часткі. Такі падыход таксама выглядае лагічным, бо I Статут не спыняўся на паняцці здрады *per se*, але апісваў шэраг толькі канкрэтных злачынстваў, якія разумеліся як здрада (напрыклад, с. 106). Гэтыя і іншыя змешчаныя ў главе разважанні аўтара дазваляюць яму ўдала канцэптуалізаваць разуменне тагачасным насельніцтвам ВКЛ здрады: яна знаходзілася ў сувязі, адзначае А. Рычкоў, з адмовай ад падпарадкавання правіцелю і, як вынік, пераходзіла ў шырокае семантычнае поле, звязанае з саперніцтвам, недружалюбнасцю, варожасцю. Адсутнасць жа распрацаваных інстытуцыянальных практык вымушала ставіцца да такіх праяў як да канкрэтных выклікаў, на якія мусіў адказваць правіцель дзеля падтрымання сваёй улады. Гэтыя фактары і сфарміравалі паняцце, што здрадай правіцелю з’яўляецца любое парушэнне лаяльнасці асобе гаспадара (с. 114).

Другая глава адкрываецца малавядомым пытаннем сувязі пакарання з гневам правіцеля (с. 120–131). На падставе параўнанняў з дакументацыяй іншых еўрапейскіх манархій (с. 131) і матэрыялам літаратуры па антрапалогіі чалавечых эмоцый (с. 121, 123–125) А. Рычкоў заключае, што створаныя ў ВКЛ тэксты другой паловы XV – першай паловы XVI ст. маюць на ўвазе пад праявамі гневу не толькі ўласна эмацыянальныя перажыванні (напрыклад, с. 140), але і сродак ціску на дзеянні асобных падданых, якія вялікі князь лічыў непрымальнымі. У канцы першай трэці XVI ст. такое разуменне неэмацыянальнага гневу трансфармавалася ў сродак процідзейнічаць парушэнням інтарэсаў кіраван-

---

[4] Арыг. пол. – «Jako zdawna książęciu naszemu wielkiemu królu i dziadu naszemu wielkiemu książęciu Witołdu służyli, a teraz ani nam także służyć».

[5] Арыг. пол. – «wszystkie złości, chytrości».

[6] Прывілей захаваўся ў польскім спісе другой паловы XVII ст.; тут выкарыстоўваюцца цытаты паводле публікацыі, дзе правапіс крыніцы мадэрнізаваны.

ня або парушэнням інтарэсаў правіцеля і яго сваякоў (с. 137–147). Выражэнне гневу правіцеля накладала рэпутацыйную пляму («стыгму», як вобразна называе яе аўтар) на абвінавачанага ў здрадзе і нават на яго сям'ю і нашчадкаў (с. 155, 159). Важна, што ролю такой рэпутацыйнай шкоды А. Рычкоў тлумачыць (с. 149, зноска 630) на падставе добра вядомай ідэі пра «камунікацыйную памяць», распрацаваную Алейдай і Янам Асманамі. Наогул, у сувязі з гэтымі звесткамі няцяжка заўважыць, што А. Рычкоў часта спыняецца на праблеме «чти» (рэпутацыі) абвінавачаных у здрадзе асоб, і адпаведную інфармацыю крыніц аўтар часта прыводзіць *in extenso* ва ўсёй манаграфіі, а не толькі ва ўказаным раздзеле (напрыклад, с. 112, зноска 463; с. 141, 147). У гэтым жа святле, згодна з прыведзенай А. Рычковым інфармацыяй, сярод баяраў узнікла нават спецыяльнае негатыўнае найменне мяцяжу Глінскага – «Гліншчына» (с. 151–153). Дазволім сабе зрабіць адступленне: згаданая аўтарам «стыгма» і ўвогуле праведзеныя ім назіранні на тэму асабістай рэпутацыі абвінавачаных паказваюць яшчэ і жывасць практыкі негатыўнай камунікацыйнай памяці нават насуперак ідэям аб індывідуальнасці пакарання, хоць апошнія былі вядомыя ў ВКЛ на апісаны А. Рычковым час (першыя дзесяцігоддзі XVI ст.) вельмі даўно – як мінімум з канца першай паловы XV ст., гэта значыць, амаль стагоддзе перад гэтым.

Другі раздзел другой главы (сёмы ў валавай нумарацыі) вырашаецца, на першы погляд, дзіўным чынам: спачатку ў тэксце апісваюцца спосабы пакарання за здраду і толькі потым падаюцца звесткі аб працэсе расследавання падазрэнняў у здрадзе. Магчымае ўражанне аб неапраўданасці такой схемы вывучэння было б падманлівым, тады як, насамрэч, аўтару нельга адмовіць у трапнасці выбару менавіта такой паслядоўнасці, бо час узнікнення крыніц, у якіх апісваецца пакаранне ў ВКЛ за здраду, адносіцца ў сваёй большасці да ранейшага перыяду, чым час паўстання крыніц, дзе апісваўся працэс расследавання падазрэння ў здзяйсненні гэтага ўчынку. У гэтым дачыненні найбольшую ўвагу прыкоўваюць дзве высновы. Першая з іх заключаецца ў тым, што ў ВКЛ практыкаваліся дэманстрацыйныя пакаранні падазраваных у здрадзе дзеля ўмацавання лаяльнасці да правіцеля (с. 165–166) (апраўдана, што аўтар прыцягвае на дапамогу адзін з хрэстаматыйных прыкладаў з гісторыі ВКЛ – спаленне жыўцом праваслаўнага мітрапаліта Герасіма паводле загаду Свідрыгайлы). У гэтым выпадку, аднак, хацелася б зрабіць рэмарку: не выключана, што спаленне Герасіма прывяло да адваротнага эфекту і спрычынілася да негатыўных рэакцый на такое пакаранне (гл., напрыклад: [5, с. 492]). Другую адметную выснову аўтар выводзіць на падставе досыць вядомых літуаністам прыкладаў, калі падазраваным у здрадзе ўдавалася пазбягаць зняволення дзякуючы ўзяццю на парукі. Тут А. Рычкоў заключае, што калі падазраваны ўсё ж не мог пазбегнуць

зняволення, то гэта цягнула за сабой немагчымасць пазбегнуць пакарання за здраду (с. 173).

Адзначым у гэтым жа раздзеле рэканструкцыю працэсу смяротнага пакарання за здраду, чаму прысвечаны цэлы падраздзел, – з прыцягненнем, сярод іншага, абагульненняў Мішэля Фуко (с. 183), што заслугоўвае станоўчай ацэнкі, бо вялікі даробак гэтага аўтара па тэме пакарання ў раннемадэрнай Еўропе не так часта становіцца аб'ектам рэфлексіі сучасных літуаністаў. У гэтым дачыненні аўтар рэцэнзаванай працы адзначае, што смяротнае пакаранне за здраду ў ВКЛ у пачатку XVI ст. было публічным, і на базе гэтага факта ў спалучэнні з абагульненнямі М. Фуко аўтар кнігі дапускае, што публічнасць пакарання здраднікаў была патрэбна для таго, каб прылучыць сабраных гледачоў да самога працэсу пакарання смерцю, ператварыць іх у сувыканаўцаў гэтага пакарання (с. 183–184). Прыкметна, што А. Рычкоў не ідзе шляхам адбору «тыповых» ці «характэрных» прыкладаў такіх пакаранняў і разбірае (с. 179–193) ледзь не ўсе вядомыя выпадкі (хоць і адносяцца яны ў сілу спецыфікі крыніц да XV ст. і пазнейшага часу, а не да ўсяго закранутага ў кнізе часавага адрэзку). Пакаранага перад смерцю прыніжалі і імкнуліся пазбавіць хрысціянскага пахавання (с. 188–189, 192). Варта дадаць да штрыхоў гэтай карціны і тое, што магло мець месца наўмыснае забыццё асобы здрадніка, імкненне пазбягаць канкрэтных яго згадак (такія выпадкі засведчаныя для сярэдзіны XVI ст. [3]), і такім чынам, постаць здрадніка магла станавіцца непрымальнай таксама з таго пункту гледжання, што яна стварала негатыўную камунікацыйную памяць пра род ці сваякоў. У выніку, свае назіранні аўтар абагульняе наступным чынам. Першапачаткова ў ВКЛ пакаранне за здраду было цяжка аддзялімым ад гневу правіцеля (с. 196), і толькі ў пачатку XVI ст. намецілася замацаванне на пісьме паняцця менавіта здрады правіцелю (с. 196). Смяротнае пакаранне за здраду было рэдкім, але гэта не сведчыць пра слабасць правіцеля (с. 195). Нягледзячы на заўважную інстытуцыяналізацыю і фармалізацыю ідэі пакарання за здраду правіцелю, не апошнюю ролю ў адпраўленні пакарання працягвалі адыгрываць асабістыя гарантыі нефармальна звязаных са злачынцам людзей (с. 197), што цалкам упісваецца ў логіку грамадскіх кантактаў у дамадэрнай Еўропе. Не без гэтага ж кантэксту бачацца апраўданымі заключэнні даследчыка, што падобныя абвінавачанні цягнулі за сабой стыгматызацыю чалавека, пакідаючы «пляму здрады» («išdavystės dėmė») на ім, яго блізкіх і нашчадках, нават у выпадку апраўдання абвінавачанага (с. 197).

Манаграфія не пазбаўленая супярэчлівых месцаў, якія адносяцца да асобных элементаў «творчай лабараторыі» аўтара і тым самым робяць спрэчнымі хутчэй толькі асобныя канцэптуальныя моманты. Так, пры апісанні крыніц аўтар спыняецца і на тых з іх, якія былі напісаны тэн-

дэнцыйна, напрыклад: *«некаторыя з гэтых лістоў прадузятыя, бо закранутыя ў іх падзеі часта апісваліся тэндэнцыйна»*[7] (с. 34). Аднак хіба існуюць сітуацыі, калі створаныя чалавекам тэксты былі б аб'ектыўнымі? І хіба само паняцце здрады правіцелю ў якім-небудзь грамадстве не павінна было б фарміравацца з усёй разнастайнасці магчымых суб'ектыўных пазіцый людзей?

Уражанне некаторай непаўнаты стварае тое, што разбор А. Рычковым пытання рэпутацыі абвінавачаных у здрадзе правіцелю, пытання негатыўнай канатацыі сярод шараговых баяраў аб мяцяжы Глінскага паводле логікі рэчаў павінен быў бы таксама ўвесці нас у праблему таго, калі здрада гаспадару ўсё-такі дапускалася і што адбывалася з рэпутацыяй такіх здраднікаў, але такія сюжэты засталіся ў манаграфіі без увагі. Мы маем на ўвазе фарміраванне ў ВКЛ тэкстаў, якія ў той ці іншай форме апісвалі прычыны звяржэння вялікіх князёў і апраўдвалі такія ўчынкі, напрыклад: апісанні прычын звяржэння Свідрыгайлы ў 1432 г. [5, с. 243–247, 253–254], канструяванне летапісных сюжэтаў пра прычыны забойства Жыгімонта Кейстутавіча ў 1440 г. [15, р. 98; 14, р. 62; 6, с. 101; 5, с. 471]. Што такія апраўданні маглі выклікацца рэальнай патрэбай ачышчэння ўласнай рэпутацыі ў вачах іншых, гаворыць, напрыклад, негатыўная ацэнка сучаснікамі забойства Кейстутавіча [5, с. 447]. І хоць паўсядзённыя ўяўленні аб здрадзе ў ВКЛ XV і пачатку XVI ст. (перадусім, вядома, знаці ў сілу спецыфікі крыніц) ужо вывучаліся брытанска-літоўскім даследчыкам Стывенам Крыстаферам Роўэлам [16], ВКЛ у XV ст. асветлена далёкім ад жаданага ідэалу масівам крыніц, а значыць, яшчэ больш глыбокая распрацоўка тэмы магла б пашырыць нашыя веды. У гэтым жа дачыненні хацелася б ізноў спыніцца на аднойчы выкарыстаным А. Рычковым тэксце агульназемскага прывілея 1447 г. у спісе з т. зв. Кракаўскай кормчай. Аўтар абапіраўся на звесткі спіса акта пры рэканструкцыі гісторыі фарміравання лексікі, прысвечанай здрадзе правіцелю (с. 47). Аўтар выкарыстоўвае ідэю літоўскай даследчыцы гісторыі кнігі Рымы Цыцэніене аб тым, што кормчая была створана ў атачэнні літоўскага праваслаўнага мітрапаліта Іосіфа Солтана (1507–1521/1522) [9, р. 41][8]. У іншых працах па праблемах, звязаных з Кракаўскай кормчай (гл.: [2, с. 149, 223; 7, с. 137, 223]), былі агучаны больш аргументаваныя высновы наконт паходжання ўсёй гэтай кнігі, і, паводле гэтых высноў, стварэнне кормчай магчыма звязаць з далёкімі ад

---

[7] Арыг. літ. – «dalis tokių laiškų yra šališki, kadangi juose pristatomi įvykiai dažnai buvo aprašomi tendencingai».

[8] Падобную да гіпотэзы названай даследчыцы ідэю выказвае беларускі даследчык Юрый Мікульскі, але ён будуе свае меркаванні незалежна ад Р. Цыцэніене і грунтуецца амаль выключна на прыёмах фармальнай логікі ў адрыве ад шэрагу звестак кормчай (у прыватнасці, яе рукапіснай традыцыі) [4].

правячай эліты коламі. Польскі гісторык Ян Фелікс Якубоўскі абгрунтавана выказаўся, што спіс прывілея *«выйшаў не з велікакняжацкай канцылярыі, а з-пад пяра прыватнай асобы»* [8, с. 245]. Такім чынам, прыцягненне ўказанага спіса, у прыватнасці, асаблівасцей яго тэрміналогіі, падбору слоў для перакладу лацінскіх выразаў арыгінала (а да лексічных пытанняў А. Рычкоў, як мы ўжо ўбачылі, падышоў вельмі дбайна), магло б вывесці нас і да меркаванняў аб паняцці пра здраду, якія існавалі ў далёкіх ад правячай эліты людзей.

Іншым праблемным месцам кнігі можна назваць уключэнне канфлікту Жыгімонта Кейстутавіча і Свідрыгайлы ў адзін шэраг з іншымі канфліктамі ўнутры роду Гедымінавічаў (с. 69). На нашу думку, лепей заключыць, што канфлікт двух князёў у 1430-х гг. успрымаўся сучаснікамі яшчэ таксама і як незаконны захоп улады над вялікім княствам[9].

Магчыма, было б карысным дапоўніць праблему «гневу» правіцеля і тымі сітуацыямі, калі гэтае паняцце ў кіраванні выкарыстоўвалі, напрыклад, велікакняжацкія ваяводы [1, с. 45]. У гэтым выпадку напрошваецца паралель з прыведзенымі А. Рычковым высновамі (с. 113), згодна з якімі службоўцы правіцеля ўспрымаліся як асобы, што ўвасаблялі яго ўладу. Ці не было чагосьці аналагічнага і ў выпадку «гневу» намеснікаў, ваяводаў і іншых прадстаўнікоў вялікага князя – ці не маглі яны ўспрымацца як асобы, правамоцныя да падобнага ж выражэння «гневу»?

Некарэктнасці меншай значнасці аўтар дапусціў пры выкарыстанні тэрміналогіі. Спрэчным з'яўляецца пазначэнне лексемы са значэннем «вораг» не ў тыповай усходнеславянскай агаласоўцы («ворогъ»), а ў агаласоўцы, якая ўзнікла ў выніку ўплываў з боку старaславянскай пісьмовасці («врагъ»), тым больш што А. Рычкову вядома пра іншамоўнае паходжанне формы «врагъ» і выкарыстанне яе ў спецыфічных стылістычных нішах (с. 65, зноска 217). Іншым спрэчным месцам у тэрміналогіі лічым выкарыстанне слова «інстытуцыя» ў дачыненні да другой паловы XV ст. (напрыклад, с. 95, 96, 104), асабліва – падзел паміж «персонай правіцеля» («valdovo personalija») і «інстытуцыяй вялікага князя літоўскага» («Lietuvos didžiojo kunigaikščio institucija») (с. 149). На нашу думку, у кантэксце тагачасных прававых адносінаў у ВКЛ, у якіх яшчэ важкае, калі не асноўнае месца займалі нефармальныя адносіны і сувязі, а таксама апора на вуснае слова, казаць пра інстытуцыі было б заўчасным. Яшчэ менш інстытуцыяналізаванай была асоба правіцеля ў

---

[9] Сяргей Палехаў, спецыяльна даследаваўшы тэму, рэзюмаваў падзеі канфлікту двух князёў наступным чынам: *«Для шырокіх колаў жыхароў літоўскай Русі (якіх, натуральна, у планы змоўшчыкаў ніхто не пасвяціў) Свідрыгайла застаўся легітымным правіцелем, а тое, што адбылося ў гістарычным цэнтры краіны, – мяцяжом, які трэба было задушыць»* [5, с. 503].

ВКЛ XIII – першых дзесяцігоддзяў XVI ст., калі ў княстве адсутнічала размежаванне паміж асобай канкрэтнага чалавека на велікакняжацкім прастоле і абстрактным паняццем кіраўніка княства. Так, у манархіях тагачаснай Еўропы, дзе такое размежаванне мела месца, актыўна выкарыстоўвалі ў значэнні абстрактнага кіраўніка дзяржавы выразы tutor Regni, gubernator Regni, electus rex Regni і г. д., у той час як у ВКЛ такія азначэнні былі практычна невядомыя.

Так ці інакш, пералічаныя негатыўныя моманты з’яўляюцца ў большасці сваёй «кропкавымі» і не мяняюць агульнай перспектывы ўнёску, які можа зрабіць у гістарыяграфію блізкіх тэм разгледжаная праца. Арыентаванасць у міждысцыплінарнасці і (асабліва) глыбокая праца на нешматлікім матэрыяле XIII–XIV стст. дазволілі А. Рычкову не проста высветліць, *якімі былі* створаныя ў тагачасным ВКЛ нормы, прысвечаныя здрадзе правіцелю і абразе яго маястату, але і высветліць, *што́* яны азначалі і *што́* даюць ужо сучаснаму чытачу для больш шырокага разумення здрады тагачаснымі людзьмі княства. Звычайна якасна новае даследаванне не проста запаўняе прабелы ў непасрэдна закранутай праблеме, але таксама стымулюе далейшыя развагі і падказвае існаванне іншых нераскрытых сюжэтаў, і вышэйразгледжаная манаграфія, на нашу думку, з гэтым заданнем спраўляецца цалкам. Яна адкрывае новыя гарызонты, напрыклад, адзін з найбольш інтрыгоўных – амаль нераспрацаваная праблема прысягі і вернасці ў тагачасным ВКЛ[10] ці ўжо мімаходзь згаданая ў нашым тэксце праблема рэпутацыі ў супольнасцях ВКЛ, рысы якой маглі адрозівацца ад сучаснай, бо ў гэтых супольнасцях вядучую ролю адыгрывалі гарызантальныя адносіны і нефармальныя спосабы чалавечых сувязей увогуле. Падводзячы вынік выкладзенаму, варта адзначыць, што манаграфія стала яшчэ адным прыкладам даследавання не толькі афіцыйных і дзелавых поглядаў, але таксама паўсядзённага прававога жыцця ў ВКЛ XIII – першых дзесяцігоддзяў XVI ст., і такая праца можа дапамагчы літуаністам разглядаць прававую гісторыю ВКЛ ва ўсёй разнастайнасці яго культурнага і інтэлектуальнага свету.

## Крыніцы і літаратура

1. Беларускі архіў: у 3 т. / склад. З. І. Даўгяла. – Мінск : Ін-т беларускай культуры, 1927–1930. – Т. 2: XV–XVI стст. Літоўская метрыка. Кніга запісаў № 16: Архіў Літоўскай метрыкі ў дзяржаўным актахранілішчы ў Маскве (былы Архіў Мін-ва юстыцыі). 1530–1538 гг. – 1928. – 341 с.

[10] Для параўнання: пытанне актыўна вывучаецца на матэрыяле манархій Заходняй і Цэнтральна-Усходняй Еўропы, напрыклад: [10, s. 160 і інш.; 11; 13; 20]. Гэтае пытанне, у сваю чаргу, не трэба блытаць з гісторыяй *судовай* прысягі ў Еўропе Сярэднявечча і Ранняга Новага часу.

2. Восточнославянские и южнославянские рукописные книги в собраниях Польской Народной Республики : в 2 ч. / сост. Я. Н. Щапов. – Москва : Наука, 1976. – Ч. 1: Рукописи собраний Варшавы и Кракова. – 161 с.
3. Лапатэцкі, К. Злачынства здрады ў Вялікім Княстве Літоўскім XVI ст. / К. Лапатэцкі; пер. з польск. С. Петрыкевіча // Беларускі гістарычны агляд. – Т. 22. – Сш. 1–2. – Мінск; Вільня : Рэдакцыя БГА, 2015. – С. 31–63.
4. Микульский, Ю. Н. Кормчая книга XV в. из коллекции графов Тарновских: к истории архива западнорусских митрополитов / Ю. Н. Микульский // Беларуская даўніна : studia et fontes : зб. навук. арт. / пад рэд. Ю. М. Мікульскага. – Вып. 3. – Мінск : [б/в], 2016. – С. 57–69.
5. Полехов, С. В. Наследники Витовта. Династическая война в Великом княжестве Литовском в 30-е годы XV века / С. В. Полехов. – Москва : «Индрик», 2015. – 712 с.
6. Пятраўскас, Р. Літоўская знаць у канцы XIV – XV ст. : склад – структура – улада / Р. Пятраўскас; пер. з літ. А. Мікуса. – 2-е выд. – Смаленск : Інбелкульт, 2014. – 386 с.
7. Щапов, Я. Н. Княжеские уставы и церковь в Древней Руси XI–XIV вв. / Я. Н. Щапов. – Москва : Наука, 1972. – 338 с.
8. Якубовский, И. Земские привилеи Великого Княжества Литовского / И. Якубовский // Журнал Мин-ва народного просвещения. – 1903. – № 4. – С. 239–278.
9. Cicėnienė, R. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės rankraštinės knygos kultūra (iki XVI a. antrosios pusės) : daktaro disertacija, humanitariniai mokslai, komunikacija ir informacija (06 H) / Vilniaus Universitetas; R. Cicėnienė. – Vilnius, 2011. – 224 p.
10. Dalewski, Z. Rytuał i polityka. Opowieść Galla Anonima o konflikcie Bolesława Krzywoustego ze Zbigniewem / Z. Dalewski. – Warszawa : Instytut Historii PAN, 2005. – 259 s.
11. Débax, H. Éléments pour une analyse du rituel des serments féodaux en Languedoc et en Provence (XIe–XIIe siècles) / H. Débax // Le Moyen Age. Revue d’histoire et de philologie. – 2007. – [Nr] CXIII – [Vol.] 1. – P. 9–23.
12. Dubber, M. D. Histories of Crime and Criminal Justice and the Historical Analysis of Criminal Law / M. D. Dubber // The Oxford Handbook of the History of Crime and Criminal Justice / eds.: P. Knepper, A. Johansen. – New York, 2016. – P. 597–612.
13. Fałkowski, W. Double Meaning in Ritual Communication / W. Fałkowski // Frühmittelalterliche Studien. – 2008. – Vol. 42. – № 1. – P. 169–187.
14. Gudmantas, K. Valdovo ir dinastijos įvaizdžiai vėlyvuosiuose Lietuvos metraščiuose / K. Gudmantas // Acta Academiae Artium Vilnensis. – T 65–66. – Vilnius : Vilniaus dailės akademija, 2012. – P. 51–73.
15. Petrauskas, R. Lietuvos diduomenė XIV a. pabaigoje – XV a. : sudėtis – struktūra – valdžia / R. Petrauskas. – Vilnius : Aidai, 2003. – 379 p.
16. Rowell, S. C. Išdavystė ar paprasti nesutarimai? Kazimieras Jogailaitis ir Lietuvos diduomenė 1440–1481 metais / S. C. Rowell // Lietuvos valstybė XII–

XVIII a. : [straipsnių rinkinys] / red. kol.: Z. Kiaupa, A. Mickievičius, J. Sarcevičienė (sekretorė). – Vilnius : Lietuvos Istorijos Institutas, 1997. – P. 45–74.

17. Ryčkov, A. Internal Factors behind the Emergence of the Law of Treason in the Grand Duchy of Lithuania in the Mid-Fourteenth to Mid-Fifteenth Centuries / A. Ryčkov // Lithuanian Historical Studies. – 2015. – № 20. – P. 31–52.
18. Ryčkov, A. Valdovo išdavystės samprata Lietuvos Didžiojoje Kunigaikštystėje XIII a. pabaigoje – XVI a. viduryje : daktaro disertacija, humanitariniai mokslai, historija (05 H) / Lietuvos Istorijos Institutas, Vilniaus Universitetas; A. Ryčkov. – Vilnius, 2016. – 223 p.
19. Saviščevas, E. Žemaitijos savivalda ir valdžios elitas 1409–1566 metais / E. Saviščevas. – Vilnius : Vilniaus universiteto leidykla, 2010. – 461 p.
20. Sperka, J. Osobiste akty hołdownicze panów polskich z okresu panowania Władysława Jagiełły / J. Sperka // Społeczeństwo Polski średniowiecznej / pod red. S. K. Kuczyńskiego. – 2001. – T. IX. – S. 221–255.
21. Zarankaitė, T. Išdavystės anatomija. Apie Andrėjaus Ryčkovo disertaciją „Valdovo išdavystės samprata Lietuvos Didžiojoje Kunigaikštystėje XIII a. pab. – XVI a. viduryje“ ir jos gynimą / T. Zarankaitė // Lietuvos Istorijos Studijos. – 2016. – № 38. – P. 157–160.
22. Žemaitijos žemės privilegijos XV–XVII a. = Privilegia terrestria Samogitiensia sæc. XV–XVII / par. D. Antanavičius, E. Saviščevas. – Vilnius : Versus Aureus, 2010. – 102 p.

*Г. А. Бераставы*

Артыкул пастуміў у рэдакцыю 23.06.2021

# In memoriam

*Д. В. Лісейчыкаў, В. В. Урублеўскі*

## Памяці калегі і сябра: Сяргей Уладзіміравіч Жумар (10.11.1958 – 19.05.2021)

19 **мая 2021 г.** ад ускладненняў, выкліканых цяжкай эпідэмічнай хваробай, памёр выбітны прадстаўнік галіны айчыннага архівазнаўства і дакументазнаўства Сяргей Уладзіміравіч Жумар. Усім, хто суперажываў Сяргею Уладзіміравічу ў апошнія дні яго жыцця, не верылася, што ён болей не зможа выйсці з-пад улады хваробы. Яго постаць была знакавай для беларускай архіўнай галіны, бо амаль 37 гадоў свайго жыцця ён аддаў архівам і вывучэнню нашай дакументальнай спадчыны.

С. У. Жумар нарадзіўся 10 лістапада 1958 г. у Мінску ў сям'і служачых. У размовах на генеалагічную тэму любіў падкрэсліваць, што яго продкі ўкраінскага, рускага і балгарскага паходжання, не без дамешкаў цюркскай крыві. Сваё прозвішча выводзіў ад украінскай назвы старадаўняй спецыяльнасці тых, хто вырабляе алей – «алейнік» (укр. «жумарь»).

З маладых гадоў Сяргей Уладзіміравіч падарожнічаў па Беларусі ў складзе археалагічных экспедыцый, чаму садзейнічала яго праца лабарантам у сектары археалогіі Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР (1977–1983 гг.). Пра той час ён захаваў мноства цікавых гісторый, звязаных са слаўнымі мясцінамі і вядомымі асобамі беларускай археалогіі. Адначасова вучыўся на вячэрнім аддзяленні гістарычнага факультэта БДУ, які з адзнакай скончыў у 1983 г. Затым выкладаў гісторыю і грамадазнаўства ў сярэдняй школе № 46 г. Мінска.

Сяргей Уладзіміравіч звязаў свой лёс з архіўнай галіной у чэрвені 1984 г., уладкаваўшыся на пасаду захавальніка фондаў аддзела спецфондаў Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі БССР. Са жніўня 1992 г. ён працаваў навуковым супрацоўнікам аддзела архівазнаўства Беларускага навукова-даследчага інстытута дакументазнаў-



ства і архіўнай справы, з 1995 г. – загадчыкам аддзела архівазнаўства, у 2000 г. пераведзены на пасаду намесніка дырэктара БелНДІДАС (аднначасова выконваў функцыі загадчыка аддзела архівазнаўства). Менавіта з БелНДІДАС звязаны перыяд яго найбольшай навуковай і творчай актыўнасці.

Дзвюма галоўнымі тэмамі, якія знаходзіліся ў коле даследчыцкіх інтарэсаў С. У. Жумара, з’яўляліся: гісторыя Другой сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі, а таксама гісторыя і метадычныя аспекты архіўнай справы. У кантэксце першай была абаронена кандыдацкая дысертацыя «Акупацыйны друк на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (па матэрыялах беларускамоўных выданняў» (1996 г.), падрыхтавана манаграфія, шэраг зборнікаў дакументаў і іншых крыніцазнаўчых публікацый; у кантэксце другой – тры зборнікі метадычных рэкамендацый (1995, 2017, 2019 гг.), манаграфія «Ведущие архивы и отраслевые фонды Республики Беларусь», шэраг архівазнаўчых даведнікаў.

Апрача таго, Сяргей Уладзіміравіч быў аўтарам 35 артыкулаў і суаўтарам шматлікіх калектыўных праектаў, дзе выступаў і як аўтар, і як кіраўнік аўтарскага калектыву або рэдактар. Адным з апошніх яго праектаў было другое выданне біябібліяграфічнага даведніка «Архівісты Беларусі» (2020 г.), у якім ён з’яўляўся адным са складальнікаў. Яго ўнёсак у айчынныя дакументазнаўства і архівазнаўства цяжка пераацаніць – яго публікацыі закранаюць шырокае поле гістарычных, архівазнаўчых, дакументазнаўчых, археаграфічных і справаводчых пытанняў.

Доўга і плённа супрацоўнічаў Сяргей Уладзіміравіч з Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі. З 2004 г. ён увайшоў у склад Вучонага савета архіва і браў самы актыўны ўдзел у яго працы. З яго дапамогай былі сфармуляваны прынцыпы распрацоўкі многіх навуковых тэм архіва. Пачынаючы з 2006 г. С. У. Жумар стаў сталым рэцэнзентам зборніка навуковых артыкулаў і паведамленняў «Архіварыус». У ролі рэцэнзента ён ніколі не падыходзіў да сваёй справы з чыста фармальнага боку, а ўважліва і добрасумленна вычытваў змест кожнага выпуску, вылучаючы адметныя і няўдалыя публікацыі, уносіў прапановы па структуры і камплектацыі зместу.

Сяргей Уладзіміравіч быў надзвычай эрудзіраваным і цікавым суразмоўцам на самыя розныя тэмы. Іранічны склад розуму і выдатнае пачуццё гумару заўсёды вылучалі прамовы Сяргея Уладзіміравіча і на сур’ёзных працоўных пасяджэннях, і ў сяброўскіх кампаніях. Ён быў надзвычай душэўным чалавекам, які любіў вандраваць, гатаваць і цаніць прыгажосць.

Вечная памяць Вам, дарагі калега, настаўнік і сябар!

# Рэзюмэ

**Антановіч Зінаіда Васільеўна,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*«Архіўныя крыніцы па арганізацыі дзейнасці органаў кіраўніцтва хрысціянскімі канфесіямі на беларускіх землях у канцы XVIII – пачатку XX ст.»*

У артыкуле сістэматызаваны архіўныя фонды органаў кіраўніцтва хрысціянскімі канфесіямі дзяржаўнага, канфесіянальнага і епархіяльнага ўзроўню. Функцыянальныя рэарганізацыі на першых двух узроўнях адбываліся з канца XVIII да першай трэці XIX ст., у выніку чаго праваслаўная і ўніяцкая цэрквы былі падпарадкаваны обер-пракурору Сінода, а іншыя хрысціянскія канфесіі – Міністэрству ўнутраных спраў Расійскай імперыі праз органы канфесіянальнага кіраўніцтва. У выніку аналізу функцый разгледжаных органаў, іх узаемадзеяння і складу іх архіўных фондаў робіцца выснова, што архіўныя фонды кансісторый з'яўляюцца базавымі для выяўлення спецыфікі кожнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі епархіяльнага ўзроўню і даследаванняў у галіне арганізацыі дзейнасці органаў кіраўніцтва хрысціянскімі канфесіямі на беларускіх землях. Выкарыстанне матэрыялаў дзейнасці органаў вышэйшых узроўняў кіравання мэтазгодна пры страце адпаведнай дакументацыі кансісторый.

**Берастаўы Глеб Андрэевіч,** магістр гістарычных навук, стыпендыят праграмы Ураду Польскай Рэспублікі для маладых навукоўцаў.

*Рэцэнзія:* ***Ryčkov, A.*** *Judo bučinys : valdovo išdavystės samprata Lietuvoje (XIII a. pabaiga – XVI a. vidurys) / A. Ryčkov. – Vilnius : Lietuvos Istorijos Institutas, 2018. – 278 p.*

Рэцэнзуецца манаграфічнае даследаванне доктара гуманітарных навук, навуковага супрацоўніка аддзела археаграфіі Інстытута гісторыі Літвы Андрэя Рычкова, прысвечанае відазмяненню і сэнсаваму напаўненню паняцця здрады вялікім князям літоўскім у Вялікім Княстве Літоўскім у XIII – пачатку XVI ст. Кніга ацэньваецца як паводле звыклага апісання структуры і пераканаўчасці выкладзеных тэзісаў, так і ў больш шырокім кантэксце сучасных падыходаў, якія выкарыстоўваюцца ў звязаных тэмах. Агучваецца выснова, наколькі разгледжаная праца здольная прасунуць існуючую гістарыяграфію гісторыі ВКЛ XIII – пачатку XVI ст.

**Глінскі Яўген Станіслававіч,** магістр гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела навукова-даследчай і публікацыйнай дзейнасці Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

*«Зямяне маёнткаў Урэчча, Новы Двор і Яромічы Слуцкага княства ў другой палове XVI – пачатку XVIII ст.: фарміраванне супольнасці і генеалагічная свядомасць»*

У маёнтках, размешчаных на ўсход ад Слуцка (Урэчча, Новы Двор, Яромічы), колькасць зямян была істотна меншай, чым у іншых дварах Слуцкага і Капыльскага княстваў. Самым значным зямянскім паселішчам у гэтым рэгіёне з'яўляліся Сорагі (Сорага), зямянская супольнасць якіх пачала фарміравацца ў XVI ст. і заставалася дастаткова стабільнай да канца XVIII ст. Апрача таго, ва ўсходняй частцы Слуцкага княства існавалі нешматлікія баярскія засценкі, якія ў сярэдзіне XVII ст. таксама былі пераведзены на зямянскія павіннасці. Пры гэтым не толькі баяры, якія з'яўляліся выхадцамі з вярхоў сялянскага саслоўя, але і старадаўнія зямяне, многія з якіх мелі шляхецкае паходжанне, вымушаны былі падмацоўваць свой сацыяльны статус (падчас зямянскіх рэвізій і судовых працэсаў аб «нагане шляхецтва») спасылкамі на сфальсіфікаваныя дакументы. Адным з наступстваў гэтага стала складанне выразнай генеалагічнай свядомасці ў частцы зямянскіх родаў.

**Голубеў Валянцін Фёдаравіч,** доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык Цэнтра гісторыі Беларусі IX–XVIII стагоддзяў і спецыяльных гістарычных навук Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

*«Апісанне мястэчка Смаляны, Смалянскага замка і ратушы (важніцы) з інвентара Смалянскага княства 1744 г.»*

Публікуецца інвентар маёнтка Смаляны (Белы Ковель) Аршанскага павета ад 1744 г., у якім даецца апісанне Смалянскага замка, яго жылых і гаспадарчых пабудоў, а таксама мястэчка Смаляны, пазначаны склад яго жыхароў, іх заняткі і абавязкі. Таксама прыведзены фрагмент з больш ранняга інвентара Смалянскага княства ад 1710 г., які раскрывае структуру павіннасцей, якія неслі ў гэты час розныя групы мясцовага сялянскага насельніцтва. Публікацыя суправаджаецца нарысам гісторыі маёнтка Смаляны (Белы Ковель), які з сярэдзіны XVI ст. належаў прадстаўнікам уплывовага роду князёў Сангушкаў.

**Груша Аляксандр Іванавіч,** доктар гістарычных навук, дырэктар Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;
**Доўнар Аляксандр Барысавіч**, кандыдат гістарычных навук, загадчык аддзела спецыяльных гістарычных даследаванняў Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;
**Палехаў Сяргей Уладзіміравіч**, кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Школы актуальных гуманітарных

даследаванняў Інстытута грамадскіх навук Расійскай акадэміі народнай гаспадаркі і дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі.

*«Судовае рашэнне архіепіскапа і мітрапаліта Кіеўскага і ўсяе Русі Іосіфа II Солтана за 1510 г.»*

Апублікавана судовае рашэнне архіепіскапа і мітрапаліта Кіеўскага і ўсяе Русі Іосіфа II Солтана за 1510 г. – адзінае вядомае пісьмовае рашэнне духоўнага суда праваслаўнай царквы ў Вялікім Княстве Літоўскім за перыяд да канца 1520-х гг., якое захавалася цалкам і ў арыгінале. Дакумент з'яўляецца важнай крыніцай у вывучэнні гісторыі Кіеўскай мітраполіі XV–XVI стст., дзейнасці яе іерархаў, царкоўнага правасуддзя, святарскага кліру, цэркваў і манастыроў Мінска. Дадзенае рашэнне – адзін з рэдкіх дакументаў, які характарызуе дзейнасць аднаго з самых актыўных мітрапалітаў – Іосіфа II Солтана (1507–1521/1522).

**Даўгач Таццяна Валянцінаўна,** кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік аддзела спецыяльных гістарычных даследаванняў Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

*«Скаргі і прашэнні ўдзельнікаў аграрных адносін другой паловы XIX – пачатку XX ст. як гістарычная крыніца»*

У артыкуле разглядаюцца скаргі і прашэнні сялян і памешчыкаў, якія паступалі ў губернскія па сялянскіх справах прысутнасці пасля адмены прыгоннага права. Адзначаецца, што з-за хібаў і недапрацовак паслярэформеннага заканадаўства, колькасць скаргаў і прашэнняў у другой палове XIX – пачатку XX ст. была надзвычай высокай. Дадзеныя дакументы, складзеныя прыватнымі асобамі – удзельнікамі аграрных адносін, апрача справаводнага прызначэння, утрымліваюць «Я-канструкцыю», а значыць, з'яўляюцца каштоўнай крыніцай па гісторыі штодзённасці, ментальнасці, гендэрнай гісторыі. Яны нясуць у сабе інфармацыю аб індывідуальнай памяці і ўспрыманні розных сацыяльных з'яў. У артыкуле прыводзіцца аналіз скаргаў і прашэнняў па найбольш актуальных для тагачасных удзельнікаў аграрных адносін пытаннях.

**Кароль Маргарыта Міхайлаўна,** магістр гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела навукова-даследчай і публікацыйнай дзейнасці Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

*«Змена канфесійнай прыналежнасці як спосаб сацыяльнай адаптацыі ў беларускіх губернях у другой палове XIX ст. (паводле матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі)»*

Масавыя пераводы з каталіцызму ў праваслаўе з'ўляліся складовай часткай канфесійнай палітыкі Расійскай імперыі ў другой палове XIX ст. Частка прымусова пераведзеных у праваслаўе былых каталікоў спрабавала вярнуцца ў ранейшае веравызнанне і адмаўлялася прызнаваць сябе праваслаўнымі. Пры гэтым існавала катэгорыя людзей, якіх можна акрэсліць як умоўна добраахвотных канвертытаў. Прычыны іх пераходу ў праваслаўе былі шчыльна

звязаны з абставінамі грамадска-палітычнага і эканамічнага характару, якія склаліся пасля задушэння паўстання 1863–1864 гг. Чыноўнікі часта маглі нанава ўладкавацца на службу толькі пасля прыняцця праваслаўя або прымалі яго непасрэдна падчас знаходжання на службовай пасадзе для таго, каб яе захаваць. Таксама пераходзілі ў праваслаўе жонкі чыноўнікаў і асабліва праваслаўных святароў.

**Латушкін Андрэй Мікалаевіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*«Комплекс арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва Вялікага Княства Літоўскага ў гістарыяграфіі краін постсавецкай прасторы 1991–2020 гг .: тэрміналагічны аспект»*

У названы перыяд праблема комплексу арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва ВКЛ не стала прадметам спецыяльнага аналізу ў гістарыяграфіі Расіі, Украіны, Літвы. Грунтоўнай навуковай тэрміналагічнай распрацоўкі назвы комплексу ці яго элементаў не зафіксавана. Аднак усё часцей аб’ект стаў разглядацца як асобны ад іншых масіваў архіўнай спадчыны ВКЛ, у прыватнасці – ад Метрыкі ВКЛ, пазіцыянавацца як асобная частка «архіва Вялікага Княства Літоўскага», «дзяржаўнага архіва». Разам з тым, выпадкі яго інтэрпрэтацыі як элемента ў структуры Метрыкі ВКЛ усё яшчэ маюць месца. Характэрнай рысай расійскай гістарыяграфіі з’яўляецца выкарыстанне ў адносінах да дакументаў комплексу тэрміна «сапраўдны акт» у значэнні «арыгінал», тады як ва ўкраінскай і літоўскай гістарыяграфіі пануючым стаў тэрмін «арыгінал». У цяперашні час адзіны падыход да тэрміналогіі комплексу ў гістарычнай навуцы па-ранейшаму адсутнічае.

**Лаўрык Юрый Мікалаевіч,** вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.

*«Палемічна-дагматычны зборнік сярэдзіны XVIII ст. з калекцыі «Рукапісныя кнігі» Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь»*

У артыкуле прапануюцца вынікі кнігазнаўчага вывучэння манускрыпта, які захоўваецца ў калекцыі «Рукапісныя кнігі» Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь пад інвентарным нумарам КП 540. Манускрыпт змяшчае чатыры тэксты палемічна-дагматычнай накіраванасці, якія, у сваёй большасці, перапісаны або перакладзены з праваслаўных друкаваных выданняў XVI–XVII стст. На падставе філіграназнаўчага і кадыкалагічнага аналізу высветлена, што рукапіс быў створаны ў сярэдзіне XVIII ст., верагодна, на ўкраінскіх землях Рэчы Паспалітай, а ў XIX ст. бытаваў у Вохарскім манастыры на Чэрыкаўшчыне.

**Лісейчыкаў Дзяніс Васільевіч,** кандыдат гістарычных навук, намеснік дырэктара Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі;
**Плавінскі Мікалай Аляксандравіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі сярэдніх

вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

*«Цуд на востраве сярод водаў»: Браслаўскі Прачысценскі манастыр у святле пісьмовых крыніц і археалагічных даследаванняў»*

Браслаўскі Прачысценскі манастыр з'яўляецца надзвычай цікавым прыкладам рэлігійнай абшчыны, жыццядзейнасць якой адбывалася на вузка абмежаванай тэрыторыі (на востраве на возеры Неспіш) на працягу доўгага перыяду – больш за тры стагоддзі. Адметнай асаблівасцю рэканструкцыі гісторыі Браслаўскага Прачысценскага манастыра з'яўляецца тое, што ў распараджэнні даследчыкаў маецца значная колькасць пісьмовых крыніц, а таксама прадстаўнічая нумізматычная калекцыя. Карэляцыя звестак з пісьмовых крыніц, археалагічных і нумізматычных дадзеных, атрыманых у выніку археалагічных раскопак 2019 г., дазваляе дастаткова падрабязна рэканструяваць асноўныя этапы гісторыі манастыра ад моманту яго ўзнікнення ў XV ст. да пачатку 1830-х гг., калі на востраве адбыўся пажар, які паклаў канец яго існаванню.

**Лугаўцова Святлана Леанідаўна,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт, прарэктар па вучэбнай рабоце ДУА «Рэспубліканскі інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі работнікаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь».

*Рэцэнзія: **Адынец, А. Э.** Успаміны пра мінулае / А. Э. Адынец. – Мінск : Лімарыус, 2020. – 360 с. – (Бібліятэка «Наша XIX стагоддзе»)*

Рэцэнзуецца выданне мемуараў аднаго з найбольш вядомых літаратараў і грамадскіх дзеячаў Беларусі XIX стагоддзя – Антонія Эдварда Адынца. Раскрываецца змест кнігі (асноўныя вехі жыцця аўтара), ацэньваецца інфармацыйны патэнцыял гэтых успамінаў як гістарычнай крыніцы, вызначаюцца асноўныя зробленыя дасягненні. Указваецца на наяўнасць некаторых хібаў і недапрацовак пры падрыхтоўцы мемуараў, прапануюцца варыянты іх выпраўлення для патэнцыяльных будучых выданняў.

**Макараў Максім Дзмітрыевіч,** кандыдат гістарычных навук, вядучы архівіст аддзела старажытных актаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

*«Выкананне «падводнай» павіннасці мяшчанскай абшчынай і гарадскія «падводныя» землі Віцебска ў XV–XVII стст.».*

У артыкуле разгледжаны асаблівасці выканання «падводнай» павіннасці (выдача верхавых коней вялікаму князю, яго ўраднікам, паслам, ганцам, замежным пасольствам пры іх перамяшчэнні па тэрыторыі дзяржавы) мяшчанскай абшчынай Віцебска ў XV–XVII стст. Робіцца выснова пра тое, што нададзенымі вялікімі князямі літоўскімі «падводнымі» землямі, насельніцтва якіх выконвала гэтую павіннасць, валодаў горад як калектыўная асоба, таму самі мяшчане былі вызвалены ад нясення «падводнай» службы. У далейшым у 1558 г. натуральнае выкананне павіннасці з «падводных» зямель Віцебска было заменена грашовым падаткам, а пасля забойства 12 лістапада 1623 г.

уніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча і часовай ліквідацыі гарадскіх улад гэты комплекс нерухомасці быў у асноўнай масе захоплены прадстаўнікамі мясцовай шляхты і перастаў існаваць як адзінае цэлае.

**Матвейчык Дзмітрый Часлававіч,** кандыдат гістарычных навук, загадчык аддзела навукова-даследчай і публікацыйнай дзейнасці Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

*«Унёсак беларускіх гісторыкаў і архівістаў у рэалізацыю польска-савецкага праекта па выданні крыніц па гісторыі паўстання 1863–1864 гг. (1957–1987 гг.)»*

Разглядаецца рэалізацыя сумеснага праекта польскіх і савецкіх даследчыкаў па выяўленні і публікацыі крыніц па гісторыі паўстання 1863–1864 гг. Вызначаюцца перадумовы яго з'яўлення, указваюцца складанасці пры рэалізацыі і шляхі іх пераадолення, ацэньваюцца дасягнутыя вынікі і іх роля ва ўмацаванні міжнародных навуковых сувязей. Найбольшая ўвага звяртаецца на ўнёсак беларускіх даследчыкаў-гісторыкаў і архівістаў, якія ўдзельнічалі ў выяўленні матэрыялаў і падрыхтоўцы да друку асобных тамоў публікацыйнай серыі. Асобна ацэньваецца дзейнасць у межах праекта вядомых прадстаўнікоў айчыннай навукі, якія зрабілі найбольшы ўнёсак у яго рэалізацыю, – Генадзя Кісялёва, Сусаны Байковай (Самбук), Неры Булдаковай і іншых. Робіцца выснова пра вялікую значнасць дадзенага праекта для развіцця беларускай гістарыяграфіі паўстання.

**Мацук Андрэй Уладзіміравіч,** кандыдат гістарычных навук, навуковы супрацоўнік Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта.

*«Полацкія соймікі ў 1704–1707 гг.»*

На падставе разнастайных матэрыялаў з архіваў Беларусі, Расіі і Польшчы, а таксама навуковай літаратуры разглядаецца функцыянаванне полацкіх соймікаў у 1704–1707 гг. Адзначаецца, што галоўны ўплыў на іх функцыянаванне аказвала прысутнасць расійскіх войскаў у Полацкім ваяводстве, а асноўнай прычынай склікання соймікаў была праблема забеспячэння гэтых войскаў. Вызначана, што ў сітуацыі двухкаралеўя шляхта на полацкіх сойміках у асноўным была прыхільная Аўгусту ІІ і выступала супраць падтрыманага шведамі Станіслава Ляшчынскага.

**Палехаў Сяргей Уладзіміравіч,** кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Школы актуальных гуманітарных даследаванняў Інстытута грамадскіх навук Расійскай акадэміі народнай гаспадаркі і дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі.

*«Самая старажытная згадка Шклова – 1466 год: пасланне навагародскага намесніка Марціна Гаштольда»*

Публікуецца распарадчае пасланне навагародскага намесніка Марціна Гаштольда яго шклоўскаму намесніку Комару пра падараванне сяльца яго баярыну ад 1 красавіка 1466 г. – дакумент, які змяшчае самую старажытную вядомую згадку Шклова ва ўскоснай форме.

**Рындзін Сяргей Мікалаевіч,** магістр гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела навукова-даследчай і публікацыйнай дзейнасці Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

*«Маркоўшчынскі лагер ваеннапалонных падчас Першай сусветнай вайны (паводле матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі)»*

У артыкуле адзначаецца, што ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі доўгі час нічога не было вядома пра стварэнне лагераў для замежных ваеннапалонных на тэрыторыі беларускіх губерняў у перыяд Першай сусветнай вайны. НГАБ захоўвае дэталёвыя звесткі пра адзін з такіх лагераў на тэрыторыі Віцебскай губерні, які быў разгорнуты ў раёне сяла Ма́ркаўшчына ў Віцебскім павеце і, паводле архіўных дакументаў, праіснаваў на працягу ўсёй вайны. У дадзеным артыкуле праводзіцца агляд выяўленых дакументаў і прааналізавана іх інфарматыўнасць: перыяд існавання лагера, умовы ўтрымання ваеннапалонных, адносіны зняволеных замежных вайскоўцаў з лагернай адміністрацыяй, кіраўніцтвам і персаналам гаспадарчых аб'ектаў, што выкарыстоўвалі працу ваеннапалонных, маштаб выкарыстання працы. Вялікую цікавасць уяўляюць дакументы, што змяшчаюць звесткі пра саміх ваеннапалонных: падданства, нацыянальнасць, імянныя спісы.

**Самовіч Аляксандр Леанідавіч,** доктар гістарычных навук, дацэнт, галоўны навуковы супрацоўнік цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

*«Першая сусветная вайна і беларуская школа: ваенны фактар у дзейнасці навучальных устаноў (1914–1918 гг.)»*

Артыкул закранае пытанні, звязаныя з уплывам падзей Першай сусветнай вайны на дзейнасць навучальных устаноў беларускіх губерняў. Звяртаецца ўвага на ініцыятывы моладзі ў падтрымку салдацкіх сем'яў, адзначаецца клопат юнакоў і дзяўчат у дачыненні да параненых воінаў, прыводзяцца факты ўдзелу падлеткаў у баявых дзеяннях. Падкрэсліваецца важнасць вывучэння вопыту работы сярэдняй школы ў надзвычайных умовах ваеннага часу.

**Скеп'ян Анастасія Анатольеўна,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі IX–XVIII стагоддзяў Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

*«Гербавыя пячаткі князёў Алелькавічаў»*

У артыкуле аналізуюцца асаблівасці сфрагістыкі князёў Алелькавічаў і яе эвалюцыя на працягу XV – пачатку XVII ст. Яе характэрнай рысай з'яўлялася выкарыстанне асабістага адзінкавага герба, спачатку ў выглядзе клейна, а пазней герба «Пагоні». На працягу ўсяго часу існавання дынастыі яе прадстаўнікі ні разу не выкарыстоўвалі для размяшчэння на пячатках складанага або шлюбнага герба, што ў шэрагу выпадкаў ускладняе іх ідэнтыфікацыю. Цікавай асаблівасцю жаночай геральдыкі Алелькавічаў з'яўляецца невыкарыстанне княгінямі для пячатак чырвонага воску, нягледзячы на свой статус.

**Снапкоўскі Юрый Мікалаевіч,** намеснік загадчыка аддзела навукова-даследчай і публікацыйнай дзейнасці Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

*«Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі ў спецыяльных гістарычных дысцыплінах біяграфічнага профілю (на прыкладзе анлайн-картатэкі прафесара Эрыка Амбургера «Іншаземцы ў дарэвалюцыйнай Расіі»)»*

У артыкуле закранаецца праблема прымянення сучасных інфармацыйных тэхналогій спецыяльных гістарычных дысцыплінах біяграфічнага кірунку (біяграфіцы, генеалогіі, некрапалістыцы). Адзначаецца іх роля ў выяўленні, назапашванні, сістэматызацыі і эфектыўным выкарыстанні рэтраспектыўнай інфармацыі. У якасці аднаго з самых буйных і інфарматыўных профільных электронных рэсурсаў разглядаецца нямецкамоўная анлайн-картатэка прафесара Эрыка Амбургера «Іншаземцы ў дарэвалюцыйнай Расіі». Аўтарам прааналізаваны яе інфармацыйны патэнцыял, структура, навігацыя і некаторыя знешнія параметры. Падкрэсліваецца вялікая практычная значнасць анлайн-картатэкі для асобных даследаванняў і навукова-даследчых праектаў.

**Чарняўскі Фёдар Віктаравіч,** гісторык-генеалог.

*«Маршалак Ашмянскага павета Ян Свалынскі (?–1646): паходжанне, грамадска-палітычная дзейнасць, маёмаснае становішча»*

У артыкуле разглядаецца маёмаснае становішча і грамадска-палітычная дзейнасць роду Свалынскіх (Свалонскіх). Яго прадстаўнікі адзначыліся падчас Інфлянцкай вайны, але сапраўднае ўзвышэнне роду адбылося ў першай палове XVII ст., калі дзейнічаў маршалак ашмянскі і каралеўскі сакратар Ян Іванавіч Свалынскі. Ён здолеў не толькі зрабіць выдатную палітычную кар’еру (у тым ліку пры дапамозе сваякоў з уплывовага роду Трызнаў), але і сабраць дастаткова вялікі маёмасны комплекс. Маёнткі Яна Свалынскага пераважна размяшчаліся ў Ашмянскім павеце, у той час як большасць Свалынскіх у XVII–XVIII стст. працягвала адносіцца да шляхты Полацкага ваяводства. Асобна ў артыкуле звяртаецца ўвага на складанасці пры вызначэнні паходжання некаторых Свалынскіх, удакладнены радаводы ўласна маршалка Яна, а таксама Канстанціна Антонія Свалынскага, які ў 1694–1714 гг. займаў пасаду менскага гродскага суддзі.

# Резюме

**Антонович Зинаида Васильевна,** кандидат исторических наук, доцент, доцент кафедры источниковедения исторического факультета Белорусского государственного университета.

*«Архивные источники по организации деятельности органов управления христианскими конфессиями на белорусских землях в конце XVIII – начале XX в.»*

В статье систематизированы архивные фонды органов управления христианскими конфессиями на государственном, конфессиональном и епархиальном уровнях. Функциональные преобразования на первых двух уровнях осуществлялись с конца XVIII до первой трети XIX в., в результате чего православная и униатская церкви были подчинены обер-прокурору Синода, а другие христианские конфессии – Министерству внутренних дел Российской империи через органы конфессионального управления. В результате анализа функций рассматриваемых органов, их взаимодействия и структуры их архивных фондов делается вывод, что архивные фонды консисторий являются базовыми для выявления специфики каждой административно-территориальной единицы епархиального уровня и исследований в сфере организации деятельности органов управления христианскими конфессиями на белорусских землях. Использование материалов деятельности вышестоящих органов целесообразно при утрате соответствующей документации консисторий.

**Берестовой Глеб Андреевич,** магистр исторических наук, стипендиат программы Правительства Польской Республики для молодых ученых.

*Рецензия:* ***Ryčkov, A.*** *Judo bučinys : valdovo išdavystės samprata Lietuvoje (XIII a. pabaiga – XVI a. vidurys) / A. Ryčkov. – Vilnius : Lietuvos Istorijos Institutas, 2018. – 278 p.*

Рецензируется монографическое исследование доктора гуманитарных наук, научного сотрудника отдела археографии Института истории Литвы Андрея Рычкова, посвящённое видоизменению и смысловому наполнению понятия предательства великим князьям литовским в Великом Княжестве Литовском в XIII – начале XVI в. Книга оценивается как по привычному описанию структуры и убедительности изложенных тезисов, так и в более обширном контексте современных подходов, используемых в связанных темах. Озвучивается вывод, насколько рассмотренная работа способна продвинуть существующую историографию истории ВКЛ XIII – начала XVI в.

**Глинский Евгений Станиславович,** магистр исторических наук, ведущий научный сотрудник отдела научно-исследовательской и публикационной деятельности Национального исторического архива Беларуси.

*«Земяне имений Уречье, Новый Двор и Еремичи Слуцкого княжества во второй половине XVI – начале XVIII в.: формирование сообщества и генеалогическое сознание»*

В имениях, расположенных на восток от Слуцка (Уречье, Новый Двор, Еремичи), количество земян было существенно меньшим, чем в других дворах Слуцкого и Копыльского княжеств. Самым значительным земянским поселением в этом регионе являлись Сороги (Сорога), земянское сообщество которых начало формироваться в XVI в. и оставалось достаточно стабильным до конца XVIII в. Кроме того, в восточной части Слуцкого княжества существовали немногочисленные боярские застенки, в середине XVII в. также переведенные на земянские повинности. При этом не только бояре, являвшиеся выходцами из верхов крестьянского сословия, но и древние земяне, многие из которых имели шляхетское происхождение, вынуждены были подкреплять свой социальный статус (во время земянских ревизий и судебных процессов о присвоении шляхетского достоинства) ссылками на сфальсифицированные документы. Одним из последствий этого стало формирование выраженного генеалогического сознания у части земянских родов.

**Голубев Валентин Федорович,** доктор исторических наук, профессор, заведующий Центром истории Беларуси IX–XVIII веков и специальных исторических дисциплин Института истории Национальной академии наук Беларуси.

*«Описание местечка Смоляны, Смолянского замка и ратуши (важницы) из инвентаря Смолянского княжества 1744 г.»*

Публикуется инвентарь имения Смоляны (Белый Ковель) Оршанского повета от 1744 г., в котором дается описание Смолянского замка, его жилых и хозяйственных строений, а также местечка Смоляны, указан состав его жителей, их занятия и обязанности. Также приведен фрагмент из более раннего инвентаря Смолянского княжества от 1710 г., раскрывающий структуру повинностей, которые несли в это время разные группы местного крестьянского населения. Публикация сопровождается очерком истории имения Смоляны (Белый Ковель), с середины XVI в. принадлежавшего представителям влиятельного рода князей Сангушко.

**Груша Александр Иванович,** доктор исторических наук, директор Центральной научной библиотеки имени Якуба Коласа Национальной академии наук Беларуси;
**Довнар Александр Борисович**, кандидат исторических наук, заведующий отделом специальных исторических исследований Института истории Национальной академии наук Беларуси;
**Полехов Сергей Владимирович**, кандидат исторических наук,

старший научный сотрудник Школы актуальных гуманитарных исследований Института общественных наук Российской академии народного хозяйства и государственной службы при Президенте Российской Федерации.

*«Судебное решение архиепископа и митрополита Киевского и всея Руси Иосифа II Солтана за 1510 г.»*

Опубликовано судебное решение архиепископа и митрополита Киевского и всея Руси Иосифа II Солтана за 1510 г. – единственное известное письменное решение духовного суда православной церкви в Великом Княжестве Литовском за период до конца 1520-х гг., которое сохранилось полностью и в подлиннике. Документ является важным источником в изучении истории Киевской митрополии XV–XVI вв., деятельности ее иерархов, церковного правосудия, священного клира, церквей и монастырей Минска. Данное решение – один из редких документов, характеризующих деятельность одного из самых активных митрополитов – Иосифа II Солтана (1507–1521/1522).

**Долгач Татьяна Валентиновна,** кандидат исторических наук, старший научный сотрудник отдела специальных исторических исследований Института истории Национальной академии наук Беларуси.

*«Жалобы и прошения участников аграрных отношений второй половины XIX – начала XX в. как исторический источник»*

В статье рассматриваются жалобы и прошения крестьян и помещиков, которые поступали в губернские по крестьянским делам присутствия после отмены крепостного права. Отмечается, что из-за изъянов и недоработок в пореформенном законодательстве, количество жалоб и прошений во второй половине XIX – начале XX в. было чрезвычайно высоким. Данные документы, составленные частными лицами – участниками аграрных отношений, кроме делопроизводственного назначения, содержат «Я-конструкцию», а значит, являются ценным источником по истории повседневности, ментальности, гендерной истории. Они несут в себе информацию об индивидуальной памяти и восприятии разных социальных явлений. В статье приведен анализ жалоб и прошений по наиболее актуальным для участников аграрных отношений вопросам.

**Король Маргарита Михайловна,** магистр исторических наук, ведущий научный сотрудник отдела научно-исследовательской и публикационной деятельности Национального исторического архива Беларуси.

*«Изменение конфессиональной принадлежности как способ социальной адаптации в белорусских губерниях во второй половине XIX в. (по материалам Национального исторического архива Беларуси)»*

Массовые переводы из католицизма в православие являлись составной частью конфессиональной политики Российской империи во второй половине XIX в. Часть принудительно переведенных в православие бывших като-

ликов пыталась вернуться в предыдущее вероисповедание и отказывалась признавать себя православными. При этом существовала категория людей, которых можно обозначить как условно добровольных конвертитов. Причины их перехода в православие были тесно связаны с обстоятельствами общественно-политического и экономического характера, возникшими после подавления восстания 1863–1864 гг. Чиновники часто могли вновь устроиться на службу только после принятия православия или принимали его непосредственно во время нахождения в должности для того, чтобы ее сохранить. Также переходили в православие жены чиновников и особенно православных священников.

**Лаврик Юрий Николаевич,** ведущий научный сотрудник Национального исторического музея Республики Беларусь.

*«Полемико-догматический сборник середины XVIII в. из коллекции «Рукописные книги» Национального исторического музея Республики Беларусь»*

В статье предлагаются результаты книговедческого изучения манускрипта, входящего в состав коллекции «Рукописные книги» Национального исторического музея Республики Беларусь под инвентарным номером КП 540. Манускрипт содержит четыре текста полемико-догматической направленности, которые в большинстве случаев были переписаны или переведены с православных печатных изданий XVI–XVII вв. На основании филиграневедческого и кодикологического анализа определено, что рукопись была создана в середине XVIII в., вероятно, на украинских землях Речи Посполитой, а в XIX в. бытовала в Охорском монастыре на Чериковщине.

**Латушкин Андрей Николаевич,** кандидат исторических наук, доцент, доцент кафедры источниковедения исторического факультета Белорусского государственного университета.

*«Комплекс оригиналов актов общегосударственного значения архива Великого Княжества Литовского в историографии стран постсоветского пространства 1991–2020 гг.: терминологический аспект»*

В названный период проблема комплекса оригиналов актов общегосударственного значения архива Великого Княжества Литовского не стала предметом специального анализа в историографии России, Украины, Литвы. Тщательной научной терминологической разработки названия комплекса или его элементов не зафиксировано. Однако возросла частота рассмотрения объекта как отдельного от других массивов архивного наследия ВКЛ, в частности – от Метрики ВКЛ, позиционирования его как отдельной части «архива Великого Княжества Литовского», «государственного архива». Однако случаи его интерпретации как элемента в структуре Метрики ВКЛ все еще имеют место. Характерной чертой российской историографии является использование в отношении документов комплекса термина «подлинник» в значении «оригинал», тогда как в украинской и литовской историографии господствующим стал термин «оригинал». В настоящее время единого подхода к терминологии комплекса в исторической науке нет.

**Лисейчиков Денис Васильевич,** кандидат исторических наук, заместитель директора Национального исторического архива Беларуси; **Плавинский Николай Александрович,** кандидат исторических наук, доцент, ведущий научный сотрудник отдела археологии средних веков и Нового времени Института истории Национальной академии наук Беларуси.

*«Чудо на острове среди вод»: Браславский Пречистенский монастырь в свете письменных источников и археологических исследований»*

Браславский Пречистенский монастырь является крайне интересным примером религиозной общины, жизнедеятельность которой происходила на узко ограниченной территории (на острове озера Неспиш) на протяжении длительного периода – более трех столетий. Примечательной особенностью реконструкции истории Браславского Пречистенского монастыря является то, что в распоряжении исследователей имеется значительное число письменных источников, а также представительная нумизматическая коллекция. Корреляция сведений из письменных источников, археологических и нумизматических данных, полученных в результате археологических раскопок 2019 г., позволяет достаточно подробно реконструировать основные этапы истории монастыря от момента его возникновения в XV в. до начала 1830-х гг., когда на острове произошел пожар, положивший конец его существованию.

**Луговцова Светлана Леонидовна,** кандидат исторических наук, доцент, проректор по учебной работе ГУО «Республиканский институт повышения квалификации и переподготовки работников Министерства труда и социальной защиты Республики Беларусь».

*Рецензия: **Адынец, А. Э.** Успаміны пра мінулае / А. Э. Адынец. – Мінск : Лімарыус, 2020. – 360 с. – (Бібліятэка «Наша XIX стагоддзе»)*

Рецензируется издание мемуаров одного из наиболее известных литераторов и общественных деятелей Беларуси XIX века – Антония Эдварда Одынца. Раскрывается содержание книги (основные вехи жизни автора, оценивается информационный потенциал воспоминай как исторического источника, определяются основные сделанные достижения. Указывается на наличие некоторых изъянов и недоработок при подготовке мемуаров, предлагаются варианты их исправления для потенциальных будущих изданий.

**Макаров Максим Дмитриевич,** кандидат исторических наук, ведущий архивист отдела древних актов Национального исторического архива Беларуси.

*«Выполнение «подводной» повинности мещанской общиной и городские «подводные» земли Витебска в XV–XVII вв.».*

В статье рассмотрены особенности выполнения «подводной» повинности (выдача верховых лошадей великому князю, его урядникам, послам, гонцам, иностранным посольствам при их перемещении по территории государства) мещанской общиной Витебска в XV–XVII вв. Делается вывод о том, что

пожалованными великими князьями литовскими «подводными» землями, население которых несло данную повинность, владел город как коллективное лицо, поэтому сами мещане были освобождены от несения «подводной» службы. В дальнейшем в 1558 г. натуральное выполнение повинности с «подводных» земель Витебска было заменено денежным налогом, а после убийства 12 ноября 1623 г. униатского архиепископа Иософата Кунцевича и временной ликвидации городских властей этот комплекс недвижимости был в основной массе захвачен представителями местной шляхты и перестал существовать как единое целое.

**Матвейчик Дмитрий Чеславович,** кандидат исторических наук, заведующий отделом научно-исследовательской и публикационной деятельности Национального исторического архива Беларуси.

*«Вклад белорусских историков и архивистов в реализацию польско-советского проекта по изданию источников по истории восстания 1863–1864 гг. (1957–1987 гг.)»*

Рассматривается реализация совместного проекта польских и советских исследователей по выявлению и публикации источников по истории восстания 1863–1864 гг. Определяются предпосылки его появления, указываются сложности при его реализации и пути их преодоления, оцениваются достигнутые результаты и их роль в укреплении международных научных связей. Наибольшее внимание уделяется вкладу белорусских исследователей-историков и архивистов, участвовавших в выявлении материалов и подготовке к печати отдельных томов публикационной серии. Отдельно оценивается деятельность в рамках проекта известных представителей отечественной науки, внесших наибольший вклад в его реализацию, – Геннадия Киселева, Сусанны Байковой (Самбук), Неры Булдаковой и других. Делается вывод о большой значимости данного проекта для развития белорусской историографии восстания.

**Мацук Андрей Владимирович,** кандидат исторических наук, научный сотрудник Европейского гуманитарного университета.

*«Полоцкие сеймики в 1704–1707 гг.»*

В статье на основе различных материалов из архивов Беларуси, России и Польши, а также научной литературы рассматривается функционирование полоцких сеймиков в 1704–1707 гг. Отмечается, что основное влияние на их функционирование оказало присутствие российских войск в Полоцком воеводстве, а основной причиной созыва сеймиков была проблема обеспечения этих войск. Установлено, что в ситуации двухкоролевья шляхта на полоцких сеймиках в основном была сторонницей Августа II и выступала против поддерживаемого шведами Станислава Лещинского.

**Полехов Сергей Владимирович,** кандидат исторических наук, старший научный сотрудник Школы актуальных гуманитарных исследований Института общественных наук Российской академии народного хозяйства и государственной службы при Президенте Российской Федерации.

*«Древнейшее упоминание Шклова – 1466 год: послание новогородского наместника Мартина Гаштольда»*

Публикуется распорядительное послание новогородского наместника Мартина Гаштольда его шкловскому наместнику Комару о пожаловании сельца его боярину от 1 апреля 1466 г. – документ, содержащий древнейшее известное упоминание Шклова в косвенной форме.

**Рындин Сергей Николаевич,** магистр исторических наук, ведущий научный сотрудник отдела научно-исследовательской и публикационной деятельности Национального исторического архива Беларуси.

*«Марковщинский лагерь военнопленных во время Первой мировой войны (по материалам Национального исторического архива Беларуси)»*

В статье отмечается, что в отечественной и зарубежной историографии долгое время ничего не было известно о создании лагерей для иностранных военнопленных на территории белорусских губерний в период Первой мировой войны. НИАБ хранит подробные сведения об одном из таких лагерей на территории Витебской губернии, который был развернут в районе села Марковщина в Витебском уезде и, согласно архивным документам, просуществовал в течение всей войны. В данной статье проводится обзор выявленных документов и проанализирована их информативность: период существования лагеря, условия содержания военнопленных, отношения заключенных иностранных военнослужащих с лагерной администрацией, руководством и персоналом хозяйственных объектов, использовавших труд военнопленных, масштаб применения труда. Большой интерес представляют документы, содержащие сведения о самих военнопленных: подданство, национальность, именные списки.

**Самович Александр Леонидович,** доктор исторических наук, доцент, главный научный сотрудник центра военной истории Беларуси Института истории Национальной академии наук Беларуси.

*«Первая мировая война и белорусская школа: военный фактор в деятельности учебных заведений (1914–1918 гг.)»*

Статья затрагивает вопросы, связанные с влиянием событий Первой мировой войны на деятельность учебных заведений белорусских губерний. Обращается внимание на инициативы учащейся молодежи в поддержку солдатских семей, отмечается забота юношей и девушек в отношении раненых воинов, приводятся факты участия подростков в боевых действиях. Подчеркивается важность изучения опыта работы средней школы в чрезвычайных условиях военного времени.

**Скепьян Анастасия Анатольевна,** кандидат исторических наук, доцент, ведущий научный сотрудник отдела истории Беларуси IX–XVIII веков Института истории Национальной академии наук Беларуси.

*«Геральдические печати князей Олельковичей»*

В статье анализируются особенности сфрагистики князей Олельковичей и ее эволюция на протяжении XV – начала XVII в. Ее характерной чертой являлось использование личного единичного герба, вначале в виде клейна, а затем герба «Погони». На протяжении всего времени существования династии ее представители ни разу не использовали для размещения на печати сложного или брачного герба, что в ряде случаев затрудняет их идентификацию. Интересной особенностью женской геральдики Олельковичей является неиспользование княгинями красного воска для печатей, несмотря на свой статус.

**Снапковский Юрий Николаевич,** заместитель заведующего отделом научно-исследовательской и публикационной деятельности Национального исторического архива Беларуси.

*«Современные информационные технологии в специальных исторических дисциплинах биографического профиля (на примере онлайн-картотеки профессора Эрика Амбургера «Иностранцы в дореволюционной России»)»*

В статье затрагивается проблема применения современных информационных технологий в специальных исторических дисциплинах биографического профиля (биографике, генеалогии, некрополистике). Отмечается их роль в выявлении, накоплении, систематизации и эффективном использовании ретроспективной информации. В качестве одного из самых крупных и информативных профильных электронных ресурсов рассматривается немецкоязычная онлайн-картотека профессора Эрика Амбургера «Иностранцы в дореволюционной России». Автором проанализированы ее информационный потенциал, структура, навигация и некоторые внешние параметры. Подчеркивается большая практическая значимость онлайн-картотеки для отдельных исследований и научно-исследовательских проектов.

**Чернявский Федор Викторович,** историк-генеолог.

*«Маршалок Ошмянского повета Ян Сволынский (?–1646): происхождение, общественно-политическая деятельность, имущественное положение»*

